# Алесь Адамовіч



# VIXI

Алесь Адамовіч

# VIXI

Менск
**«Ковчег»**
2002

УДК 821.161.3-31
ББК 84 (4 Беи) - 44
А 28

**Адамовіч Алесь. Vixi.** Тры апошнія аповесьці/ Алесь
А 28 Адамовіч. — Мн.: ТАА "Ковчег"., — 2002. — 504 с.
**ISBN 985-6056-33-0**

Гэтую кнігу Алеся Адамовіча складаюць тры апошнія аповесьці — "Вэнэра", "Нямко" і "Vixi" — якія раней асобнымі выданьнямі не выходзілі, бо пісаліся ўжо ў постсавецкі час і адлюстроўваюць незалежны погляд на беларускую гісторыю і беларускага чалавека XX стагодзьдзя.

**УДК 821.161.3-31**
**ББК 84 (4 Беи) - 44**

ISBN **985-6056-33-0**

© Адамовіч Натальля, 2002
© «Ковчег», 2002

ЗЬМЕСТ

**Вэнэра, або як я быў прыгоньнікам.** *Аповесьць, **5***

**Нямко.** *Нявыдуманая гісторыя, **189***

**Vixi.** *Скончаныя разьдзелы незавершанай кнігі, **299***

*Выданьне кнігі сталася магчымым, дзякуючы:*

Беларускаму Дабрачыннаму Фонду
“Дзецям Чарнобыля”
і асабіста Генадзю Грушавому;

“Белорусской Деловой Газете”
і асабіста Пятру Марцаву;

Віталю Тарасу;

Алене Лукашэвіч;

Юрыю Цыбіну.

# ВЭНЭРА,
# або
# ЯК Я БЫЎ ПРЫГОНЬНІКАМ

*Аповесьць*

***Bella donna Russia! (Чароўная расіянка!) —
выгукнуў нэапалітанец, пабачыўшы савецкіх
турыстак на пад'ёме да крэпасьці Санта-Эльма.
А я пачуў сваё: Бела-русь! Ты, чароўная Беларусь,
але чаму злыя вятры абавязкова ў твой бок дзьмуць?***

# РАЗЬДЗЕЛ ПЕРШЫ

— Каб жа вайна якая! — прашаптала-выгукнула жанчына. Здавалася, што заплакала не ад словаў судзьдзі («Пяць гадоў пазбаўленьня волі без канфіскацыі маёмасьці»), а ад уласных бясьсільных і страшных словаў. Каб яшчэ больш балюча было і як сама ня верачы, што гэта яна кажа такое, паўтарыла: — Каб жа вайна...

Жанчына-судзьдзя, не сьпяшаючыся, зьбірае паперы з крываногага стала, накрытага чырвоным, у чарнільных плямах абрусам, пракурор Чайкоўскі, бокам да залі, пасьміхаецца, нешта тлумачыць мужчыну начальніцкай рассыцеласьці, але ўсе — і заля таксама: заводзкія бабы, седзячы на груба зьбітых клюбных лаўках, нашы падшпаркі, якім і ў судзе цікава, — усе быццам яшчэ чагосьці чакаюць. А ўсё ўжо скончана.

Асобна, напалоханай птушынай чародкаю сядзяць дзеці асуджанай, — здаецца, хлопчык і чатыры дзяў-

чынкі: апратка на іх такая, што не разабраць. На ўсіх дарослыя жаноча-мужчынскія абноскі. Маці іх, ля якой ужо зьявіўся міліцыянэр, апранута ў пацёртую плюшаўку ў іржавых плямах ці падпалінах. Яна ўсё папраўляе валасы, што выпадаюць з-пад парыжэлай хусткі. Быццам хапаецца за галаву, вось-вось загалосіць.

Але бачна, што і сама яна ўсё яшчэ чакае чагосьці, быццам прысуд не прагучаў і не яна вымавіла тыя жахлівыя і канчатковыя словы.

На такія выязныя, з Бабруйску, суды ў нашым пасёлку Глуша людзі зьбіраліся ў клюбе гэтак жа, як на трафэйныя кінафільмы. Суды здараліся нават часьцей, чым кіно. Можна было і прызвычаіцца. Але вось гэты суд быў адметны. Ці мне так падалося? Бо даўнавата тут ня быў? І потым: я ж гэтую жанчыну ведаю! А папраўдзе: ведаў. Божа, дык гэта ж яна, наша партызанская Вэнэра! І ў прысудзе яе прозьвішча згадвалася: «Станкевіч Вэнэра Антонаўна», ды напачатку я нібыта і не расчуў.

Імя ў яе зусім рымскае — у бабы з Палесься. Але тады, у вайну, нас гэта не дзівіла: а як яшчэ можа звацца Багіня? Наша агульнае партызанскае каханьне — Вэнэра зь вёскі Ўюнішчы.

Паспрабуй пазнай яе ў бабе, схуднелай, усохлай, як леташні пакляваны вераб'ямі сланечнік на пустцы, з выводкам напалоханых дзетак, толькі што асуджанай «за раскраданьне сацыялістычнай уласнасьці».

Колькі ж гадкоў прамінула — сем? Ды не, калі ад першай сустрэчы, — усе дзесяць. Але абрысы твару, а найбольш ямачкі, — росчырк на ўсю шчаку — тыя самыя, я ўсё ж пазнаў яе. А ўсё адно паверыць цяжка: бы цёмны нэгатыў знаёмай фатаграфіі. «Наша ластавачка», — называў яе стары Караткевіч, калі міма нас — узводу, які адпачываў ва Ўюнішчах, — пралятала дзяўчынка: танклявы тварок з загадкава прыкусанай губкай, заўжды нейк плечуком ад нас сарамліва разьвярнутая, бы адводзіць убок не па гадах поўныя грудзі, ногі, як у бусьляняці, даўгія. Каса за сьпінаю тоўстая, як белае бяроза-

вае палена. На грудзях ці на плячы — абавязковы белы кончык хусьцінкі. І праўда — як у ластаўкі. Краем вока ўхопіць цябе, бы мошку, і панясе тваё дыханьне, апалае сэрца — кудысьці ўверх. Вось як перад дажджом ластаўкі крэсьляць пацямнелае неба.

Дом Станкевіча быў крайні ад бальшака і самы прыкметны ва Ўюнішчах. То быў менавіта дом. Простай хатай не назавеш. Пяцісьценка, пад бляшаным дахам, вокны вялікія зь белымі фіранкамі. І паўсюль кветкі. У Станкевіча быў і свой пчальнік, і конік, звычайны, нават мізэрны. (А якога ён у лесе хаваў, мы ня ведалі.) Ну і карова, цёлка, сьвіньні, куры. Але справа нават ня ў гэтым, а вось як усё ў яго адно да аднаго клеілася, ладзілася і як ён умеў сябе паставіць перад усімі. Час жа вунь які: у каго зброя, той і галоўны. Асабліва ўначы і асабліва ў вёсцы. Усё астатняе (тое, што я пералічыў, яго гаспадарка) чалавека не мацавала, не ўздымала, а рабіла якраз залежным: з галяка што возьмеш, а гэткага ўшчаміць каму неахвота.

Але вусаты дзядзька, Вэнэрын бацька, і хадзіў па вуліцы, і пазіраў, і вітаўся так, што зь міжвольнай павагай-цікаўнасьцю азірнесься на яго. А ўжо дома ў яго тым больш: ногі абавязкова выцераш ля парогу. Ды ня надта мы да яго зазіралі, шарагоўцы-партызаны. Вечна нечы конь пад сядлом навязаны да плоту Станкевіча. Які-небудзь камандзір гасьцюе. Моцны мужык — Станкевіч. Хітраван. Куркуль. Кулак. Словы гэтыя, ахвотна вымаўленыя, ніяк, зрэшты, не падрывалі нашу да яго павагу. Даравалася яму многае, нават багацьце — за дачку. Вэнэра нас мірыла зь любой няроўнасьцю. Камандзір, разьведчык, ад'ютант — нехта красуецца на харашунеканi, абвешаны зброяй, пад баранковай шапкай-кубанкай, ну што ж, затое Вэнэра ёсьць ва ўсіх у нас. Нічыйная, а таму ўсіхная. Што нічыйная — на тое мы спадзяваліся, ды якімі часам раўнівымі і нядобрымі вачыма сачылі за ёю. Не-не ды й выкажа хто-ніхто агульную нашу насьцярогу: «Усе яны такія, бабы! А чулі...» — пра

тое, як бачылі яе ў сядле ў Міцькі Касога з брыгаднай разьведкі. Але мы разарваць гатовыя былі таго, хто выказваў нашы ж думкі-асьцярогі. Найчасьцей гэта Носаў Мікалай. Твар ці то хлапечы, ці старой дзеўкі, безвалосы, памяты. Можа, таму і злосьці столькі. Ад самога сябе аніякай радасьці чалавеку!

— Бач, знайшоўся жанішок для нашай Вэнэры! Так і ліпне да Станкевіча. Бяжы да сваіх недамеркаў саратаўскіх!

— Саратаўскія лускаюць семачкі і пад хлопцам.

— Такія, значыць, хлопцы.

Вось так, і дзеўкам, і хлопцам — адной меркай. Але Носаў ня з тых, каго можна агулам, талакой біць. Гэта яму толькі азарту паддае.

— Беларусь мая радная — бульба дробная, гнілая!

— Дробная, але заўжды ёсьцека, а ў цябе: год густа — два пуста. Саратаўскія страданія!

Вось так яму — арыстакрату. Бо ў нас «старыя партызаны» — арыстакратыя. А Носаў Мікалай, няхай сабе і «дабраволец» (уласаўцамі тых, хто ў 1941-м напяў нямецкі мундзір, тады яшчэ не называлі), але ў партызанах зь вясны 1942-га. За Вэнэру хлопцы каму хочаш нос адкусяць. Самому камандзіру альбо камісару. Роўнасьць дык роўнасьць. Мы на гэтым сабаку зьелі, у роўнасьці. У нашым лягеры на кухні катлы віселі вялікія, агульныя — «для ўсіх» і маленькія — для штабных. Мясны суп на сьняданак закладвалі кухары-кухцікі з начы: валоўе мяса прэла, даходзіла пад вугольлем да сьвітанку, ну і яшчэ ў невялікім катле смажылася адмыслова для начальства, пячоначка там розная — пах на ўвесь лес. Пасьля выпадкаў альбо чутак, што дзесьці нямецкія агенты падсыпалі ў кацёл партызанам атруту, каля катлоў выставілі варту. Стаіш і напружана ўслухоўваесься, ці не крадзецца хто. Во, ляпае ў цемры лыжкай па кацялку — цяпер не зявай. Ага, падобна, што гэта Цыбук, не, Носаў — вынырнуў з начы і напрасткі за алтар прэцца, у сьвятая сьвятога, да катлоў. Чарпака няма, а яму й ня трэба, ручышчай смач-

ныя кавалкі ловіць, добра, калі рукаво ватоўкі закатае. Пячоначку — з катла меншага, самага пахучага, штабнога. Смачнага сьняданку, таварышы камандзіры! (Толькі пасьля вайны, калі зьяжджацца пачалі на партызанскія сустрэчы, расказаў ім пра гэта — пакрыўдзіліся. Яны, выявілася, пра такое і думаць не маглі.)

У Носава падазронае сяброўства з вусатым Станкевічам, бацькам нашай Вэнэры: ці ня хоча гэткім чынам абысьці нас усіх на павароце? Сочым, вачэй не спускаем, калі ён павісьне на плоце, і аб нечым усё гамоняць, гамоняць: Носаў на вуліцы, куркуль у агародзе. Мяне падсылалі: ты маладзейшы, ідзі паслухай. (Пры чым тут маладзейшы — старэйшы, калі паслухаць самому цікава.) Ажно яны — пра гатункі пшаніцы і пароды авечак, ды так захоплена. Хлопцы нават расчараваныя.

— А морды, морды ў іх, бы пасаг абгаворваюць.

Сьмех і сьлёзы — што з намі тое дзяўчо вычварала. Добра, мы ўчорашнія шкаляры, але ж і Носаў, Караткевіч (наогул дзед) — быццам і клопату іншага няма, адно толькі з-за яе перажываць.

Так што гэткае незвычайнае імя — Вэнэра — было надта дарэчы. Зрэшты, на Палесьсі адразу і ня скажаш, што дарэчы, а што недарэчы. Нібыта балота штокрок, «галоўнае балота Эўропы» (тыцкаў носам саратавец, калі дужа мы яго даставалі), а дубоў гэткіх і соснаў у пяць абхватаў нідзе больш не пабачыш. І старых ды баб стогадовых (і плюс немаведама колькі яшчэ) — пашукай такіх, хіба што на Каўказе. Зрэшты, на гэта ў Караткевіча ёсць тлумачэньне:

— А было так, наехалі піянэры аж зь Менску ці скуль. Раскажы, дзед, як ты жыў, калі Напалеон тут праходзіў, як усё было. А ён: калі адбылася Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя... Не, ты пра швэдаў! Дзед сваё: калі здарылася гэтая рэвалюцыя... «Ды мы гэта ўжо чулі». Нарэшце, доўгажыхар прарваўся: калі нарабілася гэтая рэвалюцыя, быў такі гармідар, што мне прыпісалі лішніх 70 гадоў у мэтрыку...

— Вось кончым немца, — раптам залетуценіў Носаў, — таварыш Сталін калгасы побаку, прыеду да Станкевіча, і будзем гарбаціцца на пару. Бражку зь мёду гнаць, вас, нахлебнікаў, частаваць...

— Куркулі, бачыш, аб чым мараць! — Хлопцы жартаў не ўспрымаюць, калі на Вэнэру хтосьці квапіцца. — А на Салаўкі не жадаеце?

Праз Палесьсе калісьці шлях ішоў: з варагаў у грэкі. Значыць, і шлях грэкаў да нас. А дзе грэкі, там італьянцы — багі і багіні іхныя ў блізкім сваяцтве былі.

Вось такі радавод у нашай Вэнэры, а тут — нейкі саратавец! Пазіраць пазірай, ніхто не забараняе любавацца нашай Вэнэрай, але з шэрагу не вытыркайся.

А неяк чэпэ здарылася: нехта палазіў каля вульляў Станкевіча. Называецца: павязаць пчолак. З патрону выломваеш кулю, запалку да патрону, патрон да лаза — ш-шух! Душагубка для пчол. Адчыняй вечка і, не баючыся джалаў, гаспадар, нібы фашыст. Але ня можа быць, каб гэта з нашага атраду. Пэўна нейкія чужакі пашарылі. Носава віншавалі: во як памацалі твайго цесьця! А ён нават задаволены, радуецца — чаго толькі: віншаваньням альбо што Станкевіча раскулачылі? Гэткія гісторыі нас усіх чамусьці забаўляюць. А, недаспадобы? Прыйшлі, вярнуліся ў лягер уначы, у зямлянцы сьпяць упокат, аднаму, другому з усяго маху па задніцы — падскоквае, як шалёны. А, недаспадобы?! У гэтым уся вясёласьць: каб чалавеку не падабалася.

Начальства правяло сьледзтва, але паспрабуй адшукай вінаватага. Носаў абяцаў: нічога, мы зь цесьцем знойдзем мёдаежак. У выдзертым мёдзе пчолкі хаваюцца, нібыта мёртвыя, а ў губу ўджаліць, як дзеўка п'яная, — морду і разьнясе.

Сам Станкевіч наўрад ці напіраў на сьледзтва, вышук. Сабе даражэй — сварыцца з начнымі гасьцямі, у якіх зброя.

У мяне з Багіняй была адна-адзіная сустрэча самнасам. Пры сьведках я зь ёю і ня змог бы загаварыць. А

гэта пабачыў у вакно, што адна сярод вуліцы — выйшла з граблямі прыбраць расьцярушанае коньмі сена. Там, дзе разьведчыкі і камандзіры, скочыўшы зь сядла, няўважна кідаюць на плот-кветнік аброць. Я шпурнуў на стол лыжку, не аблізаўшы нават кісьляк. Жуючы гарачую, проста з чыгуна, бульбачку, выбег за парог, ня помню, ці падзякаваў гаспадыні. Пасьпець, пакуль не апярэдзіў хто з нашых нахабаў. У роце перасохла, затое далоні нечага ўзмоклі — зараз альбо ніколі! Крытычным позіркам яшчэ раз сябе агледзеў, свой баявы арсэнал: лімонка пас адцягвае, цераз плячук патронная стужка, як у кіно насілі. Стрэльбу трэба во гэтак, руляю ўніз, нядбайна.

Скіраваў ступакі свае да Багіні. Сапраўды ступакі, даўно ня мытыя, вызіраюць з растаптаных чаравікаў. Варта б аддыхацца, каб суняць сэрца, а на твары каб было, як у веселуноў-ад'ютантаў: не пасуе ў такім выпадку твар пахмурнага грабежніка зь вялікай дарогі (падазраю, што ён у мяне акурат такім і быў — ад рашучасьці не збаяцца). На хаду адкашляўшыся, ужо і фразу падрыхтаваў: «Што, парадачак наводзім?» — нядбайную, быццам штораніцы во гэтак сустракаемся, гамонім. Падрыхтаваную фразу сваю ня вымавіў, а, пэўна, пракрычаў за сьпінаю ў яе, бо дзяўчына ажно ўздрыганулася:

— Ай, дзядзька, гэтак і заікай можна зрабіць!

— А што, сёньня які фэст, сьвята ў вас? (Вось і яшчэ адно слова, намі прыручанае, можна сказаць, нажытае з замежнікамі: фэст, вядома, ад фіесты.)

Я пасьпешліва выдаю сваю нарыхтоўку. Пакуль яшчэ дух не заняло. А сам намагаюся не заўважаць высокія грудзі, прыкрытыя белай кофтачкай і ўсё той жа ластаўкай-хусьцінкай; ямачкі зьмейкай уюцца на шчоках, пульхныя і капрызьлівыя па-дзіцячаму вусны. Ляплю абы-што:

— Сватоў чакаем?

Вэнэра вывучае колькі хвілінаў хлапца, што аднекуль выскачыў, абвешаны амуніцыяй, цікаўна — як ка-

ляднiка. Я ў адчаi, я бачу, як яна згарнула мяне, нiбы буквар, — даўно прачытаны, знаёмы да апошняй лiтары i малюнка. I тут жа з дарослай, крывадушнай цiкаўнасьцю спытала:

— Ты, хлопча, з гаспадарчага ўзводу?

Добра, што не спытала, чаго гэтак спатнеў.

— Што, Мiцькi Касога конь тут быў? — спытаў я злосна.

А яна засьмяялася. Нагадаў ёй пра кагосьцi больш цiкавага, чым я сам. Нашмат больш цiкавага.

— Нацерусiў сваiм канём, а каб прыбраць — дзе там!

I раптам хмурынка набегла на яе тварок. Зусiм iншым голасам вымавiла:

— А што як наляцяць немцы цi бобiкi? Адразу вiдно, дзе партызаны днююць-начуюць. Во i будзе тады фэст!

Сабрала рукамi сена, што падгрэбла.

— У вас кнiгi ёсьць?— сьпяшаюся хоць чым зацiкавiць. Не заўважаючы, што раблю гэта зусiм па-школьнаму.

— О, тата заўжды прывозiў, калi ў горад езьдзiў. Я зусiм яшчэ малая была. I плякаты такiя прыгожыя: пра пчолак, пра парасят.

— А я прынёс кнiгi з дому: Пушкiна, Байрана. Дык курцы! Вярнуўся з адной апэрацыi — а ад кнiг адзiн пераплёт.

— У нас нават Бiблiю скурылi. Пакуль тата спахапiўся, паўкнiгi выдралi.

— Мiцька Касы?— Я ёй усё яшчэ не дараваў.

— Можа, ён, можа, хто iншы.

— А хто iншы?..

Даведацца не пасьпеў: зьявiлiся на вулiцы нашы, вывалiлiся з хаты насупраць — я прыкiнуўся, што мне тэрмiнова трэба да iх.

Пракурор, якi запатрабаваў для Вэнэры Станкевiч пяць гадоў лягераў за восем калгасных бульбiн, быў доб-

ры знаёмы, не, больш — сябра майго бацькі, нашага дому. Яшчэ з даваеннага часу, калі працаваў дырэктарам саўгасу. Наяжджаў да нас у акуратнай павозцы, жарабец у яго, што зьвер, — зусім ня тое, што мы звыкліся бачыць на калгасна-саўгасным кірмашы. Першымі да яго выбягалі мы з братам.

— Забярыце вашай кароўцы, — рукой аддзяляў, пакідаючы рэшту канюшыны сабе, каб было пад зад. А маці нашай паведамляў:

— Гаспадары ў вас растуць.

— Гультаі, — не згаджалася мама, — вады не дапросісься прывезьці. Асабліва гэты.

«Гэты» — гэта я. У старэйшага брата рэпутацыя іншая, мне падавалася, што і карова наша з большай павагаю паварочвала морду, калі ня я, а ён падносіў ёй канюшыну. (І цяпер помню горкую сьліну, ажно гоніць зь цябе, калі валачэш бярэмя, прытрымліваючы падбародзьдзем, носам, — да чаго ж усё гэта помніцца!)

У дзень суду над Вэнэрай пракурор Іван Фёдаравіч Чайкоўскі па даваеннай звычцы заехаў, зазірнуў да нас. Жылі мы не ў ранейшым доме, а ў двух задніх пакойчыках аптэкі. Пасьля партызанкі мама зноў стала загадчыцай аптэкі, а казённую кватэру, пакуль былі ў лесе, забралі, прыстасавалі спачатку пад паліцэйскую каравулку, а потым пад больніцу. І паколькі бацька, падпалкоўнік мэдслужбы ўжо, таксама вярнуўся ў сваю больніцу, адабраць яе ў загадчыка, гэта значыць у сябе самога, ня мог. Рашыў будаваць уласны дамок. (Так і не дабудаваў, памёр у 48-м. А я, помню, пачуўшы пра ягонае раптоўнае жаданьне мець свой дом, зьдзівіўся: дык жа неўзабаве камунізм!)

Вайна шмат што зьмяніла, падправіла ў людзкіх біяграфіях. Вось і Чайкоўскі — зрабіўся пракурорам. (Здаецца, маёрам у арміі быў.) Яго сіплаваты голас і сьмяшок, такі знаёмы, з паторгваньнем, я пачуў, яшчэ валяючыся ў ложку:

— Кажуць, студэнт ваш прыехаў? («Асьпірант», —

паправіў я яго ў думках.) А я во заявіўся баб судзіць. За бульбіну — гадок! Б'ем і плакаць не даем.

І калі сьнедалі, за сталом сядзелі, ён то бацьку нашага згадваў, то — некалькі разоў — гэтую бульбіну:

— Пяць гадоў за пяток бульбін!

Вочы весела-жорсткія, у іх нешта такое, чаго да вайны ў гэтым чалавеку не прыкмячалася. Зрэшты, я ня ведаю, які ён тады быў — з саўгасаўцамі. Вядома адно, што гаспадарка ў яго была «моцная».

Ён пайшоў у клюб, судзіць, я пакуль туды зьбіраўся — засьпеў, пачуў толькі прысуд. Нашай партызанскай Вэнэры прысуд.

Вось такія справы! — хочацца паўтарыць усьлед за аўтарам «Бойні нумар пяць». Такія вось пірагі. Гарачыя, апячэсься. У амэрыканскага немца Курта Вонэгута вычытаў я і яшчэ адну думку, хоць забіце, але яна і мая ўласная: пра мінулую вайну як пра крыжовы паход дзяцей. Яна, на жаль, скарыстана, зрасходавана на амэрыканцаў, што ваявалі ў Эўропе. А як бы спатрэбілася для нашай партызаншчыны. Вось ужо дзеці дык дзеці! А дзе дзеці, там і жорсткасьць. Асаблівая, дзіцячая.

У нас нават камандзіры атрадаў, брыгад былі найбольш дваццацідвух-дваццацітрохгадовыя. Ва ўзводах — школьнікі, нядаўнія школьнікі. Былі і барадачы, «дзяды», але няшмат, як бы спэцыяльна для дакумэнтальных кінастужак, фотаздымкаў, каб ня крыўдзіць тых, хто менавіта такімі ўяўляюць «народных мсьціўцаў».

Можна нават падлічыць, у лічбах, працэнтах. У атрадзе нашым было каля 600 чалавек. Гэта ў 1943 годзе. Складаўся ён з каго (досыць тыпова для Беларусі)? Працэнтаў 10 — былыя акружэнцы, яны ж нашы камандзіры, штабная публіка. Столькі ж, бадай, былых «дабравольцаў», «уласаўцаў». Гэта ўсё наш армейска-кадравы склад, баявы касьцяк атраду. Акружэнцы партызанілі з 41-га, «дабравольцы»— зь вясны 42-га. І тыя, і другія як бы арыстакратыя наша, «старыя партызаны». Хаця не-

прыкметны падзел між імі заўсёды існаваў: ніводнага «ўласаўца» не было ў штабе, а калі «ўласавец» камандзір, дык не вышэй, чым узводу. І наогул грахі вольныя ці міжвольныя не даравáліся. Злучыліся з арміяй — і большасьць іх, не пытаючыся, хто як партызаніў, адправілі ў штрафныя роты. Вася Папоў ужо колькі разоў сваю віну выкупляў, калі й была віна, а паслалі выкупляць яшчэ раз. Група ягоная 18 цягнікоў, кажучы тэкстам, голасам Левітана, «з варожай сілай і тэхнікай пусьціла пад адхон». Ня ўсякая дывізія на фронце такія страты ворагу нанесла. Адсьвяткавалі сустрэчу з Савецкай Арміяй, і тут жа Васю — у штрафную.

Гэта я пра камандзіраў казаў. Ну а наступная паводле значэньня і павагі катэгорыя партызан — «дзяды», ва ўзводах баявых і пры гаспадарчым узводзе. Іх ня больш за 3-5 працэнтаў.

Ага, не забыцца пра былых паліцаяў, іх таксама працэнтаў пяць.

Наогул працэнтаў 35 — ня мы. Астатнія — мы, школьнікі. Зь вёсак, з рабочых пасёлкаў, як наша Глуша, з райцэнтраў, мястэчак. Былі і гарадзкія, але ім больш складана трапіць у партызаны, дабрацца да нас. Там у іх заводзіліся «маладыя гвардыі», у Беларусі — у кожным гарадку, а ў вялікіх гарадах — амаль на кожнай вуліцы. Так што і ўся рэспубліка беларусаў у вайну — крыжовы паход дзяцей.

Вось такія ў нас справы школьныя, Курт!

Вайна не пакінула мне пустога рукава, не аддзячыла цяжкім ліпавым пратэзам. А ў маім студэнцкім пакоі на вуліцы Няміга, 21, на пяцярых было ўсяго толькі восем рук і столькі ж ног. Імгненьне жаху, калі, выбягаючы з пакою, я ляпнуў з размаху дзьвярыма. І заціснуў, прышчаміў пальцы аднарукаму Вальку Гаўрылаву. Спачатку крык болю, само сабой, мацяршчына, а потым посьмлівае: «Будзеш цяпер штаны мне зашпільваць у прыбіральні!» Хіба двухрукаму думка пра гэта прыйдзе? Ніхто не вывучаў псыхалёгію народу, дзе сярод ацале-

лых, жывых столькі аднарукіх і бязногіх. Не, гэта ўжо іншы народ, іншая, не-ранейшая краіна. А калі яшчэ ведаць, колькі наогул не вярнулася, а бяз кожнага, як вядома, народ няпоўны.

Але і ацалелыя — цэленькія, як я, таксама прынесьлі з вайны сваю кульцю. Гучна кажучы, кульцю ў душы. Чым мяне надарыла вайна (ненадоўга), дык гэта аўтаматам ППШ. (Кароткі тупастволы — кульця і ёсьць.) Ведалі б нармальныя людзі (калі такія ў нас яшчэ засталіся), які ўсьмешлівы монстар, вясёлы кракадзіл (і не адзін) блукае-гуляе поруч, езьдзіць у адным зь імі трамваі, цягніку, ляціць у самалёце. Ідзе, едзе, глядзіць у вакно рэйсавага аўтобуса і раптам — зрывае з пляча кульцю-аўтамат, палец на спуску-курку: тр-р-р! І ад вас адзін успамін!

Мацней, чым пра каня пад жоўтым сядлом, гарачэй, чым пра баранковую, у дробныя кольцы, шэрую кубанку альбо наган, марылася мець, няхай сабе дыскавы (але найлепш ражковы), аўтамат. Дапяў да сваёй мары, толькі калі партызаны спрабавалі фронт перайсьці, перабегчы. Камандзіру ўзводу Лазараву з засады секанулі па абедзьвюх руках з кулямёта. Першым, да каго ён дачыкільгаў, абліваючыся крывёю, быў я — мне й дастаўся ягоны аўтамат. Ажно сем дзён я насіў яго. Але ні разочку не часануў, шырока, вольна: тр-р-р! Адно раз пукнуў. Важдаўся з дыскам, спрабаваў загнаць патрон у рулю (хаця і цяміў, што нельга, што не трохлінейка гэта) — каб траха, нагу прастрэліў бы незнаёмаму партызану.

Але так і не запузырыў ні разу чаргу, не разрадзіў дыск, не разрадзіўся сам, спружына засталася на ўзводзе. Зімільгаюць перад вачыма тэлеграфныя слупы альбо кусты ўздоўж дарогі пабягуць, у руках у мяне ўжо аўтамат, даўно здадзены армейскаму камэнданту: тр-р-р!— шырокая, разьняволеная, на паўдыска, чарга. Вось яны— школьнікі на вайне. І пасьля.

А здавалася ж, наваяваўся, зьбіў смагу. Першыя

часы, калі жыў на Алтаі, ваенныя фільмы, напрыклад, глядзець не хадзіў. Можа, таму, што свой фільм усё круціўся, пазбавіцца ня мог. Пазбавіўся нечакана і як бы імгненна: гуляў па праспэкце ў Менску, зеляніна, сьвежасьць, ногі самі бягуць, а наперадзе, згарнуўшы парасон, маладая жанчына ў чырвонай сукенцы. І раптам сукенка загарэлася, валасы ўзьляцелі, таксама ахопленыя полымем... Ажно вочы заплюшчыў — так гэта выразна ўявілася. Перад гэтым я прачытаў пра Бомбу, скінутую на японцаў.

Ужо ня помню, з выпадку якога савецкага сьвята, але наш паход да Бярэзіны называўся «камсамольска-маладзёжным». Заданьне перад групаю ставіць камісар, а мы з Караткевічам — малы і стары — сядзім у лесе і пазіраем на сонечную, сьветлую паляну, куды нас, не-камсамольцаў, не паклікалі. Сказалі, што паклічуць потым. Я доўга і нудна ўпрошваў камандзіра групы Рамановіча ўзяць мяне на справу. Ну а Караткевіч калісьці жыў у той мясцовасьці, куды зьбіраемся пайсьці. Звыкла пачэсваючы сівую шчаціну і шырокі, на ўвесь твар, нос беларуса, Караткевіч адукоўвае мяне:

— Уся бяда ад сходаў. Павер старому, як сход, дык плаці. Або лесанарыхтоўкі.

Пра вёску сваю, што каля Бярэзіны, Караткевіч часта згадвае. Быццам яна і зараз там стаіць. А яе няма, спалілі зь людзьмі. Сям'ю яго таксама спалілі. Разам зь нявесткамі і ўнукамі. Ці не таму ў яго вочы такія хворыя заўжды, сьлязяцца. І гамоніць, гамоніць — ці не таму?

— Сады ў нас там, сады! Заўжды жывая капейка з кірмаша. Бабы курэй проста дамоў бабруйскім жыдам насілі.

— Ну, калі яны ўжо там нагаворацца? — пакутую я, пазіраючы на камсамольцаў, што засядаюць сярод зялёнай паляны. — Што мы ім, прыдуркі якія?

Для мяне вельмі важны гэты паход. Каб канчатко-

ва забыліся на маё гасузводаўскае мінулае. І самому забыць. Бывае, вязеш бочку з вадою ад рэчкі, і ратуй Божа, пабачыць цябе які-небудзь Цыбук. Як прыпадачны, загарлае на ўвесь лес: «Лягерны прыдурак... там-там-там! Мы цябе — і ў рот і ў нос!»

Такія во пасьляшкольныя забавы.

А наогул блатныя словы падабаюцца нам, а іншыя такімі і не здаюцца — нармальныя, звыклыя словы. Штокрок яны ў нас: «лягер», «прыдурак», «зона» — як слупы, зь якіх абарваны дрот.

— Ну, пайшоў наш камісар, — кажа Караткевіч, праводзячы слязьлівымі вачыма высокага, пружыністага, як малады жарабок, у хадзе Васіля Юльевіча. Бярэцца за высушаныя на сонцы анучы: — Не сьпяшы, пасьпеем гуку нарабіць. Там гэтых гарнізонаў паліцэйскіх, як у паршывага сабакі на хвасьце дзядоўніку.

Старанна памяў, пацёр задубелыя ад поту і гразі анучы, распрастаў аборы, нечага на сьвятло агледзеў адзін лапаць, другі — так зброю азіраюць, прыдзірліва і нават любоўна. Сьцяг палешука, пад якім мінулася і індустрыялізацыя, і калектывізацыя, і жыць стала лепей, весялей. Хада думак, прынамсі, у яго ў гэты бок.

— Быў у нас адзін, золата выбіваў для пяцігодкі. Няма хлеба, няма сала, пяцігодка ўсё забрала! Але золата — памры, а ім падай. Дык гэты што прыдумаў? Майстар! На галаву дзядзьку вясковаму ці былому крамніку-жыду надзене дзяжу, вядро і ну лупцаваць палкаю! Такая музыка, што адразу прыгадаеш, дзе і што ў цябе схавана. Свайго няма — суседзкае згадаеш. Найбольш любілі царскія манэты.

— А адкуль ім узяцца, царскім? — пытаю хціва.

— Вам здаецца, што цар — гэта як татары, калі-і было! А яно зусім нядаўна перавярнулася. На маёй яшчэ памяці.

Пытаюся, а ў самога зашытая ў куточку кашалька такая манэта: цяжыстая, тоўсьценькая, палае, як гарачы вугаль. Мама дала адну мне і адну брату. Калі немцы

прыйшлі. Разам зь меднымі крыжыкамі — выявілася, што мы з братам хрышчаныя, а ня ведалі пра тое, нам раней не казалі. Залатую манэту, я так скеміў, на выпадак, калі зусім-зусім будзе кепска. За золата нават мужоў-ваеннапалонных бабы ў немцаў куплялі. Залаты кружочак пры мне, а крыжа на мне няма. Кінуў, шпурнуў у бульбу, калі бег гародамі немаведама куды — плакаць бег пасьля таго, як немцы правялі міма нашага дому страшную калёну паўтрупаў-ваеннапалонных: білі, стралялі людзей у нас на вачах. І на вачах у Яго, калі Ён ёсць: ну дык вось на Табе Твой крыж, калі Ты такі!..

Мы — нехрысьці. Але вайна і нас паварочвае. Напрыклад, усе без выключэньня верым, што чалавек ведае, адчувае, калі яго заб'юць. Ходзіць столькі разоў на справу, на баявыя апэрацыі і нічога такога ня думае, а тут адчуе — і ўжо не ўцячэш ад лёсу...

Выходзілі зь лягера, як з абрыдлага, дзе ні дыхнуць, кляснага пакоя. У кожнага ў торбе ці ў кішэнях пінжака, плашча, ватоўкі пахучы хлеб, вараная, цёплая яшчэ, ялавічына — поўная незалежнасьць ад кухні, ад штабу. І невядомасьць, якая кліча. Калі нават гэта невядомасьць бяды, а для кагосьці раненьне, сьмерць — усё адно. І гаворка не пра ўзрост, калі ў сьмерць для сябе паверыць немагчыма. І ў Караткевіча, і ў Носава таксама выгляд шкаляроў, адпушчаных з заняткаў.

Потым, калі рана ці позна гэта здараецца, — заўжды здаецца: намёк быў, хіба вы ня помніце?.. Вось забілі алтайца Федзю Злобіна. І ўсе адразу заўспаміналі, які ён быў перад гэтым, як глядзеў, што казаў. А быў ён на сябе не падобны і словы, як знарок, дзіўныя казаў:

— Калі што, вазьмі, Мікалай, — гэта Носаву, — маё аддзяленьне.

— Ды ты што гэта?

— Не, я проста так, — а ў самога твар гэткі, бы нехта занава ўзяўся вылепліваць яго абрысы: знаёмыя, а выглядаюць незнаёма, скамячаныя, сьцёртыя.

Альбо перадапошні камісар Буянаў — неяк адшукаў атраднага мэдыка, нашу маму (мы з братам далёка былі, нас ужо пахавалі тыя, хто не перайшоў лінію фронту, вярнуліся ў атрад) — адшукаў яе і просіць: вазьміце мой маскоўскі адрас — на выпадак, калі не вярнуся. (А ішлі ўсяго толькі ў засаду, як дзясяткі разоў хадзілі; раней яму ў галаву не прыходзіла пакідаць адрас.) І вядома, не вярнуўся. Засада ўжо там сядзела, чакала, з могілак ударылі кулямёты па нашых, добра бачна было на высокім, яшчэ ў 1942 годзе адваяваным у немцаў чыгуначным насыпе — Буянаў наперадзе ішоў, пра нешта гаманіў з камандзірам атраду Царыкам. Абодвух скасілі...

І Носава, калі зарэзалі, Мікалая, — тое самае. Заўжды тое самае. Чалавек адчувае. Мы заўважылі, які ён перад тым стаў раптам уступлівы, мяккі, бы хацеў, каб такім яго запомнілі. І ўсё загаворваў пра тое, што вось у яго ў той і ў той вёсцы цешча ёсьць (а значыць, і каханка — так яму хто і паверыў!), зачакаліся, акно да дзірак прагледзелі.

— А што, скончыцца вайна, тут і застануся. А перад гэтым хачу пабыць начальнікам. Адзін месяц. Толькі адзін месяц. Над нямецкім лягерам. Яны ў мяне стануць кім хочаш. (Аніяк сваё «ўласаўства» даравацъ ня мог.) Трэба, дык і жыдамі стануць.

Насьцігла куля яго сярод поля, да лесу не дабег. Дабеглі да яго самога — перасьледнікі-ўласаўцы. І штыком нямецкім, ягоным жа штыком, — паміж лапатак! Так мы яго і знайшлі, распластанага, нібы прыколатага да зямлі, дзе ён зьбіраўся жыць. Зусім дзіцячая, худзенькая шыя была ў Носава, што ляжаў сярод поля.

Але ўсё гэта потым, праз два месяцы, здарылася. А пакуль мы ідзём да Бярэзіны. Ці то паход, ці то шпацыр — настрой гэткі. Блякадная вайна, што абрынулася ўвесну, схлынула, жыць можна. Тым, хто ацалеў. Праўда, нас адно краем блякада прыхапіла, а вось іншым перапала.

Ідзём лясной дарогаю, паўзарослаю ўжо. Гэта азна-

чае, што вёскі ў тутэйшых мясьцінах спаленыя. Людзей альбо зусім няма, альбо мала засталося. Вось гэтая дарога ішла на Ўюнішчы — травы па костачку ўжо. Нават зайца ўзьнялі, але Рамановіч, наш строгі камандзір групы — малады румянак непрыхавана вясковы, — ускінуў руку: ня ўздумайце страляць!

Выйшлі на ўзьлесак: грабняк, ляшчына. Западскоквалі, каб схапіць рукой гронку, адчуць ротам аскоміну малочнай кіслаты. Зазелянела далячынь, дзічкі-йгрушы раскіданыя па ўзьмежку: людзей няма, а поле, імі засеянае, засталося, красуе, наліваецца. Прыйдзе восень — чакай новай блякады. Кожны сьпяшае сабраць ураджай для сябе.

— Не было б мужыка, — філязофствуе Караткевіч, — і вайны не было б.

— Гэта як?

— А не было б за што ваяваць. Дзяліць не было б чаго.

— Дае дзед!

— Да вайны, — не супімаецца Караткевіч, — упаўнаважаныя наяжджалі з раёну, усялякія газэты, радыё: не забудзьцеся пасеяць, не забудзьцеся прыбраць! А тут, во, ніхто не ўгаворваў.

— О, не, наш камісар вясною выступаў перад вяскоўцамі. І камсамольцы.

— Маглі й не выступаць.

— Ты што, Тамаш, хочаш сказаць? — пасьміхаецца Носаў. — Што пражыць без начальства можна? Ня пройдзе гэта ў вас, беларусаў. Кожнаму хочацца хлеба з маслам.

Уюнішчаў няма, згарэлі, няма Станкевіча, ужо месяцы тры, як гэта здарылася. Дзіўна, але пра Вэнэру, пра нашу Багіню, — ніхто ні слова. Ці гэта толькі гульня была — тая наша агульная закаханасьць у дзяўчо?

Была партызанская Вэнэра, ну, і было, а ня стала яе, і ўсё пайшло, забыта…

— Глядзіце, стаіць, цэлы! — вокліч зьдзіўленьня.

Гэта адкрыліся Ўюнішчы, тое, што ад іх засталося. Пячныя коміны, нейкія паўзгарэлыя хлеўчукі, пажоўклыя сады. І сярод усяго гэтага — дом, цэленькі! Ацынкаваны дах праменіцца, як люстэрка.

— Праўду кажуць: багатаму нячысьцік дзяцей калыша!

— І тут куркулю пашэнціла!

Быццам і ня помнім, што Станкевіча няма, і які жахлівы быў канец у жыхароў гэтай вёскі.

— А праўда, што гэта спэцатрад тут дзейнічаў? — пытае Навічок. (У хлопца ёсць прозьвішча, імя, але для нас ён проста Навічок: усяго толькі два тыдні, як прыбег з Бабруйску.) Злавеснае наша маўчаньне Навічку анічога не сказала, упарта дамагаецца адказу:

— Кажуць, што яшчэ да немцаў тут нашы былі, нейкі атрад спэцыяльны...

— Табе гэта ня немцы расказвалі? — пытае Рамановіч. Вунь якія жорсткія вочы могуць быць у нашага камандзіра. — У лістоўцы нямецкай вычытаў?

— Не... Хаця, праўда. У бабруйскай газэце «Новы шлях» пісалі. Але мы ім ня верылі. Тут чуў, ад партызан. У лягеры казалі, што нейкі з каўкаскім прозьвішчам камандзір, спэцатрад нейкі.

— Не балбачы, чаго ня ведаеш. Чуў звон!

Мы згодныя з Рамановічам. Пра гэта ня трэба. Мы таксама ведаем. Але пра гэта ня трэба. Ні ведаць, ні помніць ня хочацца.

Заначавалі ў сваёй, яшчэ партызанскай зоне, на ўзьбярэжку балотнай рачулкі. (Наша зона ці нямецкая зона — паняцьці досыць умоўныя: зямля, якую часова пакінуў прыліў, — гуляй, пакуль вада не вярнулася. Пакуль не пачалася новая блякада.) У рачулцы налавілі ракаў, Ванечка нават колькі ўюноў ухапіў. Пілёткаю. Паляшук пераконвае, што ў ягонай вёсачцы рыбу рукамі, проста рукамі, нават бабы ловяць.

— А капусту як — лапцем хлебчам?

— А што лапці, пабачым, якія ў цябе будуць ногі, калі вернемся, і якія ў мяне. — Круглы, як мячык, Ванечка, лежачы на сьпіне, ускінуў у неба пераплеценыя аборамі караткаватыя свае ногі. Лапці многія абуваюць у дальнюю дарогу, тым больш калі балота наперадзе. Ванечка тлумачыць: — Чым добра: ногі заўжды сухія. Ніякая вада не трымаецца.

Носава чамусьці злуе гэтае вясковая выхваляньне.

— Ага, галодны панос — таксама добра: наскрозь прасьвіствае.

Гэта, напэўна, зь ягонай «даўласаўскай», лягернай біяграфіі.

Другую начоўку Рамановіч аб'явіў, калі Караткевіч раптам паклікаў яго сярод сасновага бору:

— Камандзір, далей ня варта. Тут гадзіна хады да Бярэзіны. Лепш ранкам. — І дадаў, гледзячы ў неба, быццам там яе бачыць, сваю Бярэзіну, сваю вёску Рудню: — Эх, рыбу, рыбу бралі! І на вудачку, і невадам, і звычайным кошыкам з-пад бульбы, як Ванечка.

— Нягож, столькі камароў, — паскардзіўся Носаў. — Ніякой рыбы не захочаш. І якія яны ў вас, Тамаш, кусьлівыя!

Мы ж прыкідваемся, што нам, тутэйшым, усё роўна. Заляпляюць вочы, ноздры — чыхалі мы на гэта! І дружна чыхаем, плюемся.

— І ўсё самачкі, сьцервы!

— А ты іх у калгас — адразу разьляцяцца.

У камароў свая жытка, добра, а нам спаць трэба. Заўтра дзень будзе даўгі, чым і калі скончыцца, тое ня ведае ніхто. Ад зямлі, як ад нагрэтай печкі, зь неба халадок — самы раз паспаць бы, але вось тут яны цябе і дастануць, як ні хутайся ў плашч. Гудуць, што самалёты, але страшныя не мільярды, а адзін-адзінюткі, які адарваўся і шукае шчылінку, каб дапасьці да рукі, да шчакі, да нагі — моліць, вымольвае, нягоднік: дай, дай кропельку крыві! Тонкі, востры піск усё бліжэй, неадступней, няўхільней.

— А каб цябе! — чуецца то з аднаго, то з другога боку. Вуха напружана слухае агідны піск, ня сьпіць і нейкая часьцінка мозгу, тая, што загадвае нянавісьцю, рукой, якая б'е, а ўсё астатняе спрабуе, але таксама ня можа адключыцца.

— Ну, я вас зараз! — гукае нехта! А яшчэ нехта сьмяецца, злосна і безнадзейна. Але вось у шчыліну з-пад плашча бачу сьвятло. Яны што там — з глузду зьехалі, няўжо вогнішча распалілі! Ня ведаем, дзе мы, ня ведаем, хто побач можа апынуцца, — і такое. Сыпануць аганьку — ног не панясеш!

Але бачна, але чутно, як заварушыліся на доле коканы — людзі, яшчэ не асмельваючыся дарэшты вылупіцца з апратак, вылезьці з сваіх схованак, спаўзаюцца да Цыбука — гэта ён падпаліў шыгольле, сухія галінкі. На іншага Рамановіч напэўна адразу ж гаркнуў бы, а тут замарудзіў, і ўпусьціў момант, бо паўзуць ужо да Цыбука, спаўзаюцца і кожны нешта загроб рукою — шышку, жменю шыгольля, яловую лапку, каб паддаць дымку гадам.

— Сьвітанак, ці што?— няўпэўнены голас Караткевіча.— Во зараз і трэба чакаць.

Старэчы заклік да разважлівасьці ня быў пачуты. Ужо вогнішча палае, высьвечваючы сосны да самых вяршынь, на ўсю моц трашчаць сырыя галінкі, дымяць, ажно пыхкаюць: так вам, так! Пра што тут казаць: немцы, паліцаі-гады далёка, а гэтыя — вось яны! Глытайце дым, ага, не падабаецца!

Твары нашы пераможна вясёлыя, сярод іх і зьбянтэжаны камандзірскі, Рамановіча, — а што яму застаецца рабіць?

А калі як сьлед пасьвятлела, пакідаючы абжыты куточак бору, няўдзячна памачыліся на згаслае вогнішча. Зь піянэрскай пары правіла — не пакідаць у лесе агня.

— А што шкадаваць? — раптам усумніўся нехта. — Няхай бы гарэлі бобікі.

Маўляў, лес тут паліцэйскі.

Караткевіч сходу прыгадаў павучальную гісторыю:

— У сорак першым аб'явіліся ў нас падпольшчыкі, сталі лясы гарэць. Дык нашы хлопцы адлавілі парачку, а яны нам у нос газэту маскоўскую. Там загад самога Сталіна.

Маўчаньне напятае. Добрая душа Ванечка дапамог нам усім:

— Газэту маглі і немцы зварганіць.

Рамановіч разьвярнуў гаворку да нашае начное дурноты.

— А шкада, шкада, што бобікі не наляцелі на вогнішча! Вось было б: ногі мае, ногі, нясіце маю задніцу!

Дзіўна, але тая начная бесклапотнасьць надала бадзёрасьці нам больш, чым сон. Што слова — сьмех. Сьмешна — памерці можна!

— Канчай дзіцячы сад! — просіць ужо камандзір. Але і на яго глянеш — сьмешна. Мядзьведзь з румянкам на ўсю шчаку. Добры брыгадзір калгасу, а не камандзір. Ну што ж, калгас дык калгас — можам і ў калгас пагуляць. Такі ў нас настрой.

— Давай нарад на працу. Што рабіць будзем?

Што — яшчэ і Рамановіч ня ведае. У штабе сказалі: арыентуйцеся на мясцовасьці. Задача ж: нашкодзіць немцам у гонар рэвалюцыйнага сьвята.

Шлях Парычы—Бабруйск, да якога мы выйшлі і цяпер прыглядаемся, бяжыць паралельна зь Бярэзінай. Мы яе ня бачым яшчэ, але ведаем, што яна вунь за тымі сосенкамі, што зелянеюць на жоўтых пясчаных касагорах, за садамі, якія ахуталі хаты вёскі. Са словаў (ня дужа ўпэўненых аднак) Караткевіча, паліцаяў у гэтай вёсцы няма, затое і зьлева і справа — гарнізоны. Месца вельмі прыдатнае для засады: альбо з аднаго боку, альбо з другога паліцаі могуць ісьці, ехаць. Яны для нас «бобікі», мы для іх — «сталінскія бандыты», так што ў разьліку. Ну, а пасапраўднаму расквітаемся на гэтай вось дарозе. Рамановіч свой кулямёт уладкоўвае на пясчанай горцы за сосенкай. Ванечка, ягоны «другі нумар», трымаючы сумку з запаснымі дыскамі ў руцэ, выглядае месца побач. Ну, і мы,

вядома, выбіраем кожны сабе, каб больш зручна і бачна было ў абодва бакі. І ў бок Парычаў, і ў бок Бабруйску, адкуль можна чакаць ужо не паліцэйскія павозкі, а нямецкія машыны. Вунь як расьцёрты пясчаны шлях, нават танкавых гусеніц сьляды, знаёмая жоўтая рабізна.

Ахапіла трывога, стала няўтульна. Не-не, ды і азірнесься: ці далёка вялікі лес?

— Глянь, Бярэзіна! — Выгукнуў Ванечка. Вогненна ўспухла і распалася нейкая аблачынка над сасновым касагорам, і сьляпуча адкрыўся ўскраек сонечнага дыска. А між касагораў шырокім сталёвым лязом зазіхцела рака. Быццам з ножнаў выхапілі.

— Не маячце! Сядай, лягай! — занепакоіўся Рамановіч. — Папярэджваю: без маёй каманды агонь не адкрываць! Чарга з кулямёта — каманда!

— А без маёй, — пацьвяляецца Цыбук, — ня драпаць.

У гэтага даўгашыяга хлопца вочы сёньня нейкія няўпэўненыя, неспакойныя. Калі зь ім што здарыцца, потым будуць успамінаць: адчуваў, ведаў!

Зрэшты, здагадацца можна, што яго мучае. Хлопцу не пазайздросьціш: у якую вёску ні сунемся, на якое гняздо паліцэйскае ні рушыць атрад — у Цыбука там родны дзядзька. Пляменьнічак, дапамажы! Ты ж ведаеш, мяне прымусілі…

— Я цябе не прымушаў, — і ўся гамонка-адказ. Некалькі разоў, у самым пачатку, ён ручаўся за аднаго, за другога дзядзьку-паліцая перад камандаваньнем. У атрадзе цяпер гэтыя яго дзядзькі. Але потым, напэўна, сказалі: неўзабаве ўвесь атрад з тваіх паліцаяў будзе! Ды і хлопцы дастаюць жартачкамі, гаворкамі на гэтую тэму.

— Слухай, Панасевіч, а тут які-небудзь дзядзька твой жыве? — Во, калі ласка, Носаў зацікавіўся.

Цыбук крыху памарудзіў (як бы размахваючыся). І — на, атрымай, калі напрасіўся:

— Перамацаем паліцаяў — возьмемся за ўласаўцаў. І вайне канец.

Ну, вось, сапсавалі адзін аднаму настрой. А навошта? Ванечка, добрая душа, кліча-запрашае: ды гляньце, гэта ж Бярэзіна!

— Не ў кіно прывялі! Што лямант узьняў на ўсю акругу? — абрывае нас Рамановіч.

Ужо людзі ўзьніклі на пясчаным, зьезджаным танкамі і машынамі шляху. Дзьве басаногія цёткі адна адной насустрач бягуць-сьпяшаюцца: іхныя абвешаныя вузламі сагнутыя постаці перасекліся і пачалі аддаляцца адна ад адной. Тая ў Бабруйск, напэўна, паляцела, гэтая — у Парычы. Сёньня, здаецца, нядзеля, кірмаш. З Парычаў, калі зьявяцца, дык паліцаі, а з Бабруйску — чакай немцаў на машынах. Лепш бы з Бабруйску: больш небясьпечна, але і больш цікава. Забіць немца — гэта ня тое, што «фашыста», «гітлераўца». Калі пішуць у лістоўках альбо дасланых з Масквы газэтах: атрад таварыша Н. зьнішчыў вось столькі «фашыстаў», «гітлераўцаў», ведай: там больш паліцаяў, чым немцаў. А калі «немцаў» — тут ужо без падману.

Адштурхнуўшыся ад зямлі, сонца абавязкова павісіць нерухома, а пасьля гэтага ўжо працягне ўзьлёт. Яму трэба спачатку паглядзець: што тут зьмянілася? Мы глядзім на сонца, яно на нас. Бачыць яно, магчыма, і яшчэ штосьці: нямецкія машыны, пешую калёну бобікаў, абоз. Але не спытаесься.

А нехта па сьняданку ўжо затужыў:

— Глядзіце, цётка ў печы запаліла.

— Кароўку за сіську: цур-цур!

— Бач, цялятка, далёка чуе.

— Камандзір, — голас Цыбука, — пакуль тое ды сёе…

Рамановіч, катаючы жаўлакі пад дзявочай скурай зь пяшчотнымі палоскамі румянку, незадаволена слухае нашу балбатню. Узіраецца ў чараду тэлеграфных слупоў, што бягуць удалечыню.

— А што ім стаяць тут? Няма чаго ім тут ста-

яць, — кажа шматзначна. — А калі так, сякеры патрэбныя, пілы. Ну, і штосьці пажраць.

Хто ляжаў, той ужо на каленях, хто на каленях — прыўстаў: ва ўсіх сумленьне пры сабе. У каго сумка ад процігазу, у каго бяздонныя кішэні. Не дадуць у крыўду ні свой, ні чужы страўнік. Але ў Рамановіча свае намеры.

— Так, Ванечка, дыскі пакінь... Хто яшчэ? Ты. (На Навічка паказаў.) Дзядзька Тамаш (гэта Караткевіч).

Запнуўся. Што, у другіх сумленьня менш? Альбо хатулі не такія ўмяшчальныя? Ды ён проста абразіў нас! Носаў і Цыбук тут жа самі прапанавалі сябе. Рамановіч ня стаў пярэчыць (не адважыўся?). Паказаў на мяне, як кропку паставіў:

— Усё. Нехта і тут павінен застацца.

Зайздросьнікі таксама зашыпелі:

— Во гэтак бы на працу прасіліся.

— Гэтыя прынясуць, трымай рот шырэй!

Ногі па костачкі грузнуць у сыпучым пяску, ступак і пальцы левай нагі адчуваюць адначасова і ранішняе ад сонца цяпло і начны халадок: ранак зьверху, ноч глыбей. Падэшва ў чаравіка адарваная, ануча вылазіць, распаўзлася. Што важней: апрануцца альбо ўсё ж пад'есьці? — спрэчка голага ступака і пустога страўніка вырашыцца на месцы. Там, у вёсцы. Надзея на выпадак, бо на сябе надзеі вялікай няма — праверана. Інакш не хадзіў бы ў такіх чаравіках.

Во, як разьезьдзілі шлях, што тут гэтыя танкі робяць? Ці на Курск гналі? А інакш што ім тут рабіць?

Бегучы міма тэлеграфнага слупа, Ванечка лапнуў яго рукою:

— Стаіш?

Вось тут, напэўна, і пачаўся адлік часу, як бывае пад час нейкае важнае падзеі: дзесяць, дзевяць, восем... Але мы гэтага не заўважылі.

А што калі ў той, такой мірнай вёсцы, што ўлеглася пасярод мяккіх ад зялёніны ўзгоркаў, затаіўся гарні-

зон? Караткевіч можа й ня ведаць: учора не было, а сёньня разьмясьціўся. Бярэзіна сьлепіць вочы, быццам хто знарок зайчыкі пускае: гуляе шырокім лязом, паварочвае з боку на бок. Наперадзе ўсіх адмервае крокі-сажэні Цыбук, усьлед сьпяшае-коціцца Ванечка, дзед Караткевіч прыадстаў, яму за імі ўсьлед ня ўгнацца. А лодак, лодак колькі на беразе — як драўляных прышчэпак на вяроўцы для бялізны.

Толькі дабеглі да першай сярод поля пабудовы, як раптам — узвылі. Не, не кулямёты — сабакі. Прачнуліся, нарэшце, за што вас гаспадары кормяць? Але, значыцца, рывок быў што трэба. Пераскокваючы галовы гарбузоў, мнучы, ламаючы сьцяблiны кукурузы, імчым ужо да хат, да іх сьляпых, бяз вокнаў, задніх сьцен. Хочацца верыць, што праскочылі ўжо той момант, калі нас маглі расстраляць сярод поля. Затое цяпер ужо і ня выберасься зь вёскі, калі там усё ж нехта ёсьць. Гэта пакуль што найважней для нас — дык ёсьць хто ці нікога няма? Праз двор, хутчэй да весьнічак — вызірнуць на вуліцу. Можна дух перавесьці: вёска паўпустынная, куры, гусі, бабы зь вёдрамі ля калодзежа. Затое вокны за сьпінаю ў нас выбелены тварамі баб, дзетак, што дапалі да шкла. Ды нічога, не палохайцеся, гэта мы! Што, ня бачылі яшчэ партызан? Тым больш. Памахай, памахай ім рукою! Чалавек з ружжом — усё ж прыемна ўсьведамляць сябе ў гэтай ролі. Вось так, на вачах у перапалоханай вёскі. Зайсьці, ці што, у хату?

— О, божачкі! Толькі што парыцкія паехалі, начавалі тут. А вы хто будзеце?

Твары баб, дзяцей (убаку барада мужчынская), цяпер усе да парогу павернутыя, гаспадыня напалоханая: ці так загаварыла, ці тое паведаміла, ня ведае цьвёрда, хто і з чым зайшоў у хату, чаго чакаць?

— Паліцыя паехала?

— Палова гадзіны, як паехалі. А вы хто будзеце?

— Ну, мы — гэта мы.

Ужо і ты пачынаеш хітраваць, выгадваць час, не-

зразумела дзеля чаго. Патрэбен час, каб растаў халодны камяк пад лыжачкаю: нейкія паўгадзіны разьвялі нас з паліцыяй, маглі нас так сустрэць!

— А што нам парыцкія, нас тут цэлы атрад!

Гаспадыня замітусілася (барада ж каля шырмы рамоўквае, ні ў чым ня ўдзельнічае).

— Вы галодныя, мабыць? Я хуценька, сьмятанка, малачко. Можа, вам няма калі, з сабою возьмеце?

Бяры і ідзі, як мага барзджэй! Што ж, так нават лепш. Сьцены ўсё-ткі гнятуць, здаецца, што там, на вуліцы, ужо нешта зьмянілася, адбываецца.

З хаты выйшаў бяз рук. Абедзьве занятыя: гладыш з малаком, у анучцы — халоднае, з вады, масла, добры камяк. Угледзеў Ванечку, што выбег з двара. Лесаруб ды й толькі: апаясаны па ватоўцы пілою, у руцэ сякера. О, чорт, пра галоўнае забыўся! Зайсьці ў той вось дом, самы прыкметны, вялікі. У такога гаспадара інструмэнт павінен быць. Ну, і паесьці самому, ня будзеш жа патрабаваць сваю долю: хто паверыць, што бег цераз масток, схапіў кляновы лісток?..

Ываліўся на вуліцу Цыбук, у руках і за поясам чаго толькі няма. Тут жа нырнуў у суседзкі двор. Такое ўражаньне, быццам вынырваюць, каб глыток паветра ўхапіць.

І толькі Караткевіч стаіць ля плота і нікуды не сьпяшаецца, з дзядзькам нейкім гамоніць. Праўда, на траве ля ног яго кус жоўтага сала, кругляк хлеба — ужо сабраў даніну. Добра, што хоць ён за вуліцай назірае, пэўна, дзеля гэтага і стаіць.

У дзядзькі, якога Караткевіч выклікаў з хаты, у руках сякера, піла: дае і не дае, шкада. Мяркуючы з урыўкаў гаворкі, высьвятляе: можа, яму пайсьці з намі і зрабіць самому, што трэба. Затое застанецца пры сваім інструмэнце. Сякеры шкада, а галавы не шкада? Караткевіч яго ў гэтым напрамку адукоўвае. Нічога, пасьля вайны разжывемся. Кажуць, вунь і калгасаў няма там,

у Сталіна. Гэта немцы, Гітлер трымаецца за калгасы-абшчыны, а наш ужо распусьціў.

Верыць наш дзед сам у гэта альбо не, сказаць цяжка. Павучыся ў яго, як трэба прасіць, выманьваць сякеру, пілу. Я накіраваўся ў дом, чымсьці падобны на палац Станкевіча.

Першае, што кінулася ў вочы, — моцныя (ці не вайсковыя?) боты на нагах у гаспадара. Сядзіць ля стала, крышыць тытунь. Гаспадыня чамусьці заплаканая, паведаміла ад печы:

— У мяне тут бульбачка, акурат пасьпела. Можа, паесьці хочаце?

— Гэта я для нашых хлопцаў, — паказваю тое, што ў мяне ў руках.

Мужык за сталом крактануў, як бы насьмешліва. Але змаўчаў. Здаецца, зь ім давядзецца паваждацца. Узрост не дапетрыш які, расьсеўся тут, замаскаваўся барадою і няма яму справы да цябе.

— Гаспадар, пазыч нам пілу і сякеру, — і дадаў са значэньнем: — Трэба.

Падняўся адразу ж і выйшаў. Ну, здаецца, паўтараць не давядзецца.

Гаспадыня клапоціць ля патэльні, гамоніць, гамоніць, а на мяне пазірае чамусьці вінавата. Калі ў мужыка ў звычайны дзень, ды яшчэ летні, на нагах такія боты, дык якія ў яго прыхаваныя! Але як пачаць размову?

Чаго гэта ён там так доўга важдаецца ў сенцах? Загуло раптам. Жорны, ці што?

— Вы на яго не крыўдуйце, не ў сабе чалавек. Ставілі да сьценкі, гэтыя парыцкія, чаго толькі не вымагалі! Забралі касьцюм добры, даваенны. Вы ешце, ешце...

Дасюль моташна, як згадаеш даўнюю сцэну ў лесе, каля гэткай вось нічыйнай вёскі. Як Зубрыцкі разуваў «жаніха». Мы высочвалі паліцаяў, а ён — вось ён, на лаўца і зьвер: крочыць па вечаровым ўзьлеску,

насьвіствае: «Сам п'ю, сам гуляю!» Здалёку чуецца пілiканьне гармоніка, бубен паддае жару — вечарынка ў людзей. А мы, як ваўкі ў цёмным лесе. Ну, і нарваўся гэты, жанішок. Пад настрой.

— Глядзіце, хлопцы, калёсы якія ў яго! Хром!

Ведаў бы Зубрыцкі, што праз нейкі месяц будзе ляжаць у гэтых «калёсах» і ў сваім гэтым шэрым плашчы сярод поля з кулявой дзірай пад пераносьсем — камісар стрэліў у яго, проста з каня. Зубрыцкі зьбег з паста каля рэчкі, спалохаўшыся, што немцы пераправіліся ўжо ніжэй ці вышэй. Проста збаяўся. І адразу, як гэта ў нас здаралася, узгадалі: паліцай былы, што яго шкадаваць, што тут балбатаць!..

А пакуль на доле перакулены ляжаў не Зубрыцкі, а «жаніх» з задранай, бы ў жабы, нагой, зь яе Зубрыцкі старанна сьцягваў бот. «Жаніх» не аддае, падціснуў пальцы, не адпускае. Круціцца на сьпіне і глядзіць, глядзіць на нас: ня просьба аб дапамозе (мы для яго адна зграя), а адно страх ператрымаць бот і боязь, што ў яго раптам стрэляць.

Доўга, агідна доўга гэта цягнулася, пакуль нехта не схапіўся за другую нагу: тады толькі адпусьціў. Зубрыцкі хуценька скінуў свае боты і шпурнуў «жаніху»: скачы.

Ня помню ўжо, каму «калёсы» і дасталіся, калі застрэлілі Зубрыцкага. Добры абутак у мёртвых адбіралі, як і зброю.

... Я ня вытрываў, пайшоў нібыта да вядра, вадзічкі папіць. Выглянуў у сенцы: дзядзька, як падвешаны, высока трымаючыся за стаяк-палку, шалёна нешта меле ў жорнах. Але нічога ня сыплецца з латка, ды ці засыпаў ён што, — падобна, што ня зерне, не жалуды перацірае, а мяне і тых парыцкіх паліцаяў, што забралі ў яго касьцюм.

Эх, дзядзька, на цябе б Зубрыцкага!

Выскачыў на вуліцу, кленучы мамчыных сыночкаў, усіх, якія толькі ёсьць, бываюць. І хто ў партызаны такіх бярэ, хто ім вінтоўкі дае?

... — Ох, і выгляд у вас быў, калі цераз шлях ляцелі!

— На вас што, сабак спусьцілі!

— Не, хто малайцом, дык гэта Навічок, глядзіце!

Навічок сапраўды схітраваў — у місе прыпёр сьмятану. Ажно чаравікі, штаны заляпаў, як маляр. А яшчэ ў прыдачу — сякера за поясам. І пілу кінуў на зямлю, аж засьпявала. Вось табе і навічок. А ты? Добра, што ніхто на мяне не зьвярнуў увагі. А яшчэ гэтыя пальцы, што тырчаць з чаравікаў. Нічога, да зімы далёка. Яшчэ дажыць трэба. Як у нас любяць казаць.

Зімою гэта і здарылася. Але не пра боты гаворка. Аднак усё па парадку. Хто ў лесе ня злодзей — дома не гаспадар! Вядомая мудрасьць, сялянская. Ну, а дзе дом партызана? У лесе. Так што ён менш мае патрэбу ў апраўданьнях, чым нават мужык, які такую прымаўку прыдумаў.

Было гэта, калі фронт наблізіўся да самай Бярэзіны. Па той бок ракі наша войска, па гэты — мы, партызаны, а немцы справа і зьлева: у Бабруйску, у Парычах. Дыспазыцыя — як і тады, падчас нашага камсамольскага паходу. Толькі ўжо зіма, і армія побач, а паліцыя разьбеглася, разагнаная, езьдзім за раку, ганяем туды кароў, адабраных у немцаў, паліцаяў (а яны адабралі ў насельніцтва), прывозім боепрыпасы, трафэйныя куляметы нямецкія, амэрыканскія кансэрвы. Такое жыцьцё пачалося. Партызанскае жыцьцё рушыць да завяршэньня, а ў мяне, як раней, — ні аўтамата, ні баранковай кубанкі! На нагах, праўда, боты: мама ўпрасіла атраднага шаўца пашыць — з каровінай сырамяці.

Разьмясьціўся атрад наш у былым паліцэйскім гарнізоне. Паліцаяў — каго забілі, хто ўцёк, а сем'і іхныя засталіся ў вёсцы. У іх хатах мы і пасяліліся. Бульба гаспадыні, яшчэ паліцай нарыхтаваў, мяса, кансэрвы — нашы. Так і жывём у атачэньні дзетак, бацькоў якіх

мы перабілі, разагналі. А яны нашу зброю разглядаюць з нармальным дзіцячым захапленьнем.

Па суседзтву з нашай вёскай, за лясочкам, вёска з такою ж назваю — Коўчыцы, але ўжо — Другія. Альбо: Жыдоўскія. Да самай вайны жыды жылі, 36 сем'яў з 150-ці, хаця многія ўжо выбраліся ў Парычы, у Бабруйск. У калгасе працаваць засталіся пераважна тыя, хто пераражаніўся зь беларусамі. Іх перабілі немцы і паліцаі ў жніўні 1941-га. Наш атрадны шавец якраз з гэтай вёскі, так распавядаў: ягоны хлопчык нёс канькі ў кузьню, пабачыў сусед, паклікаў:

— Ведаеш, аддай майму Кольку канькі, цябе ўсё роўна заб'юць.

Заплакаў хлопчык, уцёк. А той чмур уступіў-такі ў паліцыю, бегаў потым і адлоўліваў суседзяў-жыдоў. У дзядзькі, што сядзеў перад сваім домам, пытае, маўляў, ці ня бачыў нашага суседа Рубіна, куды сваіх павёў? Бачыў, а як жа (а сям'я Бэркі Рубіна ў таго дзядзькі на гарышчы хавалася), у лес уцяклі, куды ж яшчэ.

— Цяпер ты будзеш уцякаць.

Як у ваду глядзеў. Мы перабілі паліцаяў (і ў Беларускіх, і ў Жыдоўскіх Коўчыцах).

А потым франтавыя немцы і ўласаўцы перабілі і спалілі сем'і паліцэйскіх. Ужо не разьбіраліся. Але гэта потым, калі выперлі нас і ўварваліся ў Коўчыцы.

Гэта здарылася праз тры дні пасьля таго, як мяне павінны былі расстраляць — за тое, што сьцягнуў камісараву кубанку. Хто ў лесе ня злодзей, таго не расстрэльваюць.

А здарылася вось што. Усё з тым жа Караткевічам мы патрулявалі з боку лесу, які блізка падступаўся да Коўчыц Беларускіх. Брыдзеш, як воўк зімою, па глыбокім сьнезе, спыняесься, прыслухоўваесься, уяўляючы, як нехта там каля лесу таксама слухае твае крокі і шоргат сьнегу, кашаль дзеда. Ды не, ня воўк ты, а акурат дваровы сабака — першая здабыча воўка.

Замерзьнем, надакучыць блукаць у цемры — за-

варочваем у самы блізкі двор, дзе сьвятло капцілкі альбо лучыны мільгаціць, сагрэцца, а Караткевіч — папаліць чужога самасаду.

У адной хаце затрымаліся крыху. Як было не затрымацца: перад гаспадаром спакусьлівая горка тытуню, крышыць і зьмешвае розныя гатункі на шырокай дошцы — гэта відовішча для Караткевіча. А мой позірк заарканены тым, што вісіць на жэрдачцы побач зь цёплай печкай. Шкурка зь нядаўна асьвежаванага баранчыка. Шэранькая, у дробнае кольца — лепшай не прыдумаеш для партызанскай кубанкі! Дзядзьку яна навошта?

Косячы позіркам, каб ня выдаць, як забілася сэрца, як перасохла ў роце, разглядваю сваю будучую папаху. "Ягнёнка видит он, он к добыче стремится" — ці як там у школе завучваў? Кубанка будзе ня горшая, чым у ад'ютанта, у камісара, ва ўсіх у іх.

Вось так сядзелі мы ва ўтульным цяпле пры лучыне, што патрэсквала сабе, і кожны быў у палоне свайго інтэрасу. Ды калі інтэрас гаспадара хаты і Караткевіча супадаў — прыемна, калі твой мультанчык камусьці падабаецца і вунь як хваляць-расхвальваюць (а гэта наш Караткевіч умее), — дык нашы з уласьнікам авечай шкуркі дачыненьні складваліся выразна антаганістычна. Тое, да чаго памкнулася мая душа, усе мае намеры, не падзеліш па-братэрску. Альбо-альбо. А як нахабна, зь якім выклікам разьвесіў гэткае багацьце проста пасярод хаты! І што ты з гэтай шкуркі вырабіш, дзядзька? Шапку — ці доўга ты ёю пакарыстаесься! Дарэмна толькі старацца будзеш. Ты што: ад'ютант альбо камандзір? Альбо хаця б сабе партызан? Чакай, чакай, а ты як застаўся, ацалеў? Ніводнага мужыка на вёсцы, а ты хто такі? Пэўна, таксама паліцай! Бач, прыгрэўся ля печкі!

Ані дзядзька, ані Караткевіч, што любоўна такуюць над тытунём, не прыкмячаюць мук, пакутаў злодзея-пачаткоўца. (Калі не лічыць калектыўнага, усёй клясай, налёту перад вайною на чужы сад, пасьля чаго я добранька спазнаў, якім грозным і нядобрым можа быць

мой бацька.) Зноў і зноў (у думках) цягнуся рукой да мяккай, волкай шкуркі і суну, суну запазуху (прыгатаваў ужо, расшпіліў паліто). Паўтараю гэта шмат разоў, ушчэнт зьняможаны. Галоўнае, потым спакойна дайсьці да дзьвярэй, ня бегчы.

В о ч ы, я к і я ў б а ч ы л і з л о д з е я, — вялізныя дзіцячыя вочы ў прыцемку за комінам я заўважыў, калі ўжо засунуў шкурку пад паліто. Глядзім адно на аднаго з аднолькавым жахам — я і шасьці-, сямігадовае дзіця. Быццам і там, на печцы, — я. Асуджана прыціснуў адварот паліто і на вялых нагах пакіраваў да выхаду: дзядзька, вядома, таксама заўважыў, усе ўбачылі, увесь сьвет бачыць. Чаму мяне не спыняюць? Вываліўся на мароз усьлед за Караткевічам, пакінуўшы ў хаце сваё ўмольнае: «Дзякую! Да пабачэньня!»

Далей усё адбывалася, як у дурным сьне. Быццам забыўся на сэнс таго, што здарылася, і гэтак, што нават не перахаваў скрадзенае. Так і хадзіў увесь ранак, адчуваючы на грудзях цёплае, мяккае, бы жывое. Калі чаго й баяўся, дык гэта — хаця б на хвіліну расстацца з партызанскай марай, засунутай пад школьнае маё паліто.

І раптам наш каравульны ўзвод гоняць з хаты на вуліцу, строіцца. Анічога такога я не падумаў, стаў у строй, як усе. Занепакоены толькі Рамановіч, бо і ён ня цяміць навошта. Але яму і належыць хвалявацца: зусім нядаўна з камандзіра аддзяленьня стаў узводным. Хутка падышоў да нас камісар, якога суправаджаў ад'ютант. Я адно адзначыў, на гэты раз без ранейшай зайздрасьці, што ў абодвух кубанкі — баранковыя. У камісара — чорная. Прыкінуў, што мая будзе нават лепшаю. Калі такі ж верх зрабіць, цёмны. Сталі перад строем, камісар чагосьці чакае, маўчыць. Ад'ютант у яго за сьпінаю. І тут я скеміў, каго чакаюць. Нарэшце, я зразумеў, што лепш бы мне на сьвет не нарадзіцца. Вядуць нашага дзядзьку ажно двое партызан, як пад канвоем. Выгляд у яго спалохана-вінаваты, ногі ў лапцях і як бы путы на іх, кажушок наапашкі, вось-вось згубіць,

валасы на галаве ўскудлачаныя. Камісар гучна, грозна растлумачыў, што сярод нас злодзей, я дапетрыў большае: у мяне на грудзях шкурка, якая яму належыць, гэта ён аддаў дзядзьку на выраб. У той момант не да грэкаў было, не да спартанцаў, але калі б мне нагадалі пра цярплівага хлопчыка, які схаваў пад кашуляй жывога зайца, а той яму разадраў жывот, — менавіта я мог бы распавесьці, што ён пры гэтым перажыў.

— Калі хто з нашых узяў — расстраляю на месцы.

У гэтым можна не сумнявацца — наш Васіль Юльевіч на расправу хуткі. І мы лічым — справядлівы. Вось тады — Зубрыцкага. А ў блякаду папярэдзіў: хто на пасту засьне — будзіць ня будзем. І застрэліў соннага. А як інакш? Ну, а каб немцы неўпрыкмет падыйшлі?..

І не такая ўжо дарагая яму гэтая шкурка, у яго кубанка ёсьць, няхай сабе чорная. Расстраляе злодзея, які ганьбіць народных мсьціўцаў. І ўсе, хто стаіць поруч са мною, яго зразумеюць. Я таксама разумею. У дзядзькі я проста ўзяў. Як сваё, мне патрэбнае. Хто ў іх ня браў, не бярэ? Але высьветлілася, шкурка — камісарава. Гэта ўжо зладзейства сапраўднае. Я разумею. Вось толькі мама... Шчасьліўчык быў той, каго не пабудзілі. А я павінен буду ўсё бачыць, усё! Як рука адшчоўкне кабуру, як уздыме пісталет — гэта не адразу, гэта колькі ж будзе цягнуцца! Упершыню так моцна перажыў адчуваньне, якое назваў бы сьмяротным сорамам. Тое, што злодзеем памру, і мама з гэтым вернецца дадому пасьля вайны, — гэта першае. Але гэта ня ўсё. Перажыў с о р а м  с ь м е р ц і. Непрыгожы чалавек, які памірае, і ён міжволі саромеецца сябе. А тым больш той, каго публічна забіваюць.

Вось з гэтым складаным пачуцьцём, а не з адным толькі сорамам за крадзеж альбо страхам сьмерці чакаў я, калі дзядзька мяне пазнае. Менавіта дзеля гэтага яго сюды прывялі. Ён стаіць нейк на адной назе, так яму тут няўтульна, не па сабе, усяго яго скурчыла, як бусла на балоце ў холад. Нібы ён і ёсьць злачынца.

— Глядзі — хто! — рэзка, адрывіста кажа камісар. — Пазнаеш?

І калгасьнік пайшоў уздоўж строя. Бы ганаровы каравул прымае — так каму-небудзь магло здацца, каму было весела. Што пазнае мяне, нас з Караткевічам (мы і стаім поруч), я не сумняваюся і чакаю імгненьня, калі дабрыдзе дзядзька да мяне, спыніцца, магчыма, нічога ня скажа, а толькі азірнецца па-сабачы на начальства, як на паляўнічага...

— Расстраляю злодзея на месцы! — ня можа стрымаць гнеў камісар. Дзядзька ажно спыніўся, умольна на нас усіх і на камісара пазірае. — Шукай, шукай!

Здагадваюся, што камісар, няхай сабе і міжволі, але ўратаваў мяне ад ім жа абяцанага ганебнага канца — вось гэтым напамінам пра расстрэл. Дзядзька ўжо ішоў, як сьляпы, глядзеў на нас і ня бачыў, такія ж сьляпыя ад жаху вочы сьлізганулі і па маім твары (я яму жаласна ўсьміхнуўся). Амаль радасна, з палёгкай дзядзька паведаміў:

— Не, тут няма. Я ня бачу таго.

— Добранька паглядзі!

— Я вам вярну, я знайду другую шкурку, адкуплю. — І жаласна папрасіў: — Даруйце!

Камісар сярдзіта махнуў рукой і павярнуўся ісьці. Ад'ютант важна пастаяў перад намі замест яго, важка пагразіўся на нас пальцам і засьпяшаўся ўсьлед за начальствам.

— Даруйце! — паўтарыў дзядзька, запытальна глядзіць: ці можна яму ісьці? Павярнуўся і амаль пабег па засьнежанай вуліцы, ногі ў лапцях правальваюцца, сьлізгаюць, ён узмахвае рукой, быццам працягвае гаворку з самім сабою.

Хутчэй, хутчэй вызваліцца ад гэтае гадзіны! Прытрымліваючы каўнер паліто, я азіраюся, куды пакіраваць. Караткевіч, які чамусьці не адстае ад мяне, абыякава так пацікавіўся:

— Ты куды схаваў?

Дык ён ведае?! Ён адразу ўсё скеміў, як толькі зьявіўся наш дзядзька. Стаяў поруч і ўсё ведаў. Я паказаў на грудзі.

— Што, пры сабе трымаеш? Ну, рызыкант, я табе скажу! А так спакойна стаяў. У мяне і то ногі дрыжалі.

Во якім героем (куды таму спартанцу з зайцам) цябе пабачыў Караткевіч. Было ліха, дый пагоршала.

Прыкідваючыся, што па патрэбе туды кіруюся, зайшоў за пуньку, руку ўкруціў ў халодную зьляжалую кастрыцу, якою ўцеплена сьценка, прасьвідраваў, прадраў ямку і пасьпешліва сунуў сьмяротны доказ туды.

Выратаваў мне жыцьцё і ў мяне даравання папрасіў: «Даруйце!» Не ў кагосьці, а ў мяне. Дзе ён потым апынуўся, мой дзядзька, што сталася зь ім? Якое ў яго жыцьцё было? Калі мы перамаглі.

— Ох, і выгляд у вас быў! За вамі сабакі гналіся? — усё ніяк не нарадуюцца на раскошны сьняданак нашы нахлебнікі. Расхапалі праснакі, хлеб, крынкі з малаком, рукамі заграбаюць тварог і сьмятану, а на сякеры, пілы — нуль увагі. Гэта адразу заўважыў Рамановіч:

— Лепей кашкі не дадай, адно на работу не ганяй! Ну, добра, зьеў, ня зьеў — паехалі. Так, хто сякеру, хто пілу — парамі. Сьпілавалі слуп — сячы дрот. Забірай шырэй, каб па тры, па чатыры слупы дасталося. Пры кулямёце застаемся: я, вось ты і вось ты.

І як пры масавым забегу — рванулі зь месца. У кожнага бегуна, акрамя вінтоўкі, яшчэ і сякера альбо піла. Піла ажно вые, зьвіваецца ў руцэ: Ванечка (зноў свайго «другога» адпусьціў камандзір) яе трымае над галавой, як толькі шыю сабе ня зьнясе. Мой напарнік — Навічок, у яго піла, у мяне сякера.

Вось мы на дарозе, топчучы танкавую рабізну на пяску, акружаем слупы, хто да якога дабег, бярэм іх у палон і: шах-шах-шах!.. Навічок робіць самы вялікі агрэх няўмелага пільшчыка: пілу і цягне, і штурхае ад сябе, стараецца мне памагчы, а яна ў яго гнецца, і мне толькі цяжэй.

— Ты не штурхай, так толькі горш. Піла павінна сама ісьці, — павучаю яго акурат так, як калісьці дзядуля мне.

Хоць тэлеграфныя слупы з балотнай сасны, пілавіньне жоўтае, труха, але піла тупая, кепска разьведзеная, а яшчэ напарнік такі — гэта табе не сьмятану місамі цягаць! Хоць тут адчуваю сваю перавагу перад гараджанінам.

Сьпілаваны слуп завіс на дроце, не дастаў да зямлі, гойдаецца, як аловак. Э, чорт! Добра, другі звалім — лягуць.

Сьпілавалі другі слуп — завіс, затое першы ўжо на зямлі. Я бягу да яго абсякаць дрот. Найперш — па кубачках з парцаляны, як па зубах, абушком! Во гэтак вам, а вы пазваніце, пагергечыце ў тэлефон! На зямлі дрот не сячэцца, камень падкласьці. Даруй, дзядзька, што так з тваёю сякераю, нічога не папішаш: вайна, матка! — як немцы кажуць, ловячы куру на вачах у гаспадыні.

Другі слуп павалілі, трэці — толькі пілавіньне пырскае з-пад пілы, разьлятаюцца з-пад абушку белыя, парцалянавыя пырскі. Гэтыя кубачкі парцалянавыя на слупах магнітам прыцягвалі заводзкіх падшпаркаў, столькі разоў цалялі ў іх з рагаткі. І во — дабраліся. Сьмерць нямецкім акупантам!

Калі пілуеш слуп, міжволі глядзіш на чаравікі напарніка, засыпаныя жоўтым пілавіньнем. Дабрэнныя чаравікі! І ўся экіпіроўка што трэба. Галавой думаў, калі зьбіраўся ў партызаны. Ня тое што іншыя: там, маўляў, на дрэвах растуць пірагі-боты-аўтаматы! А потым бегаюць, вытрашчыўшы зенкі: дзе б раздабыць! Ён жа са сваёй вінтоўкаю прыйшоў (скраў у п’янога паліцая), затое не давялося, як мне, прыдуркам ішачыць на кухні. Яго касьцюмчык, ягоны плашчык і гэтыя моцныя армейскія чаравікі нават нядобрыя думкі абуджалі ў нашага асабіста. Сям’я, кажаш, зьбірала, мама, бабуля! А ня дзядзька нямецкі?..

Працуюць хлопцы ўжо ву-уньдзека — каля

дальніх слупоў. Перабягаюць зь месца на месца, махаюць сякерамі.

Амаль вярсту слупоў уклалі ў бок Парычаў і гэтулькі ж — у бок Бабруйску. Нейкія людзі, павозкі рухаюцца, маячаць на шляху воддаль, але да нас не набліжаюцца. Чалавек цяпер хутка чуе, дзе сьпее бяда. Толькі мы, падобна, на час страцілі гэтае адчуваньне: энтузіязм, азарт працы-руйнаваньня — ён бывае больш гарачы за ўсякі іншы. Вядома: ламаць не будаваць. Эй вы там, пагаманіце, даўно не гаманілі па сваіх дратах!

Першы стрэл, першая кулямётная чарга, калі лупяць па табе, заўсёды аглушаюць нечаканкаю. Удар грому, а ўжо затым пасыпалася, як дождж па даху з бляхі.

З-за горкі за першай выскачыла другая машына, яшчэ і яшчэ. І адразу падзелены сьвет, падзеленая прастора: зона нямецкая, зона партызанская — памкнуліся адна насустрач адной. Тое, што адсунута было па часе, раптам сышлося, адразу зблізілася — быццам перагародку прыбралі.

«Партызаны рагаталі, уцякаючы», — такая ж фальшывая мэтафара, як і «мора сьмяялася». Не да сьмеху, што й казаць. І ўсё ж забаўна было назіраць, як нехта ўсё яшчэ ня кідае пілу і бяжыць, змагаецца зь ёю, як з штандарам, што ўпіраецца на вятры, — ды гэта ж зноўку Ванечка! Во дзівак. А Цыбук штурхае ў сьпіну, дапамагае старому Караткевічу, які бяжыць па сыпучым пяску, буксуе на месцы.

Будзе потым вясёлых згадак: хто як даваў лататы. Ногі мае, ногі, нясіце маю... жэню!

Унё як Ванечка колам пайшоў! Закуляўся па зямлі цераз галаву. Што ён вырабляе: параніцца пілою!

І толькі тут сьцяміў, убачыў: не цыркачом пакаціўся, а зусім па-сабачы. Як бывае, калі ў сабаку ўлепяць увесь зарад, проста наляту. Ватоўка ягоная адразу забялела і тут жа чырвонымі плямамі заплыла — шматкі выдранай ваты. Быццам і сапраўды піла зубамі прайшлася па ім.

Ужо б'е ад лесу наш кулямёт — Рамановіч. Туды трэба, туды, але Ванечка ляжыць паміж тваім паратункам, лесам, і табой — не абмінеш. Цыбук да яго паўзе, а ўжо ён тым больш не адчуе задавальненьня — убачыць сьпіну «прыдурка», які ўцякае. Я дамчаўся да Ванечкі раней, чакаю Цыбука і маю права ўжо ім пакамандаваць: сюды давай, хутчэй!

— Ваня, ты што, Ваня? — гучыць голас Цыбука так заклапочана, што я адразу забыўся на ўсе свае крыўды, якія цярпеў ад яго. Мусіць, і да мяне вось гэтак зьвяртаўся б. Я ўжо люблю яго, я ведаю: калі і па мне пройдзе чарга (у любы наступны міг можа здарыцца), ніхто, якім бы я дарагім ім ні быў (мама, брат), ніхто ня будзе «выносіць мяне з бою», а менавіта ён, раней самы непрыемны мне чалавек. Вось як мы зараз Ванечку. Я падхопліваю за ногі, а трэба яшчэ і вінтоўку ягоную забраць, цяжка, нязручна несьці, а нас абсьвістваюць кулі, то з аднаго, то з другога боку, хочацца ўпасьці і не ўставаць, але Цыбук прэ наперад, як танк, і трэба пасьпяваць, і няма калі баяцца. Каля лесу ахнуў выбух, другі, ну во, у іх і мінамёты, самае паршывае. Кулямёт наш вышукваюць, намагаюцца накрыць: занепакоіліся — дабегчы, давалачы цяжэразную ношу да лесу, а там ужо радавацца, што ты жывы.

Навічка я пабачыў, калі ў нас, што страцілі апошняе дыханьне, перахапілі, забралі акрываўленага Ванечку. Наш Навічок ляжыць на зямлі, дзіўна нерухомы, калі ўсе мы нецярпліва рвемся бегчы далей углыб лесу. Рамановіч стрымлівае: ня ўсе сабраліся. Ванечка, чыёй крывёю мы з Цыбуком усе вымазаліся, ляжыць аблеплены пяском, быццам дзёгцем, а Навічок — чысьценькі, ані плямачкі. І толькі цёмная палоска каля вуха.

— Міна. Маленькі такі асколачак. Быў Ільлюша і няма, — зьдзіўлена кажа ціхі хлапчына ў лапцях, у сьвітцы. Нават ня ведаю, зь якога ўзводу. Гэты ўжо зусім вёска.

Дык яго Ільлюшам звалі? А мы ж яго: Навічок,

Навічок. Што яму цяпер скажаш, такому мёртваму. Пра што наогул гаворацць зь мёртвым школьнікам? Я бачыў, чуў, як вясковая старая брату свайму ў труне, такому ж старому, расказвала пра іхнае агульнае маленства, і гэта было так дарэчы, зразумела. А што, пра што расказваць Ільлюшку? Пра старасьць, якой ня будзе?

Чаму забілі менавіта яго? Скажуць: навічок, нявопытны. Ды толькі гэта аблуда, што забіваюць навенькіх часьцей, чым шматвопытных, абстраляных. Я ж перакананы: у кожнага ёсьць набор удач, накшталт набору храмасом. Зрасходаваў — нішто цябе не ўратуе, ніякая шматвопытнасьць, асьцярога. Сустракаюцца людзі з адной «храмасомай удачы», мабыць, і Навічок з гэткіх. Але «малахрамасомнаму» можа пашанцаваць, калі яго шанцы будуць раздробленыя — на раненьні. Спытайце ў тых, каго шмат разоў параніла. Перакананыя: павінны былі забіць, але пашанцавала. Раненьні заўсёды «замест». Раненьні не скарачаюць, а падаўжаюць жыцьцё. Павінны былі забіць... Па-сапраўднаму сьмерці не баяцца тыя, каго ні разу не падстрэлілі. А цюкнула — вось тут і паверыш, што таксама сьмяротны. І атрымліваецца насуперак распаўсюджанаму меркаваньню, што бывалыя байцы бясстрашныя. Ды не, менавіта той, хто страціў шанцы, гэта значыць бывалы, і пачынае разумець, што такое баяцца, што вось той бой ужо абавязкова апошні ў ягоным жыцьці. Даруйце мне, бывалыя, і пацьвердзіце.

Ванечка і гэтым разам адбыў раненьнем. (Ён зусім нядаўна ляжаў у санчастцы.) Але на гэты раз яго размалявалі, як ніколі раней. Калі перавязалі, нельга было зразумець, што ў яго ацалела, не кранута. Усе індывідуальныя пакеты, у каго толькі былі, патрацілі. Усе азіраюцца на насычаны крывёю брызэнтавы плашч Рамановіча, які ў нас замест насілак: ці жывога нясем?

А Навічка мы пахавалі на лясной палянцы. Спачатку несьлі абодвух. Мяняліся часта: да чаго ж цяжкі чалавек мёртвы. У лесе пераначавалі і далей панесьлі

толькі Ванечку, дыхае ён часта-часта, у грудзях хрып, бульканьне — вось-вось усё абарвецца.

Каму не пазайздросьціш, мы гэта разумеем, дык гэта Рамановічу, нашаму камандзіру. Група і зьдзейсьніць нічога не пасьпела, а двух страцілі (Ванечку, падобна, нам не данесьці жывым). Але хіба вінаваты Рамановіч: калі адбіраў нас у сваю групу, мы ж яму даведак не давалі, у каго колькі «храмасом», шанцаў ацалець.

— Хлопцы, ну і ну! Цур, мой, я знайшоў!

Гэта Панасевіч, наш Цыбук, гарлае. Ён адыйшоў убок па патрэбе і во кліча нас паглядзець на нейкае дзіва. Не дарэмна шыя ў гэтага дзецюка (таму і «Цыбук») заўсёды выцягнутая, як у важака чарады, самае цікавае першы заўважае.

— Глядзіце, які ў мяне конь! — усё стараецца нагадаць, чыя знаходка. Як быццам, калі ўжо на тое пайшло, яму дастанецца. Ні каня, ні пісталета не-камандзірам, не-разьведчыкам, не-ад'ютантам у нас нельга мець. Нават калі твой трафэй, нават калі ў часе бою ўзяў.

Так што ня мылься — галіцца не давядзецца. Але, праўда, цуд, а ня конь. Шэры, як воблака, што раптам апусьцілася ў змрок лесу. А па сьпіне, па крыжы — чорная палоса. Вось гэтак напрадвесьні адтае самы верх засьнежанай страхі. І грыва падцененая. А нам хаця б якога, хаця б калгаснага працаўніка-дахадзягу. Рукі абарвалі валачы параненага, ды й яму, пэўна, лягчэй будзе, нашаму Ванечку, ня так балюча. А тут пры кані яшчэ і павозка. І збруя ўся як на падбор. У непацёртым яшчэ, фіялетавым лазовым кашы ўлёгся, што пан, новенькі хамут з шляёй. Шчодра адштукаваны меднымі бляшкамі. І сырамятныя лейцы, аброць, сядзёлка — усё новае, з блёсткамі. Прыхінутая да кола дуга пафарбаваная ў зяляніну і (паверыць немагчыма) званочкі на ёй паначапляныя. Што нас ужо зусім даканала: сьпіцы і калодкі калёсаў таксама пафарбаваныя.

— Дзе нявеста, павінна быць яшчэ нявеста! — лямантуе Носаў. — Шукай, Цыбук.

— Разгалдзеліся, як цыганы на конскім базары, — бурчыць Рамановіч. Але і ён таксама, усе мы любуемся на шэрага зь цёмнаю палосаю па крыжы прыгажуна, кімсьці схаванага ад чужога вока (і конь, і павозка спушчаныя ў яму-роў, што, мусіць, застаўся яшчэ з 41-га, у такіх машыны, танкі, а, здаралася, што і коней хавалі ад бамбёжак). Перад мордаю ў прыгажуна раскіданая па зямлі трава-асака, зусім сьвежая, зялёная. Разгледзелі нарэшце і хібу: на левым сьцегняку каня — вялізны шнар, рубец, падобна, ад бомбы. Адразу згадалася, што ў першае лета вайны на Палесьсі дзейнічалі цэлыя конныя дывізіі, зьбітыя з пазыцыяў, зрушаныя, як лістота з дарогі, танкавымі, матарызаванымі нямецкімі клінамі, што распаласавалі Беларусь і Ўкраіну.

— А божачкамойбожачка! — пачулі раптам жаночае галашэньне аднекуль з кустоў. — Абедныяжмыбедныя!..

Да нас пакіравала захутаная ў нейкую посьцілку постаць, мяркуючы па падранай спадніцы і босых нагах, — жаночая. Пакуль нясьмела набліжалася, усё нам паведаміла сваім выцьцём-галашэньнем: і як яна «з таткам» лячыла-ратавала коніка ад ваўкоў і нядобрых людзей, і якая страшная «болька», рана, была ў яго, і як ёй адной у лесе «жудасна».

— Твой, ці што «пасаг»? — не паверыў Носаў. — Цыбук, вось і нявеста. Цур, твая!

У бабы твар (ледзьве выглядвае з-пад посьцілкі-хусткі) брыдка распух, мусіць, ад укусаў балотнае машкары, камарыных. Як уключылі яе — зноўку загаласіла:

— А травамі ж, лекамі абмывалі яго! Думалі ж — на жыцьцё. Усіх зьнішчылі, усіх. Па сьпіцы татка зьбраў, па раменьчыку — усё прахам! На сьмерць, атрымліваецца, зьбіраў.

— Ну і дзякуй татку твайму, — ня вытрымаў Ра-

мановіч, — і досыць. Бачыш, бяда ў нас? Хлопца кулямі пасеклі.

Цётка, бачна, не хацела ні чуць, ні заўважаць нічога нашага. Бачыла і аплаквала сваё.

— А вы ж, хлопчыкі, ня крыўдзіце нас, сірот!

— Пакрыўдзім, будзь спакойная, цётка. — Цыбук ужо бярэцца за хамут, перабірае лейцы. Носаў спрабуе павадзіць каня: ці моцна кульгае?

— А ён жа калека, а ён жа няздатны на вялікую дарогу! — пераконвае нас цётка.

— Во як сьпявае, во як сьпявае! — ужо злуе Цыбук. — Разумець нічога ня хоча. Бачыш, паранены ў нас! Табе зразумелаю моваю кажуць!

Караткевіч умяшаўся:

— Мы табе яго вернем, цётка. Мы толькі да вёскі, там другога каня знойдзем.

— А вы ж абманваеце, а вы ж лжаце!

— Лжаце, лжаце! — ужо злуецца Цыбук. — Ты б чалавека так шкадавала, як гэтую падлу!

І адсунуў цётку плячом, бо яна ўжо спусьцілася ў яму, ужо схапілася рукою за вазок. (Што ў яе з рукамі? Чырвоныя, бы ашпараныя. Ня рукі, а гусіныя лапы, як бы нават зь перапонкамі.)

А што далей адбывалася, помніцца, як нешта брыдкае і безвыходнае. Конь, павозка патрэбныя ня нам, параненаму, а баба анічога ведаць ня хоча, хапаецца, пакуль мы запрагаем каня ў павозку, сваімі страшнымі рукамі то за аброць, то за вазок, крычыць-галосіць. Цыбук яе адштурхнуў проста ня мяне.

— Трымай гэтага чорта!

І я абхапіў бабу абедзьвума рукамі, утрымліваючы, пакуль павозка адыходзіць, пераваліваючыся на купінах, чапляючы фарбаванымі ступіцамі за сосенкі і чамусьці пазвоньваючы. Ах, гэта званочкі на дузе. Трэба было б зьняць. Раптам адчуў, якое худзенькае, д з я в о ч а е цела я абдымаю, калі яно забілася, як птушка, у руках у мяне. Напалоханы быў сьмяртэльна. Вочы

ў вочы з жанчынай, і я яе абдымаю: посьцілка-хустка спаўзла з галавы, адкрыліся ўзлахмачана-рыжыя валасы, твар пачварна распухлы, але вочы — чыстыя, гняўлівыя, як быццам пазналі мяне:

— Адыдзі! Дурань!

Адпусьціў рукі, яна паспрабавала здагнаць павозку, я ўсё ж устаў у яе на дарозе. Зь якою пагардаю да майго ваяўнічага выгляду яна паўтарыла:

— Пусьці, дурань.

Голас нават знаёмы! Я разгублена адступіўся ўбок. Яна пабегла ўсьлед за павозкаю, але Цыбук раптам скіраваў на яе вінтоўку:

— Кулі не пашкадую. Раз мовы не разумееш.

Спынілася, бы ачнулася. Я абышоў яе, як саляны слуп, кінуўся здаганяць сваіх.

Мы адыходзілі праз лес: дарога раптам зьнікала, зноў на шляху ў нас зьяўлялася балота, даводзілася вазок з параненым цягнуць ледзьве не на руках. А конь, як знарок, стаў прыкульгваць. Ды яшчэ гэтае пазваньваньне. Нехта прапанаваў анучаю абматаць дугу (проста сарваць бязглуздыя званочкі нам чамусьці шкада). Раптам Ванечка спытаў, не расплюшчваючы вачэй:

— Мама, гэта на гары звоняць? Цішэй, мама, чуеш?

Хацяб да вёскі конь дацягнуў. Ужо зусім забыліся пра чортаву бабу (нават рукі мае ацяжэлыя яе сталі забываць), як раптам сярод жытнёвага поля Караткевіч выгукнуў. Як бы нават у захапленьні:

— Не, вы гляньце, не адстае цётка!

Ужо зь непакрытай галавою, трымаючы яе па-дзявочы высока, брыдзе праз жыта ўсьлед за намі, неадступна, як наканаваньне.

# РАЗЬДЗЕЛ ДРУГІ

*У той жа дзень двое зь іх ішлі ў сяло,*
*што ў шасьцідзесяцёх стадыях ад Ерузаліму,*
*званае Эмаўс,*
*І гутарылі між сабою аб усіх гэтых здарэньнях.*
*І сталася, як гутарылі яны ды разважалі між*
*сабою, вось Сам Ісус, падышоўшы, пайшоў зь імі;*
*але вочы іх былі стрыманы, дык не пазналі Яго.*

*Паводле Лукі, Сьв.Эвангельле, 24:13-16.*

... Сьпіна ўсё яшчэ балела — там, дзе калісьці прыліпла да абпаленай скуры расплаўленая і зацьвярдзелая, як асфальт, каса, чужая і цяжкая, быццам палена падвешана ззаду. Распаленае палена. Адна, адна засталася ў цэлым сьвеце. Адабрана адзіная жывая і радасная істота, якая ў яе яшчэ была. Каня гэтага, Шэрага, з бацькам хавалі аж два гады і ад немцаў з бобікамі, і ад партызан.

Агульная іх сям'і таямніца, любоў і надзея. Вечарамі пры запаленай лучыне, калі здавалася: дзень, хвала Богу, пражыты, ну, а начныя людзі, партызаны ў бацькі ўсе сябры застольныя, не пакрыўдзяць, — у такія вечары ўсёй сям'ёй летуцелі, як будзе пасьля вайны. Калі ў іх будзе свой конь, багатая збруя і ўсё, што трэба, у гаспадарцы будзе. Бацька падоўгу распавядаў, як ён пачынаў жыць, калі яшчэ дзед гаспадарыў і наогул было інакш. Аб гэтым распавядалі і прыгожыя малюнкі-плякаты на сьценах, прымацаваныя зьверху шпалераў. (Бацька часамі спыніцца сярод хаты, азірнецца: «Ну, хата-чытальня, нічога ня скажаш!») Дзеці (і Вэнэра таксама) любілі гэтыя малюнкі на сьценах, часта іх шумна разглядвалі: вялікія-вялізныя пчолы, прыгожыя рамачныя вульлі, сьмешныя, пацалаваць хочацца, круглыя «пятачкі» тлустых парсючкоў каля белай, як цёплая печка, мамысьвіньні, добрыя морды кароваў, ну, а шэры конь у табуне іншых харашуноў выклікаў самае вялікае захапленьне: «Гэта наш Шэры!» Вэнэры асабліва падабаліся ходзікі з каляровым, яркім, як навагодняе сьвята, цыфэрблятам. На ім жоўтае-жоўтае ад пасьпелага жыта поле, селянін з такімі ж жоўтымі вусамі і снапом у руках, а ўнізе — трактар з чырвоным сьцягам.

— Як у таткі вусы! — Малыя ніколі не забудуцца наноў зьдзівіцца такому радаснаму падабенству.

А за абразом схаваная была газэта «Камуніст», на якой ужо і сапраўды быў паказаны бацька. Фатаграфія кепская, брудная, як і ўсе літары, але дзеці ведалі, што гэта іх татка зь дзедам, зноў і зноў патрабавалі ім паказаць і пачытаць, што напісана: «Бацька і сын Станкевічы зь вёскі Ўюнішчы наладзілі культурную гаспадарку». Бацька і сам зь цікаўнасьцю разглядваў газэту, па краях абарваную на курава, не-не ды й скажа:

— Была б нам культурная гаспадарка, калі б дзед ваш, Госпадзе, супакой яго душу, не надарваўся ў лесе і не памёр. Раскулачылі б, як піць даць! Ён бы не аддаў

усё гэтак лёгка, як сынок. Я зь імі мог размаўляць, а ён ня ўмеў.

Згарэла ўсё, усё спалілі немцы, усіх! І навошта толькі яна выратавалася, навошта ёй жыць, Вэнэры? Прыпадала да морды Шэрага, ён нэрвова, цяжка дыхаў ёй на рукі, у мокры ад сьлёз твар: хоць адна жывая на сьвеце істота ведае і разумее, як ёй ня хочацца, немагчыма жыць!..

А тут гэтыя партызаны — адабралі, павялі й яго. Асіряцілі Вэнэру канчаткова. Яна пацягнулася сьледам і, няхай што хочуць робяць, не пакіне свайго Шэрага. Распухлага твару яе ніхто не пазнае, а гэта ж знаёмыя партызаны. Яны бывалі ва Ўюнішчах, сяго-таго зь іх помніць яна. Не, ёй ня трэба, каб яе прызналі, ёй балюча, яна саромеецца сябе такой, якой яна стала, якой зрабілася. Гэты твар, гэтыя рукі...

Шэрага бацька знайшоў, калі мужыкі расхапалі кінутых у лесе і на дарогах, пакінутых Чырвонай Арміяй коней. Калі разьбіралі калгасных дахадзяг. Нікому ён не патрэбен быў — конь з распаласаваным асколкам сьцегняком. А вось бацька ўзяў, нешта ён убачыў, разгледзеў у няшчасным калеку з гнілою страшнаю ранаю. Тлумачыў так:

— Стаіць і, як чалавек, глядзіць, мухі, заядзь гэтая, проста ратунку няма, а вочы, ну, проста чалавечыя: «Мне кепска, мне вельмі кепска!..» А харашун, калека і ўсё адно — харашун!..

Мужыкі-суседзі пасьмейваліся: столькі здаровых, нармальных коней, а Станкевіч унё інваліда падабраў! Узяў бацька і калгаснага коніка, але ўся ўвага, клопат былі Шэраму. А калі падлячыў, сталі з зайздрасьцю на яго пазіраць. Ды аб'явіліся партызаны, паліцыя — не абыйдуць увагаю! — адвёў Шэрага ў лес, стажок сена накасіў, па чарзе з Вэнэрай наведвалі яго. Вёсцы растлумачылі: прыйшлі, маўляў, ноччу нейкія, забралі. Колькі клопату і трывог даў Шэры, але і радасьці жывой колькі! Ня раз знаходзілі поле бітвы на тым месцы,

дзе ў лясной кашары яго хавалі. Стаптаны, парыты капытамі дол, зламаныя, памятыя дрэўцы: падыходзілі ваўкі. Але Шэры ня даўся ім. Бацька, замучаны трывогай, ня раз бег да яго на дапамогу: ледзь што прысьніцца — бяжыць. Маці проста змарнела са страху за яго, за ўсіх. Але ў маці гэта быў заўсёдны, вечны стан: страх. Нават у спакойныя часы. Бацька, бывала, возьме яе, як малую, на рукі, трымае, не выпускае:

— Не, ты скажы! Чаго ты баісься, растлумач, чаму ты заўжды баісься? Нічога ж не здараецца, што гэта з табою?

Бедная мама, бедны бацька — ведалі б яны, што зробяць з намі! Зь імі.

Бацька быў упэўнены, што ўжо ён дык не аддасьць у рукі бядзе сваю сям'ю. Адаб'ецца, як Шэры ад ваўкоў, — ня раз пра гэта казаў. А мама ад гэтых размоваў яшчэ больш баялася. Адразу пачынала дрыжаць, калі бацька нас усіх і яе саджаў у цагляны склеп у халоднай палавіне дому альбо ў зямлянку-хованку ў гумне, «каб прывыклі». Як малы, гуляў зь дзецьмі: прыйдзе ў гумно — снапы жыта, сена, што яшчэ бачыце? Нідзе анічога. Адкоціць убок сноп, другі, падыме плаху — глыбокая нара ў зямлі, пад сена.

— Дык згарым жа, на вугалькі, о божа! — стогне мама.

Але бацька, ня быў бы гэта ён, падрыхтаваў не адну, ня дзьве, а цэлыя тры хованкі (ня лічачы склепа). Адну — там, дзе і іншыя аднавяскоўцы рабілі, у сухім бары з добрым падлескам. Кожны рыў патаемна ад усіх, па начах, прыбіраючы сьляды жоўтага пяску, маскіруючы лаз імхом, галінкамі, як толькі ні хітравалі. Але як не пахваліцца перад суседам? Вось і бацька прывёў да сваёй хованкі кульгавага касавокага Камая, па мянушцы «Самаед»: ну, дзе, адшукай? Знайсьці ня мог, тупаў, кульгаючы, круціўся, хапаў сасёнкі за чубы, думаючы, што пасаджаныя, — бацька радаваўся, як дзіця. Адвярнуў сасновы пень і гэтым жа адчыніў дзьверку

на завесах, ад куфра яе бацька ўзяў, прыстасаваў — на роўным месцы, не заўважыш. А як пад зямлёю ўсё акуратна зроблена: прыступкі, палічкі, ёсьць дзе сесьці і нават легчы. Цешыўся татка, як нашы малыя, — мама горка плакала, гледзячы на гэтую іхнюю радасьць. Але найбольшы гонар бацькаў была трэцяя зямлянка: у бярозавым гаёчку, густым, як шчотка. Вось пра тую ён нікому ані слова, на яе спадзяваўся асабліва. Ніякія немцы не папруцца туды з сабакамі, заблытаюцца са сваімі павадкамі. А ўжо як замаскаваў, як усё зручна зрабіў — дзяўчаткі і асабліва Антончык ня раз прасіліся: адвядзі іх зноўку «ў бярозкі».

— Ды ты ня бойся, — тлумачыў маме, — якая нас аўчарка там вынюхае. Там такія пахі: грыбы, ягады, мышы — нос сабачы набок зьверне! Хлопцы мяне папярэдзяць, пойдзем туды загадзя. Ваду паставіў, хлеб, сала — усё нарыхтавана.

Бацька дужа спадзяваўся на разьведчыкаў: ужо ж яны паўсюль шныраць і папярэдзіць не забудуцца, калі што.

Усё, аднак, парушыў незразумелы той атрад. Зайшлі ва Ўюнішчы ноччу, ціха, але патрабавальна пастукалі ў вакенца, потым паторгалі дзьверы. На пытаньне: хто? — адазваліся сярдзіта: мы дык свае, калі ты таксама свой! Зайшлі ў дом: ніводнага знаёмага, апранутыя амаль ва ўсё вайсковае, але наша. Такіх, з іголачкі, Вэнэра бачыла перад самай вайной, калі манэўры былі. Ну, словам, не падобныя на партызан, на якіх нямецкага больш, чым на паліцаях. І зброя не такая, як у мясцовых партызан, не ўсялякае-living рознае, а аднолькавае, і ўсё больш аўтаматы. Абцасамі шчоўкаюць, казыраюць: «Таварыш камандзір! Таварыш зампаліт!»

Вэнэры спадабаліся: культурныя, ветлівыя, рук не распускаюць, не ўжываюць слоўцаў розных, што ад знаёмых партызан ляцяць, як шалупіньне ад семак на вечарынках.

Толькі камандзір сьмешны, такіх на вечарынках

называлі «недамеркамі». Іх усіх мучыла зайздрасьць да хлопцаў, якіх не саромяцца рослыя дзяўчаты. Гэты ж наогул нейкі цудзік: абцасы сабе зрабіў спэцыяльна, каб вышэй быць. Ну, як на жончыных туфлях абцасы.

Пасьля вайны ўжо, толькі праз 25 гадоў, мы спахапіліся і ўзяліся запісваць людзей з такіх, як Уюнішчы, вёсак. Тых, хто ацалеў, каго не спалілі ў сьвірнах, у цэрквах.

Нам жанчыны расказваюць, старэнькія, ім ужо за 70, магнітафон запісвае: Вера Пятроўна Слабада, настаўніца, вядзе расказ, а дзьве другія жыхаркі Дубровы толькі падказваюць, дапамагаюць ёй плачам і самі слухаюць, як бы ня верачы, што самі гэта бачылі, перажылі, было такое...

— Прыехалі й кажуць: ідзіце ў лес, немцы хутка будуць у вас... А людзі, зіма ж, мароз, куды ж ім у лес ды ў каго шмат дзяцей. Не паслухаліся некаторыя. Дык яны назаўтра вярнуліся і тых, хто ў лес ня выехаў, ажно дзевяць сямеек, — усіх пастралялі...

— Чакайце, гэта хто былі?

— Ды хто, партызаны, мы ж кажам. Спэц... гэты атрад — яны сябе называлі. Восемдзесят ці колькі душ, ды зь дзеткамі пастралялі... Вы, кажуць, немцаў чакалі, вы не савецкія людзі.

— Чакайце, чакайце! — усё ня хочам зразумець, паверыць. — Дык гэта ня немцы, не паліцаі былі?..

— Камандзір іхны, як яго... Калайджан, чорны такі, вочы такія, усё крычаў: «Вы — паліцэйскія лазутчыкі, вы ворагі народу, здраднікі!»

Ад мясцовых партызан мы тое самае пачулі. Спэцыяльна распытвалі ў іншых вёсках. І ўсё-ткі не далі ў кнігу. Можна растлумачыць: гэтага нізавошта б не прапусьцілі, 70-я гады. Праўда, але з адной агаворкай. Касэту мы самі сьцёрлі, запісалі на ёй іншы расказ у другой вёсцы, дзе забівалі ўжо сапраўды немцы. Першая думка, пачуцьцё наша (усе трое да таго ж былыя партызаны): ды

калі прагучыць гэты выпадак, усе астатнія нашы запісы, нашы «вогненныя вёскі», дзе немцы і паліцаі «працавалі», нехта паставіць пад сумненьне. А ці ня іх, такіх вось «спэцатрадаў», справа — вашы Хатыні.

Які быў расклад рэчаў у тыя дні: альбо — альбо. Калі і вашы «органы» — зьвяр'ё, значыць, як бы апраўданьне нямецкім карнікам. Сьцёрлі магнітную стужку — факт. А хіба не сьціралі самую памяць, у саміх сабе (ды й цяпер сьціраем): тое, што можам успомніць, — чалавеку проста ня вытрымаць (маці і бабуля зварылі памерлае дзіця, каб накарміць астатніх дзяцей, — у блякадным Ленінградзе). Абаронная рэакцыя? Часткова і гэта...

Мой суаўтар па кнізе «Я з вогненнай вёскі» Янка Брыль спэцыяльна адшукваў сьляды гэтага Калайджана. Па музеях ды публікацыях. Выявілася: прысланы быў з Масквы, бо ў 1942 годзе «камандзіраў не хапала». (Ды й ня вельмі давяралі акружэнцам: з НКВД — надзейней.)

Ваграм Пагосавіч Калайджан, старшы лейтэнант, — вось ён і расстраляў на Віцебшчыне вёску Дуброва. Потым яго адклікалі ў Маскву. Паводле афіцыйнай вэрсіі: судзіць. Паводле перакананьня мясцовых партызан: уцёк сам, за ім ужо палявалі мясцовыя хлопцы. Прынамсі, ніякой за сабою віны не прызнаваў, а наадварот, крыўдзіўся (пасьля вайны ўжо), "выпрошваў узнагароды".

Тое, што адбылося ў нашай мясцовасьці — ва Ўюнішчах, ну проста-ткі сьпісана з Калайджана. І таксама — «спэцатрад».

Вэнэры атрад гэты спачатку спадабаўся, а выгляд камандзіра, які сьмешна падскокваў на высокіх абцасах, проста забаўляў яе. І ён таксама за кожным словам: «пажалуста» ды «спасіба», хаця голас рэзкі, нават вісклівы. Ён усё выходзіў на кухню запіваць нейкія таблеткі. Мабыць, язва мучыла.

Камандаваньне разьмясьцілася, вядома ж, у доме Станкевіча, ну як мёдам намазана там было для іх для ўсіх.

Хто Вэнэры не спадабаўся, дык гэта «таўстун». Яна называла сама сабе так чалавека, які пры камандзіры быў. «Таўстун» нібыта ўсьміхаецца, дабрадушны такі, а загаворыць — і не заўважыш, як ты ўжо быццам і вінаваты.

— Ну як жывём?

— Як і ўсе.

— А ўсе як?

— Жывуць, пакуль жыць можна.

— А хто не дае жыць? Партызаны?

— Чаму абавязкова партызаны?

— Ну а хто больш перашкаджае жыць: немцы ці мы?

Зрэшты, і ў бацькі не атрымлівалася размова, ні з «таўстуном», ні з камандзірам. Ты іх частуеш, ставіш на стол што толькі маеш: нібыта і задаволеныя, калі ўмінаюць за абедзьве шчакі, а ўсё ня могуць каб бяз шпількі: «О, які ў цябе мядок, гаспадар! Вульлі, ці што, калгасныя?» Альбо: «Дом, ну, як у добрага пана!»

Бацька ўжо тлумачыў, тлумачыў: як дзед пачынаў будаваць пасьля рэвалюцыі і як завезьлі ў сяльпо карыты цынкавыя, столькі, што ня ведалі, куды дзець, а ён, бацька, і здагадаўся іх скупіць. Выпрастаў і накрыў дом, атрымаўся такі дах, усім на зайздрасьць.

— Ад партызан неспакою шмат?

Пытае «таўстун», але як бы не для сябе, а для камандзіра, пераглядваючыся зь ім.

Ну што ім адказаць? Што партызаны ва Ўюнішчы днююць і начуюць, свае хлопцы. Вось блякада, гэта сапраўды, яе баяцца даводзіцца.

— Свае, значыцца, хлопцы. Яно і бачна, — нешта сваё мае ў думках «таўстун». І камандзір таксама.

— Значыць, партызан не баіцеся. А немцаў баіцеся? — раптам спытаў.

— Ну, правільна, — ня сьцяміў бацька, — што ж сваіх баяцца?

— Служаць таму, каго баяцца, — паведаміў «таўстун».

А тут са сьцягам яшчэ так атрымалася. Прыбегла ў дом, радуецца Вэнэра, дурніца малая:

— Татка, а ў нас сьцяг павесілі!

І праўда, проста на варотах прыладзілі: чырвоная ануча на палцы. Як, бывала, на сельсавеце. Бацька адразу да камандзіра: акуратна пастукаў сагнутым пальцам па касяку ў дзьвярах, а той акурат выходзіць сваю таблетку запіваць.

— Там вашы хлопцы сьцяг вывесілі...

— У нас няма хлопцаў, у нас байцы.

— Ня варта б гэтага, таварышы, рабіць... Вы ж самі ведаеце, немцы ідуць. А калі даведаюцца?

— Вы лічыце, што мы іх сюды пусьцім?

— Ды ўжо пусьцілі. А беражонага Бог беражэ.

— У вас што, здраднікі тут, данясуць? — вочы палаюць, чорны такі — ад хваробы ці гневу. — Ад каго немцы могуць даведацца? Што ж ня кажаце? Як з такімі быць, мы ведаем.

— Данясуць, не данясуць... Сарока на хвасьце прынясе.

— Не віляйце! Пры чым тут сарока? Ім ужо чырвоны сьцяг перашкаджае. А як савецкая ўлада — таксама?

Пад вечар трывога ўсур'ёз ахапіла людзей: і жыхароў, і асобы гэты атрад. Калі над вёскай завіс нямецкі самалёт — «рама», па ім стралялі, але ён і не зважаў нават. Затым паляцеў. Пад вячэру (Вэнэра накрыла стол на дзесяцярых, яе так папрасілі: «Накрыйце на дзесяць пэрсон») у хату сышліся камандзіры, у сьвятліцу праходзілі, а на кухні цесна і шумна стала ад ад'ютантаў. Толькі перашкаджалі Вэнэры рабіць, як быццам ёй ёсьць справа да іх. Публіка вядомая: адзін перад адным выстаўляюцца. Галоўны ад'ютант камандзіраў

стаяў ля дзьвярэй, каб не заходзілі і не заглядвалі, каму ня сьлед. Паведаміў, падміргнуўшы:

— Чапай думае.

З вуліцы забег малады баец, спытаў, дзе камандзір, але й яго не пусьцілі. Выявілася, што каля лесу перахапілі некалькі жыхароў, спрабавалі пайсьці зь вёскі. Галоўны ад'ютант строга выслухаў, таксама падумаў, як Чапай, і прыняў рашэньне:

— Зачыніць іх, а я потым далажу камандзіру.

Але там, здаецца, пачулі, выйшаў сам камандзір.

— Што там?

Яму растлумачылі. І бацька не стрымаўся, патлумачыў:

— Вядома, баяцца людзі.

— Каго баяцца і да каго пабеглі?

— У лес, хованкі там, а куды ж яшчэ?

— А можа, у паліцыю? Шмат у вас сваякоў паліцэйскіх?

— Партызанскія ёсьць, а пра паліцэйскіх ня чуў.

— Ну дык мы чулі! — камандзір крутануўся на сваіх высокіх абцасах — ісьці. А байцу пацьвердзіў загад свайго ад'ютанта: — Зачыніць!

Тата занепакоіўся, стаў пытаць у ад'ютантаў: вы, таварышы, сапраўды хочаце бой у вёсцы трымаць? Дык спаляць нас на вугельчыкі — гэта ўжо дакладна!

— А мы іх ня пусьцім.

— З намі не прападзеце.

— Вайна, матка!

Прыдурваюцца, ім што! Вэнэры падміргваюць, быццам яна зь імі заадно.

Бацька дачакаўся, калі сталі разыходзіцца камандзіры, і адразу да «таўстуна» (гэты, прынамсі, усьміхаецца, ён накшталт камісара ў іх).

— Ня варта б дражніцца зь імі.

— Гэта з кім?

— Зь немцамі. Калі бой у вёсцы будзе — пераб'юць усіх. Жыўцом спаляць. Яны і бяз гэтага лютуюць, а тут...

— Мы не дражніцца сюды прыйшлі. Запомніце.

Сказаў, як папрасіў. І ўсьміхнуўся. І дадаў:

— Сваім перадайце: ні кроку зь вёскі. Расцэнена будзе як спроба перабегчы на бок ворага. Перадайце.

Але людзі, навучаныя ўсім, што перажылі ўжо, вядома ж, спрабавалі выбрацца зь нечаканай пасткі. Бацька хадзіў, каб папярэдзіць, хто паслухаўся, а хто й не. Тата і сам цішком прыкідваў, як сваіх вывесьці.

А ноччу, пад самы ранак, пачулася кананада, ды так блізенька. І рэдкая стральба — ужо ў самой вёсцы. Бацька кінуўся да дзьвярэй пакоя, дзе начавалі камандзіры, а адтуль выйшаў «таўстун»:

— Нічога, нічога ня здарылася. Вас гэта не датычыцца.

Але калі пайшоў, галоўны ад'ютант, які сабраўся кудысьці ісьці, шчоўкнуў пальцамі ля вуха і патлумачыў:

— Перашчоўкалі паліцаяў.

Бацька чамусьці шэптам перапытаў:

— Паліцаяў? Гэта якіх? У нас тут аніякіх паліцаяў.

— У вас ніякіх, а ў нас значацца.

Усё стала зразумела, і ў гэта паверылі, калі ў дом штурхнулі двух байцоў, а да іх выбег камандзір:

— Здраднікі! Бач, добранькія! Вас за гэтым сюды паслалі? Ну, добра, няхай мясцовыя ўжо. Дык і вы таксама? Камсамол вас дзеля чаго пасылаў? — І распарадзіўся: — Арыштаваць іх! Судзіць будзем.

А раніцою раптам павалілі з дому, зь вёскі, не разьвітаўшыся нават. Жыхары стоўпіліся на вуліцы, усплёскі трывогі — і ад далёкай стралянiны, выбухаў, і ад чаканьня нейкай бяды, якая ўжо здарылася, поруч. Людзі разгублена маўчаць, а іншыя парываюцца бегчы, нешта рабіць.

У хляве людзей няма, невядома куды падзелі арыштаваных. Падабралі нечыя апраткі, дзіцячы чаравік. Але тут зводдаль пачуўся здушаны крык: за калгасным хлевам роў — там крычаць, клічуць. Усе пабеглі.

Рачулка, што цячэ па дне рва, заваленая целамі забітых, вада паднялася, як перад плацінай, і здаецца, што яна ад крыві паднялася. Самае прыкметнае — дзеці. Адзін, яшчэ адзін. Іх больш, чым дарослых. Галоўкі раздробленыя. Твары ўсе ў крыві, страшныя.

Вось тут з мамай і здарылася: нейкае зацямненьне найшло. Што ж, прынамсі, яна анічога, што адбывалася далей, ужо ня цяміла, не ўспрымала. Як пабачыла гэтых дзетак пабітых, як падламаліся ў яе ногі, так і не вярнулася сама ў сябе, зрабілася, бы неразважлівае дзіцянё. Глядзіць ціха, пакорліва, робіць, што ёй скажуць, а сама ані слова і ні на што не адгукаецца. Ужо і плакалі над ёю, ужо і клікалі, малыя клікалі яе — пазірае баязьліва, вінавата. Бацька павёў сям'ю ў беразьнячок, туды, дзе галоўная хованка. Самалёт як праляцеў над Уюнішчамі, скінуў бомбу, абстраляў — усе і кінуліся наўцёкі. Засталіся толькі тыя, што ў рове.

Зьбіліся ў зямлянцы ў адзін камяк, цёмна і душна, а як зачыніў бацька дзьверы над галовамі, пачулі тое, чаго наверсе нібыта і не чутно: уздыхі зямлі ад далёкіх udараў. Ужо і крыкі даносяцца, галасы, сабачы брэх наверсе. Тут і пачалося самае жахлівае: мама стала рвацца наверх, зваць, клікаць дзяцей, яны зь ёю побач, цiснуцца да яе, а яна іх кліча, быццам у тым рове іх кінулі, забыліся:

— Волечка... Антончык... Маня... Вэнэра... Вэнэрачка...

І зноў, і зноў, і анічога немагчыма зрабіць, каб змоўкла. А, Божа, накліча бяду, бацька і так, і гэтак зь ёю, і пужаў бедную, і лаяў:

— Богам-Госпадам цябе прашу, не крычы! Ты ж ворага клічаш, сама. Усе тут, дзеці ўсе пры табе. Во рука твая, іх галовы, во яны! О, Божа, заўжды чагосьці чакала, баялася. Во і дабаялася.

Двое сутак сядзелі пад зямлёю. Бацька прачыняў дзьверцы, і тады добра былі чутны галасы, нямецкія, крыкі, брэх аўчарак, стральба. Але хутка зусім на-

блізіліся, поруч загучалі і стрэлы, і крыкі людзкія, брэх. Дзеці прастуджана кашлялі, ім давалі вадзічкі папіць, пажаваць хлебчыка, каб ня так душыў кашаль. Старанна прыціскаліся ротам да чыёй-небудзь сьпіны. А вось з мамай было ня зладзіць: раптам зноў пачынала клікаць дзяцей, па імёнах. Бацька ўжо і рот ёй закрываў, яна вырывалася, спалохана мычала.

— Што, што зь ёй рабіць? — у адчаі пытаў бацька. Вэнэра, абхапіўшы маці рукамі, худзенькую, маленькую, шаптала ёй ласкавыя словы, упрошваючы супакоіцца, замаўчаць: мы з табою, усе жывыя, усе дзеці тут!

— А ну вы там — вылазь! Гранату кіну! — як гром прагучала наверсе, прайшло скрозь зямлю. І бурчаньне незадаволенае: — Язьві вашу душу, баба гамоніць! Дзе яны тут?

Бацька спрабуе заціснуць маці рот, яна адбіваецца, жаласна мычыць: усё, прапалі! О Божа!

Удары зьверху, глухія, потым па самых дзьверцах, намацалі.

— О, гутэн таг! Прывецік!

Сьвятло ўдарыла ў вочы, аглушыла — грозным воклічам:

— А ну, вылазь давай! Гранату атрымаеце! Доўга вас запрашаць?

Моцныя рукі бацькі адцягваюць, запіхваюць Вэнэру кудысьці ў кут, у пясчаную цьвердзь, а сам ён не сваім голасам — галаском крычыць тым, што наверсе:

— Паночкі, мы зараз, мы выходзім! Дзеці, тут толькі дзеці!

— Лічу да трох!

Вэнэры здалося, што голас наверсе знаёмы. Бацька выбраўся першым, ён, стоячы над ямаю і прымаючы ад Вэнэры дзяцей, спрабуе нешта тлумачыць, гаворыць пра хворую маці, а Вэнэра ўжо разгледзела Мандрыка. Гэта ён, хлопец-баламут з суседняй вёскі, гэта яго быў голас.

— О, наша вам з банцікам! — пазнаў і ён Вэнэру. Як не пазнаць! Колькі разоў спрабаваў «Конік» (за прут-

касьць і худобу такую мянушку яму прыдумалі) выцягнуць яе ў кола, на скокі, калі Вэнэра пачала хадзіць на вячоркі. Вэнэра ж танчыла толькі з аднагодкамідзяўчаткамі, ад хлопцаў уцякала. А потым яго забралі нібыта ў войска — і во ён:

— Добрае месьцейка выбралі. Зьміцер хіцер, але й Саўка ня дурань! Бачыш, знайшлі.

Радуецца нечага, дурань. Але ўжо ня так страшна, калі тут знаёмы, выходзіць да немцаў. Іх чацьвёра, у плямістых плашчах-накідках, адзін трымае за павадок аўчарку: о, Божа, мама зусім перапалохаецца! Бедная, бедная мама!

Тут жа стаіць і дзядзька Камай («Самаед»), пераступае са здаровай нагі на кароткую (на фінскай вайне падстрэлілі), тупае на месцы, вінавата пытае ў бацькі:

— Твая ж хованка ня тут? Я іх павёў, ведаў, што ня тут... Я думаў, наадварот...

— Прывёў, ну і малайчына. — Мандрыку весела. — Будзеш ведаць, як дурняў-немцаў абманваць. — І раптам — бацьку: Гані золата — адпусьцяць. У цябе ёсьць, усе ведаюць. За золата яны што хочаш, не скупярдзяйнічай. — Патлумачыў: — Ім за кожнага партызана заплоцяць па 75 марак. Гэта палічы колькі. Раз, два, тры, о, вас тут цэлы дзясятак. Давай гані, пакуль ня позна.

— Ды адкуль у нас золата? Ты ж ведаеш, як да вайны выграбалі ўсё, падчыстую, у каго што і было.

— Твая справа. Мне не цябе, мне яе шкада.

І паказаў на Вэнэру.

Немцы цярпліва чакаюць, пакуль дамовяцца за іх, ад іх імя. Мандрык махнуў рукою, маўляў, нічога не атрымалася. І тады яны ажылі, заварушылі локцямі, узьнялі рулі аўтаматаў, і, о цуд, толькі цяпер загырчала аўчарка. І як бы ажыла далеч, увесь лес — крыкам, плачам, выцьцём. Вэнэры ўспомнілася, і дрыжыкі раптам ахапілі яе наскрозь: бабы нейк распавядалі пра дзьвюх злоўленых карнікамі дзяўчат. Як мучылі, зьдзекваліся, і як яны на ўвесь лес жахліва крычалі. А

прыйшлі потым людзі туды, пабачылі іх, парэзаных, і пабітыя бутэлькі побач: бутэлькамі што толькі зь імі не вычваралі. («І яшчэ цукерку засунулі», — пра гэта бабы казалі, міжволі прыглушаючы голас.)

Бацька ўсё спрабуе нешта растлумачыць, апраўдацца. Ён нясе дваіх дзяцей, Вэнэра Антончыка схапіла і маму за руку, як малую, узяла, а бацька ўсё паўтарае:

— Каб жа ведаць, што чорная гадзіна наперадзе. А то думалася: ну, ужо горш ня будзе. Усё давялося аддаць. Каб жа ведаць, што яшчэ і гэта на нашу галаву!

Антончык, учэпіста, што клешч, абхапіў галаву Вэнэры, дыхнуць не дае і шэпча, сочачы за аўчаркаю:

— Антончыка не кусай, Антончыка любіць мама, татка...

А мама павісла на руцэ, зь дзіцячым жахам азіраючыся на кожны вокрык, сабачы рык, — Вэнэры няма як пра сябе падумаць. Прабягаючы міма, Мандрык шыпіць-шэпча:

— Прасіся ў Германію. Чуеш! Табе кажу! А то позна будзе.

Выгналі ўсіх на поле, немцы-начальнікі на горачцы сталі, а другія, з аўтаматамі і аўчаркамі, акружылі людзей, іх сабралі ледзьве ня сотню, калі ня больш. Усіх выкалупалі з хованак ды кустоў, Вэнэра многіх аднавяскоўцаў пазнала, але ёсьць і чужыя. Немец з бліскучымі, як з малюнка, валасамі тлумачыць:

— Маладыя паедуць на работу ў Германію. Астатніх забярэм у гарнізон. Там вас не дастануць сталінскія бандыты. Хто ў Германію — на гэты бок.

І паказаў — куды.

Антончык яшчэ мацней, тужэй абхапіў Вэнэру за шыю, быццам адчуў, што варухнулася ў яе душы. А тут яшчэ бацька:

— Ідзі, донька, я зь імі застануся. Ты за нас ня бойся.

І зноў Мандрык, «Конік» пракляты, як чорт закруціўся поруч:

— Дурная, аддай хлапца матцы! Кажу табе, пашкадуеш!

Каб ня ён, Вэнэра, магчыма, і паслухалася б бацьку. А тут спрацавала вясковая дзявочая ўпартасьць: бач, прыстаў! Ведае яна, што ў такіх у думках. Каб адарваць ад бацькі, ад маці, а там ужо сябе пакажа. Плачу, крыку пабольшала. Немцы ўжо страцілі цярпеньне, кінуліся ў натоўп і сталі выдзіраць, адкідваць убок, хто пад руку трапіцца. Але тады і тыя, хто ўжо быў адабраны «ў Германію», занепакоілся, спалохаліся і пабеглі назад да родных — такое ўзьнялося, пачалося! Немец у акулярах вырывае з рук Вэнэры браціка, цягне яго, разрывае, твар у Антончыка пасінеў, памярцьвеў ад крыку, бацька, якога зь дзьвюма дзяўчынкамі адцясьнілі назад, бездапаможна спрабуе прабіцца да Вэнэры, а мама дзесьці прапала, яе адштурхнулі, заштурхалі ў мітусьлівы натоўп баб, дзяцей, мужыкоў. І тут зноўку Мандрык, злы, ашалелы:

— Ну, і гары, калі такая!

Усіх, каго не ў Германію, загналі ў даўгі калгасны хлеў. Той самы, дзе і «спэцатрад» людзей трымаў. Праўда, мужчын, нават пажылых, адабралі і павялі, нехта ўгледзеў, што зачынілі іх у калгаснай канторы. Бацька толькі і пасьпеў крыкнуць:

— Вэнэрачка, глядзі маму, глядзі іх...

Маці Вэнэра адшукала, і цяпер пры ёй было чацьвёра: мама імгненна страшна пастарэла, але таксама, як малая, такая бездапаможная і бясьсільная.

Вэнэра як бы і сябе бачыць збоку, з заціснутым жахам глядзіць на сябе — старую-старую бабу з узлахмачанай, як у ведзьмы, галавой...

Татка, татка, што са мною зрабілі! Чаму я засталася, адна-адзінюткая на ўсім на белым сьвеце? На каго пакінулі вы мяне, мамачка, Антончык, Волечка, Манюся?! Як, як жа вам, бедным, было балюча, як пякло! А ты, татка, ляжыш у тым страшным рове, мы ў шчы-

ліны глядзелі, бачылі, як вас вадзілі забіваць. Я ўжо радая была, што хоць мама не разумее нічога, а малыя вераць, што нас павязуць далёка-далёка, дзе нас чакае татка, і ўсё будзе, як было, добра будзе. Хлопчык па сьцяне ўзьняўся, прыпаў да дзіркі, крычыць: «Станкевіч уцякае! Во, упаў! Вэнэра, твой бацька!..»

Ты заплакаў, татка, калі сказаў: «Глядзі маму, глядзі іх!» Я такая старая, як ніхто на зямлі. Во, нават партызаны — і днявалі, і начавалі ў нас у вёсцы — мяне не пазналі. І добра, што так, я не хачу, каб мяне хто ўбачыў. Яны забралі нашага Шэрага, але я буду ісьці, пакуль змагу, я ў іх адбяру, татка. Гэта наш конік, ты заўсёды так марыў, што ў нас будзе ўсё і вось такі харашунконь. Ганарыўся, што твая донька самая прыгожая ва Ўюнішчах і нават на акрузе ўсёй, табе гэтага хацелася, а цяпер і ты б не пазнаў, людзі не прызнаюць, думаюць, баба бабаю. Аж сьмешна. Бачыў бы ты: як ратаваў мяне наш Шэры, ну, як чалавек, і мне ня быць бы сярод жывых, калі б ня ён, не дабралася да яго.

Шчыліны між бярвеньня сьвецяцца: зарыва разьлілося над вёскаю, над падпаленымі Ўюнішчамі. Раве скаціна, стрэлы, і толькі ў хляве, як у магіле. Людзі абмерлі, маўчаць. Заплаканых дзяцей стараюцца суняць, пужаюць: а то немец прыйдзе! Толькі б забылі, не прыйшлі — вар'яцкая гэтая надзея ахапіла ўсіх. Над нематою і заціснутым плачам дзяцей — надтрэснуты голас нейкай старой, што прамаўляе далёкія няўцямныя словы:

«З вуснаў жа Яго зыходзіць востры меч, каб ім паражаць народы. Ён пасьвіць іх жазлом жалезным; ён топча тачыла віна лютасьці і гневу Бога Ўседзяржыцеля...»

Раптам у шырокую сьветлую вэртыкальную шчыліну, там, дзе вароты, усунуўся высокі цень, узьнікла чалавечая постаць і — голас:

— Эй, дзеўкі! Маладых клічуць на кухню. Хто хоча бульбу чысьціць, набягай!

Мандрык, зноўку ён! Во і яе (Вэнэра сьцяміла, што яе) кліча:

— Эй, ты дзе тут? Позна будзе, кажу табе.

Уваліўся ў хлеў, за ім яшчэ двое. І пайшлі шнырыць па людзях, што ляжаць на высахлым конскім гнаі, зазіраюць у твары, паварочваюць да сьвятла.

— Ціха, дурныя, на кухні смачна паясьцё. Дзякуй яшчэ скажаце.

— Эй, Вэнэра, дабром прашу!

Вэнэра забілася між дзецьмі, наваліла іх на сябе і затаілася тварам да высахлага конскага паху, які казыча ноздры, дзярэ горла. Сястрычкі і нават Антончык прыпалі да яе, абхапілі ручкамі, — ратуюць, хаваюць.

А тыя ўсё топчуцца, як коні, грэбліва паварочваюць да сьвятла і адкідваюць старых:

— Вэк, вэк, курва старая! Фарфлюхтэр!

Навошта яна падумала: «як коні», можа, яна і пасеяла ў дурныя іх галовы тую прыдумку? Зарагаталі, аб чымсьці змаўляючыся, прыгразілі:

— Ну, чакай, сука! Мы цябе выкапаем. Сама вылезеш.

Пайшлі, мацюкаючыся. Доўга не зьяўляліся. І раптам шырока сталі распаўзацца вароты. Там важданіна нейкая, вокрыкі, вялізныя цені:

— Пайшоў! Пайшоў! Давай, памалаці іх добранька!

Гэта ж яны каня хочуць заштурхаць, зацягнуць у хлеў — проста на людзей. Рагочуць, радуюцца злой сваёй дурноце, і не разьбярэш, хто ўжо там, дзе немец, дзе с в о й. Пачуўся ля самых варот крык жаху і болю — замітусіліся на сьвятле дзіцячыя галоўкі, постаці. А на іх наступае, напаўзае нешта вялізазнае, галавастае, валасата-жахлівае. Нямецкі цяжкавоз-біцюг рухае нагамі, таўшчэзнымі каленямі, быццам гліну месіць, а яго штурхаюць ззаду, лупцуюць па баках:

— Ну, давай, ня бойся, душы сталінскіх бандытаў! Форвард!

Конь-велікан спрабуе на вазе ўтрымаць вялізныя, зь мяцёлкаю валос, капыты: ня можа конь ступаць на

жывое. Але змушаны, і ён рухаецца нейк рыўкамі, як бы падаючы. Дзеці, бабы завішчалі, запішчалі, ну, як мышы, як мышкі малыя, ускочылі з долу, адно за аднаго хаваюцца, зьбіліся ля сьцен, у кутках. У расчыненыя вароты бачна, як гараць-дагараюць Уюнішчы, вые і пішчыць усё жывое. За варотамі раптам загарлалі панямецку, і каня з такою ж стараннасьцю сталі гнаць, штурхаць з хлява. А ён ня йдзе: там агонь, іскры. Забеглі яшчэ салдаты і сяк-так вывалаклі.

І ўсе ўбачылі, што падпалілі, што загарэлася страха хлява, вогненна зачырванелася салома над галовамі. І як бы ўзарваная апошнім жахам, крыкам людзей, раптам узьляцела да чорнага-чорнага неба і адначасова стала асыпацца агнём — на галовы, на рукі, на адкрытыя ногі. На дзяцей. Закрычаў дзіка і пратэстуючы-гучна Антончык, замахаў ручкамі, скідваючы наліплы на яго саламяны агонь. Вэнэру аглушыў жахлівы трэск валасоў, якія загарэліся на галаве ў яе, і ўдар болю — у цемя, у патыліцу. Гэта быў апошні кантраляваны стан, адчуваньне. Што далей адбывалася — яна кепска помніць. Запомніла, як ляжала на малых, на цельцах, што сьціснуліся, уздрыгвалі, распластаўшыся, прыкрываючы ад агню, што падае зьверху, і ад ног ашалелых людзей, што некуды рвуцца. Потым панесла і яе, яна, абхапіўшы і ня могучы абхапіць усіх, цягнула дзяцей, адчуваючы, як губляе аднаго за адным, рукі яе хапаліся за ўсё дзіцячае, што ёй траплялася: галовы, рукі, ножкі. Людзей выпірае ў расчыненыя вароты, і яны ня бачаць і ня чуюць, што там ва ўпор б'юць кулямёты, — агонь і жах былі страшней.

На ўсё жыцьцё засталася ў Вэнэры млосьць ад любога паху смажанага мяса, сала, а гарэлых валасоў — асабліва. Колькі гадоў потым не магла доўга стаяць ля печы. Стаяла, як жа бабе вясковай бяз гэтага, і смажыла, і варыла, але каб ведалі, што яна пры гэтым перажывала, які ўнутраны жах ажываў у ёй.

Чорны дым ад спаленых цел, мабыць, ён і прыкрыў, выратаваў Вэнэру, калі яна вывалілася за варо-

ты. Да самай канавы яе суправаджаў вал людзей, што вырваліся з агню, гнаў, штурхаў наперад. Яна ўпала ў рэдзенькую гразь, а на яе валіліся, падалі забітыя і не зусім дабітыя. Паўзадушаная, яна адчувала, як яшчэ і яшчэ мёртва чмякаліся зьверху цяжкія целы. Стральба была бесьперапынная, але ўжо здавалася далёкаю, і яе яна ўжо не датычылася. Яшчэ запомніла, што, калі падала ў гразь, у ваду, зашыпела, як распаленая галавешка. Так, было, шыпела, ацiхаючы, гарачае палена, якое мама совала ў бак з вадою, падрыхтаванаю пад бялізну, каб вада была «мяккаю». Потым, калі вечнасьць прамінула, і Вэнэра зноў апынулася наверсе, над трупамі, — зусім ня помніць, як выграблася, выбралася, — больш за ўсё хацелася вызваліцца ад касы, мучыў пякучы цяжар і невыцерпны боль ад палена валасоў, якія craналіся абпаленай шыі, сьпіны. Перакінуць бы на грудзі, але для гэтага трэба мець хаця б адну руку, а ў яе замест рук нешта чужое і страшнае, абпалена-чырвонае, са скураю, што брудна спаўзае, як панчоха.

Нейкі час разглядвала забітых, стоячы над канаваю, баялася, што пабачыць там сваіх. Як быццам тое, што за сьпінаю ў яе, — задымленае пажарышча, вялізны чорны горб сярод зеляніны там, дзе стаяў хлеў, — менш страшна і канчаткова.

І яшчэ што было, што помніць: каля лесу спынілася і азірнулася ў апошні раз на вёску, якой ужо не было. І тут нешта ёй прымроілася, здалося: сярод дрэваў і ацалелых хлеўчукоў далёка-далёка сьвеціцца дах яе дому, бацькоўскай хаты. Зьдзівілася нейк абыякава, цямячы, што гэта толькі мроіцца ёй, і пайшла, ведаючы, што назаўжды. Жыць яна не зьбіралася, не разьлічвала. Да каго яна пойдзе, хто і дзе тыя, куды яна магла б імкнуцца? І ўспомніла, што ёсьць Шэры, што ён на балоце адзін, зусім адзін. Як і яна цяпер. Вось куды ісьці, вось навошта. Ёй нават здалося, што калі яна туды дабярэцца, тады і боль пачне ацiхаць, ня будзе так нясьцерпна паліць. Вось гэта і гнала туды, да мэты, — ад пякоты, болю ўцякала. Ад

кары, якую ў сабе несла. Ад безнадзейнасьці і жаху. Раптам пачынала выць, не пазнаючы больш самую сябе. Яна ўжо не ўсьведамляла, раніца цяпер альбо вечар, дзень альбо ноч. Усё гарэла, куды ні глянь, ноччу, як удзень, і ўдзень, як сярод начы.

Нарэшце ўбачыла стажок, калісьці скіданы ёю і бацькам на пару, — і раптам вярнулася адчуваньне часу, убачыла, што ўжо сьвітаньне. І бы пацьвярджаючы яе вяртаньне да рэальнасьці, заіржаў Шэры, жаласна, з крыўдаю, як падае голас пакінутае дзіця, што доўга плакала. У адказ загаласіла:

— А бедныя ж мы сіроты! А няма ж ужо ў нас таткі нашага, а няма мамкі, і Волечкі, і Антончыка, і Манечкі! Анікога, анікога ў нас з табою!

Шэры, ледзь не задушаны вяроўкаю, якою быў навязаны да павозкі, стаяў над перакуленаю кадзьдзюля вады, утаптанай у дол травой-асакой. Вочы чырвоныя, дзікія малілі аб дапамозе і паратунку. Зямля ўзрытая ўся, тут ішло змаганьне не на жыцьцё, а на сьмерць, мусіць, зноўку з ваўкамі. Шэранькі мой, Шэры, і табе, і табе дасталося!

Тата, татачка, які ж ён худзюшчы і страшны быў. А я не магу вызваліць яго ад вяроўкі-пятлі, мне маімі рукамі да чаго-небудзь дакранацца — лепш памерці, крычу, быццам мяне рэжуць. Распухлі, сочацца, скура чорным шмацьцём.

Дык ён, Шэры, пашкадаваў мяне, пераступаў нагамі і так, і так — і цуд! — вяроўка сама адпусьціла, звалілася пад ногі, як мёртвая зьмяя. Калі мы пайшлі да вады, ён зноў закульгаў, ды так моцна. Ён і цяпер кульгае ў іх у павозцы, як яны даедуць, я ня ведаю, яны й не даедуць на ім. Ён такі разумны, наш Шэры.

Сьмерць непрыгожая, усе кнігі, і фільмы, і опэры хлусяць, што яна бывае прыгожаю. Непрыгожы чалавек, які памірае і, галоўнае, ён сам гэта разумее ў тое імгненьне. А вось навакольныя часам не разумеюць гэтага і мучаюць яго сваім неразуменьнем. Існуе с о р а м

с ь м е р ц і, я ў гэтым перакананы, сам перажыў. Можа, яшчэ пра гэта раскажу. Часам ён мацнейшы за страх — сорам сьмерці. Многія маглі б расказаць. Ня нейкай там ніжкай, подлай, здрадніцкай сьмерці (гэта асобная гаворка), а сорам сьмерці л ю б о й.

Ванечка памёр у лясной вёсачцы (на паўшляху да лягера). Не давезьлі.

Мы ўсю дарогу падбадзёрвалі яго: вось прыедзем, там лекары, мігам паставяць цябе на ногі, табе не першыня! Але Ванечка ўжо апошні шанец зрасходаваў, і ён гэта ведаў. Глядзеў на нас нядобрымі вачыма аднекуль здалёк, як на тых, хто задумаў насьмяяцца над ім, здрадзіў яму, на змоўшчыкаў.

Адчуваючы віну перад ім — мы застаемся жывыя, цэлыя, здаровыя, — шукалі і знаходзілі вінаватых перад намі ўсімі. Ну, немцы, «бобікі» — гэта зразумела. Але й іншыя ўсе, хто не хадзіў з намі, не перажыў таго, што мы перажываем, — адседжваюцца, прыдуркі, у лягеры, жывуць-пажываюць у вёсках, замаскаваўшыся барадою, ні нашым ні вашым! Ды ці мала іх — вось хаця б баба гэтая, што навязалася і брыдзе за намі, як Ванечкава сьмерць. Чакае свайго часу, што вось памрэ партызан і ёй вернуць яе багацьце? На нешта разьлічвае, калі не адстае і не падыходзіць да нас, трымаецца воддаль. Баіцца? Саромеецца? Проста гадзіна, што тут скажаш. Сьцярвятнік! То на полі з жыта выныре, то з кустоў на дарогу вываліцца — не адстае, хоць страляй па ёй.

А Ванечка (мы ўяжджалі ў паўжывую пустую вёсачку) раптам папрасіў:

— Спыніце.

— Табе кепска, Ванечка, зараз чаго-небудзь цёпленькага табе.

— Адыдзіце, я зараз памру. Ну, прашу.

Мы, наадварот, — усе да яго, замітусіліся, бадзёрымі і, як заўжды пры чалавеку, які памірае, фальшы-

вымі словамі спрабавалі — што? Угаварыць яго — не паміраць? Не казаць пра сьмерць?..

— Ды дактары цябе ўраз!..

— Ты яшчэ танцаваць будзеш!..

Мы адганялі ад сябе і ад яго страх сьмерці. Не заўважаючы, што ўжо апошняе — сорам сьмерці пачаў яго мучыць. Ванечка бездапаможна, крывячы, як дзіця, рот, заплакаў. Здавалася, таму, што мы ня цямім чагосьці, ня хочам яго пачуць. І раптам вусны пабялелі, закамянелі, рот раскрыўся, як яма...

Мы стаялі вакол павозкі, як свавольныя школьнікі, якія аніяк не чакалі такога выніку, ня думалі, не хацелі, а яно здарылася. Хацелася азірнуцца, пашукаць, неадкладна знайсьці віноўніка. Перад намі перад усімі вінаватага. У такую хвіліну нас лепш не чапай. А тут яшчэ гэтая падла-конь цягнуць зусім ня хоча: раскульгаўся так, што невядома, ці даедзем дадому, ці давязем забітага. Ну не, здохнеш, але давязеш! А яшчэ гэтая баба, як варона, уся ў цёмным, брыдзе за намі, бы навязаная. Спадзяецца, што кінем каня-сымулянта, пакінем ёй.

І ўсё-ткі Рамановіч рашыў, што трэба пашукаць іншага каня. Адправіўся, пайшоў па дварах Цыбук, гэты знойдзе і — галоўнае — прывядзе. І праўда, прывёў. І каня, і разгубленага гаспадара. Бачыш, дзядзька, што ў нас здарылася? Давязем і вернем твайго канька-гарбунка, можаш ехаць з намі, сам і прыгоніш. Павозка развалюха ў цябе? А гэты вазок бачыў? Падабаецца? То-та ж! Нам не шкада, плата будзе табе за працу. Нам падабалася наша шчодрасьць: а тая варона няхай забірае свайго кульгавага. Хоць ты яе страляй, анічога разумець ня хоча!

Кульгавага харашуна вывелі з аглобляў, разьдзелі дагала: хамут, дугу са званочкамі, раскошную збрую з бляшкамі перанесьлі на каня-карантыша, упрыгожылі яго.

«Як сьвіньні сядло!» — сказануў нехта і змоўк

зьбянтэжана. Няхай, няхай пакрасуецца і калгасьнік. Гэты, прынамсі, дурыцца ня будзе. І галоўнае, сябе мы бачым багатымі і шчодрымі: карыстайся, дзядзька!

А ты — кавыляй да сваёй кулачкі, зачакалася, засумавала. Бач, раскульгаўся, сымулянт.

Ужо ад'ехаўшы з паўвярсты, мы пабачылі, што каля пакінутага сярод вуліцы каня зьявілася баба зь непакрытаю, белаю ад валасоў галавою, паклала, як упусьціла, на сьпіну яму рукі і — мы зноў пачулі — загаласіла. Зарагаталі б, калі б не было з намі нябожчыка.

— Ну, бабы, ну, бабы! — толькі і сказаў Караткевіч. — І сьмех з вамі, і грэх.

# РАЗЬДЗЕЛ ТРЭЦІ

*«І яшчэ сказаў бы яму (таму, хто тужыць па часах, калі «цэны зьніжалі), што Сталін прадаваў нядорага тое мяса, якое ў маіх бацькоў-калгасьнікаў наогул задарма браў. І прывёў бы яму нявыдуманы бюджэт гэтых калгасьнікаў за 1952 год.*

*Прыход:*

*а) 120 кг прарослага зерня пшаніцы (празявалі, прамокла, прарасло, дзяржаве яно не патрэбнае, на табе, калгасьнік, жыві заможна),*

*б) 90 кг кукурузы ў пачатках (пачаткі таксама прайшлі як «прадукты», хаця ні сьвінка гэта ня есьць, ні кура не расклюе).*

*Расход:*

*а) 1500 рублёў (старымі) Сталінскай «дабравольнай» пазыкі (хаця пры спагнаньні яе часам і па зубах давалі),*

*б) падатак з двара (на казу, парсюка, сад) — 1000 рублёў. І 40 кг мяса.*

*Жартаваў неяк Жванецкі (і можа, думаў, што нам гэта сьмешна) — атрымліваем 250, жывём на 400.*

***А тут — прыходуем 5, расходуем — 2500. Унё як!***

***І як зараз, бачу Яе, што нарадзіла мяне, на калгасным полі, ломам выкалупвае мерзлыя буракі зь зямлі (пры рацыёне — ляпёшка, цыбуля, соль) і прыгаворвае ў паўтрызьненьні:***

***— Цэ ж рабства... Цэ ж рабства...***

***Але казаць усё гэта кадравіку ня стаў: чалавек зь мінулага — не зразумее».***

*(Зь ліста Міхаіла Ўладзімеравіча Дрозьдзіка, г.Чарнаўцы)*

Неяк перамучылася восень і зіму на балоце, у лесе, а вясною праз галовы лясных і балотных людзей пракаціўся фронт — было, як ніколі раней, цяжка. Але затое якая надзея, што вось-вось усё кепскае апынецца ззаду. Абы не спасьцігла бяда на самым парозе ратунку.

Пачынаецца тое, дзеля чаго варта ўсё пераносіць. А інакш такога і не пеpажыў бы, ня вынес.

У Вэнэры да таго ж быў Шэры: бацькаў падарунак і як бы запавет — з чым яна пойдзе ў іншае жыцьцё. Зьберагла Шэрага, ацалеў, застаўся пры ёй — самой цяжка верыцца. Было і так, што мыш ня ведала, у якой норцы схавацца, а тут — конь. І ад людзей, і ад ваўкоў трэба зьберагчы. Але калі гэтак пашанцавала, хіба нельга спадзявацца, што і далей будзе ня горш, — да лепшага ўсё ідзе.

І пацягнуліся людзі да згарэлых, разбураных сваіх гняздовішчаў, забраўшы, несучы з сабою ўсе страты, — не было анікога, хто б ня страціў. А Вэнэра не ішла, яна ехала — няхай і на разьбітай, чужой, а ня той, бацькоўскай, з фарбаванымі ступіцамі павозцы, затое конік у яе свой, цяпер назаўжды свой. І не адна ехала, яна можа і людзям памагчы: на возе дзетак — не палічыш. Пры іх бабулі, ужо зусім абязножаныя. Хто чый — не зразумееш, ды й ня мела значэньня. Загружаны дзецьмі воз і натоўп баб, што брыдуць усьлед. Дзьве каровы пры іх. Міма праносяцца незнаёма цяжкія машыны, кажуць, амэрыканскія, салдацікі нашы абавязкова крыкнуць, абавязкова памахаюць рукой:

— Эй, нявесты! Чакайце нас!

А самі — брудныя, змораныя, ну, нічым ня лепш за Вэнэрыну каманду.

— А ў нас ёсьць жаніх! — спрабуюць і бабы задзірацца. Гэта пра Тамаша, аднарукага дзеда-партызана. На адзіную яго руку наматаныя лейцы, але ён умудраецца і цыгарку ёю да вусоў падносіць. Можна падумаць, што з адною рукою і нарадзіўся.

Як зь цягніка: нехта злазіў, сыходзіў, зьбіраў у кучу сваіх дзетак і вёў палявымі дарогамі да нябачных вёсачак. Ня ведаючы, ёсьць там што альбо нічога — як і пobліз шляху: брудныя пячныя коміны ды чорныя, яшчэ не зазелянелыя сады. А на воз падсаджваюцца новыя пасажыры, дагружаюць яго стомленымі, вірлавокімі дзеткамі — каго здагоняць альбо хто нагоніць. Вэнэрын конь і кульгаць перастаў: як бы нават ганарыўся сваёю роляю, падзяляючы пачуцьці гаспадыні.

А што іх усіх чакае дома, якога хутчэй за ўсё і няма, адны вугалькі, — пра гэта ня кажуць. Не пра гэта кажуць, а ўсё пра салдацікаў, войска, на якое ніяк не наглядзяцца, не нарадуюцца. Свае, свае, вось яны нарэшце тут, — ня верылася ўжо, што і дажыць давядзецца! А што брудныя і галодныя на выгляд, і зусім не такія, якімі ўяўлялі іх, ну і што — такія яны нават бліжэй, радней.

Ня ведала і Вэнэра, што яе чакае ва Ўюнішчах, дакладней, ведала, што адна пякельная чарната на месцы ўсяго, што ёй дорага было, што было яе жыцьцём. Усё, што ў яе засталося, едзе зь ёю, — гэта Шэры, гэта некалькі баб, красуня Окця з Уюнішчаў, ну, і болькі-струпы яе памяці, якія, адно вочы апусьці на рукі, — адразу бачыш. За гэты час амаль прывыкла, што яна пачвара: пажаваныя агнём рукі, шыя. Але як, як ёй, дзяўчыне, да такога прывыкнуць, ёй, Вэнэры, якую ўсе вылучалі нават сярод дзяўчат больш дарослых?

Ня ведала, што цуд чакае-прычэквае яе ва Ўюнішчах. Неба вырашыла, мабыць, узнагародзіць хаця б гэтым цудам. Хто ведае, ці не за кошт будучыні? Той, якую, здавалася, так лёгка ўгадаць. Сьветлай і блазен-

най, як т о й  с ь в е т  для пакутнікаў-сьвятых, якія верацЬ, што ім прыгатаваны абавязкова рай.

Колькі разоў у лесе, на балоце Вэнэры ўсё гэта бачылася: вяртаньне ва Ўюнішчы. Пасьля таго хлява, пажару, канавы яна баялася ночы, сну, сноў, затое ўдзень як наяве ўсё гэта бачыла — вяртаньне ва Ўюнішчы. Ня ў іншыя нейкія, а ў тыя, дзе жывуць яе бацька, яе маці, Антончык, сястрычкі, усе жывыя-здаровыя і вёска, як раней была. Вось гэта, аказваецца, і было шчасьцем — усё, што было раней, а яна, ды й ніхто, ня ведалі гэтага. Часьцей за ўсё згадвалася пасадка бульбы на сваім агародзе, о, гэта было заўжды сьвята. Радуюцца дзеці, памагаючы саджаць бульбу, баязьліва-ціха ўсьміхаецца мама, як бы баючыся каго раззлаваць альбо нешта спужнуць, ну, а бацька, проста як генэрал які, крочыць за плугам, торгаючы то адну, то другую ляйчыну, зьлёгку, як на хворага, на дахадзягу калгаснага коніка пакрыквае. Так цяжка выпрасіць каня ў брыгадзіра, міжволі будзеш паважаць, як капрызнага і важнага госьця. Усё перад вачыма, усе, хто табе дарагі тут, — і ціха вакол, а галасы ва ўсіх такія добрыя, і нічога кепскага не чакаеш, ня будзе... Як Вэнэра цяпер разумела сваю маму, яе заўсёдны страх усё страціць, над якім разам з таткам дзеці пасьмейваліся, ад якога дружна стараліся абудзіць сваю маму.

Бабская, дзіцячая каманда Вэнэры пад'яжджала да Ўюнішчаў — да тых агародаў, садоў, брудных жоўта-белых печак, рэдкіх забудоваў і абпаленых платоў, дзе раней былі Ўюнішчы. Сэрца білася, быццам адрываў яго хто. Раптам завыла Окця. Яна бачыць упершыню такія Ўюнішчы: карнікі не злавілі яе ў лесе, сям'я яе, самая вялікая ў вёсцы — дванаццаць душ, гарэла безь яе... Вэнэра бачыла перакошаны запозьненым жахам твар прыгожай Окці і зноў вярталася ў той хлеў (на касагоры чарната дасюль), у гэтую вось канаву (ад вёскі яна цягнецца ажно сюды, да ўзьлеску).

— Вэнэра, глядзі, а твой дом стаіць! — Нечы голас, Вэнэра і ня чуе — чый: — А твой цэленькі!

Яна і сама бачыць дом, а ўсё ня можа паверыць, ёй усё здаецца, што сны наяве працягваюцца. Дах удалечыні, проста як люстэрка, зіхціць пад вясеньнім сонцам на захадзе.

— Багатая нявеста па цяперашнім часе, — разважліва кажа Тамаш. — Жаніхі цугам хадзіць будуць. Ну што ж. Не была б Станкевічава! Пра цябе і партызаны нашы толькі й гаварылі.

Яму жарты, ён тут збоку-прыпёку, нетутэйшы.

Мосьцік праз канаву зусім згніў, давялося ўсіх ссаджваць з павозкі, ня здарылася б бяды. Хаця б Шэры шчасьліва перабраўся, ног не паламаў. Тамаш на пару з канём зьдзейсьнілі пераход вельмі спрытна, вось што значыць мужчына. Шэры Тамаша з паўслова разумее.

На жоўтым касагоры — вялікае, неахопнае яе гора, той усясьветны жах: маленькая, калі здалёк глядзець, смаляна-чорная пляма ад згарэлага хлява. Вэнэру ўжо калоціць, як у ліхаманцы. У другі бок паглядзець — зіхоткі, як люстэрка, дах дому. Як чалавеку такое вытрываць? Здаецца, што яна зь месца ня зрушыцца. Тамаш убачыў, зразумеў, паказаў на павозку:

— Сядай, чаго ўжо, звыклая справа...

Дапамог узьлезьці — так і даехала паўжывая да самага двара. Там спаўзла з павозкі, як хворая, і пайшла да дому, ня гледзячы па баках, быццам баялася, што дом раптам зьнікне. За ёю і ўсе пацягнуліся, але наперад не забягаюць нават дзеці. Дзьверы расчыненыя, вокны павыбітыя: зблізку дом ужо не здаецца цудам са сну, выглядае пакалечаным, загаджаным, нежылым. Раптам выбег зь сенцаў сабака, дзіка, спалохана зірнуў на людзей і кінуўся наўцёкі. Ля парогу і ў сенцах мэталічныя ячэістыя скрынкі нейкія, глянула налева, у халодную палавіну, — поўны разгром. У чыстай палавіне — яшчэ большы. Перакуленыя, валяюцца чыгункі, зэдлік зламаны, са сьцяны спаўзьлі брудныя, адсырэлыя шпалеры. Як калісьці скура зь яе рук... Тут да Вэнэры вярнулася ўся праўда: яна ўзвыла, сама напалохаўшыся свайго голасу.

— А татка, а мамка, дзеткі нашыя, а даруйце мне, я ж не вінаватая!..

Тыя, што зь ёю прыехалі, нясьмела адступіліся, каб пабыла і павыла адна. (Здалёк чуваць Окцін крык, выцьцё — яна на сваім падворку-папялішчы.) Пасьцель, дзе спалі бацькі, скінута пад ногі, дзіцячыя ложкі — на дваіх і яшчэ на дваіх — перакуленыя. (У Станкевічаў усе спалі не на палацях, а на гарадзкіх мэталічных, зь сеткамі ложках.) Усё загаджана, затаптана: іх няма, анікога няма і ніколі ня будзе!

— Я не вінаватая, мы прыйшлі, мы тут, Шэрага я зьберагла, але што мне бяз вас, нашто яно ўсё?

Усё жыцьцё Ўюнішчаў, што засталося, ацалела, сабралася ў доме Вэнэры. У яе пасялілася і Окця (двор яе выгараў падчыстую), і яшчэ дзьве бабулькі, якія, як на сьмех, ацалелі, уратаваліся, калі і дочкі-сыны і ўнукі іх загінулі, адны вугалькі ад іх. Ну і ўсе нетутэйшыя: шасьцёра баб і дзясятак дзетак — сталі жыць у яе доме. Ня ехаць жа ім, не брысьці ў далёкі сьвет, дзе яшчэ і вайна не ўціхамірылася. Фронт нібыта спыніўся, а можа, і не, Уюнішчы адрэзаныя балотнымі разьлівамі ад усяго сьвету. Дом сяк-так прыбралі, вычысьцілі, Тамаш і дзятва пабольшая скупіліся ў левай, у «халоднай» палавіне. Там у іх шумна і тлумна далёка за поўнач. Маці шыкаюць на іх, каб суцішыць, але галоўны бузацёр — Тамаш, зь ім паспрабуй спраўся, старое, што малое, забаўляе іх бясконцымі байкамі.

Ён усё грозіцца, што пойдзе ў сваю вёску. Няма там нікога ў Тамаша, і самой вёскі няма, але яму трэба быць на месцы: а раптам сыны знойдуцца, напішуць. Але ўсё ня йдзе, а бабы абяцаюць: вось вернуцца нашы мужыкі — адпусьцім.

— Ага, я ў вас накшталт НЗ, недатыкальны запас. Толькі на той выпадак, калі нявыкруткі.

Тамаш, выявілася, ведаў, помніць Вэнэрынага бацьку, бываў ня раз з партызанамі ва Ўюнішчах.

— Ну, ты мяне не запомніла. Камандзіры ды ад'ютанты ад вас не вылазілі. Дзяўчынка такая бегала, дражніла нашу публіку. Але як мы цябе не прызналі? Калі каня забіралі. Гэта ж трэба!..

Усё так. Крыўдна толькі, што і па дарозе ва Ўюнішчы, калі вярталіся зь лесу дадому, пазнаў яе Тамаш толькі пасьля таго, як Шэрага па шнары на назе пазнаў. Старая і ёсьць старая.

Справа, у «чыстай» палавіне Вэнэрынага дому, — уся малеча і зь імі бабы. Падзялілі на ўсіх ложкі, анучы, якія ёсьць, ну, і на печцы, на лавах, што каля сьцен, можна спаць, а то й на падлозе — дом, дзякуй Богу, прасторны. Сама гаспадыня сьпіць на бацькоўскай пасьцелі, — а пры ёй цэлы вывадак дзетак, якія раўніва дамагаюцца права (па чарзе) спаць каля «цёткі Вэнэры». Вайна ў іх за гэта ідзе са сьлязьмі і крыкам, маткі ледзьве спраўляюцца наводзіць парадак і справядлівасьць. Але і старыя бабы ільнуць да Вэнэры, і ня толькі таму, што гаспадыня іх часовага прытулку, але і яшчэ чамусьці, Вэнэра гэта адчувае. Быццам яна мудрэй і старэй за іх усіх. Хаця кожная пражыла сваё, усім хапіла. Узяць тую ж Старую, высокую, худую бабу, — усе не маладыя, ёсьць нават старэйшыя, але менавіта яе называюць Старой — дык у яе яшчэ да вайны пачалося блуканьне, ажно з Сыбіру дабралася. Але і яна Вэнэру вылучае, як з роўнай заўжды размаўляе, а не сурова-павучальна, як зь іншымі.

Ад усяго гэтага Вэнэры тужліва і яшчэ больш няўтульна на сьвеце: быццам легла спаць, прачнулася і выявіла, што жыцьцё прайшло.

Лежачы ў пасьцелі, калі ўгамоняцца і малыя, і старыя, яна расплюшчвала вочы і слухала свой дом: ня храп і стогны, вокрыкі пастаяльцаў, а за імі што. Дапамагалі ёй у гэтым ходзікі-гадзіньнік. Яна іх адкапала ў сьмецьці, узрадавалася, як жывому, — пачысьціла, памыла нават, Тамаш падвесіў, прыладзіў да ланцужка нейкія жалезкі — і яны зацікалі. Як у дзяцінстве, бывала, да вайны. Цік ды цік, цік ды цік. А по-

тым — др-р-р... Нешта торгаецца, зрываецца. Але так заўжды было, калі бацька яшчэ толькі прывёз з гораду. Стрэлкі паказваюць то на жаўтавусага селяніна са снапом сьпелай пшаніцы, то на трактар з чырвоным сьцягам, то на сіняе, амаль зялёнае неба. Яшчэ цікавей — збоку зазірнуць, праз шкельца: бегаюць, як жучкі-павучкі, калёсікі — колькі разоў разглядвалі іх вочы Вэнэрыных сястрычак, брацікa. Дзеці ў сям'і зьяўляліся, ледзьве падрасталі і пачыналі з рук цягнуцца да самага яркага ў доме прадмету. Вэнэра іх усіх па чарзе падносіла да гадзіньніка, як на экскурсію.

Цяпер яна слухала ціканьне і ўсхрыпы ходзікаў, а праз гэтыя гукі пачынала чуць і сам дом, сьцены, дах і падпольле. Знаёмае вялікае дыханьне дому, да якога прыслухоўвалася яшчэ ў дзяцінстве, цэлае жыцьцё, што так радасна-доўга цягнулася, пакуль былі ўсе зь ёю, усе і ўсё, без чаго сябе не ўяўляла. За вокнамі шапацеў сад, не шумеў, а менавіта шапацеў, шумна альбо гуляючы — крадком: у маленстве сад ёй здаваўся жывою істотаю, вялікаю і добраю. Начамі яна і цяпер магла размаўляць зь ім, але ўжо інакш. Тады ў доме, па гэты бок сьцен, былі і мама, і бацька, і сястрычкі з брацікам, цяпер жа яны ўсе т а м, за сьценамі, і разам з дрэвамі зазіраюць у вокны, таксама ўслухоўваюцца і чагосьці чакаюць ад яе. Што, што яны хочуць сказаць, пачуць: хаця б у сьне паведамілі!..

Раней за ўсіх прачыналася халодная палавіна дому, «Тамашова каманда»: гэтым што вечар, што раніца — не да сну. Ды й халаднавата там, грэюцца дурэючы. Тамаш пра сваю пасьцель, як і заўжды, скажа так, што ўсім цікава і сьмешна:

— Салдату аднаго шыняля хапае на любую пагоду. Старшына яму як тлумачыў? Зімою холадна? Дык жа ён суконны! Летам горача? Дык ён жа без падкладкі! Але толькі мой нямецкі — з паперы. Затое ў немцаў вёска — з цэглы. Каб яшчэ крыху, і Расеі як не было. Умела ваяваў немец, па-гаспадарску. Што значыць се-

лянін — галава ўсяму. Тэльман захацеў усіх паставіць пад рабочых, а Гітлер перахітрыў: не, усяму галава, хто на зямлі працуе.

— Падвяжы, дзед, пугу сваю, каб па вушах сабе не заехаў! — папярэджвала яго мудрая Старая. — Энкавэдэ вярнулася. Забыў? А то думалі: вайна скончыцца — і ні табе таго, ні табе другога...

— А што тое энкавэдэ мне зрабіць можа? Немец і той не зрабіў. Во толькі руку адцяпаў. Ды й то — гангрэна.

— Фашыст цябе не дастаў, а гэны дастане.

Неяк адразу склалася, што да Старой, да яе сухога голасу прыслухоўваліся. Вэнэры здавалася, што гэтая худзюшчая, як ссохлы на агародзе сланечнік, жанчына нешта ведае такое, зможа і ёй дапамагчы вярнуцца да чагосьці, што назаўжды засталося ў страшным тым пажары. Вочы ў Старой такія: ведае ўсё, бачыла ўсё, змагла і адолела ўсё. Яе падабралі ля дарогі, зусім зьняможаную, абязножаную: вузялок у руках, на нагах раскіслыя ад халоднай гразі буркі, без бахіл нават. Адны толькі вочы жылі, жывуць на твары яе. Але затое як жывуць! Такія Вэнэра бачыла толькі ў птушак. Ды ў кошак. Нетутэйшыя вочы. Нават Тамаш тушуецца, калі яна яму:

— Язык у цябе, як цыганская пуга. Глядзі, грамадзянін Караткевіч, падвяжуць.

— Ды каму мы тут патрэбны? Да новых маразоў ніхто, глядзі, і не дабярэцца да нас. Калі лета мокрае будзе.

Адной Окці ніхто не аўтарытэт, яна сама любіць Старую падражніць. Вельмі зьмянілася Окця з таго часу, як вярнулася дамоў. Першыя дні і ночы была, як вар'ятка. Усё блукала сярод пажарышчаў, каля хаты сваёй, ад якой адна печка засталася ды студня. А потым нібыта на ўсё забылася, ні слова, ані ўздыху пра тое. Затое сама стала што вожык.

— Прыедзе начальства, а ў нас ужо гатовы калгас. Бабскі. Во абрадуецца. Ох, разагнала б я вас усіх

на месцы Вэнэры. І жыла б сама па сабе, адна. З адной мяне калгасу не зьляпілі б.

Тамаш адно хмыкае:

— Што-небудзь яшчэ прыдумаюць. Як у нас адзін абяцаў. Цяпер час будзе ў іх, чаму і не прыдумаць? Яшчэ не такое вычвараць.

Бабы ня згодныя. (Ды й Вэнэры таксама тужліва робіцца.) Ну як можна, каб нічога не зьмянілася пасьля такой вайны, пасьля ўсяго, што было, і калі людзі гэтак нацярпеліся ад немца: паліў, караў за гэтую ўладу, камуніст ты ці не камуніст, усіх падрад. І партызаны, і нават камісары казалі: ну, бабкі, будзе ўсё інакш пасьля вайны!

Ахватней, аднак, і весялей ішлі ў Вэнэрыным бабскім каўчэгу гаворкі вакол іншага — пра мужыкоў, якіх ужо няма альбо пра якіх ня ведаюць, дзе і што зь імі. Ну, і пра жаніхоў — для Вэнэры і Окці.

Вось вернуцца лейтэнанты — абавязкова той, што знарок спыніў маленькую машыну, параўняўшыся на дарозе з Вэнэрай, і падарыў ёй прыгожую скрынку з амэрыканскімі прадуктамі (усім бабам, дзеткам, але паднёс Вэнэры). Ну, а Окці генэрала знойдзем!

— Як для Окці, дык стары конь! У нас ужо ёсьць адзін.

Гэта — пра беднага Тамаша. Окця такая, язык, што шыла.

А Вэнэра перакананая: калі і ёсьць сярод іх прыгажуня, дык гэта Окця. Яна і шыю, і рукі можа сьмела паказаць — каму хочаш, любому лейтэнанту. А Вэнэра, калі прымала тую скрынку, ледзь не ўпусьціла. Трэба было працягнуць да лейтэнанта рукі, сама на іх зірнула і ледзьве не ўпусьціла падарунак.

Вэнэрын ці то калгас, ці то каўчэг (называй як хочаш) засяляўся ўсё новымі людзьмі. І ўсё бабы зь дзеткамі. Адзін толькі мужычок, гадкоў чатырнаццаці, прыбіўся: сірата Васілёк. Усіх згубіў у лесе, нікога ў яго не засталося. У Тамаша свой разьлік:

— Цяпер вамі, бабамі, закамандуем!

Але і бабы радыя: мужыкамі, якія ні ёсьць, запахла.

Сьняданкі, абеды гатавалі адразу на ўсіх, ва ўсіх, якія ёсьць, чыгунах, каструлях. Бульба ды праснакі (з чаго толькі ні пяклі, дадаючы ва ўсё растоўчаныя ў ступе жалуды). Малако ад дзьвюх каровак дзялілі на дзяцей. Яны чародкаю тоўпіліся вакол каровы, калі даілі для іх малачко, усьлед ішлі дамоў, дружна назіралі, як яго, пеністае, працэджваюць, а потым ніяк не маглі дачакацца сьняданку. Іх дружна гналі маці на двор — гуляць.

А Шэрага падкормлівалі, люлялі, агулам, тут ужо бабы хадзілі цугам вакол.

— Я ўжо каменьчыкі ўсе прыбрала са свайго агароду. Каб лягчэй яму было. А залезьзя, залезьзя таго — усё зьнесла ў канаву.

Навіны адтуль, дзе ўсё яшчэ, бачна, цягнулся вайна, не даходзілі. Ні радыё, ні газэт. Засмучаны Тамаш блукаў уздоўж сьцен і ўчытваўся ў жоўтыя, крохкія газэтныя лісты, якімі аклееныя сьцены (шпалеры амаль усе спаўзьлі, абваліліся ад сырасьці, а газэты трымаюцца). Бабы занятыя хто чым, дзеці вяла важдаюцца (галодныя ўсё-ткі), а над усімі — як, бывала, радыё — голас Тамаша:

— Дадзім краіне дзевяць... нуль, нуль, нуль, нуль, нуль, нуль... Во, дзевяць мільёнаў пудоў хлеба!.. Магілёўскі раён... чыстка... кіраўнікі чысткі Рудзутак, Кагановіч, Яжоў, Пятніцкі... Кулаччо дзейнічае, такія, як Атрашонак і Каткаўскі, зрываюць закупку збожжа... «Правда», орган цэка вэкапэбэ... Кіраўскі райком аб'яўляе розыск наступных камуністаў... Грыгар'янц Л.А., Паўлаў В.В., Грышын Р.Р... «Савецкая Беларусь», суровы прыгавор падпісваю першы...

— І жнец, і на дудзе ігрэц. Ты ў нас, Тамаш, замест радыё.

— Камісар. Толькі газэты ў цябе яшчэ часоў цара Гароха.

— Нічога, неўзабаве будуць новыя, — цешыцца наперад і абяцае Тамаш.

А ў баб — свая газэта. Сны. Гэта ў іх — і газэта, і малітва. Кожную раніцу хто-небудзь абавязкова пачынае сны расказваць. Слухаюць уважліва, прагна, разгадваюць і падказваюць. Сны часьцей за ўсё — з вайны, цяжкія. А ў лесе, наадварот, усё сьнілася даваеннае. Можа быць, дзеля таго цяпер сны такія, каб прачнуцца і ведаць, успомніць: усё мінулася, няма тут больш вайны.

Навыперадкі бабы расхвальваюць жыцьцё сваё, нарадавацца ня могуць: во, прачынаемся і бегчы нікуды ня трэба. І ведаеш, што прачнесься. А дзесьці бедныя людзі яшчэ пакутуюць, яшчэ толькі мараць пра такое шчасьце.

Вось так паступова лясная мара пра жыцьцё без вайны карэктавалася, падразалася па тым, што ёсьць. Выскачыў з агню — і радуйся. Чаго ж яшчэ жадаць? Ня стала б горш.

А тут — Вялікдзень. Людзі як бы ўзгадалі, што не адны на зямлі: дзесьці нехта таксама сьвяткуе. Царквы на ўсю акругу і да вайны не засталося ніводнай, куды пойдзеш? На месца пагібелі людзей пайшлі. Рыхталіся да гэтага, Старая ведае, што трэба і як павінна праходзіць. Вялікдзень, а праз тыдзень Радуніца, памінаньне мёртвых, няхай будзе разам, яно як бы і ёсьць адно. Уваскрэс Ён, яны таксама не назаўжды нас пакінулі — дзеля гэтага і ўваскрэс Бог. Дзеля такога выпадку трэба б яечка, хоць адно. Куры ніводнай на ўсе Ўюнішчы. І вось цуд, трэба ж, дзеці ў лазенцы адшукалі — старое, пашарэлае, у крапінку (падумалася нават, што не курынае) яйка. Старая адразу забрала ў іх, паклала на анучку ў стары кошык. Нават твар зазьзяў. Быццам абразок ёй прынесьлі. (У доме Станкевічаў былі абразы, віселі ў заднім пакоі — нехта і іх зьнёс.)

— Тут — усё! — патлумачыла Старая, паказаўшы яйка. І ёй паверылі, абрадаваліся, што ўсё будзе паводле закону, як трэба. На худых грудзях, пад кашуляю,

Старая хавае лісткі са сьвятой кнігі, замасьляныя, сьцёртыя. Калі дастае іх, адразу птушыны позірк у бок Тамаша — як на паляўнічага. Ён сарамліва адводзіць сквапны позірк курца. Дарэмна яго падазраюць у падобных намерах, зь яго хопіць на цэлую пяцігодку газэт, якімі сьцены аклееныя. Праўда, дым ад клею салодкі, плюецца Тамаш.

Сьвітанкам, раненька, калі прачнулася шумлівая дзятва ў Тамаша, Старая пайшла да іх і паведаміла, што Хрыстос уваскрэс.

Дзеці, па-лясному чулыя да любога папярэджаньня, паведамленьня, выраслыя ў трывозе, вечным чаканьні, адразу аціхлі-змоўклі.

— Скажыце: сапраўды ўваскрэс! — дасьведчана загадаў ім Тамаш, і дзеці нядружна (як бы прасыпалася нешта зь няпэўных рук) вымавілі гэтыя словы.

— Ну, вось так. — Старая вярнулася на другую палавіну, а тут бабы ў паўцемры ўжо хрыстосуюцца, але ціха, зьбянтэжана, як бы і ня дзеля іх сьвята. Дзеля ўсіх, але ці дзеля іх: Хрыстос, уваскрасеньне-ўзьнясеньне — усё гэта з далёкага маленства, з таго жыцьця, калі была вёска, іх блізкія былі, усё было...

А потым пайшлі — усьлед за Вэнэрай і Окцяй — на луг, туды, дзе гарэлі людзі. Тамаш і Васілёк несьлі рыдлёўкі, яны ішлі ззаду за ўсімі. Старая доўга чытала малітвы, стоячы сярод страшнае плямы, чорнае, як патэльня. Нахілялася, брала чалавечую костачку, цалавала і складвала ў кучку.

Вэнэра як села каля кучы чалавечых касьцей, што расла, на халодны, як жалеза, дол, так і не ўздымалася, не варушылася, здавалася, пайсьці адсюль ужо ня зможа. Да яе падыходзілі, нахіляліся:

— Ты паплач, паплач, дачушка! Бачыш, Окця...

А Окця стаіць уся ў сьлязах, але бяз крыку, без выцьця, твар мокры, нават рукавы, рукі мокрыя. Вочы зусім як і не яе — адно мальба дзіцячая: за што мяне так?! Бабы, гледзячы на яе, пачыналі ціха падвываць,

але тут жа заціхалі: строгія вочы Старой не дазвалялі гэтага ім. Сёньня асаблівы дзень: Ё н у в а с к р э с!

Пад ціхія сьлёзы выкапалі яму: Тамаш арудаваў адной рукой, дапамагаючы каленам, Васілёк, худзенькі і такі ва ўсім старанны, працаваў, як сапраўдны мужык. Зьнесьлі ў яму ціхія костачкі, чарапы, засыпалі зямлёю. На сьвежую магілу Старая паклала лісток, напісаны ад рукі (зьняла з грудзей, з патаемнага вузялка дастала), і прыціснула яйкам, якое ўвесь гэты час трымала ў далонях дзяўчынка.

Плач, крык на поўны голас прарваліся, калі перайшлі да другога жалобнага месца — да рова. Тут перабілі, пастралялі мужчын. А яшчэ раней — тыя восем сямеек, якіх «асобы атрад» зьнішчыў. У роў гэты раней ніхто не хадзіў, не спускаліся, але часам прыходзілі і заварожана глядзелі зьверху на белыя вялікія косьці, раскіданыя, як лаўжы, на страшныя чарапы. Нават дзеці ня бегалі сюды. І цяпер усе стаялі наверсе, над ямай-ровам, як над брацкай магілай, што раптам раскрылася дзеля Апошняга Суду, — спусьцілася да мёртвых толькі Старая.

Вось тут і прарвалася. Закрычалі ўсе ў адзін голас, падобны на выцьцё. Як бы адкрылася людзям сьмерць, уся і без анічога. Быццам прапала раптам неба, а засталіся толькі зямля, прах ды людзі сам-насам зь мёртвымі сваімі. І дзень, як знарок, спахмурнеў, сышла ранішняя сінеча, малако туману зацягнула і брудныя, усё яшчэ чорныя сады, і далячынь, і вышыню — толькі яма з касьцьмі ля людзкіх ног. Ды страшная Старая, што капошыцца там: гаворыць, гаворыць нешта.

— ... Дакуль, Уладыка сьвяты і ісьцінны, ня судзіш і ня помсьціш жывушчым на зямлі за кроў нашу?..

Замоўклі наверсе, замерлі ад міжвольнага жаху.

— І дадзеныя былі кожнаму, — зь ямы, сьмяротна белай, прамаўляла Старая, — адзеньне белае, і сказана ім, каб яны супакоіліся яшчэ на малы час... Чуеце, людцы: на малы час! Пакуль суродзічы вашы і браты, якія будуць забітыя, папоўняць лік...

О, Божа, што гэта? Людзі наверсе ня ўлоўлівалі ўсіх словаў, але ведалі: нешта адбываецца большае нават, чым пераЖытая імі бяда, пераЖыванае імі гора. Тое раніншняе, з чым яны прачнуліся, што іх сёньня на сьвітаньні сустрэла: Вялікдзень, забыты дзесьці ў маленстве Бог, Сын Бога, які аЖыў у вайну, з вайною да іх вярнуўся, — Ён тут, у гэтай яме разам з усімі. І ўваскрасаць ім разам. Але толькі пасьля таго, як будзе папоўнена лічба...

Тамаш адышоў ад рова, каб закурыць. Побач зь ім, як навязаны, Васілёк, яму таксама дазволена лічыцца дарослым і курыць.

— Дзеду, а што яна кажа?

— Старая ведае, што казаць. Яна ўсё разумее.

— Жудасна неяк. Страшней, чым у вайну было.

— Нічога, наша дзела правае. Табе яшчэ Жыць ды Жыць.

Ворыва пачалі з агародаў, што на паўднёвых касагорах, абласканых майскім сонцам. Вясна пазьнілася. За плуг стаў аднарукі Тамаш. Запэўніў баб, што тоўпіліся вакол:

— Стары конь баразны не псуе.

— Шэры не сапсуе, а за сябе не ручайся, — зразумела, не ўтрывала Окця. Але падхалімкі-бабы дружна заступіліся за аратага:

— О, наш дзед яшчэ хоць куды!

— Не губляйся і ты, Окця!

Бессаромныя, пра абяцаных ёй генэралаў ды капітанаў ужо нібыта й забыліся.

А ўжо як лашчылі-песьцілі Шэрага — і бабы, і дзеці: ён у іх і харашун, і разумненькі, бяду-гора іх разумее, зусім як чалавек. Яму і бульбачку на далоні прынясуць, і шмат праснака, адабранага ва ўласнага трыбуха, які ўвесь час бурчыць з голаду, а ўжо як гладзіліпагладжвалі з усіх бакоў. Быццам любае немаўлятка, калі мыюць яго ўсёй сям'ёю.

Насенную бульбу зьбіралі з усіх капцоў згарэлай

вёскі. Бульба даўно згніла, разрытыя, як брацкія магілы, капцы сьмярдзяць, хоць ты не падыходзь да іх. Адна сьлізь засталася. Але нешта ў тых, дзе сушэй, ацалела, адмылі, пачысьцілі — ану ж вырасьце.

Пасьля цэлага дня працы на сваім полі (упарта не называлі па-калгаснаму «прысядзібны ўчастак», а з гонарам: «маё поле», «тваё поле»...) яшчэ адна радасьць — лазьня.

Яе рыхтавалі з раніцы. Ацалела на другім канцы вёскі, каля рэчачкі-канавы. Вады нацягалі, дроваў, напалілі, як трэба. Першых у лазенку пусьцілі Тамаша з Васільком.

— Каб дух мужыка там пасяліўся, — бадзёрыліся бабы.

— Які ад мяне дух, — угамоньваў Тамаш.

— Дух, ён і ў старога канягі застаецца, — Окця не змаўчыць.

Вэнэра сваю чаргу адсунула на канец. Растлумачыла, што ня любіць жару.

А раней і жар у лазьні, і дні такія, о, як любілі ў іх сям'і. Сьвята. Асабліва падабалася ёй церці вяхоткаю цельца брацїка альбо каго-небудзь зь сястрычак, спалохана-паслухмяныя сьпінкі, грудкі, а калі сьлёзы пачыналіся, цалаваць-зьлізваць іх з мордачак разам з мылам, пакрыкваць на дзяцей і рагатаць разам зь імі. Пасьля лазенкі падоўгу заседжваліся за сталом, гарбату пілі зь мёдам, часам нават зь белым хлебам, тату прасілі чытаць ім «пра багоў». Дзеці ажно падскоквалі на лаўках ад задавальненьня, калі каторы ўжо раз чулі вершы пра тое, як багі таксама хадзілі ў лазьню і во гэтак потым усаджваліся за сталом: «бралі чарку», хлёбалі беларускую крупеню, а калі хто паперад галоўнага бога соваў лыжку ў місу, атрымліваў па ілбе ад самога Зэўса. Мабыць, лыжка ў яго вялі-ікая была! Калі даходзіла да гэтага месца, Вэнэра загадзя пачынала хапаць дзяцей за рукі: адзін аднаму ілбы паразьбіваюць, навыперадкі лыжкамі махаюць. Мама ж старалася су-

няць і малых, і старых: усе яны, як дзеці! Нават такі вясёлы хатні шум-гам яе палохаў.

У тых таткавых вершах было — дзеці ажно падалі пад стол — і пра Вэнэру. Багіню, прыгажуню, з чырвонымі шчокамі, якая тым адно і занятая, што фарбуецца, мажацца, перад люстэркам задам круціць, хвастом мяце, і багі з-за яе сварацца, ледзь не ў кулачкі ідуць. Тут ужо малыя — назіральныя, нягоднікі! — усіх Вэнэрыных залётнікаў назавуць, усе вясковыя мянушкі згадаюць, ухіляючыся ад Вэнэрынага ручніка, які хвастае па іх.

Калі Вэнэра, пасьпешліва скінуўшы зь сябе брудныя рабочыя анучы (а іншай апраткі на зьмену няма ні ў яе, ані ў кога няма), шмыгнула ў лазенку, да старых, там яе сустрэлі, ну, як тыя таткавы багі, — ухвальным гоманам. І такая яна ў іх ладная, і ўсё ў яе на месцы! Тут жа сталі параўноўваць з Окцяй. У той мяса болей, а ў яе — ну, усё, як точанае. З гэтымі бабамі проста немагчыма. Хоць ты пад полку ад іх хавайся, бессаромных. Апалоскваючыся мяккай ад пары вадою, не-не ды і знаходзіла Вэнэра знаёмую шурпатасьць на шыі, на плячы, сьпіне. Гэта зь ёю застанецца, колькі жыць ёй. Якая ўжо тут радасьць ці хараство, пра што гэтыя бабы языкамі мелюць! Руку сваю возьмеш у другую і тут жа кінеш, хочацца кінуць. Чужое, перапончатае нешта. Але й тая рука, што шпурляе, самая такая ж. А калі нармальныя чые возьмуць руку яе ды пагладзяць? Бабы, бабы, якія там лейтэнанты, ніхто і блізка да нас не падыйдзе. Толькі маме і дала б бязбоязна рукі свае, разам бы і паплакалі.

Лазьня разгаварыла і Старую — глядзець страшна на яе, такая яна плоская, чорная ўся і чамусьці вялізазная! — голас яе памякчэў, быццам памаладзеў.

— Дзе лазьню цэніш, дык гэта там. Костачкі ажно шэраньню пакрываліся, адагрэцца няма дзе, баракі прасьвіствае ветрам, сьнегам. А мне пашэнціла пры лазьні служыць. Гэта калі ўжо маіх Госпад прыбраў. Адмучылася і нявестка, дзетак ня стала, унукаў маіх ніводнага. Ну, а сын яшчэ раней. Ага, дык упаўзае ча-

лавек у пару напалавіну з дымам, пекла, а ня лазьня, але ў пекле гэтым шчасьліўчыкі, раты бяззубыя, цынготныя ашчэраныя, усьміхаюцца. А бабы, паглядзелі б вы на іх! Ды мы з вамі прыгажуні (пра Вэнэру і Окцю не кажу) перад імі! Аднойчы жонак ваенных прывезьлі, каго ў чым. У шаўковай сукенцы, парванай, як у цыганкі, а на нагах лодачкі на такіх вось абцасах. З самой Масквы, Ленінграду. Плачуць, напужаныя, а ўсё адно маладыя. Глядзяць на старажылаў, як на паўсталых з магіл. А мы ведаем: трох месяцаў ня пройдзе, будзеце і вы ня лепшыя. Яны і самі неўзабаве сьцямілі. І вось адна, у лазьні, кажа: «Жанчыны, мы яшчэ жанчыны, давайце запомнім, якія мы былі, хто якая была, каб калі ўсе станем на адзін твар, бабулямі, як усе тут, ведаць, што нехта помніць, якая я была. Якой калісьці мяне муж бачыў». Сталі ў круг, голыя, і глядзяць.

— Бессаромныя! — тут жа асудзілі бабы.

— А што бессаромныя? — заступілася за тых, далёкіх, Старая. — Каб толькі ведалі вы, бабанькі, што лесапавал з нас выробляў. Цягне баба, дзеўка камель яловы, як чыгун цяжэразны, перакідвае з канца на канец, а ў яе ўсё і валіцца. Сядзе на сьнег і запіхвае матку пальцамі. Во якое хараство. І калгас там раем здасца. Дзеля гэтага і зроблена было так.

Ва Ўюнішчах аб'явіўся мужык, незнаёмы. Мяркуючы з таго, як апрануты, — з раёну. Быццам агляд бабам рабіць прыбыў. Выгляд такі — правяральшчыка. Акурат Окці бульбу саджалі, на яе полі.

— Памагай Бог, таварышы бабы!

Адгукнуліся звыклым:

— Казаў Бог, каб сам памог.

— За гэтым ня стане, за намі не заржавее, — пазірае на брудныя свае боты, замазюканыя штаны. — Добра папрацавалі народныя мсьціўцы: ніводнага мосьціка не засталося.

— Наша работка! — пахваліўся Тамаш.

— Ёсьць пляны асушыць вас.

— Пляны? — Тамаш вырачыў вочы. — А помніце перад вайною галоўку ваенную ўсю расстралялі. За гэта самае. Палесьсе зьбіраліся асушаць, акупантам дарогі пракласьці для іх танкаў. І дзе б мы тады хаваліся? Вось энкавэдэ за такія справы іх у расход.

Папужаў чалавека Тамаш і, пэўна, не без разьліку. Бо раптам спытаў:

— А як цяпер на гэта глядзяць? Можа, дакумэнты ў Бэрліне знойдуць?

— А ўсё і так ясна. Перамога за намі.

І ўсё яшчэ як бы не пачулі бабы. Што перамога за намі, гэта казалі і год, і тры гады назад, — а вайна цягнулася і цягнулася. Ды ці скончыцца яна калі-небудзь?

— Таварышок, можа газэты сьвежыя маеце? А то мы тут... — Тамаш ужо пра плуг забыўся, пазірае на кірзавую сумку раённага пасланца. Васілёк умомант перахапіў у дзеда ручкі плуга: раз газэтамі запахла, а тым больш сьвежымі, дзед адключыўся надоўга. Ссумаваўся ля тых старых, «насьценных», як конь калгасны пад вясну ля кармушак, набітых саламянаю трухою са старых стрэх.

Васілёк пацягнуў за сабою сьвежую тлуста-чорную баразну, а за ім подбегам, жвава так падскокваючы, кінуліся дзьве бабкі зь вядром і кошыкам, спрытна прыкладваючы далонькі з бульбінамі да мяккай зямелькі.

Ну а астатнія ўсе стоўпіліся каля рэдкай цяпер у вёсках чалавечай пароды — двух мужыкоў. Цяжка, бадай, уявіць дзьве асобіны адной пароды, гэтак адрозныя. Двух гэтак адрозных беларусаў. Але гэта менавіта беларусы, кожны скажа, зірнуўшы на іх насы. Беларусы якраз насамі прыкметныя, адрозьніваюцца ў бурным славянскім моры, гэтак жа, як украінцы брывамі, расейцы — скуламі, сэрбы — падбародзьдзямі.

А між тым нос Тамаша і нос прышэльца з раёну такія непадобныя: барадаўкавая бульбіна ад вуха да вуха ў зарасьцях сівых валасоў і — вузенькі, з шырокім лязом, цясак. Такі дыяпазон нашых насоў: ад і да.

А я бачыў нос, у якім адрозьненьні альбо, скажам, вартасьці і аднаго тыпу і другога сумяшчаюцца. І шырыня і вышыня адначасова. Трапіўся на вочы мне ён у Нью-Ёрку, у вэстыбюлі Калюмбійскага коледжу: я падышоў да ліфта, а там ужо чакае чалавек. Зірнулі адно на аднаго: дзе ж я цябе бачыў? Падумаў я не пра чалавека — пра нос. Успамінаў нядоўга: Якуб Колас! Наш клясык, працяглы час сусед мой на вуліцы Акадэмічнай у горадзе Менску. Да чаго ж падобны гэты амэрыканец на яго! Зрэшты, ці амэрыканец? Яны таксама бяз гальштукаў больш любяць, але каб так вось шэранькую кашулю зашпіліць на крайні гузічак, ажно пад горла (худое, жылістае, старэчае), — ці ня наш, ці ня мой зямляк?

І ўявіце: так яно і выйшла. У залі коледжу мяне чакала яшчэ ня менш за пяць дзясяткаў беларусаў. Але ж калі праз аанаўскую нашу місію, беларускую, мяне заказваў дэкан коледжу — прачытаць даклад (любы выступ у іх «даклад») пра савецкую літаратуру, — гаворка ішла пра студэнтаў-амэрыканцаў, славістаў. На беларусаў (гэта 1982 год) мяне, бадай што, і не адпусьцілі б.

Але самая вялікая нечаканка — я сапраўды сустрэў Міцкевіча, брата Якуба Коласа. Той, каля ліфта, — адзін з уцекачоў ад паўторнага вызваленьня. Бо, калі ў 1939 годзе Заходнюю Беларусь вызвалілі, яго (хаця і брат клясыка беларускай літаратуры, а, магчыма, менавіта таму) нашы энкавэдысты мардавалі, як адно яны ўмелі, робячы вакол яго кругі і петлі. Другога нашэсьця «саветаў» (так нас называлі ў Заходняй Беларусі) вырашыў чалавек не чакаць. Можа, і менскага брата пашкадаваў: не хапала яму мецъ у родзе высланага ў Сыбір «ворага народу». (Школы нейкія беларускія арганізоўвалі пры немцах, падручнікі на беларускай, «нацдэмаўскай», мове пісаў — ці шмат трэба «саветам».)

Не з таго шэрагу, але згадваеш пасьляваенны анэкдот: што лепш — мець брата камандзіра партызанскага атраду альбо брата, які «супрацоўнічаў зь немцамі»? Дык вось, другое найлепш. Чаму? А вось чаму. Цябе

выклікаюць у вядомы дом (каго не выклікалі, хаця б дзеля «прафіляктыкі»?).

— Хто ў вас брат?

— Камандзір партызанскага атраду.

Гучыць ганарова? Гучыць.

А калі сам і ёсьць той камандзір, дык пытаюць, а хто брат твой. Паліцай... Стараста... Настаўнікам быў пры немцах...

Галоўнае ня хто ты сам, а чый ты брат, сын, дачка, унук!

Ну але я не пра гэта.

У прышэльца з раёну вочы пастаўленыя вузка, як у ваўка (вузкі нос-цясак дазваляе), але ня злыя, а хутчэй гульлівыя, пабалакаць чалавек, бачна, схільны, што трэба растлумачыць, не ганарысты.

— Хто ж вы, таварышок, будзеце? — цікавіцца Тамаш, пакуль рукі прышэльца перабіраюць у сумцы паперы.

— Фінінспэктар я. Паслалі вывучыць акалічнасьці на месцы. Машына засела ў Багуслаўцы. Во чорт, там у мяне раёнку выманілі. Газэту.

Тамаш ажно застагнаў ад засмучэньня. А госьць:

— Ну, як вы тут дзень перамогі адзначылі?

— Якой перамогі? Дык хіба?.. — Жаласны ня голас нават, а піск у натоўпе баб.

— А вы што, ня чулі? Ня ведаеце, што Бэрлін — капут, вайна — капут, амбец Гітлеру?.. Дзявятага траўня ўвесь сьвет сьвяткаваў.

— Увесь сьвет... — Той жа пакрыўджаны голас-піск.

І завылі. Што тут радасьць, а што крыўда — ідзі разьбяры ў тых баб. Толькі дзеці яшчэ могуць плакаць з такім самакатаваньнем, калі кожная клетачка разрываецца ад горычы-крыўды. Усе, усе людзі на зямельцы ўжо ведалі, ужо радаваліся, сваіх успаміналі, а яны тут поўзаюць у гразі, ім гэтага не дасталося! Забыла

пра іх далёкая тая Перамога. Пра іх ніхто і ня ўспомніў, абышла агульная радасьць.

— Дзявятага, дзявятага, калі ж гэта было?..

— Што мы ў гэты дзень?..

— Ну і няхай гэта будзе ў нас сёньня, — разумна разважыў Тамаш. — Клічце чалавека ў дом. Вэнэра, гэта ж твой дом. Запрашай.

І ўсе павалілі з агароду. А Тамаш ніяк не суцешыцца:

— Газэты, гэта ж трэба, дасталіся паліцаям. Багуслаўка, там гарнізон да сорак трэцяга быў.

— Так цяпер і будзе, — яго падтрымалі, — вядома, муж любіць жонку здаровую, а брат — сястру багатую. А з нас што возьмеш? Усё пагарэла. Каму мы трэба, такія? Немца ж прагналі, пра нас можна і забыцца.

— Не забудзем! — цьмяна паабяцаў фінінспэктар. — Ого, які дом! А сад!

Выграблі і сабралі на стол усё, што маглі, што было. А што і адкуль выграбеш? Але што запомнілася, дзецям асабліва, дык гэта драбочкі шакаляду ў залатых паперках, выкладзеныя на стол прышэльцам з раёну.

Амэрыканскі шакаляд. Нейкая «Юнра» дасылае.

Залатыя паперкі яшчэ доўга не-не ды й трапляліся на вочы, як знакі ледзь не патойбочнага сьвету. А дзівоснае слова «Юнра» замацавалася цьвёрда. Дзеці, няўдзячнае племя, прыляпілі яго самому прышэльцу: «Юнра» і ўсё. Згадваючы яго, так толькі і называлі.

«Юнра» як бы распачаў лік, сьпісавы склад прышэльцаў з раёну — неўзабаве пацягнуліся яны адзін за адным.

А вось і машына прабілася ва Ўюнішчы. Раз машына, значыць, нейкае начальства, не затрымліваючыся каля адзінага ацалелага дому, амэрыканскі «віліс» (хлапчукі ведаюць усе маркі) пакаціў па былой вуліцы былой вёскі. Потым вярнуліся, пад'ехалі да баб, што зачакаліся гасьцей. Вылезьлі трое, спачатку ўгору паглядзелі, на цынкавы дах, а ўжо затым на людзей.

— А што тут было да вайны? — спытаў самы белатвары.

— Жылі людзі. Во яе сям'я, Станкевічы, — паказалі на Вэнэру.

— Колькі ў калгасе людзей?

— Калгасу, гэта, як бы яшчэ і няма, — няўпэўнена прамовіў Тамаш.

— А куды ён падзеўся?

— А што, немцы ўсё звозілі. Можа, і калгас зьвезьлі.

Галоўны госьць жарты разумее. Радасна агледзеў сваіх.

— Народ ня вешае нос. Гэта добра. — І паабяцаў бабам: — Самае цяжкае ззаду. Нічога, зажывём ня горш, чым да вайны.

— Добра б — лепш, — не згадзіўся нехта.

— Зразумела. Перамаглі мы, наша дзела правае.

Наступныя наехалі з громам і ляскатам — на танку. Нарэшце да Ўюнішчаў дабралася Перамога, высадзіла свой дэсант. Проста пад ногі — бабам, дзеткам. З брані паляцелі вузлы, сумкі, а ўсьлед няўпэўненымі нагамі ўюнішчаўскай зямлі крануліся тры мужчыны. І бабу прывезьлі: ледзьве вылушчылася з танка. Бачна, што яе выпіхваюць пад зад. А ўсьлед паказалася вясёлая морда ў танкісцкім шлеме, белыя вочы, белыя зубы. Гарлае:

— Во колькі вам калгасаўцаў прывезьлі! А вы нам — унё тую.

І паказаў на Окцю.

— І гэтую, — разгледзеў і Вэнэру.

— Губа ня дура, — загалдзелі бабы, — выбраў прыгожых, багатых.

— Вы лепш у нас заставайцеся. Хопіць за граніцаю катацца.

Божа, як ім мала трэба. Каб зноўку засьвяціліся жаночыя вочы, пазванчэлі галасы. Быццам і сапраўды вярнуліся жаніхі, мужы, бацькі.

— Здаю вам па накладной, — шчэрыць зубы танкіст, — айн, цвай, драй. І фраў. Ня крыўдзіце началь-

ства. Аўфвідэрзэйн! Ну, што, прыгажуні, месца ў нас вызвалілася. Паехалі, а?

Пачакаў, засмучана махнуў рукою і зьнік у люку.

Газануў, крута разьвярнуў зь ляскатам сваё цяжкое жалезьзе, гарматаю ледзьве ня зьнёс калодзежны «журавель».

— Хаця б малачка-а папі-ілі! — пачулася наўздагон, тужліва-адвечнае, бабскае.

Танкісты быццам пачулі той крык, раптам спынілася грымучая бляшанка. І зноўку вызірнула белазубая морда: «Эй!..» А больш не разьбярэш.

Хлапчукі паляцелі туды, хутка вярнуліся. З гонарам далажылі:

— Пытаў прозьвішча Вэнэры і Окці. Мы сказалі.

— Дзе я? Я ўжо ледзь жывая, — трымаючыся за растрапаную галаву, скардзіцца паўнацелая кабета, высаджаная з танку. Голас сіпла-мужчынскі.

— На гэтым сьвеце, на гэтым, Груня, — супакойвае яе самы прыкметны з прыежджых. Чарнавалосы, высокі, а замест рукі пустое зялёнае рукаво нямецкага мундзіра — яно ў яго лунае, лётае, як жывое.

— У цябе якая рука? — пытае ў Тамаша. — Твая і мая — во і чалавек. Будзеш маёй праваю рукой.

А бабы ніяк не супакояцца, у іх свае перажываньні, расхваляваў танкіст, што зьехаў.

— Што, што ён сказаў? — прычапіліся да дзяцей. — Якія вы бесталковыя!

— Не, а як пачырванела наша Вэнэрачка.

— Чые харомы? — зацікавіўся другі «дэсантнік», на якім рамянёў, сумак, спражак, як на кавалерыйскім кані. Увесь у чорнай скуры. Калені пад скуранымі штанамі — круглыя, буйныя. І фізіяномія (адно да аднаго) непраўдападобна даўгая. Ну проста конскае ўсё.

Па занепакоеным твары Вэнэры адразу сьцяміў, у каго пытаць пра дом.

— Твой, значыць? Глядзі ты, цэленькі! У ім што, немцы стаялі? Паліцэйскі пост?

Бабы былі абражаныя:

— Якая ў нас паліцыя? Мы і пацярпелі таму, што партызанская вёска. А цяпер ім добра, у іх там, у Багуслаўцы, хаты цэлыя.

— Ну, каму цяпер добра, а каму — кепска — нам вырашаць, — аб'явіў скураны.

— Энкавэдэ разьбярэцца, — прыдурняючыся дадаў аднарукі ў нямецкім кіцелі. І патлумачыў яшчэ раз, да прыкметнай незадаволенасьці скуранога: — Нашы органы ніколі ня сьпяць. І вам спаць не дадуць.

Трэці (у пакамечаным шэрым касьцюме) заняты тым, што дапамагае разабрацца з вузламі жанчыне, што прыехала ў танку. Худзенькі, як падлетак, рэдкія валасы на вузкай галаве, рэдкія зубы, — зразумела, чаму выгляд у паўнагрудай Груні такі незадаволены. Што маем, ня цэнім. Бабы ўжо ўсё сьцямілі і разважылі, хаця і маўчаць. А ім і аднарукі яшчэ растлумачыў:

— Знаёмцеся. Наша савецкая ўлада, сельсавет ваш. Гэта — вы ўжо ведаеце: органы. Ну, а я — старшыня вашага калгасу. Калі аберацe.

Тамаш ужо быў расчыніў валасаты рот, каб пацікавіцца: дзе вы той калгас бачыце? — але не пасьпеў: у двор ступіў Шэры. На ім шчасьлівы абарванец Васілёк усьсеўся, гойсае па непакрытай сьпіне, але харашуна-каня гэта ані не бянтэжыць, ён перабірае тонкімі нагамі, як на парадзе, як пад маршальскім сядлом, гунькаю. Можа, гэта здалося новаму старшыні калгасу (пэўна, ужо глядзеў у кіно парад Перамогі), бо не спытаў, а выкрыкнуў:

— Адкуль гэта ў вас? На ім Жукаву езьдзіць!

Вэнэра змаўчала. А бабы адразу ўсё скемілі. Тут жа, як над памерлым, галасіць узяліся над канём: і нага ў яго, во, глядзіце, такая пакалечаная, і тое ў яго, і другое. Адным словам, толькі і прыгодны што для нашых гародчыкаў.

А Вэнэра сьцяміла: вось яно, гэта ўжо адбылося. Колькі разоў пракручвала ў думках, як яна раскажа, што выскажа, якімі словамі і зь якімі сьлязьмі — пра тое,

што для яе значыў Шэры ў самыя страшныя дні, хвіліны, і як я н ы ўсё зразумеюць і не адважацца адабраць у яе. А тут раптам зразумела: усё роўна як тады, калі б яна ў двор да сябе трактар альбо танк прыгнала. Конь — хто ёй дазволіць? Гэта толькі здавалася, што ён ёй належыць. Як тады ў лесе партызаны: убачылі каня — іхны! І чым лепшы конь, тым больш іхны. Дык яны хоць вярнулі.

Той, каго аднарукі назваў савецкай уладаю — плямы на раззлаваным твары, ашпараным бесьперапынным шыпеньнем жонкі, — раптам падаў голас:

— Гэта што ж, дзеўка, і конь таксама твой? Ды цябе раскулачваць хутка будзем.

— Наш конь, наш! — загалдзелі бабы. — Усе агароды нашы засеяў.

— Ну, дзе тут каністра? — умяшаўся старшыня, будучы «Жукаў» (ня ведае, што цяпер яго так будуць называць). — Пара заліваць страсьці. Вядзіце ў дом: госьці са сваёй выпіўкаю, са сваёй закускаю. Дзе такіх яшчэ адшукаеце?

Першае застольле ў доме Вэнэры запомнілася, можа, таму, што першае было. Але галоўнае, што яны, бабы, яшчэ тут гаспадарамі сябе адчувалі, а начальства — гасьцямі. Размовы былі і адкрытыя, і амаль задушэўныя. Як-ніяк разам перамаглі такога лютага ворага, разам і жыць цяпер. Разам, але як?

І пра тое ўспомнілі, нагадалі, як абяцалі ў вайну: усё па-другому будзе. Альбо будзе, як у той прымаўцы Тамашовай, зразумела: калі тануў, сякеру абяцаў, а выплыў — і тапарышча шкада?

— Ды вы, бабы, прападзеце без дапамогі дзяржавы, — угаворвае Косьця-старшыня.

— Калгасы — шлях да зажытачнага жыцьця. Лепш за Сталіна ня скажаш! — трасучы галавой паўтарае адно і тое ж «Савецкая ўлада», для якой Косьцева каністра скончылася на другой шклянцы. (Жонка і другой дапіць ня дала.)

— Не, вы скажыце, — не сунімаецца Тамаш, —

чаму фашыст калгасы не распускаў? А павінен быў. Савецкія ж калгасы. Не распусьціў, толькі кляймо зьмяніў. Абшчынай сталі называць. А цябе во, старшыню, называлі старастам.

— Дык я табе, дзед, староста? Ды я іх сам, ведаеш, колькі!..

— Ня ў слове справа. А ў тым, што і для фашыста калгас выгадны.

— Ну, дык што табе трэба? — згаджаецца бесклапотны Косьця. — Значыць, такая форма, сам кажаш, зручная. Для ўсіх прыгодная.

Тут Косьця-старшыня ўскочыў на ногі, як пеўнік, паляпаў сябе па баку і кукарэкнуў на ўсю глотку:

— Хлеб гасуда-арству!

Пасьля — з нагамі ўскочыў на лаўку, кароценькай рукою ў паветры паторгаў і галаском пеўніка маладзенькага:

— І эмтээсу!!!

«Энкавэдэ» ажно заторгала, аж за сумку схапіўся, шныпарыць у ёй, нэрвова нешта шукае. Косьця п'яны-п'яны, а ўсё прыкмячае:

— Ну, што ты ўсё у гэтай торбе шныпарыш? Што ў цябе там — мандавошкі?

— Угаманіся, Крук! Не губляй твару. Народ глядзіць. Вас яшчэ выбіраць павінны.

— Ах, праўда, выбіраць. Окця, выбераш?

— Я яшчэ пагляджу.

— Ну, і глядзі. Во Вэнэра — добрая душа. Як, Вэнэра?

Шалапут ты, падумала Вэнэра.

Бацька любіў слова: рызыкант. Гэта пра такіх. Іх і ў вайну хапала. Колькі прайшло праз дом Станкевіча, хочаш, ня хочаш, з усякімі-любымі трэба ўжывацца. Бацька гэта ўмеў, хаця цану ім ведаў. Адным днём жывуць. Глядзяць і ня бачаць, кажуць і самі ня чуюць, што кажуць. І цьвярозы, як п'яны. Ненадзейныя, хоць плач. Прыгодныя для вайны, а жыць як?

Калі «Савецкую ўладу» жонка Груня пацягнула спаць, а Косьця-старшыня бяздумнымі вачыма ўпёрся кудысьці ў сьцяну, вось тады загаварыў скураны Энкавэдэ:

— Вось што, жанчыны, шкада мне вас: таму скажу. Уважліва слухайце, ні ад кога больш не пачуеце. І я апошні раз кажу. Дзень такі, добра. Тое, што вам наабяцалі народныя мсьціўцы, партызанчыкі гэтыя, калі пілі вашу самагонку тут ды яечню жэрлі, забудзьце. І ніколі не ўспамінайце. Асабліва ўголас. Так будзе лепш для ўсіх.

Вайна вярнула яшчэ аднаго мужыка Ўюнішчам. Як выплюнула. Пакуль вайна сама не акапуцілася, ён дзесьці качаўся па шпіталях, ну, а цяпер: прымай, баба, што засталося ад суджанага! Гэта Прохар, даваенны старшыня ўюнішчаўскага калгасу «Запаветы Ільліча». А жонка ягоная Вольга, ёй па яго ехаць. Зьбіралі ўсім домам: хто спадніцу ацалелую, чысьцейшую, хто хусьцінку на галаву. Яна ж едзе туды, адкуль вяртаюцца мужыкі, і нельга там паказвацца бабе, на якую і глядзець не захочацца. І плакалі, і сьмяяліся, гадаючы, што вайна Вользе пакінула, а чаго не пакінула. Косьця-старшыня ўважыў свайго папярэдніка, даў пад яго (альбо што засталося ад яго) ня толькі Шэрага, але і лёгкі вазок, які здабыў дзесьці ў суседняй вёсцы, у «брыгадзе». (У калгас «Запаветы Ільліча» цяпер уваходзілі чатыры вёскі.)

Пад вечар Прохар быў дома, нават начальства выйшла яго сустракаць — выманілі галасы баб, плач, выгукі. Толькі вясельных званочкаў на дузе не ставала, гэткім урачыстым было яго прыбыцьцё: фурман Тамаш з хвацка наматанымі на руку лейцамі, шчасьлівыя Вольга і Прохар, як галубкі, ззаду. Цяжкая рука мужа ляжала ў Вольгі на плячы, а яна галаву схіліла ці то ад цяжару, ці то ад зьбянтэжанасьці, што менавіта яе ўзнагародзіў лёс, вылучыў адну з усіх. Нават румянак на запалых немаладых шчоках. Другой рукой Прохар напружана трымаецца за край кашоўкі.

Цяжкія, незнаёмыя чорныя вусы, як у цыгана, і чамусьці на галаву вышэйшы за Вольгу, а было заўсёды наадварот. Але тут жа пабачылі, сьцямілі: гэта ён забраўся на сядзеньне з нагамі, а праўдзівей — з абрубкамі ног, шырокімі, таўшчэзнымі, як у слана, абцягнутымі пацёртаю скураю. Бабы адразу насунуліся:

— Прохарка, а майго Нічыпара не давялося там бачыць?..

— А майго Паўла?..

Інвалід раптам, як малпа, спрытна, толькі мэдалі зьвякнулі, пераскочыў церазы кашоўку, павіс на руках — спусьціўся туды, дзе дзеці. Ніхто не пасьпеў скеміць і дапамагчы. Тамаш толькі падаў яму дошку на калёсіках.

— Во я і на сваёй зямлі, — крактануў інвалід, спрытна ўскокваючы на дошку. — Прывет, братва!

Дзеці за вайну прывыклі да скалечаных жывёл, людзей. Яны для дзяцей амаль норма, але толькі больш цікава. А тут яшчэ столькі мэдалёў, ордэнаў. І на калёсіках. (Тыя «ролікі», што пад лоўкаю ступнёю нашых сёньняшніх аксэлератаў, якія імчацца па гарадзкіх тратуарах, ці не радня яны Прохаравай дошцы з калёсікамі?)

Карантыш-дзядзечка спрытна падкочвае то да аднаго, то да другога, штурхаючыся рукамі ад зямлі.

— Ну, ты чый? А, ведаю. А ты? З бацькам тваім таптуху цягалі. Ну, цябе, рыжая, пазнаю. Ксеня, твая дзеўка?..

За сталом, з нагамі на лаўцы, ён зноў быў вышэй за ўсіх, і голас ягоны заглушаў нават начальства: нерастрачаная ўпэўненасьць і пачуцьцё перавагі франтавіка, у якога ўсё навідавоку: дзе быў, што рабіў. І гэтыя ногі, і гэтыя ордэны-мэдалі.

— Нічога, баба, пражывем! Яны во пракормяць. Будзь спок! Во за гэты — плоцяць. І за гэты, і за гэты.

У канцы растапыранымі пальцамі па ўзнагародах, як гарманіст па клявішах, правёў. Абняў Вольгу, зьбянтэжаную, як нявеста.

— Нічога, баба, дзяцей завядзем. Да вайны не атрымлівалася ў нас з табой, цяпер атрымаецца. Усё цяпер атрымаецца!

Амаль жа перакананы чалавек быў, як і многія тады: пойдзе справа не як было — інакш усё.

Прохара з Вольгаю пасялілі ў «халоднай» палавіне дому, дзе ж яшчэ, калі ў самым прасторным пакоі цяпер і праўленьне калгасу, і сельсавет, і МГБ, і начлежка для ўпаўнаважаных з раёну. На Вэнэрыным ложку сьпіць Груня з «Савецкай уладаю», на другім — па чарзе альбо Косьця-старшыня, альбо Энкавэдэ, а то і хто з раёну. Добра, што лаўкі шырозныя, дзед і татка пастараліся, — сяк-так разьмяшчаюцца ўсе.

Вэнэра жыве найбольш на кухні, і печ у яе поўнай уладзе.

Спачатку ўлада абяцала, што перабазуецца ў якуюнебудзь з суседніх вёсак-брыгад, якая больш ацалела. Але прыжыліся ў Вэнэрыным каўчэгу. Тамаш тлумачыць проста: іх начальству цяжэй сюды, ва Ўюнішчы, дабірацца. За вайну мясцовыя камандзіры адвыклі быць на вачах у тых, хто вышэй. Правялі тэлефон і жывуць, як у Хрыста за пазухай. Самі сабе галоўныя. У тэлефон толькі і чуеш, як адбрэхваюцца і абяцаюць усё: пра падаткі, пра пазыку, пра чорта, пра д'ябла.

Некалькі разоў начаваў на таткавых лаўках і стары знаёмы, Юнра. Гэты лётае па вёсках, як аса паміж яблынь. Весела абяцае:

— Хутка і вас аформлю, да Ўюнішчаў рукі не даходзяць. Сады тут як ні ў кога.

— Людзей жа няма, з каго падатак браць будзе? — спытаў Косьця-старшыня.

— Паспрабуй гэта ім растлумач! — Юнра махнуў кудысьці ўдалеч сваім таўшчэзным алоўкам, напалову сінім, напалову чырвоным.

З раёну прывозілі газэтку памерам з капусны ліст, брудную, паточаную няроўнымі літаркамі-шашалем. Але і такая для Тамаша — сьвята. Перш чым пачаць

абрываць на цыгаркі «Шлях да камунізму», ён заўжды прачытваў яе ўголас ажно да прозьвішча рэдактара, нейкага Гапановіча І.І. Але для Тамаша чытаньня такога на адзін зуб. Апэтыт даводзілася глушыць старымі запасамі, газэтамі, што на сьценах Вэнэрынага дому. У кухні ён перачытаў сьцены да самае столі па пяць разоў ужо. Цікава забрацца ў пакой начальства, там паболей чытанкі, але дзеля гэтага даводзіцца лавіць момант, калі ў пакоі пуста. Заўжды адшукаеш новенькае на старых-застарэлых сьценах-старонках, яшчэ бацькам, яшчэ дзедам Вэнэрынымі чытаных:

«Кулаччо наглее. Сапсавалі племяннога быка. Перад злучкай ня піў, ня еў два дні, ну, а вынік вядома які»... О чорт, далей тут заклеена!

— Не, дзед, пачаў, падражніў, дык расказвай да канца, — нахабнічае Окця. — А што далей было? Раз ты ў нас палітрук. Паў-літрук!

У газэце «Шлях да камунізму» вычытаў Тамаш пра новы пачын: у такіх вось вёсках бабы запрагаюцца ў плуг, па чатыры, па пяць. Сеяць трэба, карміць краіну трэба! І фатаграфія, але такая гразкая, што не дапетрыш, што ў іх на тварах. Плачуць? Сьмяюцца?

Па тэлефоне ў Косьці-старшыні ўжо пыталіся: як укараняецца пачын? Ён сур'ёзна ім гэтак: праводзім сярод жанчын работу, зрухі ёсьць.

«Савецкая ўлада» да гэтага ставіцца сур'ёзьней:

— Табе жартачкі! А што восеньню ім скажаш? Што здаваць будзем?

— Груня, — не да яго, да жонкі ягонай зьвяртаецца Косьця, — узначаліш патрыятычную справу? А яго — у караньнікі. А то ён у цябе ўсё прыпражны.

— Анічога, тут кабыліцы добрыя, — помсьліва адказвае Груня. — А вы — кабялі. Хутка да яе на печ палезеце, я бачу.

Завядзёнка ўжо, што кожную ноч п'юць. Гэта ў іх называецца: увечары — «падвядзеньне вынікаў», раніцай — «лятучка». І ў прамежках яшчэ «папраўляюць

галаву». («Не прымі, Госпадзе, за п'янства, а прымі за лякарства».) Самагон прывозяць з другіх брыгад, часьцей з Багуслаўкі. Даніну, ці што, бяруць з паліцэйскай вёскі? Ну, а госьці пад гэтую справу — ледзь не штодня. Упаўнаважаныя з раёну едуць і едуць. І гразь, балота для іх не перашкода.

Шэры за баб адсопваецца, цягае плуг па калгасных прасторах. Камусьці трэба. Косьця, шкадуючы, не-не ды й скажа:

— Такога каня сапсуем. Можа, і праўда баб запрэгчы, што ім зробіцца? Пашкадуем, бабанькі, Шэрага?

А ім і праўда — шкада больш, чым саміх сябе. Кароў таксама прыстасавалі: газэтка пра гэта ўвесь час піша, ды і куды падзецца? Ярмо спэцыяльна дзеля гэтага вынайдзена. Косьця прывёз узор: драўляная пятля, накідваеш на галаву і — пайшла, бурая! Першыя дні заплаканыя дзеці на поле прыбягалі, шкада ім каровак, малачко даваць перасталі. Адна кроў сочыцца з вымя.

У Тамаша на ўсе выпадкі жыцьця падрыхтаваная «палітычная ацэнка». А чаго ў сваёй галаве ня вышкрабе, са сьцяны здыме, са старых газэт вычытае. «Конь — вораг сацыялізму. Ударым па антымэханізатарскіх настроях!» І: «Кулаччо наглее!»

Тэлефон паведаміў: калгасу «Запаветы Ільліча» выдзеленыя нямецкія каровы, прыходзьце забірайце. Пастухоў апраналі дзеля гэтае справы, як дэлегацыю якую. Ня пойдзеш жа "ў раён» у нявартай сваёй апратцы. А іншую дзе ўзяць? Чысьцілі, падшывалі. У Окці ажно дзьве сукенкі, і абедзьве ёй малыя, вузкія, выцягнулася дзеўка, раздалася ўшыркі за вайну і пасьля. Ня харч, дык гады, яны таксама нешта значаць. Ёй бяда, а Вэнэры шанцунак. Абдарыла Окця сяброўку па-царску: рабенькая, у чорны гарошак, такое і да вайны папашукаць было.

Тамаш надраіў свой камандзірскі, з зоркай-спражкаю, рэмень да бляску, нават Васілёк нешта знайшоў на вечна босыя, патрэсканыя ногі.

У «раёне» (пыльнае мястэчка) уразіла больш за ўсё колькасьць дамоў. Аднапавярховыя ўсё, звычайныя, але шмат, і яны цэлыя. Ужо амаль забылі, што павінны быць дамы, хаты, будынкі там, дзе жывуць людзі.

— Адсюль нас вывозілі, — раптам паведаміла Старая Вэнэры і паказала на драўляны дом з высокім, цаглянай кладкі, фундамэнтам, — сядзелі, здаецца, у тым во падвале. Высокія падмуркі, бачыш. А яны прыходзілі, у даўгіх шынялях, нават з жонкамі прыходзілі глядзець на маіх унукаў, як на зьвяр'ё. У Сыбіру тым ня верылася, што калі-небудзь пабачу гэтыя свае мясьціны.

Кароў, вялізную плямістa-чорную чараду, адшукалі на ўскрайку гарадка, на выгане, да смалістай чарнаты ўзьбітым капытамі.

— Ну рыхтык палонныя, — адзначыў Тамаш. — А замораныя, замораныя! То ж вядома, ня везьлі, а гналі бедных. І скаціне вайна — ня маці родная. Што нашым кароўкам было, што цяпер іхным.

І тут жа зазлаваў:

— Так вам! Ня браў бы маю, не аддаў бы сваю.

Васілёк кудысьці адлучаўся на хвіліну, вярнуўся і паведаміў:

— Там хлеб даюць!

— Даюць, але, пэўна, ня ўсім, — усьміхнуўся Тамаш. І ўсё-ткі пакіравалі да крамы, паглядзець. Х л е б , к а л і я г о м н о г а, — такога даўно ня бачылі.

Але людзей ля прылаўка зусім ня густа. Крама прасьмярдзела газаю, пэўна, яшчэ з нэпу, але хлебны дух мацней. Тоўстая сонная баба ў брудным халаце шырокім нажом наразае хлеб і ўзважвае на старых вагахталерках, прымацаваных да бэлькі пад стольлю. Перад гэтым вырэзвае квадрацікі з картачак і наколвае іх на высокае шыла.

Пастаялі, паглядзелі, перажываючы, што вунь як недакладна працуюць гэтыя старыя вагі, быццам іх самых абвешваюць. Выйшлі на вуліцу. Тамаш раптам вырашыў: а пайшлі на «таўкучку», там, кажуць, усё ёсьць.

Купім сабе хлеба, мы што — горшыя, у бога цяля сьцягнулі! «А «купіла» дзе возьмем?» — пацікавілася Окця. Дзед Тамаш адно паляпаў па спражцы-зорцы.

— Ці ведаеце, хто болей за ўсіх хлеба можа зьесьці? — задаў загадку ўсім. І сам адказаў: — Калгасьнік. Што заробіць за год — зьядае за тыдзень.

Вось тут нават каменныя будыніны, нейкія склады, відаць, яшчэ купецкія. За імі і схавалася «таўкучка». Ну, проста фэст, падумала Вэнэра, успомнілася, як з бацькам езьдзілі на кірмаш-фэст аж за Бярэзіну. І вось гэткі ж вялізны натоўп там быў, які сьвяточна віжаваў вакол і каля блакітнай царквы, а на вазах чаго толькі ні прадавалі: і парсюкоў, і кур-гусей, і гаршкі-збаны. Так, але там быў цэнтар усяго — драўляная, блакітненькая пад блакітным небам царква, у высокія дзьверы заходзілі, хрысьціліся, выходзілі, хрысьціліся, з тварамі значнымі, пасур'ёзьнелымі, і потым на рынку глядзелі адзін на аднаго, як на знаёмых, віталіся са сваімі і чужымі. На «таўкучцы» ж проста рухаюцца па коле, як сьляпы конь на таку, амаль моўчкі, бяз гучных вокрыкаў альбо сьмеху, бесьперапынна, як заведзеныя. Глядзяць не на твары адзін аднаго, а на руку: што прадаеш?

Уціснуліся ў натоўп — ён сам раптам уцягнуў, нават ня цмокнуўшы, каманду Тамаша, і ён з бабамі адразу ж рушыў па коле з хуткасьцю, якую ня сам вызначаеш, якая зададзеная табе пярэднім і задні́м людам. Ледзь затрымаесься — напіраюць. Так што і пытай пра тавар, і дамаўляйся, і прадавай-купляй на хаду, не спыняючыся. Праўда, ёсьць астраўкі нерухомасьці, людзі зь мяшкамі ля ног і проста не захопленыя блуканьнем па коле: гэтыя толькі прадаюць. Многія і прадаюць, і купляюць адначасова, а большасьць — ні тое ні другое, адно пазіраюць. Заварожана пазіраюць на хлеб, на бутэлькі малака, сыр, сала, на салдацкія боты альбо нямецкую коўдру — усё гэта ёсьць, можна мець. Было б на што памяняць альбо за што купіць.

Тамаш ужо пачаў ляпаць сябе па жываце, а дак-

ладней па спражцы-зорцы, як бы паказваючы, што і ў яго тавар.

— Была, не была, а пабачылася! — рашуча сарваў свой шырокі рэмень і ўзьняў над галавой: — Каму афіцэрскі?

Бабы адразу ў спалох:

— Заарыштуюць за шпікуляцыю!

Таўкучка не адразу адрэагавала на новага камэрсанта. Але ўжо праз хвіліну-другую чужыя рукі сталі мацаць Тамашоў тавар: колькі просіш?

— Не па тваёй кішэні.

— А ты, дзед, лазіў у маю кішэню?

— І лазіць ня трэба, каб дзірку пабачыць.

Дзед, бачна, атрымлівае задавальненьне ад новай, нечаканай ролі, ад увагі да сябе. Зьняў рэмень з пуза, узяў у руку, і ты ўжо важная шышка, людзям патрэбен. З маладзенькім лейтэнантам іншы тон гаворкі:

— Што, цікавіцеся? Вам акурат падыдзе гэткі. Ня сорамна і маёру насіць.

А прывабіла лейтэнанта Окця: у нас, маўляў, купіце. І глядзіць на яго, быццам даўно яны знаёмыя, а маладзенькі лейтэнант — нібыта па галаве яго стукнулі, пазірае і не разумее, але хоча зразумець, што зь ім здарылася. А здарылася Окця: у квяцістай цеснай школьнай сваёй сукенцы яна горш, чым распранутая: усё, што мае, выпірае наверх, сукеначка ў гармошку, колькі ні абцягвай — паўзе ўверх, вось-вось дзеўка вызваліцца зь яе, як зьмяя ад старой скуры. Твар зьбянтэжана-ружовы, але вочы, наадварот, сьмелыя, з выклікам.

Лейтэнант пакорліва дастаў партманэ і працягнуў яго Окці — як разбойніку зь вялікай дарогі. Апамятаўся, пасьпешліва-паслухмяна засунуў у кашалёк пальцы: колькі я павінен заплаціць? Окця махае ў бок Тамаша: ён, ён купец, зь ім справу рабі!

— А нам на бохан хлеба, больш ня трэба! — вырашае Тамаш.

Сто рублёў у лейтэнанта, ого, а ці не зашмат? Яго

амаль сілаю апаясваюць рамянём, умацоўваюць зорку на худзенькім жываце, ён жа адно мармыча:

— Тут жа ня хопіць на булку хлеба. Мала.

— Анічога, хопіць! — І чамусьці адразу: — Другому мы і за тысячу не аддалі б. Окці нашай цаны няма.

— Пры чым тут я?

Ніхто і не патлумачыў бы, пры чым тут яна, але калі пайшоў лейтэнант-курсант, Окцю папракаюць:

— Што ж не сказала хоць, зь якой вёскі?

— Ды ну вас! Вы мяне, ці што, прадаваць хадзілі?

Хлеб гарадзкі смакавалі, як манпасье, грошай і праўда хапіла толькі на акраец. Затое якое смакацьцё!

А на выгане сустрэліся з Косьцем-старшынём. У яго пад пахай белы хлеб.

— Вось, будзеце ў дарозе заядаць малако.

Як пра самагон сказаў і нават нахіліўся панюхаць хлеб.

— Эх, а я рэмень прабазарыў! — ня вытрымаў-такі, пашкадаваў Тамаш. — Хаджу во, як арыштант.

— Затое Окці жаніха знайшлі.

— Каб жа так!

Усьлед за нямецкімі каровамі, якіх, пакуль цёпла, вырашана было трымаць на абгароджаным лузе каля канавы, зьявіліся і самі немцы. Ня тыя, зразумела, ранейшыя, а ваеннапалонныя. Іх прыганяюць будаваць дарогу («Стратэгічную», — з павагаю прамаўляе Тамаш). Калі напрасткі пайсьці праз падсохлае балота, дык гэта ў трох вярстах ад Уюнішчаў. Бабы бегаць туды пачалі, калі пайшла чутка, што ня толькі нямецкія палонныя там, але і нашы. Тыя, каго яшчэ немцы ў палон забралі. Іх прыганяюць рознымі калёнамі, а працуюць на дарозе разам. У баб, вядома, свой клопат-надзея: а раптам хто-небудзь з тых, хто прапаў на вайне, тут аб'явіцца. («А як жа, проста ва Ўюнішчы вам даставяць!» — расхалоджвае іх Тамаш.) Хіба нешта спыніць бабу, калі ёй засьвеціць хаця б маленькая надзея. У першыя ме-

сяцы вайны зьбіраліся па пяць, па дзесяць чалавек і лёталі, качавалі ад лягеру да лягеру і за сто, і за дзьвесьце вёрст. І здаралася, што знаходзілі сваіх мужыкоў, былі выпадкі, што і выручалі, выкуплялі. Як тая баба данесла, дзе хавала пярсьцёнак заручальны альбо царскую манэту (хто толькі іх ні спыняў, ні вытрасаў зь іх усё, што мелі!), гэтага зразумець нельга. Калі немцы адпускалі, дык свае, зразумела, ня ўстояць перад бабскімі сьлязьмі. («А гэта вы забылі, што Масква сьлязам ня верыць?» — нагадваў бязьлітасны Тамаш.)

Палонных ахоўваюць чырвонаармейцы, некалькі афіцэраў. Калі блізка падыдзеш, заўважаеш: у нашых палонных выгляд яшчэ горшы, чым у немцаў. І вочы ў іх галаднейшыя, і адзеньне парванае, загаджанае дашчэнту.

Занава пазнаёміліся бабы зь сяброўкамі сваіх маладых гадоў каля гэтых няшчасных кар'ераў, зь якіх насыпаюць дарогу. Бо набягаюць сюды з усіх бліжніх і нават далёкіх вёсак — «партызанскіх», «паліцэйскіх», «нічыйных». Адна ва ўсіх заклапочанасьць, адна надзея. Нікому, аднак, шчасьлівы білет ня выпаў, а вось Окці выпаў, дастаўся. Яна свайго знайшла. А праўдзівей, знайшлі бабы, прыбеглі і далажылі: «Твой лейтэнанцік імі камандуе. Важны такі, мы яго адразу па Тамашовым рэмені, па зорцы прызналі. Пазнаў, што гэта мы, і адразу: «А дзе тая, у кароценькай сукенцы?» Окця зазлавала: «А якая яму трэба сукенка? Падумаеш, напнуў мундзірчык!» Але баб не падманеш: румянак выдаў, зазьбіралася, а потым зьнікла Окця на цэлы дзень. Вярнулася і маўчыць, нічога не дакладвае, а бабам так хочацца пагрэцца, ну, хацяб каля чужога цяпельца. Адно пасьміхаецца, зараза. Але калі зноўку сабраліся на дарожную будоўлю і яе паклікалі, спакойна пайшла з усімі. Лейтэнант іх сустрэў, як самых чаканых гасьцей, нават гасьцінец з сумкі дастаў, галетамі пачаў частаваць. Окця ўзяць дык узяла, але тут жа аддала палоннаму, нашаму. Той схапіў, спалохана зіркнуў на афіцэра, адышоў на ўсякі выпадак далей.

— Што вы іх тут трымаеце? — накінулася Окця на лейтэнанта. — Мала яны нагаладаліся ў немцаў? Дома маткі чакаюць, а вы іх на гэтым балоце!..

Лейтэнант цярпліва патлумачыў:

— Разумееце, яны не ваявалі, калі другія аж ад Масквы, аж ад Сталінграду наступалі. Вось ім і дасталося — адпрацаваць за гэты час.

Можна падумаць, што сысунок сам не вылазіў усю вайну з акопаў. Толькі што з вучылішча, гэта і за вярсту ўбачыш. Але ён хоць не крычыць на тых, хто працуе, як Хрыпун (бабы так ахрысьцілі другога афіцэра, прыгажуна з бакенбардамі). Окцін лейтэнант нават паўшчуваў салдата, калі той замахнуўся прыкладам на немца, што ўпусьціў насілкі зь пяском. Бабы ўхвалілі, пасьля і дома расхвальвалі Окцінага лейтэнанта. Окця адно хіхікала, як дурненькая: ёй нібыта гэта зусім не цікава.

Неўзабаве палонных немцаў пабачылі ў сябе ва Ўюнішчах. Невядома, з кім дамовіўся Косьця-старшыня, але іх прыгналі памагчы калгасу. Што нікога не зьдзівіла, дык гэта зьяўленьне зь імі Окцінага лейтэнанта.

Зноў ва Ўюнішчах немцы. Але гэта ўжо ня тыя немцы, на якіх наглядзеліся ў вайну, ня тыя нібыта людзі. Паверыць цяжка, наколькі яны іншыя, не падобныя. А можа, таму, што іншымі вачыма ўжо на іх глядзіш. Калі на каго і падобныя цяпер, дык гэта на нашых палонных. (Якіх яны, можа быць, гэтыя самыя ахоўвалі калісьці, ганялі на працу, з працы.) Такія ж чорныя твары, запаленыя і пакорлівыя вочы, даўгія рукі, нясьмелыя і ўхопістыя...

Немец ня петрыць, калі зь ім загаворваеш, з усіх сіл намагаецца зразумець цябе і жалю варты ў сваёй бездапаможнасьці, як дзіця. Яны і тады не разумелі, але раней ад іх неразуменьня ішла небясьпека, а то й адкрытая пагроза. Не яны тваёй мовы не разумелі, а ты іхных вокрыкаў. І ня іх гэта мучыла, а цябе.

Палонным далі працу: зямлянкі рабіць на агаро-

дах. Уласнае жытло Вэнэрыным пастаяльцам: не, не для начальства, а для баб з малымі. Так атрымалася, што першую яму пад зямлянку выкапалі на Окціным агародзе. Прыйшла пара разгружаць Вэнэрын каўчэг. А то ўжо і Юнра ў ім пасяліўся, сваю кантору і нават склад адчыніў фінінспэктар. Яму месца шмат спатрэбілася, нават у халодную палавіну ўлез: з усіх вёсак сюды сьцягвае рэчы, канфіскаваныя за нядоімку. Падушкі, кросны ткацкія, нават машыну «Зынгер» прывёз. Во ўжо, мабыць, павыла баба, калі забіраў. Яны і ва Ўюнішчы прыбягаюць выць — ля парога Вэнэрынага дому. Але ў Юнры адна гаворка: «Грошы прынесла? Квітанцыю па малаказдачы, на яйкі, шэрсьць, мяса?.. А, няма? Ну, дык і падушак няма!» Павые баба, паклянчыць, выкрыкне пад канец пракляцьце на «воўчае племя» ды і пабрыдзе дамоў. Дом Вэнэры для навакольных вёсак (ёй усё вусьцішней ад гэтага) стаў нейкім гнезьдзішчам разбойнікаў, прыгнятальнікаў. Праклёнаў гэтулькі насылаюць, што на ўсіх хопіць. Як ён толькі не загарыцца, яе дом?

Юнра ўжо і гаспадыні дому падміргвае:

— Ёсьць дакумэнцік, хутка пазнаёмлю. Сад у цябе вунь які!

Косьця-старшыня нейк пачуў, зморшчыўся, як ад хворага зуба, нагадаў яму?

— Воўк і той побліз логава авечак ня душыць. А ты ўсіх дастаў.

— Ня я, ня я! Сам ведаеш, хто.

Вызваляюць месца ў доме пад канторскіх людзей і сем'і-пастаяльцы з далёкіх мясьцін. Вайна сончылася, адседзеліся, набраліся сілачкі — у дарогу пара. Яны не запісаныя за гэтым калгасам, ім можна... Разьвітаўшыся з усімі шмат разоў, паплакаўшы, адыходзілі бабы і дзеці да лесу. У дарогу ім пяклі бульбу, праснакі з жытніх абсеўкаў ды той жа бульбачкі. Вэнэра штораз выбачалася, што конь заняты, каб падвезьці іх. Як быццам яна ім усё яшчэ распараджалася.

Зямлянку Окці немцы пад кіраўніцтвам лейтэнан-

та выбудавалі што трэба. Вялікую, акуратную, з двума — ля дзьвярэй і ў задняй сьценцы — вокнамі. Палац ды й толькі. «Як дзеля сябе стараецца!» — ківалі ў бок лейтэнанта бабы. З раніцы немцаў прыводзілі, увечары іх адводзілі два салдаты. А лейтэнант «ішоў у партызаны». Зь ім у лес ішла і Окця. Падобна, што яны ішлі на ўсю ноч. Во ўжо пытаньняў і гаворак было на ранішняй дойцы кароў. У Васілька, які чакаў каля бідонаў, калі іх напоўняць пеністым сырадоем, проста-такі вушы расьлі — як лепш пачуць усе падрабязнасьці бабскіх роспытаў і дадаткаў.

Растрыбушыўшы Окціны таямніцы, бабы за Вэнэру браліся. Як-ніяк з начальствам сьпіць бок ля боку. Ня можа быць, каб ніхто не паквапіўся на такую маладзіцу. Ня будзь дурніцаю, дзеўка, яны чаго хочаш наабяцаюць. Адно разьвесь вушы. Калі хто і сур'ёзны там, дык гэта старшыня, Косьця. Шалапут? Ёсьць і гэта, але хаця б халасты. Ня піша ніхто яму, не прыяжджае.

Бяда Вэнэры — не сваё начальства. Са сваімі ў яе наладзіліся нібыта цярпімыя дачыненьні. Стол накрые, прыбярэ пакой, падмяце, памые. Калі ўсе разбрыдуцца, а справа да ночы — да сябе на печ. Клічуць выпіць, закусіць зь імі, але ня дужа чапляюцца з гэтым. Галоўнае, каб на печ шлях не спазналі. Добра, што бухгальтар, гарластая Груня, пры іх, яна не пацерпіць, каб «Савецкай уладзе» дурны прыклад паказвалі. А вось упаўнаважаныя з раёну — яны зусім шалеюць, вырваўшыся з дому, воддаль ад жонкі, парткомаў, начальства. Тут яны самі над усімі камандзіры. Уставіцца гэткі на Вэнэру мутнымі вачыма, як п'яніца ў шклянку, — яна хутчэй рукі свае ды проста пад ягоныя бельмы. (Робячы выгляд, быццам нешта перасоўвае на стале.)

Вось гэтак у вайну дзяўчаты ад немцаў ды ўласаўцаў ратаваліся: перамажуць твар сажаю, ходзяць горбячыся, кульгаючы.

Што ўражвала Вэнэру, дык гэта тое, што яны ўсе наяжджаюць у адным як бы плашчы. Самі нібыта і

адрозныя, і, мабыць, пасада ў іх у кожнага свая: хто настаўнік, хто крамнік, альбо з райкому, альбо яшчэ хто, але плашч заўсёды адзін і той жа. Даўгі, ледзьве не да пят, брудна-сіні, з абламанымі, як шасьцярні, гузікамі, засаленымі каўняром і рукавамі — вісіць, пэўна, на вешаку недзе ў самым галоўным доме, па чарзе выдаюць усім упаўнаважаным. Спэцапратка іхная. А часам здаецца, што адзін і той жа наяжджае, а мяняюць яму голас, твар, рост, хаду — у тым галоўным доме. Сваіх начальнікаў звычкі ўжо вывучыла, а гэты пярэварацень — так і чакай ад яго прыкрасьці якой.

З-за сьцяны зь печы чаго толькі не наслухаесься, не спазнаеш. За поўнач заседжваюцца, ад капцілак сажа па хаце лётае. І жаруць, і жаруць, пра выпіўку і казаць няма чаго. Тварныя асобіны — называе іх Старая. З суседніх брыгад, вёсак, асабліва з «паліцэйскай», цягнуць і цягнуць. Называюць гэта: «ясак». Альбо: «разбамбіць», «раскулачыць». Ну, нібы немцы там, гарнізон паліцэйскі, і гэта нават геройства — ад іх пажывіцца. Як у вайну было. Крык стаіць, а словы часьцей за ўсё адны і тыя ж. Як плашч на ўпаўнаважаных. Нават Косьцеў голас брыдкім здаецца, талдычыць адно і тое ж. Падражнівае ўсіх увесь час. Во зараз фінінспэктара, Юнру.

— У яго аловак, пакажы, пакажы! Бабы падаюць, як дастане. Напалову сіні, напалову чырвоны.

А «Савецкая ўлада» бесьперапынна ўсіх пераконвае: «Э, лепш за Сталіна ня скажаш!» Але Косьцю, дурня, і Сталіным не напужаць.

— Сталін гэтага не казаў.

— Казаў!

— Не казаў!

— Ну, дык слухай, калі ня ведаеш: «Любы савецкі чалавек на галаву вышэй за любога буржуя, які цягне на шыі ярмо капіталістычнай эксплёатацыі».

— Нешта блытае «Савецкая ўлада», — не згаджаецца Косьця, — буржуй ярма не цягае, як бабы дзенебудзь ва Ўюнішчах.

— Асьцярожней на паваротах! — голас Энкавэдэ.

Упаўнаважаныя тыя пыжацца, называюць раённае начальства па імені-бацьку і скардзяцца, скардзяцца. Дома ў іх праца, адказная, а вы тут не выконваеце, што павінны, распусьцілі калгасаўцаў, даводзіцца лазіць па гразюцы, у дажджы, у халепу.

— А як жа бяз вас? — хмыкае Косьця. — Прыслалі вучылку, упершыню ў жыцьці пабачыла, як кароў дояць: «Ой, вы ж ім адарвеце!» Гэта нічога. А хочаце пра вас анэкдот? Алкаш памылкова ў морг трапіў, ачуняў, пабачыў, што за суседзі, аж працьверазеў. Стукае ў дзьверы. Адчынілі акенца. «Дзе я?» — «У моргу». — «У моргу? Ну, тады гутэнморген!»

Іржаньне, ажно прусакі аціхаюць на сьценах, дзе каторага засьпела.

Аранічкаю прыбягаюць дзеці з халоднай палавіны дому, ад Тамаша, пачынаюць круціцца пад нагамі: чакаюць, калі дзядзькі сыдуць і цётка Вэнэра зьбярэ і раздасьць ім недаедзеныя кусманы зь вялікага стала. Не сакрэт, Вэнэра і сама не ўтрывае, праглыне кавал-другі: голад ня цётка!..

Тамаша да стала ня клічуць, во хто пайшоў бы ахвотна, але ня клічуць, а то ён бы ім пра іх самых расказаў. Баб адукоўвае:

— Да рэвалюцыі карчма на «варшаўцы» стаяла, дык зьбіраліся там прапойцы з усяе акругі, добры гаспадар у будзень ня пойдзе, а такія, як гэтыя нашы. І было правіла: за рубель пі колькі ўлезе піва, але не ўстаючы з-за стала. Рубель — «бяз выхаду». Выйшаў на двор — зноў рубель, усё спачатку. Твае, Вэнэра, часта бегаюць? Раду магу ім даць, бясплатную. Рабілі так: прывяжа да гэтага месца посік (цяпер можна грэлку) і дзьмі, колькі ўлезе.

— Ды ну цябе, дзед, жывот ад цябе баліць!

Аднойчы Косьця выйшаў адтуль на кухню, закурыў, прысеў унізе на зэдлік. Спытаў:

— Што ты там хаваесься? Слухай, твайму бацьку партызаны паперу не давалі? Ну, каня, карову забіралі

і давалі расьпіску. Вернем, дзядзька, пасьля дожджычку ў чацьвер!

Прыгадала: быў такі выпадак. Атрад незнаёмы, рухаўся ў Заходнюю Беларусь. Свае партызаны ў Станкевіча не забралі б. Але дзе яны, тыя паперкі, калі ўсё згінула, пасьцягнута.

— Суседзі пацьвердзяць, — упэўнена вырашыў Косьця.

Пацьвердзіць дык пацьвердзяць, але пры гэтым падумаюць: а чаму ёй усё? І дом у яе ацалеў, а цяпер — карову. У другіх дзеці, ім, можа, больш трэба.

— Нічога, паспрабуем і яшчэ каму. Пакуль гоняць з Германіі, гэта магчыма. Усё адно перадохнуць.

І зрабіў. Для Вэнэры і яшчэ адной сям'і, праўда, бязьдзетнай, — Вользе і бязногаму Прохару. У Вольгі нават паперка захавалася. Мэтрыку згубіла, пашпарт, хаваючыся ў балоце, згубіла, а расьпіску, што забралі карову, зьберагла.

Сваю кароўку Вэнэра палюбіла зь першага погляду. Нават здалося, калі хадзілі з Косьцем сярод чарады, што паглядзела на Вэнэру нейк асабліва, сама напрасілася. Такая пярэсьценькая (як быццам другія не такія, усе яны чорна-плямістыя) яе немачка, акуратная! Атрымала яе за канфіскаваную ў вайну, але і яшчэ ўзамен той надзеі, той мары, якую адабралі пасьля вайны ўжо — Шэрага. Косьця адабраў, Косьця і вярнуў. Ну, ня цалкам. Бо Шэры — гэта ня проста конь, ён — абяцаньне зусім другога жыцьця, пра якое татка гэтулькі фантазіраваў у самыя страшныя дні. Ну а карова ў селяніна — як прысядзібны ўчастак: пры калгасным жыцьці, а не замест яго. Затое якая дабрэнная дасталася, разумніца, ласкавая і як лёгка і старанна аддае малако — толькі пальцамі краніся.

Шэры, адмучыўшыся ў калгаснай баразьне, пайшоў зноўку на падвышэньне: сядло на ім замест хамута. Зноў на ім фарсіць аднарукі «Жукаў». Пакарыстацца Шэрым мерацца і Энкавэдэ, і «Савецкая ўлада», але Косьця раўнівы, ня вельмі і ўступіць.

Часам, зладзейкавата азірнуўшыся, ці няма каго побліз, Вэнэра наблізіцца да засядланага Шэрага (старое, з пруткім воласам сядло, хіба такое яму падрыхтаваў калісьці Станкевіч?). Рука да Шэрага пацягнецца, дык ён таксама пысаю, храпамі шумна памкне насустрач, але адразу ж ганарыста адкіне галаву, а вочы замаркоцяцца.

Смутна, праз дрымоту Вэнэра чуе зьверху, зь печкі, звыклыя, як гул малатарні, галасы сваіх пастаяльцаў-начальнікаў. Сёньня ў іх аж два ўпаўнаважаныя з раёну. Калі ўзьніклі на парозе, Вэнэра цікаўна зіркнула: а як яны падзялілі плашч? Абодва без плашчоў, у пінжаках: ага, нікому не дастаўся.

Зь вечара да яе набілася цэлая плойма малых, шум, піск, не суняць. На кухню выйшла Груня, яшчэ адна шклянка або слоік трэба.

— Нічога, ляжы, я сама. Гані ты гэтую арду, як ты іх вытрымліваеш?

Бурчыць, а Вэнэра чула, як аднойчы ўгаворвала «Савецкую ўладу»:

— Калі ты нічога ня можаш, давай возьмем дзіцёнка. Цяпер іх вунь колькі сірот...

— Чаму гэта я не магу, а ня ты?

— Паглядзі на сябе і паглядзі на мяне!

Пасьля Груні (як сьцежку праклала) зачасьцілі на кухню ўпаўнаважаныя. Малады двойчы выйшаў — на вуліцу, але, вярнуўшыся, затрымаўся ля печкі. Паведаміў, што яму на спаборніцтвы ў горад ехаць, спартовец, а яго сюды «кінулі», у вёску: пазыку забясьпечваць.

— Упіраюцца мужыкі, быццам зубы ён зьбіраецца рваць. Але затое адзін стары: «А на тры тысячы можна?» — «Вітаецца», — «А калі я падпішу на мільён? Буду як Стаханаў?» — «А чым заплоціш, дзед?» Шчэрыць пустым ротам: «А нашто плаціць? У мяне, бачыш, што ў хаце, што на агародзе — анічога ня возьмеш. Затое ты выканаеш плян і паедзеш дамоў». Гэта ён мяне пашкадаваў. Напасьці б на гэткага. Няма ў вас такіх? Я бачыў тут адну красуню.

— Красуню? У яе залётнік з пушкай. Так што сьцеражыцеся.

— А ў цябе? Таксама?

— А ў мяне яшчэ горш.

— А хто?..

Ледзьве адчапіўся, пайшоў, калі яму на тры ці пяць пытаньняў не адказалі.

Пайшоў гэты, Вэнэра ціхенька выправіла дзяцей: спаць, спаць, заўтра ўставаць рана!

Прачнулася ад таго, што нехта побач зь ёю, навальваецца, брыдка дыхае. Той, спартовец! Адштурхнула з усяе сілы. Але тут жа рука яе злавіла жалю варты абрубак Косьцевай рукі — пазнала. Другая рука яго, агідна прасьмярдзелая тытунём, заціснула ёй рот, як жалезная. А ў вуха задзьмувае гарачыя словы: «Ветачка-Нетачка, ну, ня будзь такой! Ну, Ветачка!..» І брыдка, і страшна, і няма зусім волі, нешта з Вэнэрай здарылася, зьнікла раптам уся сіла з рук, зь цела. Голас такі блізкі, словы незнаёма ласкавыя. Раптам сьцяміла: даўно іх чакае, і не ад каго іншага, а менавіта ад гэтага шалапута — Косьці, такога вясёлага, добрага і да сьлёз ненадзейнага.

Што зь ёю сталася, чаму саступіла, хаця і ў думках, здавалася, такога не дапускала? Сама не паверыла б, што вось так і адразу няблізкаму яшчэ чалавеку саступіць — яна, вясковая ганарліўка, Станкевічава Вэнэра. Ды як: з удзячным плачам, ледзь не рыданьнямі, абцалоўваючы ягоную жалю вартую, кранальную руку-кульцяпку. (Помніла заўжды яго паўп'янае апавяданьне, як у партызанах яму гэтую руку адпілоўвалі звычайнай нажоўкай: «Самагонам аглушылі і наваліліся, як чыгунныя!») Абдымала свайго крыўдзіцеля з мальбою не чапаць яе, ня рушыць, але і з надзеяй, як маму абдымала б ці татку, — з мальбою не пакідаць яе, абараніць ад цэлага сьвету.

Празь нейкі час, апамятаўшыся, раскатурхала соннага Косьцю:

— Ідзі да сябе, Косьцечка. Ідзі, родненькі. Ціхенька спусьціся, бо пабудзіш.

— А? Што? Хто тут?!

Здаецца, і не прачнуўшыся як сьлед, споўз зь печы і, неасьцярожна гучна ляпнуўшы дзьвярыма, вываліўся на двор. Там доўга кашляў, крактаў, ікаў. О, Божа, як яго адвучыць ад іхных пасядзелак, папоек?

Вярнуўся з вуліцы, папіў вады (Вэнэра, прыўстаўшы, сачыла за ім, чакаючы, што хоць нейк пакажа, што помніць аб яе прысутнасьці, шапне нешта), але ён гучна сплюнуў і пайшоў да сваіх. Чамусьці паплакала перш чым заснуць і наказала сабе не праспаць ранак. Яна згатуе яму сапраўдны сьняданак. Во толькі з чаго? Каб сваё, а ня з гэтых іх нячыстых запасаў, ды і не засталося: што здабылі, тое стравілі! Заснула шчасьлівая.

Вакно ледзьве зашарэла, а яна ўжо была на нагах. Высьлізнула на ганак: у яблынях ціўкаюць пеначкі, страсаючы з крылцаў, з галінак расу. Шэры цяжка пераступіў з нагі на нагу і паглядзеў ад плоту ў яе бок (Вэнэра паказала яму язык). Зазірнула ў хляўчук, дзе начуе Пярэсьценькая (да сьцяны з нахілам прыстаўленыя жэрдкі — во і ўвесь пакуль што хляўчук). Зараз, зараз цябе падаю! Трэба нам яго добранька даглядаць — худы такі. Заўжды паўгалодны, недагледжаны і за сталом амаль ня есьць нічога, адною самагонкай і жыве.

У якую ж зямлянку пастукацца? Вольга са сваім Прохарам яшчэ сьпяць, не чутно яе голасу ў хлеўчуку. Штурхнула дзьверы Окцінага палацу — не зачыненыя. Сунулася, а яны, бессаромныя, раскінуўшыся, ляжаць на нізкіх нарах, аж страшна. Назад выбегла, наўздагон голас Окці:

— Ну хто там?

Выйшла заспаная, ледзь акрыўшыся жоўтым прасторным (лейтэнанта падарунак) халатам.

— Ну, што бегаеш? Мядзьведзь цябе спалохаў?

Размаўляе сярдзіта-паблажліва, як зь дзяўчынкай. А ведала б ты! Вэнэры яе нават шкада: што гэтыя лейтэнанты, сёньня тут, заўтра і сьледу яго не пабачыш!

— Пазыч пару яек. Можа, сала шматочак? Я вярну.

— Гэта што там за госьці такія?

— А вось такія! — з намёкам. Не табе, маўляў, адной!

І пачырванела да вушэй.

Прыбегла дамоў з адной думкаю: толькі б не зьвялі яго, добра, каб сам да яе на кухню выйшаў, пабачыў, што дзеля яго аднаго сьняданак. Пераглянуцца зь ім, слова шапнуць, дакрануцца рукою шчакі (няголены заўжды). Глянула крыўдліва на рукі свае. Быццам спадзявалася на цуд, — што сталі другія. Ня сталі.

Але цуд усё ж вымаліла: выйшаў да яе, а тыя яшчэ і голасу не падаюць, адно храпуць, цмокаюць мокрымі ратамі.

— О, што за сьвята? — Косьця зазірнуў у печ, дзе шквірчыць сала, жаўцее яечня ў два сонейкі. А то ня ведаеш, ня помніш, якое сьвята? На цьвічку над вядром чысты ручнік па-дзявочы чырванее вышыўкаю. (Падарунак адной з пастаялак, што пакінула ўжо Вэнэрын дом.) Палівала яму на руку зь меднага коўшыка, зробленага са снараду, ён зусім па-дзіцячы пырскаўся вадою.

— Вушы, вушы не забывай!

— Дзякуй, гаспадынька, дык каму ўсё гэта?

— Хто рана ўстае, таму Бог дае.

Бессаромнік, дражніцца, прыкідваецца, што анічога ня помніць, ня цяміць! Хуценька выставіла на стол збан з малаком, хлеб (загадзя абрэзала кусманы так, што можна падумаць — толькі што бохан раскраіла). Выхапіла зь печы патэльню і паставіла на драўляную дошчачку.

— Мне? Во гэта здорава! Пад такую закусь трэба абавязкова. Там не засталося?

Паказаў на пакой-кантору, а сам да дзьвярэй.

— Глянь там. Каня дагледжу, выклікаюць у раён, а я, чорт бы іх пабраў, забыўся!

Забыўся ён на Вэнэрын сьняданак, само так атрымалася альбо гэта знарок (страшна было паверыць). Не заўважыла, як яечню зьелі ўпаўнаважаныя. А Косьця так і не вярнуўся з вуліцы, пачула — позна ўжо было,

не адважылася гукнуць усьлед, як грымнулі капыты Шэрага. Быццам у грудзі ёй ударылі.

Цэлы дзень адпакутавала — і на працы, і дома, — чакаючы яго вяртаньня. Каб зірнуць у твар, у вочы і пераканацца, што ён проста забыўся. Такі ўжо ён, Косьця. Як яму не даравацъ?

Вярнуўся змрочны, злы, накрычаў на брыгадзіраў, што прыйшлі з суседніх вёсак і чакалі старшыню:

— Што, што? Вы б іх паслухалі. Можна падумаць, што ў нас тут МТС, дваццаць машын, а мы праспалі вясну. Жыта яшчэ не адкаласілася, а яны ўжо за звышплянавы ўраджай справаздачу зрабілі. Галовы абяцаюць сарваць. Адзін там усё: «Гэта вам не пры немцах!» Ды пры немцах я б такога зондэрфюрэра!.. А я ім паводле Сьвятога Пісаньня, як наша Старая: «На хрыбце чужым аралі, а зьбіраць будуць ня сеяўшыя, не араўшыя...»

Вэнэры нават нязручна са сваімі бабскімі крыўдамі совацца да чалавека. Яму сьвет ня мілы, ясна, што мог і забыць. Адно жаласьлівасьць накочваецца. Да яго, ну і крыху да сябе.

Зь вечара і на ўсю ноч у іх зноўку загула п'янка. Толькі і чуеш бязглуздыя тосты: «Гутэнморген!» Вэнэра ляжала на печы, лавіла голас Косьці, плакала, а потым ціхенька сьмяялася, калі рагатаў ён, ды так і заснула. І во зноў да яе... О, Божа, Косьцік, усіх перабудзіш! Але адразу ж скеміла, што ня ён: другая рука яе абшнырвае. Другая! Яна ня помніла, што адбылося далей, як спружына ў ёй спрацавала. Рукамі, нагамі скінула зь сябе гада, ды так, што грымнуўся проста на падлогу. Нават сьціснулася ўсё ў ёй: абы не забіўся!

У хаце да гэтага вісела нязвыклая ціша, ні голасу, ні ўсхрапу! Але гэта цягнулася да нейкага імгненьня. Раптам грымнуў, як выбухнуў, дружны рогат. Зларадасны, помсьлівы, дурнаваты. Падаслалі, яны падаслалі нейкага ўпаўнаважанага! І гучней за ўсіх — Вэнэру пранізаў холад, жах — іржаў ейны Косьця.

У жыцьці Вэнэры ставала чорных дзён, начэй. Але гэткую здраду яна спазнала ўпершыню.

Усё, што пасьля зь ёю, у яе жыцьці адбывалася, было непазьбежна. Пасьля таго, як яна пачула здрадніцкі рогат чалавека, якога гатовая была пакахаць на ўвесь бабскі век.

Косьця-старшыня зьнік з Уюнішчаў гэтаксама нечакана, як і аб'явіўся. Зімою 1945 году яго пасадзілі «за разбазарваньне калгаснага зерня». Газэта «Шлях да камунізму» паведаміла пра гэта на ўвесь раён.

А адбылося ўсё так. Пачаліся заложныя дажджы, і зноўку Ўюнішчы адрэзала ад усяго сьвету. Жніво ішло цяжка, жыта і авёс у брыгадах жалі, зразумела, сярпамі, снапы сушылі дзе толькі маглі. Вэнэра спала на мокрым жыце на сваёй печцы — ня печ, а калгасны ток. Косьця зьвёўся, лётаючы па вёсках-брыгадах, і Шэры пад ім схуднеў — абодвух Вэнэры было шкада. Выратаваньне хлеба (хаця й ня свой гэта хлеб) нейк зьблізіла, парадніла ўсіх. Косьця, калі выпадаў час, затрымліваўся там, дзе бабы, мужыкі, гутарыў зь людзьмі ціха, грунтоўна, разам меркавалі, як і што зрабіць лепш. Старыя бабы — ім у абед па сто лет, — ледзьве не са сьмяротнага ложку спаўзьлі, брылі спачатку жаць, а потым сушылі снапы і вымалочвалі зерне ў сваіх зямлянках, пранікамі, якімі выбіваюць бялізну на рацэ. Прохар, даваенны старшыня, папярэджваў Косьцю: быць бядзе! Бяда не ў дажджах і ня ў тым, што згніе зерне, а ў іншым: зерне апынулася ў руках у мужыка. Бо як было задумана, як заўжды рабілася: першы сноп — дзяржаве, і другі, і трэці, ды і апошні таксама. («Во праўда: і эмтээсу!») Прытым — неадкладна, як толькі зжалі, абмалацілі. А потым ужо яна са сваіх рук выдасьць калгасьніку, колькі палічыць вартым. А ня выдасьць — таксама не прывыкаць. Тут жа як атрымалася: сноп гэты ў хаце, у зямлянцы ў калгасьніка апынуўся, за сто гадоў упершыню. Пракантралюй, паспрабуй, кожнага. Калі мужыцкі трыбух падцягнула з гола-

ду. А ты яшчэ, старшыня, паабяцаў, што дасі ня менш як кілаграм на працадзень. Апошнюю руку залажыў, што стрымаеш слова. Маўляў, адпілуеце іржавай пілою. Адпілуюць, толькі не яны, а іншыя, і не руку, а галаву.

Косьця сапраўды паабяцаў, ня ўсе, зразумела, але яму паверылі. Усё-ткі ваявалі нядаўна разам і, што б ні казалі, а перамаглі ў такой страшнай вайне, — ня можа быць, каб заставалася ўсё на страху і хлусьні.

Не адзін Прохар, але і «Савецкая ўлада», і Юнра таксама вучылі Косьцю розуму-развазе. А ў яго на ўсё адзін адказ:

— Дык што, паміраць ім, хто ў вайну не памёр?

— Такой графы ў справаздачнасьці няма, — цярпліва тлумачыла «Савецкая ўлада», а Юнра гучна падхопліваў:

— Каровы паздыхаюць — спытаюць, сьвіньні — партбілет пакладзеш. А калі людзі — такой графы няма.

Як у ваду глядзелі: не пасьпеў Косьця раздаць свае кіляграмы, толькі пачалі ўзважваць ды выдаваць, як наляцела праверка з раёну. Як і сам Косьця калісьці, на танку прыехалі (а на чым яшчэ дабярэсься?). Першнаперш з Энкавэдэ сустрэліся, Вэнэру з хаты выставілі і доўга пра нешта гаманілі — двое з раёну і Энкавэдэ.

Затым пайшлі па зямлянках: сапраўды, забіта ўсё калгаснымі снапамі, засыпана зернем. Бабы ім: забірайце, калі так трэба! А куды забярэш: ні гумна, ні току. На танку не павязеш.

Зьвезьлі старшыню. Дзён праз дзесяць Косьця вярнуўся, але, як было сказана, здаваць справы. Каму і што ён здаваў, Вэнэра ня дужа цікавілася, ёй бы пагаманіць зь ім пра іх справы (ужо зразумела, цяжарная яна!), але як гэта зрабіць? Ды і боязна. Пасьля той начы, дзікага рогату-здрады яна баялася гэтага чалавека. І шкадавала, і баялася на што-небудзь добрае спадзявацца. Ведала: і яму канец, і ёй канец. І сябе, і яе загубіў.

Потым, гледзячы з далечыні ў пяць, сем гадоў на гэтыя дні і падзеі, Вэнэра сваё жыцьцё ўяўляла ў выг-

лядзе бруднага сьнежнага камяка, які (у маленстве так цікава было назіраць), коцячыся, зьбіраў усё сьмецьце з-пад ног. Анічога, апроч сьмецьця, гразі і холаду. А што было ня так, інакш (бо рознае здаралася), забывалася, ня помнілася. Адтайвала памяць — і, як у сьнежным камяку, выяўляліся, адкрываліся позірку толькі вострыя асколкі шкла ды трэскі, ды камякі гразі.

I ўсё жыцьцё вакол, тое, што ня зь ёю, а зь іншымі адбывалася, з кожным днём і годам рабілася ўсё больш бязрадасным і безнадзейным. Быццам пракляў іх усіх нехта і назаўжды.

Памерла Окця. Пасьля таго ўжо, як яе лейтэнанта забралі на вайну зь Японіяй і ад яго потым — ні слуху ні духу. Яна жыла, як апоеная, пастарэла, збрыдчэла. I раптам, трэба ж, наступіла босаю нагою сахор, прабіла да самае косьці. Вядома, як у вёсцы: пакуль выбраліся ў амбуляторыю ехаць, разьнесла ступак, нагу, як калоду. Павезьлі яе, а потым прывезьлі — мёртвую. Як і не жыла. О, як плакалі, гаравалі бабы, яны па дзецях малых сваіх (трое да вясны 1946-га пасьпелі памерці) гэтак не рыдалі. Гэта быў нейкі бессэнсоўны жах — сьмерць самай маладой, прыгожай, калі ў вёсцы адны старыя.

А яшчэ раней, зімою, новага старшыню прывезьлі з раёну. I «сваты», як заведзена, зь ім прыехалі... Бо па калгаснаму статуту старшыню абіраюць працаўнікі зямлі. Гэта калі Косьцю ставілі, была парушана калгасная дэмакратыя, а цяпер, як было сказана, усё па Статуту і Сталінскай канстытуцыі. I сапраўды, каля дому Вэнэры сабраліся калгасьнікі з усіх брыгад, ну, як на вясельлі да вайны ці на хаўтурах, здаралася, — і ў доме, і на вуліцы.

На новага свайго старшыню, цаглянатварага дзябёлага мужчыну ў добрым касьцюме, пазіралі цікаўна, як на жаніха з далёкай вёскі. А «сваты», як і заведзена, усе вясёлыя, гаваркія, адно што ручнікоў няма цераз плячо. Тамаш ужо разьведаў: прывезьлі вялі-ікага

начальніка, у горадзе ці ў райкоме, ці нават і ў абкоме працаваў.

Чым жа ён так завінаваціўся ў іх, што ўсе астатнія ажно зьзяюць, сьвецяцца ад шчасьця? А сам «жаніх» змрочны, злы: не па любові бярэ ён калгас, без акуляраў бачна, што не па любові.

Выбары адбываліся ў двары, вынесьлі стол, лаўкі, расьсеўся прэзыдыюм, а бабы, дзядзькі, хлапчукі стаялі хто дзе, многія ў садзе, пад белымі ад шэрані яблынямі і сьлівамі.

Самы вясёлы і дружалюбны на выгляд «сват», выдыхаючы клубы пары з высокіх, як у бабы, грудзей, выклаў біяграфію будучага кіраўніка гаспадаркі. Ніхто не дапетрыў, кім ён усё-ткі працаваў. Што кіраваў ледзьве не ад гаршка, гэта было ясна, але чаму вучыўся і ці працаваў на зямлі? Тамаш тут жа пацікавіўся гэтым. Але няўдала (прэзыдыюм спахмурнеў): ці ведае таварышок, «на чым сьвіньня хвост носіць»? Сьмяшок прайшоў па шэрагах калгасьнікаў. Адказваць устаў сам прэтэндэнт на пасаду. Сказаў тое самае, што і «сваты», але як бы ня ім падыгрываў, а Тамашу: ішоў, узыходзіў па партыйнай лініі, прапаганда і ў гэтым духу, загадваў нейкім аргаддзелам, вучыўся ў нейкай Акадэміі, ну, а што датычыцца «пытаньняў сяла», «пытаньняў сельскай гаспадаркі» — не займаўся. Аднак, калі партыя лічыць, што ён патрэбен на гэтым участку, што трэба ўмацаваць кадрамі разбураную ворагам гаспадарку, ён гатовы.

Але «сваты» таксама ня дурні, зразумелі, што ўзьнікае паміж іх намэнклятурай і калгасьнікамі як бы маўклівая змова: дзядзькі ўсё скемілі, сыгнал пасланы. У труне, маўляў, я ваш калгас бачыў! Ну, і мы цябе таксама!.. І разыдуцца да ўзаемнага задавальненьня.

Прэзыдыюм зашаптаўся, уставаць пачалі адзін за адным і зноўку распавядаць, як складна пойдзе справа, зажывуць калгасаўцы, калі гаспадарку ўзначаліць такі вопытны, прайшоўшы школу партыйнай работы

на ўсіх узроўнях (на гэта націскалі з прыкметным задавальненьнем) кіраўнік.

Галасуем! Парачка-другая рук ускінулася, але тут жа ўпалі, адразу зьвялі, калі стала відно: не праходзіць.

І зноўку гаварылі, і зноўку пачыналі галасаваць — тое самае. Некалькі разоў так. Тады падышоў да стала скураны, Энкавэдэ. Ускінуў сваю конскую мысу:

— Дайце мне.

Пастаяў моўчкі, разглядваў мужыкоў, баб зь цікаўнасьцю, тыя на яго зіркалі аціхлыя.

— Так, — загаварыў няголасна, але пачулі самыя далёкія, нават у садзе, — савецкая ўлада камусьці папярок горла, партыя ўжо ня ўказ. Так гэта трэба разумець, таварышы партызаны-паліцэйскія? Хто за старшыню, рэкамэндаванага парторганамі? А я пагляджу.

Убачыў — рук ужо зь дзясятак. Але гэта якая ж частка ад прысутных? Калі самі калгасьнікі зразумелі, што яны не прагаласавалі, што не спужаліся, дружны шоргат прайшоў па натоўпе, які пераступаў на замерзлым сьнезе, твары радасна засьвяціліся.

Энкавэдэ крануў рукой за плячук «Савецкую ўладу»: «Устань!», падсунуў нагой табурэтку, устаў на яе. Цяпер конскі твар глядзеў на людзей зьверху. Вось калі стала бачна, што дзяржаўны авёс таварыш глуміў недарэмна, зь вялікаю карысьцю.

Агледзеўшы ўсіх, памаўчаўшы яшчэ, тыцнуў пальцам у натоўп.

— Гэта там Фёкла з Паплавоў? Руку баісься натаміць? А калі з капца калгаснага бульбу выграбала, рукі не шкадавала? У мяне ўсё гэта — тут.

І паляпаў па сумцы. Фёкла з Паплавоў хуценька ўскінула руку.

— А ты? Цябе пытаю, Пратасеня. Можа, напомніць, па якім артыкуле асуджаны быў? Дык гэты артыкул застаецца, нікуды не падзеўся. Ну вось, гэтак будзе лепш. А хто ў нас у палоне пабываў? Пракапчук... Мароз... Сьмялей, сьмялей! Раз, два, тры... (Па-

лічыў пасьпешліва ўзьнятыя рукі.) Бач, нахапаліся там духу! І ты, дзед, а, падняў руку, ну і добра, напамінаць ня стану. Пра што — ведаеш. І ты, і ты! Бачыце, няма такіх, хто чысты перад савецкай уладаю, як шкельца. Няма і быць ня можа. Значыць, аднагалосна.

Пераможна зьверху ўніз паглядзеў на прэзыдыюм. Узьняўся цаглянатвары і ці ўдзячна, ці пагрозьліва сказаў:

— Дзякую за давер, таварышы калгасьнікі і калгасьніцы. Я вось толькі зьежджу да сям'і, разьбяруся зь сям'ёю.

А Вэнэру нудзіць. І бязь іх усіх яе нудзіць. Гэта нагадвае ёй аб сабе ўвесь час, і ўдзень, і ўначы: прапала ты, дзеўка! Ужо нічога зрабіць немагчыма, позна, занадта доўга не хацела верыць, падманвала сябе, старалася думаць, што гэта ад падгнілых «ташноцікаў», «аблігацыяў». (Папаела і яна іх напрадвесьні.)

Старая першаю ўсё скеміла, выгледзела.

— Анічога, мы жывём, і яно будзе жыць. Ня ўздумай толькі Бога гнявіць. А я зноўку ўнучка займею. Пяцёра мне памарозілі. Не пужайся, выняньчым.

Дзякуй ёй, Старая ўладна адгарадзіла Вэнэру ад назойлівае цікаўнасьці і балбатні іншых жанчын. Сама ж ім Старая і паведаміла:

— У нас будзе дзіця. Сказана: усякі дом ды напоўніцца. Не чутно, каб у другіх вёсках, а во нас блаславіў Госпад. Окцю толькі шкада, так шкада. Няхай блазенныя будуць няплодныя, і ўлоньне нерадзіўшае, і саскі не насычаўшыя. І тройчы — нарадзіўшая і карміўшая. Дзякуй, Вэнэрачка, ад нас усіх.

Так во павярнула Старая. І хаця ў вачах другіх баб сьвяцілася і жорсткая цікаўнасьць, і пытаньні (чый? ад каго?), але не чапляліся.

Вэнэра нейк супакоілася, пакорліва чакала тэрміну. Сама заўважыла, што зьявілася ў яе рухах замаруджанасьць, лянотнасьць, якая заўсёды ўражвала ў кароў. Перастала пужліва зазіраць у ашкелак люстэрка, што

на сьцяне каля ходзікаў, кранаць пальцамі непрыгожыя, здрадлівыя плямы на шчоках. Калі і гляне ў люстэрка — сама сабе па-добраму ўсьміхнецца: во такая мама ў Яго! На каго будзе падобны (упэўненая — сын)? Намагалася ўспомніць і не магла: якога колеру былі ў Косьці вочы? Добра і не разгледзела — во такое было каханьне.

Пастаяльцы ўсё не заўважаюць, што іхная гаспадыня ў цікавым становішчы. Будуць пытаньні, сьмяшкі. Але ня гэтага баіцца Вэнэра. Яна баіцца новага старшыні. Яго грэбліва зьдзіўленага позірку: гэтая баба, чыя яна, што тут круціцца? Яму патлумачылі, Вэнэра чула: гаспадыня дому, праўленьне арэндуе ў яе памяшканьне.

— Дык гэта не калгасны дом? — зьдзівіўся яшчэ больш. — І такі даміна ў нейкай дзеўкі!

А наогул ён цудзік, гэты грузны мужчына з цаглянным тварам, шэра-бруднымі валасамі, жорсткімі, быццам пяску ў іх насыпана, рыжымі вачыма. Цэмэнтавым мяшком у маленстве стукнулі! — настойвае Тамаш. Таму, маўляў, і ня бачыць, не заўважае анікога вакол. Пасьля выбараў старшыня амаль месяц не паказваўся, а затым у тэлефон загадаў: прыслаць каня з вазком на такі вось перагон чыгункі. Тамаш і колы падмазаў, і сена мяккага прыхапіў, каб зручна было каціць новага старшыню. Калі Шэры вярнуўся, Тамаша чамусьці зь ім не было, адзін старшыня ў вазку. Не маглі ніяк дацяміць, пакуль не аб'явіўся стары: пешадрала топаў. І распавёў:

— Пераняў у мяне лейцы, цуда гэтае, усеўся важна гэтак, расставіў локці, а я стаю, бы дурань, не разумею, што ж гэта ён едзе безь мяне. «Эй, эй!» — дзе там, не азірнуўся. А можа, ён мяне, цуда-юда, не прыкмеціў?..

Толькі ў вазку бабы і бачылі цагляную свайго старшыні фізіяномію — з-за шырокага заду Шэрага. Пад'едзе да «фэрмы» (адгароджаны квадрат непралазнай гразі, па якой улетку хадзіць — тонеш, узімку — ногі зломіш) і пазірае з кашоўкі, не вылазячы. Анічога ня кажа, анічога не пытае. А затым штосьці і вырашыць. Паведамляюць: хлеў каровам будзе ў рове. Хлеў-зямлянка.

Гэта як жа? Аказваецца, ажно за Ўралам капалі такія, калі разьмяшчалі кароў, прыгнаных з Украіны, зь Беларусі ў 41-м. А там жа, у рове, нашыя пахаваныя, костачкі іх! Вухам не павёў, бульдозэр з дарогі прыгналі, вурчыць, ссоўвае пясок, траншэю робяць. І жэрдак навезьлі, накрыць зьверху. Галава свая, рукі — палонных знoўку нагналі. На гэты раз нашых, рускіх. Зьдзіўлена разглядваюць яны тое, што ім рабіць загадана.

— Для кароў? У такіх ямах нас немцы трымалі.

— А зараз — у лепшых?..

Можна і не пытаць: брудныя, босыя і абадраныя, схуднелыя, ад ветру валяцца, ну, акурат калгасныя паланянкі. Для каторых робяць хлеў-магілу: дзірка ў зямлі, цёмны тунэль з плаўным спускам. А Вашамосьць радуецца сваёй прыдумцы, нават з каляскі-вазка стаў вылазіць, па зямлі нагамі хадзіць.

На сьлёзы, на пратэсты, што магілу парушылі, адзін адказ: а тут паліцэйскія ляжаць, партызаны пастралялі. Калі сказалі, што во і яе бацька, Вэнэрын, ляжыць, немцамі застрэлены, Вашамосьць (гэтая мянушка прыклеілася да старшыні) упершыню да яе напрасткі зьвярнуўся:

— Ён у цябе хто быў?

— Калгасьнік, хто яшчэ. Сувязны ў партызан. Сувязь трымаў.

— Каго толькі з кім? А то здаралася... — няпэўна буркнуў Вашамосьць і страціў да гэтага цікавасьць.

Бабам усіх шкада — і пабітых, якім цяпер пад гноем і каровінай мачой ляжаць, і саміх кароў. Костачкі, як маглі, прыбралі, перанесьлі на касагор, дзе людзі згарэлі. Аплакалі яшчэ раз. І над каровінай доляю сьлёзы пралілі: прыгналі іх ад добрага, бачна, жыцьця — ды ў калгаснае. З гразі не вылазяць ды бяскорміцы, а тут наогул пад зямлёю жыць. Але і ад марозу куды падзецца, вялікі хлеў, абору калгасу не адолець з аднымі бабамі, так што Вашамосьць, можа, і мае рэзон. Адно, што, як заўжды, правата яго такая, што на сьвет Божы гля-

дзець ня хочацца. Хутка, бачна, і апошнія немачкі адмучаюцца. Палова чарады перадохла ўжо, і хаця б адну карову зарэзалі для людзей, ды не, усіх адцягнулі на ўзьлесак, ваўкам. Няхай згіне, абы не калгасьніку.

Вэнэра ўсё часьцей лавіла сябе на тым, што, нават за сьцяною пачуўшы голас новага старшыні, яна ўся сьціскаецца, абмірае ад трывогі. Раней чым выйсьці са свайго закутка ля печкі, прыслухоўвалася за шырмай: як бы не апынуцца ў яго перад вачыма. Жоўтыя, сабачыя, няўважлівыя вочы, ад якіх нядобра халадзее ўнутры — там, дзе дзіцятка. Яно таксама ўздрыгвае, яно чуе. Во, яшчэ не нарадзілася, а ўжо вучыцца баяцца.

Але яе па-ранейшаму клічуць стол накрываць, са стала трэба прыбраць, — прымушала сябе пайсьці туды, калі сядзіць ён там. Сама не магла б адказаць, што яе палохае так. Ну, ня зьесьць жа ён яе. Яна ў сваім доме, гэта яны тут набрыдзь, з усяго сьвету спаўзьліся, сьцягачы.

Да яе на печ ўсё яшчэ бегаюць, забіраюцца дзеці нават тых баб, якія адсяліліся, жывуць у зямлянках. Паспрабуй скажы ім, каб не шумелі, не сьмяяліся, — Вэнэра казкамі трымае ў паслухмянасьці. Нават свой замірае, не перабірае ножкамі. Упэўненая, што і ён чуе, слухае. Дзеці без канца просяць паўтарыць «пра бога Зэўса». Аказваецца, Вэнэра на памяць ведае бацькаву паэму «Тарас на Парнасе». Заўважыла, што новыя дзеці, хаця і любяць, як калісьці яна сама, слухаць пра тое, як багі на гары Парнас п'янствуюць і скачуць, а сталы ломяцца ад сялянскай ежы, але ня столькі сьмехам праменяцца дзіцячыя вочы, колькі галоднай хцівасьцю. У гэтых свой вопыт. Нехта раптам успомніць і пакажа на сьцяну, за якой жывуць начальнікі, — во тут пачынаецца сьмех, аж пішчаць сябры яе хлопчыка. Сам-насам, калі зь ім застаесься, ужо проста да сыночка зьвяртаецца: ну што стукаесься? Куды ты так сьпяшаесься? Ніхто не чакае цябе тут, акрамя мамкі. Во і пабудзь зь ёю. Цёпла табе, добра, ну і жыві, пакуль можна. Хутка

наша карова ацеліцца, а то запусьцілася. Будзем здаваць малачко, ну і табе кружачка застанецца. Я папрашу Пярэсьценькую спэцыяльна на цябе дабавіць. І пчолак завядзём, у дзядулі твайго, ці ведаеш, колькі домікаў было. Сад зацьвіце, у нас вялікі-вялікі сад. Яшчэ прадзед разьбіваў...

Яна пакуль яму ня кажа пра тое, што ёй ужо сказаў Юнра: плаціць давядзецца за сад, за кожнае дрэва, якое зацьвіце. Так што ці будзе яшчэ той сад? Мужчыны-пастаяльцы ўжо разгледзелі чэрава, чакала сьмешак-насьмешак, гэтага таксама хапала, але, што, як восы над банкай мёду, закружацца — больш за ўсё яе ўразіла. Нават «Савецкая ўлада» (калі Груні няма побліз):

— Ноччу прыйду на печ да цябе.

— Прыйдзі, прыйдзі, кулём паляціш!

Старая так тлумачыць паводзіны мужыкоў:

— Гэта нармальна. Чаму і называецца: жанчына ў цікавым становішчы. Асаблівая цікаўнасьць зьяўляецца да такіх, як ты. Жарабцы!

— Гэта яны на цечку, — удакладняе Тамаш.

Энкавэдэ, нават ён, строга спыніў яе на двары:

— Табе ня піша гэты? Ну, гэты гусь, што загрымеў?

А сам вачыма там і шныпарыць.

Вэнэра вечарамі ўслухоўвалася: што за сьцяною пра яе кажуць і ці кажуць наогул? Калі там Вашамосьць. Яго яна цяпер ня проста баіцца, але і саромеецца — толькі б яму на вочы не патрапіць са сваім чэравам. Яно і сапраўды: з раёну наяжджаюць людзі, нават з гораду бываюць госьці, а тут нейкая баба ў такім выглядзе! З жахам думала не пра боль, калі ўсё пачнецца, а пра тое, як ёй раджаць і іх не патрывожыць. Каб другі час, не зіма, можна было б і ў халоднай палавіне дому альбо наогул у лесе, на лузе (для вясковых гэта не навіна, асабліва ў ранейшыя часы), але куды ты падзенесься ў сьцюжу?

Пасьпеў клопат: надышоў час карове цяліцца. Старая і Тамаш узялі гэта на сябе, але Вэнэра папаўзла ўсьлед — дапамагаць. Ня ім, дык Пярэсьценькай, ёй так-

сама страшна, балюча. Цялятка выйшла мёртвае. Такое ж пляміста-чорнае, як яго мама, але мёртвенькае. Аж заплакала Вэнэра. І раптам заламала сьпіну ў самой, ды так, хоць крычы. Яна і стала крычаць — на Тамаша, гнаць яго з вачэй, прэч з хлеўчука. Каб прыслаў Старую: тая чагосьці пабегла ў дом. Тамаш не адразу сьцяміў, што адбываецца, з акрываўленымі рукамі і нажом, асьветлены цьмяна мігатлівым агеньчым ліхтара, стаяў і лупіў бельмы. А яна, ашчэрыўшыся, як ваўчыца, крычала на яго:

— Сыдзі, сыдзі, як табе ня сорамна!

Нарэшце дапетрыў:

— Я зараз, зараз...

Сунуў руку з нажом у чыгун зь цёплай вадою, спаласнуў, пакінуў там нож і раптам абхапіў рукою Вэнэру неспадзявана моцна (у гэтых аднарукіх яна як з жалеза) і пацягнуў дадому. А ім насустрач якраз Старая, ёй і перадаў парадзіху. Вэнэра ўпіралася, адбівалася: больш пакутаў і сьмерці баялася ўласнай хаты, а яны гэтага не разумелі. Угаворвалі: не пужайся, ня ты першая, ня ты апошняя! Ну кухні яна павалакла іх за печку, памкнулася ў свой куток. А Старая гучна на ўвесь дом:

— Мужчыны, сыдзіце, раджаць будзем! Хуценька, нам ложак патрэбны.

На ўсё жыцьцё Вэнэра запомніла, зь якімі паслухмяна-вінаватымі тварамі яны прашмыргвалі міма яе і Старой, на хаду падцягваючы рамяні і апранаючы пінжакі, быццам пачулі не Старой голас, а нечы самы галоўны над усімі. Вашамосьць таксама выйшаў, пакрочыў за парог, ні на каго ня глянуў. У доме засталася адна Груня і таксама ўзялася дапамагаць Старой, рыхтаваць пасьцель, зь якой яе і «Савецкую ўладу» толькі што ўзьнялі.

Увесь дзень, а затым ноч, да самага сьвітанку прамучылася Вэнэра. Была ўпэўненая, што памірае, у хвіліны, калі боль адпускаў, ледзьве пазнавала людзей, крыўдзілася, што ў іх твары амаль радасныя. І ўвесь

час помніла, што яна забрала ложак у гэтай во жанчыны з такім добрым тварам, якая разам са Старой клапоціцца каля яе.

А калі раптам прапаў боль і ўсё да яе стала вяртацца, Старая блізенька падышла з чымсьці на даўгіх руках, паказала — не адразу дайшло — гэта і ёсьць тое, той, хто яе мучыў, яе дзіцянятка. Вачыма бліжэй паклікала Старую, тая, адводзячы рукі з чырвоным камячком, які пахныкваў, нахілілася. І выбухнула гучным пратэстам:

— Глупства якое! Яна ўжо гатова ўцякаць са сваёй хаты. Нічога ня здарыцца, калі два дні не пазасядаюць.

Аднак жыцьцё ёсьць жыцьцё і калгас ёсьць калгас. Ужо пад вечар Вэнэру з навародкам перамясьцілі ў яе закутак, на печ. Яна сама ўпрасіла Старую, ды і што было рабіць, дзе спаць начальнікам, яны і так, палова, зьехалі ў раён, хто на дзень, хто на два, — і за тое дзякуй. А Вашамосьць дык і наогул пакаціў да сям'і ў горад. Не зьяўляўся амаль тыдзень. Тамаш заключыў: во, пакрыўдзіўся, і застанемся мы без галавы калгасу.

— Як жа, трымай кішэню шырэй, узрадаваўся! — сказала на гэта Старая. — Раней ты зьбяжыш. Ды толькі куды?

Так што другую пераможную вясну Вэнэра сустрэла не адна, з сынам. Хлопчык, аднак, пакутаваў жывоцікам без канца, скардзіўся плачам. Як жа замучылася яна, чуючы гэты бездапаможны покліч, які чуюць і там. За перагародкаю.

А тут і гарод падышоў. Вэнэра прыстасавалася ўжо цягаць Антончыка (назвала імем свайго згарэлага браціка, хаця і ведала: прыкмета кепская) на дойку кароў, на любую працу. Адно б зьнесьці з хаты-канторы гэты вечны плач. Ну, а саджаць бульбу на ўласным гародчыку — гэта ж сьвята: сонейка адагрэла і зямельку, і скаціну галодную, і людзей. Калісьці ўсёй сям'ёю рабілі гэтую працу і стары, і малы. Так і цяпер. Антончык кугукае пад яблыняй, і кароўка тут, і Васілёк — усе самыя блізкія

Вэнэры істоты. На Шэрага надзеі аніякай, адрэзаная луста. Горш за тое — цяпер ён як нешта адно з чалавекам, ад якога заўжды вее пагрозаю, небясьпеаю. У кніжках па гісторыі бачыла такіх коней-паўлюдзей, неразлучных.

Затое кароўка такою блізкаю стала, ну, проста родная. І так па-жаночы пакорліва, па-бабску ціхмяна згаджаецца са сваім лёсам — быць таксама і канём. А што зробіш, паўсюль цяпер аруць на каровах, асабліва свае агароды. Праўда, на калгасных ня вельмі і наарэш, ледзьве жывыя выпаўзаюць з мокрага падзямельля. Крыжа на людзях няма, так скаціну мучыць.

Але й самі людзі зь зімы выбраліся ня лепшымі. Яшчэ сьнег не сышоў, а яны поўзалі ўжо, бы чарвякі, па полі, дзе летась бульба расла, палкай выкалупваючы з гразі гнілую сьлізь. Каб выціснуць, вымыць зь яе крухмал і напячы дзецям «ташноцікаў». Дужа не падабаецца новаму старшыню глядзець на гэта. Але можна падумаць, што якраз падабаецца: спыніць сваю каляску на рысорах сярод дарогі, людзі неспакойна азіраюцца на нерухомыя галовы чалавека і каня, што тырчаць воддаль, каня-чалавека. Падслухаў Тамаш, пераказваў, пра што гавораць яны там на сваіх «лятучках», як павучаюць брыгадзіраў з суседніх вёсак. Быў яшчэ да вайны ўказ: за каласкі давалі па дзесяць гадоў, а то і расстрэл. Што думаеце, вучыў старшыня, каласка пашкадавала дзяржава?! Не ў каласку справа, а ў хітрасьці, подласьці мужыцкай. Знарок не прыбіраюць як сьлед калгасны ўраджай. Каб непрыбранае потым ім дасталося. Тут не каласкамі патыхае, а велізарнымі стратамі. Так і з бульбаю. Забараніць бы варта зьбіраць па вясьне на калгасным полі. Вы прыгледзьцеся, абураўся Вашамосьць, свае агароды не перакопваюць, там шукаць няма чаго...

Васілёк за плугам, Антончык пад таўшчэзнаю разгалістаю яблыняю (яшчэ прадзед саджаў), Вэнэра з насеннаю, акуратна парэзанаю бульбай у вядры ледзь не за шыю абдымае кароўку: ну-ну, Пярэсьценькая, яшчэ,

яшчэ трохі!.. Васілёк і на Вэнэру тым жа голасам, што і на карову, пакрыквае:

— Ну што вы шэпчацеся там? Будзем ці ня будзем рабіць?

А як тут рабіць, калі ярмо (самаробка зь ляшчыны) ад спалоханых рухаў каровы ўсё зрываецца з кароўскіх грудзей, пачынае ціснуць на горла, скаціна, завярнуўшы галаву, зь белымі вачыма кідаецца наперад, у бакі — хоць плач разам зь ёю. Вэнэра ўпускае вядро з бульбаю, бяжыць да каровы.

— Нічога, — пакрыквае Васілёк, — звыкнецца-зьлюбіцца. Бяда з гэтым баб'ём!

— Ня трэба, Васілёк, так крычаць, ёй і без таго страшна.

Сэрца разрывалася ў Вэнэры ад болю і любові да ўсіх іх, сваёй сямейкі: усе, усе тут сіроты. І яна сама, і Антончык, і Васілёк, і гэтая немачка, якая не разумее, што зь ёю тут вырабляюць. А як у такія вось дні весела было на гэтым гародчыку, у садзе, калі яшчэ жывыя былі бацька і ўся іхная вялікая сям'я. Тады ўжо і першы Антончык нарадзіўся, брацік, ці не пад гэтаю яблыняю мама яго ўкладвала на ватоўку, коўдрачку? Бацька выпрасіць у брыгадзіра каня на гадзіну, на дзьве і амаль бегма лётае за плугам, спрытна выварочваючы і заносячы яго ў канцы баразны. А ўсе ўсьлед за ім, зь вёдрамі, з кашамі, — абы пасьпець. Гэта было шчасьце, цяпер, адсюль бачна, якія гэта былі шчасьлівыя хвіліны. А якая была бульба, чыстая, ружовая — такую цяпер і не пабачыш. Дымок ад вогнішча, на якім патрэсквалі ў полымі старыя галінкі, садовае сьмецьце і пяклася бульба, ня раз потым сьніўся Вэнэры, пах гэты будзіў яе і заўсёды ў сьлёзах.

Зноў самаробнае ярмо сарвалася і пераціснула карове дыханьне, яна, вывернуўшы на бок галаву, захрыпела, вочы наліліся крывёю. Ой, лепш бы Вэнэра рыдлёўкаю, сваімі рукамі ўскапала гэты агарод, чым такая пакута! Але няма аніводнага дзянёчка вольнага, і гэтую нядзелю, як украла: Вашамосьць кудысьці зье-

хаў, а бабы яе адпусьцілі (яны па чарзе каго-небудзь на свой агарод адпускаюць, а інакш з чаго потым жыць).

Спыняліся, хаця і лаецца Васілёк, усё часьцей, ледзь толькі вернецца ў кароўскія вочы цень блізкага жаху.

— Не сьпяшы, Васілёк, у нас дзень наперадзе, пасьпеем.

Але ў нейкі момант, змучаная ўсім, што яны вытвараюць з караваю, Вэнэра ня вытрывала, схапіла з-пад ног палку і ўдарыла яе па хрыбціне:

— Ну што ты ўсё кідаесься, што ты ўсё!

А тая, быццам дачакалася гэтага ўчынку: упала на камяні, ярмо зусім здушыла гарлянку, хрып да самага неба — здалося Вэнэры. Сама ўпала наўколенцы каля каровы, стараючыся адвярнуць убок драўляную пятлю, вызваліць дыханьне. А калі ўдалося і карова стала ўздымацца, Вэнэра ўбачыла, што рукі ў крыві. Нічога ня цямячы, агледзела скаціну і ўбачыла: гэта ў яе з сасцоў сочыцца.

— А прападзі яно пропадам усё! І такое жыцьцё, і такая доля! — закрычала невядома каму, але як бы некаму. — За што нас так? Каму мы што зрабілі?

«Э, горш ня будзе!» Колькі ўчынкаў, часам выратоўчых, часам непапраўных зроблена, колькі рашэньняў, якія вызначылі нечы лёс, прынята з гэтым адчуваньнем альбо апошнім ускрыкам. Кажуць, крычалі: «За Сталіна!» Не прыпомню ў нас у партызанах. Што здаралася такое, чуў толькі аднойчы. Адзін выпадак у нашай мясцовасьці, сярод многіх атрадаў, зафіксаваны: 25 сьнежня 1943 году, Аляксандар Вышкоўскі, вёска Коўчыцы-Беларускія Парыцкага раёну, Палесьсе. Некалькі дзён пасьля гэтага пыталі: «А праўда, што адзін храпковец...» Атрад наш сядзеў у акопах і дзотах, збудаваных паліцаямі, якіх мы перабілі, на нас наваліліся франтавыя немцы і ўласаўцы з танкамі. Сашка Вышкоўскі адстрэльваўся з абмразуры, у яе і выкрыкнуў вонкі, у абмразуру куля заля-

цела, якая тут жа яго і забіла. Менавіта так і было. Распавядалі тыя, хто зь ім у дзоце знаходзіўся. Мы былі раскіданыя па акопчыках альбо проста ў канавах ляжалі і таго ня бачылі, ня чулі, але таксама потым адзін аднаму перадавалі: «А Сашка крыкнуў: «За Сталіна!» І пасьля вайны ўспаміналі на партызанскіх сустрэчах. Нават другія атрады. Але калі б гэта быў не надзвычай рэдкі сярод партызан выпадак, столькі б не гаварылі пра яго. У нас нават палітрукі і камісары не выкрыквалі: «За гэтага самага!», нават ім перашкаджала нешта: магчыма, нашы вечныя гаворкі пра калгасы і інш.?

Затое: «Горш ня будзе!» — зь любой нагоды. Нават там, дзе трэба было б: «За Радзіму, за Сталіна!» Пабачылі першых ваеннапалонных-чырвонаармейцаў, акружаных цікаўнымі немцамі, і мы, глушанцы, пачулі ўсяму тлумачэньне, на ўсё адказ: «А, горш ня будзе!» Выкрыкнуў у наш бок высокі, за колькі дзён усохлы, пачарнелы чырвонаармеец — без рамяня, кашулягімнасьцёрка па-бабску выпушчана на худы жывот.

Гэта быў дзясяты дзень ад пачатку вайны, мы аніяк не гатовыя былі ўсё гэта зразумець і прыняць. І чырвонаармейцы паверх галоваў немцаў усё выкрыквалі ў натоўп суайчыньнікаў:

— А што? За Сталіна галовы класьці?

— За калгасы?! Э, горш ня будзе!

Гучала гэта і ў наступныя дні — там, дзе пралетарыі гуты «Камінтэрн» (другая, савецкая назва Глушы) рэзаліся ў карты. Азартна і злосна, быццам не адныя толькі савецкія рублі і нямецкія маркі, а яшчэ нешта ставячы на кон. У канавах пры шашы, у клюбным двары — паўсюль гэтыя залеглыя ў траве басаногія, бруднаштаныя карцёжныя клюбы. Ня спрэчкі, не абмеркаваньне, а толькі кароткія рэплікі, і сэнс многіх зводзіўся да аднаго: горш ня будзе, чым было! Ужо не бывае горш!

Праз два з паловаю дзесяцігодзьдзі голас-крык Валодзі Высоцкага агучваў наш фільм «Вайна пад стрэхамі»:

«... Мы іх не чакалі, а яны ўжо прыйшлі, а ў калодзе як-ніяк чатыры карты, яны давай хапаць тузы і каралі... Ім посьпех, а нам спалох...» Начальства песьню выразала, а як жа: «акупанты прыйшлі, а нашы людзі ў карты рэжуцца!»

Ну хіба растлумачыш, што пасьля і самім забыць хацелася — пра тыя першыя два-тры тыдні? Адзін цяжар (учарашні) зваліўся, новы не наваліўся (не адчулі яшчэ напоўніцу), і людзі як бы спрабавалі, правяралі такое вось нязвыклае становішча, самаадчуваньне: можна сказаць (альбо хаця б пачуць), што думаеш, што думаў аб арыштах, аб калгасах, пра Сталіна, пра ўсё тое жыцьцё, якое было, стала, здавалася, навек, і раптам — няма яго! Кудысьці ўсё пакацілася.

Ну а што навалілася? НКВД пахапала амаль палову шкловыдзімальнікаў-рабацяг (на бяду, бацькі ім пакінулі польскія прозьвішчы, імёны), і сьлед іх прастыў. Колькі пастраляюць фашысты, зьнікне ў падвалах СД, камэндатур нямецкіх, пераб'юць эйнзацкаманды — пра гэта яшчэ належала даведацца.

Таго ўжо няма, гэтага яшчэ няма.

Потым адвечнае наша: «Горш ня будзе!» стала працаваць супраць немцаў, супраць «Гітлера-вызваліцеля». Зь вялізнымі вогненна-чырвонымі плякатамі-партрэтамі машыны спыняліся, зьяжджалі на ўзбочыну, запрашаючы карцёжнікаў пачытаць брашуры: запомнілася кніжачка беларускага «наццэма» Аляхновіча «У капцюрох Г.П.У.». Гэтыя «капцюры» не былі навіною для нашых людзей, але калі з рук акупантаў — такая праўда бянтэжыла. А тут 7 лістапада немцы адзначылі савецкае сьвята тым, што на вачах у жыхароў забілі палкамі, прыстрэлілі дзясяткі ваеннапалонных — цяпер іх брашуры і наогул не патрэбныя былі глушанцам. Немцы самі паклапаціліся, каб разьяднаць у сьвядомасьці камінтэрнаўцаў Сталіна і Гітлера. Далоў гітлераўскія сто грам, няхай жыве сталінскі кіляграм!..

З вайны выбраліся зь нікім не пацьверджаным,

нічым не гарантаваным перакананьнем: будзе лепш! Пасьля ўсяго — толькі лепш!

У 46-м і 47-м, усё яшчэ да канца ня верачы ў тое, што творыцца, вёска адкрывала — не да лепшага, а ўсё да горшага і горшага паварочвае. І гораду было кепска: так, цэны для яго зьніжалі, але зь якога ўзроўню? Раней іх усьцягнулі ледзь не на неба. Вёска ж і гэтага не атрымала (а гэта 2/3 насельніцтва краіны). Зусім наадварот. Во і ва Ўюнішчах: Юнру і ўсіх калгасных і надкалгасных начальнікаў сабралі ў раён. А іншых — у вобласьць. Свой манэўр разумееце? Сам таварыш Сталін кантралюе задачу: прадукты, тавары павінны паступаць на нарыхтоўчыя пункты бесьперапынна. Калі ў каго ёсьць яшчэ адна галава ў запасе, можаце плян яйкамясамалаказдачы ня выканаць, а астатнім — не рэкамэндуем.

Вёсцы было кепска і раней. А было, што і зусім невыносна. Але нават у 20-я і 30-я заставалася надзея: калі-небудзь гэты разбой, што чыніцца над мужыкамі, над зямлёю, над ураджаем і безабароннай скацінаю, скончыцца, ня можа ня скончыцца! І ў вайну — ужо як было невыносна кепска! — а ведалі: вось выганім немца — і ўвесь гэты кашмар згіне.

Усё трацілі: маёмасьць, дзяцей, жыцьцё сваё. А надзея заставалася.

Самае жахлівае — жыць без надзеі. У 1946-м, нават у 1947-м усё яшчэ цеплілася: ня можа быць, каб заставалася во гэтак! Быццам і не было вайны, усіх ахвяр, і ўсіх справаў, і абяцаньняў, і анічога не азначае ўсё, што людзі зрабілі і вынесьлі.

Адныя раней, другія крыху пазьней, але выявілі: усё гэта не азначае анічога. Для кагосьці там, невядома дзе, але не для самых галоўных. А хто больш галоўны за Сталіна? Праўда, і ад не-галоўных, але яны блізка, пабач, залежыць, жыць табе альбо лепш памерці. Нават калі ў іх самых пашпарту няма, а ёсьць калгасная паперка.

Галодныя, паўмёртвыя дзеці, гнілыя «ташноцікі»

па вясьне, нялюбая праца і холад, зьдзеклівыя «палачкі» ў калгаснай ведамасьці замест аплаты, і над усім, за ўсім — блізкая турма, суд хуткі зыа што заўгодна і нават без чаго-небудзь. Б'юць і плакаць не даюць.

Але для нас, у каго ў вёсках былі свае прыгонныя — гэта так, прыгонныя, ведалі мы пра гэта ці ня ведалі, думалі ці ня думалі, — зьніжаліся цэны на вырваныя з роту ў вясковых дзяцей «прадукты харчаваньня». Аніяк забыцца ня можам, што цэны зьніжалі!..

Адкуль бяда прыйдзе, гром грымне, хіба ў гэтай жытцы ведаеш? Ну абклееныя старымі газэтамі сьцены, многія так рабілі, перад вайною бацька па газэтах шпалеры паклаў, але спаўзьлі ад вільгаці, калі ня жыў у доме ніхто. І потым: газэты савецкія, а не нямецкія. Але гэта, выяўляецца, яшчэ горш. Калі зьяўляліся якіянебудзь важныя госьці ў пастаяльцаў-начальнікаў, Вэнэра перажывала, што прусакі па сьценах бегаюць, ад перасохлай паперы такое шаргаценьне. Але пра самыя газэты й ня думалася. Вісяць, дык яны заўжды віселі. Да іх і вока ўжо звыклася: дзе нейкая пляма-партрэт, дзе большыя літары, а дзе меншыя. Ну Тамаш прыйдзе ды прачытае ўголас, дык ён без газэты ня можа, яму што старая, што новая.

Сам называе газэты каровінай жвачкаю.

— Замест сена пачытаць бы каровам: «Больш кармоў, сакавітых і калярыйных». Адно немачкі нашы па-руску ня петраць. Мруць, як мухі.

А то пачне фатаграфіі і подпісы пад імі тлумачыць: гэта Бухарын — вораг народу, Леніна хацеў забіць, а гэта Шаранговіч, наш таварыш, беларускі, таксама шпіён, а Чарвякоў застрэліўся сам, проста на зьезьдзе. Асабліва любіць пра Прышчэпава (пра яго і Вэнэрын бацька калісьці ўспамінаў). Грымеў гэты нарком на ўсю Беларусь. Прышчэпаўскія пасёлкі, прышчэпаўскія хутары. Культурныя гаспадаркі. Выстаўкі. Усё Прышчэпаў. Ратаваў ад камуны, ды толькі не ўра-

таваў: праваліліся ў гэтыя калгасы. І сам прапаў. Таксама польскі шпіён.

Старую і Вэнэру, хаця і цікава, пужалі Тамашовыя палітгутаркі. Накліча дзед бяду!

Калі ж дабіраўся да сталінскіх абліччаў на газэтах — хоць з хаты ўцякай!

— Ну што ты заўжды такі незадаволены? Усіх, усіх ворагаў у барані рог, а ўсё незадаволены, надзьмуты. Ужо і Гітлера няма.

Старая сунімала Тамаша:

— Не зласлоў цара, бо пташка нябесная перанясе слова тваё!

Ня пташка, а самі, каму ня сьлед, пабачылі, разгледзелі-ткі. Хаця ніколі раней ніякія прыежджыя ўвагі не зьвярталі. Але гэтыя наехалі зусім здалёк, раней, можа, і вёскі ня бачылі блізка. Усё ім было цікава: ах ды ох! Усталі ўжо з-за стала, задаволеныя, што іх так прынялі і гаворкаю пачаставалі, ім дагодлівай, зь імі згоднай, тут адзін раптам і зачапіўся вокам за нейкі брудны, мухамі запэцканы партрэт на газэце.

— «Член палітбюро Зіноўеў выступае перад пуцілаўцамі...» Што?! Ды ў вас тут яшчэ і Бухарын! Яшчэ хто, ну-ну? Цэлы агітпункт! Супраць савецкай улады. І проста ў праўленьні калгасу.

— Гэта не праўленьне, гэта дом адной бабы, — замармытала, аж заікацца пачала «Савецкая ўлада», — вы правільна заўважылі, а мы прагледзелі, не праявілі...

Госьці гэтыя, начальства гэтае будоўлю за лесам інспэктавала (дарогу ці што там у іх атрымлівалася), а Энкавэдэ запрасіў іх на абед ва Ўюнішчы. На сваю галаву. Стаяў і слухаў, як грымела яго высокае начальства, уцягнуўшы конскую сваю морду ў плечы, як пад узмахам пугаўя.

Паехалі — як жа ён разьюшыўся, усіх прымусіў бегаць, як на пажары, скрэбці сьцены, змываць варожыя фізіяноміі, прозьвішчы, словы. Але адразу задача ўскладнілася, і Тамаш таму віною. Зьвярнуў увагу Эн-

кавэдэ, што шмат, больш за ўсё Сталіна на тых газэтах. Сказаў уголас, і цяпер нельга было цішком змываць, зьдзіраць і Сталіна таксама. Энкавэдэ падазрона, як бы з-пад дугі, глянуў на дзеда (знарок той зрабіў гэта альбо па дурноце), узяў у Юнры сіне-чырвоны аловак і ўласнаю рукою стаў адзначаць мясьціны, якія не павінны кранаць мокрая швабра і нож. Давялося ўсе сьцены аблазіць яму.

Назаўтра, калі пастаяльцы-начальнікі разьбегліся па сваіх справах, Вэнэра асьцярожна зазірнула ў сьвятліцу. Проста не пазнаць: бярвеньне жаўцее, што воск, а сям-там і чорнае да смалы. Нават вусатых прусакоў паменшала. Альбо ня так прыкметныя на цёмным. Затое яны добра бачныя на вусатай фізіяноміі Сталіна, быццам знарок зьбіраюцца на ім пашаптацца ўсе разам. Заўважыў гэта і Энкавэдэ, ён цяпер пільны, аж кіпіць.

— Неадкладна вытруціць! Якія маразы, чакаць да маразоў? Каб заўтра не было гэтае брыды!

Тамаш пасьля адкамэнтаваў:

— Гэта вам ня людзі, гэтых не зьвядзеш наганам.

Здаваць пачаў Тамаш і вонкава, і розумам: то хіхікае, то заплача бяз бачнае прычыны. Зрэшты, прычыны ёсьць: у яго ў вайну ўсе згарэлі, мала баба з дочкамі, дык яшчэ і нявесткі з унукамі. Але куды часьцей цяпер Тамаш успамінае сыноў. Іх, абодвух, забралі, загінулі перад вайною.

— Прыяжджалі ў госьці, уся вёска зьбеглася паглядзець. Лейтэнанты, кубары! І тут гэта здарылася. Абедзьве нявесткі з малымі, адна за адной зьявіліся. Ажно забралі. І Грышу забралі, і Міхася, старэйшага. Як абухом па галаве.

Тамаш дабег да Парычаў, купіў канвэрт, паперу і напісаў там жа, за паштовым сталом, ліст самому Сталіну. Нікому і ніколі ён такіх словаў, з такой надзеяй і ўпэўненасьцю, што ўсё і адразу зьменіцца ў лёсе ягоных дзяцей, не пісаў і не казаў. За першым потым і другі, і дзясяты ліст, пакуль яго не папярэдзілі: у раё-

не пра цябе гавораць, хутка забяруць, лісты пішаш, тады як іншыя адракаюцца і ад дзяцей, і ад бацькоў — ворагаў народу. Змоўк Тамаш, а то яшчэ і нявестак пахапаюць. А тут — вайна, другая бяда навалілася.

Пасьля вайны ён нэрваваўся, непакоіўся: а раптам які з сыноў вернецца, будзе шукаць у сваёй вёсцы, хто яму паведаміць, што бацька ў нейкіх там Уюнішчах прыладзіўся жыць? Зноў пачаў лісты пісаць, не ў Маскву, а ў Парычы і ў сваю вёску, якой, ведаў, няма больш. Яна так і не адбудавалася — аднойчы зьезьдзіў, пабыў на папялішчы. І вось, бы чуючы канец, зноў стаў зьбірацца «дамоў», усім распавядаў пра сыноў, анікога і анічога ўжо не баяўся Тамаш.

А ў краіне зноў і зноў нешта здаралася, ворагі не сунімаліся. Нейкая Ахматава, нейкі Зошчанка нешта такое там сказалі альбо зрабілі, што ўся краіна была ўзьнятая супраць іх, як нядаўна супраць немцаў. А пасьля той гісторыі з газэтамі да Ўюнішчаў у вялікага начальства асаблівая ўвага. Акрамя ўпаўнаважаных па сяўбе, жніву, ворыву, баранаваньню, падкормцы, пазыцы, малака- і мясаздачы, зачасьцілі і гэтыя, якіх бабы адразу ахрысьцілі «тлумачамі». І плашчы, і касьцюмы на тлумачах розныя і лепшыя, чым у розных іншых упаўнаважаных, але патрапаныя папяровыя лісткі, падобна, яны перадаюць адзін аднаму адныя й тыя ж. Двойчы наяжджалі па Ахматавай і Зошчанку, а тут і трэці зьявіўся, прыйшоў напраcткі да аборы. Пакуль перабіраў добра знаёмыя запаветаўцам паперкі, Тамаш, каб час не марнаваць, распавядаў бабам пра атамную бомбу. Больш за ўсё ўражвае запаветаўцаў, што можна ў чамадане перавезьці яе і можна ўзарваць любы горад. Ой, нашы хоць добра глядзяць там, на мяжы? «Савецкая ўлада», якая суправаджала тлумача, запэўніла:

— Таварыш Сталін не дапусьціць.

— А я сон бачыў, — падхоплівае Тамаш, — адзін сон двойчы: ляцяць, ляцяць, жудасна, ні гуку, ні стуку, не самалёты, а, халера на іх, палкі нейкія. А Сталін

мне кажа, ён са мною, як ты ды я: «Анічога, Тамаш, у нас вёрстамі (Тамаш па-рыбацку раскінуў рукі) лётаць будуць».

Тлумач гатовы да справы прыступіцца, але Тамаш не аддае яму аўдыторыю, дасказвае, як Сталін Чэрчыля і Рузвэльта зьдзівіў. Ехалі ў машыне, а на дарозе бык улёгся, гнаў Чэрчыль — не прагнаў, амэрыканскі прэзыдэнт гнаў — не прагнаў, а Сталін падышоў, шапнуў слова — толькі і бачылі таго быка, аж пыл закурыўся. А ўсяго толькі і сказаў: «Зараз у калгас забяру!» Усе страшэнна задаволеныя, нават «Савецкая ўлада»: не, лепш за Сталіна ня скажаш!

Тлумач зацягнуў, як дзяк: пастанова ЦК, указаньні ЦК; бабы — хто стаіць, а хто наўколенцы прысеў, у гразі-гнаі па вушы, слухаюць пакорліва-ўважліва. А з падзямельля па сьлізкім гнаі марудна брыдзе, уздымаецца істота, якая нагадвае карову, зьлепленую з гразі, гною, сусьветнае тугі, бабы заварожана пазіраюць, як яна торгаецца ў паралічы, а ногі разьяжджаюцца, быццам у цяляці, што толькі што нарадзілася. Захісталася немачка, стукнулі-грукнулі капыты, і, нейк сьмешна-бязглузда выгнуўшыся, карова завалілася на бок. «Савецкая ўлада» строга асадзіла ахнуўшых цётак, ускінула рукі: не адхіляцца, слухаць! Во, самае важнае, цікавае! Ахматава такая і сякая, Зошчанка тое ды гэтае. Чалавек спэцыяльна прыехаў, во як гэта важна.

Не, краіна не забывалася на запаветаўцаў, на Ўюнішчы. Што грамадзе, тое і бабінаму сыну. Прыкаціў да дому бязногі Прохар, яго здалёк чутно: калі людзей няма, пагамоніць з курай, з сабакам, з ганкам, з дзьвярыма. І ўсё гучна, на поўны голас. Вэнэра выбегла, расчыніла адны дзьверы, другія, ён перакінуў сябе разам з калёсікамі праз парог і пакаціў проста ў сьвятліцу, дзе начальства.

— Чулі, людзі? — Выгукнуў, закінуўшы твар угору. — Чулі?

— Ну, што там? — Незаволены голас Вашамосьця. — Бачыш, у нас актыў. Табе чаго?

— Ня чулі? А тое, што адмянілі плату за ордэны. Во!

Ніхто ня ахнуў, ня ўскочыў, нікуды ня кінуўся бегчы. Зарагаталі:

— Менш піць будзеце. А то на ўсіх вакзалах ды ў цягніках, не прайсьці людзям.

— Я што, на працадні п'ю? Вось вы за якія п'яце тут? А за вашы працадні і кура не нап'ецца. Гэта ўсё Зьверава работа, твайго гада, твайго, Юнра! Шкоднікі! Не атрымаецца ў вас. У нас, у салдат, ёсьць абаронца. Генэралісімус скажа слова, пачакайце! У цябе, а ў цябе — у каго ёсьць падзяка Вярхоўнага? Ні храна ў вас няма. Тварныя істоты! Праўду пра вас Старая кажа. Цяпер трымайцеся, салдацкае цярпеньне лопнула!

— Ды ён пагражае! Гэта каму ж ты, тэрарыст, грозісься? Савецкай уладзе? Старшыні калгасу? Мне, органам? Ды знаеш, што з табой будзе?

— Ладна, выкінуць яго і ўсё, — распарадзіўся Вашамосьць.

Вэнэра абмерла ад жаху і болю, калі пабачыла, як двое — «Савецкая ўлада» і Юнра — пацягнулі да парогу абрубак чалавека, які лямантаваў, сыпаў мацюкі, піхаючы нагой яго калясачку. Было чутно, як чмякнуўся аб дол цяжкі куль-чалавек, забегла «Савецкая ўлада», падхапіла калясачку і, шпурнуўшы за дзьверы, вярнулася пераможна.

Жыцьцё кацілася, калі што і зьмянялася, дык абавязкова да горшага. Затое будоўля за лесам набірала моц: хадзілі, праўда, чуткі, што аніякая гэта не дарога, а аэрадром, сакрэтны. Нікога туды не прапускалі, даводзілася рабіць круга за тры вярсты, калі трэба ў суседнюю вёску. На выпадак вайны з амэрыканцамі будуецца — вось з гэтага аніякага сакрэту не рабілася. Але людзям не да таго. У кожнага сваіх клопатаў. Вэнэра не-не ды й адзначыць, што абыякавай робіцца — да ўсяго, ад чаго раней і сьлёзы былі, і бяссоньніца. Нейкія два-тры галоўныя клопаты: каб ня выгналі з хаты, разьлічыцца па падатках,

каб карову не забралі, ну і рот чым-небудзь заткнуць сабе, дзецям — астатняе як бы і не датычыцца яе, да яе душы не дастае. Пабачыць Шэрага — ну што, конь як конь. Ня сам па сабе ён ёй цікавы, вочы б на яго не глядзелі, а вось ці не прасыпаўся авёс, хоць жменька, з торбы, якую вешаюць яму на шыю: жары, не хачу! — за гэтым назірае Вэнэра пільна. Хуценька сабраць у далонь — дзеткам на суп. Калі добранька, доўга тушыць-выварваць у печцы, ён, хоць і неабдзіраны, а пусьціць жыжку, клей — не адною ж бульбаю душыцца, ды й той ніколі да вясны не хапае. За ўсім, куды ні павернесься, туга і бяздумная боязь невядома чаго ўжо. Хаця вядома. Татка, татка, навошта ты яго рабіў, гэты дом, такім вялікім, прыкметным? Была б у мяне хатка, як у людзей, няхай зь бярвеньняў-запалак, няхай у адно акенца, затое гаспадыняю была б у сябе дома. Не было б гэтых жорсткіх таблічак на сьценах, гэтых назол па ўсіх кутках, ад якіх і на печы месца, спакою ўжо няма. А галоўны клопат: карову ня страціць. Адзіная карміцелька. Але і яе карміць трэба. Асака балотная, лясная трава, ды й то асьцерагайся, што пераймуць-спыняць, вытрасуць зь лясёнкі: «Дзе нажала?» — глядзі, што і адбяруць. А было, што, сухое, і падпальвалі. Гары агнём, а табе нельга! А каб жа з лапаць лугу калгасьніку адмералі, сена далі, дык у Вашамосьця на гэта адзін адказ: «Тры аршыны тут твае, астатняе калгаснае!» Яно і праўда, людзі ўжо забыліся, дзе і якая зямля была твайго бацькі альбо дзеда. Нібыта заўсёды была іхнаю, во гэтых крыкуноў, і ніколі яны ні цябе, ні дзяцей тваіх не адпусьцяць ад нялюбай сіраты-зямелькі, якая ня корміць.

І сад бацькоўскі цяпер ня ў радасьць. Такі ён вялікі, дрэвы, як у лесе. А кожнае падлічана, запісана (дзесьці там, у раёне і вышэй), за кожнае ім заплаці. Быццам ня бацька, ня дзед, а яны яго саджалі, сад Вэнэрын. Ня кожны год родзіць, а плоціш штогод. Але нават калі ўродзіць, куды, каму прадасі яблыкі, ігрушы, вішню — разок, другі зьбегаеш да дарогі, дзе машыны праходзяць: бярыце!

Амаль задарма! Але гэтым зь Юнрам не разьлічысься. За ўсё, і за сад, плоціць Пярэсьценькая — сваім малачком ды масьліцам. Антончыку ды Машы (ужо і Маша ёсьць у Вэнэры, выкацілася на сьвет, як яблычак зялёненькі) — для іх мала што застаецца. Як украдзеш таго малака — па паўкружачкі ранічкаю ды нанач.

Нейк прыстасавалася жыць, прызвычаілася, калі б ня гэты Юнра. Раней нібыта не заўважаў Вэнэру, і дзякуй Богу, адно палохаў, звычка такая ў яго паскудная: хутка, маўляў, і тваю ў калектыўны статак. Во ў цябе тут пені нарасло па мясе ды па шэрсьці. У калгасную яму бедную скаціну? Ды яна такая пяшчотная, ласкавая, есьці не пачне, калі не пачуе добрага слова ад гаспадыні. Ужо лепш на бойню. Сэрца адзін раз адбалела б. А то штодня бачыць яе — як сярод ваеннапалонных за дротам сына свайго ці дачку. Так ужо атрымалася, што не абараніла сябе, не ўратавалася Вэнэра ад гэтых паразытаў-назол. Але калі нарадзіла Машу, яна азьвярэла: можаце гнаць, выганяйце з дому, а нікога не падпушчу, ня дамся! У вайну дзеўкі ратаваліся ад немцаў ды паліцаяў тым, што кульгавымі, гарбатымі прыкідваліся, морду сабе ў сажу запэцкаюць, каб на чорта быць падобнаю. Але гэтым, хоць кульгавая хоць мурзатая, ён, каторы лезе да цябе на печ, сам сябе ня помніць, яму ўсё роўна, яму, камандзіровачнаму, абы ўрваць хоць што-небудзь.

А цяпер Юнра раптам зашустрыў, патрабуе, як свайго. Ледзь ноч, пайшоў бегаць: за дзьверы, у дом, туды, сюды, голас падае. Вэнэра прыкідваецца, што заснула. Паўзе на печ. Пужалася, што на дзяцей наступіць, яны, калі не на печы, дык на ляжанцы ўнізе, там халадок.

З чым прыходзіў, з тым і адыходзіў. Крыўдзіўся: рукі ў цябе не жаночыя, як каваль хапаеш, і калені — жалезныя! А потым аж крыкнуў, ужо на ўвесь дом:

— Лічы, што каровы ў цябе няма! Заўтра каб да капейкі ўнесла за сад, за кожнае дрэва!

Ужо зьнізу, спусьціўшыся, дадаў:

— Сама паклічаш — не прыйду.

Чакай, паклічу, а то як жа! Але калі сама супакоілася, зразумела: загінула, загубіць! Колькіх ён ужо ababраў да нітачкі.

Гадзіна прайшла, другая, ноч усё не мінала, Вэнэра больш не магла чакаць: яна спусьцілася з печы, стараючыся не пабудзіць Антончыка і Машу, якія спалі ў закутку, спадніцу апранаць ня трэба, сьпіць у ёй, не здымаючы, накінула на плечы куплены ў палонных немцаў фрэнч, у сенцах пад шафаю абмацала сякеру і ціхенька выйшла з дому. Голыя ступакі абпаліла холадам: усё правільна — квецень на яблыні, мароз на зямлю. Ад бацькі чула. Цемра-цемрыва, а зоркі — быццам вецярком жар падварушвае — іскрацца-зіхацяць. Але толькі на адной палавіне неба. Другая закрытая шчыльнаю хмараю, якая праглынула і месяц. Дзіўна бачыць квітнеючы сад чорным. Дзіўна і вусьцішна. Ня верыцца, што насамрэч ён белы-белы, як пена мыльная. Але гэта нават добра, гэта добра. Тую справу, на якую ідзе Вэнэра, лепш зрабіць у чорным садзе. Рукою намацала ствол, як горла намацвае забойца, рука зь сякераю цяжкая, чужая. Адступіла і ўдарыла, але, сосьлепу ды хвалюючыся, адно кончыкам ляза зачапіла дрэва, ледзь сабе па калене не секанула. А варта б, а варта б! Нянавісьць, такая ж чорная, як ноч, як галінкі-кветкі, запаўняла яе ўсю. Нянавісьць да Юнры, д а і х у с і х, але і да сябе самой і да гэтага саду-згубцы («Цьвіцеш, а ня ведаеш, што ты нечая пагібель!») — усё зьмяшалася, як крупы з мышыным памётам. Забяруць карову, як маім дзецям жыць? Што мне з твайго хараства, куды я твае яблыкі, каму яны тут патрэбныя?

Адступіла і пайшла па садзе, бы чакаючы чагосьці. І дачакалася. Быццам пацягнуў хто хмару, як коўдру, раптам вызірнула круглая, страшная поўня. І ўзбух срабрыстаю пенаю сад над галавою ў Вэнэры, пераліваючыся нежывым бляскам і сонна шапочучы. Ну во і добра, ну во і добра. Цяпер бачна, як секчы. А вы што думалі

(камусьці зларадасна і ледзь ня плачучы), думалі месяцоваю красою напалохаць, зьвязаць рукі? І добра, во з гэтай, самай-самай срабрыстай і пачаць! Альбо гэту? (Успомнілася, як маладзенькі партызан бацьку распавядаў, што ён, лежачы ў засадзе, ня мог вырашыць, у якога немца стрэліць: у гэтага? у таго? і чаму памерці яму, а не таму, што побач сядзіць на возе?) Не змагла. Перайшла да наступнага дрэва: шафран, увосень вялікія, далоньню не ўвабраць, духмяныя яблыкі. Далей — штрыфэль. А гэта — пепінка, дзіцячая радасьць. Колькі разоў зь сястрычкамі бегалі да яе, зьбіралі маленькія, бы цацачныя, моцныя, ажно рыпяць, яблыкі. Во гэтая ігрушына заўжды хварэе, але цьвету на ёй гэты год як ніколі. З кагосьці пачаць трэба. Ня думаць, не глядзець... Замахнулася і секанула моцна, па-мужчынску. Змагла і — пайшло. Лягчэй, амаль лёгка. Во так, во так, а вы як думалі? Няхай забіраюць карову, няхай мруць дзеці. А ты? Слуцкая бэра, гонар бацькоў. Ну і няхай бэра, няхай слуцкая, татка, даруй нам, але ўсё, што ты рабіў, — усё тваім унучкам, унуку на шкоду: і дом твой прыгожы, і гэтая смачная, духмяная слуцкая бэра. За глотку нас узялі, трымаюць — і дом твой, і слуцкая бэра.

Сякера навостраная, што брытва, — улюбёны занятак Тамаша што-небудзь вастрыць, кляпаць. Антонаўка, вялізная ад свайго гольля і сучча, завалілася, як стог, амаль бязгучна — столькі на ёй квецені, як пух белай. Вяночкі пялёсткаў, як дзіцячыя вусны, што толькі адарваліся ад ранішняга пеністага малака...

Ужо ня чорныя, начныя, і ня мёртва-срабрыстыя, а сьвежа-ранішнія, *жывыя* дрэвы, ціха ахкаючы, завальваюцца набок, адно за адным.

Альбо гэтай красе быць, жыць, альбо яе дзецям: Юнра не памілуе, яны нікога ня мілуюць! Здаецца, зноў антонаўка, якая розьніца, антонаўка, не антонаўка... Антон, Антончык, о Божа, што вы са мною зрабілі, што вы з намі вытвараеце?! У галаве быццам матор раве, усё глушачы, а Вэнэру ўжо клічуць. Хто, чый гэта голас?

— Ты што гэта творыш? З глузду зьехала?

Тамаш у нацельнай кашулі, у нагавіцах, зарослы, як лесавік, адзін нос тырчыць шырокі — кліча, паклікаў яе назад у сьвет, ад якога так проста не адчэпісься:

— Ты ведаеш, што табе за гэта будзе?

Вэнэра азірнулася і ня ўбачыла знаёмага саду. Не, дрэвы стаяць, яшчэ шмат нясьсечаных, амаль палавіна, але няма саду і няма яе самой — нехта незнаёмы ў незнаёмым каінавым месцы.

— А што мне будзе? — адказвае амаль абыякава. — Мой сад, я і раблю, што хачу.

Гаворыць, а сама ўспомніла і ня можа адарваць вачэй ад белай вішні ля сваіх ног: патанула яе сяброўка, з жаніхом пабегла купацца, а ён п'яны, не зьбярог, пайшла на дно, яе хавалі ў падвянечных строях, а конь спужаўся нечага, памчаў і зьляцела труна на дарогу — во такая ў гразі ляжала ў белых строях...

— Натварыла ты, дзеўка, — гучна шэпча Тамаш, — засудзяць, гэта так. Шкодніцтва. Як піць даць.

Вэнэра, упусьціўшы сякеру ледзь не на нагу сабе, схапілася рукамі за галаву.

— Не магу, дзеду, сілы ў мяне больш няма трываць! Усе прыстаюць. І гэтая жаба. Пагражаў карову забраць, калі за сад ня выплачу. А з чаго выплочваць?..

— Уф-ф! — Тамаш сплюнуў. — Каб у іх зубы павывальваліся, як мой сусед Моўша казаў. Адзін каб застаўся — дзеля болю.

Праклінай не праклінай, а справа зроблена. Зайшла ў свой дом, як у турму ўваходзяць: анічога твайго тут няма і сам ты сабе не належыш. Во так, пэўна, непамысна Косьцю. Калі жывы. Хутка спазнаеш, так ці ня так чалавеку ў турме. Што, што яна натварыла, няхай бы бралі і карову, усё няхай забяруць! Абы жыць, як жыла.

Села на лаўку ля вакна, за кухонным столікам, зьбітым са старых, негабляваных дошак, і чагосьці чакала. Дзеці сьпяць, Антончык набегаўся ўвечары, а Маша наплакалася, жываток балеў. Рукою Антончык,

абараняючы, абхапіў Машу — бедныя сіроткі! Вэнэра заплакала.

Сядзела доўга, невядома чаго чакаючы. Хутка прачнуцца яе судзьдзі і пракуроры. Хутчэй бы ўжо пачуць іх крык, гнеў, перацярпець — а раптам даруюць, ня выганяць, не аддадуць пад суд? Няхай забіраюць, што хочуць.

Прачнуўся, зірнуў, як сонейка, пабачыў мамку і адразу патупаў да яе Антончык. Па-сабачы ткнуўся ў калені тварам, палез на рукі. У каго ён такі лізун? Жыць як будзе?..

Першаю на кухні зьявілася Груня, калгасная бухгальтэрыя.

— Песьціш ты яго. Потым наплачасься, — папярэдзіла чамусьці пакрыўджана і так, быццам сама ўжо дзесяцёра выняньчыла. Пабыла на двары, вярнулася — бы і не выходзіла: анічога не прыкмеціла. У Вэнэры шалёная думка мільганулася: што там і няма нічога, анічога і не было. Здалося, сьніцца ёй. Зірнула ў вакно, захутала ў крысо свайго фрэнча Антончыка і выйшла за дзьверы.

Ёсьць, анікуды не падзелася. У самай сярэдзіне саду страшна бачыцца нязвыклая пустка, колер у палеглых дрэваў мёртвы. Азірнулася і пабачыла за сьпінаю Юнру, фінінспэктара. Пазірае на зьдзейсьненае ёю як бы з ухвалай, быццам чакаў і во дачакаўся. Вочы яшчэ бліжэй да пляската-вострага носу ссунуліся: вясёлы, сьмяшлівы воўк! Няголены.

— Во ўжо да чаго дайшло! Якраз артыкул пад цябе прыняты. Сем гадоў з канфіскацыяй. Пайду палічу, наколькі зьбяднела казна. Рублёў на тысячу пацягне. Дзяржава гэтага ня любіць.

Тлумачыць падрабязна, радуючыся. Асіроціць яе дзяцей, што яму!

Карацей, ён свайго дамогся.

— Ну во, дурненькая, я ж ня зьвер, — шаптаў ноччу, адваліўшыся, як ліпучы смоўж. — А то рукі-ногі напружыць, як жалезныя, хто так робіць?

Ураньні яна нікому, нават карове ў вочы зірнуць не

магла. Не ад сораму. Ад нянавісьці. Быццам пяску ў вочы насыпалася. Немаведама за што пакрыўдзіла Антончыка, адшпурнула, як шчаня. Папрасіў малачка. Малачка табе! Усім вам ад мяне штосьці трэба! Сама жахнулася.

За рысаю нябачнаю засталася тая Вэнэра, дзяўчынка, жанчына, якая сябе ведала, помніла, цяпер ёй жыць з тою, якую сама ня любіць, сама якою пагарджае, калі не ненавідзіць.

Прысьніўся ёй Сталін. Што Сталін, скеміла пазьней. Першая думка: а гэты валасаты як сюды забраўся, што і не пачула? Ляжыць спакойна, ціхмяна і — голы. Зусім голы, аніводзін упаўнаважаны да такога не даходзіў. Тыя доўга блытаюцца ў сваіх кашулях-штанах, як ажылае пудзіла, — самы момант сьпіхнуць зь печы. Каб аж загрымеў. На радасьць тым, хто яго падаслаў. Падсылаюць найчасьцей новенькіх. Толькі што ад жонкі, зь якога-небудзь раённага крэсла. А бывалыя самі дарогу добра ведаюць. Амаль штоноч вайна зь імі. Стамілася ўжо, о, як ненавідзіць! І баіцца, бо каму гэта спадабаецца, калі такое ў доме робіцца? Ранкам, удзень баіцца на вочы патрапіць Вашамосьцю, старшыні.

Таму пасьля першага пярэпалаху: хто гэта і голы?! — другі спалох, але і зьбянтэжанасьць: няўжо было нешта? З гэтым? Валасаты, як выверуты кажух! Але рахманы. Ня чэпіцца, ня лезе з рукамі, ляжыць і тужліва пазірае ў чорную столь. Незразумела адно, дзеля чаго распрануўся? Адсунуўшыся далей да цёплага лежака, Вэнэра бачыць: гэта ён, той грузін, што прадаваў вінаград, а яна хацела купіць празрыстую ягадку для Антончыка, каб хаця пакаштаваў гэты цуд. Нясьмела падала была манэтку, ня ведаючы, колькі адна ягадка каштуе.

— Ты што мне суеш, як жабраку? — вочы ажно зьбялелі. — Калі ты бедная — на, бяры, бясплатна!

Гронкаю ледзь не па твары заехаў. І тут жа шпурнуў яе на горку вінаграду. І пальцамі, кісьцю рукі зрабіў

нейкі надта нетутэйшы рух: ідзі і не зьяўляйся ніколі! Вэнэра потым патаемна спрабавала паўтарыць: не атрымліваецца. Каб так прыгожа і пагардліва. І ніхто з тых, каго яна ведае, так ня змог бы.

А цяпер сам аб'явіўся і ляжыць побач на яе печцы. Круглатвары, рыжы, бязвусы, той самы, але Вэнэра чамусьці ведае, што гэта Сталін. Ёй зусім-зусім ня страшна, а толькі дзіўна і шкада голага Сталіна. Цягуча скардзіцца Вэнэры: на прусакоў, што поўзаюць па ягоным твары, як п'янтос-шафёр па бульбянішчы напрасткі, крыўдуе, што яго ня любяць, во і Антончык тады...

— Ды любяць, любяць, Іосіф Вісарыёнавіч! І Антончык — гэта ён ад пачуцьця да вас. Выбег на мароз, а сьняжок белы, сонца ў вочы, ножкі голыя, падпякае, малое, што дурное, ён і павёў піськаю, жоўтым па белым, цёпленькім: «Сталін». Энкавэдэ наш нагамі тупаў: «Навучыла! Пасадзім! Дзесяць гадоў як лёду!» Хлопчык чуе імя ваша на кожным кроку, во ён і напісаў яго.

— Напісаў. Тут розьніца. Яшчэ якая!

— Хочаце, я яго палаю, адшлёпаю? Адно не крыўдуйце на нас. Думаеце, мы не разумеем, як вам самім цяжка з нашымі камандзірамі-начальнікамі. Усе зладзюжкі, п'яніцы, а вам трэба будаваць камунізм. Вы Леніну абяцалі, а зь імі што збудуеш? Ды й мы ня лепшыя. Аб адным толькі прашу: каб не забіралі карову. Дзецям ні кроплі малака ня дам, усё дзяржаве, абы толькі ня здалі ў калгас. Як нам безь яе, а тут хоць якая апора, надзея.

— А навошта вам гэтыя газэты здаліся? — спытаў, паскардзіўся Сталін. — І яшчэ кажаце, што любіце!

— Дык мы ўжо садралі, усіх да аднаго. Толькі вашы партрэты засталіся. Ну а што прусакі бегаюць, дык іх толькі зімою і можна вымаразіць. Але затым зноўку напаўзуць. Спрабавалі. У бацькі, праўда, быў сродак, з гораду прывозіў. Яшчэ да калгасаў. Во ў вайну ўжо не было калгасаў. Не, я нічога, мы ня супраць. Няхай бы і калгас, калі б хоць плацілі. А то год паку-

туеш, а атрымліваеш — у адной руцэ чалавек зьнясе. Толькі шкоднікі так могуць з народам абыходзіцца. Вы іх і так, і гэтак, а яны шкодзяць усё роўна.

— Кажаш, любіш. А вось абняць ня хочаш.

Вэнэра зірнула на голага і ахнула: ніякі ён ня Сталін і не базарны грузін — Юнра гэта! Хітрыя воўчыя вочы, бы ў прусака, спаўзьліся да пераносіцы — пярэварацень! Жах і агіда вырваліся з грудзей крыкам, крык гэты яе і абудзіў! Загаварылі за сьценкаю. Вэнэра спалохана сьціснулася, быццам яе і няма ў гэтым доме.

Засталася-такі без каровы. Нішто не дапамагло: ні яе неўтаймаванасьць, ні яе ўступлівасьць. Унё нават начныя скаргі Сталіну не адвялі бяды. Пасьля таго сну яна нават хацела напісаць яму ліст. Але згадала ліст Тамаша і ня стала гэтага рабіць.

І сад высекла, а кароўку ўсё адно страціла. Месяцы два яшчэ карміла яе са сваіх рук, але пеня нарасла такая, тысяч на пяць («пена», кажуць калгасьнікі), што і Юнра не дапамог. А ён выгляд рабіў: хацеў, яшчэ як стараўся, але дзяржава мацней нават за фінінспэктара.

У калгасным статку Пярэсьценькая адразу замаркоцілася, бакі і сьпіна ў плястырах гразі, ногі, як у цяляці-сысунка, заплятаюцца. Малака збавіла больш чым напалову. Але нікому справы да гэтага няма, скаціна, як і людзі, — для калгасу, а не наадварот. Не субота для чалавека, а чалавек для суботы, — ня раз тлумачыў гэта і Тамаш.

Сябе гэтак не шкадавала Вэнэра, як сваю кароўку. Пра сябе і ня думалася: якая яна, калі з боку глянуць? Але аднойчы глянула міжволі, сама пабачыла. Ну і што? Хіба нешта зьменіш, можна зьмяніць?

А здарылася, што ва Ўюнішчы заехалі партызаны. Былыя, вядома, якія калісьці днявалі і начавалі ў доме Станкевіча. Мабыць, вялікія шышкі, аж зь Менску, на «Победе» прыехалі. Пастаялі на вуліцы, пагаманілі з «Савецкай уладай» ды Вашамосьцем. Надта кудысьці сьпя-

шаліся. А адзін усё бегаў па вёсцы, немаведама чаго прачыніў дзьверы і зазірнуў у Вэнэрын дом, не зайшоў, а толькі: «Добры дзень, прабачце, я проста так», — і пабег далей. Але ў Вэнэры свае клопаты і справы: выйшла з брудным вядром падабраць за шэрым, якога Вашамосьць навязаў да агароджы. Каштаны, якія коні губляюць, запаветаўцы тут жа падбіраюць. Калі зьмяшаць з бульбянымі лушпайкамі ды запарыць кіпенем, ад гэтай зялёнай, густа пахучай бурды парсючка за вушы не адцягнеш. Але найбольш цэніцца гаўно старшынёўскага Шэрага, у якім бялеюць зернеткі аўса, і тут Вэнэры пашанцавала — заўсёды каля яе дому. Зноўку аб'явіўся той, што зазіраў у дзьверы, зноўку «дабрыдзень» і пытаньне:

— Вы ня ведаеце? У гэтым быццам доме Станкевічы жылі, у іх яшчэ дзяўчына была... Мабыць, усе пагарэлі, іх усіх тут пазабівалі.

Ну і што ж, усіх дык усіх, няма ў Вэнэры ахвоты прызнавацца, што тая дзяўчына — гэта яна, во гэтая баба зь вядром конскага гаўна і ёсьць тая самая Вэнэра.

— А вы з Тамашом пагутарце, вунь дзед едзе з поля, — параіла, пазьбягаючы непатрэбных роспытаў. — Ён таксама партызан.

Але маладзенькага бегунка (студэнт, напэўна) паклікалі да машыны, і яны тут жа паехалі. Тамаш праводзіў іх са скрухаю ў позірку: хто-хто, а ён шануе заежджых гасьцей — і пакурыць можна, і пабалакаць.

— Гэта хто былі? — пацікавіўся ў Вэнэры, ня злазячы з возу. Акуратна перавернутая дошка пад худым азадкам, чыстым, ня ўгноеным бокам, але самога ня вывернеш, не перавернеш: запэцкаўся па вушы, адна рука ёсьць адна рука. — Што ім трэба было?

— Партызаны. Можа, вашы? Сказалі, зь Менску.

— Шкада, што паехалі. Можа, і праўда хто з храпкоўцаў. Прыгожы, кажуць, стаў Менск.

Так, гэта мы былі, Караткевіч, ты ўгадаў, дзед Тамаш. (Так яго, здаецца, адзін Носаў называў.) Была

магчымасьць пабачыцца, пабалакаць ды паўспамінаць. Разам заваёўвалі Перамогу.

Менск — горад прыгожы. Прыежджыя, нават зь Ленінграду госьці, усе так кажуць. І Кіеў з новым Храшчацікам усім падабаўся, анэкдот у іх, у суседзяў, быў, які і нам добра падыходзіць. Калгасьнік на тым Храшчаціку зрабіў непрыстойны гук, міліцыянэр адразу: плаці тры рублі штрафу! Заплаціў, куды дзявацца, — з грошай, што выручыў за малако, вішні. Але ўсё-ткі пацікавіўся: куды мае тры рублі патраціце?

— Бачыш, бацька, якія даміны адгрохалі? Мармур, граніт. Але гэта толькі пачатак.

— Доўга ж нам пярдзець давядзецца!

Не такія ўжо мы гарадзкія былі, самі толькі ўчора зь вёскі.

Але добра помню, як пасьля Новага году прыехаў да нас з братам у Менск бацька па справах сваёй больніцы. Праводжу яго да Дому ўраду, праз плошчу Леніна прабіраемся — уся забітая ларкамі, але не звычайнымі, а пад казку, дзясяткі раскошных буданчыкаў. Затрымаліся каля выстаўленай на продаж (свабодны) «Победы», і цана ёй — 9000 рублёў! Я і паведаміў бацьку, чамусьці ганарліва:

— Сто тысяч гарадок каштуе. На два тыдні. А потым усё гэта на злом.

Думаю, што на інтэлігенцкую «віну перад народам» вясковы лекар Міхаіл Іосіфавіч Адамовіч не хварэў ніколі. Ён дзень пры дні ўкалваў у сваёй больніцы, а кожную ноч яго вазілі ў вёскі да парадзіх ды ўсякіх тэрміновых хворых, — так і памёр амаль у дарозе. Не было калі яму вінавацінца. Але тут раптам зірнуў на свайго сына з пагардаю:

— Сто тысяч сабаку пад хвост? Бачу, вы тут у нас багацеі! Даўно ў калгас не зазіралі. Машына вунь 9000. А баба плоціць тры тысячы падатку: траціна машыны. Добра вы ўладкаваліся!

Гады каціліся, але ва Ўюнішчах гэта прыкмячалася толькі па тым, як расьлі-гадаваліся дзеці, ды

яшчэ — колькі іх у Вэнэры. Яе дзеці, што кольцы на зрэзе дрэва. На якім вісеў Евін зьмей-спакусьнік. Толькі ніякай спакусы не было і ў паміне. А было адно сьвінства, хамства: рукі-ногі зьвязаныя страхам перад гаспадарамі дому (яе дому!). Вэнэра не-не ды й саступала. Во як таму заатэхніку маладзенькаму, ён прыехаў на стажыроўку. Хлапчаня, прынамсі, не пасьпеў запаршывець, як усе гэтыя ўпаўнаважаныя з раёну, настаўнікі ды загадчыкі складоў. Угледзеў Вэнэрыны грудзі, спужаўся неймаверна. Потым прызнаўся: як у яго мамы! І сьлёзы, і сьмех.

Жыцьцё ўсё горшала. Для ўсіх, хто навокал. Але ёй, Вэнэры, бабы лічылі, пашэнціла. Ну, і што, калі ў доме ў яе цэлы райком-сельсавет-калгас-міліцыя? Каля іх усіх і яна пражыве, дзяцей на адных кавалках з агульнага стала пратрымае. А паспрабуй пражыві-пракармі, калі ў хаце хоць шаром пакаці — ні свайго, ні чужога.

Аднойчы прыбегла Вэнэра ад кароў у дом свой, глянуць, як там яе плойма, яе дзеці, хуценька накарміць і пазапіхваць у куткі, каб не таўкліся пад нагамі ў людзей, — а яны ўжо абедаюць. Паклікалі ўсіх пяцярых (нават маленькую Ксюшу) у сьвятліцу, дзе ў начальства застольле сярод белага дня. Вэнэра разгублена прыціснулася да сьценкі-перагародкі, чуе Вашамосьця голас, зусім не сярдзіты, і нават вясёлы:

— Ты чыя? Завуць цябе як?

— Мамчына. (Гэта Маша.)

— І я таксама мамчына. (Ксюшы галасок.)

— Чуеш, фінінспэктар, твая тут каторая?

— А твая?

— Твая — унё тая. І кропелькі сабрала. Рыжая, рабацінье.

— Жарабцы, перастаньце! — суцішвае іх Груня. — Вы, дзеткі, ешце, не зважайце на іх.

— А «Савецкая ўлада» нібыта тут і ні пры чым. Ой, пры чым, Груня, разьбярыся! Во ты — чый?

— Мой бацька — Сталін! — у Антона адна тэма.

Аціхлі, мусіць, дых у іх заняло. Нарэшце падала голас «Савецкая ўлада»:

— Правільна, герой! Сталін — бацька ўсіх, ён бацька народаў. Малайчына, лепш ня скажаш.

Ня вытрывала Вэнэра, забегла, уварвалася, як бура. Стаяць яе дурненькія ля сьцяны адзін пры адным, у руках па кавалку хлеба, сыр, жыватамі голымі сьвецяць — задаволеныя! Выхапіла хлеб, сыр з рук адной, другой, быццам у гэтым уся бяда. Але не шпурнула ў абрыдлыя морды, а паклала на стол. Ціха сказала ім, што па-пракурорску сядзелі перад ёй і яе дзецьмі:

— Ніяк не насмокчацеся. Ужо за дзяцей узяліся. Труны адкрытыя, во хто вы. Труны, а ня людзі.

— Гэта хто ж — труны? — гаркнуў Энкавэдэ. — Гэта на каго замахваесься? Уся савецкая ўлада тут, а яна такія словы. Досыць, нацацкаліся!

Вэнэра спалоханымі рукамі шырока захапіла, згрэбла сваіх дзяцей і выштурхала іх з пакоя. З палёгкаю пачула рогат усьлед.

Бяда ўсё роўна здарылася, але ня зь ёю. З Васільком. Ён даўно рыхтаваўся да арміі, чакаў таго дня, калі пойдзе, забяруць яго. Дадуць моцныя, на медных цьвічках боты, якім зносу няма, форму падбяруць, каб не целяпалася на ім, а ў абліпачку, і галоўнае, зброю атрымае — дзяцінства проста перла зь яго. Але Вэнэру і Тамаша шкадаваў па-дарослаexisting: ён паедзе туды, дзе людзі жывуць, а не пакутуюць. У горадзе ўладкуецца. Пасьля войска гэта дазваляецца. А ім насіць калгас, як горб, пажыцьцёва. «А хочаце, я вярнуся?» — раптам пытаў, добрая душа.

Цыган на неба, а чорт за нагу! — бяда прыйшла, адкуль і не чакалі. Вырашыла начальства адзначыць той факт, што выгадавалі воіна ў родную армію, наладзіць сіраце провады. І нібыта добра, правільна, а атрымалася не як у людзей. Яны што, ім не прывыкаць лішні раз выпіць. А Васілёк — моцнае віно ды на слабую галоўку! Выявілася, што п’яны ён буйны. Ды яшчэ які.

Такенькая птушка, а паспрабуй спраўся зь ім. Крычаў, што ён вернецца і наладзіць ім разгон, ён навучыць радзіму любіць — гэта вам не на бабах езьдзіць ды пустым працаднём паганяць! Яго сунімаць, за рукі хапаць, вязаць ручніком — вырваўся ды ў шыбу кулаком. Спадабалася — другую дастаў. Усё б нічога, але моцна парэзаўся, кроў ажно на сьцяну пырснула. Жылу перасёк ці што. Адвезьлі ў раён, у больніцу, і раптам вестка: судзіць Васілька будуць. За членашкодніцтва і як бы дэзэртырства з арміі. Дык гэта ён дэзэртыр? Перад самым судом пабываў ва Ўюнішчах, разгублена паказваў усім, што з рукою ў яго: не разьвесьці пальцы, далонь — як капусны ліст у сьпёку...

І згінуў Васілёк. Як у яму праваліўся. І што там за яма такая ў іх, аніяк не загацяць, як бяздоннае балота? Ступіў — і няма чалавека. Не целяпайся, а то яшчэ глыбей засядзеш. Во і Косьця прапаў, а потым нібыта вестка пра яго дайшла. Але якая! Энкавэдэ паклікаў Вэнэру за перагародку, у праўленьне:

— Во, падпішы.

— Гэта што? — зь сялянскім спалохам перад усякаю казённаю паперынаю спытала Вэнэра.

— А ты пачытай.

Валасы на галаве заварушыліся: аказваецца, Косьця і яшчэ нейкія партызаны зьбіраліся забіць Сталіна, замініраваць чыгунку, калі ён ехаў у Бэрлін.

— Яго вяртаюць на дасьледаваньне, — паведаміў Энкавэдэ. — Бач, перагляду захацеў. Будзе табе перагляд.

Вар'яцкая думка: калі Вэнэра падпіша, дык пабачыць яго, а ён, магчыма, Антончыка зможа пабачыць. Але тут жа апомнілася.

— Я нічога ня ведаю, ня чула, ня бачыла!

— Ты што шпурляеш афіцыйны дакумэнт? Ня чула, ня бачыла! Дык другія чулі. Не адной табе расказваў. А табе я хацеў памагчы. Заматае ён і цябе. Ска-

жа слова, і пойдзеш сама — за неданосчыцтва. Справа ня жарты. Тэракт супраць правадыра.

А гэта ж усе мы прайшлі па самым краі, што асыпаўся, сьлізкім, той ямы. Усе, хто жылі тады. Пашпартныя і бяспашпартныя. А мы, дурачкі-партызаны, дык першыя на чарзе стаялі. Дурачкі таму, што вельмі ўжо ўсур'ёз прымалі сваё партызанства: мы, маўляў, правераныя, і яшчэ як! Быццам не былі «правераныя» (і рэвалюцыяй, і грамадзянскай вайной) тыя, чые імёны і фатаграфіі мы ў школьных падручніках выкасоўвалі і вырывалі. Дзякуй хмурнаму генэрал-маёру Філатаву, са спазьненьнем, але прачытаў у яго «Ваенна-гістарычным журнале» за 1991 год (№1) аўтарытэтнае пацьверджаньне: не любіў Сталін партызан, «некаторых». Нават калі толькі «некаторых», дык лупіць гэты псіх меў звычку «па плошчах» — адразу па ўсіх галовах. Дабіраўся са сваім Берыем ужо і да партызан-падпольшчыкаў і наогул да пакаленьня 1925-1927 гадоў: наша чарга падыходзіла — запаўняць лягеры. Шагам арш!

Але я мог загрымець і па-за чаргою. Выпадак амаль як у Васілька, праз глупства — такі самы. І было гэта якраз у тым жа, 1951-м годзе.

Сышоў з начнога цягніка Магілёў-Менск з чамаданам, цяжэразным ад клапатліва напіханых у яго маці прадуктаў (з разьлікам на ўвесь асьпіранцкі пакой, але каб і сыночку нешта перапала), і пайшоў не да варот на выхад, а да агароджы — перамахнуў, і адразу перад вачыма ўнівэрсытэт і наш інтэрнат. Перабраўся сяк-так з чамаданам, а па другі бок цэмэнтавае сьцяны — добры дзень! — мяне чакаў міліцыянэр.

— Сьпёр?

— Што «сьпёр»? Гэта мой чамадан.

— Пайшлі ў аддзяленьне.

— Чаго я там ня бачыў?

А за гэтым: «Ты хто такі, каб так з партызанамі размаўляць?» — надта мы былі ганарыстыя ў першыя

пасьляваенныя гады. Ён бярэцца за ручку чамадана, я яго руку адкідваю. Аднекуль зьявіўся другі міліцыянэр.

— Во, сьпёр, а ісьці ў міліцыю ня хоча, — паведаміў «мой» міліцыянэр. (Мабыць, таксама нядаўні партызан ці франтавік: таксама ганарысты.)

— Бяры чамадан! — Гэта яны мне.

— Самі нясіце, калі вам трэба.

Яны і панесьлі. Але лепш бы мне гэта самому зрабіць.

І дваццаць, і сорак гадоў пазьней, апынуўшыся на Менскім вакзале, абавязкова шукаў вачыма тыя дзьверы справа на выхадзе з пэрону, якія маглі для мяне быць, стаць лягернымі варотамі. Падыходзіў да іх чалавек з адной біяграфіяй (будучай), а выйсьці мог зусім зь іншай. Калі б за сталом у аддзяленьні сядзеў тады другі начальнік аддзяленьня, а не сьветлавалосы лейтэнант з прозьвішчам Абрамовіч.

«Мой» міліцыянэр далажыў: во ён, галубчык, скраў чамадан. І акрамя таго: ён мяне (г. зн. я яго) ударыў! Во тут нават я скеміў: складуць акт і пяць гадоў прышыюць да тых, што ўжо маю. У нашай Глушы якраз перад гэтым сына пажарніка Алёхіна пасадзілі: тры бутэлькі, пустыя, праз плот з заводу перакінуў, цана кожнай 10 капеек (новымі грашыма — 1 капейка). Пасьля ўжо, шмат гадоў пазьней, калі бачыла, сустракала мяне яго маці — а мы калісьці разам у партызаны пайшлі, — абавязкова пачынала гаворку пра сына, але самага жахлівага мы не кранаді: яго жыўцом спалілі на вогнішчы лягерныя крымінальнікі, чымсьці не дагадзіў. Вось вам і 3 кап.

— Што ў чамадане? — спытаў лейтэнант, якога міліцыянэр, як бы на памяць мне, назваў па прозьвішчы. Я пералічыў смачныя рэчы, якімі нагрузіла мяне мая мама. Адчынілі чамадан — правільна ўсё.

— Ён мяне ўдарыў, — нагадаў міліцыянэр і пераглянуўся з напарнікам: той кіўнуў галавой, пацьвярджае.

Лейтэнант Абрамовіч уважліва паглядзеў на іх, на мяне, зноўку на іх:

— Добра, ідзіце.

Тыя неахвотна выйшлі.

— Ты яго ўдарыў?

— Ды вы што! Не чапаў я.

— Добра, ідзі.

Вось так проста ён мне вярнуў жыцьцё. Каб я яго пражыў, як сам захачу, змагу.

Новы Тамашоў клопат — габрэі. У газэтах, і ў раённай таксама, у радыё — без канца пра іх. Праўда, называюць іх словам незнаёмым, нейкія «касмапаліты», але ўсім зразумела, пра каго гаворка. Яны немаведама дзеля чаго прозьвішчы зьмянілі, але іх у час выкрылі. Тамаш ніяк не дапетрыць: нашы, вясковыя, не зьмянялі. Калі Моўша, дык Моўша, а Рабіновіч, дык Рабіновіч. Абараняе перад начальствам хаця б сваіх, коўчыцкіх. Але засумняваўся і Тамаш, вышукваў і ў сваіх стары грэх, аднойчы ўспомніў:

— А быў у нас мужык па імені Павал, яго Рыжым абзывалі. Гучнагалосы такі, труба ерыхонская. Едзе ноччу з Парычаў па сьвежа пракладзенай дарозе, бачыць, чалавек сярод поля, узяў яго, у санях едуць удвух, той і кажа Рыжаму, вядомая рэч, габрэй, хоча паддобрыцца: «А гэта мы, Павал, рэвалюцыю зрабілі». Ну што ж, вы дык вы, — Павал паганяе каня. Бачыць той, што мала заплаціў, трэба яшчэ, і кажа Рыжаму: «Калгасы таксама мы прыдумалі». — «Тпр-р-р! Што? Вы гэта? Калгасы? А ну, злазь, такую тваю, а то зараз пугаю па вушах!» Скаціўся з санак спадарожнік і крычыць усьлед: «Чакай, чакай, мы яшчэ ня тое прыдумаем!»

Начальнікі частуюць Тамаша, задаволеныя, што правільна калгасьнік разумее бягучы момант. Во толькі не зусім добра з калгасам атрымліваецца. Энкавэдэ папярэджвае на ўсякі выпадак:

— Усё ў цябе з падкавыркаю. Нібы ты і супраць

жыдоў, але і супраць савецкай улады. Вас, партызан, колькі ні кармі... Тое і яно, нос у цябе — вунь які!

Уражвала што, калі немцы былі ў нас? Мы гэта назіралі, а зразумець не маглі. Гоняць калёну палонных альбо арыштаваных, знямоглыя, зьнябожаныя людзі пакорліва брыдуць, куды іх кіруюць, з адною, напэўна, думкаю — дабрацца да нар, нешта зьесьці, папіць. І раптам, як рабізна па вадзе, — хваляваньне, рэзкі нямецкі вокрык, канваіры забеглі наперад калёны і пачынаюць палкамі, прыкладамі зьбіваць пярэдніх і ўсіх агулам — парадак парушаны, людзі ня ведаюць, ня цямяць, чаго ад іх хочуць, бясьсільна выкручваюцца з-пад udaraў, зьбіваюцца ў тлумныя групы, натоўп, а тыя, хто парушыў парадак, цяпер з усяе змогі стараюцца яго аднавіць — новымі ўдарамі і крыкамі на ўсё горла.

Здавалася, аніякага сэнсу, аніякай лёгікі ў такіх дзеяньнях не было. Нармальнай лёгікі і сэнсу. Але нейкі іншы, відавочна, сэнс быў.

Калі думаеш пра наша савецкае жыцьцё, пра наша ўсё даваеннае і паваеннае існаваньне, прыгадваеш вось гэта, з вайны. Словы «парадак», «дысцыпліна» — не сыходзілі са старонак газэт, на кожным сходзе пра гэта. Але ледзь-ледзь пачынала наладжвацца нешта, асталёўвацца, як адразу з новым крыкам, з новымі лёзунгамі і пагрозамі забягалі наперад — і пайшло. Новыя ворагі, новыя заклікі і ўдары па тых, хто наперадзе. Даеш культурныя гаспадаркі, пасёлкі, хутары, Прышчэпаў сказаў тое, напісаў тое!.. Бі прышчэпаўцаў — гэтых агентаў кулацтва і сусьветнага імпэрыялізму! Усе справы і паперы перакладаем, пераходзім на беларускую (украінскую, узбэцкую) мову, даеш беларусізацыю, даеш украінізацыю!.. Ату іх, беларускіх нацдэмаў, украінскіх нацыяналістаў-самасьційнікаў, касмапалітаў, раструшчым галовы агентам, антысаветчыкам, ворагам народу!.. І так — у вялікім і ў малым, у вас і ў сусе-

дзяў, на заводах, у школах, у вёсцы, у горадзе, наверсе і ўнізе. І ўсё ў імя руху наперад, дасягненьня нейкага асаблівага, нябачанага парадку — сацыялізму, камунізму, чорта, д'ябла!

Такое было ўражаньне, што нехта там, галоўны і ўсе галоўныя, сьмяртэльна не жадалі, каб людзі маглі нарэшце агледзецца: дзе яны, што зь імі адбываецца? Ня даць супакоіцца, апомніцца. Калі вайна пачалася, нібыта гэтага паменшала, але, можа, таму, што ня трэба было прыдумляць бясконцую вайну знарок, калі пачалася сапраўдная.

Бесьперапынная вайна ўсё новых пакаленьняў з усім, што было «да». Чытаў недзе, што на Стаўрапольшчыне падчас жніва піянэраў саджалі на вышкі пасярод поля: сачыць у бінокаль, ці не крадуць іх бацькі калгаснае дабро.

Беспарадак дзікі, але ў рамках і ў імя нейкага вышэйшага, зразумелага толькі вышэйшай уладзе парадку. Угадаць яго раз і назаўсёды нікому ня дадзена, а таму, каб ацалець, выжыць, — галоўнае, не празяваць момант, не замарудзіць, калі прагучыць каманда (спачатку, магчыма, ледзь улоўная, ледзь чутная), што старыя заклікі, загады, каманды ўсе няправільныя, а, глядзі, што і варожыя. Каб тады, калі пачнуць біць новых ворагаў, ты апынуўся ў патрэбным стане. Альбо хацяб збоку, цябе б не прыкмецілі.

У такім жыцьці лепш быць улегцы, не абцяжараным, каб лёгка павярнуцца, выкруціцца. І каб не маглі строга спытаць: з гэтым чалавекам быў знаёмы? гэты табе хто, радня? а во той, гэткі, чаму ў вас аднолькавае прозьвішча?

Пра тых, хто некуды зьнік у грамадзянскую вайну альбо ў 1937-м, лепш было не гаварыць і нават ня ведаць. Цьмяна даходзіла да нас з братам, што ў бацькі таксама былі браты, нашы дзядзькі, колькі, мы нават ня ведалі дакладна, бо некаторыя апынуліся за мяжой. Старэйшы бацькаў брат Сяргей — у Грэцыі. Трапіў за мяжу —

азначала тое ж, што і прапаў. Як быццам і не было зусім.

Хто з нас помніць (помніў) род свой далей за дзеда альбо бабкі? Не трымалі ў памяці і не было патрэбы ведаць. Лепш далёка не зазіраць, каб усьлед за табой і нехта іншы не зазірнуў. Ды і якая цікавасьць у тым, калі ўсё самае галоўнае пачыналася ў наш час і чакае нас усіх наперадзе?

Толькі свабодны чалавек цікавіцца каранямі. Альбо дзеля свабоды. Во як мы цяпер. Ну зусім як амэрыканскія нэгры, якія гадоў дваццаць назад раптам кінуліся шукаць, хто і каго і калі прывёз з Афрыкі, у якім труме і ў якім годзе.

Ад дзядзькі (па маёй маці) Антона незадоўга да яго сьмерці чую, што ў Адамовічаў прозьвішча было падвойнае: Адамовіч-Адамчук. Прадзед мой па бацьку яшчэ насіў яго, а ўжо дзед, як яшчарка хвост, згубіў альбо адкінуў. Магчыма, толькі гэта і выратавала ў 37-м майго бацьку: у даносе фігуравала абвінавачаньне, што ён «сын памешчыка». Падвойнае ж прозьвішча, застанься яно, — выяўны доказ калі не дваранскага, дык шляхецкага паходжаньня. Пра дробную шляхту ў Беларусі казалі: на пузе шоўк, а ў пузе шчоўк! Вясковая галота, але з «польскім» (а праўдзівей, каталіцкім) гонарам. Бабка мая, калі выйшла замуж ужо за «чыстага мужыка» (г.зн. праваслаўнага беларуса), бацькавага айчыма (узяў ён яе з дванаццацю дзецьмі), так тлумачыла гэты няроўны шлюб: «Бо маладая, дурная была!»

Адамовіч-Адамчук з прыгонных выбіўся ў арандатары: «трымаў бровар», гэта значыць сьпіртзавод арандаваў у пана. Гэта — Случчына, беларускі чарназём, сьпірт гналі з жыта, з бульбы ды буракоў за кожным ляском. Прытым ужо і дзеля тэхнічных патрэбаў: везьлі ня толькі на ўсход, але і на захад. Ну, і, вядома, дзеля народнай патрэбы, уласнай: толькі нядаўна царскую назву Карчма (скрыжаваньне дарог непадалёк ад нашай Глушы) замянілі на брэжнеўскае Дачнае.

Такую гісторыю помніў і мне распавёў дзядзька Антон. Вяльможны пан, гаспадар зямлі і бровару, неяк на зіму паехаў у Варшаву, адразу ж на завод зачасьціў ягоны малодшы брат. А быў ён слабы на галаву альбо, як пра такога ў нас адна жанчына казала: галоўка ў яго добрая, але мяккая. У адсутнасьці брата любіў пакуражыцца, паказаць сябе гаспадаром. Адамовічу-Адамчуку гэта чамусьці не спадабалася:

— Во Бог, а во табе, паночку, — парог!

І паказаў на дзьверы.

Што пачалося! Прачулі маці-пані, і сястра-пані, і пляменьніца — жалоба ў іх! Мужык абразіў увесь іхны род. Вярнуўся старэйшы сын, нічога яму не заставалася, як выклікаць арандатара і прабраць яго добранька пры сямейніках. А ў майго прадзеда таксама як-ніяк падвойнае прозьвішча, на хвост сабе наступіць не дазволіць! Шпурнуў пану пад ногі ключы ад бровару і пайшоў. Яго тут жа запрасілі за далёкі лясок, на іншы заводзік. Мабыць, рэпутацыя ў нядаўняга прыгоннага была някепская.

Пачуўшы гэтую гісторыю, я ўспомніў, што менавіта з гэтымі словамі («Во Бог, а во парог!») і, мабыць, з тымі ж вачыма (тырчком, шалёныя) мой бацька выгнаў з нашага дому чалавека, які прыйшоў ад парткому ці пасялковага савету (ужо ня помню) угаворваць яго «выправіць памылку», г.зн. разьвесьціся з жонкаю, нашай мамай: Адамовіч — паважаны ў пасёлку лекар, а Тычына — дачка раскулачаных. А калі бацьку, «сына памешчыка» (данос чалавека, якога ён выгнаў), маглі вось-вось арыштаваць, ён заплаканай маме казаў (ноччу я гэта чуў, лежачы ў сваёй пасьцелі):

— Ня езьдзі, ня стукайся, як гэтыя твае Віткоўская ці Марыя Данілаўна, прашу цябе! Я адтуль не прыйду, кажуць, яны там б'юць: ухаплю крэсла, графін, што пад руку трапіць! Біць сябе не дазволю...

Тычынам (маміным сваякам) давялося пакаштаваць Сыбіру, але нашым яшчэ пашанцавала: пасьля вай-

ны вярнуліся ў Беларусь, хто праз фронт, хто праз залатыя алданскія капальні. А колькі выкінутых на сьнег у тайзе пазамярзала, вымерлі сем'ямі, вёскамі. Нават бабулю сваю я пабачыў, маленькую, сухенькую, негаваркую, а вось дзед Тычына застаўся ляжаць у алданскай зямлі. Вінаваты я перад ім: у «Вайне пад стрэхамі», каб зрабіць галоўнай гераіняй дачку раскулачанага (сказаць праўдзівае «А»), усё-ткі падпусьціў і сацрэалізму (досыць бяздумна нахлусіў у «Б») — прыдумаў дзеду «ўпарты» і яшчэ там нейкі характар, і быццам бы дачка, пасварыўшыся, пайшла ад яго яшчэ да раскулачваньня. Хаця насамрэч даўгакосая дзяўчына зь вёскі Забалаць з бацькоўскага блаславеньня выйшла замуж за хлопца зь вёскі Рачэнь і, паехаўшы на месца вучобы-працы мужа, нарадзіла двух сыноў, гэта значыць, нас з братам.

Калі ў 1958-м хадзіў-плаваў зь сябрам па горкаўскай Волзе, сацрэалістычная хлусьня заснавальніка мяне зьдзівіла і зьбянтэжыла. Ня ён, вядома, вучыў нас ілгаць — настаўнікаў хапала і безь яго, — але як гэта робіцца, выявіў ужо тады, пабываўшы ў Краснавідаве. Помніце, у «Маіх універсытэтах» пра багатае, на ўзгорках над Волгай, вялікае і прыгожае сяло? Дзе кулакі (яны, а хто ж яшчэ?) падпалілі пякарню народніка Ромася і ледзь не забілі яго і будучага заснавальніка сацрэалізму.

Мы пабачылі сяло беднаваценькае, запушчанае і не над вялікаю рускаю ракою, а над шырачэзнай і замазучанаю калюжынаю. (Тут не віна пісьменьніка — дынаміка нашага савецкага жыцьця.) Бабы каля цаглянай крамкі з газай, што чакаюць кароў з пашы, чамусьці не адгукнуліся на прагную цікаўнасьць двух вандроўнікаў з рэчмяшкамі («У вас тут Максім Горкі жыў...») і паслалі нас да нейкага Аксенцьева.

— Ён пра Максіма ўсё ведае, ён вам паведае.

Малодка, што паплёўвала з вакна шалупіньнем ад семак, хацела адвесьці нас далей ад падказанага нам

дому, які вылучаўся новымі сьценамі і разнымі аканіцамі:

— Навошта вам мой стары? Во там, у суседнім, дзеўкі маладыя жывуць.

— Нам дзе-евак ня трэба, нам Аксенцьева трэба!

Мы яго ўжо разгледзелі: за асьветленым лямпай сталом п'е каля самавара са сподачка чай самавіты белабароды дзед.

— Кліч людзей у хату, — чуем, загадвае. А калі, выклаўшы на стол згушчыва, кансэрвы, белы хлеб, уключыліся ва ўрачыстае чаяваньне, тут жа даведаліся пра адваротны бок іх сямейнага жыцьця:

— Во, сядзіць дзень у дзень і чакае, калі я памру, дом ёй новы адвалю. Дзеля гэтага і замуж за мяне ішла. А я ўсё жыву. Сьпіць на лаўцы, адна, са мною ня хоча.

І глянуў, а мы ўсьлед, — на брудна-белы балдахін, ну, проста царскі, расьпяты над драўляным ложкам. Малодка і вухам не вядзе, бачна, прывыкла да падобных гаворак.

— А скажыце, чаму мора не выліваецца, калі яно ўнізе апынецца? Ня цямлю я нешта...

Павысьвятлялі, гэта і яшчэ шмат што ў тым жа родзе, і перайшлі да Аляксея Максімавіча.

— Ліксей — ведаў я яго. У дубкі разам гулялі. Ну, палкаю бычыныя камякі ганялі мерзлыя. Ліксея да нас Ромась прывёз, падабраў ля дарогі амаль мёртвага — з галадухі. Стаў рабіць у яго ў пякарні.

— А раскажыце, як кулакі спалілі пякарню і ледзь іх не пазабівалі.

— Гэта з чаго ж?

— Ну, Ромась жа быў народнік, рэвалюцыю рыхтаваў, беднякоў агітаваў.

— Хто яго паліў? Я сам усё бачыў. З бацем на агародзе насупраць якраз былі, калі ад пячнога коміна страха занялася, дымок і адразу агонь. Пякарня, печка ўвесь час паліліся. Ну, а быў вецер моцны, пажар усю вуліцу выкаціў. Мужыкі разьюшыліся. У

Ромася страхоўка, а яны не застрахаваныя. Трохі адлупцавалі.

Запомніў Аляксей Максімавіч. Не даравалў. А можа, і на бахчы разок-другі прыхоплівалі, жыцьцёткі дабравольна-басяцкае, — калі па поўдні бадзяўся. (Можа, і меў рацыю Янка Брыль, які неяк выказаў такую здагадку.) Зьбіралася клясавая нянавісьць.

Ну добра, падмайстар, кніжкамі заманены ў чалкашы гараджанін, ну а мы, сялянскія дзеці, унукі, чаго такі любы нам быў Чалкаш і агідны Гаўрыла? У чалкашы, у люмпэны, як у піянэры, запісваліся. І ўжо гатовыя схапіць бінокаль — толькі дай! З высокай вышкі глядзець на калгасных гаўрылаў — гэта ў нас у савецкай крыві, ці што?

Арыштаваных кулакоў зачынілі ў падвале Слуцкага АГПУ. Чакалі вагоны пад пагрузку, на вываз. Жонкі начальнікаў скардзіліся: маўляў, кулакі зьбяруць вошай са сваіх кажухоў ды і падкінуць непрыкметна на шынялі салдат і начальства — сыпняк распаўсюджвалі. А чаму і не? Максім Горкі як тлумачыў кулака, чаму ён хлеб у зямлю закопвае? Каб утаіць ці згнаіць?

Плытка араце і пішаце, блізка бачыце. Кулакі больш злыя, чым думаеце: яны хлеб у зямлю закопваюць, каб мышэй разводзіць. А тыя потым накінуцца на калгасны хлеб. Шкодніцтва з дальнім прыцэлам. Мяне маці ўгаворвала: «Адрачыся ад нас, а то і цябе пасадзяць ці вышлюць. Мы будзем ведаць, што ты гэта знарок». А бацька, твой дзед: «Не, наш Антон не такі! І не ўгаворвай, маці, не адмовіцца наш сын ад бацькоў».

І яшчэ мне распавядаў дзядзька Антон, народны настаўнік Беларусі:

— Паскардзіўся бацька: «Не магу, Антон, выйсьці з хаты, прайсьці па вуліцы. Суседзі падыходзяць, руку працягваюць павітацца, а ў мяне, глядзі, далонь, як у пана, мяккая становіцца. Нічога ж не раблю. Усю нашу гаспадарку цьвёрдае заданьне сажрала. Куды рукі схаваць, ня ведаеш».

Распавёў мне гэта дзядзька, ад маці чуў не багата. Ня тое каб таілі ад нас, дзяцей, але не прынята было. Яны высланыя там жывуць, мы тут, у нас расьце цыбуля, часнык, сала сваё — пасылкі зьбіралі, забівалі, адпраўлялі. Мы тут, яны там.

Прыйшлі немцы, мама тут жа пачала працаваць на акружэнцаў-партызан, насіла мэдыкамэнты ў лес. Былі пытаньні ў яе ці не было, як паводзіць сябе ёй, дачцы кулака, я ня ведаю. Пра нас, пра яе дзяцей, і казаць ня трэба: неадкладна ў лес, у партызаны, — гэта так цікава! Што датычыцца раскулачанай паловы сям'і — пра гэта мы ня думалі. А вось дзядзька Антон, паводле ягоных словаў, яшчэ і таму асабліва баяўся нямецкага палону, што бацькі яго былі ў палоне ў Сталіна.

— На каго хочаш, Эдзічак, крыўдуй, каго хочаш праклінай, але толькі не Радзіму! — угаворвала дачка кулака сына «ворага народу». Мая маці — нашага суседа. Каб толькі хлопец не аступіўся.

У мяне свая памяць пра ўсё гэта, у іншых нейкая свая пра тое самае — у беларускай газэце «Сельская жизнь» раптам прачытаў:

«Пабачылі дашчатыя нізкія баракі, дзе жыло некалькі соцень сем'яў, што прыбылі па высылцы яшчэ ў 1929 годзе. Як цяпер помню апухлых з голаду старых, дзяцей, што выйшлі нам насустрач з працягнутымі для міласьціны рукамі... Бацьку і брата адправілі на лесасплаў, маці і я засталіся ў бараку. Там я захварэла на шкарлятыну, пасьля яе пачалося ўскладненьне на вочы... Пайшла на вакзал, купіла білет на маскоўскі цягнік, села ў вагон. Намер быў цьвёрды — любой цаной дабрацца дадому, у Боркі. У купэ ехаў ваенны, з трыма кубікамі на пятліцах. Частаваў мяне купленаю на вакзале малінаю, распытваў, куды еду. І раптам чую ў калідоры вагона галасы: «Ды во яна толькі што па пэроне ішла, у сінім паліто, невысокага расточку». Я зразумела — пра мяне ідзе гаворка, мабыць, сачылі.

Вайсковец, пэўна, здагадаўся, хто я такая, і сеў так, што засланіў мяне з боку калідора. Нейкі мужчына ў плашчы зазірнуў у наша купэ, але мяне ня ўбачыў.

Прыехала-такі ў Слуцак, расшукала на базары сваю сястру Надзю. Разам зь ёй ноччу мы дабраліся да вёскі. Ад нашага дому засталася толькі печ — усё астатняе перавезьлі ў суседнюю вёску пад клюб...

Нехта з суседзяў высачыў мяне і данёс куды трэба. Прыехаў участковы міліцыянэр і адвёў мяне да выканаўцы ў сельсавет — Васіля Кулакоўскага. Кажа, адвядзі гэтую кулачку ў міліцыю, у Слуцак. А ўжо цямнела. Так нанач гледзячы мы і пайшлі ў горад. Ранкам выклікае мяне начальнік і, выслухаўшы мае тлумачэньні, кажа: «Неадкладна едзь за сто вёрст адсюль, з памежнай зоны. Каб і духу твайго тут не было». Усё ж пашкадаваў. Мог жа паведаміць пра мяне ў мясцовае НКВД.

Куды дзявацца, дзе жыць? Успомніла, што ў вёсцы Глуша каля Бабруйску жыве мая стрыечная сястра, Ганна Мітрафанаўна Адамовіч... Працавала яна ў сельскай аптэцы. Прыняла мяне цёпла, як радню. Тыдні два пражыла я там. Але не хацела падстаўляць пад небясьпеку сястру, тым больш, што і яе блізкія сваякі былі высланыя на Поўнач у пэрыяд раскулачваньня...» (Успаміны Масквіной Шуры).

Вось думаю: а што сказала б Вэнэра, прачытаўшы пра сябе, апавяданьне пра свой лёс. Нават «станоўчыя» героі майго раману «Вайна пад стрэхамі», глушанцы-прататыпы, задаволеныя не засталіся. Гэта нашаму брату-інтэлігенту цікава, калі пра яго раскажуць, пра яго лёс-подзьвігі. Для людзей простых любая публічнасьць падазроная і часьцей крыўдная. Выставіў напаказ! Так што я здагадваюся, што сказала б Вэнэра. Альбо што падумала б пра расказанае мною.

Мы вось усё ўгаворваем сябе і адзін аднаго — пакаяцца. І паводзім сябе, як Лаўрэнці Берыя: калі зачытвалі яму абвінаваўчае заключэньне, ён у знак пратэсту заткнуў вушы пальцамі.

Я ўсё наконт прыгонных. А можа, дастанем з вушэй пальцы?

Бог цяжка захварэў. Але ва Ўюнішчах пра гэта дазналіся толькі пад абед. Як заўжды, са спазьненьнем запаветаўцы пасьпяваюць да агульнай ня толькі радасьці — як было зь Перамогай — але і бяды. Цяпер вайна! — першая думка. Чакай — яны нападуць. Хто «яны» і чаму абавязкова нападуць — ніхто не ўдакладняў, не пытаў. Ёсьць мы, а ёсьць яны, нам кепска, наш Правадыр захварэў, значыць, ім добра і яны гэта выкарыстаюць абавязкова. З чорнай талеркі рэпрадуктара, падрамантаванага толькі апоўдні (пасьля таго, як навіна даляцела праз тэлефон), гучыць далёкая музыка альбо раптам няўцямныя (але тым страшней) мэдычныя словы.

Аціхла нават начальства, падобна, нават піць перастала, але пасуравела. Пазіраюць, нібы ты, менавіта Вэнэра, у нечым завінавацілася. Ёй успомніўся сон, і яна сапраўды вінавацілася перад чалавекам, які пакутаваў недзе там у Маскве, якому столькі людзей хацелі б памагчы, а ня могуць. Голы прысьніцца — на хваробу. Добра, што не расказвала нікому пра свой сон. Але яны, нібы чуюць, ваўкамі пазіраюць. Вашамосьць нават заўвагу зрабіў:

— Хоць у такі дзень бяз гэтага можна?

«Бяз гэтага» — каб ня плакала Ксюша, а тут трэба ж: жывоцік расхварэўся і галоўка гарачая, і яшчэ Старая напужала: можа, апэндыцыт?

Бяда ня ходзіць адна. А прыйшла — чакай і горшае. Гэта адразу падумалася, калі раніцай назаўтра нешта ўдарыла ў дах, нібы сарвала і панесла бляху, а тоўстыя бярвеньні ў сьценах таргануліся, як запалкі. Гул-роў слабеў і аддаляўся, але тут жа нарастаў — з другога боку. Вэнэра зьляцела зь печы, як курыца зь седала, і адразу да дзяцей сваіх: яны сьпяць, бы парсючкі, у спэцыяльнай загарадцы ля цёплае ляжанкі. Тамаш адгарадзіў, зьбіў з дошак, калі ў доме зьявілася трэцяе дзіця. «Дасьць

Бог не апошняе!» — і ўзяўся за працу. Сьпяць у саломе, закіданыя, акрытыя старой вопраткай, дзяружкамі — не па-людзку, затое цёпла ім, ня зваліцца ўніз, і ўсе разам. Антон, мужчына, трымае парадак, у яго не пакапрызіш, не паб'есься — шкада бывае дзяўчатак, але Вэнэра стараецца ды й ня можа часта ўмешвацца ў іх справы і спрэчкі. Перадаверыла Антону, хаця і прыкмячае, што расьце зь яго камандзір, яшчэ адзін начальнік будзе. Не на пасадзе, дык характарам.

— Дзеткі, вайна! Вайна, дзетачкі мае! — Ну, як звар'яцела: хапае дзяружкі, закідвае, хутае дзяцей, хавае. Выскачыў з-за перагародкі Энкавэдэ — чамусьці з радасным, нават урачыстым тварам — крыкнуў:

— Вы што гэта паніку? Гэта аэрадром засяляюць.

А там, на двары ўжо Тамаш і нейкі ўпаўнаважаны, што начаваў на халоднай палавіне, абодва ледзь ня ў споднiках, тыцкаюць пальцамі ў неба, перабіваюць адзін аднаго:

— Во, глядзі ты, яшчэ адзін!

— Ды той самы, кругі робіць перад пасадкай.

— Якой пасадкай? На захад ляцяць, бачыце — перадыслякацыя. Дывізія, а можа, армія. Ну, падзеі!

— Я расказваў, Сталін нядаўна прысьніўся. Кажа мне: «У нас, Тамаш, самалёты будуць — кожны зь вярсту даўжынёю!»

А з-за лесу яшчэ адзін паказаўся, спачатку нерухомы, адно растуць, даўжэюць у яго крылы і роў гусьцее, з мэталёвым скрыгатам. І вось ужо абрынуўся на галаву, дзяўбе, дзяўбе — па даху, па ўсім, што навакол. Раптам як адарваўся, хутка, хутка аддаляецца, меншае.

— Ажно чатыры маторы! — радуюцца мужыкі. — У амэрыканцаў называюцца «лятучыя крэпасьці».

— Прычым тут амэрыканцы?

Ужо і бязногі Прохар тут, пасьпеў, прыкаціў, і таксама нечаму рады:

— Слава Богу! Слава Богу! Во, гэта і ёсьць дзяржава! А вы што думалі?

Збоку Старая, захуталася ў рваную ватоўку, глядзіць чамусьці ў дол. Быццам моліцца. Вэнэра пайшла ад гэтых апалелых мужыкоў — да яе. І раптам чуе мармытаньне:

— Ты не памрэш лёгка! Дзеткі мае табе не дадуць лёгка!..

О Божа, і гэта звар'яцела!

Вэнэра кінулася ў дом, да сваіх дзяцей.

І паўгода не мінула, як радыё, газэты, і разам з усімі Ўюнішчы пахавалі Сталіна, паклалі яго недзе побач зь Леніным, а ўжо новыя словы, імёны, неспакой. Жыцьцё ня скончылася. Наадварот, засьвяцілася нясьмелая надзея, што вось цяпер і пачнецца нешта такое... Юнра прымчаў з гораду з навіною, можна падумаць — менавіта ён усё жыцьцё і марыў пра такое. Зрэзваюць падаткі, напалавіну! Спачатку менавіта гэта і пачула: п а л а в і н у з р э з в а ю ц ь. Ня тры тысячы рублёў, а паўтары, ня трыста літраў малака, а роўна напалавіну. Ну і ўсё астатняе. Прайшло колькі дзён — чалавеку не дагодзіш! — зразумелі: так, але палавіна застаецца, паспрабуй і столькі выплаціць, сабраць, здаць! З чаго возьмеш? Забыліся быццам, што нейк жылі і пры падвойных падатках, і нават плакалі, калі памёр самы галоўны Юнра. Вось прыйшоў Малянкоў, і ня горш. І нават лепш — бяз тых, ранейшых. А Лаўрэнці Палыч Берыя не апраўдаў даверу, а Георгі Малянкоў даў нам хлеба і блінкоў!..

— З нашым урадам не засумуеш. Во, у іх і Берыя шпіён! — шыпіць Старая. У яе зь імі з усімі свае рахункі.

Энкавэдэ стаў неспакойна азірацца на сьцены (далíся яны яму!), на абрыўкі газэт з вусатай фізіяноміяй. А аднойчы распарадзіўся:

— Вісіць адзін добры партрэт таварыша Сталіна і няхай. А гэта — саскрэбці!

Вэнэра даўно чакала ўдару зь нейкага боку, часам нават думалася: хутчэй бы, ведаць бы што! Або тое, або гэта, але колькі можна мучыць чалавека?

У той кастрычніцкі дзень прачнулася рана, ні сьвет ні зара. Акно на кухні па-зімоваму бялеецца — нечакана выпаў сьнег. Ну во, дачакаліся і сьнегу, а калгасная бульба напалову не пакапаная. Дажджы ўсё перашкаджалі. Вашамосьця цэлы месяц не было, некуды адпачываць езьдзіў зь сям'ёй.

Ня спалася яшчэ і з-за гаворкі з бухгальтаркаю Груняй, якую тая распачала ўвечары. Нібы выпадкова зазірнула да Вэнэры на кухню, а потым і выказалася: лепш бы ты прадала дом калгасу. У цябе столькі дзяцей і ўжо ў рост пайшлі. Атрымала б грошы, лес калгас дапаможа вывезьці, агораеш хатку па сабе, нікому справы да цябе, — жыві не хачу! І нават грошы застануцца, ня ўсе разыдуцца: хіба лішняя будзе табе тысяча, другая? Дзеці зусім голыя, аніякага абутку, а хутка ў школу старэйшым — за тры вярсты бегаць. Ну, і падаткі... Усё расьпісала бухгальтарка, усе Вэнэрыны даходы-расходы і пэрспэктывы. Так яно і ёсьць, як Груня кажа, сама Вэнэра пра гэта ўжо думала, а ёй, глядзі ты, веквяком, калгас насустрач ідзе. Але тут яна ажно задрыжала ад страху. Ня спала, усё прыкідвала. Аказваецца, што яна з гэтым абрыдлым домам-кантораю зьвязаная мацней, трывалей, чым сама чакала. Ды як жа так, значыць уся пакута і чаканьне — усё дарэмна, безвынікова, і нічога ня сьвеціць нават дзецям яе? У дзеда быў дом, у бацькі Вэнэры і ў яе таксама, так ці гэтак, але быў. У дзяцей жа дому свайго ня будзе. А тое, што ёй хопіць сілы збудаваць, — будан і ёсьць будан.

Не было чаго рабіць з ранку, але спаць ужо не магла. Цягнула абысьці ўсе куты, бы сапраўды выяжджаць назаўжды надумала. Агледзела цёплы закутак, дзе, як парсючкі, сьпяць яе дзеці, і ўжо не здалося крыўдным, што во гэтак, не па-людзку, яна іх трымае. Затое і трывалыя сьцены дому, і высокі дах — усё іхнае. Перацерпець толькі. Жыцьцё як-ніяк зрушылася, у людзей нават надзея ажыла. Перацерпець яшчэ, а там глядзі і пераменіцца жытка. Столькі пакутавалі, дык няўжо ўсё дарма?

Каб не патрывожыць тут нікога, папраставала ў халодную палавіну дому. Заадно і бульбы дастане са склепу. Два ўпаўнаважаныя на лаўцы храпуць, як пшаніцу прадаўшы. Замарыў іх зь вечара Тамаш сваімі байкамі. Нядрэнна дзед прыжыўся — уладкаваўся: ад стала ўпаўнаважаныя начавац сюды прыходзяць не з пустымі рукамі, вядомая справа, ім яшчэ і зранку трэба «паправіць галаву». Ну, і Тамашу перападае, ён ужо ня горш за застольнікаў-начальнікаў у гэтым разьбіраецца. І вітацца па-іхнаму стаў зранку: «Гутэнморген, калі так!» (Што толькі засталося на сьвеце ад бацькі Антончыка — гэтая дурнаватая п'яная прымаўка.)

Узьняла за колца цяжэразнае вечка склепу, успомніла, што агонь не ўзяла, вярнулася на кухню, разьдзьмухала вугельчыкі ў печцы і запаліла жоўтую, што воск, лучыну-смаляк: сьвятла надоўга хопіць. Спусьцілася ў падпольле па цагляных прыступках, выкладзеных яшчэ дзедам, і забытыя пахі акружылі яе. Дзяцінства пахі, што ад бацькі ідуць, ад жыткі, якая ці была, ці не была. Паўсюль паліцы, паліцы, з цэглы выкладзеныя і з тоўстых дошак высьцеленыя. Цяпер загружаныя, закіданыя тым, на што вочы не глядзелі б: гаспадарка Юнры, рэчы нарабаваныя ў баб-нядоімшчыц. Лічыцца, што цяпер гэта дзяржаве належыць, а што прапіваецца — ня ведае ніхто. Праўдзівей, ведаюць усе, бо і п'юць усе. Во гэтая падушка з наўлечкай у гарошак, колькі сьлёз у яе выплакана нечых, і яна тут ляжыць — ды як жа можна, у гэтым доме жывучы, дабра і здароўя чакаць? Якія праклёны і Юнру, і дому гэтаму тут сабраныя: калі адбіралі ў людзей во гэты самавар ці бабчыны кросны. А заадно і ўсё, што наткала яна на гэтым станку.

Але пах, водар ранейшыя — дзеля іх нават проста так спускаўся б сюды. Ну і бульбачка Вэнэрына тут, прасыхае ў кутку. Пахне склеп забытымі вэнджанінаю, саленьнямі — сьліну гоніць з роту. Тамаш ня раз казаў (у іх адно ў галаве):

— Сюды з чаркай спусьціцца: закусь ня трэба.

А колькі бочачак мёду стаяла, Вэнэра яшчэ помніць. Цяпер ня водзяцца пчолы. Каму іх разводзіць, ня церпіць пчала выпівох. І яшчэ, бацька казаў, ня церпіць яна людзей пужлівых і несамавітых. А дзе цяпер іншых адшукаеш?

Паліцы, паліцы, бязь ліку і самыя нечаканыя паглыбленьні-нішы — на якое ж гэта дабро ўсё разьлічана? Чалавеку ўжо і ўявіць, дапетрыць цяжка.

Усё Вэнэрына багацьце, ад яе турботаў праведных — горка бульбачкі, ды і тая цалкам са свайго гародчыку. Ну і нейкія морквінкі, бурачкі, прысыпаныя сухім пясочкам. Добра яшчэ, што са сваіх сотак пасьпелі ўхапіць: і дажджы лілі, і старшыня сачыў, не дазваляў. Пакуль, маўляў, калгаснае не зьбяром. Начамі капаліся ў агародах, але сабралі ўсё. Зьбярэш, калі жыць захочаш!

А за вакном ужо сапраўдная зіма. Вэнэра запаліла ў печы, паставіла бульбу варыцца і доўга глядзела з вакна на зьбялелы ад сьнегу сад. Белы быў ад цьвету, калі яна хадзіла на яго зь сякерею. Як мужыкі на зьвера хадзілі некалі. Дасюль балюча падумаць, узгадаць.

Прайшлася і па двары — з калодзежа вады набраць. Халодная, цяжкая, ужо зімная. Апроч усяго ў яе кабанчык у хлеўчуку з аполак, даўно падае голас, кліча гаспадыню. Яго б у хату на зіму, у той жа халоднай палавіне зьмясьціць, але хіба Вэнэра гаспадыня ў гэтым доме? Пакарміла, разьмінаючы рукою кожны камячок у карыце, а ён хапае, а ён хапае — добры трапіўся кабанчык. Хоць пагаманіла. З кароўкаю ўжо не пагамоніш. І Шэры — адрэзаная луста. Хаця цяпер ён на калгаснай працы, як і былая яго гаспадыня, пастарэў і зьмізарнеў. А Вашамосьць на машыне езьдзіць, калгас яму купіў.

Вярнулася ў дом, а там ужо ня сьпяць, ужо крык зранку ў тэлефонную трубку, гэтым разам — пра некапаную бульбу. Відно, Вашамосьць з адпачынку прыкаціў, а яго там, у раёне, прывіталі, ён цяпер сюды дасылае мацюкі.

«Савецкая ўлада» прамчала праз кухню:

— Едуць з райкому. Усіх на бульбу! Жывых і мёртвых!

Неўзабаве пачуліся галасы ў двары, нешта дужа хутка. І якое ажыўленьне, не як заўжды пры такіх зборах. Вэнэра, выбіраючы ў сенцах што горшае з апраткі і абутку (хаця што можа быць горш за тое, што бабы носяць дзень у дзень), вызірнула на двор: і твары ў баб нейк пажвавелі і бы сьвяточныя. Ды што здарылася?

Ёй патлумачылі: брыгадзір Грыша распарадзіўся (ці нехта там), што кожны дзясяты кош на карысьць працаўніка. А, во чаму і дзяцей папрыводзілі. І старыя, што даўно зь печы не спаўзаюць, таксама прышкандыбалі.

Вэнэра занэрвавалася: а як ёй зь дзецьмі быць? Антон пабяжыць, адно скажы, а дзяўчатак шкада цягнуць у такую халепу, гразь, які ў іх абутак! Ды й тое падумаць: лішняе вядро бульбачкі — каму зашкодзіць? Столькі ратоў у яе — да вясны паспрабуй дацягні.

Калёна працаўнікоў атрымалася хоць куды. Ну зусім як палонныя, якіх прыганялі на аэрадром: бабы, хто ў ватоўках, хто ў нямецкіх фрэнчах, брудных, падраных дарэшты. На нагах — чаго толькі няма. Ад чырвоных гумовых бахіл да лапцей. але абораў не хапае, дык дротам анучы аплялі.

Такія ж пудзілы зь дзяцей вырабілі, але гэтыя і весялейшыя, і жвавейшыя. Зрэшты, і дарослым весела:

— Ой, зноўку абуюць нас у лапці!

— Як бы ты не ў лапцях. Наш старшыня ўжо і хлусіць лянуецца, адно палкай памахвае.

На полі некалькі чалавек з коньмі, ужо раскрылі першыя баразны, чорныя-чорныя па белым сьнезе. Шэры ажно хістаецца, цягаючы плуг, але ногі з гразі вырывае — дзе яго ранейшая пастава, хараство? Глядзець шкада. І сябе чамусьці шкада. Затое Тамашу абы пабалакаць:

— Што, брат, старасьць ня радасьць? Нават калі ты партыйны. Соладка еў, цёпла спаў, а цяпер во гэтак. Мае сыны таксама былі і партыйныя, і маральна вытрыманыя.

На полі Антон адразу ўсчаў камандаваць сваімі працаўніцамі (ня быў бы то мужык!), ён і Вэнэру павучае: ня белыя, ня белыя бульбіны ў свой кош! Чырвоная, яна і чысьцей, і разварваецца.

Дзяўчаткі пакорліва, паслухмяна паўтараюць усе яго рухі, во толькі гліна, гразь іх ножкі хапае мацней, проста зрывае абутак, які на іх ёсьць. Антон сярдзіта хапае то адну, то другую, то трэцюю, вырывае зь зямлі, як корак з бутэлькі. Нават гук падобны. Ну во, ірваны-абадраны, гумовы боцік Волькі застаўся ў зямлі, бедная дрыгае босаю нагой, як жабка.

— Ды ты не цягні нагу адразу, трэба паволі, паволі! — вучыць брат.

Брыгадзір Грыша (сёньня ён Рыгор Сямёнавіч) не на шмат старэйшы і разумнейшы за Антона — ходзіць важны са сваім перапэцканым сшыткам, запісвае, хто колькі сабраў. Каму колькі належыць. А бабы гукаюць да яго:

— Во, дзявяты ўжо. Бягу па дзясяты.

Шумна, як ніколі, на полі. Як бывае толькі на сваіх агародах: весела перагукваюцца памаладзелымі галасамі, паджартоўваюць зь дзятвы. Божа, як мала ім трэба! Плакаць хочацца. А тут яшчэ Шэры перад вачыма. Так, мабыць, жанчына на мужыка глядзіць, з кім скакала ў дзявоцтве, прымервалася зь ім жыцьцё пражыць, а потым разьвёў іх лёс, і раптам сустракае брыдкага, неахайнага старога!..

Пад вечар зьявіўся старшыня, зь ім у машыне ажно два начальнікі. Сталі на дарозе і пазіраюць у бок людзей. Бабы ўстрывожыліся.

— Ну, калгасьнічкі, плакалі нашы стаханаўскія!

— Першыня ці што?

Як бы і не яны хвіліну таму і радаваліся, і верылі.

На дарогу неахвотна пабрыў Грыша, Рыгор Сямёнавіч, на хаду запіхваючы ў кішэню свой сшытак. Бабы стаяць, глядзяць, бы на сьмерць яго выпраўляюць. Чутно ў марозным паветры: нешта ў яго пытаюць, гавораць. Грыша чамусьці сшытак дастаў і паказвае. І пачулася:

— Я вам укарачу рукі!

Вашамосьць горла дзярэ. Бабы як усё роўна сьцямілі (ды і сьцямілі, як выявілася), таксама загаманілі, бы зладжаны “хор” у антычнай трагедыі:

— Значыць, няхай мерзьне, абы людзям ня даць!

— Гэтыя дзеці няшчасныя, во іх навошта цягнулі?

— Бабы, ну, ідзіце, скажыце.

— Ім скажаш!

І ўсё ж тры ці чатыры жанчыны (і Вэнэра чамусьці зь імі), падбадзёраныя галасамі і крыўдаю астатніх, папраставалі на дарогу.

— Ну што за дэлегацыя! — сустрэў іх Вашамосьць. — Чаму працу кінулі? Пад сьнег бульбу адправілі, а цяпер свой закон ставіце? Ёсьць статут арцелі, ёсьць канстытуцыя: кожнаму па працы. А не як каму захацелася.

— Дык што, мы не працуем? — нясьмела пярэчаць, але ўсё ж пярэчаць жанчыны. Незнаёмае начальства моўчкі пазірае, слухае, гэта запаветаўцаў бянтэжыць, але і падбадзёрвае. Усё-ткі жыве ў людзях вера, што во нехта пачуе, выслухае і...

— Во, мы і дзяцей з сабою прывялі. Каб і дзяржаве, як кажуць, добра і нам штосьці.

— Грыша сказаў, брыгадзір значыць, што такі загад: дзевяць вам, адзін нам.

— З вашым Грышам асобная будзе гаворка. А вы — рабіць. Там разьбяромся.

— Я людзям абяцаў, — кажа Грыша, Рыгор Сямёнавіч. Ён ажно зьбялеў. — А так я не магу. Я адмаўляюся.

Нечага падае сшытак старшыню, як адчайны школяр настаўніку дзёньнік.

— Ты што мне соваеш? Ты што тут свае парадкі ўзяўся наводзіць?

Не ўтрывала Вэнэра (потым ніяк не магла сьцяміць, што змусіла, чаму гэтак зрабіла):

— Нават у вайну зь людзьмі такое не выраблялі!

— Што? Што-о? — тырчком паставіў свае рыжыя заплылыя вочы Вашамосьць. Тут і прыежджы начальнік у сінім плашчы і капелюшы не змаўчаў:

— Нельга так, жанчына. Такога ворага пабілі, а вы гэткія словы, нядобра.

— Вы хіба немцаў пабілі? (О Божа, што я кажу!) Гэта мы ваш палон! Нас забралі ў палон. З дзецьмі разам. І душу і цела ў палон узялі.

— Дык мы горш за немцаў? Выказалася нарэшце, — Вашамосьць ужо не крычыць, але глядзіць так, што сэрца бы рука халодная сьціснула. Вэнэра міжволі пасунулася бліжэй да баб, зайшла за нечую сьпіну. Такое сказаць уголас, і пры гэтых, з раёну! Яна сама сябе не разумела. Вашамосьць адно махнуў рукою, маўляў, што тут, ідзіце і працуйце. Селі ў машыну і паехалі ва Ўюнішчы. Жанчыны глядзяць адна на адну, на тых, хто воддаль назірае за ўсім.

— Так нам і трэба!

— Добра, Грыша, не бядуй! Не такое выраблялі. Табе што, пойдзеш у войска, можа, яшчэ і маці сваю забярэш.

Ну не, усяму ёсьць мера. Пакуль не спадзяваліся ні на што, не паманілі іх справядлівасьцю, людзі нібыта ўжо і ня здольныя былі дамагацца, пратэставаць. А тут як прарвала. Асабліва тое, што дзеці зь імі, зьмерзлыя, саплівыя, ногі ва ўсіх прамоклі, а прыцягнулі дзяцей яны самі, дурніцы. Моўчкі, злосна сталі набіраць у вёдры, у кашы бульбу. Антон зрабіў гэта першы, і кош, і вядро напоўніў толькі чырвонай. Вэнэра папрасіла:

— Высып, сынок, ня трэба.

— Як жа, сьпяшаюся!

— Ну, я прашу. Не чапай ты іх, няхай іх скула балючая чапае.

Сама высыпала кош на сьнег. А праўда, якая ладненькая гэтая чырвоная пасьпешка. Антон зь цяжкім вядром адступіўся ад яе, далей, вачаняты адчайныя: не падыходзь! не мяшайся! Бедны Грыша, бедны Антончык, цяпер вас будуць мяць-ламаць, як раней іншых.

За ляском іх чакалі. Два ўчастковыя міліцыянэры і чамусьці Юнра. Бабы як пабачылі іх, адразу павыкульвалі свае вёдры, кашы. А тыя ідуць, падыходзяць нясьпешна. Вэнэра выхапіла-ткі ў Антона вядро, проста з рук давялося вырваць, і таксама высыпала бульбу ў канаву. Але яны да яе папраставалі, ні да кога больш, а толькі да Вэнэры.

— Твая? Зьбяры.

— Не мая і зьбіраць ня буду.

— Ну што ж, так і запішам. — Але нічога пакуль не запісваюць, зграбаюць у вядро бульбу.

— О Божа, вайны на вас няма!

— І гэта запішам.

Нікога, апроч Вэнэры, не затрымалі! Яно і зразумела: камусьці ў калгасе трэба заставацца, працаваць.

***

Месяц каціўся па рабрыстых начных аблоках, як па грэблі, раптам правальваючыся, чабохтаючыся і зноўку выныраючы — зусім бязгучна, не парушаючы зямную цішу. Вакол дому з высачэзным сьветлым дахам цішыню затрымліваў, захоўваў, праглынаючы ўсе гукі, мякка палеглы на дол сьнег.

Затое ўнутры сьцены дому трэсьліся ад храпу і мармытаньня, здавалася, што і ў сьне людзі некуды бягуць з крыкам і задышкаю. Кучна зьбіўшыся пад дахам Вэнэрынага каўчэгу, улады набіраліся моцы дзеля сваёй пастаяннай цяжкай барацьбы з натуральнай хадою існаваньня, што і было іх асноўнай справай, клопатам. Узыдзе сонца, і яны разбрыдуцца выконваць каманды і выкрыкваць каманды, паслухмяныя слугі і пакутнікі шматгадовага абсурду. На іх трывала ўсё. Але й тыя, каго яны папіхалі, кожны сваім бясьсільлем і пакораю ўтрымліваў у зьвязаным стане ўсіх астатніх. Я цябе не адпускаю на волю, а ты мяне, і мы абодва — яшчэ кагосьці. Калгасныя сходы, куды некалі зганялі сілаю і пагрозамі і дзе людзі спачатку стараліся хоць неяк

адпіхнуць ад сябе чужую волю і дурноту, але потым усё больш безнадзейна змаўкалі, яны, гэтыя сходы зноў раптам набылі значэньне — як спосаб захаваць сябе такімі, якімі не па сваёй волі сталі. Сам баюся і цябе баяцца прымушу! Сам не пайду і цябе ўтрымаю! Незалежнасьць цяпер трымала больш, мацней, чым некалі няволя, паншчына. Сьцен, загародак нібыта няма, абрынуліся, пражавелі, а паншчына засталася.

За амаль паўвека, што мінулі пасьля вайны, Уюнішчы пакрысе адбудаваліся і засяліліся: на месцы зямлянак і побач зь імі забялелі тонкімі бярвеньнямі, нясьмелаю абноваю, хаткі ўдоваў. Адыходзячы, адбягаючы ўсё далей да лесу ад Вэнэрынага дому-канторы. Але там іх нагналі тры даўгасьценныя даміны, нават прастарнейшыя за Вэнэрын, — харомы старшыняў. Першую даміну выбудаваў сабе Вашамосьць, праз год-два пасьля суду над Вэнэрай. Тут жа прадаў яго аэрадромным службоўцам і назаўжды зьнік з Уюнішчаў. Як і не было яго. Потым пастаршынствавала «Савецкая ўлада» (а дакладней, ягоная Груня) і таксама пайшла са сваім домам. Яе зьмяніў жыцьцярадасны таўстун з раённай нарыхтоўчай канторы, пасьпеў за паўтары гады даміну агараць. Гэты гарэзаваў па-свойму. Падабалася яму палохаць баб, калгасьнікаў новымі падаткамі, якія вось-вось зноў падвысяць. Альбо тым, што пасьля арміі калгасных хлопцаў будуць прымусова вяртаць у вёску. А аднойчы наогул адчыбучыў: пазычыў на аэрадроме форму вайскоўца, убраўся ў яе і пакаціў па палях. Бабы, вайна! Бачыце, мабілізавалі! Паніка па глыбінцы панавала дні тры, вымятаючы соль і запалкі з крамаў і сельпо. Зьнялі яго са старшыняў, пайшоў у нейкую аэрадромную кантору, пужаць баб там.

Наступным старшынём стаў Антон Станкевіч. Але пасяліўся не на «старшынёўскай вуліцы», як яе назвалі, а ў доме маці.

Пасьля дзетдому і службы ў войску ён з гарадзкой жонкаю, старэйшаю за яго ажно на дзесяць гадоў,

вярнуўся ва Ўюнішчы. Да дачкі жонкі дарадзілі яшчэ дзьвюх дзяўчатак. Антон спачатку пасяліўся ў нейкай майстэрні-летніку, доўга судзіўся і адсудзіў-такі матчын двор.

Тры сястры Антона зь дзетдому разбрыліся па сьвеце хто куды, малодшая ж Ксюша памерла ад кохліку. Маці не вярнулася са зьняволеньня, згінула недзе, быў адзін ліст ад яе, адшукала дзяцей у інтэрнаце. Прасіла пісаць ёй падрабязна, як харчуюцца, у што апранутыя, — пісалі, але ад яе больш ні разу не атрымалі. Ні слова.

Антон атабарыўся ва Ўюнішчах учэпіста, усур'ёз. Зрабілі брыгадзірам, затым старшынёю. А каму яшчэ было старшыняваць, з раёну ня надта рваліся на гэты калгас.

А потым усе пачулі слова: «Чарнобыль». І як павар'яцелі — пабеглі. Як раней ад калгасу бегалі. Антон на гэта пазіраў пагардліва. Ён не пабяжыць. Праўда, дзеці, вось каб ня дзеці! Дзяўчаткам раджаць яшчэ, пра гэта столькі гавораць, пішуць. Ненавідзеў гэтую неабходнасьць — ад'яжджаць, уцякаць, і гэтыя гаворкі, і асабліва тых далёкіх пісак. Якія недзе там сядзяць і пішуць, хоць самым бегчы ня трэба. Ня трэба кідаць нажытае і абжытае, гняздо маці, дзеда, прадзеда.

Я ўжо абдумваў, чым магла б завяршыцца аповесьць пра дзяўчынку Вэнэру, пра калгасьніцу Вэнэру, маці Антона Станкевіча, як сярод іншых лістоў, адрасаваных на Вярхоўны Савет, прачытаў адзін — проста-ткі асабістая крыўда. І во такая мясьціна: «Ведаць бы вам, а лепш ня ведаць, як я ставіў бы да сьценкі такіх, як вы! Вам нічога не каштуе зруйнаваць наша жыцьцё, якое б яно ні было, але яно наша. І што вы ўсё ганяеце зь месца на месца чарнобыльцаў. А хіба ня вы, разумнікі, нам гэта падстроілі!»

Падумалася, што гэта мог быць ліст Антона, у нявясна напісаным адрасе значыўся толькі раён, але менавіта той, прозьвішча росьпісам чытаецца і як «Станкевіч», а ў самім лісьце згадваецца калгас «Запаветы Ільліча».

Праўду кажучы, не знаходжу, на чым паставіць кропку. Пад рукою ў мяне старонка тэксту — малітва-мальба Старой.

«І не ўтрывалі яны, грамагласна кажучы: чаму ж, Уладар сьвяты і адзіны, ня судзіш, ня помсьціш жывым за кроў нашу?

Іх ахінулі ў адзежу белую, і сказана было ім, каб крыху супакоіліся на час які, покуль саўдзельнікі іх і браты, якія таксама, як і яны, будуць забітыя, папоўняць лік».

На што спадзявацца, калі за сьпінаю гэтулькі крыві і хлусьні, самападману і злачынстваў? Бяда прыцягвае бяду, ну а калі яна — касьмічных маштабаў, якой жа сілы гравітацыя ўзьнікае і што яна прывабіць з будучыні? Няўжо і сапраўды наш лёс і прызначэньне — памнажаць ахвяры, папаўняць лік ахвяраў? Дзеля абвалу, прароцтва дзеля. Каб нарэшце пачула неба, умяшалася.

А можа, дастаткова помніць, што пабывалі ў пекле. І не забываць. Вось гэта і вынесьці, з гэтым выйсьці. І не расставацца як мага даўжэй. Пакуль не перадасьцё ў другія рукі ніць мацнейшую.

Дапісваў у Кіеве, пасьля таго, як наведаў Бабін Яр. Сыстэма, руйнуючыся і адступаючы, дазволіла габрэям адкрыта прыйсьці туды, дзе іх забівалі. Але паслала зь імі сваіх па-ранейшаму галасістых функцыянэраў.

А потым я ўбачыў Сьцяну памяці на Байкавых могілках. Сьцяну, якой быць цяпер і Сьцяною ганьбы ўсё той жа Сыстэмы. У майстэрні Ады Рыбачук і Ўладзімера Мельнічэнкі мы разглядваем твары, постаці, аб'ёмы, сюжэты, выхапленыя зь нябыту ўнутраным зрокам гэтых людзей, працаю іх рук. Я паспрабаваў сагнуць мэталічны прут, зь якога рыхтаваўся каркас усіх фігур — ня змог. Тысячы прутоў (з дапамогаю дзьвюх прымітыўных трубак)ы выгнулі па складаным малюнку жаночыя рукі загадкавай і ўтрапёнай Ады.

Трынаццаць гадоў эгіпецкай працы, яраснай твор-

часьці двух чалавек і некалькіх памочнікаў-рушэнцаў, і вось калі ад сфэрычнага купалу-неба (і да яго) памкнулася трохсотмэтровая працэсія Жыцьця-Сьмерці — першая ня тое што ва Ўкраіне, але ў краіне першая спроба акцыю разьвітаньня зь нябожчыкам узьняць на ўзровень самой падзеі, Сьмерці чалавека, — забрынкалі ў нейкіх кабінэтах тэлефонныя званкі, прыгналі да сьцяны краны, прывезьлі тоны стальных кратаў, горы цэменту і пачалася чарговая акцыя гвалту над чалавечай страсьцю да вольнай творчасьці. Той, якая на калгаснай зямлі, у заводзкіх сьценах амаль усюды ўжо была зьнішчана зласьлівай Утопіяй Кабінэтаў. І толькі сям-там яшчэ цепліцца, прарываецца з-пад коркі зьмярцьвеньня і душагубства. 96 тысяч рублёў было патрачана, каб Сьцяна ажыла абліччамі, абразамі, сюжэтамі, 172 тысячы патрацілі, каб гэта зьнішчыць, заліць, заляпіць цэмэнтам, і таксама паводле спэцыяльнай тэхналёгіі, і таксама намаганьнямі розуму, рук, па зацьверджаным праекце (я бачыў яго на паперы).

Сьляпы плястыр-кляп (трохсотмэтровы ў даўжыню, дзесяцімэтровы ў вышыню) шчыльна прыстаў да Сьцяны, якая выгінаецца, як ад болю. Ноччу мяне мучылі кашмары: на твар падае пузам нейкая брыда, спрабую адарваць, адкінуць, задыхаюся... Ада і Валодзя, якія беглі з шчарбіцкага Кіеву ў брэжнеўскую Маскву, пасылалі будучаму чарнобыльскаму злачынцу тэлеграмы: «Сёньня пачалося зьнішчэньне салдацкіх абліччаў»; «Заліты цэмэнтам Прамэтэй ляжачы»...

Я бачыў яго на слайдах — пахаванага Прамэтэя і жанчын, што жнуць ягоны агонь, які прабіваецца праз тоўшчу зямлі. Прабіўся гэты агонь і апынуўся ў руках двух мастакоў з Кіеву. Агонь доўга трымаўся ў родзе Станкевічаў з палескай вёскі Ўюнішчы. Што толькі ні рабілі, каб патушыць яго.

Адзе і Валодзю дазволілі вярнуцца да іх Справы і паспрабаваць вярнуць жыцьцё Сьцяне на Байкавых могілках. Дазваляюць тыя, хто раней забараняў: яны ўсяго

толькі пераставілі сябе на іншыя клетачкі на ўсё той жа шахматнай дошцы Кабінэтаў. Балюча было бачыць, як напалохала мастакоў сама думка, магчымасьць вярнуцца на могілкі сваёй няўрымсьлівай працы 20 гадоў пасьля. Спэцыялісты пакідаюць надзею: паколькі марка цэмэнту ў разбойнай каманды была іншая, можна разьлічваць, што адпластаваньне адбудзецца, магчымае...

Адпластаваньне магчымае. Але як нам усім страшна пачынаць спачатку, прытым літаральна ўсё. Ці адстане цэмэнт ад нашых душ, ад нашых твараў? А калі так, дык што там мы знойдзем, пабачым? І ці пазнаем саміх сябе?..

*1988-1991 г., 7 верасьня.*

# НЯМКО

***(«Ich werde dich schützen")****

*Нявыдуманая гісторыя*

***ПАМЯЦІ БРАТА***

---

* *Я цябе абараню (ням.).*

## АД АЎТАРА

*«Здымаюць скальпы (нават зь дзяцей), кастрыруюць, праз маленькую дзірку ў цемені выцягваюць з жывога чалавека мозаг, ірвуць ногі» — гэта хто, фашысты 40-х гадоў? Не, гэта сёньняшнія газэтныя паведамленьні з нашых «блізкіх» рэгіёнаў-дзяржаваў аб высьвятленьні нацыянальных, кланавых і палітычных прэтэнзіяў адно да аднаго. Гэта мы з вамі. Калі ў 41-м немцы-фашысты забівалі савецкіх ваеннапалонных на вачах у жыхароў майго пасёлку, старая, ушчэнт раздушаная бессэнсоўнай гібельлю ў засьценках НКВД яе мужа (поруч зь яшчэ васьмю дзясяткамі заводзкіх рабочых), галасіла ў сьлязах: «Чаго хацець ад чужых, калі свае вунь што тварылі?..» О, гэтыя «чужыя» і гэтыя «свае»! Як лёгка асуджаем іншых і як цяжка паварочваецца язык сказаць жорсткую праўду сабе, уласнаму народу, нават калі верх у ім бяруць ці ўзялі ўжо «свае» падонкі і расісты (як бы яны сябе ні называлі). Ці шмат мы чулі самаасуджальных галасоў хаця б ад вядомых усёй краіне інтэлігентаў*

*з Азэрбайджану і Армэніі, з Кіргізіі і Ўзбэкістану, з Малдовы і Таджыкістану? Сьвет пахаладзеў ад Сумгаіта і Хаджы, ад Фэрганы і Ошы, ад Бэндэр і Курган-Цюбэ. Мільёны людзей ва ўсіх краінах у жаху, а наша нацыянальная інтэлігенцыя адмоўчваецца. І ў Прыбалтыцы маўчаць, і ў Грузіі, ніхто не сказаў, не гаворыць «на ўвесь голас» уласнаму народу, што шавінізм «малога» народу такі ж агідны, як і любы іншы, што імпэрскія замашкі ў дачыненьні да ўласных «меншасьцяў» падрываюць і твае правы на самастойнасьць. І даброн гэта ніколі не заканчваецца. Сьведчаньнем таму — Асэтыя, Абхазія, Прыднястроўе. Пра расейскіх і ўкраінскіх «нашых», якія адкрыта і ў самазабыцьці дэманструюць свой нацысцкі радавод, і гаварыць ня хочацца, хаця разумеем: вірусы расізму ў такім вялізным целе — небясьпека ўжо для ўсёй пляніэты.*

*Ня будзем недаацэньваць падобную ж небясьпеку і для адносна спакойных Беларусі ці Казахстану. Мы пераканаліся ўжо: г э т а прарываецца нечакана і, здавалася б, «зь нічога».*

*Бачачы ўсё, перажываючы, суперажываючы зь іншымі — а непакоіць, мучыць гэта ўсіх, — я раптам прыгадаў рэальную гісторыю беларускай дзяўчынкі і маладога нямецкага салдата — зь мінулай вялікай вайны, з часоў фашысцкага азьвярэньня цэлых краін і кантынэнтаў. Яны, амаль яшчэ дзеці, змаглі пераступіць праз наймагутнейшыя нацыяналістычныя і дзяржаўна-ідэалягічныя міты, догмы і выканаць на зямлі сваю Чалавечую місію — быць братам, сястрой, быць каханьнем, быць чалавекам для іншага чалавека.*

*У нас перасыхае горла, перахопліvae дыханьне, калі трэба сказаць жорсткую праўду пра нас самых. Тады няхай яны яе нам скажуць, за нас — дзяўчынка і юнак адтуль, з самай ночы фашызму і сталінізму.*

*Гэта — аўтарскі адказ на зусім законнае, верагоднае пытаньне: зноў пра вайну, навошта?*

*11 верасьня 1992 г.*

# 1

У вёсцы Петухі вырашылі затаіцца і адседзецца колькі дзён. Gross Dorf Pietuchi*. Праца эйнзацкаманды ўзбударажыла ўсё наваколле. На кожным узьлеску засады, абстрэлы, на дарогах міны. Узварушылі партызанскае гняздо. А гэтая вёска ад лесу адгароджаная рачулкаю, сама на горцы. Выкапалі акопы для кулямётаў, парасстаўлялі ў садах лёгкія танкі і бронетранспарцёры ды зажылі мірна. Па два, па тры салдаты ў кожнай хаце, на сям'ю. Каравул разьмясьціўся ў зручна пастаўленых у канцы вуліцы былой школе і калгаснай канторы. Загадалі, і тутэйшыя кабеты вычысьцілі, вымылі загаджаныя пакоі, ім за гэта заплацілі па тры маркі. Няхай ніхто ня кажа, што ў штурмбанфюрэра Дзірлевангера служаць не салдаты, а бандыты, крымінальнікі.

Штурмбанфюрэр уласнаю асобаю меў палітычную суразмову з малодшымі афіцэрамі, а тыя — з салдатамі:

* *Вялікая вёска Петухі (ням.).*

як паводзіць сябе на гэты раз, у гэтай вёсцы. Аніякіх пагроз і канфіскацыяў, за паслугі дзякаваць і нават плаціць, сьмела ўступаць у асабістыя кантакты — усё, як у цывілізаванай краіне. А калі надыдзе дзень акцыі (аб чым будзе ў час паведамлена), усіх гаспадароў свайго дому ліквідаваць, дом і ўсе забудовы падпаліць. Словам, далей дзейнічаць, як і ў іншых вёсках. Быдла, як і раней, асабліва буйное, не зьнішчаць, выгнаць з хлявоў, перадаць пагоншчыкам.

Пры тым кожны абавязаны: зь першага ж дня зафіксаваць, колькі чальцоў сям'і пад ягоным кантролем, разьмеркаваць, хто і за каго асабіста адказвае ў дзень акцыі, каб не ўцяклі, не схаваліся. Асабліва важныя апошні дзень і ноч перад ліквідацыяй: яны, як жывёла, чуюць блізкую разьніцу.

Маладога салдата Франца Ш. (малады сапраўды, сямнаццаць гадоў, прызваны татальнай мабілізацыяй) прымацавалі да напарніка вопытнага, надзейнага, праверанага ў справе. Ота Залеўскі, паводле нармальных армейскіх мерак, можна сказаць, ужо стары, ён зь вясковых жандараў. Таксама татальнік, але не з 1943 году прызыву, а з 1942-га. Пасьля Маскоўскай бітвы, тады як Франца фюрэр паклікаў пасьля Сталінградзкай.

Франц у баявое падразьдзяленьне патрапіў проста з Бабруйскага вакзалу, разам зь цяжкім узбраеньнем, што прыбыло спэцыяльна для гэтага батальёну. Так што вёска Петухі — яго першае баявое хрышчэньне. Кажуць, тут самы гадзючнік партызанскі. Як выказаўся штурмбанфюрэр, тут і курыца — партызан.

Аднак, Францу ў гэта нялёгка было паверыць, калі ён бачыў тутэйшы люд — што ў Бабруйску, што ў гэтай вёсцы. Запалоханы і нейкі прыгнечаны: ахвотна саступаюць тратуар, дарогу, у вочы, праўда, пазьбягаюць глядзець (дзеці, тыя пазіраюць з пужлівай цікаўнасьцю), але калі немец пакліча, паслухмяна падыдуць і нават колькі словаў па-нямецку скажуць, якія ведаюць. «Ніксфарштэйн» — нават з гонарам, што таксама могуць па-нямецку.

Калі па праўдзе казаць, дык Францу нашмат больш не падабаюцца мясцовыя паліцаі: ілжыва-дагодлівыя, а тым ня менш у руках у іх зброя. Што ён там насамрэч думае і што зробіць у наступны міг — хіба ведаеш?

Сытуацыя, у якой ён адразу ж апынуўся ў Петухах, ня простая для любога. А Францу, навічку, як яму нават уявіць, што сёньня ён вось з гэтымі людзьмі жыве ў адной хаце, яны яму грэюць ваду, смажаць яечню, зь імі ён гамоніць, сьмяецца, а заўтра ён іх усіх заб'е? Прачнецца раніцай, павітаецца, пачысьціць зубы, пасядзіць за сталом, пераглядваючыся з Палінай, маладой гаспадыняй, а затым яны з Ота паглядзяць на гадзіньнік і бразнуць затворамі...

Пераглядвацца і пасьмейвацца пачалі не адразу, толькі на другі дзень — Франц зь дзяўчынай. Спачатку яму здалося, што ў гэтай хаце — дзьве бабулькі. Старая, сівая бабулька зь нейкай бязглуздай вечнай усьмешкай і бабулька маладзейшая, ані не харашэйшая за тую, першую. Нават больш брудная і ўся закручаная ў нейкія анучы, ды яшчэ і кульгае, горбіцца.

Але назаўтра раніцай другая бабулька некуды зьнікла, а аб'явілася амаль дзяўчынка, чарнавокая, з падкарочанымі валасамі, цікаўна і як бы сьмеючыся прыглядаецца да Франца. Спадніца тая ж, па-вясковаму даўгая, бруднага колеру, але кофта беленькая, нават зь нейкімі вышыванкамі. Не падазраючы, што Франц паруску разумее (бацька яго быў у расейскім палоне, і дома ў іх нямала расейскіх кніг, нават Біблія ёсьць славянская), старая шыпіць на сваю, відаць, дачку, не паварочваючы да яе твару:

— Што гэта ты сабе дазваляеш, язьві тваю душу? Перад кім ты выфранцілася? Што гэта з табой робіцца?

Ота, хаця па-іхнаму ані слова, тым ня менш бачыць і разумее тое, што адбываецца, лепш за Франца. Растлумачыў. Яны тут усе так, хто маладзей і харашэй, прыкметней: твар, шыю ў сажу запэцкаюць, вымажуць, амаль ня ў гной — рукі, ногі, апрануцца, быццам хлеў ім

чысьціць, яна табе і кульгавая, і гарбатая — адно ня руш яе! Не спакушайся на яе хараство!

А гэта, бач ты, адразу зьмяніла тактыку, як толькі ты аб'явіўся, — ганарыся, Франц!

Старому Ота даручаны яго бацькоўскай апёцы маладзён, проста з гітлерюгенду, нават спадабаўся. Хаця гараджане, ды яшчэ гарластыя, нахабныя юнцы, яму ня надта да душы. Ад іх старому, ды яшчэ вяскоўцу, заўжды трэба чакаць нейкае насьмешкі, непрыемнасьці. Адзін ужо быў у яго такі, хуценька адхапіў пасаду цугфюрэра, узводам камандуе, і Ота цяпер яму падпарадкуецца. Начыста забыў, якім быў рахманым першыя дні, як зазіраў у рот бываламу салдату, лавіў кожнае яго слова, параду, а цяпер на Ота глядзіць заўжды з насьмешачкай, штораз пры пастраеньні пацікавіцца: «Hast du dein Scheiss beendigt?», ці пасраў гер Ота, а то цуг, узвод можа яго і пачакаць.

А з гэтым Францам яшчэ і такое магчыма: падстрэліць па дурноце, усё не нацешыцца атрыманым шмайсэрам, важдаецца, як з цацкай, зараджае, перазараджае. На Ота пазірае, бы шкадуючы, у старога ўсяго толькі вінтоўка. Зь імі, з гэтаю дзявухай па-іхнаму гамоніць, хіхікаюць, ці ня з Ота? Калі пасьпеў і дзе так насабачыцца па-руску.

## 2

Прыгледзеўшыся да немцаў, што пасяліліся ў іх хаце, паслухаўшы, што суседзі расказваюць пра сваіх пастаяльцаў, Паліна сапраўды перастала баяцца. Не, страх, жах перад тым, што немцы вычварылі ў суседніх Борках і Каменцы, не зьнікаў, душыў. Але ж ня Франца ёй баяцца, гэтага дылду-хлапца, які ня можа з уласнымі рукамі-нагамі справіцца, падобны да ястрабяня, што вывалілася з гнязда. Шаснаццаць гадоў — гэта шаснаццаць гадоў. Менавіта столькі споўнілася Паліне ў сту-

дзені. Так хочацца верыць у лепшае. Ну а немцу гэтаму — ці на шмат больш? Хаця і ўзьдзеў мундзір, рамянямі і нейкімі тэрмасамі абвешаны, як пудзіла агароднае, з аўтаматам і спаць кладзецца, сьмярдзіць конскім потам і нейкімі памадамі, адэкалёнам. Бязь сьмеху глянуць на яго нельга. І ўвесь час бачыш яго блакітныя вочы. Нават сьпінаю адчуваеш.

Варта ёй апрануцца па-людзку, твар памыць, як тут жа жаночым чуцьцём зразумела: гэты хлопец яе, старацца дужа ня трэба. Праўда, ён немец, ня той час, калі на вечарынках забаўляліся. Але шаснаццаць ёсьць шаснаццаць. Яе раптоўнае ператварэньне — прычына, каб весела, жартам пераглядвацца з Францам. Быццам разыгралі яны кагосьці трэцяга. І ўсё яшчэ разыгрываюць — старога Ота, скажам. Так яго шкада — зь яго пагаслымі, абыякавымі вачыма, індычаю змаршчакаватаю шыяй. Памерці можна, слухаючы, як яны, старыя — Ота з маці Паліны — гамоняць. Старая зьвяртаецца да яго, як да глухога. Мабыць, ёй здаецца, што гучныя словы чужое мовы яму больш зразумелыя.

— Пан, а пан, вада цёплая трэба, галіцца, кажу, будзеце? Што франштэйн, што франштэйн: я кажу, галіцца будзеце?

Частка жыхароў загадзя ўцяклі ў лес, на балота. Жывыя яны, не — ніхто ня ведае. Скрозь немцы папярэджваюць: каго ў лесе засьпеюць — усіх пастраляюць. А ў вёсцы ўсё-ткі ня так страшна. Але таксама страшна. І яшчэ як! Петухоўцы, хто застаўся ў сваіх хатах, карыстаюцца любым выпадкам, прычынаю, каб дазнацца, пачуць ад суседзяў супакойлівыя словы, весткі. Адно аднаго абнадзейваюць: а здаецца нічога, не лютуюць, штокроку: «данке! данке!», не падобна, каб задумалі нешта благое. Можна бачыць, як мірна мыюцца, палошчуцца немцы ў прасторным двары Францкевіча ля калодзежа: дзеці ім палліваюць сьпіны халоднай вадой: ахканьне, сьмех. Вёску дзівіць, як часта і шмат яны ядуць. Дзень у дзень над вёскай стаіць чадны дым з комінаў: зга-

туеш ім раньні сьняданак, тут жа стаў другі, тут жа полудзень і яшчэ падвячорак — гэтак да позьняе ночы. Як у прорву, як на згубу ядуць. Ну абы людзей не чапалі. Харчы ў іх свае. «Свае» — што нахапалі ў іншых вёсках, сьвіней, гусей на вазах вязуць, муку і нават бульбу выграблі.

А петухоўскае не чапаюць, нічога ня скажаш.

Дзеду Пархімчыку салдаты памагаюць вароты ставіць. Старыя заваліліся, ён нарыхтаваў лес на новыя слупы, і вось навешваюць на іх вароты. Пархімчык, былы брыгадзір калгасны, нават пакрыквае на немцаў:

— Старайся, хлопцы, а то працадзён не запішу!

Чым мацней і нясьцерпней чаканьне чагосьці жахлівага і няўхільнага, тым з большым самазабыцьцём людзі імкнуцца да найменшага пробліску надзеі. І таму збоку магло здацца, што не да кары, забойства рыхтуюць вёску і не сутаргава адпіхаюць жыхары ад сябе жудасную праўду, што гэта накшталт падрыхтоўкі для якогасьці сьвята — бабы бегаюць па суседзтву па ўсялякую драбязу, узрушана абмяркоўваюць падзеі, вочы зіхцяць.

Супакойвае вяскоўцаў аднак тое, што дазваляюць выходзіць зь сяла, калі ты на далёкае поле кіруесься, і ўваходзіць у сяло — нават зь лесу дзьве сямейкі вярнуліся, калі прачулі, што так паводзяць сябе немцы, у лесе страшней чакаць невядома чаго.

А ў Паліны з Францам наогул поўны парадак. Тым больш, што ён ведае мову. Гаворыць, праўда, марудна, шукаючы словы і расьцягваючы іх, як дзіця, часам блытае націск, але да гэтага прывыкаеш. Як прывыкаюць да заіканьня даўняга знаёмца. Амаль не заўважаеш. А ў іх абодвух такое адчуваньне, быццам ня тры дні, а са школы знаёмыя. Словы ім ня дужа і патрэбныя. Усьмешка, кароткі жэст ці позірк, непрыкметны рух плячыма, і яны ўсё сказалі адно аднаму і ўсё зразумелі. Ну а калі старым гэта не падабаецца, незразумела — тым больш забаўна і весела гуляць у гэтую гульню Паліне і Францу.

Бацька (Франц цяпер гэта ацаніў) непрыкметна, але

вельмі ўмела скіроўваў яго цікаўнасьць і здольнасьці менавіта да моваў — лацінскай, ангельскай, расейскай. Толькі цяпер Франц пачаў кеміць: тым самым ягоны фатэр працівіўся агульнай пошасьці — анічога апрача свайго ў сьвеце не цаніць, усё зьвесьці да нямецкага кораня, сэнсу, разуменьня. Тое, што Франц моцна захапіўся расейскімі кнігамі, а таму і моваю, мабыць, заслуга (ці віна) Дастаеўскага. Ён прыцягваў тым, што пужаў. Калі быў малым, сястра дала Францу ў руку сталовы нож і раптам паднесла да яго нейкую чырвоную падкоўку (магніт) — нож разам з рукой пацягнула незразумелая сіла. Ажно ўскрыкнуў і ўпусьціў нож. Такая ж вусьцішная сіла — у кнігах гэтага расейскага пісьменьніка. Нешта выцягвае зь цябе, чаго раней, здаецца, і не было, быццам і ня ты гэта.

У вачах Паліны Франц мала чым адрозьніваецца ад тых хлопцаў з суседніх вёсак, якіх заманьвалі знакамітыя на ўсё навакольле петухоўскія вечарынкі: прыходзілі пад чаркаю, спачатку трымаліся ўсе гуртам, рыхтуючыся да адпору, калі іх пакрыўдзяць, а прыцемкам разьбягаліся за петухоўскімі кралямі, хто куды, як рахманыя цяляты, даводзілася іх абараняць, апекавацца імі, не папускаць іх у крыўду мясцовым раўніўцам. Франц цягаў ваду, сек дровы, нават расаду памідораў гэтая дзеўка прымусіла высаджваць на агародзе, старога Ота гэта зацікавіла. Ён стаяў ля агароджы зь люлькай у роце і цікаўна пазіраў, як гітлерюгенд няўмела гнецца над градкай, а на шыі аўтамат матляецца, грэбаецца, як курыца, у зямлі, запэцкаў ад няўмелага стараньня нос, шыю.

Старая Кучарыха час ад часу дзе-небудзь адлоўлівала дачку, шыпела, як гуска (але нехта сказаў бы: добрая гуска):

— Супыніся, дзеўка, што ты сабе думаеш? Што ты над ім свае штучкі вычвараеш? А калі яго камандзірам гэта не даспадобы?

— А вы ведаеце, мама, яму крыху больш гадоў, чым мне. А вырас — гляньце, які дылда!

— Вы ўжо і гадкамі памераліся! Дурное і ёсьць дурное, тое і яно, дзіця горкае. Ды толькі гэта табе не гульня! Ох, яшчэ пакажуць яны сябе, чуе маё сэрца!

І паказаў... У тую ж ноч.

Бадай, ніводная дзяўчына не падабалася так Францу, як раптам гэтая кінулася ў вочы — з бандыцкае вёскі. Ды калі папраўдзе, нічога сур'ёзнага і не было яшчэ ў яго з жаночым племем. Хаця сярод аднагодкаў, асабліва калі быў у маладзёвым лягеры «Сіла праз радасьць», ня горш за іншых выстаўляўся вопытным лавеласам, абаяльным самцом, які не з чужых словаў ведае, што і як. А сам нават да прастытутак не хадзіў, куды ў маладзёнаў зь лягеру сьцежка была пратаптаная. Ня толькі боязь заразіцца, адгукалася і хатняе выхаваньне ў сям'і пастара.

І вось перад ім тая, якую, яшчэ крыху, і ён пакахае па-сапраўднаму. Але часу на гэта ня будзе: неўзабаве дзяўчыну застрэляць. (Хто? — стараўся не дадумваць.) Ён жа так і не спазнае таго, пра што гэтулькі гаворкі, пішуць у кнігах, у кіно паказваюць — прытым не з распуснай, а вось з такой чыстай, прывабнай. У гэтым халодным нібыта разьліку: не ўпусьціць! — нейк прысутнічала пачуцьцё закаханасьці. Яно, гэтае пачуцьцё, нават завастрылася ад драпежных намераў, думак, што ўсё мацней бралі над ім уладу. Ад безабароннасьці яе і асуджанасьці яе плоць станавілася ўсё больш жаданаю. На трэцюю ноч толькі пра гэта і думаў, вячэралі, нікому ў вочы ня мог паглядзець. Дзяўчына разумела гэта па-свойму і дражніла яго яшчэ больш: падсочваючы, ловячы яго позірк. Так і дурное шчаня пачынае гуляць перад пашчаю воўка.

Што яшчэ жыло ў яго, Франца, сьвядомасьці, як ні дзіўна — пратэст. Жорсткасьць, эгаізм жаданьня супраць жорсткасьці догмы, ідэалёгіі.

Расавы закон аднак яму гэтага не дазваляе. Забіць дазваляе і нават абавязвае. А вось падобным пралюбадзействам прынізіць сваю расу — тое самае што скаталожніцтва. І таго горш, больш небясьпечна: скаціна табе сваю ідэалёгію не перадасьць.

Што пра гэта кажа закон, які вызнае ягоны бацька, пратэстанцкі сьвятар, Франц, калі трэба, можа прыгадаць, але кіравацца ім немец не абавязаны. Фюрэр вызваліў ад гэтага абавязку, даў свой запавет, закон. Але цяпер менавіта з законам расы спрачаўся эгаізм маладога немца, не вяртаючыся, аднак, да бацькавага наказу. Новыя скрыжалі ўзнагароджваюць ягоную вернасьць толькі трупам. І адбіраюць радасьць уладаньня жывым. Дзе ж сіла праз радасьць? Нешта тут ня так, мой фюрэр, гэта прывабіць хіба што Ота — яму важней за ўсё сабраць смачную пасылку і паслаць яе сваёй жонцы...

Што адбылося ў тую ноч на кухні, на шырокай лаве ля акна, дзе клалася спаць Паліна, цемра не дала разглядзець ні Кучарысе, ні старому Ота (яна спала на печцы, ён — у другім пакоі).

Я ж гэтую сцэну нібы бачу (з боку Франца), выразна яе ўяўляю: сам перажыў нешта падобнае.

Гадоў за пяць да вайны да нас у госьці прыехала цётка з мужам і іх пляменьніца. Быў я яшчэ пяцікласьнікам-школьнікам. Дужа запала мне ў вока пляменьніца, дзень у дзень мы зь ёю лёталі па двары і ў хаце, абліваліся вадою, шчыпаліся, яна на мяне скардзілася, і нас абаіх прысаромлівалі, сварылі, мая мама мяне, цётка яе. А калі згасілі сьвятло, леглі спаць (госьці ў сталоўцы), я ў цемры папоўз, каб напалохаць іх. Дапоўз да стала — далей іх ложак і канапа — і крыкнуў па-дурному: «А-а-а!» Нешта гучна фыркнула, зашыпела, як клубок зьмеяў, і па маёй фізіяноміі, па шыі прайшліся чыесьці кіпцюры. Ды такія вострыя, шалёныя. Мне б у час успомніць, што ў нашай кошкі нарадзіліся кацяняты, і карабок, іх пасьцель, пад тым сталом. Нічога ня цямячы, залямантаваў, як зарэзаны. Спалох быў усеагульны. Пакуль не запалілі сьвятло і не пабачылі мяне, з расьпісанай фізіяноміяй, і ня скемілі, што адбылося. Мяне тут жа расфарбавалі яшчэ ёдам, доўга не маглі супакоіцца — потым ужо ад сьмеху.

У хаце Кучарыхі рагатаў толькі Ота Залеўскі. Ас-

татнім было не да таго. Франц выбег за дзьверы, на вуліцу. Паліна кінулася на печ, да маці пад крыльца. І стаіліся абедзьве.

Раніцой жанчыны ўсталі, як звычайна, раненька, асьцярожна корпаліся ля печы, даілі карову, кармілі кабанчыка, курэй — усё, як заўсёды. Выйшаў да іх Ота, выспаны, дужа задаволены мінулай ноччу. Яны яго абслужылі цёплай вадзічкай: падрэзаў свае вусы, пагаліў змаршчакаватыя шчокі і шыю, часьцей звычайнага паўтараючы: «Данке, гут, гут!» Франц выйшаў са спальні, як выбег, звонячы зброяй і мэталічнымі карабкамі на поясе, адварочваючы падрапаную, з барвовымі шнарамі, фізіяномію. Не павітаўшыся, пабег на вуліцу. Кучарыха правяла яго спалоханымі вачыма, нават Паліна, зусім ціхая, зьбялелая, стаяла ля шафы, вінавата маўчала. Ота ж проста сьвяціўся ўвесь, як новы пятак.

— Лыбіцца, быццам подмазку зьеў! — не стрывала Паліна. Здаецца, яна пакрыўдзілася за Франца.

Старая Кучарыха на яе накінулася:

— Ты хоць гэтага не чапай! Хопіць, ужо дагулялася.

Паліна ціхутка шмыганула за дзьверы. Вярнуліся яны абое, зьміраныя, задобраныя (што яна яму там казала, чым суцешыла?), хоць ты іх з іконай бласлаўляй.

— Мама, у нас лой быў, гусіны тлушч. Памазаць — і пройдзе.

Выбегла ў кладоўку, а Франц стаіць і зьбянтэжана пасьміхаецца, пагладжваючы шчокі, лоб, шыю.

— Война, матка, крыг! — спрабуе жартаваць.

— Вы ўжо на яе ня гневайцеся, маладое-дурное, што зь яе ўзяць?

Дзякуй Богу, хоць стары немец пайшоў у прыбіральню, ня хутка вернецца. Паліна ўжо нясе шклянку, беланапоўненую, калупнула пальцам.

— У нас так лечаць, — растлумачыла Францу, — калі хто незнарок падрапаецца. Я змажу ранкі, гут? Не балюча, крышачку.

Франц пакорліва схіліўся. Паліна, водзячы пальчыкам, замаўляе:

— Па саломе, па мякіне, няхай пабаліць і пакіне. Пакуль жаніцца — загаіцца. Зажыве да вясельля.

## 3

Дзень расправы набліжаўся выверaным ваенным крокам. А вяскоўцам як вушы заклала, вочы заляпіла: так ім не хацелася ў гэта паверыць. За ўсе крыўды Германіі, пасьлявярсальскія пакуты нямецкага насельніцтва павінна была расплаціцца беларуская вёска Петухі. Аб тым ведала адна частка людзей (пастаяльцы), другая ж частка (самі жыхары) з кожным спакойна пражытым днём усё больш верыла: пранесла, на іх бяда не абрынулася, хаця б гэты раз.

Апошнюю ноч, калі ўжо быў аддадзены загад ажыцьцявіць на сьвітаньні (а 8.00) акцыю, Франц амаль ня спаў. Ота Залеўскі паведаміў яму агульнае распараджэньне: больш нікога зь вёскі не выпускаць (але тым, хто зь лесу вяртаецца, не перашкаджаць), па магчымасьці трымаць сваіх гаспадароў у хаце, папярэджваючы, што вось-вось можа пачацца бой з партызанамі, яны, маўляў, падыходзяць, акружаюць. Ота спаў адным вокам, некалькі разоў ноччу прачынаўся і курыў на кухні, бегаў вады папіць ці на двор па патрэбе. Франц ліхаманкава думаў, уяўляў, як гэта адбудзецца. Ота ў яго спытаў, ухмыляючыся: ты, вядома, маладую выбраў? Што ж, падабаецца, бітэ, калі ласка, а я па-старэчы прыгрэю старую каргу.

І ўсё-ткі задрамаў Франц, а калі прачнуўся і пачуў на кухні мірныя галасы старой і Ота, што ўсё спрабавалі растлумачыць адно аднаму, якая гэта ліхая штука вайна, яго раптам працяў холад, узялі дрыжыкі. Гэтага яшчэ не ставала! Як жа ён выйдзе да іх, як паглядзіць на Паліну, вачыма сустрэнецца зь яе позіркам? О Божа,

лепш бы не прачынацца наогул! Ня жыць, ня ведаць нічога гэтага. Бацька, ты любіў паўтараць словы пра чашу, якую Сыну Божаму назначана было выпіць да дна. За нас, каб і мы свае выпрабаваньні прайшлі з гонарам. Ну а сыну твайму — вось такое выпала. Ня я выбіраю, за мяне Фатэрлянд, фюрэр вызначылі маю ношу. Як зь ёю быць, што рабіць мне? У мяне засталася гадзіна часу, хто, хто падкажа?

Чуў, як з двара зайшла Паліна, грымнула дровамі ля печкі. Перад гэтым у пакой да Франца забег ашалелы стары: ты што, забыў, твая пабегла некуды, за яе ты адказваеш! О Божа, няхай бы яна і сапраўды ўцякла, ня зьелі б за гэта Франца, ну няхай бы пакаралі як сьлед. Ці няхай, калі ўжо на тое пайшло, Ота ўсё гэта зробіць, яму гэта не навіна.

Чутно, як Паліна мые даёнку, пойдзе карову даіць, а сюды ізноў уляціць гэты ашалелы падганяць Франца. Вось ён, аж задыхнуўся ад гневу, словы ў глотцы заселі.

Франц адно махнуў рукой, навешваючы на плячо аўтамат і кіруючы на кухню. Павітаўся з гаспадыняй, яна паабяцала:

— Зараз Паліна малачка сьвежага прынясе, а вы трошкі шпацырэн. Будзе апэтыт гут.

Да чаго здольная да моваў. Што ж, Франц пагуляе, а то яго апякун хутка забрэша ад абурэньня.

Франц накіраваўся да варотаў, выглянуць на вуліцу. Чутно, як у хляве за ня шчыльна прычыненымі варотамі пішчыць, патрабуе кармленьня кабан, далятае голас Паліны, што пакрыквае на неспакойную карову. Усё так мірна, звычайна. І такі сонечны ранак. Самы чорны ў жыцьці Франца. Глянуў з варот на вуліцу, там нейкі рух, заведзены машыны, перабягаюць вуліцу салдаты. А раптам раздумаў штурмбанфюрэр, гэта ў яго ўладзе, раптам аб'явяць: акцыя адмяняецца, адыходзім. Ну няхай другі раз, няхай недзе, але ня зараз, ня тут. Зразумейце ж, Паліна, Паліна! Фюрэр мой, Германія, я дрэнны патрыёт, сам бачу, але я яшчэ набяруся мужнасьці,

волі, рашучасьці. Я спатрэблюся ў справе. Але толькі не цяпер!

Чутно, скрозь усе ранішнія гукі прабіваецца да Франца, як звонка б'е ў дно даёнкі струмень малака, ласкавы голас Паліны, што ўгаворвае: «Стой спакойна, што гэта з табою сёньня?» Ох, дзяўчынка, дзяўчынка, нават быдла нешта чуе, а ты — як жа ты ня бачыш, што рыхтуецца? Сказаць ёй, махнуць на ўсё рукой і папярэдзіць! Ну і што, куды яна цяпер уцячэ, дзе схаваецца, калі ўсё пачне гарэць, а яшчэ Ота, ужо ж ён ня дасьць парушыць загад! Раней трэба было, хаця б учора, пазаўчора. Чаго чакаў, чаму так не зрабіў? Але ж гэта здрада, гэтым ты здраджваеш інтарэсам свайго народу. Які там яна, гэта дзяўчына, вораг для Германіі, але важны прынцып: дзейнічаеш патаемна, за сьпінай усіх, парушаючы загад, у інтарэсах не Германіі, а яе ворагаў.

З расчыненых варотаў выйшла Паліна з цынкавай даёнкай у руцэ, убачыла расьпісаную ёю фізіяномію Франца, зьбянтэжана ўсьміхнулася, нават румянак радасны сагрэў яе шчокі. Франц дапамог зачыніць цяжкія вароты. Знаёма ўскінула кароткія валасы і раптам пасьпешліва накрыла краем даўгой спадніцы малако. Растлумачыла, сарамліва сьмеючыся:

— Каб не сурочылі. Каб малако ня скісла, вымя ў каровы ня высахла. Калі ў вас благое вока.

— Паліна, я хачу сказаць, — усё, што здавалася самым важным, раптам перастала нешта значыць, — я хачу... папярэдзіць. Блягі чалавек прыйшоў ужо, вам усім будзе бляга.

На Франца ўмольна глядзяць вялікія чорныя вочы: гэта няпраўда? Я ня так зразумела? Ты абароніш!..

— Трэба вам... я ня ведаю што... — сказаў і азірнуўся на дзьверы, на вароты. Раптам гучна зарагатаў, гучна вымавіў: — Малако гут? Малако карашо!

Як бы перакрыўляючы Ота. Паліна на яго глядзіць у зваротнай надзеі, а можа яна ня так зразумела яго? І

ўсё ня так страшна. Пайшла дахаты, а Франц, трымаючы аўтамат ля пояса, усьлед.

І пастаяльцы-немцы, і старая — усе ўважліва пазіраюць (гэта заўсёды заварожвае), як малако льецца і пеніцца ў шкляным збане. Старая ўжо накрыла на стол: нязьменная бульба, кавалачкі сала, сьмятана, кансэрвы (відаць, Ота расшчодрыўся і адкрыў бляшанку).

Паліна ўзяла другі, непразрысты збан, гліняны, накрыла марляй і цэдзіць малако ў яго. З выразам смутку і асуджанасьці на твары: Францу прыгадаліся такія твары ў музэі, куды яго часта вадзіў бацька — на карцінах з выяваю мадонаў. Ота выразна, не сьпяшаючыся, каб другія не зьвярнулі ўвагі, дастаў свой вялікі срэбны гадзіньнік і, шчоўкнуўшы вечкам, паглядзеў на стрэлкі. Заўважылі аднак усе: яшчэ б, такі гадзіньнік, старадаўні, такі гук. Кучарыха нават пацягнулася разгледзець яго бліжэй. Як да ляза сякеры ў руках ката: ці вострае? Жах скаваў галаву Франца жалезным абручом, сталі раптам балець вочы, нават сьлязіцца ад болю.

Міжволі зірнуў на свой гадзіньнік, наручны, падарунак маці: безь пяці хвілін восем! Заўважыў, што міжволі ўслухоўваецца, што адбываецца за вакном: ці не пачалося? І ў жоўтых (якія яны жоўтыя ў яго!) вачах, на зрэзаным глыбокімі змаршчакамі твары Ота такое ж чаканьне. Змаршчакаватая шыя сьцярвятніка... Абодва заварожана глядзяць, як льецца пеністае малако, быццам і гэта зьвязана з чаканьнем: скончыцца і... пачнецца.

— Вы сьнедайце, а я набяру бульбы, абед варыць трэба, — раптам пачуўся голас старой гаспадыні. Спалох на твары Ота: сытуацыя ўскладняецца! Кабета за кольца ўзяла вечка падполу, у другой руцэ трымае пусты кош.

— Dorthin darf man nicht*, — памкнуўся да яе Ота, падхопліваючы вінтоўку, што стаяла ля сьценкі. Старая,

---

* *Туды нельга (ням.).*

не разумеючы, што немец мае на ўвазе, перадала яму з рукі ў руку вечка склепа, і Ота, як дурань, прыняў яго, трымае.

А старая, усё ўсьміхаючыся, спускаецца ў склеп. І тут глуха застукалі за акном, недзе ў суседзяў, стрэлы.

— Komm raus*, — закрычаў Ота.

Франц глядзіць на Паліну, што, уставіўшыся ў вакно, прыслухоўваецца. Твар яе такі ж белы, як малако, што сьцякае, ужо льецца цераз край чорнага збана, хлюпае на падлогу. Старая з склепу ані гуку, быццам і няма яе там. Ота ў адчаі кінуў вечка, якое да таго бязглузда трымаў, на падлогу і, пасьпешліва зарадзіўшы вінтоўку, грымнуў у падпольле стрэлам. Франц ад нечаканасьці (усё-ткі) падскочыў з табурэту, і цяпер Ота, ашчэрыўшы пракураныя жоўтыя зубы, яму крыкнуў:

— Was steckst du da, Scheisser?**

І скіраваў вінтоўку на Паліну. Але Паліна за сьпінай у Франца, і Ота ня можа стрэліць. Стрэліў Франц. Ён і не заўважыў, як рука ўскінула затвор аўтамата, апамятаўся толькі, калі аўтамат забіўся ў яго руках. Скрозь чад, што запоўніў пакой, лёгкія, вочы, сьвядомасьць, Франц бачыць, як Ота, узмахнуўшы рукой і як бы адкідваючы вінтоўку, якая стукнулася аб кухонную шафу, хіліцца да печкі, хапаецца рукамі за яе, быццам узьлезьці на яе хоча. Спаўзае на падлогу, а белая бакавіна печкі заплывае чырвонай, крывавай плямай, што шырыцца на вачах у Франца (і ў вачах Франца).

Нейк адчужана ён пачуў гук свайго аўтамата, што ўпаў пад ногі. Нехта яго штурхае ззаду (Паліна), ён пераступіў аўтамат і апынуўся ля ямы, што вяла пад падлогу. Паліна трымае яго за плечы, нахіляе:

— Туды! Там ёсьць ход! Туды!

Франц паспрабаваў нешта растлумачыць, спытаць, павярнуцца да яе, але чужыя рукі ўчэпіста і ўпарта скіро-

---

* *Вылазь наверх (ням.).*

** *Ты што, засранец, сядзіш? (ням.).*

ўваюць яго некуды. Толькі б далей ад гэтага жаху: Франц ступіў на лесьвічку, адразу ж нязграбна сьлізгануў зь яе і ўпаў каленьмі на нешта сьлізкае, коўзкае. Рукі загрузьлі ў бульбе, мокрай, падгнілай.

— О Божа! О Божа! О Госпад Бог!

Старая тут, жывая, але яе не відно. А Паліна закрывае за сабою вечка падпольля. Шэпча:

— У цябе ліхтарык, запалі ліхтарык!

Дзейнічае надзіва ўпэўнена, з разьлікам, быццам ня раз зь ёю такое адбывалася. Гэта прымушае падпарадкавацца і чакаць яе распараджэньняў. Праціснулася каля Франца, скіравала прамень ліхтарыка ў руцэ Франца на патрэбную ёй сьценку і адразу стала зрываць, здымаць зь яе драўляны шчыт.

— Ціха вы, мама! — прыкрыкнула на старую, што охала, стагнала.

За шчытом адкрылася дзірка-лаз. Паліна падсаджвае маці:

— Вы першая. Толькі ціха. Ня бойцеся, татка вучыў вас, вы ж помніце.

Бездапаможна, бы ў жабкі, заторгаліся і зьніклі ў чарнаце скрыўленыя ногі, на Франца жмурачыся (прамень ліхтарыка б'е ёй у вочы) глядзіць Паліна. Вялікія спалоханыя дзіцячыя вочы, ня верыцца, што гэта яна так сурова распараджалася. Просіць:

— Паўзі цяпер ты, а я зачыню за сабой. Там у нас схованка, такі вялікі склеп. Спэцыяльна мой фатэр зрабіў для нас. Нас ня знойдуць, ня бойся.

Франц поўз па халодным пяску, плячыма, локцямі, галавой адчуваючы дошкі вузкай, як труна, нары. Даводзіцца віцца, як чарвяку. Ён ужо і здаецца сабе чарвяком, у адзін міг з самаўпэўненага вясёлага гітлерюгенда, з начытанага, музыкальнага сына паважанага ў наваколльі пастара ператварыўся ў нешта запалоханае, паўзучае, што шукае ратунку. Чуе, як наперадзе цяжка крэкча старая, усьлед за ёю адпаўзае ад усяго ранейшага, ад сябе былога. Як хутка ўсё зьмянілася. Усё было і

нічога не засталося. А недзе ззаду — Паліна. Адзінае, што яшчэ засталося на зямлі (пад зямлёй!) для яго, як праменьчык надзеі, — гэтая спалоханая, але такая рашучая дзяўчынка. Франц скіраваў ліхтарык назад і ўбачыў... аголеныя белыя лыткі ног, стаптаныя чаравікі. Паліна паўзла нагамі наперад — скеміў: яна зачыняла лаз шчытом, маскіравала і не змагла разьвярнуцца ў вузкай нары.

— Патушы зараз жа! Ты што? — гнеўны дзявочы голас.

Некуды зьніклі рухавыя ногі старой. На руках Франц споўз, спусьціўся ў нейкую яму, пасьвяціў і агледзеўся. Тут скрынкі, на адной ужо ўселася старая, стаяць бочачкі, вядро і нават кружка ля яго — усё нарыхтавана для працяглага сядзеньня. Старая паказвае: сядайце і вы! Сказаў машынальна: «данке», а ня «дзякуй» — нямецкае слова для самога прагучала па-чужому, адразу павеяла пагрозай. Яны там знойдуць забітага Ота, а можа, ён толькі паранены, раскажа, хто ў яго страляў. Аўтамат Францаў застаўся ў хаце. Лепш бы згарэў дом, так надзейней было б, трэба было падпаліць, раней чым хавацца — з трусьлівай жорсткасцю падумалася Францу. Яму не да самаацэнак. Ды й не пра сябе ён думае, больш баіцца (упэўнены ў гэтым) за родных, калі ўсё раскрыецца, іх у Германіі чакае лягер, ганьба, нянавісьць і пагарда суседзяў.

Пасьпешліва ў склеп сьлізганула Паліна, балюча аб нешта стукнулася, войкнула, сярдзіта паправіла на сабе спадніцу.

— Памажы мне.

Ага, і тут ёсьць шчыт, можа задраіць дзірку-лаз, што вядзе дахаты. Паліна растлумачыла непраўдападобна абыякавым тонам:

— Гэта ад дыму, калі гарэць будзе хата, — і прастагнала: — О Божа, што цяпер там?!

## 4

Дым у зямлянку пранік зусім не з таго боку, адкуль прыпаўзьлі. Паліна растлумачыла:

— Гарыць лазенка. Нам туды выпаўзаць.

Але тут жа дым паваліў і праз шчыт на супрацьлеглай сьценцы — дзе хата. Паліна шэптам супакойвала маці:

— Абы жывыя засталіся. Ня плачце, а то яшчэ пачуюць!

Хутка ўсіх пачаў душыць кашаль. Паліна і Франц міжволі прыціскаюцца да пляча адно аднаго, каб ня так чуваць было. Нехта гулка прабег проста над галавой, стрэл, другі. Старая, заціскаючы твар, упала проста на дол: Франц зь бессэнсоўнай пасьпешлівасьцю патушыў ліхтарык. Як бы ад надышоўшай цемры, чутней стала, што робіцца на паверхні. Машыны равуць, і стральба. Ці гэта полымя так гудзе і страляе? Некалькі разоў цяжка стукнула, глухія выбухі збоку, як бы з глыбіні зямной, пасыпаўся зьверху пясок.

А можа і насамрэч бой пачаўся, падышлі партызаны? Калі і так — адначасова падумалі Паліна і Франц — калі выйдзем на паверхню, а там ужо нашы (а там — гэтыя, каго называюць бандытамі), брат Павал і тата прыбягуць, забяруць і Франца, але мы яго абаронім, растлумачым, як немец выратаваў нам жыцьцё (тварам да твару апынуся перад бязьлітаснымі, жахлівымі партызанамі, але, прынамсі, маёй сям'і ня будзе пагражаць Дахаў).

Франц заснуў, нейк адразу, як, здаралася, засыналі дзеці ў самай страшнай сытуацыі (б'юць, паляць) — менавіта ў самы жудасны момант. Паліна не адразу зразумела, чаму ўздрыгваюць плечы Франца, што ацяжэла прытуліўся да яе, а калі раптам зразумела — яе сэрца востра пранізаў адвечны жаночы боль і жаль да мужчыны, амаль як да дзіцяці. Немец-хлапчук спаў. Ён плакаў.

— Бедны, плача, — сказала старая, — таксама чалавек. Божа мой, Божа!

А Францу сьнілася яго кватэра ў Дрэздэне: за даўгім хатнім сталом нейкія людзі, мабыць, госьці, але ўсе маўчаць і глядзяць на строга, ва ўсё чорнае апранутага бацьку і разадзетую, як дзяўчынка, маці Франца, якая і з выгляду не старэй за яго сясьцёр. Яны таксама за сталом, зь імі Паліна. Самая малодшая ў сям'і, Галена, крычыць (чамусьці па-руску):

— У нас вясельле, Франц. Глядзі, якая нявеста. Чаму ты плачаш? Ты іх напужаеш.

— Ота ім расказаў, — ціха кажа Паліна і незразумела: — Але ты ня бойся, ён мёртвы.

Ачнуўся, мабыць, ад блізкага выбуху, не разумее, дзе ён, цёмна, як у магіле, але побач нечае дыханьне, нечая прысутнасьць. Далоньню правёў па твары сваім, шчыміць скура ад салёных сьлёз. У горле пяршыць — гэта ад дыму. Немагчыма дыхаць.

— Дзе ліхтарык, запалі, — Паліны голас.

Франц намацаў на скрынцы круглую рукаятку, запаліў сьвятло і канчаткова вярнуўся, вырваўся са сну.

— Табе лягчэй? — спытала Паліна і растлумачыла, у голасе паблажлівая ўсьмешка. — Ты заснуў.

— Так! Сон такі!

— А там сьціхае, чуеш? Ты нахіліся долу, там менш дыму.

На гадзіньніку Франца (Паліна ўзяла ягоную руку, каб паглядзець) поўдзень ужо.

Яшчэ цэлая вечнасьць мінула, нешта ў гэтым сьвеце скончылася назаўсёды, а яны трое ўсё яшчэ жывыя. Дым больш ня валіць са шчылін, але ўсё роўна сухім туманам стаіць перад вачыма, ён у грудзях, у лёгкіх, здаецца, што і галаву, і сэрца — усё, усё запоўніў. Паліна ня вытрывала, пачала здымаць шчыт з боку, як яна сказала, лазенкі. Франц кінуўся на падмогу. Пра сябе падумаў: «Wie ein Unterseeboot»*.

Паліна не гаворыць, к а б  і х  н е  н а п а л о -

---

* *Як падводная лодка (ням.).*

х а ц ь, але сама замірае ад думкі: а ці ўдасца выбрацца, раптам абодва выхады — і праз лазенку, і праз хату — заваліла так, што ня выдзерасься? Францу не дазволіла паўзьці за сабой (ня будзе чым дыхаць дваім у нары!), падбіраючы спадніцу, падсаджаная Францам (усё-ткі папрaвіла яго рукі, калі ўзяў яе нібыта ня так), уціснулася ў нару і зьнікла. Францу і старой здалося: доўга, нясьцерпна доўга яе не было. Спачатку чуўся асьцярожны кашаль, а затым і яго ня стала чутно. Франц бессэнсоўна спрабаваў промнем ліхтарыка высьвеціць задымленую дзірку, ужо і батарэйкі садзіцца сталі, сьвятло цьмянае. Нарэшце зьявілася, і зноў перш ногі, чаравікі, белыя лыткі ног. Франц — ад бяды далей! — адвёў сьвятло ўбок. Прыняў на рукі яе лёгкае стомленае цела, памог стаць на ногі. Што, што там?

— Яшчэ агонь там, жар. Трэба пачакаць.

Выбраліся толькі апоўначы. Усё роўна іх сустрэў несатлелы жар. Франц на гэты раз папоўз першым і атрымаў апёкаў больш. Яму давялося разграбаць выхад. Прапаліў мундзір на локцях, штаны на каленях. Шчыміць скура на запясьцях, шчака, шыя гараць ад апёку, сколькі ні аблізвай іх, ня змочвай сьлінай. Але ўсё-ткі ён падняў, адкінуў вечка (вугольле так і пасыпалася на яго), зрабіў выхад, затоптваючы і раскідваючы чырвонае вугольле, памог выбрацца на паверхню жанчынам. Ужо ноч, але ўся распаленая, куды ні глянь, бачныя за стваламі і скрозь сукі садовых дрэваў папялішчы, што ўсё яшчэ вогненна тлеюць, разьдзьмухваюцца ветрам. Ад хаты Кучарыхі засталася адна печка, зьнізу чырвоная, падсьвечаная жарам, вышэй бялейшая, а яшчэ вышэй — як цёмны абэліск, што ідзе ў чорнае неба. Уражвала цішыня: недзе выў сабака, яму падвываў яшчэ адзін, але гэта не парушала мёртвай, нейкай нетутэйшай цішы, здавалася, яна ідзе проста ў космас.

Людзей, што перажылі сьмерць сваёй вёскі, — думаю, і тыя, хто жыўцом гарэў у Дрэздэне, маглі б засьведчыць, — аглушала думка, перакананьне: у с ю -

ды так! На ўсёй зямлі! У гэтую хвіліну забіваюць усіх!..

Завыла Кучарыха на поўны голас, ужо не баючыся забойцаў, карнікаў. Быццам і іх таксама не засталося! Кінулася да свае хаты, аббегла вакол пажарышча раз, другі, як бы спрабуючы дабрацца, дацягнуцца да сіратліва бялеючай печкі, прыпасьці, абняць. Паліна чамусьці адышла ад Франца, ён машынальна рушыў усьлед, яна яшчэ далей пад дрэвы адступіла. І калі ён зноў захацеў наблізіцца, раптам закрычала не сваім голасам:

— Што ты ўсё аблізваеш свае рукі? Што, баліць? А ім не балюча было? Дзеткам! Жывымі ў агні!

І зарыдала, закінуўшы галаву, схапіўшыся рукамі за ствол дрэва. — Фашыст! — праз рыданьне. — Ненавіджу! Усе вы фашысты!

Франц адышоў убок і сеў на нейкі слупок. Паклаў на калені сваю пляскатую сумку. Там у яго прыбор галіцца, мыла і яшчэ — чорная круглая граната з блакітнай галоўкай. Жыць яму не хацелася.

## 5

Было б бясьпечней пайсьці ў гушчар лесу, кудынебудзь на балота, але нешта трымала іх у вёсцы, якой ужо не было. Удзень абышлі сяло — ад пажарышча да пажарышча. Кучарыха час ад часу хапалася клікаць гаспадароў:

— Хведарка! Прузына! А дзе ж вы, чаму ня выйдзеце да нас, чаму не паклічаце нас у госьці? Ці мы правініліся перад вамі? А мая ж ты Ганначка, а ты ж заўжды павітаесься, спытаеш пра дзетак, пра ўсё распытаесься. Што ж ты маўчыш, не чуваць цябе?..

Паліна і Франц ішлі наперадзе, але таксама ня разам, кожны сам па сабе — лепш каб Франц наогул не хадзіў зь імі. Але ён не адстае.

Ужо некалькі разоў дождж браўся астуджваць не-

астылую зямлю, чорныя папялішчы, але ўсё яшчэ гойдаліся блакітныя дымкі то ў адным, то ў другім месцы — быццам нечая затрымалася душа.

Палілі вогнішча: трэба было есьці, кіпяцілі ваду. Праз лаз на месцы спаленай лазьні выцягнулі нейкія сухары, старое ёлкае сала, жоўтае вязьмо рэпчатай цыбулі, бульбу — што назапашана было на такі, відаць, выпадак. Жылі, як бы некага ці нечага чакаючы. Толькі некалькі сутак мінула з тае ночы, як выбраліся на паверхню, а здавалася — прайшло Бог ведае колькі часу. Вось так сядзелі ля агеньчыка, акрытыя чорным з рэдкімі зоркамі небам, як раптам Франц, азірнуўшыся, быццам паклікалі яго, ускочыў на ногі. Усьлед за ім — Паліна са старой. Хто, што?! А на іх, уставіўшыся з ночы, глядзяць вочы, мноства запаленых вачэй! З усіх бакоў. Кучарысе здалося — душы людзкія, яна пачала хрысьціцца, але тут жа ўсіх супакоіла:

— Каты́, гэта каты́.

З усёй вёскі сышліся — на пах ежы, на жывую прысутнасьць людзей.

Франц сваім склюдам насек, нарыхтаваў для ўсіх яловага гольля, наламаў бярозавага суччa, што пахла ўжо вясной, сокам, — на чым спаць. У Паліны і старой агульнае ложа пад шырокай яблыняй. У Франца — сваё, наводшыбе. Але які там сон, халодна начамі і наогул ня сьпіцца. Старая сабрала побліз нейкія абгарэлыя, з брыдкім пахам палавікі, радно. Каб было чым акрыцца.

А раніцой Паліна раптам пачула: птушкі пяюць! І ўсе гэтыя дні, мабыць, гучалі іх галасы.

— А дзе мы яго схаваем? — спытала Кучарыха, якая таксама ня спала.

— Няхай ідзе, адкуль прыйшоў! Што яму тут рабіць?

— Хто ж яго, дачушка, прыме? Ня іхны і ня наш. Прыйдуць партызаны, і таксама невядома, як на яго паглядзяць.

— Я і кажу. Зьявяцца героі. Калі адны вугольчыкі ад людзей засталіся. Як жа, немца ў палон узялі!

— Ці жывы Паўлік, бацька? О Божа сьвяты!

Над шэптам людзей — птушыны разгай. Іх дом — сады, падлесак бярозавы — цэлы. Даюць знаць, што яны ёсьць, жывуць, цэламу сьвету, не баючыся. Пі-ікаюць пеначкі, бы стракозы, сквірчаць шпакі, на ўзьлеску (першы раз сёлета) паспрабавала свой голас зязюля, Паліна толькі пачала лічыць — тая падлік абарвала.

Паліна паглядзела ў той бок, дзе пад старой парэпанай ігрушай сьпіць немец: падцягнуў ледзь не да падбародзьдзя калені, акрыўся брудным палавіком — як у мамкі ў гасьцях. Хто цяпер адзінокі ў гэтым сьвеце, дык гэта ён. Паліне ў цяжар, мука, як асуджана Франц ходзіць за ёю, як глядзіць, але з сабой нічога парабіць ня можа: як выйшлі на сьвет, як пабачыла апусьцелую вёску, быццам у ёй нешта замкнула. Ня можа яго ні бачыць, ні чуць.

А тут нешта ў ёй здрыганулася, як абарвалася: зачаплілася шкадоба да гэтага, страшна сказаць, немца. Тут жа вырашыла: трэба яго пераапрануць, выкінуць, схаваць усю конскую збрую, што на ім, гэты ненавісны мундзір. У хованцы, там, у скрынках, схаваныя бацькавы і брата старыя апраткі, бялізна. Хаця цяжка будзе падабраць пад гэтую каланчу, да бязглузда доўгіх рук і ног нешта вартае.

Пераапрананьне ажыцьцёўлена было тут жа, яшчэ бульбу Кучарыха не пасьпела зварыць. Штаны і пінжак, некалі купленыя ў сельпо, даўно страцілі фабрычны колер, ну, а кашуля, бялізна — наогул саматканыя. І сьвітка на ім — таксама з рудога саматканага палатна. На ногі Паліна не знайшла нічога. Няхай застаюцца на ім нямецкія боты, іх цяпер і партызаны носяць. Затое бялізну адшукала новенькую, з свайго палатна. Так, шорсткае, ня так яго адбельвалі раней, да вайны, затое неапрананае. (Колькі яно пакут пасьля прынясе беднаму Францу, не здагадвалася.)

Франц схаваўся ў яшчэ бязьлістыя кусты і там пераапранаецца. Час ад часу радасна паказвае, што зьняў зь сябе і што апранае. Паказаў рэмень з усёй салдацкай аснасткай, дыскамі аўтаматнымі, з круглым карабком супрацьгазу. Паліна махае рукой: кінь і гэта! Калі свайго жыцьця не шкада, гэтага не шкадуй.

Вярнуўся з кустоў зусім іншы Франц. Хоць ты зь ім на петухоўскую вечарынку ідзі. Не, вядома, не на вечарынку ў гэтых караўках, хутчэй на калгасны сход ці ў абору. Але гэта тое, што трэба, — зноў жа калі жыць хочаш. Немец сумленна паказаў: круглую гранату ён сабе пакідае. Паднёс да ўсьмешлівага твару і прадэманстраваў, як ён адкруціць блакітную галоўку гранаты, як пацягне за яе і... Рукой, пальцамі зьмяў свой твар, як памідор. І растлумачыў:

— Blutiges Fleisch*. Ніхто не пазнае немца Франца. Што яго фатэр і мутэр жывуць у Дрэздэне.

Паліна бачыць, што на руцэ ў яго (рукавы кароткія) пабліскввае, кідаецца ў вочы, «ня наш» гадзіньнік, але не выкідаць жа і яго. Будзе насіць у кішэні. Ён ужо нечага напхнуў туды.

— Добра, што ты па-нашаму кеміш, але вымова — ну проста гарачая бульба ў роце. Зробім так: ты будзеш нямы, а гаварыць буду я!

## 6

— Пайду схаджу да Пархімчыкаў.

Або:

— Адведаю бабку Капусьціху.

І ідзе. Да суседзяў, ледзь не на ўвесь дзень. Гэта яна наведваецца да нябожчыкаў. Паліну палохае, зь якім спакоем, як сур'ёзна гучыць яе: «схаджу», «адведаю». Ні сьлязінкі ў голасе, а твар, вочы маці — нейкія

* *Крываваае мяса (ням.).*

нетутэйшыя. Каб жа, ратуй Божа, не кранулася з розуму.

Яна пастарэла за гэтыя дні. Староньнія называлі яе бабуляй даўно, яшчэ калі Паліна дзяўчынкай была. Не згаджалася:

— Няпраўда! Мая мама самая маладая!

Паліну нарадзіла, калі ёй пяцьдзясят ужо было, Паўліка — на год з палавінай раней. А датуль усё не было ў сям'і дзяцей. Вось і атрымалася: малыя дзеці, а маці — «бабуля». Але ў вёсцы на гэта ніякай увагі, старых могуць назваць — «дзеўкі», маладзіц — «бабкі»: хоць гаршком назаві, адно ў печ ня стаў!

Паліна высачыла, куды і чаго маці ідзе зранку. Нічога, толькі зьбірае на пажарышчах костачкі, чарапы спаленых і складвае ля печы. Як каля помніка. Прачытаўшы малітву, пераходзіць у наступны двор. І так увесь дзень. Паліна стала прыносіць ёй паесьці, папіць. Моўчкі прыме чорнымі ад сажы рукамі, з адсутнымі, пустымі вачыма пад'есьць, на пытаньні не адказвае. Паліна таксама змоўкне, пасядзяць побач, і Паліна вяртаецца. Цяпер ідзе да Франца. Ён звычайна сядзіць ля вогнішча, добра, калі ёсьць занятак — сачыць, ці сьпяклася бульба, а то ня ведае, куды сябе падзець, увесь час шукае вачыма Паліну. Яна ў іх за разводзяшчага ці, калі па-даваеннаму, за брыгадзіра. За ўсіх павінна галава балець.

Паліна і Франц цяпер начаваць ідуць у лес, хаця і недалёка. Каб, калі што, яны першыя, а ня іх, прыкмецілі. Акрамя іх траіх у вёсцы жывымі засталося яшчэ колькі курэй, кошкі, сабакі. Прыцемкі ўжо ня пахнуць каравякамі. Але ў жывых у кожнага свой занятак, свой клопат. Паліна выявіла, што сабакі, якія ня зьбеглі ў лес (сустрэнеш і палохаесься: воўк!), таксама вышукваюць курыныя яйкі, жаруць іх разам з шкарлупіньнем. А яна сама ўзялася яйкі зьбіраць, каб «карміць сям'ю» — маці, Франца. Сьмешна ўспамінаць, але дзед Пархімчык так тлумачыў нянавісьць немцаў да габрэяў: і тыя, і другія любяць яйкі, для ўсіх не хапае. Як цяпер у Паліны з сабакамі.

Так пражылі тыдзень, другі. Дні не занятыя, доўгія. Бадзяліся па лесе, белым ад бяроз, запоўненым вясновым сонцам і птушынымі галасамі, не сядзець жа на месцы. У адну зь цёплых травеньскіх раніц здарыўся цуд. Ці як гэта назваць? Жыцьцё такое, што ўвесь час услухоўваесься. А тут — нейкі шэлест, крадком, як бы дробны дожджык па лісьці прабег. Але на небе ні хмурынкі, і на дрэвах лісьця ўсё яшчэ няма. Тут Паліна ахнула: гэта ж пупышкі, лісьце бярозавае распускаецца! Мільярды аднначасова, аднамомантавыя электрычныя зарады выбухаюць! Зацерабіла Франца: чуеш?! Чуеш?! Ён глянуў на шчасьлівую Паліну, глянуў уверх і — малайчына! — адразу скеміў, пра што яна.

— Wie bei einem Kommando! — і сам пераклаў: — Як па камандзе!

Самае дзіўнае: пачынае здавацца, што ня толькі над галавой выбухаюць пупышкі — бярозавыя бомбачкі! — але і далёкія-далёкія чуеш, гук зьліваецца ў агульны электрычны шэлест.

І тут Паліна і Франц нырнулі на зямлю: як быццам цела пранізаў віск сапраўднай бомбы. Як стаялі, так і ўпалі, схапіўшыся за рукі, пацягнуўшы адно аднаго да долу: убачылі сярод дрэваў людзей, рух сярод нерухома-белых бяроз. Зялёныя мундзіры — немцы! Франц панічна зашнырыў рукой у кішэні, ярасна спрабуе адарвацца ад рук Паліны, адкаціцца ўбок: гэта ён гранату выцягвае — Паліна ўбачыла чорнае яйка і яшчэ больш учэпіста ўпілася ў ягонае рукаво! Кінь, кінь, выкінь!

Няўжо і сапраўды ёсьць нешта страшнейшае за сьмерць? Ды колькі хочаш — у гэтым жыцьці, не адзін чалавек у гэтым пераконваўся. Вось і Франц вырашыў: «крывавае мяса», але толькі каб ня ўзялі яго жыўцом, не прызналі ў ім «свайго», немца! Змог бы ён ці ня змог — калі б не перашкодзіла Паліна, — хто ведае. Але што ён больш, чым сьмерці пужаюцца, сваіх спужаўся — гэта было. Такое бывае зь людзьмі.

Зь нейкага часу мяне займае пытаньне: што было ў фюрэрах XX стагодзьдзя, што магло мёртва паралізаваць волю іншых людзей? Ці, можа быць, г э т а знаходзілася, зьмяшчалася ня столькі ў фюрэрах, «правадырах», колькі ў навакольных людзях? Якое такое рэчыва зь лішкам прысутнічала, вылучалася арганізмамі XX веку?

Сцэна. «Пры нас» гэта адбывалася, але зразумець да канца гэта немагчыма нават сучасьнікам, ня кажучы ўжо аб тых, хто ідзе на зьмену.

За сталом сядзяць салідныя людзі — і ня проста, а тыя, каго называюць «людзьмі навукі», «людзьмі мастацтва», у іх вытворчая нарада. Не сядзіць, а ходзіць толькі адзін чалавек, ходзіць за сьпінамі тых, хто сядзіць, раскурвае сьмярдзючую люльку, папыхквае. У нейкі момант, калі галоўныя пытаньні «вырашылі», той, хто праходжваецца, прамаўляе за сьпінамі:

— А цяпер мы павінны разгледзець пытаньне аб варожай дзейнасьці таварыша Н. у галіне тэатральнай справы.

Уявім сабе, што не ўсяго толькі словы прагучалі, а блізкая, «на паражэньне», аўтаматная чарга — як паводзілі б сябе ўсе гэтыя людзі? І той, зь люлькай? Мабыць, апынуліся б пад сталом. Страх сьмерці іх скінуў бы туды, на падлогу. Але каб ускінуцца на стол і пеўнем закукарэкаць (а менавіта гэта адбылося ў рэальнасьці) — тут страху сьмерці мала. Трэба яшчэ, каб волю сваю ты (сам) некаму перадаў. Як кажуць, дэлегаваў — чалавеку-вампіру. Смактуну чужой волі.

У спробе схавацца ў сьмерць Франц, што курчыўся на зямлі, быў адным з такіх — з абязволеных вампірамі. Ну, а па наш бок — ці шмат было зь нявысмактанай воляй? І як нялёгка, няпроста яе сабе вярталі — і тады, у вайну, і шмат гадоў, ды не, дзесяцігодзьдзяў пасьля.

— Ня вашы, ня немцы! — крычала Францу Паліна, а ён быццам аглух, усё вырываецца, хавае пад сябе гранату.

Нарэшце, здаецца, сам разгледзеў, што набліжа-

юцца людзі, хаця і са зброяй, але ў звычайным цывільным адзеньні, якое і на ім, і толькі адзін зь іх ва ўсім нямецкім. У дзьве рукі, Франц і Паліна, сунулі чорнае яйка сьмерці пад леташняе лісьце і адскочылі ўбок. Гэта не маглі не заўважыць тыя, хто падыходзіў. Адзін зь іх, ва ўсім зялёным, раней, чым наблізіцца да іх, завярнуў да таго месца, дзе пакінулі гранату. Калупнуў чаравіком, нагнуўся і падняў. Гучна хмыкнуў. Калі нарэшце ён павярнуўся сьпінай, на яго нямецкай пілётцы Паліна разгледзела чырвоную зорачку — ззаду, ён чамусьці яе адзеў перадам назад. У двух другіх чырвоныя стужкі — на зімовых шапках. На адным кажушок, на другім сьвітка, ня лепшая, чым Францава. У «немца» варашылаўскія вусікі. (Франц таксама адзначыў: як у фюрэра!) Паліна трымае руку каля рота як бы ад спалоху, але гэта для Франца: падказвае яму, нагадвае, што ён нямы. Пастух калгасны, дурненькі. О Божа, гадзіньнік! Вось яго забыліся зьняць з рукі, схаваць: тоненькі, ня наш, адразу бачна. А яшчэ боты нямецкія! «Немец» прыглядаецца да Франца нейкім паляўнічым позіркам.

— Нямы ён, гэта мой брат, — тут жа затараторыла Паліна, сама адзначыўшы, якім раптам бабскім зрабіўся яе голас.

Прыжмураныя вочы «немца» з вусікамі (ён самы нізкарослы з усіх) не адпускаюць Франца, і той, бедны, стаіць перад ім, як перад начальнікам.

— Адкуль такі? — паказаў на гадзіньнік. — Трафэйны? Боты таксама?

І ўвесь час падкідвае на руцэ Францаву гранату.

— Брат, кажаш? — павярнуўся да Паліны і раптам — да Франца: — Як цябе звалі, калі ўмеў гаварыць? Імя як тваё? Што на яе глядзіш, я ў цябе пытаю? Пакажы гадзіньнік. Замаскіраваўся, толькі б дома адседзецца. На цябе можна пліту мінамётную ўзваліць. Станкач неразабраны.

У адной руцэ ў «немца» Францава граната, у другой ужо і гадзіньнік. Цяпер ён позіркам ацэньвае боты.

— Трафэйныя, давядзецца здаць.

Твар прыдуркавата-строгі — вялікі, мабыць, майстар па трафэях. Яго саўдзельнікі глядзяць на яго таксама цікаўна. Ткнуўшы пальцам у самага пажылога, загадаў Францу:

— Вось зь ім памяняйся.

Ох, і сказала б яму Паліна, калі б не баялася, што разгадаюць, хто такі Франц. Няхай забіраюць усё, абы толькі адчапіліся.

— Ну што ты, як певень перад курыцай, тупаеш? — уляцела і пажыламу партызану ад «Варашылава». — Здымай і мяняйся. Бачыш, хлопец рашыў памагчы народным мсьціўцам! Раз сам не ваюе, няхай паможа.

Разглядае Францаў гадзіньнік ужо на сваім запясьці:

— Во, тут не па-нашаму напісана.

Нарэшце пацікавіўся:

— Вы зь якой вёскі?

— Зь Петухоў.

— Дык вас жа спалілі.

— Гэта мы ведаем.

Усё-ткі зьбянтэжыўся.

— Вы ня крыўдзіцеся. Мы ня ведалі, што вы петухоўскія.

Але чамусьці не вярнуў «трафэі».

# 7

Дзень пачаўся, як звычайна. Прачнуліся ў ранішнім сутоньні густога лесу пад яловым шатром-балдахінам. Па адзін бок таўшчэзнай яліны з падцёкамі смалы ляжала Паліна, акрыўшыся старэнькай з праплешынамі плюшавай жакеткай, па другі, нацягнуўшы да падбародзьдзя вясковую ваўняную сьвітку, — Франц. Змрочнае дрэва паміж імі, як строгі вартаўнік. Парушальнікаў не было: паспрабаваў бы гэты немец яшчэ раз, як тады! Дасюль на шчоках, на лбе ў яго меткі ад кіпцю-

роў Паліны. Весела скардзіцца, што кляшчы на яго дажджом сыплюцца. Во, і на шыі, і за вухам. Паліна паглядзела (пакорліва схіліў каротка голеную галаву), пераканалася: чарнеюць адарваныя галоўкі, скура запалілася. Ня хлопец, а трыццаць тры няшчасьці, гэты Франц. Беды на яго сыплюцца, як гэтыя кляшчы.

У двары спаленага Падабеда, ён жыў ля самай рэчкі, знайшлі лазовую вяршу-таптуху — Паліна навучыла, як лавіць уюноў, Франц натупаў зь дзясятак зьмеепадобных вёрткіх рыбак. А скулаў займеў яшчэ больш — усяго абсыпала. А можа, таму што на зямлі даводзіцца спаць, ночы халодныя? Бялізна з шорсткага вясковага палатна нацерла мяккія месцы, цяпер ён ногі ставіць уроскід, як цыркуль, — здохнуць можна, як ён ходзіць. Сябры Паўла, партызаны, называюць гэта: здагнаў воўка! Добра яшчэ, што ня ные, сам над сваімі бедамі паджартоўвае. Запэўнівае, што абавязкова сваёй мутэр завязе і пакажа: якую бялізну сын яе насіў. «Калі быў у партызанах», — ад сябе дадала Паліна. Франц змоўчаў: мулкае для яго слова, накшталт гэтай бялізны. І насіць немагчыма, і іншага няма, сваю, нямецкую, затаптаў у балоце.

І вось надышоў дзень, якога Паліна і чакала як ратунку, і адчайна баялася. Зь лесу ўбачыла ля свайго двара верхавых на конях, адразу ж пазнала Паўліка, стаіць побач з маці. Зь ім, мабыць, яго разьведчыкі, наязджалі вось так неаднойчы.

— Сядзь і сядзі тут, — загадала Францу, паказваючы на нагрэтае сонцам падгнілае бервяно, — пакуль я не вярнуся. Або паклічу. Толькі не ўцячы! Ня пойдзеш?

— Не пайду.

Ну зусім як разумнага сабаку яна яго ўгаворвае. Але ім не да сьмеху. Франц нейк панік, твар сшарэў.

І Лазарчука пазнала здалёк, ён з Зарэчча, вёска гэтая некалі супернічала зь Петухамі: у каго больш зычныя і шматлюдныя вечарынкі. І трэці нехта зь імі, сядзіць на кані, трымаючы на каленях вінтоўку. Што, што ім расказала мама? Пра Франца. Яна ўгледзела ўжо

на агародах Паліну, што бяжыць да іх, паказвае ў яе бок. Што ім сказаць? Павязуць у атрад, а там што? Ці зь ім гэтак жа будзе, як з трыма нямецкімі афіцэрамі. Самі перайшлі да партызанаў, уцёкшы з Бабруйскага аэрадрому, а датуль працяглы час пастаўлялі атраду розныя зьвесткі, мэдыкамэнты. На машыне прыкацілі, усяго навезьлі. Іх спачатку прынялі з пашанай, нават пісталеты не адабралі. А потым — арыштавалі. Быццам атруту знайшлі. Паліна бацьку давярае, яго спакойнай разважлівасьці, вопыту, ну ня Паўлу ж верыць — такому ж, як сама, школьніку? Для школьнікаў усё адразу ясна. А бацька ўсумніўся:

— Які там мыш'як? Для сябе ампулу зашылі ў каўнер. Не да цешчы на бліны ехалі. А ў нас рады прыдумаць: хацелі атруціць некага, камандаваньне! Адзначыцца трэба было асобаму аддзелу — вось і ўвесь мыш'як. Жывога немца ідзі, злаві, а тут самі ў рукі прыйшлі.

Кінулася брату на шыю.

— Вось што з намі, Паўлік, зрабілі, пабілі, папалілі!

— Бачу! — які ж ён стаў худы, вочы ўваліліся, рука падвязаная. Зморшчыўся: Паліна неасьцярожна кранула яе.

— Паранілі цябе?

— Ды ерунда!

У яго ўсё глупства, драбяза. Раптам прыкінула: а яны, бадай, аднагодкі з Францам, васямнаццаці няма.

— Донька, дзе вы там ходзіце? А ён дзе? — спытала Кучарыха.

Сказала, расказала пра Франца, пра немца!

— Ну дзе твой фрыц? — пацікавіўся Павал.

Лазарчук, што стаяў ля каня, глядзіць дапытліва. Вочы незнаёма жорсткія. Аброс так, што і хвацкія бакенбарды яго зьніклі. Як часнык у лебядзе ў дрэннай гаспадыні.

— Ой, мама! — Паліне чамусьці лягчэй сваю нечаканую выдумку-хлусьню паведамляць усім праз маці. — Забралі Франца! Нейкія зь ня ведаю якога атраду. Заб-

ралі гадзіньнік, боты, а як пабачылі шкарпэткі з блакітным паяском: «А, немец!» І павялі. Я ўжо ім і пра тое, як ён нас выратаваў, што ён не забіваў, не паліў, — не паверылі, забралі. Ня ведаю, што зь ім зробяць.

— А што зь ім рабіць? — глуха вымавіў Лазарчук. — Ясна што.

— Ён жа нас ад лютай сьмерці... — узмалілася Кучарыха.

— Дайце, маці, за зло расквітацца. А ўжо затым астатняе, — абарваў яе Лазарчук.

Умяшаўся Павал:

— Мы вас, мама, з Палінай забяром у атрад, калі назад паедзем. Што вам тут цяпер заставацца? Праз пару дзён. А то яшчэ карнікі вернуцца. У нас тут у яме бялізна ёсьць, хлопцам, ды і мне — пераапрануцца. Завашывелі.

— А як жа! І сала, і сухары. Вось Паліна, злазь, дачушка.

А празь нейкі час брат непрыкметна адвёў Паліну ўбок.

— Дык, кажаш, павялі?

— А вы б што зь ім? А, Паўлік?

— Ня ведаю, як у атрадзе. Вунь у Лазарчука ўсю сям'ю выбілі, нікога не пакінулі. Ох, і палітыкі вы з мамай! Калі недалёка павялі яго, няхай ён ідзе. Раз вы кажаце, што ён такі.

— Дык ён забіў немца, яму нельга вяртацца!

— Ну ня ведаю.

## 8

Воддаль, над лесам, а часта і проста над спаленай вёскай пралятаюць самалёты. Франц, прыхіліўшыся да дрэва, з хлапчукоўскай дасьведчанасьцю абавязкова паведаміць марку: «мэсэршміт», «фокевульф», Паліна ў такія хвіліны раўніва заўважае, як позірк яго на час

некуды аддаляецца, затуманьваючыся. Гэта ягоная Германія лётае. А сам жа ад яе хаваецца і больш за ўсё баіцца, што яна яго адшукае. Маці таксама ўсё часьцей адыходзіць у сваю далеч, усё менш у яе размоваў з жывымі, яна цалкам — зь нябожчыкамі.

— У сьне прыходзяць: «Што ж ты нас, Кучарыха, нашы белыя косьці зямелькаю не прысыплеш?» Трэба ім, дзеткі, магілкі выкапаць.

Цяпер Паліна з Францам ходзяць усьлед за ёю, закопваюць тое, што яна сабрала на пажарышчах. З рыдлёўкай, з кашом пераходзяць з двара ў двор. Франц на агародзе рые невялікую, але як мага глыбейшую яму («Каб, дзеткі, не адкапалі іх ваўкі, сабакі не расьцяггвалі»), Паліна, сабраўшы ў кош тое, што засталося ад сямейкі, нясе да ямы — закопваць. Перад гэтым магілку высьцілаюць расквечанымі галінкамі з гаспадаровай ігрушкі ці вішанькі, прысыпаўшы, Франц спэцыяльным валікам з круглага паленца выціскае на вільготным пяску крыж. Моўчкі перахрысьціцца, і Паліна таксама. Няпраўдай было б сказаць, што яна раней ніколі гэтага не рабіла. Гэта яе таямніца, салодкая і саромная. І не набожнасьць у ёй тады прачыналася, а, бадай, нешта зусім іншае. Спачатку яна рабіла гэта ў гумне, на таку, што соладка пах нагрэтымі снапамі, сенам. Зладзейкавата пракрадалася туды, станавілася наўколенцы на зацьвярдзелую гліну і пачынала шчыра хрысьціцца і класьці паклоны. Перад гэтым пасьпешліва і груба мазала вусны памадай, падоранай ёй дачкой лясьнічага Эвірай, хвалюючы пах нецяперашняй, чаканай жаночай долі дадаваў сораму і забароненасьці. Зойдуць і пабачаць, і што ты будзеш казаць? Стала гэта рабіць у хаце, перад маміным абразком, і менавіта тады, калі нехта блізка быў: на кухні ці за вакном гамоняць маці з суседкай або з бацькам — вось-вось зойдуць! Нават у школе рызыкавала гэта рабіць, калі ўсе пабягуць на перапынак (у той жа Эвіры спэцыяльна дзеля гэтага выпрасіла маленькі авальны абразок) — вось дзе пачуцьцё сорму і забароны было са-

мае вострае. Забягуць, пабачаць — пасьля гэтага жыць стане немагчыма. Толькі памерці!

Успамінала яна цяпер пра гэта? Куды ад памяці схаваесься? Але цяпер нават сьмерць ня дужа хвалявала, больш пужала — грубай прастатой і канчатковасьцю. Гэтыя паўсатлелыя косткі нядаўна жывых знаёмых ёй баб, мужчын, дзіцячыя, яны пазбаўлялі цябе ўсякай надзеі. Кладучы крыж усьлед за Францам, але справа налева, як мама хрысьціцца, як гэтыя некалі хрысьціліся (хто старэйшы быў і чые косткі перад вачыма), Паліна толькі адгароджвала сябе ад памерлых, набліжэньня не адбывалася. Хаця нават у Франца, чужога тут, яна бачыла, было інакш. Што ж яна за вырадак такі? Вось тады — незразумелая страсьць шукаць саромна-забароненае (і дзе, у чым?!), а цяпер — натужная няздольнасьць далучыцца да нечага, што яна ўжо ведае: ё с ь ц ь , ё с ь ц ь , і с н у е, але ёй пазнаць ня дадзена.

— У вас у школе маліліся? — спытаў раптам Франц.

— Не, вядома! — Паліна чамусьці пачырванела.

— І ў нас таксама: вядома! Але бацька і асабліва мутэр — вельмі веруюць. Фюрэра яны толькі баяцца. У вас мала цэркваў, дзе ў вас вянчаліся (ці як гэта)?

— У сельсавеце.

— Гэта... а, муніцыпалітэт! Каля пня? Старажытныя германцы так рабілі. Ці гэта гістарычны жарт, ня ведаю.

Аднойчы раньнім сьвітаньнем Паліна ўбачыла, што Франц ходзіць па папялішчы яе хаты, уважліва разглядвае ў сябе пад нагамі, нешта шукае. Мабыць, косьці Ота хоча і баіцца пабачыць.

Кучарыха «з працы» звычайна ішла, не аб'яўляючы пра гэта Паліне, Францу: зьнікала і ўсё, прыходзілі ў свой двор, а яна ўжо там, варыць вячэру ці сьпіць, загарнуўшыся ў калгасную сваю целагрэйку.

На гэты раз чамусьці разьвіталася. Падышла.

— Ну я там сабрала, і там, і там. Я пайшла — пахавайце.

Паліну потым мучыла памяць, здагадка: яна сказала «я пайшла — пахавайце!» Ведала, што зараз ляжа і памрэ? Калі яны з Францам вярнуліся «дахаты», Паліну ўразіла, як па-дзіцячы сьпіць яе маці. Ірваныя свае салдацкія чаравікі акуратна паставіла ля галавы (бацька заўсёды сьмяяўся з Паўла, калі ён так рабіў па сялянскай звычцы), руку паклала пад шчаку, босыя ногі, падціснуўшы, схавала ў даўгой сваёй спадніцы. Гаманілі ўпаўголасу: няхай пасьпіць. Згатавалі вячэру, сталі будзіць, а яна...

Паліна не крычала, ціха і безнадзейна цяклі сьлёзы, усё рабіў, што трэба, Франц. У гэтай вёсцы столькі сьмерцяў, што закрычаць (а так хацелася!) было страшна: як у гарах з навіслым сьнегам і лёдам.

На мёртвым твары зноў узьнікла, як бы праяўленая сьмерцю, маміна ўсьмешка. Толькі тут скеміла Паліна, чаго нетавала ўсе апошнія дні, тыдні. Усё жыцьцё, колькі Паліна сябе памятае, поруч быў немалады твар зь нязьменнай добрай усьмешкай, ласкавымі рысамі, што так спалучаліся зь пявучым «маміным» голасам. «Алтайскі галасок у нашай мамы, ведаеце, якое ў гарах рэха!» — любоўна казаў бацька. І яшчэ: «Мама наша ў дзяцінстве подмазку зьела, заўсёды ўсьміхаецца, праўда, дзеці?» Ён прывёз маму зь Беламорканалу, з ссылкі, бо яна — «з кулакоў». Простыя бацькавы словы пра гэта калісьці пужалі Паліну, патрабавалі іншых, а ня тых, што ў яе да маці, пачуцьцяў. Яны вершаў, паэм столькі завучвалі пра Паўліка Марозава. Свой жа Паўлік, здавалася, не перажываў, нават калі бацька, выпіўшы (рэдка, але здаралася), абзываў сябе з выклікам: «шкоднік», «вораг народу». Мама яго тады старалася адвесьці ад дзяцей, пакласьці спаць. Як з гэтым было справіцца дзіцячай душы, зыбістай сьвядомасьці? Павал спраўляўся лёгка. А можа і ня так, проста характар у яго мужчынскі. («Крэмень наш Павал», — казаў бацька ці то жартам, ці то ўсур'ёз). Паліна ж ня раз начамі, плачучы, перапісвала маме і бацьку біяграфію. У яе

фантазіях бацькі былі тыя ж самыя, з мамінай заўсёднай усьмешкай, бацькавай рэзкай гарачлівасьцю, але на Беламорканал яны езьдзілі па камсамольскай пуцёўцы, і, наогул, усё, як у кнігах і ў кіно.

На агародзе каля старой ігрушы Франц капаў магілу Кучарысе. Прыкідваў, з чаго зрабіць труну. Ні дошак акуратных няма, ні інструмэнту. Капаў і ў думках абыходзіў двор за дваром, усю вёску, прыгадваючы, што і дзе бачыў. Пайшоў шукаць дошкі, а калі прынёс патрэбнае (нават зламаную пілу патрапіў, паўабгарэлую сякеру), пабачыў, што Паліна пабывала ўжо ў схованцы-склепе і дастала шэры валік саматканага палатна. Моўчкі, кожны сабе, рабілі. Франц толькі сачыў увесь час, ці ня трэба памагчы. Прынёс з калодзежа вады, калі Паліна, падышоўшы да ямы, пастаяла, як бы што забыла і ўспамінала:

— Я сама абмыю, хоць крыху.

Бацька можа і не ўхваліць, што не на могілках, а проста на агародзе будзе пахаваная. Але і суседзі так — кожны ў сваім садзе. Уся вёска цяпер могільнік. Хату яны самі будавалі, бацька з маці. Вось так разам рабілі, як Франц з Палінай, але зусім-зусім іншую працу рабілі. Паліне, што ведала іх, лёгка ўявіць, як радаваліся адно аднаму і таму, што робяць. Асабліва пасьля гэтага Беламорканалу. Хату ставілі, нарадзілі Паўла, тут жа неўзабаве — Паліну, працавалі ў калгасе, бацька рахункаводам, мама — «куды пашлюць», дзеці сямігодку канчалі, і тут зноў забралі бацьку. Перад самай вайной. У школу хоць ты не хадзі, але Павал не адступіў, цягнулася ўсьлед за ім і Паліна, а там дырэктрыса-гістарычка тлумачыла дзецям: у такім вось выступленьні таварыша Сталіна тое і тое, усё што ён калі-небудзь сказаў — вернае назаўжды. Вось і пра рахункаводаў. Ворагаў трэба ўмець распазнаць пад любым абліччам, маскай: кулак не абавязкова зь бярданкай або абрэзам пад крысом. Ён можа з бухгальтарскіх касьцяшак стрэліць. Як сказаў таварыш Сталін. Сядзіць сабе такі ў калгаснай канторы і шчоўк-

шчоўк, як з-за вугла. Нашчоўкаў і, калі ласка: каровы зь бяскорміцы дохнуць, сьвіньні і куры ад чумы, зерне мокне, гніе, на працадні — грамы.

Вясковыя «лічыльнікі» бацькі з жоўтымі касьцяшкамі чамусьці не забралі, калі быў вобыск, яны дачакаліся ягонага звароту з турмы. Калі вайна пачалася. Прачнулася ноччу Паліна ад спалохана-шчасьлівага крыку маці:

— Дзеці! Дзеці!

Затым усе дружна грэлі ваду, памагалі бацьку мыцца, як немаўля, паставілі яго ў балею — вялізную і нізкую — і палівалі вадой, намыльвалі, церлі вяхоткай. А ён зусім не саромеўся свайго голага цела, неправўдападобна худога, адны косьці. Шапялявіць стаў, зубоў пярэдніх няма. Маці са страхам пытала:

— Што ў цябе са сьпінай? Па ўсім целе — што гэта за шнары?

Спачатку бацька нічога не расказваў. Што т а м было, як ён вызваліўся. Вайна ішла, зь лесу сталі наведвацца «акружэнцы», хутка гэтае слова было выцесьнена іншым: «партызаны». У бацькі нейкія справы зь імі пачаліся, адразу ж. Некуды іх вадзіў, зьнікаючы нанач, а то і на некалькі сутак. Аднойчы загаварыў:

— Паслухайце і забудзьце. Невядома, што яшчэ нас чакае ў жыцьці. Але хачу, каб вы ведалі ўсё.

Пра тое, як у менскай турме білі, выбівалі зубы і «прызнаньні» ў шкодніцтве, затым нейкага «пісьменьніка» прыплялі, мабыць, ён ім быў патрэбны больш, чым сам Кучэра. Раскажы, як прыяжджаў чытаць вершы, а сам вэрбаваў для польскай дэфэнзывы, ахранкі! Пра тое, як гэты «нацдэм» падбіраў людзей для сувязі з замежжам. А тут — вайна, Менск сталі бамбіць, турма трэслася ад грымотаў. Па Маскоўскай шашы ўцякалі гараджане, сьледам вялі «ворагаў», некалькі доўгіх калён, у аховы чырвоныя пятліцы, такія ж аколышы фуражак, вінтоўкі з даўгімі рускімі штыкамі. І гэтыя штыкі вартуюць цябе, радзіму ад цябе ахоўваюць. А немец лупіць

зьверху, і ты ўжо нібыта зь ім супроць сваіх. Спрабавалі ўгаворваць канвой: адвядзіце нас у ваенкамат, здайце ў армію, ваяваць зь немцам хочам. Заткніся, варожае адродзьдзе! Але вось выстраілі арыштаваных у шарэнгу, самі насупраць зь вінтоўкамі, кулямёты на зямлі: нейкі загад зачытваць будуць. Маёр-энкавэдыст трымае ў руцэ паперку, дачакаўся, пакуль усіх падраўнялі, усе падрыхтаваліся, і, гледзячы ў паперу сваю: «Аго-онь!» А тут якраз наляцелі самалёты.

— Я ляжу сярод бульбянішча, скашу вочы — крыжы над галавой равуць і адтуль стракочуць. Хто яшчэ жывы, бегчы спрабуе, па тых — энкавэдэшнікі. А адзін, бачу, падбег, штыком на суседа замахваецца, як я нагамі даў яму між ног, аж узвыў. Падскочылі мы і наўцёкі, а збоку бачу: энкавэдэшнік стаў над жанчынай, на абедзьве рукі нагамі, ды я-як штыком ёй у грудзі ці жывот! З усяго маху — жанчыну!

Так забівалі царскую сям'ю (сьведчаньне забойцы):

«... Арыштаваныя ўжо ўсе ляжалі на падлозе, сьцякаючы крывёю, а насьледнік усё яшчэ сядзеў на крэсьле. Ён чамусьці доўга ня падаў з крэсла і заставаўся яшчэ жывы. Упрытык пачалі яму страляць у галаву і грудзі, нарэшце і ён зваліўся з крэсла. Зь імі разам быў расстраляны і той сабачка, якога прынесла з сабой адна з дачок...

Ермакоў, бачачы, што я трымаю вінтоўку са штыком, прапанаваў мне дакалоць, хто застаўся жывы. Я адмовіўся, тады ён узяў у мне з рук вінтоўку і пачаў іх даколваць. Гэта быў самы жахлівы момант іх сьмерці. Яны доўга не паміралі, крычалі, стагналі, ператоргваліся. У асаблівасьці цяжка памерла тая асоба — дама. Ермакоў ёй усе грудзі скалоў. Удары штыком ён рабіў так моцна, што штык кожны раз глыбока ўтыкаўся ў падлогу» (Стракоцін).

«Апошняй сканала, каторая абаранялася падушачкай, што знаходзілася ў яе ў руках... (Пакаёўка царыцы Дзямідава). Малодшая доч б/цара ўпала на сьпіну і пры-

таілася забітай. Заўважаная тав. Ермаковым, яна была забітая стрэлам у грудзі. Ён, стаўшы на абедзьве рукі, стрэліў ёй у грудзі» (Нятрэбін В. Н.)*.

## 9

Вырашылі пайсьці зь вёскі — са сьмерцю Кучарыхі, здавалася, яна памерла канчаткова — і пасяліцца ў лесе, куды не дабраліся б ні немцы з паліцаямі, ні партызаны. А як знайсьці такое месцайка? Даганяючы, перасьледуючы, уцякаючы і хаваючыся адно ад аднаго, яны бясьпечных мясьцін на гэтай зямлі не пакідалі.

Але пашанцавала. У густым непраглядным ельніку (праўда, прасека блізка) набрылі на закінутую зямлянку. Мяркуючы па тым, як парасьлі, пакрыліся грыбамі і чагай бярвеньне і жэрдкі, а бляшаная бочка-«буржуйка» афарбавалася ў охру іржы, тут даўно ніхто ня жыў. Магчыма, з восені-зімы 41-га, калі акружэнцы-партызаны таіліся ў лясах, выходзілі адно здабываць харч. Часам абстрэльвалі нямецкія машыны.

Прыбралі з нараў гнілое гальлё, высьцелілі ложа сьвежым ельнікам і бярозай. Франц сякерай, якую з сабой прыхапілі, насёк сухіх дроваў — падрыхтаваліся жыць доўга. Па лесе распоўзься дымок, а зь ім і трывога: каб ня ўнюхаў хто. Пакуль сушыліся іх апраткі, сядзелі пад дрэвамі. Франц сказаў:

— Добрая чалавек твая мутэр. Паказаць маю?

Запусьціў руку пад кашулю, на далоні ў яго зазіхцеў мэдальён. Як гэта ня ўгледзеў той, «трафэйшчык»? Шнурок засмаліўся, брудны, а золата зіхціць, як жывое. Падкалупнуў пазногцем, і паказалася фатаграфія. Паліна наблізіла свой твар, на яе глядзіць строгая чужая жанчына з акуратна ўкладзенай прычоскай. Франц вытрас сабе на далонь фатаграфію, перавярнуў яе.

---

** З кнігі Алега Платонава: Убийство царской семьи. — Масква: «Сов. Россия», 1991.*

— Тут напісана: «Ich werde dich Schützen». Я цябе (як гэта? Ага!) абараню». Усім ім так здаецца.

Франц доўга і няскладна тлумачыў, што насіць гэта рызыкоўна, а замазаць нямецкі надпіс будзе нядобра, а таму просіць Паліну забраць і захоўваць, пакуль яму зноў можна будзе...

Паліна ня ведала, як тут ёй быць. Нібыта яна прысвойвае права, не спытаўшы ў той жанчыны, трымаць на грудзях яе фатаграфію. Нейк няёмка перад ёю, што далёка жыве. Пацерла зіхоткае золата між далоняў, заадно і шнурок, і спусьціла халоднае сардэчка пад кашулю. Памяць яе міжволі сьцялася: чамусьці прыгадаўся Эвірын круглы абразок...

— Аўтаматная чарга! — Франц насьцярожана ўзьняў галаву. Далекавата, але чаму разрыўныя кулі паўтарылі яе зусім побач, у кустах за зямлянкай?

— Гэта ж салавей! — засьмяялася Паліна. — Як будзе па-нямецку?

— Nachtigall. Нікому толькі не расказвай, што Франц ужо...

Пакруціў пальцам ля скроні.

— Не, праўда, падобна, — супакоіла Паліна, — во, ну зусім, як кулямёт. А цяпер палошча горла. І да вайны сьпявалі салаўі, але нікому ў галаву не прыходзіла такое.

— Многае не прыходзіла, — згадзіўся Франц. — А ў вашай школе...

І пайшлі разьбіраць сьценку няведаньня адно аднаго — і таго, і другога, і трэцяга няведаньне. Як у вас? А ў вас як? Выявілася, што многае вельмі падобна: дзяўчаты больш разумеюць хлопцаў, чым тыя іх — што ў нямецкім Дрэздэне, што ў беларускіх Петухах. І так жа аднолькава жывуць у вечным супрацьстаяньні жаночай часткі школы і мужчынскай, але здраднікаў свайму племені больш сярод дзяўчат. Вось была ў дзясятай клясе Клаўка, дзеўка ніякая зь сябе, у яе і хлопца свайго не было на выпускным вечары, дык старшаклясьнікі потым

расказвалі: яна столькі пар разьбіла, разьвяла за адзін той вечар! Нават у каго справа ішла да вясельля ўжо. І чым узяла, ты падумай! Тыя, нявесты, трымалі сваіх хлопцаў на адлегласьці: пацалунак яшчэ можна, а больш — ні-ні! — гэта каб давесьці іх да вясельля. Вам жа толькі саступі і — адз'ю! Гэтая нахабніца ўсім дала ўрок: танцавала з хлопцамі з усімі запар і ўсе яе наперабой запрашалі — прыціскалася, бессаромная, глядзела так, што кожны паверыў: сёньня ён усё і атрымае, калі зь ёю пойдзе. Ну як апаіла зельлем! І пакінула дурнямі. У нявест пасьля гэтага вечара разлад з жаніхамі, у некаторых назаўсёды — адпомсьціла за ўсе дзесяць гадоў няўвагі.

Паліна задала тон, Франц вось гэтак жа асуджальна загаварыў аб лёгкіх, проста-ткі сьвінскіх норавах сярод хлопцаў, захапіліся, ажно дыханьне стала гарачым і ў яе, і ў яго, здавалася, цяпер ужо ня змогуць стрымаць сябе, зблізяцца рукі, вусны, але што вы, як цяпер гэта магчыма?! Пра што толькі што гаманілі?.. Як асуджалі! Як абураліся! Зьбянтэжана змоўклі Паліна з Францам, адчуўшы сябе падманутымі кімсьці: назьдекаваўся і глядзіць на іх збоку, каб гучна зарагатаць пры першым іх дотыку. Расчаравана паляжалі і заснулі кожны на сваім месцы — прыблізна за мэтар адно ад аднаго. Але дзяўчына ўсё-ткі сказала «на расстаньне»:

— На новым месцы прысьніся жаніх нявесьце.

Аднак сказана было гэтак іранічна, што Франц так і не адважыўся працягнуць у яе бок руку. Помніць, бедалага, кіпцюрыкі!

Перш чым заснуць, Паліна шмат наўспамінаць пасьпела. Віру прыгадала. Вось яна б ведала, як распарадзіцца і сабой, і Францам.

Жыла гэтая сям'я, як уяўлялася петухоўцам, «бы паны». А імя Віры — ад Эвіры, што азначае: Эпоха Войнаў і Рэвалюцыяў. Імя ёй такое дала маці, тая самая дырэктрыса-гістарычка.

Бацька Віры (пакуль і гэтых не перасаджалі) пра-

цаваў лясьнічым, гаспадарка яго была ледзь не з паўраёна, дзясяткі лесьнікоў у яго распараджэньні, і лес з грыбамі-ягадамі, і трава на палянах, і дровы. Усё, чым у лясным краі люд жывы. Прасторнае лясьніцтва разьмяшчалася наводшыбе вёскі, за высокай дашчанай агароджай, дзе стаяла вялізная кантора, раздольны дом лясьнічага, высокія, з моцнага дрэва, цёсу, гаспадарчыя збудаваньні. У лясьніцтве было некалькі коней, добры выезд. Усё не як у рваным-гнілым калгасе: што збруя, што вазок — кашоўка, коні — воч не адарваць! Нават свая сажалка была за той высокай агароджай, а зімой — каток для Віры і яе сяброў. Але сяброў у яе было няшмат. Гэта яшчэ трэба было заслужыць. І перш за ўсё — непадобнымі на агульныя паводзінамі, сьмеласьцю ведаць тое, чаго іншыя ведаць баяцца. Сама яна была і разумніца, і красуня. Чытала шмат, але галоўнае — пра ўсё ў яе было сваё меркаваньне. І сапраўды — анічога не баялася. Так здавалася Паліне. Аж галава кругам ішла поруч зь ёю. Я сама сабе кніга, любіла паўтараць. І паведамляла, што падумалася, што адчулася — чаму? як так? — у такіх вось і такіх вось абставінах. Аднойчы бацька — вусаты, чарнагрывы прыгажун — яе проста высек. «Зь цікаўнасьці», як сама казала, падпаліла капу сена проста ў двары. Дык вось: «Ён мяне пугай, пугай, так спужаўся пажару, а я ў гэтыя хвіліны любіла яго больш, чым калі-небудзь. Да сьлёз».

З Палінай яны, забраўшыся на сенавал, пад ластаўчына цьвірканьне, чыталі, дзяліліся сакрэтамі, спалі, летуцелі, як наладзіцца іх жыцьцё. Аднойчы Паліну папярэдзіла:

— Я паклікала Косьцю і Бубліка. Выбірай, каго хочаш.

— Навошта яны мне?

— Што, трусіш? Мы ж дамовіліся.

— Ну гэта мы так.

— Так ці ня так, а я іх запрасіла. Сказала: прыходзьце зь цікавымі кніжкамі.

Яны і прыйшлі з кніжкамі, Бублік, той дурань-дурнем, а школьны прыгажун Косьцік (хутчэй па спалоханаскаваных паводзінах Паліны, чым з выклікам — Віры) зразумеў, што ўсё ня так сабе. Дурыліся, валтузіліся ў сене, усё больш распальваючыся і дазваляючы сабе ўсё больш. Пакуль Паліна не зазлавала і не ўцякла да вакенца, адштурхнуўшы Бубліка. Той вінавата пацягнуўся сьледам. А Віра з Косьцікам нейк незразумела і *страшна* аціхлі. Глянула Паліна ў паўзмрок сенавалу і ўбачыла голае, высока ўзьнятае калена Віры і бессэнсоўнае нейкае гойданьне сьпіны ў блакітнай майцы, сьпіна гэта здалася такой *мужчынскай*, агіднай. Разгублены Бублік паглядзеў на Паліну, яна затрымлівала яго вочы бессэнсоўнай усьмешкай, абы ён не павярнуўся, не паглядзеў *туды*. (Але абое *чуюць*: глядзяць адно на аднаго і чуюць.)

З гэтага дня Віра ўзьненавідзела Паліну. А аднойчы на зімовым катку, калі Косьця, які хадзіў цяпер за ёй, як галодны сабака, прывязваў канёк да яе стройнай нагі, Віра з раптам скажоным ад агіды і нянавісьці тварам з усяе сілы ўдарыла яго проста пад бараду, так што ён адваліўся на сьнег.

Калі Вірынага бацьку таксама арыштавалі (пасьля вэтэрынараў узяліся за лесьнікоў), сям'ю выгналі з-за дашчанай агароджы, і яны з маці некуды выехалі, як згінулі.

Раніцой Паліна і Франц прачнуліся чамусьці незадаволеныя сабой і адно адным. Але хутка гэта мінула, ім сапраўды цікава было разам. І вось так — удваіх. Вось, калі ласка, жылі кожны далёка ад другога і зусім нібыта інакш, але столькі агульнага ў іх. Гэтая прасьценькая думка чамусьці хвалявала.

— Хутка ў цябе каўтун будзе! — ускалмаціўшы валасы Франца, сказала Паліна. Ён толькі што памыў іх у зарослай альхоўнікам і асакой рэчцы, і яны ляжалі на траве каля разваленага мастка, адпачывалі. Франц у не-

дарэчнай на ім, кароткай яму бялізьне з суворага палатна, што нямала памучыла яго беднае гарадзкое цела, але ўжо разьмякчэла ад носкі і частага акунаньня ў ваду, чамусьці не саромеецца Паліны — як не саромеўся б, мабыць, апранахі клоўна. Ну а Паліне проста весела на яго, такога, глядзець.

— Ты сказала: каўтун? — мабыць, Франц нешта прыпомніць намагаецца.

Поруч на траве зіхцяць зьмейкамі вёрткія ўюны, вылаўленыя ў балотнай затоцы, дзе вада цяплейшая, Паліна зь дзіцячай несьвядомасьцю жорстка пляскае іх далонькай.

— Нашы палешукі некалі наогул ня стрыглі валасоў, — паведамляе Паліна.

— Як сікхі.

— Хто гэта?

— У Індыі каста такая. Па тры мэтры валасы адрошчваюць.

— Ну нашы менш, але таксама. Лічылася: зрэжаш — захварэеш. У каўтуне ўсе хваробы.

— Ой, чакай, успомніў! Багіня Мэб. У яе крылы з камарыных хмараў, зь ледзь прыкметных мошак. Яна хвасты коням заплятае начамі, багіня Мэб. А людзям каўтуны робіць. У Шэксьпіра, ведаеш, «Рамэо і Джульету»?

Джульету на школьнай сцэне Віра іграла, Паліна помніць белы твар, перадсьмяротны грудны голас. Паўтарыла перад Францам:

— Чакай мяне, Рамэо! І я з табой, я іду да цябе!

І «закалола» сябе «кінжалам».

— Здаецца, яна п’е атруту? — запярэчыў Франц.

— А ты што, носіш з сабой? — міжволі спытала, прыгадаўшы тых нямецкіх афіцэраў.

— Нядрэнна б. Гранату канфіскавалі.

Калі да зямлянкі ішлі, убачылі на бярозавым кусьце дзіўна завіслую варону. Глядзіць на іх з жахам, паварушылася і засьлізгала па лісьцях, ледзь стрымалася на

ніжняй галінцы. Хворая? Ці гэта ўжо так падрасьлі птушаняты, зь неасьцярогі вывалілася каторае з гнязда. Не заўважылі, а ўжо нахапілася лета. Лес пацяжэў ад лістоты, елка выкінула сьвежыя зялёныя (тут жа пачынаюць жаўцець) стрэлкі. А салаўі запускаюць свае трэлі-чэргі і ранкам, і ўвечары. Зьявіўся ў лесе майстар, і ўсе астатнія сьпевакі цягнуцца, падладжваюцца пад яго, стараюцца з усяе сілы, каб і ў іх ня горш атрымлівалася. А тут яшчэ нябачныя жабоцькі на ўсё наваколье паведамляюць:

— Я-ак до-обр-ра-а, соладка!

Калі Паліна міжволі пацягнула руку, каб памагчы вараняці, яно са страху — дзе і сіла, і ўменьне ўзялося — узьляцела і села на ніжні сук сіратліва, у яловай засені выраслай бярозы. Гайданулася, каб ня ўпасьці, умацавацца. І ўхапілася атрасаць вільгаць роднага гнязда, саскрабаць дзіцячую ліпучку зь пер'я, прапускаючы празь дзюбу то адно, то другое крыло. Усім добра. А што людзям дрэнна, дык хто ў гэтым вінаваты, калі не яны самі?

Павячэралі бульбай і падсмажанымі на распаленай блясе ўюнкамі (Франц запэўніваў, што нічога больш смачнага ня еў, будзе мутэр сваёй расказваць).

На гэты раз спаць уладкаваліся моўчкі, як бы баючыся словаў, яны адно перашкаджаюць. Расьсьцялілі Францаву вясковую саматканую сьвітку — гэта пад ніз будзе, акрыцца — плюшаўка Паліны. Усё бяз словаў, і быццам заўсёды так вось спалі і нічога асаблівага няма.

— Холадна табе?

— Крыху. Я бачу, і табе таксама холадна.

— Беднае варанятка. З гнязда выпала.

— Цікава, якія цяпер у муці сны? Яна любіць іх пераказваць, і мы абавязаныя слухаць, як урадавую зводку. Крыўдзіцца. Вярнуся калі, яна мне іх абавязкова раскажа.

— Табе ж холадна. Акрыйся добра. Сьпі, сьпі. Ня дыхай так! Чуеш, ня дыхай так!

Хацела адсунуцца, а ён спалохана і вінавата аціх.

Беднае варанятка! Працягнула сама да яго ў цемры рукі, ён прыціснуўся да іх гарачымі шчокамі, прыціснуўся да яе, як схаваўся. Такі бездапаможны, такі разгублены... Калі боль пранізаў яе і, галоўнае, спалох, што гэта ўжо адбылося, здарылася (падкраўся, гад!), яна адштурхнула яго зь сілай, якой сама не чакала!

— Зьвер! Фашыст! Фашыст пракляты!

— Я ж цябе кахаю, Паліна.

— Воўк — кабылу! — і зарыдала.

Печка выгарала, згасла, у зямлянцы няўтульна, сыра, пах закінутасьці і нейкай безвыходнасьці. За дзіравым акенцам насьмешлівы, зьдзеклівы хор жаб. Загарнуўшыся ў свой плюш, ціха ўсхліпвала Паліна. Аціхлы, быццам і няма яго тут, ляжыць Франц. Ён, здаецца, мацней за яе аглушаны тым, што здарылася. Ціхенька ўстаў, разьдзьмуў у печцы агеньчык, падкінуў дроваў. Пад смалістае пастрэльваньне агню заснуў.

Крык уварваўся ў расчыненыя дзьверы:

— А ну выходзь! Фэрфлюхтэр, мацъ вашу!

І проста над галавой — у акенца:

— Кідаю гранату! Язьві вашу душу: выходзь!

Гэта маміна «язьві» падзейнічала асабліва паралізуюча.

— Ой, дзядзечка, ня трэба, мы вясковыя!

Адштурхнуўшы Франца, выйшла, выбегла першаю, папярэджваючы крыкам:

— Там брат, ён нямы, зусім нямы!

Плямісты нейкі чалавек (плашч-накідка і голеная галава — усё ў яго ў плямах) адкінуў Паліну:

— А мы зараз пабачым.

І Франца аўтаматам адштурхнуў убок:

— А ну, выпенцюх! Хто яшчэ там?

— Нікога, паночак, толькі мы! — сьпяшае адказаць Паліна.

— Правер, — загадаў плямісты другому ў такім жа плашчы, але ў гэтага на галаве нямецкая каска.

— Бач, бандыцкія морды! — нядобрымі вачыма разглядвае голенагаловы злоўленых. — Хочаце пабачыць беларускую птушку бусла? Пакажам вам, сталінскія бандыты!

І ўжо да сваіх, чалавек шэсьць іх, жалезнагаловых.

— Мала было Сталіна гэтым бульбянікам, не нацешыліся калгасамі. Вы за што гэта ваюеце?

— Мы цывільныя, дзядзечка, брат, ён нямоглы зусім, хворы, — галасіла Паліна, а сама думала: ня горш за бабку Адарку, яна карміласяя тым, што аплаквала нябожчыкаў. Адно каб Франц ня ўздумаў памагаць.

А плямістагаловы ўсё шукае, да чаго прычапіцца. Вось ужо свой яму не дагадзіў:

— Іваноў, ты куды? У кусты ўсё цягне? Ой, глядзі! Можа, як Валошын рашыў? Бяжыце, бяжыце, вас бандыты прылашчаць!

— Скуль ты ўзяў? — агрызнуўся ўласавец у акулярах (Паліна ўжо разумее, хто гэта). — Чалавеку пасц... нельга?

Франц жа пра сваё ўсё думаў, трывожыўся: на просецы адразу ж убачылі немцаў. Некалькі афіцэраў у такіх жа плашч-накідках, але высокія фуражкі на іх, а ня каскі і не пілёткі. І галоўнае, глядзяць так — яны і астатнія на іх, — што адразу разумееш: самыя вялікія начальнікі — гэтыя.

Франц з усяе сілы стараецца не спужацца, не прыцягнуць іх увагу. Але ўсё-ткі гэта былі першыя немцы пасьля ўсяго, і сам ён ня мог не перажываць наймацнейшых пачуцьцяў, дзе былі ня толькі трывога, страх, але і шчымлівы боль за сябе, за свой вось так пакручаны лёс.

— Warum grinzt er?* — спытаў раптам афіцэр. Пра што гэта ён?! Няўжо пра Франца? — глядзіць на яго. Ну вось. Ну вось, зараз усё і адбудзецца, здарыцца! А калі знойдуць мэдальён у Паліны: нямецкі, адкуль?! — а калі яна ня вытрымае? Як умеюць дапрасіць чалавека,

---

* *Чаму ён пасьміхаецца? (ням.).*

каб дазнацца пра ўсё, — для Франца не сакрэт. Тут прыйшоў страх ужо не за сябе — за Паліну. Скеміў, як дарагая яму гэтая наравістая істота!..

Падобна, перакладчык, што стаяў поруч з афіцэрам, спытаў у рускага:

— Хто яны?

— Нямы, — ахвотна растлумачыў той і дзеля перакаанаўчасьці пальцам пакруціў каля сваёй скроні, — калгасьнікі. Усе яны тут бандыты.

Раптам занепакоіліся ўсе, па-нямецку, па-руску прагучала папярэджаньне: сысьці з просекі, у лес, наперадзе нейкія людзі! Бяжыць па просецы нехта, апрануты па-вясковаму, але па тым, як ён бяжыць, а ўсе чакаюць яго, зразумела, што ён свой, мабыць, сувязны, разьведчык. Дабег, запыхкаўшыся, прасіпеў:

— Ідуць! Там іх цэлая група.

І тыя, што заставаліся на просецы, усе зрушыліся, паглыбіліся ў гушчар, штурхнуўшы туды і Франца з Палінай. Тут шмат іх, уласаўцаў, і, мабыць, немцаў. Апынуліся побач з тым самым «Івановым», ці ён падсунуўся наўмысна, раптам як бы паказаў сабе за сьпіну: уцякайце, пакуль ня позна! Але, здаецца, позна: тут ужо і голенагаловы.

— Ты і ты, — загадаў двум уласаўцам, адвядзіце іх... Ну хоць бы да мосьціка.

Тыя на яго пазіраюць запытальна.

— Што незразумела? Адпусьціце там. Каб ані гуку. Адна нага тут, другая там. Фарштэйн? Выконвайце!

І ўзьняў вочы да неба, пасьміхаючыся гадка. Паліна зразумела, а Франц, падобна, перажывае палёгку, супакаеньне, што ён ужо ня ў полі зроку нямецкіх афіцэраў.

Францу нават цікава назіраць ягдкаманду ў дзеі, колькі разоў чытаў з захапленьнем пра сьмельчакоў, што, пераймаючы тактыку партызанаў, пранікаюць у самае гняздо іх, а там, затаіўшыся, чакаюць, як паляў-

нічы зьвера, ворага, які нічога не падазрае. Але пісалі менавіта пра нямецкія «паляўнічыя каманды», гэтая ж — уся амаль з рускіх іншаземцаў.

Паліна разумела, куды іх і навошта вядуць. Той, што зь вінтоўкай, адзеў на ствол штык-кінжал (сталь драпежна клацнула), у аўтаматчыка, рыжабровага пад каскай, кінжал вісіць на поясе. Будуць рэзаць! — рукі-ногі ў Паліны загулі, як быццам яны пустыя, полыя, прадзьмутыя марозным зімовым сіверкам. Яе на вачах у Франца рэзаць, Франца на вачах у яе. Страх ня толькі болю і ня толькі жах сам па сабе, але і сорам. Яе жывёльны жах будзе бачыць Франц, а яна — ягоны жах. Па гэтай кароткай лясной дарозе ўчора ішлі да рэчкі ўюноў лавіць. Тут, зусім побач, зараз, зараз гэта здарыцца!

— Ну, ідзі, ідзі! — штурхае Паліну штыком пажылы ўласавец, нечым, нейкай унутранай злосьцю ён нагадаў Ота. Франца наперадзе вядзе рыжы аўтаматчык. Як сказаць Францу, што іх вядуць забіваць (калі ён яшчэ не дапетрыў), і, галоўнае, што страляць, шумець, калі партызаны блізка, ім нельга. Калі кінуцца ў лес, ім будзе не да таго, каб лавіць, але трэба абаім разам. «Ота» не дарэмна нэрвуецца, злуе, чуе, што можа так адбыцца. Паліна пабегла б ужо, будзь што будзе, але Франц, Франц...

— Дык, значыць, Пушкіну цар кажа, — раптам паварочваецца рыжабровы аўтаматчык, зьвяртаючыся да «Ота» цераз галаву Паліны, — кажа: «Пушкін, ці ня ты напісаў Луку Мудзішчава?» А Пушкін, язьві яго душу...

— Вы не з Алтая, не алтаец? — перахапіла яго позірк (здалося, дабрадушны, не пагрозьлівы) Паліна.

— Ну алтаец, а што?

— У мяне мама з-пад Ленінагорску.

— Гэ, я таксама з Рыдэра. Гэта па-сталінску: Ленінагорск. А сапраўдная — Рыдэр, англічане руду здабывалі. Дык што ты хацела сказаць?

— Ну што мама мая з Алтая таксама. Яна, як і вы, гаворыць.

— Гэ, чуеш, Муха, — зьвярнуўся да «Ота», — зямлячка мая.

— Ідзі лысага гэтым абрадуй. Вось зараз яны там падыдуць ды ўлепяць табе чаргу ў сьпіну — пабратаецеся. Я б іх усіх! Чаго гэта мы іх так далёка праводзім?

Франц ня дужа перажываў тое, што адбывалася. Яму здалося, што большая пагроза мінулася. Той сказаў: «адпусьціце». Афіцэры ж нічога падазронага не заўважылі. А разгадай яны Франца! У 40-м нямецкія маці па радыё і ў газэтах праклiналі сыноў, якіх зьбілі над Англіяй і яны ня так нешта сказалі пра фюрэра. А што зрабілі б зь яго маці, бацькам, што іх змусілі б зрабіць, калі б адкрылася, што яго не схапілі партызаны, забіўшы Ота (хацелася верыць, што менавіта так падумалі), што гэта ён забіў таварыша, немца забіў, здрадзіў самаму сьвятому.

Вось і знаёмая рачулка адкрылася, злавесна тырчаць вывернутыя з жоўтага пяску чорныя бярвеньні, гнілыя жэрдкі, унізе густы алешнік — выйшлі да мастка. Вось і кош валяецца. Францаў кош, якім уюноў лавіў. Схапіць за руку, заплюшчыць вочы, і, пацягнуўшы яго, скочыць проста на кусты. Як будзе, так і будзе. Няхай страляюць, калі адважацца: яны так жудасна спыніліся насупраць, гэтыя двое, самі як бы разгубіліся, ня ведаюць, з чаго пачаць. А Франц зьзяе блакітнымі ўдзячнымі вачыма, лічачы, што яго і Паліну адпусьцяць.

— Дзякуй! — ад паўнаты пачуцьцяў вымавіў нямко.

— Ах ты, сука! — узвыў «Ота» і штыком пырнуў яго збоку. Коратка, але рэзка. Паліна пранізьліва закрычала і паляцела ўніз. Яна ўжо ня бачыла, як «Ота», не вышморгваючы штык, сьпіхнуў усьлед Франца. Тут жа ўсё вакол як выбухнула — ад блізкай страляніны. Ня чула крыку:

— Канчай іх аўтаматам!

Страчыў па ёй, па ім рыжы алтаец ці не, Паліна ня ведае. Аглушаная падзеньнем, уся падрапаная, амаль

трацячы прытомнасьць ад болю ў плячы, Паліна расплюшчыла вочы і ўбачыла раптам (ці здалося гэта) над сабой шызую морду сабакі, што пільна глядзеў проста ў вочы ёй. Дзіўныя вушы ў гэтага сабакі: буданом, быццам склееныя, нібыта рог у яго на галаве. Тут жа зьнік, як прывід. Прымусіўшы сябе ўстаць, Паліна гарачліва шукала вачыма Франца: яна ў нейкі міг пасьпела ўбачыць, як раскрэсьліла неба распластанае чалавечае цела. Густы алешнік прымяты, прыціснуты да долу — там! Хапаючыся за кусты нямогла — вялымі рукамі, пагрэблася ў той бок, раптам пабачыла — што гэта?! — чырвонае павуціньне, што апляло галіну альхі. Ліпкія ніткі крыві цягнуліся, ярка палалі ў сонечных прамянях. А на лістах яна дзягцярна-цёмная. (Гэта не была толькі гульня сьвятла: на хінна-гаркавых альховых лістах кроў чамусьці робіцца чорнай — гэта ўжо маё назіраньне з вайны.)

Нарэшце ўбачыла цела Франца — камяком. Ногі, рукі, шыя — як у вузел зьвязаныя. У самой жывот падцягнула да схаладзелых пазванкоў, калі, выхапіўшы з штаноў Франца кашулю, убачыла сінюшную рваную рану і, як ёй здалося, белую палоску рабра. Рукі яе афарбаваліся ў кроў, яна глядзела ў твар, зьбялелы, мёртвы.

— Ды памажыце ж! — крыкнула невядома каму. Рэха бою чулася недзе высока над імі. Вочы расплюшчыліся, блакіт у іх цьмяны, нежывы, чалавек спытаў:

— Wohin soll ich springen? Mama, Wohin?* Сюды?..

# 10

Ня ўсе загінулі, ня ўсіх забілі, жывыя застаюцца нават на такой вайне, што дасталася нам. Штык-кінжал загруз, здаецца, проста ў жываце. Але ў апошні міг без усякай яго волі цела само выгнулася, бегучы ад вернай сьмерці. І штык, рыпнуўшы, прайшоў між рэбраў. Адна

---

* *Куды скакаць? Мама, куды? (ням.).*

Паліна магла б расказаць жанчыне з чужымі строгімі вачыма, фатаграфію якой насіла ў мэдальёне, як Францу, ім з Францам пашанцавала ацалець. І там, каля моста, і пазьней, калі несла іх грозная перадфрантавая хваля, штурхаючы перад сабой, абрынаючыся зьверху, накрываючы іх разам з тысячамі такіх жа, як яны, уцекачоў ад пагібелі. А як уцячэш, калі яна навокал, усюды, нясе ўсіх, як трэскі ў паводку, — ты ў яе ўчэпістых абдымках, сам ня верачы, што яшчэ жывы?

Спачатку вярнуліся ў тую ж зямлянку, адкуль іх нядаўна пагналі забіваць. Паліне туды вяртацца было страшна, але некуды трэба было схавацца з параненым. Ня дзень, ня два патрэбны, каб ён акрыяў. Яна цягнула Франца, слухаючы рэдкую страляніну аддаленага бою, кожны іх крок пакутаю, болем люстраваўся на спарэлым твары параненага. Паліна прыціскала да параненага боку Франца камяк альховае лістоты, што зьліплася ад крыві, разумела, што гэта бессэнсоўна, кроў гэтым не супыніш, але тым мацней уціскала руку, як бы затрымліваючы ў абмяклым целе рэшту сіл, жыцьця.

Дні пакаціліся бязь ліку, зьліпаючыся з трывожнымі начамі, падсьвечанымі пажарамі, зь неспакойнымі, дрыготкімі ад далёкіх і блізкіх выбухаў сьвітанкамі — зьліваліся ў нешта суцэльнае, як сьпіцы ў коле, што імкліва коціцца. Ужо праз тыдзень давялося пакінуць сваё сховішча. На шчасьце, Паліне трапілася на вочы кімсьці кінутая двухколка (на такіх калгасьнікі вазілі сена з балота, на сабе, вядома, каня мець ім было забаронена). Уклаўшы параненага — то ногі, то галава яго занадта зьвешваліся, даводзілася бясконца спыняцца, папраўляць, — Паліна ўцякала ад неадступнай бяды. Часам здавалася, што ня нейкія там карнікі — немцы ці паліцаі іх перасьледуюць, а ўся Германія, тая самая «праклятая», як пра яе сьпяваюць, помсьліва кінулася ў пагоню. Не пасьпявала дацягнуцца да якой-небудзь вёскі ці хутара, дзе разьлічвала адпачыць, перахапіць што-небудзь, пад'есьці, як змушаная была разам з жыхарамі бегчы

далей: зноў страляніна, ірвуцца міны, зьверху абстрэльвае самалёт. Франтавыя часьці, адступаючы з усходу, ярасьць сваю абрушвалі на ўсё жывое. Неўзабаве давялося кінуць і вазок, а Францу ўстаць на ногі, хаця паранены бок яго ўсё яшчэ сьцякаў гноем, крывёю. Іх загналі ў гнілыя балоты, якія ўжо там вазкі. Даводзілася ня тое што ісьці, а паўзьці на пузе. Былі моманты, калі ад страху з галавой праваліцца, ад нечаканкі, што ў Францa вырываліся нямецкія словы — ускрыкі, і тут ён раптам прыкмячаў побач твар дзіцяці ці жанчыны з расшыранымі ад жаху вачыма: як калі б поруч зь імі загыркаў, узьняў поўсьць воўк ці, больш дакладна, клацнуў зяпай кракадзіл. А калі выбраліся на «дальнія», як тут называюць, «астравы» («Камар-мох») і ўжо можна было стаяць і нават ляжаць, перадыхнуць, Францa раптам закалаціла ліхаманка, жар зваліў, як і многіх, — тыф! Мала ўсяго, дык яшчэ і гэта. Пачаў трызьніць, выкрыкваць скрозь нямецкія фразы. А побач людзі, што ўцякаюць ад немцаў. Паліне давялося выдумаць легенду. Гэта італьянец, ён уцёк з іхнай арміі, многія ўцякаюць пасьля таго, як Італія выйшла з вайны. Немцы іх заганяюць у лягеры. Але Паліне верылі нядоўга: нават дзеці добра ведаюць, чые гэта словы: «хальт» ды «ком». Жанчыны і суровыя падлеткі пачалі нядобра касіцца на Паліну і яе «італьянца», нічога не заставалася, як распавесьці ім праўду. Чуцьцё падказвала Паліне: трэба расказваць падрабязна, з усімі перажываньнямі, як яно насамрэч адбывалася. І Паліна пастаралася: пра тое, як Франц выратаваў іх з маці, як разам хавалі вёску, а мама памерла, як Францa ледзь не зарэзаў уласавец і яны цудам выратаваліся. А калі пра той вазок стала апавядаць, расплакалася. Колькі ж гэта дзён, начэй яна цягнула такі цяжэразны вазок, уцякаючы ад пагібелі і зноў трапляючы ў лапы сьмерці. Сьлёзы ўжо і на вачах у іншых жанчын: усё гэта і яны перажылі, ёсьць каго і што аплакваць кожнай. Але, вядома, і спрэчка ўзьнікла. Паліна правільна зрабіла, што замоўкла. Няхай, няхай жанчыны нагаворацца, колькі ім пажадаецца.

— А, усе яны добрыя! Адных ратаваў, а другіх, можа, караў, мучыў.

— Дзеўка ж казала: ён толькі што з Германіі, калі ён мог пасьпець?

— Ужо нагледзеліся мы на іх! На ўсякіх.

— Не, не, бывае, не кажэце! Вось адна жанчына на гарышчы схавалася, цыбуля там сушылася, дык яна пад яе зашылася. А ён: рып па лесьвіцы, рып-рып... Узьлез, падышоў, адкрыў твар ёй, паглядзелі адно на аднаго, назад паклаў вянок і пайшоў, не чапіў.

— А то расказвалі... Афіцэр адзін, таксама немец, ня вытрываў, як яны тых дзяцей, баб забіваюць, адышоў убок і сабе ў галаву...

— А гэты, калі ён праўда застрэліў свайго, хто ж яго цяпер памілуе, калі ня мы?

Калі пал і сьмяротная слабасьць адступіліся, і Франц стаў пазнаваць Паліну, убачыў людзей каля сябе, ён раптам павітаўся:

— Добры дзень!

— Нічога, можаш гаварыць, — супакоіла Паліна, — людзі ўсё ведаюць.

— А ён па-нашаму гавора! — абрадаваліся бабы.

А калі пераканаліся, што і гаворыць, і разумее добра, распачаліся сапраўдныя палітразмовы. Завадатар гэтых бясконцых размоваў — стары, якога ўсе называюць Бязвухі. Ён без вушэй насамрэч. Калі такімі не лічыць кароткія агрызкі, прыкрытыя рэдзенькім касмыльком валасоў. Бабы, тыя ўсе ведаюць, паведамілі Паліне: у грамадзянскую вайну так удружылі дзеду, адно вуха адрэзалі чырвоныя, другое — балахоўцы, белыя. Не дагадзіў ні тым, ні другім. Мабыць, ім таксама дакучаў, назаляў сваёй асобай, сялянскай праўдай, як зараз во Францу. Бабы ўжо гоняць яго, як авадня.

— Дай хоць чалавеку паляжаць. Да чаго прыставучы дзед.

Каб гэтыя людзі раптам зрабілі Паліне нават вялікае зло, яна не змагла б ім не дараваць — за тыя кружачкі

малака, што прыносілі Францу. На ўвесь «цывільны лягер» было дзьве ці тры каровы, каб дабрацца да іх, трэба ажыцьцявіць небясьпечнае падарожжа па балотных купінах, і вось кроплямі малака, што прызначаліся адным толькі дзецям, дзяліліся зь немцам.

А Бязвухі ўсё намагаўся нешта сваё даказаць Францу. І выклікаць яго на спрэчку. «Дзеду-ўсяведу» (яшчэ і так клічуць Бязвухага глумлівыя падлеткі) трэба абавязкова атрымаць пацьвярджэньне, што гэта немцы прыдумалі калгасы. І зрабілі знарок, каб гэтыя дурні на ўсходзе развучыліся і працаваць, і ваяваць. Армія заўсёды трымалася на самастойным гаспадары, а з калгасьніка — што спытаць? Які работнік, такі і воін. А надумаў, зрабіў так усё ўнук «Карлы Маркса», ён пры Гітлеры галоўны дарадца. У Франца галава ішла кругам ад несакрушальнай упэўненасьці Быязвухага. Бабы ж папярэдзілі свайго дзеда:

— Ой, глядзі, адрэзалі табе вушы, і язык адрэжуць!

Хто адрэжа, не казалі, але, мяркуючы па ўсім, ведалі і яны, і сам стары. Таму што гаварун на нейкі час змаўкаў, сыходзіў да сваіх справаў. Але неўзабаве вяртаўся.

— А вось скажыце вы мне!.. — і зноў раскручваў Францавы мазгі, але ўжо ў зваротным накірунку: а ці праўда, што Гебэльс у Маскве вучыўся, там школа адмысловая ёсьць для такіх?..

Узгадваючы меркаваньні свайго бацькі пра Расею, пра ўсё, што ў ёй адбылося пасьля рэвалюцыі, Франц таксама ня супраць быў сёе-тое пераправерыць, а раптам зможа потым бацьку пераказаць. Ці праўда, што калгасы задумваліся як вяртаньне да камунаў, абшчын раньніх хрысьціян? Сумесная праца, агульны стол, роўнасьць, няхай і не пры вялікім дастатку. «Капіталіст — во! — Франц зграбаў да сваіх ног усё сьмецьце, шышкі. — А камуніст...» — раздаваў тыя ж шышкі: «Табе, табе і табе!» Рэакцыя была нечаканая. Не, здаецца, ніхто не аспрэчваў, але нават старыя бабы глядзелі на Франца як на блазна, хворага. «Дзед-усявед» усё-ткі адкамэнтаваў:

— Бязвухі ня я, а вось хто! — і ўрачыста паказаў на Франца. — Можа, самі вы, немцы, яшчэ пасмакуеце, што гэта за мёд.

На ўсе пярэчаньні (Паліна таксама зь ім спрачалася) дзед сьцьвярджаў адно:

— Ну а чаму Гітлер калгасы не распускае? Адно шыльду зьмяніў. Тое і яно! Што гэты, што Напалеон — спужаліся мужыцкай волі.

Паліна чула, як збоч бабы так гэта абгаворвалі.

— Мо ён камуніст? Ня ўсіх жа Гітлер пасадзіў.

— Кажа так пра калгасы, думае, нам гэта спадабаецца.

— Бедны, кожнаму жыць ахвота.

Паліну мучыць неспакой: зьявяцца партызаны, і нехта абавязкова пахваліцца немцам. Ня ў кожнага ёсьць свой немец. Каб жа можна было ведаць, што яны зробяць. Ты ж ня ведаеш, якія трапяцца партызаны.

Што асабліва ўражвала Франца, дык гэта тактоўнасьць, зь якой гэтыя людзі абыходзілі размовы, што гучалі б, як абвінавачаньне яму — усё-ткі немец. Калгасы — гэта так, анэкдот. Чакаў, што загавораць пра выбітыя вёскі, пра тое, што ім вось тут трэба хавацца зь дзецьмі. Ані слова. Нават фюрэра амаль ня ўзгадваюць. Але аднойчы рабацiністы падлетак, боязка азірнуўшыся на жанчын, прашыпеў:

— Ну што, капут твайму Гітлеру? Кажы: капут!

Адказалі за Франца:

— Трэба будзе — скажа. Чаго ты чэпісься?

— Ён што, пытаў, гэты Гітлер, у Франца, ваяваць ці не?

Не падымалі размову Бязвухага пра тое, сустракаліся ці не сустракаліся — Сталін з Гітлерам.

— Не чапай ты ліха, пакуль ціха.

Не ўдакладнялі: тычыцца гэта аднаго фюрэра ці і іх уласнага правадыра таксама. Паліна Францу растлумачыла пра сарочку: беларуская прымаўка з адваротным сэнсам — «нарадзіцца ў сарочцы», г. зн. «дабра б яму ня знаць». І зноў жа, каму?

Ці не таму не загаворваюць пра Гітлера, каб не зачапіць і Сталіна. Знаёма гэта Францу, у Германіі, асабліва да вайны, пажылыя людзі паводзілі сябе падобна.

Ну а ў Паліны іншы клопат, куды важнейшы за праблемы — чый правадыр лепшы. Яе непакоіць затрымка з жаночымі справамі. Няўжо тое, што паміж ёю і Францам адбылося, можа быць прычынай? Ды нічога ж і не было, акрамя болю і крыўды. Хіба такое магчыма? Хутчэй за ўсё перанапружаньне адбіваецца: асабліва тыя трое сутак, калі цягала вазок з паўжывым Францам. Ведаў бы ён, які быў цяжкі! А яшчэ ўсё ногі звальваліся, хоць сьмейся, хоць плач!

Узгадваючы вясковыя бабскія гаворкі пра самаадчуваньне цяжарнай, пераправярала — што і як зь ёю адбываецца. Вось ужо смыліць унутры — ці не яно самае? А яшчэ ўзьнікае неадольнае жаданьне, гэта вядома. Зьесьці што-небудзь, асабліва салёнае. Ці такое, што і ў горадзе не знайсьці. Маме, калі «хадзіла Палінай», захадалася раптам беламорканальнай баланды з гнілымі селядцамі. Ці гэта выдумка бацькі, ён любіў зь яе пажартаваць. Пакуль Паліна гадала-разгадвала, наклікала на сваю галаву: захацелася, хоць забі, чаго-небудзь халоднага. Усё ўзгадвала марожанае, якім бацька пачаставаў калісьці ў чыгуначным буфэце: жоўтае, на сьлізкай мэталічнай чашы, а ад гэтага яшчэ халаднейшае.

Сказаць, не сказаць — Францу?

Тое, што было, здарылася ў іх зямлянцы, паступова, па дэталях узнаўлялася, але ўжо не як пярэдадзень усяго жахлівага, што адбылося ў той самы ранак і пра што не хацелася ўспамінаць, а па-іншаму: гэта ж была іх першая блізкасьць. У Паліны — першая, яна пра сябе ведае. А п р а і х — хіба можаш ведаць? Вунь як тады палез у хаце! І атрымаў! Раптам рэўнасьць — сьмешна. Ляжыць, як немаўля, слабенькі, бездапаможны, захацелася б, дык не параўнуеш.

Ад таго, што грудзі дзіўна зацьвярдзелі і баляць, адчуваеш і ўвесь час успамінаеш я г о рукі. Як тады!

Але ўжо не адштурхнула б, наадварот, прыціснула б іх, каб было балюча, соладка...

Франц ужо сядзець мог, прытуліўшыся да дрэва, сядзеў так гадзінамі, праводзячы і сустракаючы ўсіх слабой усьмешкай ачунялага. Тыф зваліў многіх, некаторых пахавалі, ён жа — як з таго сьвету вярнуўся, аціхлы, задуменны. Валасы ў беднага пасыпаліся, няма ратунку. Добра, лес таксама хутка лысым стане, не гаруй і ты! Лес ужо зжоўк, дажджы пайшлі, лясныя людзі зь неабходнасьці асьмялелі і пачалі паліць вогнішчы, абсушыцца не абсушысься, таму што лье без канца, але хоць сагрэецца мокрая апратка, кіслая пара зь яе ідзе.

Паліна ўсё не казала яму пра галоўнае. Цяпер у яе занятак: гледзячы на Франца, параўноўваць, уяўляць, якія вочы, твар, валасы ў яе дзіцяці. Забывалася ва ўсьмешцы, але раптам яе твар (с а м а  б а ч ы л а) рабіўся халодным, чужым, як бы пярэчыла каму: а  в а м  я к а я  с п р а в а? Н у, а д  н е м ц а, н я  в а м  я г о  г а д а в а ц ь!

Мамачка стала мамай, а тата бацькам для Паліны, будучы такімі старэнькімі. У яе дзіцяці мама будзе зусім маладая. Разам на вечарынкі бегаць будзем! — упарта вяртала ўсьмешку на твар.

А потым усё пачыналася зноўку: абстрэлы, бамбёжкі. Выкрыкнула сваю таямніцу Францу, калі прабіралася па халоднай гразі па калена, раптам спужалася (сосенка ад выбуху, узьляцеўшы, іх абодвух накрыла, балюча хлабыснула па галовах, сьпінах), што заб'юць каго-небудзь або абодвух, а ён так і не даведаецца.

Але Франц, падобна, не расчуў ці не зразумеў, пра якое яна дзіця. Іх столькі навокал, дзяцей; нягледзячы на слабасьць, і Франц стараецца памагаць жанчынам, у каго па трое, а то і больш.

У гарачцы ўжо амаль не прыкмячаў Франц (а спачатку пужаўся), калі побач зьяўляліся людзі са зброяй, партызаны. Яны то рухаліся разам з жыхарамі, то неку-

ды ішлі, зьнікалі. Франц пераконваўся: такія ж, як і астатнія, вясковыя людзі.

Праўда, калі і Францу, пры яго маскарадзе, апратцы, даць зброю, сыдзе і ён за свайго тут.

А аднойчы здарылася такое, што ўсяго перавярнула, як бы ня помніў ужо, хто ён, дзе ён. Такое давялося пабачыць (Паліне), у такім удзельнічаць (Францу) — пра гэта ніколі потым не гаварылі адно з адным і ўспамінаць не хацелася. Не, не самае жорсткае і жахлівае з бачанага, пражытага, бо мера даўно страчана на гэтай вайне, у гэтым жыцьці.

Гэтыя пяцёра зьявіліся пасьля яўна няўдалай апэрацыі, бою. Ніяк супакоіцца не маглі, па выгуках і нэрвовай перапалцы можна было дапетрыць, што толькі яны і вырваліся адтуль жывыя. Двое зь іх параненыя, у руку, у галаву, здавалася, ледзь трываюць на нагах. Спачатку насядалі на чалавека ў пацёртым скураным паліто, з сухім непрыгожым тварам. Ён не аддаў нейкую каманду і сам апынуўся ня там, дзе павінен быў знаходзіцца. Францу цікава было і крыху вусьцішна назіраць за імі: гэта і ёсьць тыя самыя партызаны, якіх так ненавідзяць і так баяцца немцы. А ў скуранцы, мабыць, камандзір, магчыма, камісар. Але ён не габрэй, хаця сярод немцаў лічыцца, што яны запраўляюць усім. Ёсьць і габрэй: гэты, аднак, амаль ня ўдзельнічае ў звадцы, зусім як старонні. Усьсеўся на рэчмяшок і глядзіць проста перад сабой, як быццам цягніка чакае, што вось-вось вынырне з-за дрэваў. А профіль-профіль, ну, проста-ткі карыкатура на «юдэ-камісара» ў салдацкіх газэтах! Нешта прыцягвае ўвагу Франца менавіта да гэтага чалавека. Зрэшты, зразумела: столькі напісана, нагаворана пра габрэйскае племя, якое ўмудраецца ва ўсё ўлезьці і ўсё павярнуць на карысьць сабе і на шкоду іншым, што сустрэча з габрэем, з ж ы в ы м — у Германіі іх ужо няма, — нечакана ўсхвалявала. Не, Франц ня лічыць сябе нацыстам-антысэмітам, у іх дома гэтага саромеліся. Але Франц апошнія гады дадому да бацькоў толькі наведваўся час

ад часу, а жыў і працаваў у маладзёжных лягерах. Дзе трэба было адпавядаць вобразу маладога і крыважэрнага тыгра-салдата фюрэра. Франц вучыўся адпавядаць. Чакаў, як і іншыя, дзень, калі, як пасьвячэньне, будзе і ў яго пад пахай наколка эсэсаўца. Наколькі, аднак, далёка зайшло, ён і сам ня ведаў: не было блізка і навокал габрэяў, каб праверыць свае пачуцьці. Але помніць, што халадзеў ад жаху і як яго ванітавала, усё ж намагаўся выглядаць ня горш за іншых, калі франтавік з «жалезным крыжам» апавядаў, як весела ваюе СС на Ўсходзе. Недзе ў паўднёвым горадзе: руская жонка прынесла перадачу арыштаванаму габрэю. Ёй вынесьлі, вярнулі посуд. На талерцы, пад ручніком — яго галава!..

І вось габрэй сядзіць перад ім, але сытуацыя зусім супрацьлеглая: ня «юдэ» ў руках у «арыйца», а «арыец» — у поўнай яго ўладзе. Досыць габрэю, даведаўшыся, што гэта немец глядзіць на яго, ткнуць у яго бок пальцам, і зь немцам зробяць тое ж, што заслугоўваюць, паводле перакананьня салдат фюрэра, габрэі.

А тым часам нешта зьмянілася ў сцэне, што разыгралася ў лесе. Дагэтуль закручвалася вакол камандзіра ў скуранцы, якога вінавацілі ў нядаўняй бядзе, пагрозьліва лаялі за неразумныя распараджэньні і, падобна, за трусасьць. Скураны падышоў да седака на рэчмяшку, паглядзеў бессэнсоўна, як бы нешта кемячы, і раптам спытаў гучна:

— Чакай, а дзе дыскі да кулямёта?

— Што дыскі, калі кулямётчыка страцілі, кулямёт, — здалёк азваўся паранены ў галаву.

— Усё роўна. Дыскі я даручыў вось яму, Фуксону.

— Якія дыскі, якія дыскі? — азіраючыся, як бы шукаючы падтрымкі, закрычаў чалавек, што сядзеў на мяшку.

— Што значыць «якія»? — не адставаў скураны. — Табе было даручана насіць запасныя. Што, згубіў, кінуў?

— Нехта нешта ня так зрабіў, пабег першы, а віна-

ваты Фуксон! — непрыемна высокім голасам выкрыкваў, адбіваўся гаспадар мяшка.

— Ты за другіх не хавайся, — умяшаўся паранены ў руку, крывячыся, мабыць, ад ныючага болю, — кожны за сябе адказвай.

— Што ў цябе там, чым мяшок набіты? — усё больш рашуча наступаў скураны. Здаецца рады, што пра яго віну забыліся. — Вось гэта ён ня кінуў? Ану, разьвяжы!

І яшчэ нечы голас прагучаў, далучаючыся да камандзірскага:

— За згубленую зброю, ведаеш, што ў нас бывае?

Скураны схапіў мяшок за шлейкі і вырваў з-пад седака, той сьмешна па-бабску зваліўся на бок. Зь мяшка вываліліся скруткі скуры, што зіхацела на сьвятле, новыя чаравікі.

— Хром, глядзіце, колькі з той машыны загатовак нагроб! — узрадаваўся скураны. — Нябось, скуру ня кінуў.

— Што хром, што нагроб! Калі другія пакідалі, значыць, і я павінен...

— Пра дыскі гаворка, куды іх падзеў?

— А што яны без кулямёта? Самі ж потым папрасілі б: Фуксон, боты трэба пашыць, Фуксон, абцас знасіўся!

— А ты і кінуўся рабіць! Ведаем мы цябе! — гэта той, з ныючай рукой.

— Што тут зь ім базар разводзіць? Ану! — скураны забраў з рук Фуксона вінтоўку, і той аддаў. — Адыдзем туды.

Накіраваліся ў бок невялікай паляны, але скураны раптам азірнуўся на Франца:

— І ты! Пайшлі з намі.

«Што, чаму?» — Франц разгубіўся. Аніяк не чакаў. У яго бок ніхто нават не глядзеў, а тут раптам...

Паліна загаласіла:

— Навошта ён вам? Ён хворы, ён немы, ён...

— Ён, ён, ён! — акрысіўся скураны. — Ну што заенчыла? Нічога ня зробіцца з тваім нямым.

— А нашто ён вам, а Божа ж, а што гэта робіцца? — на ўсякі выпадак выкрыквала Паліна, але і разумела: нельга перабаршчыць. Раптам тут ёсьць нехта, хто ведае ўсё пра Франца, успомніць, скажа — вось тады і сапраўды паенчыш. Пабегла ўсьлед, не выпускаючы ні на міг з выгляду, гатовая зноў узьняць бабскі лямант.

Выйшлі зь лесу на паляну, і тут Франц блізка разгледзеў чалавека ў скуранцы, яго вузкі і непрыгожы твар, воўчыя зморшчакі на пераносьсі, нешта знаёмае падалося яму ў бессэнсоўна злым паглядзе, у рэзка апушчаных кутках белагубага роту. Менавіта такім лёгка падпарадкоўваюцца: злосьць, што ідзе ад іх, заўсёдная, як атмасфэрны слуп. Яна і цябе пачынае спавіваць, спачатку няпрыязьзю да яго ж. Але затым ты сам зараджаесься яго незразумелай, незразумела да каго злосьцю — ад неспакою, трывогі, страху.

Куды ён і навошта вядзе ўсіх, і ўсе ідуць? Як быццам ведаюць — нават Фуксон — разумны сэнс і мэту гэтага паходу. Карычневая, пачварна даўгая скуранка зь белымі праплешынамі і трэшчынамі на камандзіры вісіць, як на вешаку, у руцэ ў яго пісталет, а ў другой — вінтоўка арыштаванага. Навошта паклікаў Франца, што ад яго хочуць? Вочы скуранога, здавалася, бессэнсоўна шныраць навокал, але не, пабачыў некалькі бярозак наводшыбе і тут жа скіраваў да іх. Паказаў Францу на белае стройнае дрэва:

— Ты самы высокі, бярыся, гні. Чаго не разумееш? Вось так — гні! Вышэй, вышэй забірай.

Франц паспрабаваў — дрэва толькі пашумела ўжо зжоўклай і парадзелай кронай, не паддаецца. Сапраўды, давялося прыўстаць на дыбачкі і схапіць прыгажуню вышэй, як за горла, зьвіснуўшы, пацягнуў уніз. Перабіраючы рукамі бліжэй да вершаліны, змусіў упартую, што плаўна слабела, прыгнуцца, наваліўся зьверху на яе, локцямі, усім целам, нехта поруч павіс, схілілі, як трэба. Хаця як трэба і што трэба, вядома тут, здаецца, адзінаму чалавеку. Ад яго патаемнай незразумелай думкі ідзе пагроза.

— А ты, — камандуе скураны таму, у каго перавязаная галава, — здымі з гэтага рэмень.

— Сам здыме, калі трэба. Добра, Фуксон, давай твой рэмень.

— Што? Навошта? Што вам ад мяне трэба?

— Давай, калі загадваюць.

І той пасьпешліва распаясаўся, цёмны плашч з разьдзьмутымі кішэнямі павіс на ім пачварна, як халат. А скураны распараджаецца далей:

— Прывязвай за нагу. Ну што незразумелага? Нагу. Да бярозы. Рэменем. Зразумеў, нямая ступа?

І сам штурхнуў Фуксона да Франца.

Франц і другі, што памагаў стрымліваць спружыністую бярозу, недарэчна намагаюцца злавіць нагу Фуксона, той адступае, сьмешна адскочыў, вырваўшы калашыну нямецкіх штаноў з Францавых пазногцяў.

— Вы што? Што вы надумалі? За гэта адкажаце!

— Э, адкажаце, адкажаце! — раптам раззлаваўся лянівага выгляду дзяцюк-мацак, што датуль ні ў чым ня ўдзельнічаў. Як бы кусілі яго.

Схапіў галаву беднага Фуксона моцнымі рукамі «ў замок» і падцягнуў яго да дрэва: прывязвайце! Франц схапіў нагу раменнай пятлёй, хутка працягнуўшы канец праз мэталічную спражку, быццам ня раз такое рабіў. Скураны адабральна памахаў пісталетам. На пару з тым, што памагае трымаць бярозу, пасьпешліва сталі канец рэменя прывязваць да ствала. Фуксон ужо ляжыць на зямлі, нага задзёртая пад неба.

— Вы што, вы што? — усё паўтарае няшчасны, торгаючы рэмень, як бы спрабуючы, ці дастаткова моцна, добра нага прывязана.

— А вось зараз пабачыш!

— Будзе табе хром!

У выкрыках ня злосьць, а як бы гульня, усіх завароджвае сама дзея, тое, што адбываецца зь і м і.

— Нахіляй другую, — камандуе скураны і, адкінуўшы вінтоўку, сам кідаецца да такой жа бярозы, што стаіць мэтраў за сем. — Сюды, да яго гні!

Фуксон у адчаі закрычаў на ўвесь лес:

— Людзі, памажыце! Гэта фашысты! Вы што, фашысты? Вы фашысты, ці хто?

Ухітрыўся скочыць зь зямлі, на назе, яшчэ не прывязанай, спрабуе адскочыць, уцячы, зноў упаў, на руках намагаецца адпаўзьці, а яго цягнуць, валакуць, прыціскаюць, вяжуць:

— Ах, мы фашысты?.. Значыць, вось мы хто?.. Зараз ты пабачыш, хто фашыст!.. Сука! Фэрфлюхтар! Сьвіньня! Фуфло! Юда! Шайзэ!..

Чые былі словы, чые галасы ў тым пачварным клубку ярасных цел, хто маўчаў нема, а хто не — ніхто ня мог бы разабраць. На другім канцы паляны таксама крычалі жанчыны, іх спалоханыя галасы ўсё нарасталі.

— Мацней, мацней навязвай! — камандуе скураны.

Ногі нябогі ўжо глядзяць у неба, плячыма, галавой ён коўзаецца па жухлай траве, перамяшчаючыся зь месца на месца на локцях, як нейкая членістаногая казюрка.

— Адпускай! Паехалі!

Пачуўся лямант жаху — дрэвы, уздрыгануўшыся, падскочылі, спрабуючы выпрастацца, стаць, як раней, але не змаглі. Іх трымалі расьпята голыя, страшныя ў гэтым становішчы чалавечыя ногі. А рукі зьвіслага галавой уніз амаль дастаюць да долу, шкрабуць траву, апалае лісьце. І нейкае вухканьне: «У-о-х! У-о-х!» — чуецца з-пад зьвіслага ўніз плашча, што закрыў галаву, твар падвешанага.

Што было б далей, сказаць немагчыма: крык з усіх бакоў рос, людзей на паляне ўсё больш. Скураны, як бы ўспомніўшы пра свой пісталет, пасьпешліва стрэліў — ва ўпор у аголены худы жывот павіслага. Рукі расьпятага напружана паварушыліся і павісьлі мякка.

Анямелая Паліна ўсё гэта назірала з-за куста, ускрыкнуўшы ад болю, прыціснула далоні да свайго жывата. Як бы заплюшчваючы вочы дзіцяці.

# 11

Расказваючы пра Паліну, Франца, не-не ды й вернесься да самога сябе, мы як-ніяк жылі ў адзін час, вопыт наш ня так ужо і адрозьніваўся. Вось і пасьля расказанай дзікай гісторыі прыгадаўся наш уласны габрэй. Ня толькі ў немцаў пры Гітлеры ён быў — уласны ў кожнага. Так павялося ўжо здаўна: Пётр лепш пазнае сябе праз Паўла. А яшчэ лепш — праз Абрама, Ісака...

Быў у нас у атрадзе свой Фуксон, не, нічога зь ім такога ня здарылася. Пасьля вайны сваёй сьмерцю памёр. На партызанскія сустрэчы акуратна прыяжджаў. Помню фразу, якую наш Мікалай Носаў часта казаў:

— Скончыцца вайна, ты, Фуксон, маеш права казаць: «Я ваяваў». Але калі ты скажаш: «Мы ваявалі!» — глядзі, Фуксон, нос адкушу.

Не, з дружбай народаў у атрадзе было ўсё ў парадку. А Хаім Хануцін, кулямётчык зь першай роты, быў фігурай, якую камандаваньне наогул за прыклад ставіла. Злы ў яго кулямёт, самы гучны ў кожным баі. Быў выпадак, калі выручыў увесь атрад, тады нас прыціснулі да ракі.

Але не магу забыць адну сцэну, на памяць прыйшла, калі апавядаў пра выпадак зь нянашым Фуксонам. (Абедзьве гісторыі аднолькава ня выдуманыя).

Вярталіся мы з «жалезкі». Хадзілі туды і вярталіся, што называецца, гамузам. Цэлай ротай. Менавіта так было ў жніўні, у верасьні сорак трэцяга — падчас «рэйкавай вайны». Пераваліліў ужо небясьпечную «варшаўку», уніклі ўдала самалётаў, якія пасьля трэцяга дня жніўня, калі ўпершыню прагрымеў на ўсёй чыгунцы на Беларусі «канцэрт», ня злазілі зь неба, увесь час віселі над намі. Вырашылі адпачыць у вялікай вёсцы Старое Сяло — хто на траўцы прысеў, хто на бярвёнах, прываленых да агароджы, уладкаваўся. Толькі разьмясьціліся — бягуць да нас жыхары зь весткай: а вас тут чакае габрэй з Бабруйску. І ня проста габрэй, а які два гады

хаваўся ад немцаў у нейкай жанчыны. Жыў у яе падвале, быў шаўцом, працай яго карміліся, дваіх дзяцей нарадзілі. (Заўважце, гісторыя нечым падобная на Францаву з Палінай).

Ён не пасьпеў яшчэ зьявіцца перад нашымі вачыма, а мы ўжо ведалі: адыходзіў з Бабруйску чамусьці па кантраляванай «варшаўцы», яго, вядома ж, цапнулі паліцаі (профіль!), пераправерылі першае падазрэньне «нямецкім спосабам» — прымусілі штаны спусьціць. І вось нейкім дзівам змог зь іх падвалу ўцячы. Праўда, пасьпелі зь яго выцягнуць, выбіць адрас жанчыны, у якой ад яго дзеці.

Гісторыя, зразумела, сама па сабе неардынарная, ніхто ня стаў бы адмаўляць. Але ў залежнасьці ад таго, як яе пераказваць, на чым рабіць акцэнты, будзеш глядзець на гэтага чалавека. Па-рознаму глянеш. Для нас акцэнт адразу ж зьбіўся на адзін бок: выдаў добрую жанчыну, якая яго выратавала. Цяпер усё залежала, якім ён нам здасца жывы, як павядзе сябе. І хто зь ім распачне размову. З ротай ішоў Васіль Емяльянавіч, камісар (далей паедзе на сваім кані: разьведчыкі прыгналі з атраду) — вось яму і накіроўваць размову.

Зьявіўся наш госьць у самым няўдзячным для сябе вобразе. Усё ў ім, як знарок, з выклікам і неўпапад. Неўпапад з агульным настроем роты, з уражаньнем ад папярэдняга расказу пра яго (тая жанчына і выданыя ўласныя дзеці!), з чаканымі паводзінамі яго. Яму б з выразам гора-бяды, віны зьявіцца, а ня з гэтай шыракаротай шчасьлівай усьмешкай на ўвесь габрэйскі твар. Не спадабалася хлопцам нават тое, што звычайна іх цешыць: як радасна кідаюцца нам насустрач тыя, хто доўга і зь вялікай рызыкай шукаў партызан. На шчасьлівае яго «добры дзень» камісар — пытаньнейка:

— Два гады, кажаш, хаваўся? А чаму раней не прыходзіў?

Ну прыдумаў бы нешта, а то:

— Лепей позна, чым ніколі.

Жартаўнік! Ён што, вораг сабе самому? Знайшоў што сказаць!

— За гэтыя два гады — ведаеш, колькі хлопцаў галовы паклалі!

Адказ горш няма куды:

— Камусьці і жыць трэба.

Ён што, нахабнік? Ці гэта ад разгубленасьці, ад нечакана непрыязнай сустрэчы? Ці проста дурны гэты падпольны шавец? Вунь як па-дурному сам жа апавядаў жыхарам пра тое, што выдаў сваю выратавальніцу.

Як бы праверыўшы агульны настрой (і адначасова накіроўваючы яго), камісар задаў яшчэ пытаньне:

— Значыць, ты ў партызаны сабраўся? А што можаш рабіць, кім хочаш быць?

— Я-то наогул шавец. Але і поварам магу. Усім магу.

— Усім можаш, — камісар хмурна зірнуў на нас, як бы запрашаючы палюбавацца на гэтага разумніка, — ну а чаму ня кажаш: магу кулямётчыкам, магу аўтаматчыкам?

— Калі трэба, калі ласка.

— Ласка твая нікому не патрэбна. Не за нас (мы самі), за сябе павагай! Досыць усім на дурніцу ехаць!

Калі ў камісара была свая нейкая мэта, дык ён яе дасягнуў цалкам, ані не рызыкуючы парушыць формулу нашага інтэрнацыянальнага выхаваньня. А як яшчэ з такою нахабаю гаманіць?! Але было і такое пачуцьцё: з нас вывернулі наверх нешта нячыстае, пра што не хацеў бы нават ведаць, што яно ў табе тоіцца. Ці не таму так ахвотна паверылі, што ён сапраўды выдаў тую жанчыну? І як бы нават узрадаваліся такому факту, які апраўдваў, растлумачваў нашы да яго адносіны.

Рота пастроілася ісьці, навічок наважыўся стаць ззаду, да яго пад'ехаў на сваім прыгажуне кані Васіль Емяльянавіч:

— А ты куды сабраўся?

— З вамі.

— У нас повары-шаўцы ёсьць. Ня маем патрэбы.

Здавалася, з ротай у камісара поўная згода. Ды і ў мяне зь ім таксама. Таму я крыху зьдзівіўся, калі празь месяц ці два ў пасёлку Акцябарскі з возу, гружанага абрэзкамі дошак, нехта радасна мне крыкнуў:

— Добры дзень!

І як бы жадаючы ўзрадаваць:

— А я ў пякарні ў Міцькі!

«Міцька» — суседні атрад нашай жа брыгады. Самае дзіўнае: як ён мог пазнаць аднаго з паўсотні, што яго адверглі, не прынялі? Няўжо ў мяне неяк адрозьніваўся тады твар, позірк, што ён мог бы ўспрыняць як спачуваньне яму?

## 12

Блякада — такая штука, не дазваляе доўга на адным нечым затрымлівацца, спыняцца. Гоніць бязьлітасна наперад, нават калі і бегчы ўжо няма куды. І для Франца з Палінай, для тых, хто поруч, такі момант надышоў — бегчы няма куды, шчыльная страляніна навокал, зусім блізка, поруч. Іх узялі. Франц слухае, чуе, як людзі ў плашчах, плямістых накідках па-нямецку перамаўляюцца: што рабіць з злоўленымі бандытамі? Цягнуць іх цераз балота ці лепш — пакласьці на месцы. Тоўсты, у акулярах, яфрэйтар зь нечаканай упартасьцю пярэчыць старшаму афіцэру: зброі пры іх няма, іх трэба загнаць у лягер! Франц выгляду не падае, што разумее. Не хацеў, каб і Паліна ведала, аб чым змаўляюцца.

Так яны апынуліся ў лясным лягеры. Што за лягер, дзе гэта, ня ведалі, дрэнна арыентаваліся, але часта чулася, гучала слова: Азарычы.

Ішлі доўга, амаль цэлы дзень. Зноў і зноў ззаду рэзка стукалі стрэлы — гэта прыстрэльвалі тых, хто ўпаў, ня можа ісьці. Колькі разоў у Франца вось-вось маглі вырвацца нямецкія словы, зьвернутыя да тых, каго ён

павінен лічыць сваімі землякамі. Але ён маўчаў, хаваючыся за ўжо саромную, ужо ганебную сваю немату. Забраў у аслабелай жанчыны дзяўчынку, нёс яе на плячах, Паліна вяла дваіх за рукі. Дзяўчынка ўсё паўтарала, схіляючыся да вуха Франца: «Я не баюся, я не баюся, немец нас не застрэліць, ты, дзядзя, ня бойся».

Лягер — гэта адгароджаны калючым дротам кавалак забалочанага лесу, аніводнага барака, нават зямлянкі, людзі, іх тут незьлічоныя тысячы, стаяць, вяла пераходзяць зь месца на месца, мёртва ляжаць у халоднай гразі. Вельмі мала мужчын, нават старых, найбольш жанчыны зь дзецьмі. Здавалася, і тыдня пражыць тут немагчыма.

Пражылі ледзь не паўгода. Маці Лізы — дзяўчынкі, якую прынёс у лягер Франц, памерла ад тыфу. Цяпер дзяўчынка жыла пры Паліне і Францу. Цэлымі днямі, сіняя, вялікавокая, ляжала яна на абжытай імі лапінцы гнілой куп'істай зямлі, грэючыся ўсім, што жывыя забіраюць у памерлых, а яе прыёмныя бацькі таўкліся ля варот у надзеі дачакацца прывозу якой-небудзь ежы. Калі прыходзіла машына, паліцаі, немцы шпурлялі ў галодны натоўп падмерзлыя баханкі хлеба, стараючыся абавязкова патрапіць каму-небудзь у галаву бурачнымі «гранатамі» — проста ў твар, весяліліся, забаўляліся. Налятай, не зявай! І наляталі з апошняе сілы, затоптваючы тых, хто слабейшы, выхопліваючы хлеб, як уласнае жыцьцё, з чужых рук. Але затое якое шчасьце ў вачах дзіцяці (Лізы!), што бачыць хлеб у тваіх руках.

Франц, гледзячы на задаволеных сваёй сытасьцю і ўладай над тысячамі жыцьцяў ахоўнікаў, мог уявіць сябе на іх месцы. Ён таксама мог стаяць на вышцы з кулямётам, на машыне, цалячы з кулямёту ў Паліну, Лізу, забаўляцца стралянінай па іх усіх, шпурляць хлеб, як цагліны, ім у галаву. І быў бы ён таксама Франц — дык хто ж, што ж такое людзі.

Лізачка пратрымалася ўсяго толькі да першага сьнегу. Выбраўшыся з-пад гары брудных целагрэек, ка-

жухоў, глянула на белы саван, што пакрыў жывых і мёртвых у гэтым страшным лесе, сказала яшчэ: «Мама (Паліне), папрасі ў таты (у Франца) хлебца...» І памерла — з румянкам на змарнелым тварыку. Тыф, насьцігаючы чалавека нават на апошняй стадыі зьнясіленьня, успыхваў вось такім непраўдападобным румянкам, падманным, разьвітальным. Чалавек паміраў, і тады ўсе вошы выпаўзалі наверх, бегучы ад халоднай сьмерці на мароз. На памерлых жанчынах, што ляжаць па ўсім лесе, калі хустка ці кажух — дык шэрыя ад гэтай пошасьці.

Спачатку памерлых зьбіралі на павозкі, вывозілі да ям — ірвоў ля драцяной агароджы, а калі выпаў сьнег, ударылі маразы, і трупны смурод, што тхнуў у лесе на дзясятках гектараў, адступіў, гэтым перасталі займацца. І хлеб, нават гнілую бульбу амаль перасталі прывозіць. Ахова засела на сваіх вышках і ў бараках за дротам, а зачыненыя ў лягеры паўтрупы — у земляных норах, амаль не выпаўзалі, толькі зь некаторых ледзь прыкметна выходзіла на паверхню пара іх нямоглага дыханьня.

Цяпер толькі Паліна дзяжурыла ля варот зь некалькімі, такімі ж, як яна, чалавечымі істотамі, што зьмяніліся непазнавальна. Франц амаль не пакідаў бруднай земляной нары пад адзіным у гэтым кволым сасновым лесе дубам. Паліна, вяртаючыся з хлебам (а гэта было ўсё радзей і радзей), часам знаходзіла яго ўжо наверсе: цярпліва чакаў, а раптам не з пустымі рукамі. Як у свой час — Ліза. Вошы паверсе ўжо ішлі, самае жахлівае, яны нават на бровах у яго. А ён не заўважае, не разумее, што гэта перашкаджае яго вейкам, жаласна міргае — о, Божа, і гэта яе Франц! Глядзіць на яе рукі, на хлеб, як бы баючыся, што не дадуць, што яму не дастанецца. Як быццам Паліна калі-небудзь не дзялілася зь ім. Яна б і сваё аддала, але ня ёй жа адной трэба, а яшчэ і дзіцяці, іх дзіцяці. Часам здавалася, што ён ужо і нежывы там, нічым аб сабе не нагадвае. Бывае, аддаўшы ўвесь хлеб Францу (ён хапаў і тут жа поўз у нару),

яна падала на сьнег і плакала — ад крыўды на Франца. Як, як ён можа такім быць, так выглядаць перад ёю? Значыць, яму цяпер яе каханьне не патрэбна, яе павага. Анічога, акрамя кавалка хлеба.

## 13

Мой сябар-філёзаф злавіў удалую думку: а што калі палічыць, колькі разоў слова «раптам» і яго сынонімы сустракаюцца на адной старонцы ў розных аўтараў. Г. зн. як часта час-жыцьцё спатыкаецца на бягу. У прозе Пушкіна падкрэсьленыя чырвоным флямастарам словы мільгаюць толькі зрэдку, як верставыя слупы. У Талстога часьцей, але ў той жа рытмічнай пасьлядоўнасьці. І раптам запалалі старонкі! Гэта раман Дастаеўскага.

Ну а калі само жыцьцё можна было б вось так разьмеціць, уласнае ці нечае? Колькі разоў «раптам» на працягу дня? Павароты, рыўкі, нечаканыя падзеі. Ну а калі існаваньне, як у Франца з Палінай, калі нечаканасьцю не зьяўляецца ўжо і сьмерць? Яна — штодзённасьць, зьнікла мяжа, граніца паміж жыцьцём, быцьцём і нябытам.

У Азарыцкім лесе сам час спыніўся: здавалася, нічога ўжо ня можа здарыцца. Памрэш — дык хіба гэта падзея?

Раз у некалькі сутак зь ямы пад каранямі дуба, па краях якое брудная наледзь (быццам і дыханьне ўжо нячыстае), выпаўзала непраўдападобная істота, мяркуючы па апратцы і шматах валасоў, што тырчалі з-пад хусткі, жанчына, не адразу выпросталася, нейкі час яна абапіралася дзьвюма рукамі аб дрэва. Затым, перабіраючы імі па ствале, выпросталася і, нарэшце, адштурхнуўшыся, пачынала рухацца... бягом. Але толькі пяць-дзесяць крокаў, і тут жа падала: ногі не пасьпявалі за целам. І ўсё пачыналася спачатку. Твар... У твар, у вочы лепш не зазіраць. Пашкадуем Паліну.

І ня станем зазіраць у нару, дзе бязвылазна ўжо ляжыць той, хто быў Францам.

Але ўжо сьвеціць па-вясноваму сонца. І нейкія гукі даносяцца ўранку ў гэты мёртвы лес з таго боку, адкуль яно ўздымаецца. Людзі, якія рухаліся і жылі па-за лягерам, маячылі на вышках, рабіліся ўсё больш неспакойнымі і задуменнымі. Але ня будзем і ў гэтыя твары зазіраць — што нам да іх? Мала яны нянавісьці атрымалі і мелі, ці што? Хаця нікому ад гэтага не лягчэй.

І раптам нешта адбылося ў сьвеце, зь якога, здавалася, назаўсёды пайшло яно, вялікае РАПТАМ. Паліна сяк-так дапаўзла да бруднай пляцоўкі блізка ля варотаў, убачыла звыклы натоўп з адных жанчын, нарыхтавалася чакаць, спадзявацца на цуд зьяўленьня хлеба, як дарэмна чакала некалькі апошніх дзён. Але што гэта, куды ўсе так напружана і ашалела глядзяць? Глянула і яна, нічога не зразумела: вароты расчыненыя насьцеж і аніводнага ахоўніка навокал! Цішыня невераемная.

Людзі як быццам пабачылі некага там, за варотамі, на гразкай дарозе, што ішла ў лясную далеч, — закрычалі і пабеглі. Блытаючыся ва ўласных нагах, хістаючыся, некаторыя бабы падалі і ўзьняцца ня мелі сілы. Гэта быў дзіўны бег, як у сьне, калі сэрца выскоквае ад шпаркіх удараў, а ногі ледзь-ледзь варушацца. Калі б Паліна азірнулася, яна пабачыла б, што іншыя бягуць назад, у свой лес, да пакінутых там дзяцей і блізкіх. Але такіх было няшмат. Астатнія ня помнілі ў той міг нічога і адно бачылі расчыненыя вароты. І нават калі пачуліся першыя выбухі на дарозе, на паляне (беглі, рассыпаўшыся шырока), не спыніліся. Нічога не разумелі, а потым пачуліся крыкі: «Мі-іны! Людзі, мі-іны!»

І тут ірванула каля Паліны, не пад ёй, а пад старым, што бег напердзе, смуродам і агнём паласнула яе па вачах, па твары. Зацiснуўшы твар далонямі, рукамі, упала ў гразь. І паклікала:

— Мама!

Успомніла і нячутна сказала:

— Даруй, Франц.

Хто яе падняў, хто вёў назад, яна ня бачыла: вочы заляпіла, ёй здавалася, гэта кроў перашкаджае глядзець, зьліпліся пальцы, якімі закрывала твар. Галасы навокал, крыкі былі спалоханыя, але ўсё роўна радасныя. Ёй трэба было пачуць Франца, яго голас. Нехта стагнаў побач, а жанчына пранізьліва крычала, падумалася: як парадзіха! І пра свайго: спужаўся, маленькі? Гэта мама твая вінаватая, усё мама!..

Франца яна выглядзела з машыны. Перад гэтым загуло, і зноў закрычалі, усё так жа незразумела радасна. Паліна ў жаху, у адчаі церла вочы, сьцірала кроў, ліпкую цёплую заслону, каб убачыць, каб глядзець — шчымеў твар, скура на левай шчацэ, на шыі і лбе, правым вокам чула сьвятло, ды і толькі.

Потым каля яе пачуліся забыта спакойныя чалавечыя галасы, нехта кранаў яе твар мужчынскімі, з пахам тытуню, пальцамі, прасілі яе прыбраць свае рукі.

— Правае цэлае, здаецца... — пачула яна. Моцна запахла аптэкай, нечым халодным-халодным змачылі твар. Яна моцна прымружыла павекі, усё спадзеючыся: вось зробяць так і так — расплюшчыць вочы і будзе бачыць. І праўда — правым разгледзела высокага ваеннага ў шэрым шынялі, непраўдападобна тоўстую кабету ў белым халаце ўзьверх целагрэйкі.

— Перавяжыце — і на машыну. Астатняе потым, — загадаў ваенны і адышоў да іншых.

З машыны і выглядзела Франца. Твар яе, пачварна і цёпла загорнуты ў вату, бінты, але адно вока расплюшчана. Пабачыла: стаіць адзаду за ўсімі, позірк тупа-разгублены, не, як у забытага, згубленага дзіцяці. Выгляд жудасны. Як бы цяпер толькі пабачыла напраўду ўсё. Тоўстая кабета ў халаце нецярпліва азірнулася на яе вокрык.

— Ну што там? Вы каго клічаце? Муж? Гэта які, хто? Нямы? Дзе тут нямы? Хто муж гэтай жанчыны? Давайце яго на гэтую машыну.

# 14

Калі вучыўся ў Менскім унівэрсытэце, у нашым пакоі на вуліцы Няміга былі адны толькі франтавікі і нядаўнія партызаны. Як і ў многіх іншых пакоях. Наш асабліва знакаміты быў баяністам — Іван Іванавіч зь фізмату. Усе танцы на калідоры мяцелілі пад яго музыку. На вясельлях рэпэртуар Іван Іванавіч вытрымліваў строга клясычны. Па адным зводзілі нявесты-жонкі нашых франтавікоў-партызан, і праводзіў іх у мірнае жыцьцё Іван Іванавіч маршамі: з «Аіды», з «Фаўста». Толькі потым, пазьней, мы гэта пачулі ў выкананьні сымфанічных аркестраў.

А вось на яго вясельлі нашых было мала. Па-мойму, не захацеў нас бачыць у сябе. А дакладней, каб мы бачылі.

Толькі ў дзень яго пахаваньня, Івана Іванавіча — праз доўгія гады, — я пабачыў яго жонку, пабываў у кватэры. Ляжаў ён у труне ў такім нязвыклым на ім касьцюме (заўсёды ж у чорнай, усё адной і той жа, гімнасьцёрцы), а на крэсьле каля яго сядзела жанчына, увесь час адвярнуўшыся. Я ведаў, мы ведалі, а тут я ўпершыню разгледзеў: шчака чорная, як застаецца ад блізкага выбуху, вока адно жудасна нерухомае, устаўное. Ёй самой, магчыма, было ўсё роўна, як яна выглядае, адварочвалася ж (раптам падумалася) д з е л я н я б о ж ч ы к а. Раз ён ня клікаў нас да сябе, значыць, не хацеў, каб бачылі.

А ведалі ж яго гісторыю, на рэдкасьць рамантычную ў наш ня дужа рамантычны час. Помню, я перажываў яе амаль са сьлязой, калі неяк пачуў. Сам ён і расказаў. У групе яго падрыўнікоў, якую Ваня вадзіў на «жалезку», той раз апынулася ў ёй, магчыма, сама напрасілася, гэта здаралася, маладзенькая дзяўчына. Калі адыходзілі пасьля ўзрыву эшалёну, уцякалі, яна напаролася на міну. Некалькі вёрст ён нёс яе на руках. Успамінаючы, сказаў: «Прыціснулася, худзенькая, дрыжыць, як

дзіця...». Вось гэтая памяць іх і пажаніла. Мабыць, ён ганарыўся сваім учынкам: ня тым, ля чыгункі, а пасьляваенным. А былі ці не шчасьлівымі — хто ведае? Было гора на твары ўдавы, але дабраты, здаецца, няшмат. А Ваня і запіваў моцна і ўвесь час на сухоты хварэў. Сын іх трапіў у турму, на пахаваньні бацькі яго не было.

Каб за ўсё добрае ўздавалася поўнаю меркаю — было б проста жыць. А жыцьцё ня простае.

## 15

На сконе лета 1944 году над размытымі і зарослымі лебядой папялішчамі Петухоў чуўся адзінокі гук. Нямоцны, вялы, як бывае, калі счэсваюць кару, звонкі, сухі, калі проста на зрубе высякаюць канаўку, каб пакласьці мох, — дзеля злучэньня з наступным вянцом бярвёнаў.

На ўзьлеску стаяць двое і ўслухоўваюцца. Зрэшты, іх трое — на руках у жанчыны, загорнутае ў марлевы шматок, прыкметна забруджаны, сьпіць малое. І хусьцінка на галаве ў жанчыны з марлі, ад гэтага асабліва прыкметныя чорныя крапінкі на зьнявечанай левай шчацэ, на лбе. Ля ног мужчыны армейскі рэчмяшок, сам ён у рускім шынялі, як на яго кароткім, увесь у бурых плямах, заношаным.

— Гэта татка, мой татка! — шэптам ускрыквае жанчына. — Я як голас яго чую.

— І прыйшлі яны ў Бэтлеем...

— Мне ня верыцца, што мы зноў тут!

— І прыйшлі ў Бэтлеем, бо казаў Аўгуст адправіцца кожнаму туды, дзе нарадзіўся. Язэп пайшоў запісацца з Марыяй, абручонаю яму...

Па дарозе Франц ужо некалькі разоў узгадваў пра біблейскі перапіс, а наогул жа яны з Палінай вельмі ўзрадаваліся, калі ў ваенным шпіталі ім выдалі паперку,

адну на дваіх (са згадкай пра дзіця): «Пераправаджаюцца па месцы даваеннага пражываньня».

У тым шпіталі яны прыжыліся надоўга. Франц працаваў на нарыхтоўцы дроваў, Паліна, крыху акрыяўшы, пры кухні і санітаркай, а затым надышоў час раджаць. Выявіла, што за час, пакуль хварэла, яе «нямко» стаў агульным любімцам у шпіталі, мэдсёстры яго шкадавалі, падкормлівалі. Нават прыраўнавала:

— Ты цяпер мяне такую памяняеш. Я ведаю.

А Франц усьміхаўся так, што хацелася верыць: пачварна склеенае яе вока і гэтая жахлівая чарната, якую ня змыць з шчакі, для Франца як бы нябачныя.

Стары Кучэра здалёк убачыў і стаў углядацца: што гэта за жанчына так сьпяшае, кіруючы да яго селішча, сядзібы. Белая хусьцінка то ўзьнікае, то хаваецца ў бярозавай зяляніне. Апошні раз цюкнуў сякерай і, ня злазячы з высокага зрубу, сачыў за жывой плямай вачыма, стомленымі ад шматдзённага бязьлюдзьдзя. Калі ўбачыў на руках у жанчыны дзіця, нясьмелая думка — а раптам Паліна? — стала чэзнуць. Але ўсё адно цікава, хто гэта — а раптам знайшоўся яшчэ адзін петухоўскі жыхар?

Паліна ўжо бачыла, пазнала бацьку: галава зусімзусім белая, а твар прыгожа-загарэлы і вусы, барада ўсё яшчэ цёмныя. Татка, татка! Камяк сьлёз не выпускаў голасу, крыку.

І калі яна выбегла з кустоў з заплаканым дзіцём, якому перадалося хваляваньне, і выкрыкнула-ткі: «Тата!», — стары невядома як апынуўся на доле. Кульгаючы (Паліна спужалася, што стукнуўся, зьлятаючы з зрубу), рушыў ёй насустрач. Паліна, дачка! Але што гэта ў яе з тварам, з шчакой? І чыё малое на руках? Як жа яна нагадвае сваю маму! Маладую, беламорканальскую.

— А донька мая, а што з табою зрабілася! — падобна па сабе загаласіў бацька. Абняў яе разам зь дзіцём. — Ну нічога, нічога, галоўнае, жывыя, сустрэліся. А дзе ж мамка, жывая?

Паліна, павярнуўшыся, паглядзела на тое месца,

дзе яны з Францам пакінулі ўзгорачак-магілу, там усё парасло бур'янам, травой.

— Дык гэта яна? Я чамусьці так і падумаў. Так і падумаў.

— Мы тут вырашылі пахаваць, — Паліна сказала «мы» і азірнулася ў бок узьлеску. Франц там, чакае, калі паклічуць.

— А Паўлік? Ён што, у арміі? — у сваю чаргу спытала ў бацькі.

— Пайшоў наш Павал, сказаў, пайду дабіваць зьвера ў логаве. Некаторых пакідалі працаваць у раёне, а ён: пайду дабіваць. І вось...

Стаў шнарыць у кішэнях, затым махнуў рукой у бок буданчыка, каля якога валяюцца апраткі, кацялок стаіць з лыжкай, вядро.

— Там пахаронка. На Вісьле склаў галаву наш Паўлік.

Відаць, каб ня даць ёй заплакаць, тут жа спытаў у Паліны пра дзіця, якое моўчкі, ацэньваючы, вывучала дзеда.

— Тваё?

— Наш Паўлік, — знарок націск зрабіла: наш! — Мы яго так назвалі. О, Божа, як быццам адчувала!

— А бацька хто?

— Тут, тут, таксама прыйшоў, — Паліна паказала на лес. — А што ў вас з нагой?

— Ды крыху мінай зачапіла.

— І мяне, татка, во, бачыш! Але Франц кажа, што затое не згублюся, прыкметная.

І заплакала.

— Ну нічога, нічога. Затое во які ў вас харашун! Франц, кажаш? Што ж ён у лесе хаваецца, як салавей-разбойнік?

— Ой, я вам усё, усё растлумачу. Мама вам тое ж самае сказала б. Яны так пасябравалі.

— Чакай, чакай! Мне Павал расказваў... Дык гэта ён?!

— Так, ён, татка.

— Не-мец? Вось не чакаў, не гадаў! Ведаў, што адчайная ты ў нас галава, але каб на такое адважыцца! Ты кеміш, што пра цябе людзі казаць будуць? Як жыць нам цяпер? Тое і яно, што хаваецца ў лесе. Так і будзем жыць, дачка?

— Пабачыш, татка, пабачыш, які ён! Вы што, вось так адзін гэты зруб і складваеце?

— Дзякуй, хоць лес памаглі вывезьці ваякі... Ага, дык гэта ты мне памочніка прывяла?

— Накіравалі нас — «па месцы жыхарства». І дакумэнт ёсьць. Ён такі старанны, Франц, такі рукасты, лекары проста ўлюбіліся ў яго.

— Ну а ты, ясная справа, тым больш. Значыць, гэта ён вас выратаваў тады? Ну што ж цяпер рабіць будзеш? Кліч свайго салаўя-разбойніка. Будзем разьбірацца.

Пакуль да іх набліжаўся немец-заяц, пакліканы радасным голасам любімай дачкі, партызан Кучэра зь нейкім нутраным нэрвовым сьмяшком зноў прабягаў сваё жыцьцё: нічога ня скажаш, толькі гэтага яму яшчэ не хапала!

— Дзень добры, Іосіф Герасімавіч! — сьціпла і зусім па-тутэйшаму павітаўся цыбаты дзяцюк у заношаным рускім шынялі, галава кароткаголеная — так выглядалі савецкія ваеннапалонныя ў 41-м. Што ж у ім ад немца засталося?

— Добры, кажаш, дзень? Што ж, будзем спадзявацца. А за іх — дзякуй! — паказаў на Паліну, глянуў на магілу жонкі. — Лёс, значыць, такі. Добры ў вас хлапчына, унё, чмыхае, як сярдзіты вожык.

— Ой, праўда, татка! — узрадавалася Паліна, што так усё добра складваецца. — Ніколі ня плача, адно сярдуе, калі галодны.

— Ты што, — спытаў Кучэра ў Франца, — камуніст? Рот фронт, як гаворыцца?

— Найн... Не. Хрысьціянін. Бацька ў мяне пастар.

— Гэта тое ж, што сьвятар, татка.

— Ведаю, ксёндз. Я пра камуністаў сказаў, бо іх раней з палону дамоў адпусьцяць.

— Прычым тут палон, татка? Франц не ў палоне. Ён з намі.

— З намі-то з намі. Калі, вядома, атрымаецца. Чалавек плянуе, а ўлада руйнуе.

— Не за дрот жа яму ісьці!

— Ворагу не пажадаю, ты мяне, дачка, не хапай за вусы. Вось так, Франц, — усё-ткі не ўтрываў партызан Кучэра, — вашы марылі савецкіх бачыць палоннымі, цяпер самім даводзіцца. Ты курыш? Паліш? Як кажуць нашы і вашы суседзі на Вісьле?

Выграб з кішэні зялёнага нямецкага фрэнчу, што валяўся ля буданчыка, нейкую залезку, крэмень, сушаную чагу-цэру, мэталічную масьлёнку, зь якой на лапік газэціны сыпануў тытуню, згарнуў цыгарку і ўзяўся здабываць агонь.

— Кацюша, — паведаміў Францу, — дзівосы тэхнікі!

Агулам здабылі, высеклі агонь. Немец старанна трымаў сухі кнот, ловячы іскры. Затым сам выштукаваў сабе цыгарку і прыкурыў у цесьця.

— Трубка міру! — сказаў крыху зьбянтэжана.

— А ты нічога сабе хлапчына! — прыкінуў Кучэра. — Глядзі, што і пражывем. Сьмеху дзеля.

## 16

Так і зажылі ўчатырох на пажарышчы вёскі Петухі. Паліна, трымаючы на вачах Паўліка, гаспадарыла «па дому», а гэта — увесь сад, агарод, насьпех складзеная печка, на месцы лазенкі, адным словам, усё, акрамя хаты. А хату вось-вось падвядуць пад страху яе мужыкі.

Прыбіўся да іх сабака, спачатку напужаў Паліну: воўк! Вушы тырчма, морда рыжая, амаль сівая — Паліна адразу прыгадала таго, што з мосту на яе глядзеў: ці ня ён? Сабака-«воўк» круціўся воддаль: ляжа пад

кустом і глядзіць. А то раптам прабяжыць, ну зусім поруч, зазіраючы людзям у вочы. Яшчэ ўкрадзе хлопчыка! — пужалася Паліна. Хаця б яго адагналі мужчыны! А аднойчы, калі абедалі, падышоў нерашуча на адлегласьць рукі і, скавычучы, лёг ля старога Кучэры.

— Ну і правільна, — спакойна сказаў стары, — куды табе безь людзей? Гэта ж ён просіцца назад да нас. Бачыш, і сабака ня хоча быць воўкам. Як цябе будзем клікаць? Усё-ткі: Воўк. Добра? Ну мы гэта знарок. Мы ж ведаем, хто ты. А дрэнныя людзі няхай думаюць.

Так і прыжыўся воўкападобны сабака. Але Паліна не адразу паверыла ў яго сабачую пароду. Затое Паўлік з Воўкам пасябравалі імгненна. Вялізарны сабака як бы з павагі да пачуцьцяў маці стараніўся яго, але больш дзеля выгляду. Глядзіць пры гэтым на жанчыну: «Бачыш, гэта ён сам, я тут ні пры чым!»

Стары Кучэра і Франц ужо канчалі ставіць дом.

— Не, вы, немцы, што ваяваць, што будаваць, — майстры! — зьнізу казаў Кучэра падаючы крокву. — Як жа вы з гэтым Гітлерам лажануліся? Хаця хіба вы адны?

Бацька часта езьдзіў у раённы цэнтар — па цьвікі, інвалідны паёк забраць, прывозіў газэты. Выходзіў на шлях, гэта вярсты са тры ад Петухоў, там лавіў папутку. Вяртаўся часам і вясёлы. У «раёне» ў яго сябры-партызаны, многія начальнікамі парабіліся.

А аднойчы вярнуўся такі падаўлены і ўстрывожаны, што Паліна адразу заўважыла, спалохалася: што, што-небудзь з Францам?..

— Ды жыў будзе твой Франц. Проста стаміўся я.

Не схацеў расказаць дачцэ. Што з таго, калі і яна будзе нэрвавацца? А здарылася вось што. Ля гасмагу сустрэў яго ваенком, аднарукі капітан: зайдзі, мэдаль табе ўручым! Партызанскі. Ня кожны дзень былому зэку мэдалі выдаюць — выкраіў час і забег у дом зь цёмна-чырвонай цэглы. А капітан павёў сябе нейк непуцёва. Сказаў пагуляць яшчэ з гадзіну, ён, маўляў, заняты, ня можа

адарвацца ад іншых справаў. А калі паўторна прыйшоў Кучэра, там сядзеў яшчэ адзін вайсковец, пухлы, як баба, маёр у лётчыцкіх пагонах. Скуль у такой дзірцы ды такія лётчыкі? Ну лётчык дык лётчык — дзе ж абяцаны мэдаль? Ажно ваенком зьвязаўся з райкомам, а там узьнікла ідэя правесьці гэтую справу арганізавана: уручыць прынародна ўсім адразу. Капітан чамусьці вельмі мітусіўся, а лётчык вывучаў Кучэру зь вялікай цікаўнасьцю, як быццам яны знаёмыя былі і зараз: га, ды гэта ты! — абдымуцца. Але ня кінуліся адзін аднаму ў абдымкі, а Кучэра пайшоў, чамусьці ненавідзячы лётчыка. Гэта які ж самалёт патрэбен, якая кабіна пад такога кныра?

Зноў стала праблемай: як быць з Францам? Дзе начаваць яму, што адказваць, калі хто-небудзь усур'ёз зацікавіцца нямым зяцем Кучэры? А калі самім Кучэрам зноў зацікавіліся (хутчэй за ўсё гэта!) ды знойдуць у яго хаце беглага немца — быць таму лётчыку падпалкоўнікам, калі не вышэй. Ці не занадта для яго?

І што стане з Палінай, з хлопчыкам: нямецкая подсьцілка! Нямецкі байструк! Мала што немцы зьнявечылі дзеўку, цяпер гэтыя будуць зьдзекавацца. Аб сабе самім Кучэра, здавалася, ужо ня дужа непакоіўся. Бярыце, жарыце з усім дзярмом, калі вы ніяк не нажарацеся! Калі ўсё жыцьцё дабіраецеся, супынку на вас няма!

Зноўку беднаму Францу начлег сталі ладаваць асобна, хацелі нават у лесе, а затым прыстасавалі дзеля гэтага незгарэлы хлевушок на чужой сялібе — гэта называлася: пайшоў Франц у прымы! Паліна яго праводзіла ды і заставалася зь ім часам. А хлопчык спаў зь дзедам. Тлумачэньне для іх Кучэра прыдумаў такое: усюды шнарацць, адлоўліваюць паліцэйскіх, дэзэртыраў, могуць і сюды набрысьці. І яшчэ адну рэч прадугледзеў Кучэра: так расплянаваць пакоі і каморкі ў новай хаце, каб у Франца была свая хованка. Не звыкаць гэта рабіць: навучылі фашысты, а яшчэ раней — і свае.

Кучэру час ад часу наведваў ягоны партызанскі сябрук — заўсёды ружовы, заўсёды вясёлы і шумны Каля-

да Віктар. Працаваў ён недзе ў леспрамгасе, няблізка, а тут вучылася дачка ў тэхнікуме: прывозіў ёй бульбу, рыбу, называючы гэта «дзяржпастаўкай». І штораз заверне ў былыя Петухі, і абавязкова з сваім «гаручым». Не расказвайце мне казкі, што зяць ня п'е! Ня п'юць або скнары, або хворыя. Ты што хочаш, Кучэра, каб пра зяця твайго такая пагалоска пайшла? А што нямко, дык ён у нас адразу разгаворыцца ад «палескай бранябойнай».

Усю тайну Кучэра нават сябру ня выдаў, хаця на ўсякі выпадак загаворваў зь ім, што, маўляў, калі што, памажы маладым. Хаця б перабрацца ў твой леспрамгас, калі там і праўда так вольна вам жывецца. А што што? Нічога такога. Але ўсе пад Богам ходзім. І пад НКВД. Пра даваеннае Каляда ловіць з паўслова. У партызанах абмяркоўвалі амаль адкрыта. І нават цяпер артачыцца Віктар Каляда: нас, партызанаў, лепш не чапайце, мы і фашыстаў не збаяліся! Фашыстаў — так, але гэтыя дастануць цябе гэтак, што забудзеш, хто і што ты.

Пагрозіцца, пабалакае Каляда і як бы весялей жыць.

— Добра табе, Паліна, ты свайму мужыку што ні кажы, а ён у адказ маўчок. Вось бы маёй такое шчасьце. Ці мне. У маім доме ніхто ня змоўчыць. Гэта як каму пашэнціць. Вось гэтыя два пальцы, якая мне карысьць ад такой рукі (на правай у яго толькі два пальцы засталося), а вось Чэрчылю б такую: вікторыя! Перамога!

Дарэчы, калі паў Бэрлін і нават да Петухоў даляцела: Перамога! — вырашылі адзначыць. Якраз і ўлазіны пасьпелі. «Дом як звон!» — любы сказаў бы. Але ня кожнаму дадзена даведацца, што дом гэты з сакрэтам. Франц, выявілася, прыроджаны майстар па дрэве. Кучэра крыху скіраваў, а далей ужо сам за ім ледзьве пасьпяваў. Францава прыдумка: дзьверы ў сакрэтную камору-прасьценак зрабіць у выглядзе жалюзі. Дошчачка за дошчачку заходзіць, узьняў, апусьціў — і ты ў прасьценку, як у пэнале, усіх чуеш, а цябе ня бачаць.

Дом яшчэ пуставаты, але стол ёсьць, лаўкі ўздоўж

сьцен, ложак, нават шафа. Ёсьць на што сесьці, за што сесьці. А тым больш — вайне канец. Тут і без падганяньня Каляды вып'еш. Калі ёсьць што. Знайшлося. Паліна першая ўзьняла сваю кропельку ў шклянцы:

— Каб нашым дзецям таго ня ведаць, што нам давялося.

Мужчыны міжволі паглядзелі на Паўліка, што самавіта сядзеў за сталом, і на яе ўжо такі прыкметны, «новы жывот». Ловячы ўсьмешку Паліны, Франц раптам скеміў: гэта ж Моны Лізы ўсьмешка, павернутая, зьвернутая ў сябе! Ды ніякай іншай «загадкі» Моны Лізы не існуе — акрамя таямніцы яе цяжарнасьці. У гэтым разгадка Джаконды: маці, што ўсьмешкай гамоніць зь дзіцём, якое ў ёй. (Вось што ён скажа бацьку, калі зноў яго пабачыць. І ня ў Луўры, а ў Петухах прыйшло да яго гэтае разуменьне.)

Як бы злавіўшы нешта ў яго думках, стары Кучэра ўзьняў шклянку:

— За тваіх, Франц, бацькоў. Каб сустрэліся вы.

Франц устаў, пастаяў. І сеў.

— Ну і правільна, — згадзіўся Кучэра, — вып'ем моўчкі.

— Не, паспрабую, — зноў прыўстаў Франц. Пастаяў, падумаў. — Я забіў чалавека. Каб жыў у Германіі, лічылася б: забіў немца. Тут: забіў нацыста. Але і так і так: чалавека. Калі па Эвангельлі. Я толькі ня ведаю, на кім той габрэй.

— Не на табе, Франц, не на табе! — звыкла засьпяшалася на дапамогу Паліна.

Франц нявесела ўсьміхнуўся:

— Хіба што групавое. Але такое злачынства ацэньваецца нават зямным судом стражэй. Толькі б на іх ня ўпала.

І зноў паглядзеў на Паўліка і на жывот Моны Лізы.

## 17

І трэба ж каб яны сваю дзяржаўную справу прымеркавалі да таго часу, калі Паліне прысьпела раджаць.

Кучэра і Франц, абодва аднолькава разгубленыя, грэлі ў чыгунках ваду, а Паліна, лежачы ў пасьцелі, саромеючыся сябе, саромеючыся бацькі, распараджалася, што трэба падрыхтаваць, з чым быць напагатове, калі гэта і сапраўды роды. Зьбіраліся праз тыдзень запрасіць вопытную бабку з суседняй вёскі, каб пажыла ў доме, чакаючы тэрміну. А тут, на табе, пачалося! Цяпер разьлічваць даводзіцца толькі на сябе — ёсьць з чаго разгубіцца. На вуліцы забрахаў Воўк, па вокнах паласнула сьвятло ад машыны, што пад'яжджала. Хутка ў тайнік — гэта яны! Ня крыкнуў, а паказаў Францу рукой, зьбялелым тварам Кучэра. І дачцэ:

— Нічога, нічога. Ты толькі не палохайся. Гэта ў іх да мяне гаворка. Па старых справах. А са мной нічога ня зробяць.

І тут пад вакном ударыла аўтаматная чарга.

У свой час Іосіфа Кучэру арыштавала ОГПУ, затым НКВД. Цяпер да хаты пад'ехала МГБ — у асобе маёра Кароткага і двух яго малодшых супрацоўнікаў. Тым самым Кучэру аказвалася некаторая павага. Усё-ткі партызан, у яго магла захавацца зброя. Можна было б выклікаць пад нейкай зачэпкай у раён і там арыштаваць. Але раптам западозрыць нядобрае і зьнікне — лес жа побач, для партызана звыклы. Але нават ня гэта галоўнае. Нехта не паверыў бы, але маёр Кароткі ведаў: тут не шараговы выпадак, тут высокая палітыка дыктуе правілы, паводзіны. У кіраўнікоў МГБ на самым версе (а з гэтымі не да жартаў!) умацавалася перакананьне (падмацаванае сустрэчнай інфармацыяй зь месцаў), што быў дапушчаны пралік, калі не палітычная памылка, раз у вызваленай ад акупантаў рэспубліцы, у сталіцы і на месцах, многія партыйныя і савецкія пасады аддадзеныя былі партызанскім камандзірам і наогул усёй гэтай партызанскай

ніз...брацыі. Лічылася: яны лепш ведаюць абстаноўку і людзей, былі тут у вайну, добра арыентуюцца. Так яно ўсё, ды толькі Лаўрэнці Паўлавіч ужо ў час вайны ня дужа ім усім давяраў. Таму і засылаў свае спэцатрады з добра правераных людзей. Але за ўсімі ўсачыць было немагчыма. У іх, у мясцовых, склалася і наладзілася свая сыстэма сувязяў і кадравых ацэнак людзей. Якая падмяняе ідучую з Цэнтру, часам нават з нахабнымі спробамі самастойнага выхаду на Сталіна. Колькі гадоў спатрэбілася Іосіфу Вісарыёнавічу, колькі намаганьняў каштавала тым жа органам, каб раскалоць глыбы сувязяў часоў грамадзянскай вайны, дамагчыся, каб ніці, цягі ад улады ішлі выключна зьверху ўніз, а ніяк не па гарызанталі. Калі замест строга кантраляваных узаемаадносін на ўсіх узроўнях пачынае панаваць Сыстэма: «Вась-Вась». Я яго ведаю, я яму веру! Як быццам гэта не кампэтэнцыя выключна органаў: ведаць, каму верыць, а каму не. Там былі сувязі непатапляльных і тых, якія палічылі, што яны непатапляльныя, Чапаевых. І калі з тымі саўладалі, дык ужо з гэтымі, ды пры накопленым вопыце!.. Яны, дурні, разьлічваюць, што Сталін іх падтрымлівае. Гэта каго ж — закаранелых тэрарыстаў? Гэтых якраз Іосіф Вісарыёнавіч больш за ўсё і любіць.

Вось і мясцовы выпадак, прыклад. Органы, вядучы працу па выяўленьню тых, хто, скарыстаўшы напад ворага, уцёк з турмаў, з-пад аховы, выйшлі на сьлед Кучэры Іосіфа. Вядома, ён прыкрываецца тым, што партызаніў. (Іншыя пабывалі на фронце, а некаторыя і ордэнаў нахапалі.) Але ёсьць рэвалюцыйны правапарадак. Раней атрымай заслужанае, а потым будзем пра новыя посьпехі твае гаварыць. Асабліва калі і посьпехі — з разьлікам прыкрыцца. Вось тут у іх запрацавала сыстэма: «Вась-Вась». Амбіцыі партызанскія. Усе яны былі на акупаванай тэрыторыі, у кантакце з ворагам. Каго пакідалі, а хто і сам застаўся. Яшчэ трэба разабрацца, навошта, зь якой мэтай. З-за нейкага Кучэры і ўжо, калі ласка, канфлікт, заступаюцца, умешваюцца ў працу органаў. І

нават у саміх органах знаходзяцца такія. Туды таксама насовалі сваіх партызанчыкаў.

Чуваць гаворкі, што да самога Сталіна дайшла патрэбная інфармацыя. І нібыта Іосіф Вісарыёнавіч папыхкаў люлькай, пасмактаў і прамовіў такія словы:

— Партызанам і партызанкам слава! Якія аддалі жыцьцё за чэсьць і незалежнасьць савецкай радзімы. Ну а хто прымазаўся, на гэтых у нас ёсьць праверадыя бальшавіцкія мэтады.

Маёр Кароткі пакінуты быў у раёне, калі разгортвала сваю сець армейская контрразьведка. Па вось столькі нахлёбаўся гэтых мясцовых амбіцыяў, замаскаванага нацыяналізму. Спыталі б яго тыя, хто вырашае, ён бы растлумачыў, адкуль ногі растуць.

Так што акцыя: арышт скрытага ворага народу — ня проста выняцьце нейкага калгасьніка, а ўдар па парадках, што склаліся. І таму паехаў на заданьне сам маёр Кароткі. А перад гэтым не паленаваўся, схадзіў у ваенкамат на апазнаньне, куды па ўказаньню органаў залучылі гэтага партызана.

Паездка атрымалася, аднак, невясёлая. І не ў самой акцыі справа тут, прычына, а ў барадаўцы. Некалькі дзён назад ён зьвярнуўся да знаёмага лекара, проста на вуліцы сустрэў яго і абыякава спытаў, паказаў: што гэта за храновіна ў мяне там пад каўняром? І адэкалёнам, і ёдам прыпальваў — не праходзіць. Той паглядзеў, адцягнуўшы каўнер лётчыцкага мундзіру: не хачу пужаць, але гісталягічны аналіз зрабіць трэба. Адшчыпнём і пашлём у абласную лябараторыю. А прыпальваць ня варта. Сэрца адразу ўпала. Не паленаваўся, у той жа дзень заехаў у больніцу. Ужо пяць прайшло дзён — а трэба дзесяць, каб быў вынік. Не хацелася нічога рабіць, так бы і ляжаў дома, чакаючы вестак, добрых ці злых. Але гэта ня выхад. З шарыкаў скоцісься. Вырашыў паскорыць апэрацыю з Кучэрам, каб пазбыцца цяжкіх думак. У машыне ўвесь час яму не хапала люстэрка, апошнія дні заняты быў тым, што станавіўся перад трумо, ручное люстэрка

заносіў за голаў і ўглядаўся ў злавесную расколатую барадаўку. Чорная, як п'яўка, гадзіна! Перад дарогай заляпілі плястырам, каб ня так шчымела, каб ня муляць яе, паню. Ты яе не непакоіш, дык яна цябе. Пра якія гэта «прадаўгаватыя клеткі» гаварылі, шапталіся гэтыя мярзотнікі-лекары ў яго за сьпінай?

Да патрэбнае хаты, да гэтых Петухоў, дабіраліся лесам, магутны амэрыканскі «додж» выхопліваў сьвятлом крутыя павароты. У такіх паездках маёр Кароткі звычайна адчуваў сябе цудоўна, ведаў, што выконвае працу зь немалой рызыкай: колькі поўзае яшчэ пасьледкаў, недабіткаў, пакінутых тут акупацыяй. Гэта жывіла, павышала пачуцьцё самапавагі. Ніколі б не паверыў, што нейкая барадаўка здасца страшнейшай за бандыта з-за куста. І вось, калі ласка, не глядзіць на дарогу, а ўсё прыслухоўваецца: як там, пад каўняром? Шчыміць яшчэ больш. Ад штуршкоў, торганьня плястыр адклеіўся — лекары, такую вашу!

Таму, калі насустрач машыне кінуўся вялізны сабака, маёр, не раздумваючы, загадаў:

— Страляй!

Проста з кабіны сабаку расстралялі аўтаматнай чаргой.

Дзьверы былі не зачыненыя, што маёру не спадабалася. Быў у гэтым нейкі выклік, самаўпэўненасьць гаспадара.

— Сьмела жывём! — замест «добры дзень!»

— Немцаў прагналі, у сябе дома каго нам баяцца? — адказаў невысокі, маёру ўжо знаёмы, стары. Сівая галава, а вусы, бародка цёмныя, быццам падфарбаваныя. Інтэлігента зь сябе строіць.

— Сабака не прывязаны. Давялося прывязаць нам.

— Значыць, маеце права, калі страляеце.

— А гэта хто ў вас?

— Дачка. Выбачайце, раджаць надумалася.

Бач, усё з падкавыркай, са зьдзекам. Паглядзім, паглядзім, як засьпяваеш.

— Ёсьць яшчэ хто-небудзь?

— Сынок на печцы. Мой унучак.

— А муж?

— Мужы цяпер, самі ведаеце...

Маёр ня стаў дамагацца ўдакладненьня. Чорт, загваздка! Як яе тут адну кінеш, парадзіху? Добра, што зь сельсавету прыхапілі з сабой панятога, яму і даручыць, каб прывёз акушэрку.

Толькі цень маёра — лямпа зьвісае са столі, — запаўняючы прасторны пакой, перамяшчаецца па сьценах зь бярвеньняў, па дашчатай столі. Усе астатнія чакаюць яго распараджэньняў: паняты, трымаючы картуз ля каленяў, аціх ля парога, малодшыя афіцэры дзяжураць ля вакон, стары каля ложка з парадзіхай.

Сказаў жанчыне як можна мякчэй:

— Выбачайце, нязваныя госьці заўсёды ня ў час. Калі б мы ведалі...

Сам унутрана пасьміхнуўся: ну а калі б ведалі? Адмянілі б акцыю? Сьмешна. Трэба пачынаць.

— Абыдземся без пратакольных фармальнасьцяў. Вы — Кучэра Іосіф Герасімавіч.

— Абсалютна дакладна.

— Год нараджэньня? Іншае — потым. Партызан, наколькі нам вядома?

— З сорак першага.

— Ведаем. Нават тое, што раненьне маеце.

— Нічога, на пераможцах, як на сабаку, раны зацягвае мігам.

— Дапусьцім, хаця сабакі тут не да месца. Зброю маеце?

— Здаў, як паложана. Па сьпіску: паўаўтаматычную вінтоўку СВТ, дзьве гранаты, пісталет сыстэмы «наган».

— Гэта вы правільна зрабілі. А то адзін вось так жыў наводшыбе, пажар здарыўся, дык на тым месцы, дзе гумно стаяла, танк! Вылез, калі ласка. Як з штаноў. Але, кажуць, гэта ў Заходняй Беларусі было.

— Усякае расказваюць. Дзівакоў на сьвеце хапае.

— Дзівакоў ці ворагаў?

— А гэта — як паглядзець.

— Ну што, цямніць ня будзем? Ведаеце, нябось, чаго пажалавалі?

— Здагадваюся. У вас цяпер чырвоныя пагоны. А былі, помніцца, нябесныя, лётчыцкія.

— І я вас прызнаў. Так што можна бязь лішніх цырымоніяў. Прыступайце, — загадаў сваім супрацоўнікам.

— Дом, як бачыце, пусты, знайсьці, калі што ёсьць, лёгка, — заахвоціў гаспадар.

— А ўсё-ткі пашукаем. Прыступайце. На гарышча дзе лесьвіца?

— Там, у халодным пакоі.

Маёр падсеў да стала, пастукаў наганам па дрэве (так рабіў нехта з большых чыноў у нейкім кінафільме) і спытаў як не сваім голасам:

— Вам ня сорамна?

— Гэта чаго ж мне саромецца?

— У вочы савецкай уладзе, народу глядзець ня сорамна?

— Гэта вам? Нібыта ня дужа.

— Значыць, тое, што народны камісарыят трэці раз вас змушаны арыштоўваць — пляваць на гэта?

Кучэра хацеў адказаць гэтаму таўстагрудаму і таўстазадаму, як баба, хмыру, але вочы яго сустрэліся з позіркам дачкі, ён адразу абмяк, плечы апусьціліся, змаўчаў.

Маёр няўклюдна павярнуўся, і тут жа каўнер зачапіў праклятую бародаўку — гэта перашкодзіла Кароткаму паглядзець, унікнуць, чый кашаль глуха прагучаў недзе за печкай. Але зь печкі прагучаў галасок (ах, вось хто гэта!):

— Ня крыўдзіце дзядулю. Я татку скажу.

— Ты там дзе? У, які грозны! Пакажыся, казак. А дзе твой татка?

— Татка прыйдзе і вас наб'е! — Паўлік грозіцца з-за коміну, не адкрываючыся ворагу. Тоўсты дядзька яго ня бачыць, а мамка, лежачы на падушцы, робіць страшныя вочы, аж сьмешна. Паабяцаў тоўстаму:

— І за мамку наб'е.

— Хутка, унучак, хутка татка прыйдзе, — умяшаўся стары і растлумачыў маёру: — Каго ўбачыць, адразу: мой татка! Вы пойдзеце, будзе ўсім расказваць, што ў яго тата ваенны, у рамянях увесь.

Франц, здушыўшы ў сабе здрадніцкі кашаль, ляжаў у сваім пэнале на тапчане, ім жа зьбітым, тварам у далоні. Мабыць, драўняны пыл удыхнуў неасьцярожна.

Услухоўваўся ў размову за сьцяной, у стукі, крокі, намагаўся злавіць голас, хаця б стогн Паліны, але яе як бы і няма там — што адбываецца, чаго яны прыехалі? Галасы: бацькі і незнаёмы, такі ўпэўнена-камандны, в а е н н ы — толькі яны чутны. Лавіў аб сабе, аб «немцу» гаворку — не, нібыта ні слова. Тады што іх прывяло? Чаму так насядаюць на бацьку, у чым ён правініўся? Іх тутэйшае жыцьцё, зь якім Франц і знаёмы быццам, але ня ведае зусім. А таму міжволі шукае аналёгіі з тым, што ўжо было. І што было б, магло быць, калі б гэта ў Германіі адбывалася. Калі прагучала ў двары аўтаматная чарга і завішчаў сабака, а Франц яшчэ толькі прыўзьняў хітра зробленую сьценку, каб запаўзьці ў свой «пэнал» (ці труну — называй, як табе больш падабаецца), яму здалося, што ўсё вярнулася да таго моманту, калі з дому, што потым згарэў на тым самым месцы, вось гэтак жа запаўзаў у нару. З Палінай, са старой. Тады было адчуваньне абвалу яго жыцьця, катастрофы, але хіба мог уявіць, якія яшчэ выпрабаваньні чакаюць? Яго і ледзь знаёмую тады дзяўчыну. Але гэта была вайна, усё думалася, усе спадзяваліся: вось скончыцца вайна! Толькі б скончылася і застацца жывым разам з блізкімі тваімі! Яна ззаду, вайна, — для ўсіх, акрамя Франца. Нават для пераможанай Германіі і, калі жывыя, для бацькоў — скончылася. Як бы там цяпер ні было, нейкая пэўнасьць

надышла. У Франца менавіта гэтага няма — пэўнасьці. Сваё жыцьцё абарвалася, а тое, якім ён жыве, — толькі прымерваньне да чужога, натужнае намаганьне ўтрымацца на плыву, не пайсьці на дно. Трымаецца гульнёй выпадку ды яшчэ воляй гэтай незвычайнай дзяўчынnetwork-жанчыны, што сустрэлася яму на шляху. У іх дзіця, будзе другое, але ўсё гэта толькі да таго моманту, калі даведаюцца, што ніякі ён не нямы, а немец. Неадкладна Паліну зь дзецьмі і яго адбяруць адно ў аднаго, а далей — якая розьніца, які лёс вызначаць яму тутэйшыя законы, парадкі? Ці ў лягер, ці ў Германію? Але ў яго ёсьць і ў Германіі сям'я: бацька, маці, сёстры. Застацца назаўсёды тут — страціць іх. Калі ўжо ня страціў. Стары Кучэра паказаў яму часопіс з фатаграфіямі: што засталося ад нямецкага Дрэздэну і японскага гораду Хірасімы. Чорныя руіны, пустыня.

Аб чым жа яны так сярдзіта, нават грозна гамоняць са старым, калі не дзеля Франца прыбылі? Нешта шукаюць: чутно, як тупаюць па столі, над галавой. Што тых самых беглых паліцаяў, дэзэртыраў шукаюць?

Былі хвіліны, калі Францу ўсё ж хацелася, каб яго знайшлі. Думка здрадніцкая ў адносінах да Паліны, да Паўліка і да таго, хто народзіцца, але што можа чалавек зрабіць, калі любы яго крок насустрач уласнаму інтарэсу — ужо здрадніцтва. Тады, у першай нары, хаваўся з д р а д н і к  Г е р м а н і і ,  ф ю р э р а. А цяпер, тут? Але не павесяць жа яго: ён выратаваў савецкіх людзей, ён забіў фашыста. Хіба за гэта тут караюць?

Раптам пачуў Паліны крык:

— Тата, тата! Што гэта? Куды вы яго забіраеце, куды ведзяце? Вы людзі ці хто вы? Што ён вам зрабіў дрэннае?

І гучны голас Кучэры:

— Нічога, дачушка, табе нельга так. А мяне патрымаюць і выпусьцяць. Маёр абяцае: зараз прышлюць акушэрку. Чуеш? (Так гучна крыкнуў, што Франц скеміў: папярэджвае яго.) Сюды прыедуць людзі. Так што чакай-

це. А прыйдзе з Каралёва Стану... цётка, тады рашайце самі, як быць. За мяне ня бойся. Не прапаў і не прападу.

Ад парога Кучэра азірнуўся яшчэ раз на Паліну і раптам убачыў прысеўшага за яе ложкам... Франца. Вылез! Што ён робіць? Загубіў! Думае, што ратуе, дурань, а губіць канчаткова. Адчайны позірк старога змусіў Франца дапасьці да падлогі, затаіцца.

— Нічога, нічога, — з-за пляча Кучэры прагучаў чужы голас, — не непакойцеся, жанчына. Мы не зьвяры. (І засьмяяўся.) Зьвяры ня мы.

## 18

У Каралёў Стан пад крыло бестурботнага Каляды, у леспрамгас, трапілі ня хутка. Яшчэ год пражылі ў сваім доме, пакуль Паліна гадавала другога хлопчыка ды ўсё пісала ў Менск і езьдзіла ў раённы цэнтар, дабіваючыся праўды, ратуючы бацьку. Каляда таксама стараўся. Але, як звычайна, больш размовамі, крыкам.

— Змрок і туман! — тлумачыў Францу. — Быў такі ў фашыстаў шыфр, у гестапа: чалавек зьнікае бязь сьледу. Каб астатніх да пят праняло. Але не на тых яны напалі. Вось паеду яшчэ раз у Менск...

Нямко Калядзе падабаўся ўсё больш, асабліва, калі піў зь ім нароўні, стаміўшыся аднекватца. Тады Паліна падыходзіла і канфіскоўвала бутэльку.

— Не хапала мне яшчэ п'яніцы-мужа!

Каляда ўсё адукоўваў нямка:

— Усё таму, што ў Палітбюро ніводнага партызана. Ёсьць у Маскве адзін чалавек Панамарэнка Панцеляймон Кандратавіч, кажуць, ён прыёмны сын Сталіна. Так што партызаны яшчэ скажуць слова. Вярні, Паліна, бутэльку, так ня робяць. Цябе Кучэра не пахваліў бы за гэта.

Сьмех і бяда з такімі памочнікамі. Але калі давялося амаль уцякаць зь Петухоў — не станавіцца ж і Фран-

цу калгасьнікам, бяспраўным на ўсё жыцьцё, а да гэтага ішло, — Каляда быў адзіным сьвятлом у вакенцы. Хату прадалі (за рэчы найбольш, апратку ды абутак) бежанцам з галадаючых раёнаў Украіны і накіраваліся ў глуш палескую, куды даўно клікаў Каляда. Грошай толькі і было — даехаць. Дзе машынай, цягніком, а апошнія дзесяць вёрст — чыгуначнай дрызінай па вузкакалейцы.

Вялізны пасёлак зь лёгкіх баракаў і сяк-так скіданых дамоў — гэта і быў край запаветны, які так расьпісваў Каляда. Дом, дзе ім выпадала жыць (паводле апавяданьня Каляды, ледзь не палац), быў сапраўды прасторнай, але не даведзенай да ладу і ўжо напалову зруйнаванай будынінай, да таго ж жонка Каляды — прыкаваная да ложку найцяжэйшым рэўматызмам, артрытам і яшчэ дзясяткам хвароб — патрабавала староньняга догляду. Усё б нічога, урэшце і Франц з рукамі, цясьляр-сталяр, і Паліна ніякай працы ў хаце не цураецца — пражывуць, а вось як з дакумэнтамі быць? Тая нікчэмная паперка з шпіталю, якой ужо было мала для хоць якога спакойнага жыцьця ў Петухах, насуперак запэўніваньню Каляды, нічога ня значыць і ў гэтай глушы: парадкі ўсюды аднолькавыя. Яно ўсё так, не тужыў Каляда, ды толькі людзі ня ўсюды аднакія. Тут — усе ў яго сябры-таварышы, ім працаўнікоў не хапае, а ня правільных паперак. Зь вялікімі нэрвамі і клопатам сяк-так утрэслася: бутэлька мацнейшая за Саўнаркам — Каляда сваю жыцьцёвую мудрасьць справай пацьвердзіў. Франц спачатку працаваў на лесапавале з бэнзапілой, затым перавялі да расьпіловачнага станка. Праца нялёгкая, але яму падабаўся п а х  п р а ц ы: сасновае пілавіньне, мазут. Ня быў бы то немец. Сюрпрыз: на пільні і яшчэ немцы ёсьць, працуюць, непадалёк лягер ваеннапалонных знаходзіцца. Вось гэта навіна дык навіна: Франц нават не чакаў, што гэта яго так усхвалюе, калі пачуў упершыню нямецкую мову і ўбачыў знаёмую армейскую форму, заношаную, замазучаную да немагчымасьці. Услухоўваўся, пра што між сабою гамоняць. Пра ежу найчасьцей,

пра Германію, але і пра нормы, пра плян. Ну проста савецкімі сталі — больш, чым самі савецкія. Тыя вечна пра рыбалку ды чым бы пахмяліцца, а немцы: нормы, колькі выканалі, трэба яшчэ зрабіць. Потым разабраўся: ім ідзе залік, і тых, хто перавыконвае норму, раней адпусьцяць дамоў, у Германію. Аж затужыў Франц: а хто залічвае тое, што давялося яму перажыць, хіба толькі Госпад Бог? Пагаманіць бы зь імі, затужыў па самой нямецкай мове, чуе, што хутка не ўтрывае, выдасьць сябе. Што зьдзівіла: адносіны да нядаўніх ворагаў мясцовых рабочых, а жанчын асабліва — абсалютна бяз злосьці, быццам і не было ўсяго, што было. А аднойчы ледзь не ўмяшаўся неасьцярожна ў падзеі, абурыўшыся сваімі немцамі. (Дык хто ж яму цяпер больш свае?) Каляда прынёс Францу абед (Паліна паслала), пры гэтым ён з торбы дастаў вялізнае колца каўбасы: адрэзаў сабе, Францу, а большую частку аддаў маладому Гансу, які даўно раздражняў Франца насьмешачкамі, зьдзеклівымі заўвагамі аб мясцовым людзе. Асабліва аб жанчынах. Калі пра Паліну сказаў аднойчы такое, Франц ледзьве стрымаўся, каб не накінуцца на яго з кулакамі.

Прыняўшы каралеўскі дар ад Каляды з дагодлівай усьмешкай, падзякаваўшы рускім «спасибо», Ганс чамусьці і не падумаў падзяліцца з двума сваімі напарнікамі-немцамі. Сунуў, нахаба, каўбасу за пазуху і, як прысуд, прамовіў: нічога ў іх ня будзе ніколі, калі такімі кавалкамі раскідваюцца!

Вось і любі «свайго» за тое толькі, што ён свой, а не чужы. Але Франца зьдзіўлялі і яго новыя «свае», зь імі таксама не засумуеш. У Каляды быў нікчэмны сабака зь дзіўнай мянушкай Кабтыздох. Паводле азначэньня гаспадара: сумесь мятлы з лаўкай. Заўсёды бегаў за ім на рыбалку.

У выходныя дні Каляда запрашаў парыбачыць і Франца. Навучыў яго абуваць лапці і нават плесьці іх самому — Франц вымушаны быў пагадзіцца, што не адна толькі

галеча прыдумала гэты лазовы абутак, але і кемлівасьць. Пайшоў аднойчы ў гумовіках, так замучыўся, чэрпаючы гразь халявамі, а тут — што зацякло, тое і выцекла. Лёгка, зручна. Бывае, што і азябнеш, «як цюцік», ну але ад гэтага вядома, што за лекі. Каляда, паказваючы на жонак, скардзіўся: яны думаюць, што мы дзеля задавальненьня п'ем, а мы — дзеля здароў'я. На рыбалку два маршруты: кароткі — на Чорнае возера, доўгі — на Прыпяць, рака не вузейшая за Рэйн. Вада ў тарфяным балоце вугальна-чорная, зачэрпнеш далоньню — мноства ўзважаных часьцінак, і тым ня менш адчуваньне дзівоснай чысьціні, нават стэрыльнасьці. Кажуць, лячэбнае возера, і ў гэта можна паверыць. А вось рыбы ў ім малавата, мізэрная, дробная. Затое на Прыпяці столькі бралі рыбы таптухай — так тут называюць на дубцах расьпятую сетку, — што і вазок не пашкодзіў бы, данесьці было цяжка. Трымай мацней вялізны сачок і не лянуйся, заганяй нагамі ў яго лянівых самоў, з кабана вагой. Па Прыпяці марудна праплываюць бясконцыя плыты, крапежнае дрэва для вугальных шахтаў Украіны — адчуваньне прасторы, першастваранасьці. А дубы, дубы — над вадой і наогул куды ні кінь вокам! Нешта падобнае, такія ж дубровы, на пад'езьдзе да Бэрліну. Будзе пра што расказаць бацьку. Любіць ён экзотыку — і ў людзях таксама. Яму, напэўна, спадабаўся б Каляда. З гэтым чалавекам не засумуеш.

Сабраліся неяк з Калядом ісьці на возера, падрыхтаваліся, як заўсёды, а Кабтыздоха няма. Дзіўна, Каляда сеў на бярвеньне, што за домам, і Франца запрасіў: маўляў, пачакаем, пакуль прыбяжыць сабака… І вось ён бяжыць ужо зь дзьвюма «кілбаскамі» — другая ў зубах, натуральная каўбаса. Такая ж, якою Каляда Ганса абдарыў. Сабака ляціць проста на гаспадара, а той ужо і нож падрыхтаваў. Прыняў паднашэньне з зубоў дварнягі, пакусанае месца адрэзаў і яму ж кінуў. Усё, пайшлі! Нічога Францу не тлумачыць, быццам і без таго ўсё зразумела. Але пабачыў, што нямко вось-вось залямантуе ад зьдзіўленьня, паблажліва растлу-

мачыў. Ды нічога асаблівага. Гэты сьцярвец вынюхаў сьцежку ў падвал прадуктовага магазіну, узяўся цягаць каўбасу праз разьбітае акенца. Каляда і сам спачатку не разумеў нічога, калі сабака першы раз здабычу прыцягнуў, затым зноў, а трэці раз вырашыў за ім прасачыць. І пабачыў, як ён гэта робіць. Той раз Маруся ня кольцы каўбасныя, а «палкі» завезла ў магазін. Дык гэты дурань, ну ніяк не дапетрыць, што за канец браць, а не пасярэдзіне. Біўся, біўся перад кратамі і ні з чым прыбег. Давялося падвучыць крыху, кідаючы звычайную палку, як яе трэба хапаць. Але кольцы сьцервяцу ўсё роўна падабаюцца больш. Вось і сёньня. Сумленны сабака, усё прыносіць гаспадару! Ну як, фатэр! І вось гэты народ вы хацелі прымусіць працаваць на Германію?

Усё цяжэй было Францу разыгрываць ролю нямка ў доме Каляды. Па-першае, Паўлік ня ведае, што яго татка нямы, і зьвяртаецца да яго прылюдна, як да ўсіх, вымагае, дабіваецца адказаў на свае бясконцыя пытаньні. І, натуральна, не разумее, чаму татка яго перастае зь ім гаманіць, «ні мычыць, ні целіцца». (Таткі любімы выраз.) А, па-другое, і акрамя таго, Францу ўжо сорамна падманваць добрых людзей. Асабліва разумніцу-жанчыну, Каляды жонку. Францу ўвесь час здаецца, што ягоны сакрэт для яе даўно ніякі не сакрэт. У Паўліка распытаць магла, а то, магчыма, і Паліна прагаварылася. Вочы ў яе насьмешлівымі робяцца, калі Франц размаўляе зь ёю жэстамі і, сапраўды, мычаньнем. Аднойчы ён у яе прысутнасьці загаварыў з Паўлікам, як гэта рабіў, калі нікога блізка не было. Калі пабачыў, якія вочы парабіліся ў гаспадыні, спахапіўся і зразумеў: яна ні аб чым не здагадвалася!

— Дык вы... Дык што ж гэта?.. — сама амаль анямела, мычыць, як Франц да таго.

У той жа вечар яны з Палінай расказалі ўсю сваю гісторыю гаспадарам, адысэю сваю, пачынаючы з таго ранку, калі лёс Франца надламаўся напалам і іх жыцьці

пайшлі поруч. Паліна не магла ня плакаць, тым больш, што гаспадыня проста рыдала, мабыць, і над уласным лёсам: пасьля блякадных балотаў яна стала поўным інвалідам. Але вось, не была б гэта жанчына: Паліна плакала яшчэ і таму, што цяпер, калі Франц ужо не «нямко», усім куды прыкметней будзе, што жонка ў яго «чарнамордая пачвара». (Зрэшты, скажы ёй хто-небудзь, што і гэта горыч у яе сьлязах, зьдзівілася б і запратэставала). А Каляда ўсё ўспамінаў Кучэру, гэта ж трэба, затаіў, не паверыў нават сябру. А хіба Каляда не зразумеў бы, ён што — энкавэдыст ці стукач? Гітлеры прыходзяць і адыходзяць, а нямецкі народ застаецца.

Дамовіліся, як выводзіць Франца зь нематы, каб не пасеяць да гэтага цуду нездаровую цікаўнасьць. Каляда прапанаваў: «Чорнае возера», яно вылечыла! Ну а гаворыць Франц ужо амаль без акцэнту, даўно можна было выходзіць з падпольля.

— Ты адно не перастарайся! — папярэдзіла Каляду яго жонка. — А то я ведаю цябе. Такога навыдумляеш, што і дурань здагадаецца.

Франц прагна слухаў радыё (часам, як бы выпадкова, круціў і замежжа па старэнькім прыёмніку), чытаў газэты. Хаця б адным вокам зазірнуць туды, дзе засталіся яго нямецкія блізкія. Усё больш рэзка адно аб адным выказваюцца ўчарашнія саюзьнікі, а Германія — у руінах. Галеча і злаславасьць. Усё, як было перад вайной. Хаця людзям яшчэ столькі гадоў трэба, каб выбрацца з развалін, з варожасьці мінулай вайны. У газэтках невялічкага фармату з брудным друкам, якія тут ніхто не чытае, а скарыстоўваюць на курыва, Франц марна шукаў што-небудзь пра Дрэздэн. У іх найбольш пра амэрыканцаў. Усё выглядала так, быццам не з Германіяй рускія ваявалі, а з амэрыканцамі. І цяпер трэба вызваліць нямецкі народ ад заходніх плютакратаў: ну зусім як пра Вэрсальскі дагавор пісалі перад вайной. Новая звада, ужо між пераможцамі, вось-вось узгарыцца. Хаця яшчэ палонныя дамоў не дабраліся. А Франц і наогул невядома

калі і як зможа патрапіць у Германію. Пасьля яшчэ адной вайны?..

А тым часам яны з Палінай і зь дзецьмі абжываліся на новым месцы. Вечарамі і ранічкаю Франц майстраваў-цясьлярыў у доме Каляды, які цяпер і іх дом, Паліна падзяліла абавязкі з гаспадыняй: тая даглядала, колькі мела сілы, за дзецьмі, Паліна клапацілася на кухні, у агародзе. У месцах старых высечак падрыхтавалі агнём і сякераю, разрабілі дзялянку (круглае слова: «ляда») — пад проса. Франц раптам адчуў смак да такога менавіта гаспадараньня, першабытнага, а паводле вызначэньня Паліны — «дзікунскага». Пабачылі б муці і фатэр свайго сына: босы, у чорных ад сажы армейскіх галіфэ, торс, як у афрыканца, і ўвесь у брудных падцёках поту, запрэгшыся ў неверагодную барану — усяго толькі абпаленая вяршынка елкі, сукаваты вожык, — цягаў ён сукамі наперад з канца ў канец паляны, узьдзіраючы пакрытую попелам зямлю. Паліна прыбягала да яго з абедам (салёныя агуркі і грыбы, рыба, бульба, хлеб), як жа яна клапацілася каля беднага свайго, як яна лічыла, катаржніка. І ня верыла, што белазубая «негрыцянская» шчасьлівая ўсьмешка — гэта ўсур'ёз, што такая праца можа некаму падабацца. А Франц і сапраўды перажываў незнаёмае раней адчуваньне паўнаты жыцьця. Спрабаваў растлумачыць жонцы: менавіта так, менавіта з голымі рукамі адзін на адзін з прыродай, і вось, калі ласка, не прапалі б з Палінай і дзецьмі — без усякае дзяржавы, без усялякае ўлады. Вось пабачыш, вырасьце проса, каша будзе, разварыстая — лыжку праглынеш! Глупства, фантазіі, але гэта Франц, не дарэмна яна кахае яго, анікога іншага поруч з сабой уявіць ня можа. Але на ўсякі выпадак казала:

— Ведаю, чаму табе так хочацца безь людзей, у дзікім лесе жыць. З такой жонкай — ні сабе, ні людзям паказаць!

І звыкла трымаецца рукой за шчаку. Левае вока ў Паліны крыху зьліплася, бачыць, але ўсё роўна не як у

людзей. Франц не спрачаецца, проста глядзіць, але так, што Паліна, успыхваючы румянкам, сьмела прыбірае руку.

— А, як хочаш! Якая ёсьць, такая ёсьць! — кажа з гульлівай абыякавасьцю, а ў вачах усё роўна блізкія сьлёзы.

Убачыў Франца я, усю яго немалую сям'ю на партызанскай сустрэчы ў лесе побліз вёскі Зубаравічы. Гэта былі ўжо хрушчоўскія 60-я, такія сустрэчы сталі дазволенымі, рэгулярнымі, звычайна 9 траўня. «Рамантыкі сталінізму», а менавіта так хочацца назваць многіх партызан гэтага часу, прынялі з рук выкрываўцы іх «галоўнакамандуючага» тое, да чаго ён сам, Сталін, блізка іх не падпускаў, але «Мікіту» тым ня менш недалюблівалі, а «генэралісімуса» па-ранейшаму ўшаноўвалі. Так і не даведаліся, а даведаліся, не паверылі б, што рыхтаваў і ім крывавую лазьню, можа быць, адразу пасьля габрэяў, і толькі сьмерць перашкодзіла яму аддзячыць іх па-сталінску.

Да таго часу на месцах ужо адбылося «амаладжэньне кадраў», у райкомах і райвыканкомах на зьмену былым партызанам прыйшлі іншыя людзі, але ў цэнтры, у Менску, яны сядзелі шчыльненька, а таму раённыя кіраўнікі такія партызанскія сьвяты арганізоўвалі з усім партыйным размахам. Высылалі на “месцы баёў” буфэты, загадзя будавалі дзе-небудзь на лясной паляне ці ля ракі трыбуну, вылучалі ўласных прамоўцаў, наструньвалі вясковых настаўнікаў, гэтых пакорлівых прыпражных ва ўсіх падобных мерапрыемствах, нават калгасьнікаў стараліся не займаць тэрміноваю працаю, і нават уласнай начальніцкай прысутнасьцю асьвячалі выязныя папойкі. Як калі б да іх наехала начальства з вобласьці ці з самой сталіцы. Улічвалася: заўтра хто-небудзь з гэтых партызанчыкаў папросту сустрэнецца з самым Мазуравым ці Машэравым ды і падзеліцца ўражаньнямі аб пастаноўцы патрыятычнага выхаваньня ў такім вось раёне.

Ну а мы, радавыя народныя мсьціўцы, настроеныя былі мірна-настальгічна нават у адносінах да тых з свайго былога начальства, каго на дух не пераносілі. Самі ж нашы начальнікі працягвалі высьвятляць, хто каго абскакаў пасьля вайны і ці па заслугах. Але здаралася, што жыцьцё і нас сутыкала лбамі. Ды не, не жыцьцё, што нам было дзяліць, а зусім пэўныя, кампэтэнтныя ў такіх справах, органы. Мне, напрыклад, зь нейкага часу езьдзіць на такія сустрэчы расхацелася, хаця многіх пабачыў бы з радасьцю. Але неяк сорамна было сустракацца зь вясёлым сваім камбрыгам, які, прасьцецкая душа, падпісаў супраць мяне генэральскае пісямко ў беларускай газэце з гнеўным палкоўніцкім асуджэньнем «пацыфіста» і «абстрактнага гуманіста». Ну што, высьвятляць зь ім, якія бываюць гуманізмы? Абстрактныя, не абстрактныя? Большае дурноты не прыдумаеш. Або такі ж ліст майго аднагодка, які аж у маскоўскай «Красной звезде» выліў сваю горыч, што давялося яму партызаніць з чалавекам, які паклёпнічаў на нашых гераічных генэралаў.

Але першы час мы езьдзілі на такія сустрэчы вельмі ахвотна. (Пасьля адно брат мой туды накіроўваўся, а мне прывозіў прыветы.) Вось там я і ўбачыў Франца, яго вялікую сямейку. Каля машыны-буфэту тоўпіліся чыста апранутыя калгасьнікі, найбольш жанчыны зь дзецьмі і падлеткі, у вочы кінуўся высокага росту блакітнавокі мужчына ў праставатым суконным касьцюме і з гальштукам. Ён толькі што прыняў ад буфэтчыцы на дзьвюх талерках хлеб і горку сасісак, і яго акружылі тыя самыя падлеткі — колькі ж іх, ці не пяцёра? Невысокая поўная жанчына (такіх у нас часьцей называюць: жанчынка, і яшчэ дужа добра кладзецца слова: кабета, кабетка), пашумліваючы на гэтую арду, пачала дзяліць сасіскі — па адной кожнаму. На галаве ў яе цёмная хусьцінка, хаця суконка вясёлая, у кветкі. (А калі прыгледзецца, убачыш, што левая шчака ў жанчыны пашкоджаная, як бывае ад блізкага выбуху).

Калі ў сям'і шмат хлопчыкаў, а самая малодшая —

дзяўчынка, яна звычайна агульная любіміца. Прыкметна адразу, што і тут гэтак жа. Зусім магчыма, што іх так шмат, хлопчыкаў, таму што бацькі хацелі дзяўчынку і ўсё «дабіраліся» да яе. Так што ёй гэтыя свавольнікі абавязаныя сваім зьяўленьнем. Гукаюць да сваёй дабрадзейкі яны нетутэйшае імя: Марта.

Наўрад ці надоўга запомніў бы гэта мімалётнае адчуваньне, разуменьне, што бачу добрую, шчасьлівую сям'ю, калі б пасьля не пачуў такую гаворку:

— А бачылі тут немца? Ледзь ня дваццаць гадоў яго хавала жанчына ў падвале.

— Ну і ну! Фрыца?

— Але. Фрыца. Дзяцей кучу нарадзілі, а потым аб'явіўся. На торфазаводзе працуе.

А потым і ў самім Менску пачуў пра яго. У сувязі са «Слуцкай гісторыяй», што ўсхвалявала ўсю Беларусь. Я маю на ўвазе выпадак, калі разгневаны натоўп добрых беларусаў спаліў суд, жыўцом згарэла жанчына-судзьдзя, некалькі чалавек пасьля гэтага расстралялі.

Неяк у мяне ўзьнікла патрэба зайсьці ў «першы аддзел» Акадэміі навук: мы ўжо сталі выяжджаць па турысцкіх пуцёўках за мяжу, а за тымі жалезнымі дзьвярыма захоўваліся нашы «справы», па якіх зьвяраліся падобныя жаданьні з магчымасьцю іх ажыцьцяўленьня. Нейкая пячатка мне спатрэбілася. Убачыў за высокім бар'ерам маленькага чалавечка: мне не знаёмы, але на мяне глядзеў, як на вядомага яму ўдоўж і ўпоперак, з усімі трыбухамі. Я, вядома, не зьдзівіўся: а як яшчэ можа глядзець чалавек («першы аддзел»), у якога пад рукамі, перад вачыма ўся твая паднаготная, нават тое, пра што сам ня ведаеш і не падазраеш?

Але ён палічыў патрэбным свой позірк растлумачыць зусім проста:

— Вы ж родам са Случчыны? Я таксама адтуль. Зусім нядаўна ў вашай Акадэміі.

Ня быў бы гэта правінцыял: тут жа паведаміў, што раней працаваў у райвыканкоме, але пераведзены сюды

пасьля славутай «Слуцкай справы». Жывы сьведка! Я ня мог не пакарыстацца нестатутнай гаварлівасьцю земляка, паспрабаваў даведацца аб усім больш падрабязна. Сёе-тое ўжо было вядома. Увесь шум-бор узгарэўся з забойства, але не радавога: работнік райвыканкому прыстукнуў у пад'езьдзе такога ж, як сам, маладога дзецюка. Маладзёжныя страсьці. Але акрамя таго, што ўлада б'е грамадзян па галаве ў нейкім пад'езьдзе, была і яшчэ адна абуральная акалічнасьць: забойца — сын паліцая, а забіты з партызанскай сям'і. Для Беларусі гэта, выявілася, неабыякава і праз дзесяць, і праз дваццаць гадоў пасьля вайны. Тыя нас забівалі тады, а гэтыя цяпер! Асабліва абмяркоўвалася тая падрабязнасьць, што «паліцэйскі» заведваў «культурай» у выканкоме, а ўсім вядомыя абавязкі такога работніка: міжсабойчыкі, саўны, адпачынак на прыродзе для начальства, жаночае абслугоўваньне. Ясна, што такога карыснага работніка начальства не пакіне без апекі і клопату, і пакараньня за злачынства не адбудзецца. Завязаўся такі клубок чутак, перасудаў, страсьцей, што разьвязаць яго можна было толькі адкрытым, галосным, на вачах усіх разборам і судом. Начальства ж зрабіла якраз наадварот (яшчэ не хапала ісьці на повадзе ў мас!) — суд адбыўся ў забалотным райцэнтры, у пакойчыку для дзесяці прысутных. За вокнамі ж і сьценамі суду сабраліся сотні, а на другі дзень і тысячы людзей з усёй ваколіцы, з самога Слуцку. Небывалая для рэспублікі сытуацыя. Мабыць, нанесены ўдар быў у нейкі патаемны нэрв беларуса, народу, якога за незласьлівасьць і дабрадушша хваліў сам Іосіф Сталін і сам Адольф Розэнберг. (Пахваліўшы, прашарсьцілі да незалечных праплешын і шнараў.)

А тут яшчэ жонка падсуднага: некалькі разоў зьявілася, дурніца, з памяшканьня, куды іншых не пусьцілі, і фыркала на жанчын — чаго зьляцеліся, крумкачы, нічога вам не абломіцца, не засудзяць майго мужа!

Што праўда тут, а што пазьнейшыя выдумкі, ска-

заць цяжка. Адно вядома дакладна (і кадравік пацьвердзіў): тыя, хто судзіў,ператрусілі, яны пераапранулі падсуднага ў адзеньне міліцыянэра і правялі праз натоўп. Але самі пайсьці не змаглі: стала вядома аб уцёках забойцы! Натоўп разьюшыўся. Спынілі машыну, што ехала міма, гружаную тарфяным брыкетам, забралі каністры з бэнзінам, аблілі будынак і падпалілі. Міліцыянэр, пераапрануты ў касьцюм падсуднага, выскачыў з вакна, пашкодзіў пазваночнік. А судзьдзя згарэла. Жах што нарабілі агулам, натоўп і начальства! Воінскую часьць прыслалі, тыя адмовіліся страляць. Але падышла другая, больш надзейная (казалі: каўказцы), уціхамірылі натоўп. У газэце было кароценькае паведамленьне: па такой справе столькі асудзілі, такіх і такіх — да вышэйшай меры.

Пад канец кадравік паведаміў:

— А вы ведаеце? Мабыць, ня чулі? Там немец удзельнічаў. З вайны яшчэ затаіўся. Падагнаў машыну, бэнзін ім прывёз.

Так (я потым даведваўся), гэта быў Франц. Толькі ўсё адбывалася крыху інакш. У нашых «органаў» слабасьць да сачыніцельства. А было ўсё прасьцей: па звычайным сваім маршруце Франц праяжджаў на машыне, вёз тарфяны брыкет. Перагарадзілі дарогу, бэнзін і ўсё, што ім трэба было, разгарачаныя людзі ўзялі, не пытаючыся шафёра. Але Франца абвінавацілі ў саўдзеле ці дапамозе, ці ў нечым іншым, і пасадзілі. Тры гады Паліна зь дзецьмі чакалі яго, а вярнуўся — завэрбаваліся ў Сыбір. Яшчэ да Чарнобыля. Недзе там, на поўначы, яны цяпер. Калі не павёз іх Франц у аб'яднаную Германію. Магчыма, нехта зь нямецкай яго сям'і жывы застаўся. Колькі яму ды і Паліне пеpажыць давялося, што хацелася б для іх хоць крыху жыцьця спакайнейшага.

Але чамусьці сумна было б даведацца, што яны ўсёткі паехалі.

P.S. Я працаваў над гэтай гісторыяй, калі ў санаторый «Падмаскоўе» мне пазванілі зь Мюнхену — супра-

цоўнік радыё «Свабода», мой зямляк Васіль Крупскі. Родам ён з нашай Віцебшчыны, прозьвішча па бацьку — Фрэйдкін, амаль увесь род Фрэйдкіных у вайну нацысты зьнішчылі. Пагаварылі пра справу, якую меў да мяне, а затым Васіль успомніў пра наш з Элемам Клімавым фільм. Карціну «Ідзі і глядзі» ў 85-м я вазіў у Заходнюю Германію, арганізатарка Мангеймскага фэстывалю нястомная жанчына без узросту фраў Фэй Вайн параіла мне быць гатовым да жорсткай дыскусіі. А наогул можна было чакаць (мяне ў Маскве ўсур'ёз папярэджвалі), што нэанацысты падпаляць кінатэатар. Непрыемны не для адных толькі нацыстаў фільм у нас атрымаўся. У час XIV Маскоўскага кінафэстывалю я быў сьведкам такой сцэны ў Крамлі: вядомы заходненямецкі кінарэжысэр, добры знаёмы Элема Клімава, папракнуў яго ў лішне жорсткім паказе немцаў. Вочы ў Элема зьбялелі (знаёмы мне ягоны стан — па нашых сустрэчах з кіраўнікамі Дзяржкіно): «Ах так! Ды мы вось такую кропелечку праўды паказалі. Вось у наступны раз — на поўную катушку!»

У Мангейме дыспут атрымаўся ярасны, але мне ў ім удзельнічаць не давялося зусім. Сядзеў з краю сцэны, спусьціўшы ногі ў залю, і ўсяго толькі назіраў за бойкай немцаў зь немцамі. Двух пакаленьняў: тых, хто пабываў на вайне, і маладых. «Ах вось вы чым там займаліся!» — а вэтэранам, вядома, крыўдна.

Васіль Крупскі расказаў тут жа па тэлефоне пра падобную сытуацыю, гісторыю ў Мюнхене: ён запрасіў да сябе маладых немцаў і паказаў ім фільм. Адзін з гасьцей папрасіў касэту і пракруціў яе бацькам. Паглядзеў зь імі фільм і сышоў з дому. Да Васіля прыходзіў потым немец-бацька, плакаў і запэўніваў, што, хаця служыў у Беларусі, але быў усяго толькі «пры конях». Прасіў, умольваючы, памагчы вярнуць сына ў сям'ю.

Ну а калі цэлыя народы пабеглі адзін ад аднаго, здавалася, на ўсё сваё наступнае гістарычнае жыцьцё напалоханыя існаваньнем у таталітарным пацучніку? Як за-

раз мы бяжым, схапіўшыся за галаву. Ад іншых уцякаем, як ад самога сябе. Таму што ад уласнай памяці намагаемся скрыцца.

І ў той жа час вяртаемся, вяртаем сябе адно аднаму — мы зь немцамі. Значыць, няма нічога канчатковага ў гэтым сьвеце. У гэтым і наша надзея.

*13 красавіка (Падмаскоўе) —*
*15 жніўня (Губічы) 1992 г.*

# VIXI*

*Скончаныя разьдзелы незавершанай кнігі*

***... я жыву апошні раз.***

*Ганна Ахматава*

*Пражыта (лац.).

*Дзеля разьбегу*

*1943 год, перадасеньнія дажджы прыбілі летнюю суш, змылі прыдарожную гразюку з пажоўклай травы, але сьпёка вярнулася, я ляжу ля дарогі, локцямі падціснуўшы вінтоўку, з боку Казловіч вядуць палонных немца і ўласаўца (ва ўласаўца мундзір жаўцейшы за нямецкі, мусіць, з запасаў вугорскай або чэхаславацкай арміі), бабы з нашае Крукаўшчыны выбягаюць на дарогу, сустракаючы і праводзячы палонных ня так злым, як горкім галашэньнем: «Дзе ж твае вочы? А маці недзе свае праплакала па такім сыночку!» Русявы прыгажун-уласавец воч не ўздымае, твар яго то бялее, то чырванее. Немец маленькі, нягеглы, у акулярах, спалохана, але і цікаўна пазірае на ўзброеных людзей; жах канца, асуджанасьці яшчэ не ахапіў яго. Па той бок дарогі, дзе ідуць яны, даўгі шэраг узгоркаў-магіл, чатыры зь іх сьвежыя, колькі дзён таму мы пахавалі тут сваіх хлопцаў.*

*Вось-вось пачнецца «блякада», грознае слова гэтае ўжо лунае ў паветры, акружэньне, блякіроўку партызанскіх вёсак і лясоў немцы звычайна прымяркоўваюць да дажынак. (Для мяне потым сьцёрты газэтны выраз «бітва за ўраджай» заўсёды поўніўся жорсткімі згадкамі.)*

*Гляджу ўсьлед нашым ворагам, што асуджана аддаляюцца, і раптам падумалася: калі б зьявіўся зараз нехта і прапанаваў мне, які пражыў шаснаццаць гадоў: «Хочаш яшчэ два тыдні? Гарантаваныя. Бесклапотныя. Як ты жыў у сваёй Глушы чатыры гады назад. Ну а затым, сам ведаеш, давядзецца плаціць, памерці».*

*Я не сьпяшаўся згаджацца. Але ж і ня гнаў таго Некага. Падлічваў, выгадваў. Я ўжо навучыўся зазіраць у сябе, юнацкая рэфлексія была добра падагрэтая чытаньнем Талстога, вечным зьдзіўленьнем: т а к , т а к , т а к , м е н а в і т а т а к , калі ў яго вычытваў сваё. «Дык гэта ж я, а не Мікалайка Ірценьеў раптоўна азіраўся (Талстога тады яшчэ не было, г. зн. не чытаў), каб засьпець сьвет не падрыхтаваны, які ён ёсьць, існуе, калі я на яго не гляджу!» А калі агаломшыла ў засадзе ля вёскі Ўсьцярхі, як звонам (не, калом), па галаве аўтаматная кулька, што саскрэбла скуру і жмут валасоў на макаўцы (затое зімовую шапку ў шмацьцё!), я зьдзівіўся: «Хто гэта мяне палкай па галаве?» — выявілася, што амаль даслоўна думаў і Андрэй Балконскі на Аўстэрліцкім полі, дзе яго параніла. (Потым пра гэта я ўзгадаў і зноў зьдзівіўся[1].)*

*Так што я ўжо ўмеў у сябе зазіраць, пытаць у сябе і сабе ж адказваць. Вось чаму і не прагнаў прэч таго Некага зь ягонай, як на цяперашні лад, дзікай прапановай. Але паводле настрою таго лета 1943 году такою яна не здавалася: два тыдні — ды гэта ж цэлае жыцьцё, калі ўжо заўтра ад цябе, магчыма, толькі і застанецца, што ўзгорачак вунь там ля дарогі! Пакапаўшыся ў сабе, зазірнуўшы глыбей, я адказаў: «Два тыдні — не. Але на месяц, на чатыры тыдні — так, згодзен!» І быццам быў нават рады, што, пахаўрусаваўшыся, моцна выгадаў: падвоіў тэрмін свайго жыцьця.*

*Днямі хірургу, які замахваўся на маё тленнае цела ў імя таго, каб падоўжыць ягонае існаваньне яшчэ гадоў на 5-10, я адказаў: 5 або 10 пад пытаньнем для мяне куды менш важныя (патрэбныя), чым адзін год, але без такое рызыкі: яшчэ некалькі завершаных разьдзелаў няскончанай кнігі ўсё ж зраблю.*

*5 сакавіка 1993 г.*

---

*[1] Пераправерыў па "Вайне і міры", там: "Как бы со всего размаха крепкою палкой кто-то из ближайших солдат, как ему показалось, ударил его в голову".*

*Людзі, якія пішуць успаміны аб пражытым, па сутнасьці, «трансплянтуюць» свой мозаг у нечую чарпную каробку, сваё сэрца ў нечую грудную клетку. (А чаму ня быць і такому вызначэньню літаратуры, у адпаведнасьці з навукова-мэдычным прагрэсам?)*

*У адной з паездак, калі вучоныя, пісьменьнікі, адрываючыся ад трыбуны шумных, яшчэ гарбачоўскіх, дэпутацкіх зьездаў, выправіліся ў іншыя краіны («Лётай, пакуль можаш хадзіць!»), каб сумесна з учарашнімі супрацiўнікамі шукаць «формулу згоды» — на гэты раз у зацалаваным акіянам амэрыканскім курортным гарадку Ньюпарт высьвятлялі тэму сучаснага Апакаліпсіса, — сустрэў я яе, Сыльвію Клер. Як завуць яе, даведаўся пазьней; спачатку, калі абедалі ў студэнцкай сталоўцы, кінулася ў вочы белавалосая дзяўчына з выразам нейкага бесьперапыннага захапленьня на твары. Амэрыканкі наогул здаваліся мне такімі: увесь час нечаму радыя, усьміхаюцца, але гэтая была асабліваю.*

*Мой сябра-філёзаф, якому перад тым зрабілі ў ФРГ сур'ёзную апэрацыю на сэрцы, першы даведаўся і нам аб'явіў, што ў Сыльвіі Клер — сэрца сямнаццацігадовага хлопца, што загінуў у аўтамабільнай аварыі. І па праву «таксама сардэчніка» ён цалкам завалодаў увагай новай нашай знаёмай, стаў яе як бы распарадчыкам, пасярэднікам паміж ёю і намі.*

*Слухаючы і ня чуючы даклады, выступленьні аб пагрозе ўсім нам глябальнай небясьпекі, — я не-не дый гляну на белавалосую жыцьцярадасную дзеўчынёху з сэрцам маладога хлопца, якога ўжо няма. У сьвядомасьці маёй сытуацыя ніяк не магла набыць устойлівасьць, раўнавагу. Дык жыве яна ці жыве ён? Дапаўняючы адно аднаго, жывуць?..*

*А недзе ёсьць бацькі памерлага, ці знаёмыя яны з Сыльвіяй (распытаць бы, але няёмка), сустракаюцца? Хоць бы па тэлефоне.*

*"— Як ты, дзетка, як пачуваесься?*

*— Дзякуй, мама, добра. Зьбіралася ісьці ва ўнівэрсытэт.*

*— Не забываеш лекі прымаць? Цябе глядзяць лекары акуратна?*

*— Не турбуйцеся, мама, я ўжо й ня помню...*

*Спахапілася: ня помню, што жыву сэрцам вашага хлопчыка?*

*— Дзякую, я так шчыра ўдзячная!"*

*І ўявілася: маці таго, што загінуў, прыяжджае, прыходзіць да дзяўчыны, гамонка аб усім, аб прадметах, далёкіх, староньніх, але думкі, але жаданьне ў маці:* ***дазволь, дачушка, паслухаць яго!***

*Сьвятая і страшная хвіліна: прыпаўшы да чужых грудзей, маці слухае жывое сэрца памерлага сына!*

*Справы любоўныя, справы* ***сардэчныя*** *Сыльвіі Клер: пра што гамоняць яны сам-насам з хлопцам, што аддаў ёй, не ў пераносным сэнсе слова, а ў прамым — сваё сэрца?* ***Жыві маім сэрцам, любі маім сэрцам, Сыльвія!..***

*Гаворкі з чужым сэрцам у сваіх грудзях — гэта па-новаму цікава. Ну а ў мяне — старое як сьвет: размова з уласным сэрцам. Менавіта такая пара «прыступіла» (як скажа беларус) і да мяне. Больш як год мінула...*

*5 красавіка 1993 г.*

# 1. З-ПАД КРОПЕЛЬНІЦЫ

*Канец 1991-га — першая палова 1992-га.*

Уначы з 20 на 21 сьнежня, калі здарылася гэта, было поўнае зацьменьне месяца. Апроч таго — потым даведаўся — афіцыйная дата нараджэньня І.В.Сталіна. (А ён жа прычым? Ды не прычым.)

Дыягназ 7-й клінічнай бальніцы г. Масквы: «ІБС, востры трансмуральны інфаркт міякарда ў пярэдне-сэптальнай, бакавой і вяршковай частцы ЛЖ з разьвіцьцём хранічнай анэўрызмы».

З маёй запісной кніжкі[1]:

«*23-25 сьнежня 91 г.* Адбылося. Самае сур'ёзнае ў маёй мэд. карце. «Вялікі», «абшырны», «з ускладненьнямі» — тут у лекараў правіла рэзаць праўду-матку ў

---

[1] *На ўнутранай вокладцы: "Канец сьнежня 1991 г. і м.б. 1992 г. Запісы для сябе. Зрэшты, наўрад".*

вочы хвораму. Што да мяне — робяць правільна. Жыцьцё маё, ці што, так ішло: у 16-ць маглі забіць дый пазьней падстаўляўся, але пражытыя ажно за 60 лічу падарункам. Чаго скавытаць? Апроч таго, мабыць, я з тых, хто сябе ня дужа высока ацэньваў. Ажыцьцявіўся, на колькі быў запраграмаваны, крыху больш, крыху менш — ужо ня мае значэньня.

Вось і спакойна ўсё ўспрыняў, а з боку — дык і леґкадумна. У чалавека няма абавязку нарадзіцца. Але памерці — абавязак кожнага. Вось і памры.

... Дзіўныя сны ў гэтым стане. Колькі начэй адзін і той жа: выцягваю, выцягваю з паўтрызьненьня нейкую праўду... для кабінэту Гайдара. А сёньня чамусьці ўсю ноч забаўляўся стылістычнай ірoніяй з прозьвішчам Бурбуліса (чытаў у сьне нейкі цікавы нарыс іншаземца).

З гэтым паміраюць? Наўрад. Павінны нейкія больш вечныя тэмы, пытаньні абступіць. Вырашыў — папраўлюся.

25.12.91.

Стала лепш — захацелася яшчэ пажыць. Не, не эканомней, гэта навошта, а вось больш разумна і с к а н ц э н т р а в а н а. На чым толькі, куды плыць?

26.12.

Добра быць запісной кніжкай Бога! — думка вылецела аднекуль са сну.

28.12.

Прачытаў у «Независимой газете», як сваё; увогуле банальнасьць, але калі нядаўна (5 дзён таму) з гэтым згаджаўся не як з цытатай, але як з фактам, падзеяй — гэта іншае: «Каб жыць па-чалавечы, трэба згадзіцца са сьмерцю і перастаць яе баяцца».

Талстой кажа, што сьмерць страшная, калі ня так пражыў. Дык што: не баісься — значыць, пражыў разумна? А колькі, што проста спальваюць сваё жыцьцё, ад-

даюць яго за задавальненьне выпіць нешта сьпіртам пахкае? Дык што — прамой залежнасьці няма. Проста ня трэба пераацэньваць сябе, і будзеш ставіцца да гэтае падзеі спакайней.

29.12

Гляджу на сьнежны дзень за вакном. Утульнасьць. Ты тут, а гэта — там. Сьмерць што — таксама такая ўтульнасьць? Ты ўжо тут, а ўсё — яшчэ там. Так. Пра гэта Лермантаў марыў: (каб) «вздымалась тихо грудь»... Але калі адсюль туды (глядзець) усьлед — хваля, якая як мага глыбей пранікнуўшы — калі (з громам) адыходзяць куміры мільёнаў ці (нехта), наадварот, ціха, але помныя (успамінаемыя) стагодзьдзі — ці ня так накатваецца (намываецца) дарога між жыцьцём і сьмерцю, акенца, дзірка ў скале (прабіваецца), пячорныя хады? Старажытныя ўжо праклалі (такую дарогу, якая зьвязвае, хады), для іх кожны памерлы быў поўны значнасьці, а не асобныя абраныя[1]. Ну, здарылася б гэта ўжо некалькі дзён назад — завіхрэньне пачуцьцяў у нейкім коле людзей, а далей — быццам нічога і ня здарылася, быццам ты жывеш і далей, але цішэй, ня так прыкметна, ня гэтак гучна, і вось тут і пачынаецца зьнікненьне: з памяці людзей, з адносін іх, са справаў. Вось тут і высьвятляецца: жыў ці ня жыў, які сьлед пакінуў і ці пакінуў?

Таму так хоча чалавек напісаць на чым хочаш, хоць на НЛА: «Тут быў Вася!»

30.12.91 г.

Гэта Бог мяне выратаваў. Ад здрады. Няхай нават часовай. (Амаль як усе кароцічы, што бягуць.) Краіна сьлізганула ў прорву, а ты паплыў бы вывучаць Азію. На шмат месяцаў[2]. Самых рызыкоўных і страшных. Калі

---

[1] *Ня вельмі разумею цяпер, што хацеў выявіць, але пакідаю, як напісалася. У дужках — цяперашнія словы-зьвязкі.*

[2] *В.М.Кузьмін рыхтаваў новы круіз (азіяцкі), накшталт таго, які ў 1990 адбываўся па Міжземнамор'і.*

мільёны ахопленыя жахам. Не магу забыць, як нават Рыжоў, сьветлы, разумны, растлумачыў мне безнадзейнасьць сытуацыі, а таму, маўляў, згадзіўся «прыняць Парыж». І не адчувае — аргумэнты накшталт таго, што маці хворая ўсё роўна безнадзейна — таму і пакідаю. Бласлаўляю, дзякую свайму сэрцу — за тое, што адмовілася качаць кроў здрадніка. Японцы маюць рацыю: важна ня як жыў, а як памёр. Мог усё пражытае жыцьцё загадзіць.

... Шчасьлівай дарогі, «Асоба»[1]. А кітайскую сьцяну, Вялікую, усё роўна шкада. Ну, і шкадуй дома, разам з усімі, каму падзецца няма куды. Расхлёбваць спаўна за ўсю 70-гадовую зграю нягоднікаў і злачынцаў, бязьмежна вінаватых перад гэтым няшчасным народам.

31.12.91 г.

Ляжу з інфарктам, гляджу ў тэлевізар на тых, што ідуць па вуліцы напярэдадні 1992 г., і шкада не сябе, а іх. Госпадзе, што чакае гэтых людзей?

3.1.92 г.

Так, жыў я апошнія гады мітынгамі, зьездамі, а ўсё ж, калі пачуў пра пуч, — першае, пра што падумаў: ня скончыў аповесьць! І вось стукнуў інфаркт, усё на краі, пра што падумаў: добра, што скончыў аповесьць.[2]

4.1.1992 г.

Доктар Лена Аляксандраўна шчыра паведаміла: «Інфаркт вялікі, вельмі вялікі і на ўсю глыбіню сьценкі»... Левы жалудачак. Утрымаўся на плыні, мабыць, дзякуючы ўсё ж мужыцкай прыродзе. Але ў любы момант... Што ж, і тут я, пэўна, ад дзядоў-мужыкоў пераняў: Бог даў, Бог узяў! Спакойны да непрыстойнасьці. Колькасна я яшчэ мог бы нешта зрабіць, а якасна — на-

---

[1] *Так называлася арганізацыя В.М.Кузьміна, што плянавала круіз па краінах Азіі.*

[2] *"Вэнэра, або як я быў прыгоньнікам".*

ўрад. Гэта трэба яшчэ гадоў 7-10 у запасе. Ніхто ня дасьць. Ну, што ж, дзякуй і за 64 гады. 64 - 16 = 48. Вось які падарунак хлапчуку, што зьбіраўся стаць паэтам, верыў у нейкае сваё назначэньне. Кулі чамусьці вакол галавы віліся: і ў першай сытуацыі (на пасту ля Незнані), і ў засадзе ля Ўсьцерхаў, калі чыркнула па чэрапе — «Нехта» яшчэ гадаў-прыкідваў: а можа, прыбраць яго? Вырашыў пакінуць. Можа, таму, а можа, па натуры — але жыў я, радуючыся самой гэтай магчымасьці — жыць. І пераважна нічога не баяўся. І ў часы Страху. Таксама пашанцавала.

Так што распараджайцеся мною, як лічыце патрэбным. І нават скавытаць ня буду, што хацеў бы камусьці (ёсьць каму) памагчы выжыць у гэты цяжкі час. Сапраўды хачу. Многім. Але гэта не аргумэнт перад вечнасьцю.

6.1.92 г. (з 5 на 6-га).

Ноч на Каляды ў бальніцы № 7 жахлівая была. Паміраў чалавек. Калісьці (уласная) літаратура (і вайна) падказалі мне: непрыгожы чалавек, які памірае! Што б ні казала аб тым сусьветнае мастацтва, як бы ні гераізавала (сьмерць) тысячы гадоў.

Бедная мая мама, да жаху ў вачах баялася неахайнасьці сьмерці, і ёй давялося прайсьці праз гэта.

Пасьля таго я асабліва забаяўся сьмерці працяглай. І як (жаданая) магчымасьць — нават калі на 5, на 10 гадоў раней — імгненная. Была «рэпэтыцыя» ў акадэмічнай гасьцініцы гадоў 8 таму: хутка ўстаў, каб пайсьці ў туалет, і ... знайшоў сябе на падлозе з выбітым пальцам і разьбітым ілбом. Вось бы так! І ўсё! Якая розьніца — калі? Што значаць гады перад вечнасьцю? А гэта менавіта вяртаньне ў вечнасьць.

... Пасыпаліся «шасьцідзясятнікі», і часьцей за ўсё інфаркт — Каракін, Бурцін, Акуджава, Баткін, не зьлічыць. Ня з зайздрасьцю (да ацалелых) і нават безь зьдзіўленьня: спасьцігае гэта толькі адну палавіну шась-

цідзясятнікаў, той бок, дзе «абстрэл асабліва інтэнсіўны», ці што. Вунь і Бондараў, Праскурын, А.Іваноў і г.д. таго ж пакаленьня. Ну, у іх нэрвы з дроту, як у сталінскіх членаў палітбюро. І наогул у чл. палітбюро.

У «Сов. писателе» мая доўгапакутніца — кніга: «Мы — шасьцідзясятнікі». Назваў, як чуў. М. б., выйдзе.

У «Дне» прачытаў, праханаўскім: «нянавісьць Адамовіча», маўляў, патойбочная, нешта ў гэтым родзе.

Яны гэта хочуць называць нянавісьцю (і ў лістах з лаянкай), тое, што нас спальвала, што шасьцідзясятнікаў (гэтых) рабіла тым, хто яны ёсьць, былі. І менавіта сталі ў 80-я дражджамі працэсу ў краіне, які пераламаў ходу гісторыі, што вось-вось магла скончыцца. Ды не, не нянавісьць рухала і рухае. Іншыя пачуцьці. Зусім-зусім іншыя. Ну, ды пра гэта што!..

... У.Бандарэнка адразу пасьля пучу маліў шасьцідзясятнікаў (у тым жа «Дне»): вы сваю справу зрабілі — адыдзіце! Затым Цыпко гэтак жа ўгаворваў дэмакратаў: дзякуй і адыдзіце!

Што ж, адыходзім. Ну а што гэтак — выбачайце.

7.1.92 г.

Што ж ня пішаш пра тое, што ніхто побач з табой ня быў сапраўды шчасьлівым? І ты сам таксама. Але ўсё па тваёй віне. Цябе любілі. А ты? У цябе было яшчэ нешта, што адцясьняла іх, а ў іх? Кампэнсаваў «сардэчную недастатковасьць» чым? Сваёй літаратурай, справамі вонкавымі (гэтыя апошнія 10 гадоў), але вось надышоў час, і хочацца ва ўсіх папрасіць прабачэньня. За тое, што так цяжка ім было побач са мной. Шкадаваць усіх і любіць — розныя рэчы. Іх шкадаваў, а любіў — сябе? І яшчэ — свабоду сваю. Вышэй за ўсё. Нават ад любові свабоду.

8.1.92 г.

Па «Свободе» зноў Кароціч. І брыдка, і сорамна. Вось так было б. (Калі б я паплыў.)

...У Глушу! У Глушу! У Глушу!

Рыжоў — у Парыж, Фільшын — у Аўстрыю, а ты — у сьмерць. Усе дэзэртыры. Не, вярнуцца і даць апошні бой — «заўтра бой!» — як зьбіраўся Сахараў. Калі і паміраць, дык вось так.

... Перавезьлі мяне ў Цэнтральную клініку. Сяджу з апаратам, хаджу, сплю, як паўлаўскі сабака.

А толькі што (13.1.92 г., у 18.30) пазваніў Гарбачоў. Падбадзёрваў я яго. На стале ў мяне ляжыць пачаты артыкул: пра тое, што наш развал, як ні цяжка, выратаваў сьвет і нас ад немінучай катастрофы, ад зрыву ў нікуды і назаўжды. І гэта зьвязана напрасткі зь дзеяньнямі (і бязьдзеяньнем) чалавека, зь якім я толькі што гаварыў. Я яму параіў усьміхацца. Праз яго спрацаваў інстынкт самазахаваньня чалавецтва. Праз яго. А астатняе, яго недзе правата або неправата — якое гэта будзе мець значэньне?

... Абмяняліся кампліментамі з Гарбачовым.

Ён: — Вы занадта спальвалі сябе.

— Ня вам гэта казаць, Міхаіл Сяргеевіч!

16.1.92 г.

Званіў Ю.Рыжоў. Да таго — Яўлінскі, Акуджава, Чарнічэнка, ну і, вядома, Быкаў. Усе (яны) мой стан успрымаюць усур'ёз. Адзіны, хто ня надта за мяне перажывае, — гэта Адамовіч, ён, той самы, каторы Алесь.

Учора — па-філязофску-фаталістычна, а стала лягчэй — быццам і ня г э т а адбылося са мной. Дактары проста ў лоб лупяць праўду і зьдзіўляюцца: ён што, не разумее?!

17.1.92 г.

Канстытуцыйны суд вырубіў указ Ельцына аб стварэньні новага «НКВД». Монстра. Я яго абазваў так, здаецца, першы. Пазванілі з «Эхо Москвы» (Чаркізаў), як толькі абнародавалі Ўказ па тэліку. Я і сказаў: монстар, трэба пайсьці паглядзець, ці не ўзабраўся Фэлікс на свой п'едэстал? І вось пацьвердзілі тую нашу акцыю скідваньня (ідала на Лубянскай плошчы). Не, а шкада адыходзіць, усё-ткі шасьцідзясятнікі, якіх так угаворваюць «пайсьці», (яшчэ) здольныя вожыка запусьціць Сыстэме, што ўсё не адыходзіць канчаткова.

... Аб'явіўся Кісынджэр у Маскве. Мусіць, забыўся, што прайграў мне бутэльку віскі: а партыя ж зьнікла!

Нейк забыўся, што ўсяго толькі 8-9 гадоў да 2000 году і мог бы дацягнуць. Вось бы, а! Ажно 6,5 млрд. шчасьліўчыкаў змогуць сказаць, што апынуліся на скрыжаваньні тысячагодзьдзяў. Да наступнага вунь колькі яшчэ чакаць многім пакаленьням! Праўда Пятрэнкі: выбух энэргіі на такіх скрыжаваньнях (стагодзьдзяў) заўсёды велізарны. А тым больш — тысячагодзьдзяў. Ну але добра, чаго захацеў.

25.1.92 г.

Цімафееў-Расоўскі: мэта жыцьця — каб, калі давядзецца паміраць, не было б сорамна. Так? Ну а табе? У тым і рэч, што гэта іншым відно. Але і тваё самаадчуваньне тут «прычым»: сорамна ці ня сорамна — табе. Што ж, зазірай у сябе, самы час.

26.1.92 г.

Амэрыканскі фільм: герой кінуўся наўздагон... А ты ўжо не пабяжыш! А ты ўжо тое і тое — не. Гэта і ёсьць старэць, паміраць?

Год назад любіў гаварыць [думаў, што гэта (яшчэ) не ўсур'ёз]: «Пакуль можаш хадзіць — езьдзі». Пакуль

можаш. Цані ж тое, што яшчэ можаш. Напрыклад, за сталом. І вось правай рукой, нагой — можаш. Трапіш у такую бальніцу, адшукаюць такое ў цябе! Зьлева сасуды галавы благія. Значыць (пад пагрозай), правая рука, нага... А таму сэрца — гэта паратунак. Раз — і вечнасьць.

28.1.92 г.

Здаецца, Падзея адкладваецца. Цяпер будзе цяжэй быць філёзафам-фаталістам. Зноў спакуса ўсё магчы, усяго хацець — жыць.

... Нешта я стаў больш сэнтымэнтальным за гэтыя дні, сьлёзы блізкія на любое дабро (калі раптам на экране), але і больш сьмяшлівым, збоку хто пачуў бы — гэта што, што за гэтым?

29.1.92 г.

«З-пад кропельніцы»[1] (ня ведаю, як назавуць артыкул у «Мегополисе») напісаў на зыходзе першага месяца вылежваньня ў бальніцы. Дзіўна, вось выходжу ў лес (у парк), іду, і ня так, як у 79-м (таксама пасьля чаканьня блізкага канца), калі нюхаў суччa, галіны па-сабачы, а тут думкі вакол таго, што не да мяне адносіны мае, не прамыя — а што там, у артыкуле. Вунь як стаў жыць «справай», а не жыцьцём. Магчыма, таму і не спужаўся блізкае Падзеі. Ну, ня з р о б і ш яшчэ нешта. Дык ужо ж зрабіў сёе-тое. Гэта ня «клейкія лісточкі». Што, у гэтым адказ?

30.1.92 г.

У сталоўцы ( я ўжо ў санаторыі імя Герцэна) бачачы старых, хворых, падумаў: як адносяцца людзі у камэрах сьмяротнікаў адзін да аднаго? Лепш, чым у агульнай жытцы (дзе таксама сьмяротнікі, але не ўсьведамляюць гэтага штохвіліны), ці горш? У чым розьніца? Там усе ў адным становішчы, толькі тэрмін розны. Але ня

---

[1] *Артыкул у "Megapolis-express" №7 называецца "Не забі чалавецтва".*

могуць за кошт другіх уратавацца, адтэрмінаваць. Тут тыя ж сьмяротнікі, але гэтая магчымасьць ёсьць. Ну, і ня помняць, што сьмяротнікі. А каб помніць? М. б., лепш і дабрэй былі б да такіх жа асуджаных.

1.2.92 г.

Я гэта ведаў тэарэтычна: чым далей чалавек ад сьмерці, якой (ужо) крануўся, тым больш баіцца гэтае Падзеі. Пачынае баяцца. «Сындром Качагуры» — наш партызан, контрразьведчык, які ўражваў храбрасьцю, халоднай рызыкай, гуляў сваім жыцьцём, часам без патрэбы. Праваліўся пад лёд, захварэў на сухоты, і які ж гэта быў варты жалю чалавек пасьля вайны: ні пра што ня мог гаварыць, адно пра сваю хваробу. Не захварэць бы на гэтую хваробу, гэты сындром.

... Глядзіш, як на марсіян, на ўсіх, хто можа бегчы, танцаваць, па лесьвіцы ўзыходзіць. Але калі нават так: галава засталася, гэта твае ногі, твой бег і танец — сядай за стол!

2.2.92 г.

Дзіўна, але сны зусім спакойныя, не зьвязаныя аніяк з тым, што адбылося. Калі «матэрыялістычна» тлумачыць — ціск вельмі нізкі: 100/75. Ну а псыхалягічна — мала думаю пра Падзею, нават калі і запісваю штодня, то нейк збоку: «Паўлаў працуе!..»

2.2.92 г.

Цікава, калі б я зараз быў інтэрнаваны (перамаглі праханавы-янаевы), ці здарылася б г э т а са мной? Ці не да таго было б?

2.2.92 г.

Калі памірала мама, я ляжаў у той жа бальніцы паверхам ніжэй з кровазьліцьцём у страўніку, а яна ня ведала («У Сашы грып»), ня надта верыла, што грып, праз боль свой фізычны нешта па-мацярынску ўгадвала,

але была і крыўда: «Дзе Адамовічы?» (Не «мае сыны», а Адамовічы.) Зразумела яна т а м, што ёй хлусілі дзеля яе ж «спакою», як яна мяне сустрэне? Ні разу за хваробу яна мне не прысьнілася (не, здаецца, днямі было), а раней сьнілася часта. У сувязі з падзеямі майго дамашняга жыцьця. А тут — не. Ці не чакае? Яшчэ не чакае?

... Тут, у санаторыі, сэрца цягне на вельмі нізкі ціск: 100/75, увесь час галавакружэньне і тупое адчуваньне пад пахай. У горадзе гэтага не было. Ну што ж, тым больш трэба сядзець за сталом. Гэта ж можаш.

... Артыкул у «М.-Э.» зноў пра ядзерныя справы, напісаны да т а г о, як Ельцын выступіў з сваёй ініцыятывай, у ім я якраз заклікаў да такой ініцыятывы (надрукаваны будзе п а с ь л я ўжо яго паездкі на Захад), напісаны дзякуючы бальніцы? Г. зн. дзякуючы хваробе. Чаму аддаў бы перавагу? Не, не скажу, што артыкулу: (добра б) без хваробы, але з артыкулам. Як сказала, пэўна, даруючы, Вера: «Ён любіць толькі малако і сваю літаратуру». Што, больш за само жыцьцё? Ці «літаратура» і ёсьць маё жыцьцё?

2.2.92 г.

Стаў сьлязьлівы на дабро — фільмы глядзець не магу, нават дурныя.

4.2.92 г.

Раптам скеміў: спакойныя сны ў т а к і м становішчы тлумачацца проста: мышца сэрца працуе слаба, сасуды мозгу не перапоўненыя крывёй, а значыць, і снамі, трызьненьнем. І нават якія ёсьць сны, заштрыхаваныя, слаба праяўленыя. 300 мэтраў — і ціск падае да 100 ці 95 (а было за 140 і вышэй). Затое ночы спакойныя. Што ж, гэта памагае па-філязофску чакаць, будзе ці ня будзе Падзея. І калі будзе.

4.2.92 г.

Бацька Герцэна: «Вось мне 76 гадоў, а я ўпершыню паміраю».

Я не скажу так. Гэта ўжо трэці (раз), калі я ведаў (што вось яна, сьмерць!). Ды не, у вайну было ня менш пяці выпадкаў, калі (да сьмерці) не 4 крокі, а паўкрока было. Значыць, у 7-ы, 8-ы раз. Ну, і ў 79-м. Не апынуўся б у бальніцы, дзе памірала мама, 2,5 літры крыві ў страўніку мяне даканалі б. І тут мама (вось гэтак) выратавала.

Вось чаму я так стаўлюся да Падзеі. Таму?

5.2.92 г.

Упарта залятае сінічка (вось ужо 4-ы раз за 15 хвілін) у мой пакой. І да майго ложка ўсё, хаця рэшткі абеду на століку ў другім канцы пакоя. Ну, што хочаш мне паведаміць? Што чакаюць мяне недзе там? Ведаю і безь цябе. Не, буду лічыць, што гэта падарунак мне, покліч да жыцьця.

7.2.92 г.

Увайшоў зноў у працу (эсэ пра тры дні пучу), і зноў цана жыцьця павысілася. Раней я пачынаў пабойвацца самалётаў, але толькі датуль, калі аповесьць пісалася. Заканчваў — і гэтае пачуцьцё зьнікала. Ну а сёньня сытуацыя пасьляінфарктная і ўсё зьмешана. Але ранейшыя паводзіны і тут праяўляюцца. Хочацца скончыць — хочацца жыць.

11.2.92 г.

Усё, што я змог зрабіць, ужо зрабіў, што ўзяць ад жыцьця змог (я!) — узяў, які ж сэнс трымацца за яго, калі сэрца ў цябе распалавінена, як шабельным ударам (лекары, лябаранты ня тояць, якіх маштабаў паражэньне). Каб потым адбылася тая самая падзея, але ў вартым жалю выглядзе — навошта гэта?

Праўда, ёсьць некалькі чалавек, дзеля якіх варта б жыць. Але потым на іх жа ляжа твая немач і с о -

рам сьмерці. Ну, а 2000-ы год? Усё ж шкада, што не дацягнуў. Гэта амаль як з-за Месяца на Зямлю зірнуць, заляцеўшы туды, — чаго таксама хацелася.

... Бунін пра сэрца: «няма (яму) роўнага ва ўсім створаным па таямнічасьці і тонкасьці». І думка: што будзе зь ім «праз сэкунду»...

З маім менавіта так і было: радасьць жыцьця, ранішняя бадзёрасьць і раптам... У пот кінула, загу-улі рукі, і ты ўжо на краі. І нават хаця і жывы, гэтак шмат для цябе (ужо) забаронена. Узяць і пабегчы...

12.2.92 г.

Ну і што з таго, што Бунін увесь час думае, жыве ў боязі небыцьця, сьмерці, а ты — побач будучы з гэтай падзеяй, бачачы ўжо нітачку, на якой вісіш, трымаесься з апошніх сіл свайго міякарду, — ты «не баісься»? Проста яму дадзены большы талент (яму, Талстому), г. зн. большая адказнасьць, і ён ёю зьвязаны, адказвае за нешта большае, чым ты. Таму чапляесься, як маці, за край прорвы: за плячыма ж у яе дзіця прывязана. (Той самы талент.) Не сябе толькі ратуе, а і яго. Вялікі дар, яму адпушчаны, на яго адказнасьць пакінуты.

19.2.92 г.

Вось ужо 20 дзён у санаторыі імя Герцэна, побач і вакол намэнклятура. Тое самае, як пасьля бою параненых варожых войскаў сабралі б у адным шпіталі. Цяпер у нас агульны вораг — інфаркт, язвы, артрыты. Пра тое, што нас учора разносіла ў шмацьцё, не размаўляем.

20.2.92 г.

Толькі Бунін зь яго неадступнай думкай пратэсту аб сьмерці мог напісаць пра труну: «пакладуць у тое, ні на што ў сьвеце не падобнае, усяму сьвету чужое і варожае». («Да роду бацькоў сваіх»)

20.2.92 г. (6 гадзін)

Усяісьціна ў тым, што памерці я хачу ў Беларусі, а ляжаць у Глушы. Там я зьвязаны з усім. Тут жа толькі ты. Гэта — для жыцьця. А для Вечнасьці — Беларусь.

23.2.92 г.

Ён памёр у сьне ад (цяжкога) сну. І ніхто ня ведаў, чаму і што (пры)сьнілася. [Ад такога вось магло (можа) гэта здарыцца.]

10.4.92 г.

«Падмаскоўе». Каб я так усё жыцьцё ўкалваў, як зараз (інфаркт чакаць ня будзе!), шма-ат бы пасьпеў. Што ж, не растраць апошні капітал (адпушчаных) дзён.

... Жырыноўскі — выкідыш КПСС.

... З Плютарха: «Цыцэрон, загадаўшы пакараць сьмерцю змоўшчыкаў, крыкнуў натоўпу: "Яны пражылі"». Так выказваліся рымляне пра людзей, якія памерлі, калі не хацелі прамаўляць злавесныя словы.

А пра сябе? «Я пражыў»?

17.5.92 г.

(Санаторый) «Падмаскоўе». (Ужо) магу дакрануцца да гэтага. 8-га днём пазванілі: дзень, маўляў, благі, поўня, папрасі зрабіць укол... Звыклыя трывогі, нічога не западозрыў. «Алесь!.. У цябе бяда, там дома... Толькі...». «— Жэня?! Брат? Памёр?» «Так, толькі... думай, што павінен яго любімых унукаў падняць, паставіць на ногі»... І іншае, што кажуць у такіх выпадках.

Памёр. Не, ня я памёр — Жэня! Ён усё ірваўся прыехаць да мяне, хворага, а я баяўся дарогі для яго цяжкай. Ніколі ў нас не было вонкавых праяваў, у словах, у абдымках [здаецца, толькі мёртвага (упершыню) я пацалаваў яго, за ўвесь час, колькі сябе помню], а тут ён (часам) загаворваць стаў, што мы вось удвух засталіся:

мама і бацька ўжо ў Глушы. Дзе і нам ляжаць. За дзень да таго, што адбылося, даслаў газэту, якая магла быць цікаваю мне, і шматок-ліст: клікаў у Менск. За ўсё жыцьцё Жэня (я ня помню выпадку такога і не ўяўляю яго) на ніводнага чалавека нават голасу ня ўзьняў. (Свае ня ў лік, у дзяцінстве мы біліся і яшчэ як. Зрэшты, «лез» я, а ня ён). У пакой зайшоў Юра (Каракін), зь ім Мая (лекар з Масквы), санаторныя лекары. Зразумелі, што паеду, што б ні казалі мне. І таму не настойвалі.

[Потым сказалі, што і (літфондаўская) Раіса Аляксееўна і Паліна Андрэеўна (з «Герцэна») былі рашуча супраць паездкі.] Але пра што тут можна гаварыць?.. У Менску Вера і Марыя зрабілі ўсё, што патрэбна; ня толькі раджаць, але і хаваць Бог даручыў жанчынам. Хлапчукі затаіліся. (На ўсё жыцьцё гэта застанецца ў іх: дзед для іх быў вялізным любячым, грэючым сонцам. Да анэкдотаў, нашых, сямейных даходзіла яго аб іх бязьмежная ласка, клопат.)

Ён ня мог легчы побач з бацькам і мамай, месца там ужо няма. Празь дзьве магілы. Я папрасіў у Марыі пакінуць маё побач зь ім. Я заўсёды ведаў, што буду там, на гэтых моглікак, што цяпер (ужо) магу стаць і пастаяць там, дзе мая Вечнасьць. («Вось тут буду ляжаць».) Калі адсартаваць усе мае (якія захаваліся) жаданьні: нешта пабачыць, напісаць і інш., і інш., на першым месцы і галоўнае, якое засталося б: ляжаць там, у зямлі бацькоў, брата, дзяцінства і ўсяго, з чаго складаўся ўсё жывое жыцьцё.

20.5.92 г.

І тым ня менш кожны дзень жыцьця — адкрыцьцё. Хаджу вечарамі і раптам выявіў тое, чаго, здаецца, не заўважалі (не адзначылі): калі зьяўляецца салоўка, пачынае паласкаць горлачка, увесь птушыны лес усьлед асабліва стараецца — зьявіўся Майстар, і ўсе астатнія пачынаюць (тужыцца) старацца наперабой, кожны хоча падняць планку.

16.6.92 г.

За некалькі дзён да саракавін мне прысьніўся Жэня. Мне ўсё хацелася дакрануцца да яго рукі, пераканацца, што рукі ў яго цёплыя. Так і было — цёплыя. Мне на гэта сказалі: з н а ч ы ц ь,  ё н  я ш ч э  т у т.

З «Падмаскоўя» да сяла Біцюгова — 3 км, там старая, 16-га стагодзьдзя, царква, зруйнаваная ў 1939 г., цяпер яе намагаецца адрадзіць бацюшка Яўген, цёзка Жэні, малады сьвятар. Дамовіліся аб службе 40-га дня, але ён быў моцна прастуджаны і, апроч таго, павінен быў у той дзень везьці бярвеньне на пільню. Са спазьненьнем — а 17.00 усё-ткі зьявіўся, затым матушка яго.

Яны і справілі службу ў пустой царкве: голая цэгла, падцёкі і зяленіва, мох у алтары (сказаў, што грыбы там зьбіраюць), але нешта ў акалічнасьцях было такое, што я ўпершыню ў жыцьці некалькі разоў пералсагнаўся — усьлед за бацюшкам Яўгенам.

Што памагае чалавеку пераносіць страту найблізкіх яму людзей? Тое, што і ён сам неўзабаве (ці не неўзабаве, я дык якраз хутка) будзе там жа, і, адпяваючы тых, чалавек чуе, як будуць яго адпяваць. Сьмяротныя — у гэтым апраўданьне ўсяго нашага жыцьця.

13.7.92 г. Перадзелкіна.

На экране японскага апарата «Рэха» — разрэз майго Сэрца, на плыткім фоне дражніцца язычок клапана. Вось дзе твой гадзіньнік. Завод скончыцца і... Напісаў Сэрца зь вялікай літары. Пішу, сьпяшаюся скончыць «Нямко». Бачыў гадзіньнік і сьпяшаюся.

# 2. І ЗНОЎ ПАЧЫНАЕЦЦА ДЗЯЦІНСТВА

Італійскія грэкі-сыбарыты не дзеля дзіцячае попкі стараліся 2500 гадоў таму назад, калі вынаходзілі начны гаршчок. Гэта быў прадмет раскошы, зусім царскі, каралеўскі. Каб дзяржаўная пэрсона магла пасядзець-падумаць сам-насам, на сьвежую галаву. Зрэшты, недзе чытаў, што мітусьлівыя, нецярплівыя да адзіноты Людовікі і нават Кацярына Вялікая дапускалі найбольш вартых прыдворных да сузіраньня і гэтае падрабязнасьці свайго ранішняга туалету. Пры гэтым вяліся куртуазныя размовы.

Што ж дзіўнага, што маленькія грамадзяне, калі начны гаршчок зрабіўся іх прывілеяй, з усіх сіл стараюцца прыцягнуць да сябе ўвагу навакольных менавіта ў такой позе, становішчы. Нават калі пераконваюцца, што гэта зьвязана з пэўнай рызыкай.

За сталом, вакол вялікай сьветлай лямпы, госьці, чужыя цёткі і дзядзькі спажываюць, гамоняць, сьмяюцца. А ты павінен адзін сядзець у цёмнай кухні. Ня дзеля гэтага ты папрасіўся на гаршчочак. Як бы міжволі пачынаеш дрэйфаваць у напрамку да сьвятла, умела пакручваючы голай попкай. Да квяцістай шырмачкі, што аддзяляе кухню ад сталоўкі, яшчэ спакойна, а далей патрэбна гранічная асьцярога і непасьпешлівасьць. Гаршчок пад табой ня можа рухацца напрасткі, а складанымі петлямі, трэба пры гэтым і патрэбны кірунак вытрымаць і ня вывернуць яго з усім зьмесьцівам. А калі «вадзіцелю» два-тры гадкі і аблічыўся — задачка гэтая ня зь лёгкіх. Галоўнае — падруляваць непрыкметна і як мага бліжэй да стала. Не, ня дзеля таго, каб сябе паказаць, а каб на другіх паглядзець, паслухаць жывы сьмех, гамонку... Мамін ускрык, жах і адчай у ім! Ну, можна падумаць, страшны воўк у пакоі зьявіўся і зараз распужае або зьесьць усіх яе гасьцей. Ускоквае з крэсла, кідаецца да цябе, загароджвае стол. Схапіўшы разам з гаршком, нясе на кухню. У цемру, адкуль ты і зьявіўся. Вас праводзіць няпэўны сьмяшок гасьцей. Тата, ягоны голас, тлумачыць (не без задавальненьня):

— Упарты парсюк!

Гэта наша першая кватэра, у якой я сябе бачу, помню. Вялікі пакой шырмай зь вялікімі яркімі кветкамі па ўсім полі распалавінены: на «сталоўку» і «спальню». Спальні аддадзена вялікая ласкава-цёплая печ. Пашчай, што дыхае агнём, яна выходзіць на кухню. На кухні гаспадарыць мама, на печы — мы з братам «Занай» (наогул ён Жэня, але «з» лягчэй вымаўляецца). На печку ўзьбіраемся проста з нашага ложка.

Але, бадай, самае прыкметнае ў прадметным сьвеце нашага дзяцінства была Лямпа — зіхоткі мэталічны шар на чорнай трынозе, шкло з крута разьдзьмутымі шчокамі, падтрыманае зьнізу ўзорыстым венчыкам. Як толькі змрок выпаўзае зь цёмных куткоў, запаўняючы спальню, кухню, а затым усю кватэру, і за вокнамі так-

сама пачынае цямнець, запальваецца, узгараецца Лямпа. Кнот у Лямпе не пляскаты, як у той бляшанцы, што на кухонным стале (тую я ня стаў бы пісаць зь вялікае літары), а круглы. Напачатку полымя ледзь трымаецца за чорны краёчак кнота, а павернуць зубчатае кольца, і сьвятло затапляе пакой — сьцены быццам рассунуліся, столь узьляцела. Калі блізка прысесьці, вуха пачуе шыпеньне, жывы шэпт Лямпы. «Шасьцілінейная» — помню гэтае загадкавае слова, якое вымаўляецца з павагай нават калі яна, запыленая і забытая, стаяла на шафе, а са столі зьвісала пазначаная мухамі электрычная лямпачка на жорсткім перакручаным дроце. Начныя матылькі з крэйдавымі крылцамі — здавалася, што ўсё тыя ж, — віліся цяпер вакол гэтых лямпачак.

Вочы помняць квяцістую шырму-загарадзь, прасьвечаную зьзяньнем Лямпы, калі ляжыш у ложку, ужо супакоена, вячэрняю валтузьнёю адваяваўшы ў старэйшага брата табе належную палавіну ложка. Гэты малюнак лёгка і натуральна накладваецца на ярка-зялёны за домам лужок ля таўшчэзнага дуба, з жорсткімі амаль бяз паху жоўтымі люцікамі, мякенькай мядовай канюшынай і нечаканай, як спалох, ягадкай сунічкі, што раптам цябе гукнула.

Усе раньнія хваробы помняцца як доўгае, да галавакружэньня, углядваньне ў плыткія малюнкі, зьменлівыя контуры на празрыстым паркалі, з-за якога (хутчэй бы!) узьнікне мама з заклапочаным і ласкавым тварам...

Калі на шкарлятыну захварэў, брата ад мяне выдалілі. Мне на зайздрасьць — на нашу печ, ён там спаў. Зьвешваўся зьверху і грымасьнічаў. Як бы на зло мне. Проста яму, нам было сумна адно без аднаго.

Печка — наша чароўнае царства, да апошняга сантымэтру абжытае, абнюханае, аблізанае. Так, і аблізанае. Калі навукова тлумачыць, дзіцячаму арганізму не хапала кальцыя. Вось чаму і глядзеў на любую пабеленую сьценку ці бакавіну печкі як на мёдам намазаную. А ўжо калі сьвежавыбеленая!.. Некалькі крокаў цягнуў язы-

ком, мокрым ад задавальненьня, па пахкай сьценцы, вапне, крэйдзе, пакідаючы выкрывальную, нават калі высыхала, палосу. А паколькі брудны бардзюрчык цямнеў на ўзроўні майго росту, уважлівай гаспадыні ня цяжка было вылічыць крэйдавага наркамана. Ну, мама, добра, яна адно сказала бацьку, што трэба мне аптэчнае крэйды, вугалю, у парашках купіць. Зусім іншы быў эфэкт, калі такі ж бардзюрчык на сьцяне і печцы пабачыла ў сваіх апартамэнтах «пані Пагоцкая», гаспадыня дому, у якім мы здымалі кватэру.

Але гэта асобная гісторыя, асобная старонка нашага жыцьця, аб ёй крыху пазьней. Дэталь ня простых і ў нечым загадкавых адносін нашай сям'і зь сям'ёй Пагоцкіх. О, каб людзям вядома было загадзя, якім жахам могуць павярнуцца ўвогуле нікчэмныя дробязі! Калі жыцьцё раптам крута разьвернецца. (Пад старым, гнілым пнём можа хавацца вунь што: брат Зана, бы асілак, зьвярнуў яловую гнілушку на ўскрайку жытнёвага поля, а пад ёй мы, ахнуўшы, пабачылі зіхоткае кольца зьмяюкі, што неспакойліва заварушылася. Усё жыцьцё потым з асьцярогай азіраў падобныя пні, перш чым на каторым сесьці.)

Як і павінна быць паміж братамі зь некаторай розьніцай у гадах, мы заклапочана дзялілі сфэры ўплыву ў сям'і. Я доўга і трывала ўтрымліваў плацдарм у ложку бацькоў — права малодшага спаць паміж імі. Брату толькі і заставалася — урачыстасьць, што яму аднаму цалкам належала дзіцячая пасьцель. Уладкаваўшыся паміж бацькам і маці, я, перад тым як заснуць, захопліваў маміну руку, прыціскаючы, абдымаючы яе цёплы малочны пах. А ёй, беднай, ні павярнуцца, ні расслабіцца. Бацька на месца яе рукі ціхенька прасоўваў у мае абдымкі сваю. Патрымаўшы нейкі час падмену, я абавязкова прачынаўся і пратэставаў са словамі:

— А, вялікая рука! Ня маміна!

Зыгмунд Фрэйд сказаў бы, што я раўнаваў да маці ня столькі брата, колькі бацьку. «Немцу» відней, ён малпу прыдумаў!

Брат адыгрываўся на іншым: вечарамі непрыкметна забіраўся на печку і сядзеў там ціхенька, пакуль я важдаўся ўнізе, за сталом або на кухні. Трэба спаць класьціся, ужо сьвятло тушыць сабраліся, і тут выяўляецца, як мяне бессаромна падманулі.

І вось яны ўсе трое ўнізе, у ложках, цёмна ў хаце, а я ўпарта сяджу на печцы і адседжваю недаседжанае.

— Сынок, — ласкавы голас бацькі, які быццам нічога не разумее, — што ты там робіш? Ідзі кладзіся спаць.

Што я, як быццам ня ведаюць!

— Гэта яшчэ што такое? — Мама ўжо сярдуе. — Што за фантазіі? Зараз жа ідзі спаць.

— А-а-а! — чуецца зь печы. — Зана больш сядзеў.

А вось зараз, ня Занава, мая ўрачыстасьць, перамога: я лётаю, няхай нават з гаршком. Зьлёгку (зусім не балюча!) адлупцаванага, з халоднай, спаласнутай на хаду попкай, мяне зьмяшчаюць побач з братам.

— Бессаромны! — папікае мама.

А брат дэманстратыўна адсоўваецца, паказваючы, што ня хоча і ляжаць побач з ванючкам.

На сьвятло Лямпы, як улетку белыя матылькі, зьяўляўся часам у нашай кватэры сівавусы сусед — гаспадар Пагоцкі. Зь вінаватай усьмешкай сядаў збоку, заўсёды адмаўляўся, калі запрашалі за стол, вячэраць. Не, ён прыйшоў пагаманіць. А дакладней — гаманіць. Сядзеў і расказваў, расказваў. Як бы адна бясконцая гісторыя. Быццам шум дажджу чуеш — роўны голас чалавека, які столькі помніць, ведае.

У Пагоцкіх было некалькі сыноў, дачка, можа, таму, што яны старэйшыя за нас з братам былі, пра іх мая раньняя памяць анічога не захавала. Ну, проста анічога, затое сам Пагоцкі, яго гэтыя вячэрнія наведваньні і мой паход на гаспадарову палавіну дому запомніўся. Яшчэ б: гэта скончылася скандалам, гучным у двары крыкам «пані Пагоцкай»: «А хоць бы вы падохлі, мае вы даражэнькія! Смаркачы паскудныя!»

Павёў мяне і брата Зану да сябе Пагоцкі, калі ні нашай мамы, ні гаспадыні дома не было, можа, у краму ці на базар, але некуды яны адлучыліся. Сьпярша ў прасторнай кладоўцы абдарыў нас прыгожымі, але вельмі цьвёрдымі ігрушамі, затым мы прайшлі праз кухню у «залю». Адзіны жыцьцёвы ланцуг маіх адкрыцьцяў-зьдзіўленьняў перад чымсьці даўнім, зьніклым, «музэйным» жыцьцём, калі называць палац графа Паскевіча ў неразьбітым яшчэ вайной Гомелі, затым ленінградзкі Эрмітаж у студэнцкія гады, — пачаўся ўсё-ткі з «залі» Пагоцкіх у заводзкім пасёлку Глуша Бабруйскага раёну. Уразіла падлога: было страшнавата на яе ступіць, як на шкло. Ярка пафарбаваная ў жоўты колер. Вялізная, да столі, чорная шафа, а па дзьверцах і па канту яе — розныя вянкі з ігруш, яблык, сьліваў, чорных, драўляных. На белых сьценах (такіх сьвежых, што сьліна ў роце набрыньвала) віселі, як я разумею, танныя літаграфіі, але яны тады здаліся нетутэйшым багацьцем: на кожнай карціне — каляровая сцэнка паляваньня. І забітыя, абвялыя зайцы, і акрываўленыя велізарныя птушкі, і падцятыя, выгнутыя, як лук, паляўнічыя сабакі, самі паляўнічыя з ружжамі, белавусыя, дужа падобныя на Пагоцкага, — быццам з гісторыяў, апавяданьняў гаспадара дому. Нейкае нязьведанае — да нас — жыцьцё.

Але як я мог не аддаць належнае і сьвежавыбеленым сьценам «пані Пагоцкай»? Злачынцаў яна вылічыла імгненна, і ўжо празь дзьве гадзіны мама з жахам слухала яе кляцьбу за вакном (пры гэтым перападала і самому Пагоцкаму), брат на мяне шыпеў («Ніяк ты не наліжасься!»), а сябе помню толькі праз страх, што злая старая зараз адвяжа, спусьціць з ланцуга вялізарнага рыжага сабаку, які заўсёды бегаў і брахаў уздоўж працягнутага ад хлява да варот дроту, што ныючы павісквал ад кольца, калі сабака цягнуў ланцуг.

Думаю, мама зноў упрошвала бацьку: пашукаць іншую кватэру, прасіць казённую, абы далей ад гэтага крыку, што кляне яе дзяцей.

У «Вайне пад стрэхамі», калі я расказаў пра «Жыгоцкіх», пра старую і яе сына Казіка, якія ледзьве ня скінулі сям'ю «Корзунаў» у падвалы нямецкай службы бясьпекі на пакуты і сьмерць, я ўсё сказаў.

Што «Вайна пад стрэхамі» — працяг усё той жа грамадзянскай, распачатай у 17-м, гэтая здагадка ў самой назве раману закадаваная. Але, вядома, не разгорнута. Як гэта мы робім сёньня, зьвяртаючыся да тых падзеяў. І я ўжо ў стане на падзеі паглядзець вачыма і іншай сям'і, Пагоцкіх-Жыгоцкіх. Іх сына, старэйшага (лейтэнанта ці нават вышэй па званьню) забралі ў 37-м. А раней — раскідалі моцную іх гаспадарку. Не саслалі, а толькі абкарналі іх зямлю, аб якасьці, урадлівасьці якой выразна сьведчылі магутныя дубы, што сьцяной крыху воддаль стаялі (дрэва гэтае на беднай глебе не расьце), не раскулачылі іх толькі таму, мабыць, што жылі ня ў вёсцы, а ў рабочым пасёлку. (Ня ўсіх адразу.) І вось на самым «жытнёвым» канцы іх поля пачалі будаваць бальніцу. А доктар гэтай новазбудаванай бальніцы — іх кватарант. Мабыць, характар у старой быў шкодны. Сам Пагоцкі, нене дый загаворыць, здаралася, пра жонку сваю зь нечаканай нянавісьцю і сорамам. Але зірніце, якой д'ябальскай сумесьсю, кіслатой палівалі душы людзей. Жонка доктара, якая «замахнулася» на дабро Пагоцкай (наша мама) — сама з раскулачанай сям'і, як тут устрымацца старой і не нагадаць кватарантам-акупантам пра гэта? З радасным крыкам разносіла навіну, калі даляцела да Глушы, што сям'ю доктаркі саслалі: «Цяпер і вы паенчыце!»

У галовах нашага насельніцтва панаваў дзікі кавардак ад усіх падзеяў. Я ў вайну ня раз чуў, як заводзкія паліцаі з гарачлівасьцю даваенных актывістаў лаялі «кулакоў», «куркулёў» вясковых. Дзе, як не ў падвалах НКВД, ішлі рэпэтыцыі, браліся ўрокі таго, што вычваралі потым «нашы людзі» ўжо ў падвалах нямецкіх «службаў бясьпекі», СД і гестапа? Ну, а вышукваць, зна-

ходзіць і сыгналізаваць аб «ворагах» (сёньня — контррэвалюцыянэрах, «кулаках», заўтра — камуністах, габрэях, партызанах), гэта проста-ткі ўбівалася ў людзей. Столькі гадоў.

... Так, магчыма, што гэта ўсяго толькі (і шкада, калі так) падмена сапраўднай веры ў бясьсьмерце — мэдычнай вэрсіяй яе: усе гэтыя гісторыі пра жыцьцё пасьля жыцьця. Life after life. Расказаныя людзьмі, якія пабылі ў стане клінічнай сьмерці. Але як хочацца ў гэта паверыць: пралятаеш па тунэлі-трубе сьмяротнага жаху і адзіноты і раптам — вырываесься, цябе абдымае незямное сьвятло, сустракаюць, да цябе вярнуліся тыя, каго страціў, здавалася, навек. Перад кім заўсёды перажываеш пачуцьцё віны, бо менавіта ты а д п у с ь ц і ў тых, каго любіў. Ня ўсё зрабіў, каб затрымаць. Сустракаюць, каб табе ня страшна было. Сьвятло, добрае, нязвыклае, незямное любові сьвятло ўзгадваюць усе, хто пабыў там і вярнуўся. Ні пекла, ні раю, а вось такая сустрэча з самымі-самымі?.. А што, калі ў ліку тых, хто сустракае т а м, і былыя нашы ворагі? Няхай ззаду, няхай за сьпінай тваёй мамы, бацькі, брата, сяброў... І што калі «пекла» (побач ці унутры «рая» той сустрэчы) — гэта ты сам, раптам сярод тых, хто любіць цябе, убачаны вачыма тых, хто цябе ненавідзіць. Што калі гэта і ёсьць б я с к о н ц а е і м г н е н ь н е п е к л а? (Там роўнае вечнасьці ўсё.) Сустрэча з самім сабой — такім нягоднікам, такім паганцам, якімі нас бачаць, бачылі ворагі нашы (а мы — іх). Бо ж нават сьвятыя старцы перад канцом прасілі ўсіх, малілі даравАць ім.

Помню, у Менску гэта было, садзіўся я ў тралейбус, і раптам чалавек, што ішоў сьледам, ня проста мяне стаў штурхаць усярэдзіну (здавалася, што не было і асаблівай таўханіны ля ўваходу), мяне не піхалі, мяне спрабавалі раздушыць — такое было адчуваньне. Такога пачуцьця ф і з ы ч н а й н я н а в і с ь ц і, што на мяне напірала, я ніколі ў жыцьці да таго (дый пасьля) не перажываў. Проста ня ведаў, што вось так можна перажываць. Азір-

нуўся і адразу пабачыў пацьвярджэньне — перакошаны ад злосьці, наліты сьвінцовай варожасьцю твар пісьменьніка К. Гэта быў час нашае нядоўгае маладое ўрачыстасьці над ганебна заголенымі, распранутымі перад грамадой вольнымі і міжвольнымі слугамі сталінска-берыеўскай д'ябаліяды. (Якія праз год-два зноў вярнулі свае трывалыя пазыцыі.)

Будучы ў Маскве, гэты К. даведаўся, што Адамовіч, які працаваў тады ў МДУ, адмовіўся падпісаць ліст супраць Сіняўскага і Даніеля. Так падставіўся! Са словаў выпадковага суседа ў вагоне, уначы колькі разоў падскокваў на купэйнай лаўцы, садзіўся і ў шчасьлівай урачыстасьці, смакаваньні выгукваў: «Не падпіса-аў!"

Ён ужо памёр, ён ужо *там*.

Якім жа я сам сябе пабачыў бы — яго вачыма! Што перажыў бы, нават адгароджаны ад нянавісьці сьвятлом любові, ужо незямной?..

Перада мной фатаграфія, на якой уся наша, тады такая маладая, сям'я, — 1928 ці 1929 год. Перазьнята з падпсаванай, якую мама насіла ў вузялку на шыі амаль год (калі карнікі загналі наш атрад у самыя гіблыя балоты), ведаючы пра мяне і Жэню толькі тое, што ёй расказалі ўратаваныя партызаны: што яе сыноў нямецкі танк в о с ь  т а к  (і нагой па рыпучым сьнезе!) запрасаваў у акопе...

Я ў шэрай куртачцы з паяском стаю на лаўцы, прыхіліўшы (пястун) галаву да бацькавай, справа за сьпінай мама, а бацька і брат Зана (у аксамітнай цёмнай куртачцы, у руцэ мамін кашалёк) сядзяць на той лаўцы.

Такіх кароткіх валасоў у маці, колькі яе помню, не было ніколі. Але, можа быць, гэта пасьля хваробы ад сапсаванага сьвінога мяса (трыхінэлёз), якую, як яна ўспаміналa, лячылі тады сьпіртам, гарэлкай, літаральна спойваючы хворага? Шырокі каўнер, відно, што шаўкова-мяккай сукенкі, твар звыкла строгі, заклапочаны (калі гэта 1929 ці 1930 год — тым больш зразумела, чым

заклапочаны) і прыгожы. [Нейк ужо ў Менску, пасьля мамінай сьмерці, пазваніла мне жанчына, што калісьці жыла ў Глушы, і раптам расказала, як яны, школьніцы, у часе вялікіх перапынкаў бегалі ў аптэку быццам бы купіць «сен-сену» (замест цукерак), а насамрэч: «паглядзець на прыгожую жонку доктара».]

Дзе мы жылі, калі нас здымаў слуцкі, відавочна, фатограф (іншыя фатаграфіі, больш раньнія, падпісаныя, маюць пазнаку: «Слуцак»)? Мабыць, гэта яшчэ да Глушы. Калі вучыўся на доктара, бацька ўлетку падзарабляў у Канюхоўскім доме адпачынку, гэта там жа, на Случчыне, дзе і родныя вёскі: Рачэнь — бацькі, Забалаць — мамы. Самае таямнічае, легендарнае месца ў маёй біяграфіі — гэтыя самыя Канюхі, у іх я нарадзіўся. Там быў нават мядзьведзь, ланцугом навязаны да яблыні, памежнікі, што адпачывалі, яго частавалі, мы з братам таксама (сам ня помню, расказваюць) — морквай. «Міска, Міска...» Мішка не жадаў быць вэгетарыянцам, аднойчы сарваўся з ланцуга і задраў карову. Яго застрэлілі.

Я анічога з Канюхоўскага жыцьця ня помню. А цікава: той, што стаіць на лаўцы ў куртачцы з паяском, — ён помніць «Міску»? І тое, як частаваў яго морквай. Зь якога моманту мы начыста забываем тое, што бачым, што востра перажываем, сьмеючыся і плачучы ў такім вось узросьце? Хіба тады мы ня п о м н і л і? Што было ўчора, пазаўчора — помнілі ж. І раптам — як адрэзвае, адсякае! Нешта застаецца ў нас, але запячатанае, у нейкіх сотах. Што наглуха, а што ўдаецца раскалупаць, раптам прасочваецца пах, ліпкасьць мёду раньнедзіцячых уражаньняў...

Магчымыя, зрэшты, і больш сьмелыя ўяўленьні. На сцэнарных курсах са мной у Маскве вучыўся Эрлом Ахвледзіяні, дзівосны казачнік-філёзаф. Калі я пабыў у ягоным тбіліскім «родавым доме», выявіў, што сам побыт яго, сам дом бацькі-дзеда такі ж таленавіты, інакш не назавеш. Столь, адфактураная часам, ні крэйда, ні шпа-

леры не ўжываліся тут апошнія гадоў сто, ля кожнай сьцяны, драўлянай ці каменнай, свая сямейная легенда. Зусім выпадкова ў «рускамоўным» грузінскім часопісе прачытаў ягонае апавяданьне «Агу», у якім нехта апавядае нам пра сваіх бацькоў — сапраўдных дзяцей розумам ва ўяўленьні гэтага апавядальніка. Сам жа ён нашпігаваны ведамі пра сусьвет і чалавека на ўзроўні найначытанага прыродазнаўцы-навукоўца. Нейкі Эйнштэйн-Фрэйд плюс Дастаеўскі ў адной асобе. Падглядвае з гэтай вышыні за клапатлівымі ля свайго першынца бацькам і маці, замілавана радымі бачыць яго забаўныя грымасы і тым, як ён ножкамі сукае. І раптам мы бачым: апавядальнік жа і ёсьць гэтае самае немаўля, гэта ён Эйнштэйн-Фрэйд-Дастаеўскі!

Раптам, на радасьць бурна захопленым бацькам, прамаўляе сваё першае: «агу!» і... І затухае. Усё, што ведаў, помніў, увесь запас вопыту чалавецтва, спрэсаваны ў немаўляці, некуды выпараецца. «Агу!» — і вось ужо ўсё пачынаецца з нуля. А ўсё, што толькі было зараз, — дзе цяпер, куды схавалася?

Пішу гэта, а побач санаторная тэлескрынка нешта паказвае, міжволі ўслухоўваесься ў голас, які апавядае (такое супадзеньне!) пра неверагодныя прарывы ў «будучыя веды» ў найстаражытнейшых народаў, у кітайцаў. Таксама потым забытыя веды, якія некуды зьніклі ці схаваліся. Так што гэта агульная загадка — для чалавечай асобы і цэлых цывілізацыяў.

Вабяць мяне старыя фатаграфіі. Ня толькі нашы сямейныя. А наогул старыя здымкі людзей, якіх ужо няма. Там, у той сфатаграфаваны, спынены момант яны думалі, адчувалі, мітусіліся, а пра тое, што папера застанецца, выпадковасьць іх вонкавага стану застанецца, а іх ня будзе, наўрад ці хто ў той міг задумваўся. Цяпер ты за іх думаеш. Пасьля, магчыма, нехта іншы разглядваць будзе і вашы групавыя: партызанскія, студэнцкія, асьпіранцкія. Няма ўжо ўнівэрсытэцкіх Вані Пятроўскага, Касько Валянціна, Ільюшэнкі Валодзі, Уладзімера

Іванавіча Красоўскага... А я ўсё чую-помню іх галасы, сьмех, міне нейкі час — і ўсе касьцяшкі даміно з хрумстам лягуць, даганяючы адно аднаго...

Пачаў я з падрабязнага запісваньня таго, што захавала раньнедзіцячая памяць незапячатаным у тых таямнічых сотах. Але паспрабуй захаваць строгі адбор: свайго і расказанага табе пазьней іншымі, хто быў побач. Чым глыбей рука апускае ў ваду дзіцячы мячык, тым мацней супраціўленьне і яго імкненьне вырвацца на паверхню — помню, як мяне гэта ўражвала, мячык быццам ажываў у тваіх пальцах. Вось так ажываюць, зьліваючыся са стыхіяй уласнай памяці, чужыя ўспаміны.

Але ж ніхто з дарослых ня мог мне расказаць пра тое, як выглядаў сьвет нашай кватэры, забаўны сьвет ног, падгледжаных рухаў, калі сочыш за імі з-пад стала, а яшчэ лепш — з-пад нізенькай канапы. І як таямніча крыжуюцца драўляныя планкі гэтых прадметаў і выпінаюць падцёкі клею на іх — зьнізу. І вось гэты вечар — толькі мой. Менавіта страшнай першай адзінотай, пакінутасьцю ўсімі я быў раптоўна напалоханы, пачаў плакаць. Ня ведаю ўжо, дзе былі ўсе, але Лямпа не запалена, у пакоі паўзмрок, я гляджу ў вакно, у бок шашы, а там ідуць, ідуць, едуць на конях салдаты... зь белымі пікамі. Тое і яно, што Чырвоная армія тады ўсё яшчэ ганарылася будзёнаўскімі пікамі, драўлянымі палкамі з мэталічнымі наканечнікамі. Потым мы ня раз бегалі да шашы глядзець на чырвоную кавалерыю. Але вось гэтыя, у прыцемку рухаюцца зь белымі палкамі па шашы, па «варшаўцы», па якой прыкаціла ў Глушу вайна, ад іх у памяці засталіся сьлёзы трывогі і пакінутасьці...

Пра наша дзіцячае мінулае нам любіла апавядаць «цётка Віткоўская», маміна сяброўка, нашмат старэйшая за яе гадамі, якая нас з братам нейкі час «глядзела», пакуль мама вучылася на фармацэўта ў Магілёве. Невысокага расточку, проста маленькая, я ў яе пытаў:

— Цёця, вы ўжо ўніз расьцеце, назад?

Умела з намі гаманіць на мове нашага ўзросту.

— Ой, Сашачка, у мяне нечага жывот забалеў!

Жывот? Гэта мы зараз! (Ня быў бы сынам доктара.) Укладваў «хворую» на канапу і, як цяперашнія экстрасэнсы, пачынаў вадзіць рукамі. Але ў мяне было яшчэ і лекарскае закляцьце:

— Па саломе, па мякіне, хай баліць ды пакіне!

Жанчынка хуценька падскоквала:

— Ой, дзякуй, доктар, перастаў ужо балець, палепшала.

Які лекар ці сёньняшні экстрасэнс не засьвеціцца радаснай, гордай усьмешкай ад такога імгненнага выніку?

А вось мой уласны хворы жывот сапраўдны доктар, мой бацька, лячыў іншым спосабам. Казалі, што, калі вярталіся дадому з клюбу, я раптам сядаў на шашу і заяўляў: баліць жывоцік. А што трэба, каб перастаў? Трэба мяне ўзяць на рукі, несьці.

І яшчэ — дзіцячыя горкія сьлёзы, спалох і крыўда. На мяне нацягнулі ружовую сукенку, паставілі на крэсла і бязьлітасна радуюцца (нават мама): якая дзяўчынка! А ўжо колькі ўрачыстасьці на фізіяноміі брата — як тут не зараўсьці!

Мама потым растлумачыла: проста ў краме нічога на хлапчукоў не было, купілі дзяўчачае, каб перашыць, перафастрыгаваць на кашульку.

Бесьперапыннасьць малечае памяці з сваіх і чужых кавалкаў і кавалачкаў мы аднаўляем, я амаль пераканаўся, паводле «законаў» літаратурнай творчасьці. Лябараторыя, мэханізм той жа. Пачынаючы абдумваць новую аповесьць, спачатку маеш вельмі і вельмі мала. Колькі зернятак ці нават адно толькі. Накшталт той, пачутай дзесяць гадоў назад гісторыі пра маладога немца і беларускую дзяўчынку, якія ратавалі адно аднаго. Усяго толькі факт: было такое. Фантазія стала ажыўляць, нарошчваць падрабязнасьці. Тут ужо я ім аддаваў сваю «памяць», але сёньня мог бы клясьціся-бажыцца, што бег побач зь імі, што так яно і было, як нафантазіяваў у «Ням-

ку». Сваё дыфузіравала ў чужое, і наадварот. Ужо сам ня здолею адно ад аднаго аддзяліць.

Наша з братам суперніцтва за сфэры ўплыву, статус у сям'і непрыкметна неяк завяршылася маёй перамогай-паражэньнем. Поўным. Зана па-брацку ўступіў мне ўсё — і маму, і бацьку, іх ласкі, варэньне, — затое набыў, забраў сабе павагу і становішча амаль дарослага, недзе поруч з бацькам і маці. У адносінах да мяне. Я раптам пабачыў, што адзін цягну лямку «дзіцяці» ў сям'і. І нават тое, што я раптам стаў усьведамляць, як старэйшы брат мяне, малечу, любіць і шкадуе, радасьці не давала. Наадварот, хацелася пабарукацца, я і задзіраўся без канца, пакуль у Заны (я ўжо ўмеў, але чамусьці доўга саромеўся вымаўляць: «Жэня») вочы не шклянелі (ускіпае! ускіпае!), ён апошні раз папярэджваў: «Зараз закрычыш: «мама!» Але я ўпарта даводзіў справу да рукапрыкладзтва і сапраўды крывадушна заклікаў старэйшых умешвацца, абурацца, няхай сабе нават намі абодвума, абаронцу-маму.

Адразу пасталелы мой брат як адмовіўся ад салодкага на карысьць малодшага брата, так потым і ня еў, не любіў ні варэньня, ні цукерак. (А мы калісьці жменямі запіхвалі ў рот пакінуты на стале ч ы р в о н ы цукар — быў такі, мусіць, сырэц з буракоў.) Будучы лекар, ён усе мае дзіцячыя хваробы адзіным агулам-даягназам аб'ядноўваў:

— А гэта ён хоча, каб мама дала варэньня.

У сям'і сярод іншых, толькі нам зразумелых, выразаў быў такі: «Ня хочаш блінчыкаў з варэньнем?» Г.зн. лупцоўкі. А ўзьнік ён так. Мы ўжо выбраліся на казённую, нашу першую заводзкую кватэру — у доўгім доме побач з базарам. Нейкая жанчына пабачыла, як «доктараў сын» паставіў нагу папярок глыбокай пясчанай каляіны і чакае сялянскі абоз, што паволі сунецца на яго. Што за экспэрымент я хацеў паставіць, дасюль зразумець не магу. Жанчына адцягнула мяне, вылаяла, неўзабаве я і думаць забыўся на тое, загуляўшыся ў таўханіне ба-

зарных павозак зь вісклівымі парсюкамі, спалохана-соннымі курамі, ігрушамі, ягадамі. І раптам чую ласкавы такі мамін голас за нашым частаколам:

— Саша, ты дзе? Хадзі, я табе блінчыкаў з варэньнем дам!

І дала. Рэдка было, але ўжо калі зазлуе па-сапраўднаму, сьвету ня рад будзеш. Не, не рукамі, — больш словам дастане.

Першыя свае паездкі, чыгунку — мабыць, у бацькаву Рачэнь (у маміну вёску на маёй памяці ня езьдзілі ні разу) — запомніў праз пахі: вараных яек і мачы (аж вочы шчыпле) у прыбіральні. Сама дарога не запомнілася як задавальненьне. Магчыма, таму што побач увесь час адчуваў раздражнёны неспакой маці. Ня так сеў, ня тое робіш! «Ты гэта што!» — рэзка, ледзь не сарвала за руку. Сапраўды, сабраўся сесьці, як на свой дамашні гаршчок, на брудную, са сьлядамі чужых ног, дошку ў вагоннай прыбіральні.

Цяпер дык разумею: у нашай маці ўвесь час жыло чаканьне катастрофы, нейкай пагрозы над усімі намі. Выяўлялася гэта перш за ўсё ў жаданьні абарваць, спыніць сваіх дзяцей — такіх неразумных, неабачлівых. Вось чаму ўсьмешка яе, якую так любіў, зь нейкае пары чужым даставалася часьцей, чым нам з братам.

Запомнілася ахутанае парай кола сярдзітага паравоза, напалавіну чырвонае, людзі з запаленым пакульлем у руках — усё такое велізарнае ў параўнаньні са мной.

А за гэтым: вясковая прастора, цёплае балотца адразу за агародам, крытая саломай бацькава (бабкі і дзеда) хата зь дзівоснай земляной падлогай, халаднаватай, з нагоды гасьцей пасыпанай жоўтым пясочкам. І вялізная, жоўтая ад пладоў, ігруша пад вакном: колькі потым перакаштаваў ігруш, міжволі шукаў у іх паўзабыты пах, смак. І не знаходзіў. Магчыма, і не ігруш, а дзяцінства быў гэта пах.

У «Вайне пад стрэхамі» я з асаблівым задавальнень-

нем апісваў нашу забаўна ганарлівую бабку, якая лічыла, што яна, каталічка, і з дванаццацьцю дзецьмі для дзеда Тодара была зайздроснай нявестай. Бацькаў айчым дабрадушна цікавіўся:

— Як жа гэта, маці, ты так прамахнулася? За мяне, мужыка, пайшла замуж.

— Бо маладая, дурная была.

«Гонар» бабкі-каталічкі ў свой час зламаў жаночы лёс яе дачкі Зоні. Неўладкаваная старая дзеўка ня раз папракала састарэлую бабку за свой бязрадасны лёс. І з мамай нашай так і не наладзіліся душэўныя адносіны: стаяла між імі нейкая невядомая нам гісторыя. Падобна, што не хацела нявесткі-«мужычкі» гаспадыня «фальварку» з саламянай страхой і земляной падлогай. Супраць яе жаданьня, волі пажаніліся бацька наш з мамай. Калі старыя пераехалі жыць у Глушу да сына, усе гэтыя гісторыі выглядалі сьмешнай бязглузьдзіцай, асабліва ў пераказах бацькавага айчыма. Але раптам узгаралася сварка ля агністага чэрава печкі, і які нядобры твар рабіўся ў мамы, які незнаёмы голас — Жэня, айкнуўшы, як ад болю, выскокваў за дзьверы. Не пераносіў ён гэтага. А я? Я заўсёды быў на баку мамы. Але яна, як я разумею, больш цаніла не маю безумоўную салідарнасьць, а нязгоду заўсёды справядлівага старэйшага сына. Хутка зьбіралася і ішла ў сваю аптэку, як бы засаромеўшыся таго, што адбылося. А бабка яшчэ доўга варушыла высахлымі, зморшчанымі вуснамі, прамаўляючы нячутныя нам словы. Калісьці, у свой час, мабыць, іх яна таксама гучна выкрыквала — у твар маладой нявестцы.

Не, але бабка, бабка! З-за яе «панскага» гонару, што, нас і на сьвеце не было б! І яшчэ я даведаўся, ужо калі і мамы ня стала, — ад дзядзькі Антона, што я наогул захацеў зьявіцца занадта рана. Брату толькі яшчэ гадок споўніўся з хвосьцікам, і тут, калі ласка, яшчэ адно дзіцятка просіцца ў сям'ю! Што гэта быў я, вядома, ні мама, ні тата ня ведалі. Нейкі эмбрыёнчык, і ўсё. А ў мамы і для першынца малака свайго не хапала. (Таму я вырас на

«штучным» малацэ.) Але я і не прэтэндаваў на ваша малако. Абуральна! Меў рацыю Ісус, няма ў чалавека большых ворагаў, чым калі імі стануць ягоныя блізкія. Вось так вырашаць за цябе — не перарэшыш.

Сусьветныя генэтыкі, якія цямяць у падліках генаў і храмасом, усё ўжо сказалі і пра мой выпадак. Калі б у маіх (і вашых) бацькі і маці нарадзілася дзетак 300 000 мільярдаў штук (нават ня ведаеш, як гэта вымавіць), толькі тады была б нейкая, не, не гарантыя, а надзея на яшчэ адзін шанец. Гэта колькі ж сонцаў згарэла б над галавой у выштурханага са сваёй законнай чаргі? Думаеце, выпадкова на той фатаграфіі, дзе мы ўпершыню ўчатырох, у хлопчыка ў шэрай куртачцы з паяском такі пакрыўджаны твар: і гэта вы мяне, вось такога, не хацелі?!

А ёсьць фатаграфіі і наогул нахабныя, калі ўгледзецца і ўдумацца. Гэта — партрэты нашых бацькоў, калі нас яшчэ не было зь імі. Але што галоўнае: яны гэтага ня ведаюць, не ўсьведамляюць. Калі помніце, у Набокава: парожняя дзіцячая каляска, зьнятая аматарскай кінакамэрай бацькоў, здалася чалавеку... труной. Яна стаіць, а яго яшчэ няма. Не нарадзіўся — гэта як памёр. А раптам нехта за цябе перавырашыць: рана, мы яшчэ не падрыхтаваныя абзавесьціся табою! Сусьвет мільярды гадоў стараўся дзеля гэтага імгненьня — зачаць менавіта цябе,— а яны, ці бачыце, не падрыхтаваныя! І імгненьне прасьлізнула, як і не было. Ніколі больш не паўторыцца.

Будучая, а дакладней — магчымая наша мама са сваім маладым мужам на фатаграфіі: «27.III.23 г., г.Слуцак». Дзьве тоўстыя касы, што па-вясковаму зьвісаюць сьпераду, выразны абрыс вуснаў, носа, які робіць твар капрызна-ўпартым. Такая вясковая красуня зусім верагодна, што магла не стрымаць абурэньня, плюнуць у твар польскаму «жалнежу», калі ён па-салдацку груба схапіў яе за руку. Яна гэта і зрабіла, наша магчымая мама, а потым суткі хавалася ў жыце, а яе шукалі разьятраныя палякі. Ну а знайшлі б? Дзядзька Антон лічыць, што плёткамі справа не абышлася, ня скончылася б.

Не, старыя фатаграфіі — гэта ня проста папера з выяўленым на ёй сьвятлом і ценем, які адкідвае чалавек, людзі. Ня толькі мы глядзім на тых, што адышлі, але і яны з пажоўклых кардонак — на нас.

Што гэта так — *яны відушчыя, фатаграфіі* — я адчуў фізычна ў той момант, калі чакаў: вось-вось мяне знойдуць немцы, насьцігне аўтаматная чарга, буду ляжаць ля іх ног, запэцканы ўласнай крывёю, а яны з мае кішэні дастануць маміну фатаграфію, і *яна ўбачыць*... Я сьпяшаўся не запаўзьці далей, глыбей у кусты, а пасьпець, пакуль яны не зьявіліся, схаваць, закапаць у пясок кашалёк з фатаграфіяй. *Каб мама ня ўбачыла нічога гэтага.*

У Забалаць, на радзіму мамы, у вёску, дзе нарадзіўся Жэня, мы ня езьдзілі. Ні разу — пасьля таго, як сям'ю Мітрафана Тычыны (маміна дзявочае прозьвішча) раскулачылі. Выслалі ў Сыбір, разам са старымі, — Аляксандра, майго цёзку, Зіну і Любу. А дзьвюх сясьцёр — як з агню выхапілі — забралі да сябе дзядзька Антон і наша мама. Мама выгадавала з намі за кампанію Соню (і замуж аддала), дзядзька Антон павёз з сабой у самую-самую глыбінку Беларусі Волю (і таксама потым «аддаў замуж»). Нагадваць пра сябе ў Забалаці лішні раз ня варта было, я так разумею. Большыя ўлады, вядома, ведалі, што жонка глушанскага доктара штомесяца адпраўляла «на Алдан» пасылкі: сала, цыбулю, часнык, крупы. Гэта ж рабіў і дзядзька Антон — са сваёй, тады зусім глухой, Хацімшчыны, куды яго, можна сказаць, таксама саслалі пасьля таго, як настаўнік Тычына Антон Мітрафанавіч адмовіўся парваць з «бацькамі-кулакамі». Да нас таксама дабіраліся: перад вайной бацьку «раілі» разьвесьціся з «кулачкай», клапатліва-пагрозьліва настойвалі. Непасрэдная небясьпека бачылася там, у забалацкіх «актывістах», якія, як і ў іншых многіх месцах, не пасаромеліся забраць і дзіцячыя валёнкі, і «лішнюю коўдрачку» — разуць, распрануць выгнаньнікаў. Так што на многія гады паміж высланымі і пакіну-

тымі пры калгасных пасадах (а то і бязь іх) «актывістамі» захоўвалася невідочная сувязь, падсочваньне, раўніва зларадн ае: каму ўрэшце горш? Вядома, тым, каго замарозілі, голадам замарылі ў далёкай ссылцы, было безумоўна горш. Але здаралася, што абрабаваныя і даведзеныя да галечы ці хоць бы нехта з такіх сем'яў апынаўся ў становішчы, прынамсі, ня горшым за калгаснае. Раўніва сачылі адно за адным зводдаль. А пісаць людзей навучылі. Так што ад грэху далей. Я помню, як далёкія нашы сваякі з калісьці багатага Засмужжа, па-калгаснаму зьбяднелага да таго часу, зьяўляючыся ў нас у доме, стараліся абудзіць у нашай маці застарэлую крыўду на землякоў. Але, па-мойму, гэта не атрымлівалася. Ці мама так умела трымаць сябе ў руках? Апроч таго — каму зайздросьціць? Тым, хто застаўся ў калгасе? Барані Бог, прачуюць, што брат Аляксандар прыяжджаў (гэта перад вайной было) з чамаданам, поўным падарункаў, — шарсьцяных адрэзаў, скураных падноскаў навёз, аб якіх тут даўно забыліся. Пашчасьціла і ў Сыбіры Тычынам: ня выкінулі ў тайгу на сьнег, не замарылі на лесапавале, завезьлі ажно на Алданскія залатыя капальні. Немаведама як, але выжылі, а падрос Аляксандар і стаў рабіць «на золаце». І ўсё гэта потым купляць на цуд-грошы, нейкія «боны». Пакуль не забралі на фронт. Доўга ляжаў у шпіталі ў Алма-Аце, а вярнуліся на Беларусь (дзядзька Аляксандар з кучай дзетак уласных і вясёлай «сібірачкай» Кацяй, што ўсім палюбілася) — раптам ператварыўся ў такога ж удачлівага, «прыроднага» палявода ў саўгасе, якім і золаташукальнікам быў, але гэта потым, пасьля...

Мне, калі я дэпутатам быў, прыходзілі лісты ад дзяцей і ўнукаў раскулачаных і тых, хто сам быў «кулакомперасяленцам» у пяці-сямігадовым узросьце. Апісаўшы ўсе нягоды, пералічыўшы памерлых ад барачнага жыцьця брацікаў і сястрычак, амаль абавязкова з пратэстам паведамлялі, што ў іх гаспадарка была, калі не зусім бядняцкая, дык серадняцкая, вось столькі кароў, коней,

авечак, збудаваньняў. Маўляў, несправядліва раскулачылі, замарылі голадам, катаргай. Тым самым як бы згаджаліся, што тых, у каго было больш за пералічанае, тых можна было, а вось нас — незаконна. І патрабавалі рэабілітацыі, аднаўленьня справядлівасьці дзеля сябе, сваіх, у каго на карову, на авечку было менш.

Баюся і сам прадэманстраваць вось такое перавернутае мысьленьне і таму ня стану даведвацца знарок, удакладняць, колькі ж было дзесяцін зямлі, ці лесу, ці балота ў Мітрафана Тычыны: дзесяць або пяцьдзясят? Ведаю толькі, хаця ў доме ў нас пра гэта ніколі не казалася і толькі пазьней дзядзька Антон пасьпеў мне сёе-тое пераказаць, — рабілі ў сям'і Тычыны ўсе, пачынаючы з шасьцігадовага ўзросту (гусі, парасяты былі іх клопатам).

Не пашанцавала Вользе, амаль не вучылася нават у школе, затое Аню, Антона Мітрафан Тычына аддаў вучыцца ў слуцкую гімназію, разумеў, што́ такое адукацыя. Але рабілі і гімназісты, наяжджаючы дамоў, і стараліся нават больш за астатніх дзяцей. Таксама разумелі, на якую ахвяру пайшла сям'я. Міжволі ўзгадваю пачутую нядаўна легенду пра Багіню — заснавальніцу працавітай Даніі. Ёй сказана было: колькі за ноч узарэш, столькі і будзе зямлі ў твайго народу. Дык яна братоў і нават дзетак сваіх перакінула ў быкоў — народ дацкі ёй і дасюль удзячны.

Паводле беларускага паняцьця, дасавецкага, «кулак» — гэта той, хто *сьпіць на кулаку*. Упаў дзе стаяў, запрацаваўшыся да бяспамяцці, і не на падушку галаву, а на цьвёрды кулак — каб лішне не заспаць. Дзядзька Антон успамінаў, як абрабаваны «цьвёрдымі заданьнямі» бацька скардзіўся не на тое, што забралі і скаціну, і інвэнтар, і зерне, а што: «рукі — сорам на вуліцу выйсьці, як вітацца з чалавекам?» Мазалі-капыты сталі сыходзіць з далоняў, Мітрафан Тычына саромеўся такіх рук.

«Савецкая ўлада» падзяліць і супрацьпаставіць імкнулася ўсіх, і ўнутры сям'і таксама, яднаючы толькі

ў адным памкненьні, стараньні: дагадзіць гэтай уладзе, нават калі загадаюць адрачыся ад бацькоў або дзяцей, неадкладна здрадзіць тым, на каго пакажуць. Ці не з прыроднага пачуцьця ўпартасьці і супраціўленьня гэтаму, зусім інстынктыўна, але з тым большай нязьменнасьцю Тычынава дачка, наша мама, усё жыцьцё сваё была зьбіральніцай і хавальніцай роду Тычынаў-Адамовічаў, мацуючай сілай. У нас у доме жылі, і па шмат гадоў, усе, каму не было дзе жыць. У вайну сабрала пад сваю страху больш як дзесяць чалавек, і ўсіх трэба было зьберагчы, карміць. Так і павялося — і пасьля вайны. Сваякі, самыя далёкія, ведалі, у каго дзень нараджэньня, калі, хто памёр, а хто вясельле павінен спраўляць, каго памірыць, каго прысарамаціць, каму якія патрэбныя лекі, даведкі, — ад цёткі Ані. Я ўжо ўздрыгваў, калі яна, радасна ажыўляючыся, пытала, вычытаўшы ці пачуўшы па радыё, тэлебачаньні прозьвішча Адамовіч, Тычына: яны, Саша, ня маюць ніякіх адносін?.. Ніякіх да нас, абсалютна аніякіх, мама! Мала, дык я яшчэ атрымліваю ад яе заданьне (такім вінаватым голасам, але ведаю, не супакоіцца, спаць ня будзе, пакуль не здабуду, не памагу, не пазваню, не павіншую) — радні, як у... ня ведаю нават, у каго! Пакінула яна нас, і ўсе потым сталі гаварыць — скардзіцца: нейк радзей сустракаемся, бачымся, гаворым адно з адным. Анічога ня ведаем, што ў каго і з кім што.

Але ня толькі дзеля радні мама скарыстоўвала мой час і «аўтарытэт» (які б я шчасьлівы быў сёньня выканаць хаця б адну яе новую просьбу!). Пачаўся рамонт у кватэры, галава шабашнікаў Юра ўжо праз некалькі дзён зрабіўся маім «кліентам». Ён на мяне працуе за грошы, я ў Менскіх архівах на яго — па просьбе маёй маці. Прачула, што Юра (з такім жа, як сам, братам-падлеткам) жыў у партызанскім лягеры, маці іх у блякаду згубіла, і, пакуль знайшліся, яна крыху кранулася з розуму. Туляцца яны ў цеснай камуналцы, партызанскай даведкі няма, нічога дабіцца ня могуць...

Празь нейкія паўгода пасьля рамонту сабраўся, накіраваўся ў сваю Акадэмію, бачу: Юра крочыць з авоськай у наш дом.

— Вось, — прыўзьняў авоську, паказаў бутэльку «Сталічнай» (!) — іду да Ганны Мітрафанаўны, па даведцы атрымалі асобную кватэру.

Калі вярнуўся празь дзьве гадзіны дамоў, убачыў дваіх шчасьлівых людзей: Юра дапіваў сваю бутэльку, закусваючы мамінымі саленьнямі, мне ж (ці не ўпершыню ў жыцьці) мама аддзячыла простай пахвалой:

— Дзе Саша — там перамога!

Мабыць, надта ўжо прыкмячала: тое, што ёй на задавальненьне, на радасьць, мне, нам, — усё ж цяжар, празь не хачу.

Калі ў кожнага чалавека ёсьць Анёл-Захавальнік, тады і род кожны павінен яго мець, мае. А інакш як растлумачыш такія розныя лёсы асобных сем'яў, якіх вайна з аднолькавай сілай круціла-матала: у адной — жывой душачкі не засталося (глушанскага Мішы Каваленкі род, 12 чалавек), другая, вось як наша, — чалавек 15 былі на фронце або ў партызанах, перакалечыла вайна, але ніводзін не загінуў? Н і   а д з і н. Які ж павінен быць Анёл-Захавальнік, каб вось так! Аднак, бадай, яны ня могуць быць лепшыя ці горшыя, анёлы. Тады, можа, адгадка ў тым: у нашага быў памочнік. Калі гэта так, дык усе, хто яшчэ жывы, засталіся з нашых, ці ня «цётку Аню» назавуць?

Пасьля вайны яна амаль усіх, каго Сталін і каго Гітлер раскідалі па сьвеце, паклікала, сабрала, вярнула ў свае краі. Толькі моцны беларускі селянін Мітрафан Тычына застаўся ляжаць у настыглай сыбірскай зямлі.

У сваёй вёсцы, г.зн., дзе зьявіўся на сьвет, — у Канюхах, я пабыў аднойчы ўсяго. За ўвесь час пасьля таго, як мяне гадавалага адтуль вывезьлі. Позірк міжволі шукаў сад, дом з калёнамі (такім чамусьці малявала фантазія «Дом адпачынку» майго маленства). Нейкія забытыя людзьмі хаціны, нават вуліца, не разабраць, дзе тут

праходзіла. Аднекуль падышла жанчына, усхвалявалася, пачуўшы прозьвішча майго бацькі: «Ой, а ў маёй мамы засталася фатаграфія! І ён там». Зараз і свайго «Міску» з морквай папярок пашчы пабачу пад той зьдзічэлай яблыняй... Да чаго ж слушна: нішто ў гэтым сьвеце не зьнікае канчаткова. Пакуль адна жанчына бегала па фатаграфію, да нас наблізілася другая. У яе праблема, можа, мы, гарадзкія, ёй растлумачым, як ёй быць з дачкой. Бо ж замуж дзеўцы трэба будзе, хутка вось пашпарт атрымоўваць (ужо і вясковым выдаюць), а там месца нараджэньня: «Канюхі»! Хто з гэтым замуж возьме? І наогул куды з гэтым?

Я ўрачыста здабыў з шырокіх, па тагачаснай модзе, штанін сваю пашпарціну: во, глядзі, цётка! Нічога, жыву, ніхто (з гэтае нагоды) каменем не шпурнуў.

* * *

Дзіўныя рэчы адбываліся з маёй душой ці маім «арганізмам», і не аднойчы: раптам пераставаў чуць вонкавы сьвет пры нібыта нармальным слыху, прытым так адключаўся, што хоць ты трактарам на мяне наяжджай, хоць дзьверы ўзломвай або акно пабі — разбудзіць мяне немагчыма. І толькі нечаканая цішыня пасьля грукату і стуку вяртала мяне да самога сябе. Усё так і было, літаральна: трактар, які на мяне наяжджае, — яшчэ ў Рачэні, куды мы выправіліся на лета да бабулі. Нацягаўшыся па сьпякотна-соннай вёсцы, я вяртаўся ў наш двор, перажываючы асалоду ад цёплага і пяшчотнага пылу пад пазьбіванымі ступнямі босых ног, дзе ні каменьчыка табе, ні шкліны, ішоў, пляскаў па ім і назіраў, як шэрыя клубочкі выпыхкваюць паміж пальцамі. Што гэта на мяне глядзіць так стары, што абапёрся і рукамі, і падбародзьдзем на палку, нібы нешта кажа, а можа, проста жуе? Але вось гэтая баба, што бяжыць насустрач, на тоўстых, як ступы, нагах, ужо ж праўда нешта крычыць у мой бок, вырачыўшы вочы. А голасу ніякага, нічога ня

чую. Нарэшце прарвалася: «... раздýшыць!» Быццам вушы ў мяне заклала: проста за сьпінай страшэнны роў і лупяць стрэлы! Я азірнуўся і адскочыў у бок. Газануў і міма мяне прагрукатаў трактар, мацерна лаючыся, пагражаючы асіплым голасам — крыкам дзядзькі на высокім сядзеньні, такога ж чорнага і прамасьленага, як і труба, што страляе дымам у яго перад носам. Злосна прысядае на маленькія пярэднія колы «сталёвы конь», вялікімі вострымі шыпамі задніх колаў, непраўдападобна вялізных, адкідвае назад камякі зямлі, я гляджу ўсьлед яму, і мне так нядобра-тужліва, быццам ён па мне праехаў. Да самай начы гнятлівая туга грызла маю дзіцячую душу, хацелася плакаць. Я і плакаў — у сьне.

Калі перад вайной жыў і вучыўся ў школе дзядзькі Антона, куды спачатку Жэню, а затым і мяне выправілі («Хопіць сабак ганяць па Глушы!» — сказаў тата), са мной падобная гісторыя здарылася, паўтарылася. Дзядзька Антон зь цёткай Лінай, якая таксама настаўнічала ў школе, у будынку якой яны (і я ў іх) жылі, аднойчы пайшлі ў госьці, а я доўга чытаў, слухаў радыё. Паўтаралі ранішняе паведамленьне радыёстанцыі «Камінтэрн» — аб забойстве Троцкага. Карчомныя сябрукі-сабутэльнікі ў далёкай Мэксыцы ўдарылі яго бутэлькай па *башке* — так нам паведамілі.

Не заўважыў, калі заснуў, а прачнуўся ад таго, што нада мной стаіць дзядзька Антон, высокі-высокі, і дзіўна на мяне глядзіць, быццам я быў толькі што мёртвы і раптам ажыў. За сьпінай у яго шырока-спалоханыя вочы цёткі Ліны, а за ёй — бяздонны чорны праём расчыненых у начны парк дзьвярэй. Нейк ухітрыўся дзядзька іх, цяжкія філянговыя дзьверы, зачыненыя мною на кручок, зьняць зь петляў. Бо колькі ён ні грукаў, ні біў у дзьверы, цётка Ліна ў акно бачыла, што я ляжу пад непатушанай лямпай нерухома і як бы ня дыхаю.

Абсалютна тое самае адбылося пасьля вайны: мама з бацькам вярнуліся з клюбу, а іх сонны сын-студэнт не адказвае на роспачны грукат. Бацька забег з таго боку,

дзе жылы пакой у аптэцы, выбіў шкло, адчыніў вакно і ўлез усярэдзіну, запаліў сьвятло, — толькі тады я прачнуўся. Ад яго пільнага трывожнага позірку.

А што, калі п а с ь л я бывае вось гэта: ня чорная труба, якая імчыць нас да сьвятла, да сваіх, а вось як: р а с п л ю ш ч в а е м в о ч ы , а н а н а с п і л ь н а г л я д з я ц ь т ы я , х т о н а с з ь л ю б о ў ю і с м у т к а м с у с т р а к а е ? Не, ніводзін з тых, хто перажыў стан life after life, не казаў пра такое. Але ў мяне ёсьць досьвед адлёту немаведама куды. А што, калі гэта рэпэтыцыя? Расстаньня, разводу душы зь целам? Пробны выхад яе ў «касьмічную прастору», як у першых касманаўтаў. На прывязі-«фале». Усё роўна ж некалі пакідаць «абжытае месца» (карабель? гняздо?), чаму і не патрэніравацца? Павучыцца лётаць, як вучыцца ліпка-мокрае птушаня, спалохана-радаснае ад свайго жудаснага вызваленьня. Пырхае, пырхае, адлятаючы ўсё далей ад гнязда ў невядомы сьвет, зь месца на месца, само ня верачы, што атрымліваецца ў яго. Але вось узьляцела і адчула, што крылы насамрэч яго трымаюць...

Аднак раней трэба пражыць табе адпушчанае. Доўга, як жа соладка доўга цягнулася дзяцінства, цэлую вечнасьць прыглядваўся да вонкавага сьвету. Затым час апусканьня ў свой унутраны падлеткавы, юнацкі сьвет. Даводзілася яшчэ паваяваць — разам з усім сьветам. У снах ледзьве ня трэць жыцьця падглядваў за сподам сваёй натуры. Дадзена было табе сваё адлюбіць і сваё адненавідзець. Падступае тэрмін разабрацца ва ўсім, у чым за цэлае жыцьцё разабрацца або ня меў часу, або ня ўмеў. Або не імкнуўся.

... Забалаць, Рачэнь, Канюхі — усё гэта назвы, пункты пашпартныя. А сапраўдная малая радзіма, дзе я ўваходзіў ва ўзрост і ў жыцьцё, — рабочы пасёлак Глуша. Савецкае ўдакладненьне: шклозавод «Камінтэрн». Або проста: гута — так называлі завод здавён, з часу яго заснаваньня. Польска-нямецкае слоўца, але зусім прыруча-

нае, наша мясцовае. На паўшляху з Варшавы на Маскву, на ўсход сем соцень вёрст, на захад — амаль столькі ж, таму і «варшаўка», таму і «кацярынінскі тракт». А наша Глуша, пазначаная толькі на падрабязных беларускіх картах, — пацерка на тонкай нітачцы.

Перад вайной загучала новае слова: асфальтка. Вось ёй і давялося стагнаць і крышыцца пад гусеніцамі танкаў. Чорная, імклівая між сосен і бяроз, усмоктвае позірк, як лейка ваду, нясе нашу Глушу ў далёкі бяскрайні сьвет. Адкуль усё прыходзіць і куды ўсё аддаляецца, забіраючы, несучы з сабой і час: дзяцінства, юнацтва, жыцьцё.

Апроч гуты, у нас прыжылося і надоўга яшчэ адно слоўка: трэпы. Вось бачыце, вы яго ня ведаеце. А ў нас і ў навакольлі любое дзіця ведала гэта слова-пароль, дар пралетарскай Сілезіі ці Пазнані. Азначае яно драўляны абутак: калодка-падэшва пад ступню і раменьчык, вугалок зь якога-небудзь непрыдатнага матэрыялу (скуры, гумы), каб трымалася наназе. Ня ведаю, адкуль прыйшла гэтая «мода» да немцаў, палякаў, ці не ад старажытных рымлян, а да нас — ужо ад іх, нашых заходніх суседзяў. Добрых гадоў з трыццаць выручала яна перамоганосных усходніх пралетарыяў, ва ўсе поры году замяняючы чаравікі, боты, асабліва на працы, хоць і ў клюб прыходзілі ў трэпах, агучваючы прыступкі высокага ганку і кіназалі звонкім драўляным перастукам.

Расейскія акружэнцы ў Заходняй Беларусі (паводле Янкі Брыля) сьпявалі прыпеўкі: «Спасибо Сталинугрузину, что обул он нас в резину!» «Резину» абувалі ў нас толькі ў сьвяты ды ў госьці — эфэмэрныя белыя тапачкі з матэрыі або чаравікі на гуме, што прамакалі ўвесну, восеньню і, як агнём ці кіслатой, палілі ступакі ног улетку. Пра скураныя падноскі загадана было забыцца. У імя таксама і заходніх працоўных. У гэтых тапачках, у гэтых чаравіках (а нехта і ў трэпах) 1 траўня і 7 лістапада завадчане на чале з парткомам праходзілі туды і назад калёнай па шашы з паўвярсты, каб затым на зна-

рок абсталяванай паляне, дзе ўжо ўзвышалася зьбітая з дошак трыбуна, куды пад'яжджаў буфэт і дзе зіхцеў трубамі гучнагалосы заводзкі аркестар, каб там паслухаць знаёмыя словы, прамовы, поўныя спачуваньня да прыгнечаных усяго сьвету, салідарнасьці зь імі і абяцаньня ім памагчы наладзіць у сябе справядлівае жыцьцё.

А вечарамі мы, падлеткі, але і нехта са старэйшых, забіўшыся за абцёртую сьпінамі, абадраную да цэглы клюбную печку-галяндку, у самазабыцьці сьпявалі-марылі пра нашыя будучыя даліны і ўзгор'і, і як мы, нашы партызанскія атрады, займацьмем гарады.

Усе людзі для нас дзяліліся ня толькі на пралетарыяў і буржуяў, чырвоных і белых, але і яшчэ — наша мясцовая спэцыфіка — на «заводзкіх» і «жлабоў» (г.зн. вясковых). Само сабою зразумела, што вяскоўцы нашых таксама не шанавалі. Сьвяты зь вялікім «заездам» вясковых гасьцей у Камінтэрнаўскі клюб быццам дзеля таго і існавалі, каб яшчэ раз высьветліць, чый верх у гэтым суперніцтве. Дзеля прынады падсылалі да праціўніка малечу, госьці разумелі, што будзе далей («Ня крыўдзі маленькіх!»), і доўга не прыкмячалі камарыных укусаў. Але ў нейкі міг — раптам ці сьвятло затухала, ці гучны, ліпкі і такі агідны ўдар па жывому, і пачыналася! Але да гэтага часу «жлабы» звычайна ўжо адмабілізоўваліся, сабраўшы сваіх у «зграю»; раздаючы і атрымліваючы поўху, яны вырываліся зь сцен клюбу, а далей пачынаўся гон. Школьнікі, якія ўзімку будуць сядзець у адной клясе, прагульвацца па адным калідоры, у адным школьным двары Глушанскай СШ, цяпер з палкамі, камянямі, грудамі зямлі даганялі «жлабоў» (ці адбіваліся ад «глушанскае шпаны»), вядомыя некалькімі дарослымі байцамі, з боку камінтэрнаўцаў — гэта звычайна два-тры рабочыя-баначнікі ў расхрыстаных на ударлявых грудзях кашулях, з характэрнымі для шкловыдзімальнікаў вострымі, як у рымлян на старадаўніх манэтах, кадыкамі. І гора таму, хто адстане ці задужа вырвецца наперад, — расквасяць «сапатку» ды крыві. Часам пась-

ля дзьвюх-трох вёрст перамаганоснага перасьледу насустрач «жлабам» зь іхнай вёскі выбягала падмога, і пасьля пэўнай замінкі ўжо яны гналі нашых, а мы, адбіваючыся, адступалі да свайго пасёлка.

Вядома ж, ні «доктар», ні «доктарша», мае бацькі, не павінны былі ведаць, што іх малодшы ў гэтым удзельнічае. Няхай нават і ня ў першых шэрагах, а там, дзе самая малеча. Галаву даводзілася берагчы, бо зусім сьмешна было б, калі б і ў трэці раз я прынес яе ў тым выглядзе, у якім ужо двойчы бацьку давялося яе бачыць і апрацоўваць у амбуляторыі. Але ўжо так шанцавала чалавеку, безь ніякай такой яго ўласнай віны. Адбыўся аднойчы пажар у драўляным прызаводзкім шматпавярховым інтэрнаце. Мы, зразумелая рэч, хацелі быць пры справе, памагалі качаць ваду. Я бег поруч з пажарнай машынай, пастаўленай на калёсы-плятформу, якую пёрлі да сажалкі, учапіўшыся ў аглоблі, і дарослыя, і дзеці, а яна вазьмі і перакуліся, распраклятая машына, — каго па галаве ручкай дастала? Ясна, каго.

А ўжо калі камень пераляцеў цераз дах школы (было ў нас і такое ідыёцкае спартыўнае практыкаваньне), ледзьве ня зьнёс чэрап (аблавушка адно ўратавала), мой, зразумела, чэрап, старэйшы брат, які ўжо вывучаў законы Н'ютана, такое тлумачэньне знайшоў мне ў апраўданьне:

— Гэта ў яго галава вялікая, прыцягвае.

Ну, а ў бальніцы, родны доктар, ад якога іншыя пакутнікі чулі заўсёды толькі: «галубчык», «галубка», абрываў мае нясьмелыя стогны зусім спартанскім павучаньнем: не скавычы! Ня будзеш лезьці, куды ня сьлед!

Самі глушанцы, адзіныя перад «жлабамі», унутры пасёлку таксама дзяліліся. Напрыклад, вылучалі «пшэкаў» (палякаў). Адрозьнівалі ня дужа выразна, хто «пшэк», а хто не, і гэта ня вельмі прысутнічала ў нашых узаемаадносінах, на дваровым і школьным узроўнях. Але вось у дарослых «пшэкаў», як мы лічылі, усё было з «понтам» (г.зн. манернае). Ну, навошта столькі кветак выс-

таўляць на падваконьнях, такія клюмбы перад домам: ясна, жаніхоў прыманьваць! Ядзя Вашкевічава, прыгожая настаўніца польскай школы, — што ні крок, такім цыркулем раскідвае носікі сваіх вострых лодачак, як яна толькі лыткі ня выверне! А паглядзіце, паслухайце, калі пані Мураўская і пані Трухановіч сустрэнуцца дзе-небудзь на базары, як учэпяцца адна ў адну, быццам у чужым горадзе выпадкова пабачыліся, і застракочуць, і запшэкаюць, абавязкова па-свойму. Галоўнае, на тых, што вакол, ужо глядзяць, як на далёкіх-незнаёмых. Адным словам: «Кеды я вышэдл за гумно до вятру, там седзі два вытарашчакі, дык я пошэдл і взел фузію (ружжо) — піз... цэго ўбіў, а х... цэго ýцек!» Гэтае блюзьнерства здавалася нам верхам дасьціпнасьці і нашай у нечым над «пшэкамі» перавагі.

Наогул жа я любіў бываць у кватэрах сваіх аднаклясьнікаў-«палякаў». Сапраўды, шмат кветак, «вазонаў», і ад іх утульнасьць, цішыня, тут не разьбяжысься і не раскідаеш абы-што і абы-як, бацькоў мае сябры на «вы» называюць, нечакана, нязвыкла і ў нашай сям'і было б проста немагчыма, але ў іх атрымліваецца вельмі нават добра. Затое і да дзяцей дарослыя зьвяртаюцца ціхім, паважлівым голасам. Падабаліся мне гэтыя іх дзіўныя, цёмныя з разьбой шафы, крэслы. Цікава разглядваць фатаграфіі на сьценах. Абавязкова ў рамках, акуратна зробленыя, і бачна, што даўно. Мы звыклі бачыць Віткоўскага, Пацэвіча, Мураўскага, Стэфановіча ў нашай заводзкай ці прамшвэеўскай апратцы, у гэтых глушанскіх трэпах, а на фатаграфіях Віткоўскі, Мураўскі — ну пан панам! У белых манішках, у вусах, а жанчыны ў нябачаных, хоць і сьмешных суkenках. Дык кім жа былі гэтыя людзі тады, калі мы добра ведаем, як прыгняталіся і гаравалі рабочыя да савецкай улады? Пытаньне гэтае ўзьнікала ў школьнай галаве, разагравала нашы мазгі.

Здавалася, адказ атрымаць, тлумачэньне мы змаглі ўжо праз некалькі гадоў, калі амаль усіх, хто на «-скі» і

на «-іч» ледзь не за раз, перасаджалі. Аднак я ня помню, каб хоць хто ў нашай Глушы ўсур'ёз паверыў, што яны былі замаскаванымі «шпіёнамі», «ворагамі народу», якія затаіліся. Хоць перакананы, што фатаграфіі ў іх «справах» ляжаць і дасюль, мы ж ня верылі, а вось як сьледчы?.. Пра што пытаў-дапытваў, любуючыся на беласьнежныя манішкі майстроў-гутнікаў?

Дасюль помню смачныя малочныя клёцкі, якімі частавала маці Пецькі і Стася Пацэвічаў. Паколькі я ні разу, нават калі сыты па горла, не адмаўляўся і адразу ішоў і сядаў за абедзенны стол, мой брат Зана, якому даводзілася рабіць тое самае, а ён гэтага не любіў, дома горача абураўся мною.

— Ты, сынок, так не рабі, — вучыла маці, — глядзі, як Жэня, так і ты за ім.

Цяпер калі мяне клікалі да стала, я тут жа рапартаваў:

— Як За́на, так і я!

Брат яшчэ больш кіпяціўся: што ён усё, як Зана? Сам хочаш, ну і жары і забудзь пра мяне! А то не пайду нікуды з табой.

Якія гэта былі палякі і што за польская мова была ў нашай Глушы — баюся, што такая ж, як беларуская ці расейская. Гэта быў наш, глушанскі валапюк, неўяўляльная сумесь трох ці нават чатырох моваў (ня лічачы дыялекты) на самым кароткім шляху з Варшавы ў Маскву. Напрыклад, я доўгія гады, таксама, як ад дзіцячага Заны, ня мог пазбавіцца ад слова «мене» (у сэнсе: мне). «Дай мене, пакажы мене...»

Наогул жа павінны былі заставацца ў Глушы і карані, карэньчыкі першых майстроў-гутнікаў, ня проста беларусаў-каталікоў (накшталт маёй бабулі), але і карэнных палякаў, 100 гадоў назад перамешчаных гаспадаром гуты на ўсход. У нас, поруч зь беларускай школай, была і польская, у старым будынку над сажалкай. (Да самага 1937 году.)

«Бэ-эз» — да чаго ж пышны пахкі бэз рос у іх пад

вакном, я дасюль, калі бачу такі пышны, п'янкі, узгадваю польска-глушанскае слова «бэ-эз»!

У Глушы і дол пад нагамі быў не як у іншых мясцінах. «Зямля ёгаў», якія не падазравалі тады, што слова ёсьць такое: ёгі. А вось слова «рокако» я ўпершыню пачуў не на ўнівэрсытэцкіх лекцыях па гісторыі мастацтва, а ў сваёй Глушы. Праўда, азначала яно вось што: заводзкія падлеткі сядалі на рабочых коней і гналі іх за лес на пашу, у нейкае імгненьне паварочваліся тварам да конскага хваста, забіралі яго ў абедзьве рукі і лямантавалі, як апантаныя: «ро-ка-ко!» — лупячы пяткамі па конскіх баках.

Калі бачу на тэлеэкране, як чалавек топчацца basaнож па бітым шкле, узгадваю сваіх аднагодкаў, якія вырабляць тое змушаныя былі дзень у дзень, усё лета. Рэч у тым, што за сто гадоў бесьперапыннай працы завод, што вырабляў бутэлькі, ня мог не памнажаць і колькасьць «бою». Паступова сеяў і сеяў вакол сябе бітае шкло, і ўсё пашыралася, распаўзалася па пасёлку кола зіхоткай, як антрацыт, чорнай жорсткай сумесі перагарэлага шлаку і шкла. А нам па гэтым бегаць, і ня будзеш штосэкунды думаць: ах, шкло! Як бы не злавіць на пятку бутэлечнае донца! Ногі паступова набывалі дзівосную, амаль прыродную, здольнасьць наступаць на ўсё зь неўсьвядомленай абачлівасьцю, у глушанскага падлетка быццам паветраная падушка пад ступнямі зьяўлялася, бяжыш, увесь час як бы ўзьлятаючы. Але да чаго ж яркая, сьветлая кроў адразу афарбоўвала хлапечую чорную ступню, калі бедны ёг з усяго маху раптам чапляў, як падкову, вострае-вострае донца на пятку!

Але ў нас быў яшчэ лес, засланы шыльнікам (хвойнымі іголкамі) і халаднаватым мякенькім імхом, — адразу ж за крайнімі хатамі, а сям-там, напрыклад, за аптэкай, балотца з кусьцікамі запаўзала проста ў пасёлак, вялізныя жабы каля самаё «варшаўкі» вечарам так надрываліся, гарлапанілі, што, здавалася, яны па-сабачы аббрэхваюць машыны, што ішлі міма.

Калі дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту «антычнік» Фактаровіч у лекцыях сваіх высьпеўваў Арыстафанаў радок: «тысяче-ку-ув-шинное слово», перад мной адразу паўставаў глушанскі лес: «тысячекувшинное» рэха! Слухаючы яго, блізкае-далёкае, пужлівае і заклікальнае, калі сьвет мой замыкаўся высокім плотам Пагоцкіх, за якім цямнеў таямнічы лес. Пазьней мы агучвалі яго, лётаючы па рыжыкавым сасьняку ці калі вышуквалі птушыныя гнёзды, вавёрчыны дуплы, яшчэ ня ведаючы перасьцерагальнага слова «экалёгія», радуючыся сваёй драпежнай уладзе над лясным жыцьцём.

Але як тое самае расчуў Валодзя Высоцкі, такі ўвесь з гораду? Як ён змог перадаць? Ён вярнуўся з Масквы (куды я яму даваў сваё першае выданьне, бляклa-зялёнае, «Вайны пад стрэхамі») зь песьняй, з сваімі «Аистами». Тут жа прасьпяваў, трымаючы навесна сваю прыручана-прасьцяцкую гітару. А я пачуў ня проста лес і клёкат буслоў, а наш, глушанскі, — з працягнутай празь яго струной асфальткі, басіста-густымі яловымі лагчынамі, западзінкамі, што пераходзілі ў балоты, звонкімі медна-сасновымі і бярозавымі ўзгоркамі, задумліва-шматвёрстымі арэшнікамі ўскрай поля. Умоўна-беларускія буслы, звыкла ваенныя вароны — усё было б задужа песенна-традыцыйна, калі б не гучала над усім у яго «Аистах» тое самае “тысячекувшинное” слова-рэха.

Ну, а вечарамі мы бралі прыступам заводзкі клюб, бо лічылася, што на танцах нам рабіць няма чаго, а на кінафільм патрэбны абавязкова білеты. Як быццам у клюбе няма бакавых дзьвярэй, а іх было ці чатыры, ці пяць, і не на адных, дык на другіх кручок раптам быў адкінуты. Мне дык грошы на кіно давалі, але з салідарнасьці часта і я такім чынам пранікаў у кіназалю. (Я, але ня Зана, гэта яму не было дадзена). І што дарослыя рабілі б бяз нас, што, як цюлені на лежбішчы, засьцілалі падлогу перад белым экранам, хто б ім агучваў сьмехам і лямантам нямыя фільмы, дружным хорам счытваў словы-цітры з экрана. (Зрэшты, гэта рабіў і дарослы люд,

адным выдыхам гучна прамаўлялі за артыстаў або аўтараў фільма: «Прайшло тры дні», «У Івана зьявіліся сябры».)

Клюб знаходзіўся акурат насупраць заводу. Збудавалі яго на месцы згарэлага (ад ранейшага засталіся ў памяці старажылаў нейкія «бляскучыя шары» — пра іх абавязкова гаварылі, узгадвалі). І збудавалі ў выглядзе самалёта: гэта быў «пэрыяд індустрыялізацыі». Сьпераду, дзе павінен быць «пламенный мотор» — высозная, аж дваццаць прыступак (ня раз пералічваў), вэранда. Тут вечарамі граў заводзкі аркестар, звыклыя губы шклавыдзімальнікаў, старых і маладзейшых, старанна выдзьмувалі кракавякі, танга, а пазьней — заляцелы і да нас факстрот.

У «крылах» клюбу-самалёта зьмяшчаліся розныя службы культбыту, ад самадзейнасьці да шахмат, да бібліятэкі і пакоя для начальства, каб магло адасобіцца перад кінасэансам. Далей — даўгая заля, як бы для пасажыраў-гледачоў, а ў самых хвасьце за сцэнай — таямнічая кладоўка, куды мы забіраліся, каб сарваць апошнія струны з забытага старога раяля, мабыць, пакінутага ад згарэлага клюбу.

Зьмеценыя каторы ўжо раз з вэранды даўгімі нагамі напаўзвар'яцелага Франака, які шмат гадоў выконваў абавязкі загадчыка клюбу, падлеткі з гіканьнем выпраўляліся ў рэйд па начным пасёлку, суправаджаючы, перасьледуючы, парачкі, што разыходзіліся дамоў і ў зацішныя куточкі. Дзіўнага я помню сябе ў гэтых кампаніях 10-12 гадовых, што гадзінамі стаялі насупраць ярка асьветленых вокнаў інтэрнату або кватэры якой-небудзь глушанскай красуні, да якой, мы ведалі, наведваюцца «ўхажоры». Мы імі пагарджалі з усяе сілы дзіцячае зайздрасьці да шчасьліўчыкаў, дапушчаных да зносін з гэтымі таямнічымі істотамі — дзяўчатамі.

Вядома, я больш ахвотна выправіўся б куды-небудзь са старэйшым братам, але ён не пераносіў «хваста», стараўся пазбавіцца, як яшчарка ўцякаючы. І сяб-

рукі яго пераянялі ягоны тон, нязносна паблажлівы: «А, Зана!» Цяпер мяне так называлі сябры брата, тым самым як бы адкідваючы некуды назад, у той час, калі я сапраўды быў маленькі.

Ну і добра, затое мы зноў пойдзем у Пакроўку, у калгасны сад. Хаця мне ўжо аднойчы дасталося, тры дні жыцьця не было ад мамінага шыпеньня і бацькавага пахмурнага зьдзіўленьня: «Гэта каго мы выгадавалі? Моркву красьці? Табе што, мала сваёй у гародзе?» Ну як растлумачыць, што ня морква і нават ня яблыкі вабяць, прыцягваюць, няўжо ня ведаюць, што «цыган за кампанію павесіўся»?

Наш набег на пакроўскі сад скончыўся поўным канфузам, ды яшчэ якім. Пакуль калацілі яблыні, набіваючы свае бяздонныя запазухі, вартаўнік зайшоў ззаду і пачакаў ля высокай агароджы. Але калі дапялі да слуцкай бэры, не ўтрываў стары з ружжом, закрычаў тонка, па-бабску:

— А ты гэтыя грушкі саджаў, паршывец ты гэткі!

Птушкамі ўзьляцелі на высокую агароджу, сьцелючы сьляды ўцёкаў дарожкай зь яблык і груш, што градам сыпаліся з кашуляў. І тут грымнуў стрэл, здвоены, надаўшы зусім ужо шалёны тэмп падзеі: імчалі, што ласі, праз бульбянішча да лесу. А калі сабраліся там, Антака не далічыліся. Сталі прыгадваць, што, калі пачуўся стрэл, нехта залямантаваў, як злоўлены за заднюю нагу заяц.

З узьлеску азіралі родны пасёлак так, быццам яго вораг захапіў і нам заходзіць у яго небясьпечна. Але што было рабіць, па адным, парамі, рознымі закавулкамі прайшлі да цэнтру, паслухоўваючы, што людзі кажуць. Нібыта нічога такога. Усё, як заўсёды. Зачапілася надзея, што наш Антак ужо дома сядзіць, зацірку малочную сёрбае, а мы тут яго хаваем. Сышліся за клюбам, як змовіліся, абгаварылі сытуацыю і вырашылі, што менавіта я (доктараў сын? але прычым тут гэта?) павінен схадзіць да пацярпелага дамоў і разьведаць, на якім мы

сьвеце. Далі мне ў падмогу яшчэ аднаго хлопца. Мы зь ім наблізіліся да весьнічак таго даўжэзнага дому, дзе маці некалі аплаквалі нявест-тапельніц, патупалі нерашуча, затым рушылі вузкім праходам да сенцаў. Угледзелі ў вакне спалохана-белы, як нам падалося, твар маці Антака. Доўга важдаліся ў цёмных сенцах, шукаючы клямку, пакуль дзьверы не расчынілі насьцеж нам знутры:

— Ды заходзьце ўжо! Што вы там шкрэбаецеся, як мышы?

На наша нявіннае: «Антак дома?» — жанчына агледзела паслоў абурана-насьмешліва і махнула рукой у бок шырмы, што адгароджвала кухню:

— Там ён, ваш Антак! Ну, а вашы сракі — цэлыя? Балея вялікая, сядайце зь ім.

Даўгалыгі Антак, шырака раскірэчыўшы ногі і вышэй за галаву трымаючы вострыя каленкі, зьвіс на руках над шырокай балеяй, апусьціўшы голы зад у гарачую (ажно пара валіць) ваду. Выпарвае соль з задніцы? Паспрабаваў нам усьміхнуцца, атрымалася вартая жалю грымаса. Колькі ж той гад зашпандорыў яму з двух ствалоў? Мы прыселі на лаўку, каб раптам не зваліцца ад дурнога здрадніцкага рогату, што закалаціў нас.

Хаця глушанскіх жыхароў клікалі ў навакольлі «заводзкімі», але іх можна было назваць і «палявымі», і «лясными». Завод ня мог пракарміць, цяжка было пражыць на зарплату нават майстра. А таму амаль у кожнага была свая гаспадарка: гародчык, кабанчык і калі не карова, дык козы. Адзінаму ў навакольлі аднаасобніку з канём, плугам Арцёму Лешчуну — хоць парвіся, усе клічуць, заклікаюць, каб узараў агарод, «абагнаў» бульбу. Але якраз дзякуючы такой сваёй патрэбнасьці Ляшчун і змог устаяць, утрымацца на паверхні, нягледзячы на ўсе падаткі, якімі ўлады дабівалі апошняга прыватніка. Яго не прыбралі з вачэй, бадай, таму толькі, што і начальству ён патрэбен быў і небескарысны.

Амаль у кожнага рабочага свая каляска — двухколка ці на чатырох колах. У некаторых удасканаленыя, з

тармазамі, на роварных колах; чалавек і пафарбуе, і ўпрыгожыць свайго несамавітага памочніка, карміцельца. І бульбу на поле ці з поля прывезьці, і шыльнік зь лесу на падсьціл карове ці кабанчыку, зжатую на ўзболатку цяжкую асаку ці траву ў лесе — без уласнай каляскі, як бяз рук. Міжволі будзеш да яе ставіцца, як да жывой істоты.

У Італіі, у рабочым клюбе «партыі пралетарскага адзінства», нас проста-ткі замучылі недаўменнымі, амаль гнеўнымі пытаньнямі, і не партыйныя функцыянэры, а рабочыя: чаму ды чаму ў вашых калгасьнікаў захоўваюцца прысядзібныя ўчасткі? Які ж гэта сацыялізм?

Што мы маглі ім адказаць і як растлумачыць? Што, маўляў, калі пераможаце і вы, пасмакуеце гэтага самага, будзеце, як нашы рабочыя, радыя-радыя — дзе ўжо там машыну! — каляску займець ды ўпрэгчыся ў яе самому на пару з жонкай. І ня будуць мучыць вас такія вось клопаты-пакуты аб чысьціні ідэі, аб тым, каб нашы калгасьнікі жылі правільна. Пра тое ёсьць каму паклапаціцца і бяз вашае падмогі і падказкі.

Гэта было ў 60-я гады. А праз 25 гадоў у Барсэлёне зусім іншае давялося пачуць. Сядзелі ў кавярні насупраць храма Сьвятога Сямейства Антонія Гаўдзі, што ўразіў нас, палюбіўся, з бацькам і сынам гішпанцамі, бацька — былы народафронтавец, сын вярнуўся з Савецкага Саюзу, куды быў вывезены дзіцянём, ясна, што пра тыя часы зайшла гаворка, пра 1937-ы, 1938-ы. (Гішпанец-сын па-расейску гаварыў чыста, ён нам перакладаў і развагі бацькі.) Бацькавы нараканьні, што пацярпелі тады паразу камуністы, выклікалі ў яго нечаканую рэакцыю:

— Каб перамаглі вы або трацкісты (ён узяў з вазы апэльсін) — і вось гэтага таксама не было б цяпер у Гішпаніі. А гэта (паказаў на дзівосны, як з падталага лёду ці аплылага зялёнага шкла, храм) узарвалі б.

У глушанскага доктара таксама была гаспадарка: і карову, і кабана трымалі, курэй — мы з братам памагалі

маме, а потым пераехалі з Рачэні ў Глушу бацькавы старыя, і ім не давялося смуткаваць па звыклай сельскай працы. Госьці да нас заходзілі часта, бацька любіў, а мама ўмела, што называецца, прыняць людзей. Гэта быў сапраўды сьвяточны дзень для нашых бацькоў — каб на стале было і каб людзі пайшлі, задаволеныя бяседай, гамонкаю, сьмехам. (Не выпадкова ў беларусаў застольле так і завецца: бяседа.) У такі час вечнае напружаньне, нескончоны клопат-турбота на твары, у змружаных, як ад галаўнога болю, вачах у маці зьмяняліся на радасна-маладое ажыўленьне, і калі яна выходзіла да нас (за стол нас звычайна не запрашалі), так добра было яе такой пабачыць, таму і я любіў, калі ў нас госьці. Але я помню, што проста-ткі на другі дзень пасьля шумнай, вясёлай бяседы ў бацькі адбылася зусім іншая размова з адным з пастаянных сяброў нашага дому — паўнатварым, усьмешлівым Г. Яны пра нешта ціха гаманілі, зачыніўшыся ў «залі», і раптам бацька закрычаў, а наведнік выскачыў, як з парылкі, сьлепа стаў тыцкацца ў дзьверы, бацька выбег усьлед:

— Прыйдзеце сюды, калі паразумнееце! У сватах патрэбы ня маем.

Выявілася (потым мама нам расказала), што гэты «сват» прыходзіў афіцыйна паведаміць доктару Адамовічу думку заводзкага «актыву»: нягожа такому аўтарытэтнаму ў пасёлку чалавеку, загадчыку бальніцы, працягваць быць жанатым з «кулачкай». Загадчык і ня ў партыі! Зрабілі выключэньне з павагі. Але ня вечна ж!

Некаторыя рэчы з тае жыткі ўзгадваеш цяпер і, ведаючы, як усе шляхі для чалавека, апроч нямногіх дазволеных, дапушчальных, былі перакрытыя і рызыкоўныя, са спазьненьнем зьдзіўляесься, што людзі стваралі і агулам захоўвалі нейкія формы і спосабы жыцьця, не начальству і дзяржаве, а ім самім патрэбныя. Нягледзячы ні на што. Ну, скажам, як ты растлумачыш цяперашняму чытачу, што дзеля таго, каб забіць выгадаванага табой кабанчыка і асмаліць яго, ты павінен быў... ук-

расьці яго ў самога сябе, ноччу, патаемна, з аглядкай, бязь лішняга стуку-груку, завёзшы сьпярша ў лес. А суседзі павінны былі памагаць адзін аднаму ў дзіўнай гэтай зладзейскай справе, у адзіночку ня справісься. А за любы ж недазволены чых пагражаў штраф ці турма. І ахвочых, а то і па службе абавязаных высачыць і «сыгналізаваць» было аж занадта. І тым ня менш нават наша сям'я, увогуле законапаслухмяная (і нават не з-за страху, а паводле сумленьня), у гэтым пытаньні рабілася ўпартай і нязгоднай. «Сала бяз шкуркі — ня сала, а мыла!» — гэтая амаль прымаўка ўзьнікла, буду настойваць, менавіта ў нашым доме. А тое, чаго хацеў бацька (ён зусім ня шмат хацеў, заўсёды заняты хворымі), было законам для мамы, а значыць, і для астатніх у доме.

Пакуль не надыходзілі халады, 10-12 пудоў жывога сала, каўбас, вяндліны, сальцісону ў бальнічным хляве, які мы як бы арандавалі, чакалі свайго тэрміну. Мама пачынала спакваля рыхтавацца да рашаючай неспакойнай начы. Знаныя спэцыялісты гэтае справы канспіратыўна (амаль як у вайну пры немцах) наведваліся ў наш дом, затым праведвалі, вывучалі сваю будучую ахвяру і нарэшце за сталом з выпіўкай, закускай распрацоўвалі плян апэрацыі. Дзеля гэтага патрабавалася як мінімум трох мужыкоў. Арцём Ляшчун зь яго адзіным у акрузе канём — абавязкова. Блізкі наш сусед Іван Архіпавіч Дзегцярэнка, хаця і шчуплы з выгляду, не сілач, але безь яго такія рэчы не рабіліся, так ужо заведзена. Любая нагода — клікалі яго, калі ў саміх не ставала рук ці спрыту, патрэбнага інструмэнту. Ну, і яшчэ аднаго-двух чалавек, залежала ад таго, колькі пудоў і які «зьвер».

Забарон існавала вялікае мноства, часта без усякіх тлумачэньняў і матывацыяў, проста «так трэба», а многім (таму ж Лешчуну і Івану Архіпавічу) здавалася, што большасьць іх прыдуманы, каб чалавека яшчэ мацней прыціснуць, не даваць яму «ні ўздыхнуць, ні пернуць». Ну, а гэтае распараджэньне — здымаць шкуру з забітых сьвіней і здаваць — мела сваю патрыятычную

падкладку: у краіне не хапала скуры, трэба абуваць-апранаць армію і г.д. Чаму стала ўсяго не хапаць, усяго не ставаць, не тлумачылася. Самі знаходзілі адказы — Арцём Ляшчун: скаціны мала, не трывае ў калгасах нават скаціна; Іван Архіпавіч: занадта шмат партфэляў робяць, уся скура на іх ідзе.

Я, здаецца, не сказаў, што да гэтае пары мы перабраліся ўжо на другую казённую кватэру, жылі блізка ля бальніцы і зноў навідавоку ў Пагоцкіх. Сям'я ў нас, уключаючы старых, была с часам 7, а часам — 8 чалавек, у залежнасьці ад таго, колькі пляменьніц у нас жыло-вучылася. Таму чатыры пакойчыкі былі так дарэчы. [Тут мы, як кажуць, і вайну сустрэлі, толькі побач была ўжо ня бацькава бальніца, а нямецкая камэндатура, што адразу ж разьмясьцілася ў зручным бальнічным будынку ля самай шашы. Заадно і раптам падумалася: старая Пагоцкая пайшла ў камэндатуру з даносам на сваіх былых жыхароў яшчэ і таму (апроч ужо ваеннага часу страсьцей і матываў), яшчэ і таму гэта зрабіла, што ненавісныя кватаранты зьехалі ад яе і яна гэтулькі гадоў ня мела магчымасьці ненавідзець уголас, крыкам — чаго мы наслухаліся ў раньнія свае гады.]

Першым прыйшоў да нас у той вечар Іван Архіпавіч — прымак суседкі Марыі Адольфаўны, —дастаў з-пад крыса і расклаў на кухонным стале зброю забойства: востра заточаны нож, доўгае шыла, з напільніка зробленае, яшчэ некалькі ня менш страшных прадметаў. Ён такі спакойны і ўсьмешлівы, хахол Дзегцярэнка, але толькі да таго моманту, калі нехта, хто ведае яго характар і крыўды, не загаворыць пра Камсамольск-на-Амуры, дзе ён «адбываў тэрмін». Даволі спытаць: раскажытка, дзядзька, як героі-камсамольцы горад на рацэ Амур у рэкордны тэрмін збудавалі, і гэты ціхі чалавек выбухаў:

— Ага! Камсамольцы, ага. За пайку.

Вось гэтак жа Арцём Ляшчун з паўабароту заводзіўся, калі засьвішчаш у хаце. Наш бацька сьвістаў,

калі ў яго быў добры настрой. І я ад яго навучыўся. Арцём ужо сані падагнаў, зь ім двое яго сыноў, худзенькі Грыша і разлапісты Шура, — забыўшыся, я засьвістаў, стары быццам на шыла сеў:

— Слухай, лепш падыдзі і дай мне ў морду!

Нарэшце прыбыў лясьнік Вакула, карчавіты мужык са зьбітым, сальным тварам і непрыемна сухім бляскам выпуклых вачэй, хрыплагалосы, увесь такі нямірны, ён таксама прынёс свой інструмэнт. Самаробкі Івана Архіпавіча адразу пабляклі, паніклі перад наборам вастраколючых і вастрарэжучых фабрычных прадметаў. З уласьцівым яму сарамлівым пацепваньнем плячыма, кіўком галавы, ці то ў знак згоды, ці такой жа нязгоды, Дзегцярэнка рукамі памацаў гэтае багацьце, пацмокаў запалым бяззубым ротам: нічога ня скажаш! Ну, што ж, усё сёньня ня лішняе, бо ўсе бачылі і ацанілі праціўніка: вепрука гаспадыня адкарміла на ўсе чатырнаццаць пудоў, але ён пры гэтым ня страціў ні рухавасьці, ні сілы. Зьвер зьверам! Пагрыз дошкі, як бэнзапіла, сьцены паклычыў, вочкі маленькія, недаверлівыя — паспрабуй да яго падступіся.

Арцём як зазвычай памоўкваў, даючы іншым выказаць уласнае глупства. І пакуль яго не паклічуць — рассудзіць іх. Калі позіркі да яго павярнуліся, яшчэ з хвіліну памаўчаў. Нарэшце ўзгаварыўся:

— Зь якога боку да яго заходзіць? А ні зь якога. Ёсьць адзін фокус, калі гаспадыня дасьць нам мучыцы, ну, а торба ў мяне на возе, з-пад аўса.

— Ого, ты каня аўсом корміш? — не ўтрываў Вакула. — На тое кулак, хутаранін!

— Аўсом не аўсом, а на лейцах пад бруха не падвешваю на вясну. Дык вось, толькі трэба, гаспадыня, прышыць да яе зашмаргі і...

Ён паказаў, як будзе завязваць торбу з мукой за вушамі ў кабана.

— Ціха, мірна, хочаш — укусі, калі зможаш. З такім зьверам інакш і немагчыма.

Што за зьвяры, якія яны сабакі кусучыя — кабаны, нават падсьвінкі, гэта і я мог бы расказаць. Тым больш, што мама адразу прыгадала мой выпадак і нават цяпер, пасьля столькіх гадоў, не безь перажываньняў:

— Вунь яго пакусала сьвіньня, дык жывога месца не было. — І не магла не дадаць, на ўсякі выпадак, на будучае:

— Вечна падлезе, куды ня сьлед.

Але, так і было — падлез, сам напрасіўся на бойку з кабаном. І каб жа кабан, а то нейкі худэразны падсьвінак (ці падсьвінка), якіх у нас нямала бадзялася па вуліцах, дварах, самастойна шукаючы сабе харч. А пад вечар, калі ня прыйдуць дамоў, гаспадыні расшуквалі іх скрозь па пасёлку. Адзін вось такі падгольваў смачную траўку ля нечае агароджы, дружалюбна махаючы хвосьцікам. Я падышоў і пхнуў босай нагой у бок, той незадаволена таргнуўся, як бы адштурхнуўшы маю нагу. Я яшчэ і яшчэ. І раптам, без усякай прычыны, ён кінуўся да мяне, пагнаўся і па-сабачы стаў хапаць мяне за лыткі, я павярнуўся да яго, схапіў за вушы і з усяе сілы, узмоцненай дзесяцікроць спалохам, стараўся ўтрымаць ашчэраны лыч далей ад маіх, такіх прывабных, смачных яму ног, а сам адступаў, адступаў да лавачкі ля агароджы, скочыў на яе. Дык гэты гад, зусім не па-сьвінячы, стаў на заднія ногі і ну кусаць, ну грызьці мае, аголеныя, я ж яшчэ ў кароценькіх штоніках хадзіў. І як жа балюча, да костачкі пракусваў (некалькі тыдняў ногі былі ў сіне-чырвоных падцёках). Я ўсё спрабаваў за вушы трымаць яго далей, не падпускаць, а ён напружваўся дастаць мяне абавязкова. Лямантаваў я, мабыць, нема, ды яшчэ злосна вішчаў падсьвінак — тут жа набеглі нейкія людзі.

— Дык вось, — працягваў Арцём, паблажліва выслухаўшы гаспадыню, — бяром торбу з мукой, дзюдзю, ён туды лыч, нос і рот поўныя, не прадыхнуць, нічога ня бачыць, тут і Дзегцярэнка зь ім справіцца.

Вось як проста, не, Арцём ёсьць Арцём, як бы ні

падсьмейвалася над хутаранцам Глуша. Але каго толькі не лічыла Глуша прасьцей за сябе?

З захаваньнем патрэбнай кансьпірацыі, сышліся ля хлева, калі Шура і Грыша падагналі ўжо сані, каня. Ні бацькі нашага, ні маму, вядома, з сабой не запрасілі: бацька і не пайшоў бы, ён наогул аніякай працы дома не выконваў. І нават не ў яго кругласутачнай занятасьці была справа, а ў нечым іншым. Ня помню, каб такое было, здарылася (а тады мы і не ўяўлялі), што наш бацька хадзіў бы зь вёдрамі да калёнкі па ваду або прынёс бы ў дом бярэмя дроваў — мама нізавошта такога не дапусьціла б, дый пасёлак, бадай, не ўхваліў бы доктара, якому людзі давяралі сваё здароўе. А таму і сам доктар рабіў і паводзіў сябе адпаведна. Ну, а ўжо красьці кабана, хаця б і ўласнага...

Мама ж, як і ўсякая гаспадыня, не павінна была ня тое, што бачыць, а нават віск чуць кабана, якога колюць, а інакш ён будзе доўга мучыцца. Гэта вядома.

Запалілі добра працёрты ліхтар і гурмой наблізіліся да загарадзі, за якой неспакойліва гуў наш гара-кабан, адступаючы ад нас далей, у самы дальні кут. Ляшчун перакінуў праз дошкі торбу і стаў жменяю набіраць і ссыпаць назад мучыцу, спакушаючы ахвяру. Кабан перарывіста гуў-чмыхаў, грозна і недаверліва, ледзь паблісквалі яго вочкі, здавалася, насьмешліва: шукайце дурняў!

— Вось табе, дзед, і дзю-дзю! — не ўтрываў Вакула. — Будзеш да ранку, як дурань, стаяць з гэтай торбай. Без ружжа тут рабіць няма чаго. Хіба толькі Іван Архіпавіч палезе да яго туды.

Дзегцярэнка худымі плечукамі згодна-нязгодна пацепаў, рабізна зморшчын на яго твары ўскалыхнулася, як вада ад кінутага каменя. Але ўсё ж усумніўся:

— Страляць? Увесь пасёлак пабудзім.

— Ну, тады пайшлі спаць, — сказаў Вакула, — няхай іншых доктар кліча, не такіх зас...цаў.

Скончылася ўсё-ткі ружжом, па яго схадзіў Вакула, ён і страляў. Я глядзеў з-за сьпін, збоку, зь біцьцём у

сэрцы чакаў стрэлу разам з асуджанай істотай, як бы разам чакалі мы страшны міг. Здалося, страха, сьцены абрынуліся — так аглушальна выбухнула цішыня, з двух ствалоў біў Вакула. Кабан нечакана паслухмяна заваліўся набок. Толькі гайданулася колькі разоў гара. Страх, што ўвесь сьвет нас пачуў, ня тое што Глуша, прымусіў сьціснуцца, як бывае, калі шум, што вырваўся, гук, сьмяротна небясьпечны, стараесься і ня можаш уцягнуць у сябе, удыхнуць, як распаленае паветра ўдыхаеш.

Ну а смалілі вепрука ў лесе, як і ўсе тады, хто краў сам у сябе сваё дабро. І зноў кожны прапаноўваў сваю працэдуру. Тут ужо ня гук, а сьвятло, зарыва трэба было хаваць, абмежаваць. Найлепшы, вякамі апрабаваны спосаб — запаленай саломкай, кулявой, распускаючы сноп за снопам, падкурваючы кабановы бакі задусюль у некалькі рук, вясёлымі байкамі падвясельваючы сябе, адзін аднаго і нават таго, каго падсмальваюць-падпякаюць, — такі спосаб, такая працэдура не для нас, нам яна не падыходзіла. Узамен гэтага вынаходлівыя завадчане пускаюць у ход паяльную лямпу. Праўда, казалі, сала аддае газай, ну, ды гэта тыя, хто ўсё яшчэ, як пры цары, «з раскошы шалее». І ўжо зусім не для нашага «шаснаццаціпудовага» (а менавіта столькі згадзіліся прызнаць за ім вагі, калі ўздымалі-ускочвалі кабанову тушу на сані) тая штуковіна, якую прыцягнуў Дзегцярэнка: звычайнае вядро з прадзіраўленым, як рэшата, дном. Насыпаць вугольля, разьдзьмухаць, распаліць дачырвана і пагладжваць па шчаціне, пакуль яна не сатлее.

— Палечыш гэтым, Іван Архіпавіч, сваю Марыю Адольфаўну — ад радыкуліту, — бесцырымонна вынес свой прысуд Вакула-лясьнік, стоячы наўколенцы і ярасна накачваючы паяльную лямпу.

Бедны Іван Архіпавіч! Па яго надзіва непрыгожым і надзіва сымпатычным, зрэзаным уздоўж і ўпоперак зморшчынамі твары зноў, як па вадзе ад кінутага каменя, прайшла рабізна зьбянтэжанасьці і адначасова як бы задавальненьня: ён ніколі ня крыўдзіўся, не злаваў на

людзей, адно не кажы яму, што горад на Амуры будавалі энтузіясты-камсамольцы.

Не, без саломкі не абышлося, практычны Ляшчун прыхапіў з сабой некалькі кулёў. Ліхтаром у лесе не насьвеціш, нават калі завіслы над лесам месяц памагае. Саламяныя паходні ідуць у справу, хоць Лешчуну і шкада на гэта кулі траціць. Салома пайшла па прамым прызначэньні, калі сьвіная туша з пачварна раздробленым чэрапам зусім счарнела, на вугаль зрабілася — пасьля Вакулавай паяльнай лямпы. Як бы здымаючы газавы запашок, прайшліся па ўсёй тушы саламяным жарком, ясным, чыстым. А потым акацілі кіпенем, знарок прывезеным у выварцы, і тут жа, наваліўшы саломы, захутаўшы кабана з галавой, загадалі нам: валіся на яго! трымай цяпло! І мы з Шурам, малодшыя з усіх, як забітыя пападалі ўпоперак тушы. Месца застаецца яшчэ і на трэцяга: прасторны, як наша канапа, пацягнутая цыратай, вяпрук. Галоўныя працаўнікі тым часам наладзілі перакур. Грэйцеся, грэйце, падбухторваюць нас старэйшыя браты Зана і Грыша. Цікава, калі б мой брат таксама закурыў, яму б і гэта сышло?

— Ну, усё, дайце і мне, — раптам камандуе, зганяе нас Вакула. — Прыгрэліся. Вось як трэба.

І валіцца на наша месца, але ня ўпоперак, а ўздоўж сьвіной тушы, абхопліваючы яе нагамі, каленямі, як верхавога каня, падграбаючы рукамі з абодвух бакоў салому.

— Сілы набрацца!

— Як на гэтай... самай, — сарамліва хіхікае Дзегцярэнка.

— І-эх! — Вакула ўскоквае і звальвае салому набок: — Сьвяці!

Хапае нож з шырокім лязом, ці не з касы зроблены, а Дзегцярэнка свой такі ж — адна рука на ручцы, другой трымае за насок — і пайшлі, і пайшлі! Саскрэбваюць тлуста-тоўсты пласт нагару да немаўлячае жаўцізны, чысьціні. У вачах абодвух, дый ва ўсіх, хто любуец-

ца тым, як атрымліваецца, — радаснае зьдзіўленьне, амаль захапленьне, мабыць, ня меншае (адсюль бачу, гляджу), чым у рэстаўратараў, калі адкрываецца з-пад паціны, копаці адпачатковая сьвежасьць шэдэўра.

І зноўку паліваецца цёплай вадой, яе не хапае, у справу ідзе чысты сьнег з-пад елачак, мы адбягаем у бок, набіраем у вёдры, а Вакула рукамі растоплівае на цёплай, зь зіхоткай жаўцізной тушы — яшчэ і яшчэ саскрабаюць лішняе, разьмякчаючы шкурку на будучым сале.

А дома нас ужо чакаюць жанчыны. На кухню выцягнулі вялікі стол, падрыхтавана нізкая шырокая лава пад разборку тушы, патрэбны посуд, вялікі, малы, чыгуны з кіпенем. Скавароды, свае і пазычаныя, — пад сьвежыну. Бацькі дома няма, павезьлі да хворага ў вёску, звычайная справа.

Жанчыны, дый усе мы, абкружылі Вакулу — глядзець першы надрэз, якое будзе сала. Ого, тры пальцы на жываце, значыць, на сьпіне, на загрыўку і пальцаў адной рукі ня хопіць! Кампліманты гаспадыням — такога выгадавалі. А мама і бабуля пераконваюць, што гэта кабанчык дабрэнны трапіўся, еў, як песьні пеў.

Вакула конаўкай зачэрпнуў крыві: ну, хто сьмелы? Не знайшлося. Сам выпіў, аж вочы заплюшчыў ад задавальненьня, а расплюшчыў, дык сталі нават дабрэйшыя, цяплейшыя. Арцём, які, мабыць, не дараваў лесьніку яго «дзю-дзю», заўважыў:

— Вось чаму ў лесьніка такое мурло!

— Жонка ня скардзіцца. Э, глядзіце, дзе ў яго сэрца! Дзіва ў рэшаце. Справа! Вось памучыліся б, а віску было б на дзьве гадзіны. А ты кажаш, навошта страляць.

Усе міжволі прыкідваюць, дзе гэта справа, а дзе зьлева, і сваё сэрца шукаюць. Адразу спрэчка: а ці бывае ў людзей? Вось доктар вернецца, трэба спытаць.

Усё, што трэба для скаварод, засмажыць для працаўнікоў, — усё ўжо ўзята-адрэзана ў кабана, заадно Вакула і кончыкі вушэй адхапіў, урачыста ўручыў нам з Шурам: грызіце, каб не расьлі лапавухімі. Да ранку ўся-

го насмажылі, нагатавалі: абавязковай у такіх выпадках крывянкі, яечні зь сьвежынай, некалькі чыгункоў бульбы (як жа безь яе?), нават кілбас жанчыны пасьпелі накруціць, сьпяшаючыся ўсьлед за ўтойвальніцай-ноччу.

Бацька вярнуўся зь вёскі ад парадзіхі акурат да застольля, уваліўся ў цёплы дом заспаны, у цяжкім, пацягнутым чорным сукном кажусе, яшчэ забалацкім. (Колькі разоў і ён і мама вінавата шкадавалі, што не змаглі вярнуць Мітрафану Тычыну яго вясельны падарунак, рэч, як бы для Сыбіры і робленую.)

Ясна, што пад чарку загаварылі і пра сэрца справа. Бацька на гэта сказаў:

— Ды гэта што! Бывалі выпадкі, што ў чалавека два сэрцы. Толькі мала яму ад гэтага радасьці. Не, не двайное здароўе і сіла не падвойная, памыляецеся. Сэрцу, як і цару... Саша, як там у твайго Пушкіна (гэта ён мной ганарыцца перад гасьцямі)? «Ты цар...»

— ... жыві адзін!

Я сапраўды да гэтага часу ўвесь гучаў радкамі з пушкінскага аднатомніка, мне падараванага. Як высушаны кабані посік — насыпанымі ў яго гарошынамі.

Такія вясёлыя дзіцячыя «шары» былі да сынтэтычных — з мачавога пухіра, стоўчанага з дапамогай попелу і пэўных фізычных маніпуляцыяў. Гэтыя шары і шары сынтэтычныя, якія я пасьпеў спазнаць за сваё кароткае-доўгае жыцьцё, цалкам маглі б служыць вешкамі прагрэсу, таксама, як і яго абвяржэньнем, — ня менш, чым ядзерная энэргія. Набываючы, трацім. Ейей, сьвіныя з гарошынамі радасьці прыносілі ня менш, калі ня больш.

Сярод заклапочаных жанчын і наша Соня, якая даўно жыве з намі, маміна малодшая сястра. Ня ведала ні яна, ні ўсе мы, што вось сюды, у гэты дом, вернецца з мужам, у першыя дні вайны, так жахліва страціўшы дзяўчынку на пераправе цераз Бярэзіну, і адсюль вось гэты Арцём Ляшчун, якому яна падкладвае смачныя кавалкі, ратуючы яе мужа-камуніста ад даносу Пагоцкіх,

на тых жа санях і на тым жа кані, што стаіць пад вакном, шпарка памчыць да школы, да лесу, што бачны з вакон.

Калі я іх потым бачыў, а бывала, што зь нейкае сьвяточнае або сумнае нагоды ледзьве ня ўсіх пецярых адразу — маму і яе сясьцёр, — міжволі параўноўваў. Да чаго ж падобныя і да чаго ж розныя. Дзядзька Антон і дзядзька Аляксандар, іх браты, што стаялі як бы наводшыбе, яшчэ лепш памагалі зразумець Тычынаўскі агульны корань.

Калі за пункт адліку браць маму, г. зн. характар выключна дзейсны і нават уладны, астатнія выстраяцца так: жорсткая (калі не жарсткаватая) Оля, што так і засталася непісьменнай сялянкай-гараджанкай, затым, бадай, разумна-іранічная Люба, якая адправіла ад сябе ажно двух мужоў, калі зразумела ім цану (першы, здавалася, і нарадзіўся з рукамі ў кішэнях, такі быў гультай, але зь неверагоднымі прэтэнзіямі, а другі — партапантаны, ён нават ва ўласную прыбіральню зрабіў адвод ад тэлефона, хоць ніхто яго, вядома, там не шукаў па тэрміновых дзяржаўных справах).

Затым — Зіна, выключна, нават нейк не па-тычынаўску, цалкам замкнёная на самой сабе, ну, і нарэшце — Соня, да старасьці худзенькая, як дзяўчынка, і ласкавая, як дзіця. Калі яна павышала голас на мужа — Пецю, ён глядзеў на яе з падбадзёрвальным зьдзіўленьнем: ну, хоць на мяне ўзьняла голас, і за тое хвала Богу!..

Ну а калі пачаць адлік з Соні, увесь ланцужок выстраіцца ў адваротным напрамку. І калі брат Аляксандар стане поруч з Соняй, яны вельмі падобныя характарамі, дык Антон будзе там у ланцужку, дзе і наша мама. Яны, Аня і Антон, заўсёды былі ў сямействе Тычын — ня столькі ўзростам, колькі аўтарытэтам — старэйшыя. І калі яны ўдваіх разыходзіліся ў меркаваньнях, у ацэнках (што здаралася дужа рэдка), дык апошняе слова звычайна заставалася за Аняй (нашай мамай).

Як жа ёй, што ўсё жыцьцё столькі трымала на сабе, адказвала ня толькі за адну сваю сям'ю, хоць ніхто, вя-

дома, ёй гэтага не даручаў, было балюча выявіць: напаткала старасьць! Гэты ня быў звычайны жаночы жах перад старасьцю. Прырода адарыла яе хараством, сьвежасьцю твару, яснасьцю вачэй, без усякіх жаночых стараньняў і хітрыкаў захавалася і пасьля 60-ці. («Ды ў вас, Ганна Мітрафанаўна, твар сьвяжэй, чым у нявестак вашых», — здаралася, скажа хто-небудзь досыць нетактоўна, у прысутнасьці ўсіх.) Дасюль болем аддаецца ўва мне памяць пра тое, як яна раптам заплакала. Нешта спатрэбілася дастаць з гарышча нашага глушанскага дому. (Бацька пасьля вайны пачаў яго будаваць, ды так і не пажыў у ім, завяршылі мамін дом мы, калі пачалі ўжо з братам зарабляць. К гэтаму часу дзевяць пруткоў-бярозак, зь якіх усё пачалося, вымахалі вышэй за прыдарожныя сосны.) Дык вось мама, не, каб сыну даручыць злазіць на гарышча і, што трэба, дастаць, сама захацела ўзьлезьці туды. Што раней ня раз, вядома, рабіла. Я памог ёй пералезьці праз нязручна шырокі застрэшак, але, калі трэба было спускацца, яна ніяк не магла дацягнуцца да лесьвічнай перакладзіны. Як я ні стараўся памагаць, стоячы ніжэй. Хоць ты ёй на тым гарышчы заставайся назаўсёды! І тут яна заплакала — з такой дзіцячай крыўдай на сваю бездапаможнасьць. На раптам спасьціглую старасьць. Плакала і злавала на мяне, што я гэта бачу. Падымалася па лесьвіцы — была адна, а спускалася — другая, старая.

Да раніцы ў доме ўсё было прыбрана, падлога, сталы, лаўкі вільготна сьвятлелі. Пах крыві, кмену, перцу, сьвежыны трымаўся яшчэ доўга. Кожны з памочнікаў панёс сумку з салам, мясам, кольца-два каўбасы, усяго крыху, але і дастаткова: калі б пачалося сьледзтва за парушэньне закону, які забараняў смаліць сьвіней, было б каго і за што абвінавачваць, — у карысьлівым саўдзеле. А калі патрэбна была «палітыка», дык, калі ласка: за сталом выскаляліся наконт таго, колькі добрых партфэляў не далічацца.

Наогул жа палітыка па-глушанску — гэта «палітыка мухамораў». Што гэта такое, магу растлумачыць.

Па шашы ідзе высокі, не па-вясковаму, а па-заводзку стары чалавек, г. зн. худы і пласкагруды, затое «адамаў яблык» выпінае, як у старажытнай чарапахі. Без акладзістай сялянскай барады, у нас барод не насілі, затое вусы, як у польскага пана, а на босых нагах нязьменныя трэпы. Гук дзеравяшак і пранізьлівы голас чуваць далёка.

— Гэта яны толькі разумныя, не было нікога і нічога да іх, да маладых. А вось пайду, звару і зьем, трэба ведаць, умець, а то таго нельга, гэтага ня можна. Хто вам сказаў?

У руцэ ў старога Мікадыма вялізазны кош грыбоў, але цяжка вачам паверыць: мухаморы! Ярка-чырвоныя, з атрутнымі белымі налёпкамі. А наогул жа само па сабе прыгожа, калі ня ведаць, што гэта такое. І каб не грозіўся Мікадым зварыць іх і зьесьці, камусьці назло.

— Трэба ведаць як, а не казаць. Казаць вы навучыліся.

Праз тры гадзіны бягуць па майго бацьку: Мікадым атруціўся! Але затое адвёў душу дзед.

На заводзкую тэрыторыю сына доктара пускалі бесьперашкодна пажарнікі, што стаялі на прахадной, яны ж і ахова. Амаль празь дзень я прыносіў бацьку «зэльтэрскую», дзеля гэтага меўся ў нас шкляны паўтаралітровы балёнчык з алавянай галоўкай, з рычажкомгашэткай — усё як на вялікім, мэталічным. Прыгожая штуковіна, але як жа яна мне апрыкрала — сымбаль маіх хатніх абавязкаў: куды б цябе ні клікалі сябры, абавязаны перш схадзіць і прынесьці ваду для бацькі. З гэтае нагоды з мамай лепш не спрачацца. Сабе даражэй.

А вось старэйшаму брату нічога такога не даручаюць: ён сам сабе справу, работу знаходзіў, тую, што больш дарослая і цікавая. Кажуць, характар у чалавека такі, якія валасы — мяккія ці жорсткія. У мяне — трусіныя, прытым яўна ангорскай пароды. Затое ў Жэні — быццам мэталічная нітка-стружка, што зьвіваецца ў дробнаедробнае кольца, каляна-рыжаватая, ніякім грабянём не прадзярэш.

Я мог ладзіць сабе экскурсіі па гуце хоць штодня. Дзеля пачатку цікава і небескарысна пакапацца ў кучахзвалках жалезнага лому за майстэрнямі, там столькі трубак любых калібраў. Лішні самапал каму перашкодзіць? Дзе тры, там і чатыры, есьці ня просяць.

Галоўнае ўпрыгожаньне заводзкага двара — высачэзная чырвона-цагляная труба, калі стаіш побліз, яна так грозна нахіляецца ад імклівых хмар, вось-вось упадзе на заводзкі цэх. (І ўпала, напалавіну пакарочала ў ноч з 3 на 4 сакавіка 1943 году, калі мы ішлі ў партызаны.) У цэх я заходзіў, ужо пабыў раней на электрастанцыі, з напоўненым газаванай вадой балёнчыкам і штораз заварожана глядзеў на «баначнікаў» і майстроў-шкловыдзімальнікаў, што кідаліся па круглай драўлянай плятформе, на іх паўторы-рухі, дзеяньні і нейкія высушана-звонкія галасы, выкрыкі здаваліся адначасова і радасна-вясёлымі і безнадзейна-мэханічнымі. З году ў год, дзесяцігодзьдзямі гута гнала бутэльку — паўлітроўкі, чакушкі і яшчэ — маленькія, у далоні хаваюцца, «мярзаўчыкі». На слыху ў нас было забабруйскае Елізава (па-польску, Елізова), сястра нашай гуты, дзе і посуд, чаркі-кубкі рабілі, а пасьля перамаганоснага паходу ў Заходнюю Беларусь пачулі мы і пра «Нёман» зь яго сусьветнай славай каляровага выдзіманьня. Глуша ж як была каралевай няхітрай паўлітроўкі, так і дасюль засталася. Але ў глушанцаў з гэтае нагоды комплексаў не назіралася. Праца з расплаўленым шклом заўсёды цуд, большы, меншы, але цуд.

Шчасьлівы лёс і турысцкая пуцёўка закінулі мяне ў Вэнэцыю, і нас павезьлі на дальні астравок, каб мы паглядзелі, як робіцца вэнэцыянскае знакамітае шкло. Там я пабачыў... сваю гуту. Так, вядома, шкляная чырвона-сіняя кветка або раскошная ваза — гэта не зусім тое, што гарэлачная бутэлька. Але ўсё астатняе, сам працэс... Тыя ж мэталічныя трубкі з драўлянымі накладкамі — імі набіраецца расплаўленае шкло з ваннай печы (у нас гэта: «баначка», як у іх называецца — не спы-

таў). І тыя ж грубыя нажы-напільнікі, якімі, папярэдне змачыўшы іх у вадзе, аддзяляюць, адсякаюць шкло. Ну, і ўласныя лёгкія гутніка, іх форма-аб'ём угадваюцца і ў бутэльцы, і ў вазе. Але што больш за ўсё падыграла майму глушанскаму самалюбству і патрыятызму, дык гэта характэрна выпінаючыя кадыкі («адамаў яблык») на напружаным горле шкловыдзімальнікаў-італьянцаў, яны больш не здаваліся мне імпэратарскімі, з рымскіх манэт, — такія прасьцецкія, глушанскія.

Расплаўлены пясок у сумесі з содай, мудрагеліста ашклянелы, — мабыць, гэта было адно зь першых адкрыцьцяў чалавека, найстаражытнейшы пячорны цуд, і яно па-ранейшаму ўражвае ўяўленьне, жывіць фантазію. Я мог падоўгу стаяць і глядзець, як робіцца адно і тое ж, адно і тое ж — бутэлька. Як баначнік намотвае шкло, быццам пражу, усунуўшы канец трубкі ў пякельнае вакенца ваннай печы, накручвае, адварочваючы твар ад жару. Затым, раз, і яшчэ, і яшчэ раз дзьмухнуўшы ў халодны канец трубкі, якая бесьперапынна круціцца між далоняў, і атрымаўшы палаючы шарык памерам з курынае яйка, ён вешае трубку на кручок стаяка і бярэцца за наступную, пачынае ўсё спачатку. Працягвае ягоную працу майстар. Майстры — гэта звычайна рабочыя, старэйшыя, іншыя з вусамі, але такія ж па-хлапчукоўску худыя: ванная-печ, пастаянная сьпёка высушаць хоць каго. Колькі ні бегай да балёнаў з зэльтэрскай вадой — па чарзе ўсе да іх бегаюць, стукаючы трэпамі, — толькі потам умыесься.

Майстар пачынае набіраць, намотваць на «баначку» яшчэ шкло, разьдзьмуваючы яго ўжо да памеру невялікай чырвонай грэлкі, шкло выгінаецца, матляецца, як гумовае. З шарам-кропляй, вось-вось згубіць, сьпяшаецца да мэталічных формаў, падвешаных да драўлянага насьцілу; ад націску нагой мэталічныя шчокі схопліваюць шар-грэлку і фармуюць яго ў бутэльку. Вырваўся з шчылін дымок, бутэльку мокрым жалезам аддзяляюць, адсякаюць проста ў латок, які падставіла, трымае памоч-

ніца, адна з жанчын з тварамі, быццам крэйдай напудранымі; па канвэеры бутэлька важна накіроўваецца ў печ-загартоўку, калі па дарозе яе ня скінуць сартавальніцы ў «бой». Затым у рагожавым кулі — у Бабруйск, на склад і г.д. Я яшчэ засьпеў пару, калі бутэлькі адвозілі габрэі-балаголы, даўгія абозы ішлі па варшаўскай гравейцы.

Улетку невыносная сьпёка, узімку лютыя скразьнякі, гарызантальныя — з варот у вароты — і вэртыкальныя: высока над галовамі работнікаў ня шклом, а павуцінай зацягнутае наверша, што было калісьці шкляным. Гэтага ўсяго, плюс спадчыннага, сямейнага тубэркулёзу, калі няўхільна паміралі адно за адным спачатку, здавалася б, зусім здаровыя дзеці (чамусьці ў 17, у 18 гадоў: «А гэта іх бацька знарок заражае, тайком харкае ў талеркі» — і такое тлумачэньне існавала), — усяго гэтага камусьці было мала. У 1937-м пачалося такое, што заводзкае пекла ўжо павінна было здавацца жаданым раем.

Парой пачынаеш думаць: а ці ня ў тым быў сэнс самай дзікай бяссэнсіцы, каб людзі, якіх абышла яшчэ горшая доля, сапраўды адчувалі сябе шчасьліўчыкамі?

1937-ы год да Глушы падбіраўся, як і ўсюды, — праз газэты, радыё, паведамленьнямі аб маскоўскіх і ленінградзкіх змоўшчыках, шпіёнах. І чаго ім, такім вялікім начальнікам, не ставала, што яны ў шпіёны завэрбаваліся? — хітра-праставата зьдзіўляліся глушанцы, на ўсякі выпадак адмяжоўваючыся.

Калі паказвалі фільм: І. В. Сталін выступае па праекту Канстытуцыі, ніводнае месца ў залі Камінтэрнаўскага клюбу не пуставала. Ваша прысутнасьць абавязковая! — ніхто гэтага не аб'яўляў, але прыйшлі ўсе колькі-небудзь прыкметныя глушанцы. Прыкметныя, значыць прыкметнай будзе іх адсутнасьць. Было гэта ў каго ўсьвядомленым, у каго ня дужа, ва ўсіх па-рознаму, але прыйшлі ўсе. Затое звычайнае лежбішча падлеткаў на падлозе перад экранам на гэты раз было пустым. Сам парторг заводу Зянкевіч стаяў там і дабра-

душна-строга глядзеў у залю. Здавалася, і парторг жадаў, каб яго стараньні былі прыкмечаны. Кім прыкмечаны, хто за ўсім назіраў — нават вунь за кім! — пераканаўча не растлумачыш. Але кожны адчуваў на сабе нябачны, уважлівы, ацэначны позірк. Апроч таго, было проста цікава: добра разгледзець Сталіна. Цэлыя дзьве гадзіны Сталін на экране! Я міжволі збоку пазіраў на бацьку, на маці — глядзяць напружана, сур'ёзна. Адно і тое ж, адно і тое ж: чалавек на трыбуне, паўгадзіны гаворыць, час ад часу паказваюць, як апладзіруе заля — я пачаў стамляцца, а таму займацца розным глупствам. Заўважаць стаў: Сталін дрэнна гаворыць. Не, не акцэнт, не цягучы голас — вось гэта якраз здавалася абавязкова-сталінскім і неадметным. Але выглядаў ён чамусьці няўпэўненым і таму як бы сярдзітым.

«Як сказаў вялікі рускі пісьменьнік Гегель... даруйце, Гогаль...» — наша заля ня тое што крытычна, а хутчэй засмучана варухнулася. Быццам з аднаго, адседжанага клуба перасялі на другі. У чалавека на трыбуне і ў *я г о* залі (яна як бы з нашай зьвязаная, толькі мы ў цемры, а яны на сьвятле), у іх там цікавая гульня: ён сказаў слова — яны заапладзіравалі, ён схапіўся за шклянку з газіроўкай і прыгубіў, дастаў як бы зь цеснай-цеснай шчыліны яшчэ слова, — воплескі гусьцей, даўжэй, ён з бутэлькі налівае ваду ў шклянку і зноў падносіць яе да вусоў...

Не, гэта ня заднім лікам пераацэнка ў тым часе сябе, сваіх думак і пачуцьцяў. Вядома: «Сталін» гучала ў мазгах увесь час. Як удары пульсу. Помню, мне нейк падумалася (ці гэта пазьней? Бадай, так, пазьней): іншыя словы паступова становяцца лішнімі, непатрэбнымі, яно іх замяняе... І нібыта нават здольнае замяніць.

Так, думкі мае былі па-школьнаму «правільныя», у асноўным. А вось пачуцьця не было — даверу і ласкі, — якое мелася быць як існуючае і абавязковае. Проста ў нашым доме, у нашай сям'і не было гэтага, і ў мяне не ўвайшло. Больш таго, я заўважаў, што яго наогул не было

і ў глушанцах, якія акружалі нас. Лічылася, што ёсьць, але не было. І, помню, мяне гэта засмучала. І бянтэжыла.

Вяскоўцы, калгасьнікі, тыя любілі яшчэ і паразважаць. Сядзіць дзядзька, і ў пакоі не расстаючыся з пугай, чакае доктара, каб павезьці да хворага, і тлумачыць, чаму ў нас усё так:

— Бо ў ботах! Ленін — у чаравіках, абыдзе, калі яма. А тут у ботах!..

І ўсе робяць выгляд, што не разумеюць: пра каго гэта. Ад бацькі ці ад маці, колькі я помню сябе ў даваенным часе, нічога такога ня чуў. Не, адзін раз бацька дазволіў сабе — нават лыжку ў гневе шпурнуў:

— Падзялілі Польшчу з Гітлерам!

А мама неадкладна: ты выпіў, гаворыш і ня ўзважваеш, табе паспаць трэба, адпачыць! — быццам стала паміж заразным і намі. Але гэта ўжо быў 1939-ы. А тады падбіраўся да Глушы 1937-ы. Як усюды, але калі хваля дакацілася і да нас, спрацавала глушанская спэцыфіка. Дзе яшчэ такая лафа для НКВД — цягні невадам «польскіх шпіёнаў», навошта вывуджваць ворагаў па адным? У дзясяткаў людзей польскія прозьвішчы, а да мяжы з Польшчай нейкіх сто вёрст, чаго тут доўга раздумваць? І загрэблі больш за 80 чалавек (зь няпоўных трохсот рабочых), амаль усіх з прозьвішчам на «скі». На «іч» — таксама многіх, ну, а заадно і Вакулу, і Пода Міхаіла Кірылавіча, але гэтых па спэцсьпісах: лесьнікоў, настаўнікаў. А іншых па іншых сьпісах: вэтэрынараў («заражаюць коней сапам!») падабралі ўсіх да аднаго, прарэдзілі, як моркву, інжынэрна-тэхнічны кантынгент і г. д.

Не адных «палякаў» (сёй той з «палякаў» захаваўся, нават на адказных пасадах), але калі школы, напрыклад, ачышчалі ад ворагаў, пачалі, натуральна, з польскай (той, што ля сажалкі: невад — сажалка, усё як па-пісаному), з дырэктрысы, палячкі Навіцкай, дырэктар беларускай школы Пода Міхаіл Кірылавіч тут жа пайшоў за

ёю ўсьлед. (Недзе і нешта сказаў пра «пэрманэнтную рэвалюцыю».)

Жонка Пода — чарнабровая і чарнавокая Марыя Данілаўна — даўно сябравала з мамай, і яна цяпер, вяртаючыся з Бабруйску, куды кожны амаль дзень езьдзіла і там суткамі дзяжурыла ля турмы (тым больш, што ўжо не заведвала дзетясьлямі, натуральна, работу такую даверыць больш не маглі), адразу ж прыходзіла да нас, а тут ужо сядзела і плакала цётка Віткоўская.

Гэтыя заплаканыя, што гайдаліся, як нежывыя маятнікі, жанчыны, гэтыя іх твары, вочы — колькі потым у вайну на іх наглядзеўся. У Глушы пастаўлены помнік-стэла (вуглаватую цэмэнтовую «маці ў скрусе» глушанцы ахрысьцілі «Дзікай Барай», быў фільм з такой назвай), на стэле імёны 102 франтавікоў, падпольшчыкаў, партызанаў. Няма дасюль стэлы з імёнамі яшчэ 83 ці 85, палеглых на вайне Сталіна з «уласным» народам. І цішком аплаканых.

Як я гэта помню: маленькая постаць цёткі Віткоўскай, гойдаецца ўзад-уперад, яна ўсё расказвае, як я н ы пастукалі, як зайшлі, а разгублены Віткоўскі, істота ня толькі бясшкодная, але якая здавалася заўсёды мне бессловеснаю, стаў прасоўваць ногі ў рукавы пінжака. Дачка Люця страшна закрычала, калі прачнулася і ўсё гэта пабачыла. (Яна пасьля гэтага засталася на ўсё жыцьцё крыху «дзіўнаватай», «ненармальнай» — яшчэ адно гора Віткоўскай.)

Куды пазьней я стаў разумець, як рызыкоўна паводзіла сябе наша мама: ёй, «кулачцы», ды ў 1937 годзе, больш бясьпечна было б не прымаць у сябе такіх гасьцей, сяброў. Што і нашай сям'і пагражае такая ж бяда, зусім ня думалася, ну а што ў нас у Глушы столькі «ворагаў», амаль усе суседзі — «шпіёны», у гэта ня верылі нават школьнікі. Аднойчы ўначы я прачнуўся ад здушанага плачу мамы. (Нашы ложкі па-ранейшаму ў адной спальні.) Яна рыдала, а бацька яе супакойваў, але так, што яна пачынала плакаць ужо ўголас.

— Ня трэба, Нюрачка! Я толькі хачу, каб ты ня езьдзіла, як Марыя Данілаўна, не шукала, не дамагалася. Ня трэба. Я адтуль не вярнуся, калі здарыцца. Кажуць, там б'юць. Што пад руку трапіцца — графін, табурэт, але біць сябе не дазволю! Няхай будзе, што будзе.

Колькі было людзей, якія вось так рыхтавалі сябе да сустрэчы з той нябачнай гадзінай, што бесьперапынна выхоплівала мужчын і жанчын, яны бязь сьледу зьнікалі ў жудаснай прорве, — мы ўжо ведаем; чулі, прачыталі і аб тым, з чым там чалавек сустракаўся і як яго паступова ператваралі ў нешта іншае, ня тое, кім ён лічыў сябе і яго лічылі. Але я ведаў бацьку толькі такім, якім ведаў, вялікае шчасьце, што і яму не давялося сябе занава пазнаваць у тых катоўнях. А ўратавала чыстая выпадковасьць: данос на «сына памешчыка» (вось так павысілі сацыяльны статус бабулінай сям'і) трапіў у рукі таго рачэнца, бабруйскі энкавэдыст вазьмі і скажы сваёй маці, маўляў, і на Адамовіча, камінтэрнаўскага доктара, напісалі. А тая па вясковай сваёй прастаце заступілася: які ж ён памешчык, ты ж іх ведаеш! Ну, памешчык, не памешчык, а калі яшчэ адзін данос паступіць...

У маім уяўленьні бацька быў менавіта такі: ён не дазволіць нікому сябе прынізіць. Характар, запальчывасьць — тут і да трох не лічы. Помню, якім ён здаўся мне страшным, калі бег ад бальніцы да нас, што расклалі вогнішча амаль пад саламянай страхой хлева. (А ўсё пачалося з павелічальнага шкла, якім мы зь Мінькам выпальвалі на бярвеньні свае імёны.) Да самай ночы я не прыходзіў дамоў. А калі ляжаў у ложку, затаіўшыся, і бацька спытаў пра мяне, ён сам раптам сказаў:

— Добра, што парсюк гэты ўцёк! Гэта ж трэба, ледзь бальніцу не спалілі.

Мама неяк расказвала пра выпадак, як бацьку павезьлі да парадзіхі ў «кацапскую» вёску. Кацапамі называлі ў акрузе старавераў, што пасяліліся тут у часы ніканаўскага расколу. У іх свая, «старая», царква, звы-

чаі таксама свае, строгія, крутыя: ня есьці і ня піць з аднаго посуду зь «нячыстымі». «Лягчэй чалавека заб'е, чым закурыць», — пра іх казалі, «бяз Бога ні да парога», — у назве любой «кацапскай» вёскі «Бог» абавязкова: Багуслаўка, Багушоўка... Наогул, і пасьля 300 гадоў іх лічылі крыху чужакамі, а таму небясьпечнымі.

Тая бацькава паездка нібыта пацьвярджала такую іх славу. Прывялі ў дом і раптам аб'яўляюць: выратуеш яе — нічога не пашкадуем, памрэ яна — памрэш і ты! Вось так, калі ласка! Бацька ім: «Будзе відаць. А пакуль усе ідзіце прэч. Жанчына няхай застанецца, грэць ваду, памагаць». Парадзіха, на шчасьце, не памерла. Назад едзе ў санях, а ззаду за імі яшчэ нехта, суправаджаюць. З чым, чаго, усякае думалася: можа, хочуць прыбраць па дарозе, баяцца, што ўладзе паскардзіцца? Не, праводзілі ажно да хаты Пагоцкіх. Раніцай мама выйсьці хоча, а дзьверы падпёртыя, не паддаюцца. Ажно — на ганку нейкія бочачкі, мяшкі. Бацька загадаў у бальніцу аддаць усё гэта — мёд, сала, лой (таплёны тлушч). Мама частку лою ўсё-ткі прысвоіла: бацька хварэў на сухоты, а тады лячылі толькі тлушчам (нават сабачым, і бацька таксама ім лячыўся).

Як ён мне падабаўся, бацька, калі збоку назіраў за ім, што крочыў па шашы або праз базар. Усе зь ім раскланьваюцца, і ён з усімі. Малады, стройны, на добра паголеным твары радасьць нечаканага адпачынку, хаця кіруецца ён на выклік, да хворага. У руцэ прыгожая, лакам пацягнутая палка (з Кіславодзку прывёз, адзіная іх, бацькі і маці, паездка на курорт), ён так здорава грае, пакручвае пад настрой сваёй палкай, часам «прапэлер» атрымліваецца. Ніхто не здагадаецца, што палка гэтая — ад злых сабак, ня раз даводзілася адбівацца яму.

У «Сынах» я пісаў пра «радыюс аўтарытэту сельскага лекара». Вёрст за 30 — 40 ад Глушы якая-небудзь цётка, пачуўшы ад партызана (хлопцы на гэтым зараблялі яечню ці яшчэ што-небудзь смачненькае), што вось гэты завашыўлены падлетак — доктараў сын, з Глушы,

пачынала надо мной галасіць, як над нябожчыкам: «А Бо! А Госпадзе! І ён ходзіць зь вінтовачкай, галодны...» — хапай шапку і ўцякай!

Думаю, што, калі б «сына памешчыка» ўсё-ткі забралі, маглі б спытаць, як у дзядзькі Антона пытаў сьледчы:

— Гэта навошта вам такі аўтарытэт? Што, рыхтуеце людзей, рыхтуецеся да моманту, калі пачнецца вайна, каб павесьці насельніцтва супраць савецкай улады?

Тады дзядзьку Антону пашанцавала: магілёўскіх энкавэдыстаў струбіла нейкая іншая банда зь іх жа ведамства і групу іх падсьледных выпусьцілі: раз вас арыштавалі ворагі, значыць, вы ня ёсьць ворагі! — на жаль, ня ўсюды такая лёгіка спрацоўвала. Нават калі саджалі і расстрэльвалі сьледчых, іх ахвярам гэта аніяк не дапамагала. А вось дзядзьку памагло, выпаўз ён з трубы (у нейкай падземнай цэмэнтовай трубе іх трымалі, турмаў ужо не хапала), сьсівелы і прыгорблены яшчэ больш (раней высокі рост яго горбіў.)

Штогод у студзені месяцы ўся наша школа з кляссаў выходзіла ў доўгі школьны калідор і сотні нашых дзіцячых сэрцаў заміралі, трымцелі, асабліва калі мы сьпявалі словы: «закрыли орлиные очи твои». Дзень жалобы, дзень сьмерці Леніна. Ня помню, як прайшоў гэты дзень у 1937, у 1938 годзе: стаялі побач дзеці «ворагаў народу» ці ім не дазволілі? А калі з намі разам сьпявалі і яны — пра каго былі іх сьлёзы? Пра яго, хто з такой чаканай радасьцю аб'яўляў прышэсьце г в а л т у , н е а б м е ж а в а н а г а н і я к і м і з а к о н а м і?

Напярэдадні вайны Глуша ўзбройвалася. Калі мець на ўвазе ўзрост ад 10-ці і да 16 — 17-ці. Бадай, вінаватыя былі ў гэтым перш за ўсё кінафільмы, там усё больш страляялі, прытым ужо з гукам. А ў завадчан столькі спакусьлівых мэталічных трубак, зь якіх можна і самапал, і гранату зрабіць. Ад сярнічак (галовак ад запалак) хутка перайшлі да самаробнага пораху, хімію ў школе вывучалі і ведалі, што патрэбна толькі сера, салетра і вугаль. Ну, а

для гэтага ёсьць аптэка, больш таго — сярод самапальшчыкаў аказаўся і сын загадчыцы аптэкі. Націск быў такі, што я аддаў перавагу ролі злодзея, чым рэпутацыі, мянушцы баязьліўца. Цягаў з «матэрыяльнай» (пакой у аптэцы, дзе захоўваліся запасы лекаў) салетру і серу, заміраючы ад жаху і чаканьня, што мама рана ці позна даведаецца, хто такі яе Саша, яе сын.

Краў ды яшчэ падстаўляў сваіх бацькоў. Сапраўды, хаця тады пра гэта зусім ня думалася, але калі б каму-небудзь з бабруйскіх энкавэдэшнікаў (як гэта было ў Саратаве ці дзе-небудзь у іншым месцы, пра тое напісана) захацелася адзначыцца, раскруціць справу пра «тэрарганізацыю дзяцей ворагаў народу», лепшага аб'екта, чым наша Глуша, яму б не адшукаць. Столькі гэтых самых «ворагаў», а ў іх дзяцей столькі, у многіх «ствалы», ды такія, што вавёрку, варону зьбіць можна вельмі проста. А чаму не каго-небудзь з актывістаў, парт- або саўработнікаў? Дзе порах даставалі? А, ясна — праз сына «кулачкі». Артыкул ад такога вось красавіка вось такога году: расстрэл дазваляецца з 12 гадоў, калі вораг, калі тэрарыст. Самім Сталінам санкцыянавана. А потым ён пераконваў пасланага Эўропай Рамэна Раляна, маўляў, затэрарызавалі бедную савецкую ўладу, камуністаў, актывістаў зласьлівыя маленькія нягоднікі, нацкаваныя клясавымі ворагамі. Мяккавусы правадыр трызьніў наяве, а вялікі гуманіст сядзеў, слухаў — ня ўстаў, не пайшоў, хаця б моўчкі, не, усё намагаўся зразумець лёгіку вар'ятаў...

Заставалася і ў нас даказаць, што была змова, але калі ўся Глуша была нашпігаваная «ствaламі», зрабіць гэта было б прасьцей простага.

Як яны не пайшлі гэтым шляхам, а ўсё перадаручана было ўчастковаму міліцыянэру — яшчэ адна загадка, выпадковасьць, шанцунак?

Гром грымнуў нечакана: нехта зазірнуў у час уроку ў клясу, назваў маё прозьвішча! Да дырэктара! Такога яшчэ не было, калі мне і даставалася, дык на ўзроўні на-

стаўніка, нават да завуча не цягалі. Увайшоў у настаўніцкі пакой, а там ніякага дырэктара, міліцыянэр чакае. І адразу да справы. Колькі ў цябе (прозьвішча? так, правільна), дык колькі ў цябе падпалянцаў? Вядома, ніводнага, хто ж у гэтым прызнаецца? (Кроў аж у цемечка б'е!) У мяне ў партфэлі доказ, варта пайсьці ў клясу і зазірнуць у маю парту. Праўда, самы маленькі, амаль цацачны самапал. Але ні абшукваць, ні нават палохаць мяне ўчастковы не зьбіраўся. Ён нават заўсьміхаўся падбадзёрваючы, бачыў, як доктараў сын зьбянтэжаны і напалоханы адным толькі падазрэньнем, што ў яго, як і ва ўсіх, можа быць самапал. Добра, ідзі! А мне паклічце вось такога.

Прыйшоў я з школы, а дома яшчэ адзін сюрпрыз. Пячнік палез на гарышча і выпадкова знайшоў, выцягнуў з-пад лежака наган — «вось такі!» (мама рукі разьвяла зусім па-рыбацку). Ня твой? Але мяне ўжо міліцыянэр дапытваў і то... Недаўменна ўскінуў плечукі: адкуль я ведаю, мы ж не адны ў гэтым доме жывем. (Няпэўны намёк на Дзёму і Грышу Савіцкіх, нашых суседзяў. Ці сумленна зрабіў — падумаць не пасьпеў, ужо сказаў.) Цікава, як многае даваеннае, перадваеннае амаль як у люстры паўтарылася ў вайну. Хоць бы гэтыя самыя гранаты, нашы самаробкі, а потым сапраўдныя, запал ад адной з такіх выбухнуў пад рукой (пад сякерай, гэта трэба было дадумацца секчы!) Дзёмы Савіцкага, пашкуматаўшы яму руку, а Жэню дробнай медзьдзю пасекла ўвесь твар, пашкодзіўшы вока. Але мы ішлі да гэтага, калі ў лесе кідалі закляпаныя з двух бакоў трубкі-цыліндры, напоўненыя «маім» порахам. Не для цікавасьці сёньняшніх падлеткаў: сярод цыліндра напільнікам робіцца прарэз, ніткамі навязваецца дзясятак сярнічак галоўка да галоўкі — чыркануў і шпурляй! Бухала так, што здавалася — у Бабруйску пачуюць! Мы зараз жа разьбягаліся. Як разьбегліся і пасьля выбуху запала, спалохаўшыся, што набягуць немцы.

Мы былі аднолькавыя, што да вайны, што ў вайну, — толькі з прыходам немцаў гульня стала справай.

Гэта калі мецъ на ўвазе нашу хлапчукоўскую страсьць да стралянiны, выбухаў, зброi. Але ж многiх напрасткi датычылiся — i як хваравiта! — рэчы, якiя мяне не кранулi. Я ня ведаю, пра што размаўлялi начамi ў сем'ях, якiя ў адначасьсе пазбавiлiся бацькоў, а жонкi i дзецi сталi «сям'ёй ворага народу». Хутчэй за ўсё, звыкла шукалi злачынцаў-згубiцеляў сярод самiх жа глушанцаў, тых, хто мог напiсаць данос, напаклёпнiчаць. Здавалася, што ў iх уся справа, яны галоўныя вiноўнiкi.

— Некалi, калi ў турму трапляў адзiн зь вёскi, гэта была такая рэдкасьць. Цяпер жа такое робiцца, што ж гэта робiцца? — пытала ў нас Вiткоўская.

Пра ваеннапалонных i яшчэ — пра палiцаяў, уласаўцаў. Мая Глуша ня ўсё растлумачыць, але сёе-тое раскрые, ужо ж тут я ведаю ўсё як сьлед: каму ўлада даваенная i якi шлях акрэсьлiла, куды штурхала-падказвала i як, тым ня менш, той цi iншы чалавек павёў сябе ў вайну. 83 цi 85 сем'яў мелi поўнае права лiчыць сябе ворагамi савецкай улады, яна сама iх аднесла да гэтай катэгорыi i ўсё зрабiла, каб гэтыя людзi ўспрынялi прыход немцаў як збавеньне. Дык вось: значная большасьць дзяцей i жонак «ворагаў народу» зрабiлiся падпольшчыкамi, партызанамi. У палiцыю, ва ўласаўскую армiю ўступiла з такiх сем'яў роўна сем чалавек. Не, я ад гэтага не прыходжу ў замiлаваньне. Ня вартая была ўлада Сталiна таго, каб яе абараняць. Тым больш сабой i дзецьмi ахвяраваць, iм, адрынутым i апляваным. Тым больш што надзьмута-вусаты правадыр i ўся пiрамiда яго бессэнсоўна жорсткай улады паводзiла сябе, як банда, якая ў заложнiкi захапiла цэлы народ, краiну. Тым i прыкрыла сябе: змагаючыся з новым, ня меншым азьвярэньнем, гiтлераўскiм, ратуючы сябе, краiну, народ ратаваў i сталiнскiх катаў, учарашнiх i заўтрашнiх.

Учора так ня думалi? Улетку 1942 году «кулачка» (наша мама) папярэдзiла сына «ворага народу» Эдзiка Вiткоўскага ад непапраўнага кроку:

— Крыўдуй, Эдзiчак, на каго хочаш. Ты маеш пра-

ва. Адно не на Радзіму. Ты ж ведаеш, што і маіх бацькоў выслалі. Таму паслухай мяне!..

Так, Сталін усё рабіў, абы ў нашай сьвядомасьці ён і радзіма зьліліся ў адно цэлае, здалёк многім гэта так і бачыцца. А насамрэч...

Я чамусьці ўпэўнены, што адным з важнейшых складнікаў перамогі над фашызмам, над Гітлерам, было пачуцьцё (часам глухое, сьвядома прыціснутае) няпрыязі, а то й нянавісьці... да Сталіна. Ішлі ў бой зь яго імем? Сапраўдныя франтавікі нічога такога не прыпамінаюць. А калі хто і крыкнуў: «За Сталіна!», дык салдацкая (а гэта пераважна сялянская, калгасная) раць успрымала засьпінныя палітрукоўскія выкрыкі як горкі, амаль зьдзеклівы напамін: мала нам было свайго «фюрэра», яго калгасаў, галадухі, турмаў, дык яшчэ адзін «вызваліцель» прыпёрся, аб'явіўся на нашу галаву! Не, гэтай уладзе заўсёды (але, здаецца, час гэты скончыўся) страшэнна і незаслужана шанцавала. Нават цяжкадонная нянавісьць, якая старанна глушылася, якую змагла камуністычная ўлада ўзрасьціць у народнай душы — да Сталіна перш за ўсё, — нават гэта паслужыла вырата-ваньню ўлады Сталіна і яе ўмацаваньню. Здушаны гнеў, які ня мог проста прарвацца супраць Сталіна, накіраваўся на Гітлера, абрынуўся на немцаў. (Як злосьць супраць нягодніка-айчыма, які прыйшоў на месца ліхадзея-бацькі, што ўцёк: мала нам свайго, дык цяпер гэты!)

Доказ таму, што Сталін зьвярыным чуцьцём улавіў самую малую небясьпеку, пагрозу сабе, ведаў сапраўдную цану прапагандысцкай «любові» да «правадыра і настаўніка» і меру глыбіннай народнай нянавісьці да яго парадкаў і да яго самога, — у яго неадкладных рэпрэсіях пасьляваенных. Ён усьведамляў, што нават нібыта сумесная з генэралісімусам Перамога над сьмяротным ворагам калі і прымірыла народ зь ім, дык гэта ненадоўга. І засьпяшаўся, тут жа ўзнавіў наступ на галоўным і пастаянным фронце — унутраным.

Ва ўсе гэтыя падзеі: 1937-ы і наступныя гады, у вайну я ўваходзіў адзінаццаці-чатырнаццацігадовым. Апроч таго, што адбывалася з усімі, было яшчэ нешта — тое, што адбывалася са мной, ува мне, вядомае толькі мне аднаму.

Адкуль ні глянь: з далёкага-далёкага дзяцінства, з-за прасьвечанай лямпай шырмы з лугавымі кветкамі-разводамі, за якой я хварэў на шкарлятыну і дзіцячую сьвінку, або праз паўвекавую мутнаватую далеч пражытага — адкуль я на сябе 12—14-гадовага ні гляну, здаюся сабе як бы падмененым. Магчыма, гэта здараецца і адбываецца з усімі, з кожным, як толькі ў дзіцяці пасяляецца адчуваньне, покліч полу і веды пра сьмерць. Г. зн., калі занава паўторыцца, ужо з табой асабіста: выгнаньне з раю. Або: паўторнае пазбаўленьне роду чалавечага яго неўміручасьці. (Якое я таксама на асабістым узроўні перажыў, але не 6-га жніўня 1945 году, калі выбухнула бомба Суднага дня, а мы нічога не зразумелі, а куды-куды пазьней. Калі пачалі разумець.)

Жыцьцё мяне вельмі доўга аберагала ад уражаньняў сьмерці, але любоўю адарыла вельмі рана.

У Глушы, вядома, паміралі, і дзеці таксама бачылі, як плакалі, як выносілі-адвозілі труну з чалавекам у бок бровара Дойнічава, там нашы могілкі. Але я ўбачыў сьмерць, яна ўвайшла ў мой зрок, засталася ў сьвядомасьці (усьвядомленая), калі ўскрывалі ў бальнічным двары цела самазабойцы. Спачатку трасянула, быццам токам, Глушу: «Клакоцкі застрэліў жонку!» Застрэліў з паляўнічага ружжа і кудысьці ўцёк. Глуша замерла ў чаканьні і цікаўнасьці, як будуць ісьці падзеі. Ужо да паўдня — новая вестка, незразумела, як і кім распаўсюджаная: «Клакоцкі ўтапіўся ў Млынку!»

Бачылі гэта падлеткі, што купаліся ў Краснай, рачулцы, якая цячэ пад варшаўкай за тры вярсты ад Глушы. Менавіта там аб'явіўся зьбеглы забойца, вельмі ўзрушаны, як запомнілася дзецям. Потны дзядзечка спытаў, дзе тут глыбокае месца, пакупацца. Глыбокае на рэчцы

Красная адно месца — Млынок, цёмная між алешын вада, дзе б'юць халодныя крыніцы, а дна не дастаць. На тым месцы стаяў калісьці млын. Дзядзька адразу ж нырнуў, не распранаючыся, паплыў, куды паказалі, а там раптам ускінуў рукі і зьнік пад вадой. Ды так і ня вынырнуў, ні разу.

Ускрываў ц е л а мой бацька — чамусьці ў двары, перад бальнічнымі вокнамі, пры тым прысутнічалі прыежджыя з Бабруйску незнаёмыя людзі. (Магчыма, яны і распарадзіліся так, каб заставацца на сьвежым паветры.) Уразіла стэарынава-празрыстая белізна мёртвага цела і тое чырвонае, што рукі бацькі як бы адкаркоўвалі.

І яшчэ глушанская сьмерць (дзьве сьмерці адразу), таксама зьвязаная з Млынком. Сяброўкі купаліся, у адной ногі зьвяла сутарга, другая кінулася яе ратаваць, але тая, што танула, абхапіла яе за шыю, ды так, што потым іх ледзь разьнялі, акачанелых.

На ўсё жыцьцё засталося ўва мне: любую сьмерць як бы бачыш вачыма маці нябожчыка. Заўсёды спытаеш: а маці ў яго жывая? Толькі так сьмерць даходзіць да сьвядомасьці ўся, як ёсьць.

Быў якраз базарны дзень, дом, дзе стаялі дзьве труны і сярод тлуста-чырвоных вяргінь і пяшчотных флёксаў ляжалі ў белых сукенках, як нявесты, сяброўкі-тапельніцы, быў побач з базарнай плошчай. Хто прадаваў, хто купляў, а хто знарок прыйшоў, усе тоўпіліся перад домам дзяўчат і іх няшчасных маці. Заводзкія кватэры іх праз сьценку, тут жа перад вакном гароды, і, каб прайсьці да суседзяў, спачатку трэба было выйсьці па вузка, плятнём выгараджанай сьцежцы на вуліцу. А потым па такой жа вярнуцца да дому, у суседнія сенцы. Людзі праходзілі ў дом, выходзілі, адтуль чуўся плач, то з адной, то з другой кватэры, або з абедзьвюх адначасова. І раптам нечы пачынаў гучаць ужо на вуліцы, тады і другі з дому выходзіў, няшчасныя маці ўжо бачылі адна адну і цяпер разам крычалі, клікалі сваіх дзяўчатак, сваіх красунь. З раскудлачанай галавой,

зь невідушчым позіркам і нейкім жывёльным выцьцёмлямантам ішлі, адна па сваёй вулачцы-сьцежцы, другая па сваёй, а выйшаўшы на вуліцу, кінуліся адна да адной і, абняўшыся, ужо разам плакалі і крычалі. І тады, здавалася, пачынала плакаць, крычаць уся базарная плошча.

Ня ведаў я тады, што вось з такім выцьцём, з такімі ж распарана, непазнавальна страшнымі тварамі будуць хадзіць сьлепа-бессэнсоўна мая мама і цётка Віткоўская, хаваючы (жыўцом, але яны таго ня ведалі) сваіх сыноў. Калі сьмерць, што раней недзе хавалася і толькі час ад часу аб сабе нагадвала, вырвецца на варшаўку, уладна, па-гаспадарску будзе стукаць у вокны, у дзьверы дамоў. (Але хіба яна ня стукала, і ўжо куды як па-гаспадарску, калі нібыта хавалася? Але, мабыць, так мы былі зробленыя: каб разгледзець свае лягеры сьмерці, нам трэба было пабачыць нацысцкія, а каб зразумець Сталіна, павінны былі пазнаць Гітлера.)

Сьмерці няма, сказаў мудрэц. Яе няма, пакуль я жыву. А калі яна прыходзіць, няма мяне. Сустрэча зь ёю немагчымая. Калі нішто іншае ўжо ня можа суцешыць, суцяшаюць сябе гэтым. Але ўсе ведаюць: ёсьць. Чужая, як свая, свая, як чужая.

Цуд і загадку каханьня я стаў разгадваць рана. Ледзьве не ў дзевяць гадоў. Колькі я помню, Лялю Стрэпетаву прывялі да нас у 2-ую «Б» клясу. Прывялі новенькую і пасадзілі за першую парту: быццам лёгкі матылёк заляцеў у вакно і спусьціўся проста перад вачыма. Гарадзкі бант на касе яшчэ больш нагадваў матылька. Адразу даведаліся, што яна пляменьніца дырэктара школы. (Да Міхаіла Кірылавіча Пода быў у нас іншы дырэктар, але запомніўся толькі таму, што быў дзядзькам Лялі Стрэпетавай.) І яшчэ стала вядома: сірата, бацькі ў яе памерлі. Ці не таму такі засмучоны заўсёды і безабаронны ў яе выгляд? І ўся яна такая кволая, паветраная. Апранаў яе дзядзька, як лялечку (відавочна, па нашых, глушанскіх мерках), а тут яшчэ імя — Ляля. Плача, калі

тройку атрымае, — памерці можна. Са сьмеху. Няхай нехта са сьмеху заходзіўся, а я, прыкідваючыся такім жа, абміраў ад шкадобы да дзяўчынкі-матылька. Што менавіта гэта называецца «страстью нежной», каханьнем, падказваў мне Пушкін. Не аднымі толькі пявучымі радкамі, але яшчэ і тым незразумелым пачуцьцём, якое будзіла ўва мне само слова: Пушкін. Бясконца змалёўваў з партрэтаў імклівы профіль, успушаныя бакенбарды, адкладны белы каўнер. Бясконца мог глядзець у такі сьветлы, ні на чый не падобны твар. І як замёрспалохаўся аднойчы, калі здалося: ён г л я д з і ц ь, ён бачыць мой закаханы позірк! Вось гэтак жа адбывалася, калі Ляля азірнецца, а я свае вочы не пасьпеў адвесьці ўбок: як варам залье ўсяго ўнутры.

Жыў у заўсёдным страху, што яна паглядзіць у мой бок ці, яшчэ горш, сустрэнемся зь ёю нечакана твар да твару. Уяўляю, якім насупам я ёй здаваўся, калі яна, вядома, заўважала маё існаваньне, недружалюбным і як бы злым на яе за нешта. І адначасова — неадступнае жаданьне пабачыць, загаварыць, глядзець, глядзець на пяшчотны, як бы зусім празрысты тварык, у непраўдападобна блакітненькія вочы. Чамусьці плакаць хацелася, мабыць, ад пяшчоты, што расьпірала мяне. Бег у клюб на кожны фільм: а раптам і яна прыйдзе? Чакаў да апошняга на вэрандзе, ужо і фільм пачнецца, а я ўсё гляджу на шашу: ці не яна там са сваімі дзядзькам і цёткай? Каб хаця пабачыць тоненькую фігурку, прасачыць, дзе яны сядуць у залі. Гэта мне трэба было ведаць дзеля таго, каб, калі сьвятло патухне, ускочыць на ногі і глядзець, глядзець у той бок. Загараўся экран, я адразу садзіўся і чакаў-чакаў, калі што-небудзь сапсуецца і заглухне кінаперасоўка. Вечныя пакуты для глушанскай публікі — гэта заўсёдныя абрывы кінастужкі ці заглохлы матор — для аднаго чалавека ў залі былі хвілінамі асалоды. Пры сьвятле або безь сьвятла, але я мог паглядзець у т о й б о к, пабачыць яе або проста ведаць, што яна там. Кінасэанс зацягваўся часам да 2, да 3 гадзін ночы, цярплівыя

кінагледачы ўжо высьпяцца на крэслах ці лаўках, а падлеткі — на падлозе перад экранам. Кіно рана ці позна канчалася, а ў чалавека яшчэ адна шчасьлівая магчымасьць: у час высьлізнуць на вэранду і паглядзець на яе зблізку, хаваючыся за людзей.

Ды ці існавала яна для мяне фізычна? Ва ўсякім выпадку, я амаль не паверыў, калі ўбачыў, што сярод дзяўчынак, што беглі старонкай і стараліся як мага больш непрыкметна і далей ад «мужчынскіх», г. зн. нашых, вачэй прасьлізнуць у жаночую палавіну прыбіральні, якая стаяла наводшыбе, што ў гэтай чародцы і яна. Што, гэта і яна хіхікае там за сьценкай, гучыць падаючым далёка ўніз струменьчыкам? Яна, як і ўсе? — крыўдна было мне з гэтым згадзіцца.

Мабыць, Ляля і сапраўды была прыгожая, таму што было шмат у нашай школе тых, хто закахаўся ў яе. Вось і мой аднаклясьнік Франц Стэфановіч, я зь ім пасябраваў, як ні з кім, калі зразумеў: і ё н т а к с а м а. Прыходзіў да мяне, і вечарамі, у цемры, далей ад чужых вачэй мы гаманілі пра Лялю. Гаварыў ён, а я слухаў гадзінамі, калі ж Франц выходзіў з ролі, якую я яму непрыкметна адводзіў — агучваць мае да яе пачуцьці, — я зноў пераводзіў гаворку на тую, якую мы абодва кахалі, толькі ён адкрыта, а я тайна ад усяго сьвету. Пасябраваў я і з братам Лялі, калі б хапіла сьмеласьці, лёгка магло б ажыцьцявіцца тое, што я і пасьля дзесяцігодзьдзяў часам бачыў у сьне: я прыходжу да яе ў дом, мы зь ёю размаўляем, сьмяемся, яна паказвае нейкія кнігі, я, каб заняць уласныя рукі, што перашкаджаюць мне, важдаюся з патэфоннымі кружэлкамі і магу глядзець на яе твар, пяшчотны рот, сьветлыя вочы, касу на худзенькай сьпіне. Але на гэта я ніколі б не адважыўся, затое мог колькі хацеў глядзець на яе брата і ў рысах яго твару, як далёкі водар, угадваць нешта агульнае зь ёю.

І раптам яна паехала з Глушы. Матылёк заляцеў у вакно, патрапятаўся пяшчотнымі, яркімі крыльцамі, дапаў на хвілінку да шторы, раптам адарваўся, і крыль-

цы растаялі ў небе разам з хараством, невядома кім нанесеным на іх. Я месца сабе не знаходзіў. Але дзіўна, перажываў і нейкую палёгку, нібыта надзею, што больш ня будзе мучыць гэтая вечная туга, неспакой, якія мяне перапаўнялі.

А тут зноў у нашай клясе новенькая — дачка прысланага на завод маладога інжынэра. Яна адразу ж стала любіміцай глушанскіх шкаляроў. Было гэта не зусім тое, што наша каханьне да Лялі, якая паехала ад нас. Тут хутчэй скандальная папулярнасьць, чым прыгажосьць. У клясу ўвайшоў настаўнік гісторыі «Вельмі Дужы» (празваны так за ўлюбёны яго выраз і адпаведны вонкавы выгляд), руку ўздымае худзюшчая чарняўка з рэзкімі рысамі твару і сьмелымі вачыма, просіць растлумачыць ёй «глушанскае слова». Якое? «Малафейка». Вельмі Дужы толькі і знайшоўся, што параіў — лепш выбіраць у Глушы сяброў.

Зблізілася чарняўка Валянціна з татавай пляменьніцай Надзяй, што жыла ў нас, і я атрымаў рэдкую магчымасьць пасябраваць зь дзяўчынкай раней, чым закахаюся. Бо я адчуў: закахаюся! Зноў закахаюся! — зь неспакоем і тугой гэта адчуў. Зноў пакутаваць на адлегласьці, ад нясьмеласьці, трусасьці. Спрабаваў пераламаць, загадзя перамагчы ў сабе гэта. Але не ўдалося. Вось ужо нямець пачаў пры яе зьяўленьні ў нашым доме, язык рабіўся шурпаты, сухі, а рукі, наадварот, мокрыя, потныя, як толькі пачую, што яна прыйшла, зьявілася. А дабіла мяне «Суліко». У Валянціны быў голас. Што пець і мець голас — гэта не адно і тое ж, мы ў гэтым ня дужа разьбіраліся, хто толькі ні сьпяваў з клюбнай сцэны, а тут перад заляй устала ламана-худзенькая дзяўчынка, і нешта здарылася зь людзьмі ў нашым звыкла-сумным заводзкім клюбе. І песьня ж была як бы зьверху ўхваленая (грузінская, а па тых часах, усё, што з «сонечнай Грузіі», заключала ў сабе лірычны вобрыз правадыра), і мерапрыемства было цалкам казённае, але пра гэта ніхто ўжо ня помніў. Зьдзіўлена глядзелі на дзяўчынку, якая

высокім дзіцячым і грудным жаночым голасам клікала і бласлаўляла каханьне, горнае, чыстае, якое кожны носіць у сабе, як магчымасьць, як мару, адно ня ведае, як гэта выявіць, як пра яго, якімі словамі сказаць.

Бацька наш, калі выходзілі з клюбу, камусьці (ужо ня помню каму) сказаў і вельмі сур'ёзна: нельга ёй рана выходзіць замуж. Можа прапасьці голас, паколькі ён ня так прыродны, як дзіцяча-ўзроставы. Голас цнатлівасьці ў такой, здавалася, разьвязнай і раскаванай, а, па глушанскіх мерках, і распушчанай дзеўчынёхі.

Я зноў ня мог нават наблізіцца да любае істоты. А тым больш прабіцца ня ўмеў, бо Валянціну заўсёды суправаджаў эскорт ухажораў, навэрбаваны з старэйшых клясаў. Зноў марыў, як пабачу яе, хаця б зводдаль, у школе, у клюбе, на шашы. І раптам у Глушу вярнулася маё першае каханьне. Вярнулася ў школу Ляля. Вось тут на мяне абрынуліся тройкі і нават двойкі, дома не разумелі, што гэта раптам зрабілася з ранейшым пяцёрачнікам. Мне сталі забараняць тое, без чаго я жыць, здавалася, ня мог: сядзі зубры, калі такі, ні кроку з хаты, а тым больш у клюб, у кіно. А я гляджу ў кніжку, рашаю задачкі, але думаю пра іх, адразу абедзьвюх, мару, як пабачу Лялю, як пабачу Валянціну, хоць бы здаля пабачу беленькую, пабачу смуглянку, каго больш хочацца пабачыць, я ўжо і ня ведаў. Сядзеў за школьнай партай, а насамрэч знаходзіўся ў нейкім бесьперапынным падзеньні, аж галава кружылася, нават нудзіла: перада мной на пярэдняй парце зноў сядзіць дзяўчо-матылёк, а ззаду, «на галёрцы», нешта ўвесь час адбываецца, настаўнікі без канца: «Валянціна, чым ты занятая?», «Валянціна, зараз пойдзеш з клясы». Спачатку гэтыя дзьве руйнавальніцы нашых школьных душ (мы так гнёзды птушыныя руйнавалі, па-дзіцячы бязьлітасна) стараніліся адна адной, як суперніцы, а затым, мабыць, зразумеўшы, якая яны сілішча, калі разам, сталі неразлучнымі, заўсёды поруч, усюды ўдзьвюх. Але мне гэта было нават на руку, яны ўва мне і так поруч,

адна і другая, як нешта адно. Але не, не яны адно, пачуцьцё мае а д н о н а а б е д з ь в ю х. Ну, зусім, як у Наташы Растовай, калі ёй думалася: а чаму нельга кахаць двух адначасова — князя Балконскага і Анатоля Курагіна? Перачытаў гэтае месца і зноў ахнуў і засмуціўся: куды ні сунься, у любы куточак уласнай душы, ва ўласную памяць, а там ужо бываў Леў Мікалаевіч, пакінуўшы сваю «візытоўку». Але ўсё ж не зусім так, раздваеньня на каханьне «чыстае» і «прыніжана-плоцкае» не было, хоць, вядома, розьніца заўважалася ў абедзьвюх дзяўчынках, а магчыма, і ў пачуцьці да іх. У ломана-стройнай чарнавокай Валянціне мацней угадвалася тое жаночае, што нас ужо хвалявала.

Але каб жа толькі хвалявала. У чарадзе падлеткаў, такой, як наша, рана ці позна адшукаецца спакусьнік, маці не выпадкова так баяцца «падваротні». Але нам нінавошта былі падваротні, у нас быў лес, дзе схавацца лягчэй, і дзе азарт, інстынкт пошуку, паляваньня на неспазнанае, неапрабаванае.

Аднойчы пасьля шумнага катаньня-беганіны вакол слупа («гіганцкія крокі» на лясной паляне нам дасталіся ў спадчыну ад піянэрскага лягеру) я накіраваўся да групы хлапчукоў у кустах, якія чымсьці былі вельмі захопленыя, занятыя былі. Зьдзівіла, як ціха там у іх: яны што, у карты гуляюць? Стаяць шчыльнай групай і на нешта там у сярэдзіне глядзяць. Я пасунуўся, стаў на дыбачкі і раптам пабачыў! На пяньку сядзіць Генка «Сухарукі» і нешта там вырабляе ля сваіх каленак. Губа прыкушана, вочы скошаны на тое, што ён робіць, а калі ўскідвае іх і глядзіць на ўсіх, яны ў яго пуста-бессаромныя. А ўсе глядзяць на яго, на мільганьне між пальцаў нечага агідна голага і чырвонага, верачы і ня верачы ў тое, што перад імі, у іх перад вачыма. Тое самае і я, тое самае і са мной адбывалася ў тую хвіліну: быццам гэта я сам на тым пяньку, вось яно як гэта адбываецца, і я ўжо не ранейшы, ніколі ім ня буду, назаўсёды нешта страчана, і жыць ня хочацца...

Тое самае адчуў — як у шчыліну праваліўся, адкуль не дастаць, — калі я ўпершыню сеў гуляць у карты на грошы і нават выйграў. Выйгрыш вярнуў, пайшоў, і ўвесь дзень мяне тачыла нуда па чымсьці страчаным непапраўна, чаго мне не вярнуць, як я грошы вярнуў.

*Я абвінавачваю цябе, што ты здрадзіў свайму першаму каханьню!..* Ян Багаслоў, кажучы гэта, меў на ўвазе нешта сваё. Але я ў той дзень, магчыма, гэта пачуў — ва ўласнай душы.

Ужо ня помню, як было зьвязана тое, што я бачыў у лесе, і думкі пра самагубства, але яны мяне сталі перасьледаваць, крадучыся, быццам кошка да птушкі. Зусім не пра тое нібыта думаеш, і тут прагучыць — як быццам твой голас, але дзіўна незнаёмы: «Павешуся!», «Застрэлюся!» Сядзіш, ляжыш і думаеш пра гэта, як гэта будзе. Марыш нават як быццам. Аднойчы зайшла ў спальню мама, убачыла, што я ўсё яшчэ ў ложку, не зрабіла звыклае заўвагі, што ўсе ўжо справай занятыя, а я тут валяюся, не, замест гэтага сказала:

— Паляжы, сынок, палетуцень!

Так ласкава, так добра сказала. Ведала б яна, пра што мае былі тады «мары». На сабе спазнаў, што такое «небясьпечны ўзрост». Столькі раптам і аднамомантна прачынаецца ў табе, *абвальваецца на цябе знутры,* што справіцца з гэтым ня ведаеш як.

У «Нямку» сваёй гераіні аддаў тое, што я сам тварыў і што са мною тварылася. Невядома навошта сьцягнуў у бабулі круглую, з далонь памерам, іконку, мамінай п'янкой пахучай губной памадай мазаў сабе вусны, а затым станавіўся на калені дзе-небудзь за бруднай шырмай на кухні, уладкоўваючыся ў цеснаце паміж ражак і вёдзер з прыгатаванай для парсюка і курэй кісла пахкай ежай і жагнаўся, жагнаўся, гледзячы на Божую маці зь дзіцяткам, біў паклоны. Сьмяротна баючыся, што нехта зойдзе, зазірне, убачыць. Але менавіта страх быў салодкі і заварожваў. Вось ім і цешыўся.

Між гэтымі днямі, падзеямі, што вядомыя былі толькі мне аднаму, і той ноччу, калі мы з братам у сваёй спальні, апрануўшыся, ляжалі і чакалі каманды — ісьці ў лес, у невядомае партызанскае жыцьцё, было, мінула некалькі гадоў. І якіх. Мы пасьпелі зьдзейсьніць «вызваленчы паход» у Заходнюю Беларусь (бацьку адразу мабілізавалі ў Чырвоную Армію), заключыўшы перад гэтым нечаканы дагавор з Гітлерам, Германіяй, мы разгramілі «белафінаў». А апошні год перад вялікай вайной я пражыў і правучыўся ня ў Глушы, а ў дзядзькі Антона, і яшчэ два гады пражылі «пад немцамі». Усё гэта ўжо заставалася ззаду, ужо адбылося з намі, са мной, і, калі я ляжаў на ложку, адчуваючы сябе коканам у шматлікіх апратках, нацягнутых у запас, услухоўваючыся, як усё ходзіць па кватэры мама, выглядваючы ў вокны, і ўяўляючы, як мы апынемся ў партызанскім лесе і як мы будзем там жыць, я пры гэтым (добра помню) даваў сабе слова, што ўсё патаемна-благое я пакідаю тут, што т а м гэта са мною рабіцца ня будзе. Н е д а т а г о б у д з е. Ішоў у лес, каб страляць, забіваць ворагаў, але я быццам ва ўласнае дзяцінства сабраўся, дзе ўсё так нявінна і чыста.

* * *

Пасьля зімовай сьпячкі ў мядзьведзя праблема: ня можа «прасрацца». Ад доўгай лёжкі «корак» утвараецца. Ты і так, і сяк, а даводзіцца памучыцца.

— Так што цярпіце, грамадзяне эсэнгэ!

Прыблізна такімі словамі растлумачыў нашу сытуацыю таварыскі вадзіцель маскоўскага тралейбуса — гучна, праз мікрафон, не забываючы называць прыпынкі. Пасажырам яго аналіз спадабаўся, прынамсі, заўсьміхаліся, атрымаўшы яшчэ і такую, яшчэ і ў такой форме інфармацыю.

Пішу пра сваю Глушу, а за сьпінай бальнічны тэле-

візар: прэзыдэнт Расеі аб'явіў асобы парадак кіраваньня на пераходны пэрыяд у краіне, не пасьпеў сысьці з экрану, як узьнікла фатаграфічна нерухомая чацьвёрка. Гэта яшчэ што за «банда чатырох»? Не, твары якраз афіцыйныя, можна не непакоіцца. Але ж і тыя, у жніўні, былі знаёма-афіцыйныя і таксама вышэйшыя. Прыгадалася: вось гэты, вусаты ваяка, што так добра трымаўся ў жніўні, за два тыдні да пучу, нам, мэмарыяльцам, з гарачлівасьцю і гатоўнасьцю да неадкладнага дзеяньня, яму так уласьцівага, паведаміў: Янаеў званіў і прапаноўваў узяцца за навядзеньне парадку ў краіне! Што ж, цяпер разам з гэтымі вырашыў узяцца? Што, ня тую курыцу зарэзалі ў жніўні?

Але вярнуся да віхі, да таго, што пражытаперажыта ў часы дадэмакратычныя і датэлевізійныя.

Калі я пісаў свае першыя раманы, а дакладней, запісваў тое, што мая маці «ўласным жыцьцём напісала» (я так ёй сваю кніжку падпісаў, але яна як бы і не заўважыла) і дзе мы з братам толькі пэрсанажы яе жыцьця-рамана, прыйшло на думку параўнаньне: жанчыны, што ваявалі пад стрэхамі сваіх хацін з акупантамі — гэта найняшчасьнейшыя салдаты, якім у акопы падсадзілі іх малых дзетак. (Для маці дзеці яе заўсёды малыя.)

Я не зьбіраюся распачынаць безнадзейную ў літаратуры спробу — яшчэ раз выкарыстаць адпрацаваную, астылую пару. Перапісваць свае першыя раманы занава. (Калісьці такое пабуджэньне ўзьнікала, але я яму не паддаўся.) Не, мэта ў мяне і задача іншая. Зірнуць на многае (і на самога аўтара раманаў) з такой будучыні, дзе ўжо бачны край жыцьця. А раптам гэта здасца цікавым. Ці хоць бы карысным.

Адпачываў я у Кактэбэлі з сваёй дачкой Наташай (якую бабуля, можна сказаць, і выгадавала), тады ўжо (ці яшчэ) другаклясьніцай. Пісьменьніцкі Дом творчасьці ў тое лета ўвесь амаль грыпаваў. Чарговы вірус, але былі і дадатковыя прычыны: нейкі дзеяч згроб і вывез на будоўлю прыхвалевую гальку, а потым, як і мно-

гае ў нас рабілася, пачалі адтуль сюды вазіць, але ўжо не адшліфаваныя морам каменьчыкі, а гліну, гразь. Давялося тэрмінова рабіць драўляныя насьцілы на слупках — да віруса дабавілі пастаянныя скразьнякі, усьлед за грыпам затэмпэратурылі пнэўманіі, пляўрыты. За тры дні да адлёту ў Менск зьлегла і мая дачка, тэмпэратура высокая, а тут яшчэ перажываньні, сьлёзы, што спозьніцца на занняткі ў школе. Прыйшоў малады доктар, паслухаў хворую, вымавіў: «Пляўрыцік». На тым бы яму і спыніцца, але ж не, удакладніў сваё ўражаньне ад пачутага ў грудзях дзіцяці:

— Як сьвежы сьняжок хрумсьціць!

Зь мяне і хапіла. Засьпяшаўся на вэранду, на сьвежае паветра. Лекар выйшаў усьлед: «О, ды тут трэба тату ратаваць!» — і зрабіў мне ўкол «супраць спазмы».

Вось тады ўпершыню інакш пaглядзеў на ўласную маці, на ўсё, што яна рабіла і як паводзіла сябе ў вайну. Задаў пытаньне самому сабе: ну, а ты, мужык, ты змог бы з дня ў дзень, на працягу многіх і многіх месяцаў «працаваць на партызан» або кагосьці яшчэ, ведаючы, што наклікаеш, амаль напэўна наклічаш на ўласнае дзіця, вось на гэтае, жорсткую кару, пакуту, сьмерць. Не шкадавалі і дзяцей, сем'ямі вынішчалі, што было не выключэньнем, а правілам у татальнай вайне. (Як, зрэшты, не шкадуюць і сёньня прадстаўнікі народаў, што зусім нядаўна называліся «брацкімі».)

За вайну мы ўсяго набачыліся. Але вось адна сцэна, магчыма, таму што была першая, і назіраў яе зблізку — у двары, які ў думках усё яшчэ называў «бальнічным», — запомнілася асабліва. Я сядзеў, як часта тады рабіў, на лесьвіцы, зьверху назіраючы за тым, што адбывалася, а адбывалася тое, з чым мая школьная сьвядомасьць усё ніяк не магла прымірыцца: акупацыя! Раптам расчыніліся дзьверы камэндатуры, за рукі з ганку звалаклі нейкага хлопца, сьледам выбеглі яшчэ два немцы — з палкамі. Хлопец (можа, старэйшы за мяне, але ўжо не старэйшы за Жэню), якога трымалі расьцягнута,

расьпята за рукі, быццам ня ведаў і прыкідваў, куды ўпасьці. Яго павалілі на траву, прыціснулі галаву, ногі да зямлі, а двое з палкамі тут ж прыступілі да працы. Менавіта — п р а ц ы. Гэта так страшна, і па гуку — быццам бабы валікамі выбіваюць мокрую бялізну над рэчкай ці сажалкай. Усё здавалася нерэальным, пакуль чалавек не закрычаў, а калі закрычаў — боль і жах чалавечай плоці, якая зразумела, што яе забіваюць насьмерць, — здалося яшчэ больш немагчымым.

Потым даведаліся: хлопца схапілі ў вёсцы па падазрэньні, што да яго заходзілі «акружэнцы» — узброеныя чырвонаармейцы, якія пазьбягалі палону, нашы першыя партызаны.

Што гэта, вось такое чакае і яе сям'ю, яе сыноў, калі раскрыюцца яе справы, куды непазьбежна ўцягваліся і мы з братам — гэты жах у маці нашай жыў увесь час. На сябе, сваю Наташу падобную сытуацыю я прымерваў і ня ў стане быў прымерыць: як вось яе, дзіця, сам штурхнуў бы ў рукі мучыцеляў, катаў? Сваімі дзеяньнямі, учынкамі асудзіў бы на нешта падобнае? Сябе гатовы падставіць пад любыя палкі, але дзіця, маё дзіця!..

Мабыць, меў рацыю сябра-філёзаф, які напісаў, што радзіма — гэта ня толькі нейкая прастора, але і час, у які табе давялося жыць. Так, сёньня я ня змог бы, як мая ўласная маці, дзейнічаць. Але гэта цяпер, а тады, раней? Ці каб быў я, напрыклад, жыхаром... старажытнай Спарты. Успомніў яе таму, што нядаўна ў Плютарха вось што вычытаў.

«Наступным ранкам, калі ўсім ужо сталі вядомыя імёны тых, хто загінуў і ацалеў, бацькі, родзічы забітых (г. зн. тых, хто загінуў у баі за інтарэсы Спарты. — А. А.) сышліся на плошчы і зь зьзяньнем на тварах, перапоўненыя гонарам і радасьцю, віталі адзін аднаго. Родзічы ж ацалелых, наадварот, заставаліся разам з жонкамі дома, як бы знаходзячыся ў жалобе; і калі хто-небудзь зь іх вымушаны быў выйсьці з дому, дык па яго вонкавым выглядзе, голасе і позірку бачна было, якія вялікія яго паны-

ласьць і прыгнечанасьць. Гэта было асабліва прыкметна ў жанчын; тыя, што чакалі сустрэць свайго сына жывым пасьля бітвы, хадзілі ў тужлівым маўчаньні, тыя ж, аб сьмерці сыноў якіх было аб'яўлена, адразу зьявіліся ў храме ці наведвалі адна адну зь вясёлым выглядам».

Калі з старога, яшчэ савецкага, Кактэбэлю на гэта паглядзеў бы: дзіка! Ды і зь Менску, з Масквы, калі сёньня глядзець — не зачароўваюць мяне спартанкі такім вось патрыятызмам. Куды больш нашаму часу сугучна, бадай, другая падрабязнасьць, таксама зафіксаваная старажытным гісторыкам: «Маладзенькую дзяўчынуспартанку аднойчы нехта спытаў, ці даводзілася ёй спаць з мужчынам. «О не! — адгукнулася яна. — Гэта яму са мной даводзілася».

Але вось у 1943-м у партызанскім лесе непадалёк ад вёскі Нязнань, дзе была наша веснавая стаянка, спартанкі Плютараха не здаліся б звар'яцелымі. У той красавіцкі (ці пачатак траўня) дзень, калі Кожычыха галасіла над сваім забітым сынам, амаль аднагодкам маім: яго забілі за 100 мэтраў ад таго месца, дзе я быў пастаўлены, стаяў на пасту. Для маці Міці — мы былі т а м разам, цяпер ён — мёртвы, а я жывы. Ён ляжыць на зямлі каля не астылых яшчэ кухонных катлоў, на скроні ледзь прыкметныя сінія плямачкі ад аўтаматных куль, ягоная маці ўздымае вочы і бачыць мяне. Мне хочацца схавацца за сьпіны або пайсьці. Але самае галоўнае і крыўднае, хоча, каб я пайшоў, мая ўласная маці. Я гэта бачу, адчуваю па тым, як яна некалькі разоў незадаволена зірнула ў мой бок, як бы кажучы: «Ты яшчэ тут? Няўжо не разумееш?» Гэта яна, якая паўгадзіны назад атрымала свайго сына: ёй жа таксама паведамілі спачатку, што мяне немцы захапілі і павезьлі, ці то жывога, ці то мёртвага. І вось, калі ласка.

Або яшчэ: калі наша мама, з той жа Кожычыхай і іншымі жанчынамі з санчасьці і гаспадарчага ўзводу праводзіла групу на чыгунку ці ўвесь атрад — насустрач ужо бою, што грымеў воддаль, я і Жэня разьвітваліся зь

ёю, як і з астатнімі, паціскаючы руку. І яна нам паціскала руку, амаль так жа, як і ўсім іншым, хто да яе падбягаў, — *ня ўласным дзецям*. Так, вочы нашы, сустрэўшыся, нешта і яшчэ, толькі наша, выказвалі, гаварылі, але наўрад ці хто-небудзь чужы, збоку, зразумеў бы, каму яна тут маці. Нібыта ўсім.

І толькі калі сына яе забівалі (г. зн. ёй так падумалася, здалося) — тут усё вырывалася напаверхню, цалкам руйнуючы вобраз інтэлігентна стрыманай жанчыны, якая так цнатліва ўтойвала свае матчыны пачуцьці.

Калі ўжо ў партызанах Жэню параніла (яго напарніка Мішу Яфіменку немцы на тым бульбянішчы дагналі і дакалолі штыкамі), ёй пра гэта не казалі: пакуль яе сына не прывязуць і яна сама не пераканаецца, што, сапраўды, не забіты, а толькі паранены. Яна нешта адчула, занепакоена зазірала ўсім у вочы, а ад яе стараліся непрыкметна ўцякаць тыя, хто ня ўпэўнены быў, што ўмела іграе як бы зададзеную кімсьці тэатральную ролю: *я нічога, і нічога ня здарылася, усё як заўсёды!*

А тут у лягер вяртаецца з павозкай, нагружанай каровімі шкурамі, шавец Бэрка, бачыць прыбітую, як яму здалося, горам жанчыну, атраднага лекара, спыніўся, каб суцешыць яе:

— Не бядуйце так, ня трэба, Ганна Мітрафанаўна, яго прывезьлі ўжо, там, на пасту, яны.

— Што? Жэня?! О Божа, забіты!

Упала, як падкошаная, да яе зьбегліся (здалёк за ёй сачылі), тут жа ўскочыла на ногі, адштурхоўвае нас, цяпер усе ёй ворагі, бо тояць праўду, страшную, якую пачуць баіцца больш за ўсё на сьвеце, але патрабуе яе, дамагаецца ад малодшага сына:

— Праўда? Скажы, сынок. Кажы!

І ласкавала-паддобрываючыся, і зь нянавісьцю. Я мармычу: так, праўда, мама, яго толькі паранілі, у плячо, лёгка — нават усьміхаюся, каб толькі яна паверыла.

Мне жудасна бачыць яе такую, на сябе не падобную, гэтыя ашалелыя вочы, гэтую раздушанасьць і ў той жа час да ўсіх агрэсіўную непрыязь. Мне ўжо не да таго, каб брата шкадаваць, я цалкам зь ёю. Але яна і гэта адчувае, яна ўсё адчувае, і таксама не даруе.

— Усе вы падманваеце, — раптам заплакала, адразу аслабеўшы. І тут жа: — Дзе ён? Дзе?

Пабегла па дарозе ў напрамку да паста, а мы сьледам за ёю.

Але самы балючы ўспамін — першы выпадак, яшчэ ў Глушы.

Ужо прыйшлі-прыехалі немцы — на вычварна разнастайных машынах, на брані танкаў і ў люльках матацыклетаў, па-пляжнаму паўголыя, з закасанымі рукавамі, з шаўковымі шалікамі на маладых, брудна-потных шыях. Прыйшлі і прайшлі, а жыцьцё, здавалася, замёршы, насамрэч працягваецца, яно ў любых акалічнасьцях цячэ, працягваецца. Нехта паехаў на заводзкай машыне ў горад, вярнуўся, у іншых свае справы там, таксама сталі езьдзіць. І Эдзік з Жэнем рашылі, ім таксама нечага спатрэбілася, захацелася. Са мной у мамы размова была б кароткая: яшчэ ён тут! Куды гэта ты паедзеш? І безь цябе звар'яцееш! Але Жэня, кажы яму, не кажы, ён зь нецярплівай усьмешкай, з бацькоўскай гарачлівасьцю, але на сваім настоіць. І настаяў, і паехалі з Эдзікам. А пад абед вярнуліся машыны, і Глуша даведалася, што сына Адамовічыхі і Эдзіка Віткоўскага немцы схапілі каля рынку, там яны ўсіх хапалі, і некуды везьлі.

Вось тут паўтарылася тое, што было на пахаваньні сяброўак-тапельніц. Такі ж грубы, амаль жывёльны крык і выгляд, і ў каго — у нашай мамы! Яны, мама і Віткоўская, выбягаючы на шашу зноў і зноў, ішлі ў бок гораду, як сьляпыя, жанчыны-суседкі вярталі іх назад, угаворваючы, супакойваючы. А мне — лепш да сваёй маці не падыходзь, мяне яна проста не заўважала, а руку адштурхоўвала зь незразумелай і крыўднай варожасьцю. Як бы падазраючы мяне ў братняй нячуласьці. (Мяне

вечна ў гэтым падазравалі: і калі бацька ішоў на фінскую вайну — пакрыўдзіўся, што я нібыта «не перажываю», як быццам нельга перажываць у адзіноце, лежачы ў цёмным пакоі, абавязкова за агульным сталом трэба.) Мама адштурхоўвала мяне гнеўна, амаль няўцямным позіркам, калі я пачынаў ёй нешта гаварыць: яшчэ нічога невядома, яны вернуцца, вось убачыш!..

І яны вярнуліся, як нічога такога не адбылося, на спадарожнай машыне, вясёлыя нахабы з закатанымі панямецку рукавамі, не разумеючы, а што, уласна, здарылася, у чым яны правініліся. У чым? Што? Ты б вось пагглядзеў, што з мамай рабілася?

І зноў мама, як ранейшая, нават паверыць цяжка, што такое ёсьць, тоіцца пад звычайнай яе стрыманасьцю, інтэлігентнасьцю, такой паважанаю ў Глушы. І вось, носячы ў сабе такі жах перад любой пагрозай яе дзецям, яна ўсё роўна паводзіла сябе так, як паводзіла, рабіла ўсё тое, што рабіла, — столькі дзён, месяцаў, нават гадоў. Чым далей я жыву, тым менш разумею яе ў гэтым. Але тым больш хачу гэта зразумець. Як і многае іншае...

Але што я зразумеў цяпер напэўна: усё яна рабіла не «зь нянавісьці да ворага». Хаця нас столькі гадоў выхоўвалі ў нянавісьці да мінулых, цяперашніх, будучых ворагаў. «Навука нянавісьці» — была навукай усіх навук.

Не, на бытавым узроўні гэтае пачуцьцё ёй было не чужым. Сьведчаньняў таму хапала. Як зьмяняўся яе голас, якімі непрымірымымі рабіліся вочы і адразу цямнелі, калі загаворвала з бацькам (не прама, але нават нам былі зразумелыя намёкі) пра Розу Маркаўну, якая загадвала аптэкай да мамы. Думаю, што мама паехала вучыцца ў Магілёў, перадаўшы нас «на рукі» цётцы Віткоўскай, каб ня страціць у вачах мужа, з пачуцьця суперніцтва з какетліва-круглавокай Розай Маркаўнай. Здаралася, што і пілавала мужа па начах, а спальня ў нас адна на ўсіх, і мы не маглі не пачуць. Аднойчы крык нас

абудзіў: бацька некуды пабег, а мы, ня верачы сваім вушам, чуем маміна: «Дзеткі, тата ваш забіць мяне хоча!» Ёй здалося, што ён пабег па сякеру, а мне, калі бацька вярнуўся з запаленай папяросай, здалося, што ў голасе маці, што так спужаў, было нешта знарокжаночае, занадта жаночае, для яе так не характэрнае. Так што са страсьцямі ў нашай мамы было ўсё ў парадку.

І ў той жа час — ніякай, ну аніякай нянавісьці і нават варожасьці да тых, супраць каго яна тайна працавала, каго забівалі яе сябры-падпольшчыкі, партызаны і хто, у сваю чаргу, мог і гатовы быў нас усіх зьнішчыць. Як гэта магчыма, ня ведаю. Але менавіта так было, ужо ж я добра адчуваў сваю маму. Не было ў ёй, гэта дакладна, таго, што расьпірала, напрыклад, яе малодшага сына — злараднасьці, калі я бачыў забітых або параненых немцаў, якіх, асьцярожна здымаючы з пасечанай кулямі машыны, зносілі ў камэндатуру. Маю гэтую нясьпатольную нянавісьць, мабыць, адчуў малады немец, калі раптам кінуўся да мяне, да падлетка зь вядром, што прагна шнырыў вачыма па залітых крывёю бартах машыны, — схапіў за плячук; я адскочыў у канаву і далей, далей ад яго, адступаючы да калодзежа, да якога я нібыта накіроўваўся.

Зімой 41-га ў дом да нас забег маладзенькі салдат, зваліўся на крэсла, сарваў закамянелы на марозе бот і, як шчаня скавычучы, пачаў расьціраць зьбялелыя пальцы нагі, пры гэтым сьмешна грымасьнічаючы, як бы правяраючы, ці ёсьць у яго, ці жывыя нос, губы, шчокі. А, не падабаецца? Што, ад самае Масквы бяжыш? Са спальні выйшла мама зь мякенькімі флянэлевымі анучкамі.

— Немцу? — крыкнуў сын.

— Які ён немец? — апраўдваючыся, сказала маці. — Дзіця нейкае.

Перад вайной да нас прыходзілі Віткоўская і жонка дырэктара школы Марыя Данілаўна, і мама не магла не падтрымліваць тых, каму горш, чым нам. У першыя

дні вайны да нас зачасьціла сям'я Левіных, як бы ведаючы ці ўгадваючы гэтую маміну ўласьцівасьць, бок натуры. Пайсьці да каго-небудзь, выгаварыцца (чуткі такія страшныя аб расправах над габрэямі!), пачуць слова спагады, якую-небудзь параду, дома сядзець адным яшчэ страшней — зразумела, што гнала іх да нас, хаця да вайны мы ня мелі ніякіх зносін з гэтай сям'ёй. Побач з аптэкай жылі Альтшулі (сын Мэер, дачка Бая), вось зь імі мы сябравалі, — яны пасьпелі выехаць на заводзкай машыне разам зь сем'ямі дырэктара завода і праныры Бляхера, камэрцыйнага дырэктара.

Левіны зноў і зноў вярталіся да думкі, якая здавалася ім паратункам: габрэі-начальнікі ўцяклі, а навошта немцам чапаць простых рабочых? Павінны немцы разьбірацца. Павінны дык павінны, згаджалася мама, але лепш, калі Левіны пойдуць куды-небудзь у вёску, як мага далей ад шашы. (Яны так і зрабілі, у 1943 годзе іх дачка начавала ў лягеры нашага атраду, Левіны былі ў габрэйскім атрадзе.)

У адзін зь першых дзён, калі прыйшлі да нас немцы, мама паклікала мяне і брата ў спальню, у руцэ нешта трымала, не паказвала:

— Вось, дзеткі, гэта ваша. Няхай будзе. Вы мяне павінны паслухацца.

Што там такое ў яе і чаму такое доўгае тлумачэньне? Разьвязала марлевы вузялок — крыжыкі! Два — пабліскваюць медзьдзю, маленькія крыжыкі.

— Гэта вас хрысьцілі. Яшчэ калі ў Забалацці былі, жылі ў Канюхах.

— Начарта гэта нам? — я, вядома.

Мама, ажно пачырванеўшы ад зьбянтэжанасьці, а таму яшчэ больш злуючыся, накінулася на мяне:

— Ты гэта што? Скажа, хоць ты…

І раптам жаласна папрасіла:

— Зрабеце дзеля мяне, дзеткі.

Крыжыкі схавалі ў кашалькі, кожны ў свой. Павесіць, насіць на шыі — аб гэтым мама і не прасіла.

У нашай маці любімая прыказка была: кінеш за сабою — знойдзеш перад сабою! На гэты раз не прагучала ўголас, але мне здалося, што менавіта пра гэта гаворка: з даўно адмененым Богам мы ўступалі ў хаўрус занава і з тае нагоды, што прыйшоў вораг. Якія насамрэч у маці былі адносіны з Богам (ня ў нас, хрышчоных нехрысьцяў, а ў яе), пра гэта асобная гаворка. А тут яна (магчыма, сапраўды небескарысьліва) адмяняла ў сваёй сям'і савецкую адмену Бога. Калі немцы перасьледуюць габрэяў, негабрэям лепш мець доказы таго, хто яны ёсьць.

Але калі такі доказ мне мог спатрэбіцца — быў такі момант, — крыжыка ў маім кашальку ўжо не было. Выкінуў. Пасьля таго, як забівалі ў нас на вачах ваеннапалонных. Ну, проста паводле «Карамазавых», мною яшчэ не прачытаных: «Калі Ты ёсьць і такое дапускаеш — ня трэба мне імя Тваё!»

Адбылося гэта 7 лістапада 1941 году. А выпадак, калі крыжык мог спатрэбіцца, — улетку 1942-га. Вярталася я ад глушанскага музыкі Зыгмуся Грабоўскага, у якога брала (без асаблівага посьпеху) урокі ігры на скрыпцы. Мяне пабачыў немец, што ішоў па шашы (мабыць, не мяне, а скрыпку) і перабег праз канаву да мяне. Я звыкла ацаніла ворага: у акулярах, бяз зброі, толькі штых-кінжал на поясе. Гэта супакоіла і надало сьмеласьці, нават нахабства. Вораг працягнуў руку да смычка — я адвяла яго ўбок, да скрыпкі пацягнуўся — я стала да яго бокам. Мабыць, немец усяго толькі хацеў апрабаваць смычок, скрыпку, хутчэй за ўсё музыка, засумаваў па інструмэнце. Але ён — узяць, а я — не даваць! А як зь імі яшчэ?

— Юдэ? Юдэ? — Бяскрыўдныя акуляры раптам зазіхцелі гнеўна, пагрозьліва. А мне здалося, што валасы на маёй галаве небясьпечна закучаравіліся, пацямнелі, зараз набяжыць больш ворагаў, пацягнуць і скрыпку і мяне ў камэндатуру. Але і гэты, адзіны, наадварот, ад мяне сярдзіта пабег, працягваючы лаяцца небясьпечным словам.

(Нікуды не схаваесься ад тэлевізара, на гэты раз «рэабілітацыйна-санаторнага», «герцэнаўскага»: нэрвовая фізіяномія старшыні Канстытуцыйнага суду, якога абазвалі «дробным рэкецірам», — чамусьці першае слова яго пакрыўдзіла больш, чым другое; зноў віцэ-прэзыдэнт катапультаваў з прэзыдэнцкага самалёта, пры гэтым прыхапіўшы адзінаццаць чамаданаў для сьпікера... Як сказала ў 1953 годзе старая габрэйка, пабачыўшы менчукоў, якія чыталі ўрадавае паведамленьне, і пачуўшы, што Берыя — ангельскі шпіён: «З нашай уладай не засумуеш!»)

Калі паспрабаваць зразумець, як маці, ахопленая страхам за дзяцей, чаму і як яна паступова траціла пачуцьцё асьцярогі, самазахаваньня (у адносінах да ўласнай сям'і), адказ, тлумачэньне я знаходжу ў адным — ваеннапалонныя. Тое, што з ваеннапалоннымі, кінутымі на волю лёсу ўласнай дзяржавай, вытварала дзяржава акупантаў, перавярнула сьвядомасьць не яе адной. Цэлага народу сьвядомасьць была ня толькі балюча абражаная, але і перавернутая. І гэта дорага каштавала немцам.

І пытаньне ўжо другое: чаму немцы дзейнічалі на шкоду самім сабе? На вачах ва ўсяго насельніцтва марылі голадам, забівалі палкамі, як скаціну, тых, у кім кожны бачыў і свайго сына, брата. Што, такім спосабам Гітлер хацеў паставіць народ на Ўсходзе, які лічыў ад пачатку і загадзя пераможаным, на калені канчаткова? Зламаць сам дух яго. Дэманструючы сваю жорсткую волю германца.

Любыя падобныя тлумачэньні ўсяго растлумачыць ня могуць. Ясна, што такія адносіны да тых, каго забралі ці хто здаўся ў палон, ня здолелі не ўмацаваць волю да супраціўленьня арміі, ды і ўсяго народу, па абодва бакі ад лініі фронту. Схаваць тое, што не схавалася, было немагчыма. Ці менавіта гэта Гітлеру было патрэбна: каб бачылі, якую масу ворагаў ён аддае на пакуты эгіпэцкія.

Менавіта *к а б  б а ч ы л і*, яму і трэба было. Пытаньне толькі — хто? Хто павінен быў усё гэта ацаніць? Чые вочы? Калі я працаваў над «Карнікамі», пра «Ружу Сьвету» Даніїла Андрэева яшчэ ніхто й ня чуў. Але ўжо хадзіла па руках праца двух французаў: «Якому богу пакланяўся Гітлер?» Небывалая ў нас кніга «Ружа Сьвету» прымушае і свае даўнія здагадкі-думкі з «Карнікаў» прыгадаць, пераправерыць. Калі «Карнікі» ў 1980 годзе пайшлі да чытача, аўтар раптам атрымаў ліст ад палкоўніка авіяцыі, франтавіка. Ліст, поўны дакораў, які прысаромліваў: вашу аповесьць крытыкі расхвальваюць, але ж у вас паўпраўда, дзе ў вас Галоўны Карнік? Меў на ўвазе палкоўнік Сталіна. Але паколькі «Карнікі» і задуманыя былі, і пісаліся як «сны двух тыранаў», а разьдзел пра Сталіна ляжаў з 1979 году, схаваны да лепшых часоў, папрокі лётчыка гучалі для мяне, як голас аднадумцы.

Вось што пісаў палкоўнік-франтавік, маючы на ўвазе дзеяньні, віну Галоўнага Карніка: апроч таго, што абезгаловіў армію, ён перабазіраваў, падставіў пад удар ня толькі зьнішчальную, але і цяжкую авіяцыю, разбурыў умацаваньні на старой граніцы да таго, як яны ўзьведзены былі на новай і г. д. і г. д. Лётчык перакананы: Сталіну патрэбен быў моцны ўдар з боку Гітлера па савецкай арміі, краіне, па народу — вялікая кроў, вось чаму ён і падстаўляўся. Дзеля таго яму гэта было патрэбна, каб людзі забыліся на кроў, ім самім пралітую, каб гэтым баранам неба з аўчынку здалося і адпала ахвота (не да таго!) весьці цяжбу з уласным правадыром, падлічваць і назапашваць старыя крыўды. Гэта і растлумачвае ўсе яго як быццам пралікі. Але наш Карнік тут ужо сапраўды пралічыўся, ён не чакаў такога сакрушальнага ўдару, калі пагроза навісла ўжо над усёй яго уладай і самім жыцьцём. Вось гэтага ён, мабыць, не чакаў і не хацеў.

Што Сталіну былі наруку зьверствы, рэпрэсіі немцаў, а асабліва — адкрытае зьнішчэньне савецкіх ваен-

напалонных — гэта відавочна. Ратуючы сябе ад палону, ад Гітлера, народ і яго, Сталіна, ратаваў. Пры гэтым пралітая Сталінам кроў замывалася той, якую цяпер германскі фюрэр пускаў.

Але Гітлеру, вось яму навошта было падыгрываць свайму праціўніку, суперніку? Наступаць, як знарок, на міну, якая пры больш гнуткай палітыцы на захопленых землях магла падарвацца не пад ім, Гітлерам, а пад Сталінам, яго ўладай.

Ці сапраўды (так у «Карніках») для Гітлера важныя былі зусім іншыя Вочы — не насельніцтва, якое бачыць усё і ўсё ацэньвае, і якім ён пагарджае, а Вышэйшых Істот? У якіх ён маніякальна верыў. Толькі ім, Вышэйшым, служачы, ён мог захапіць у свае рукі лёс сьвету. У Данііла Андрэева («Ружа Сьвету») Гітлер і Сталін — толькі прыватны выпадак выкарыстоўваньня самымі змрочнымі сіламі Сусьвету зямных палітыкаў, якія, калі хочуць улады над сьветам, абавязаны пастаўляць туды, «уніз», людзкую кроў, сьмяротную тугу чалавечых пакут — «чырвоную расу». Хто больш пралье крыві і большыя дрыжыкі болю пусьціць па целе плянэты, на тым і спыняцца Вочы Вышэйшых-Ніжэйшых сіл, таму яны і аддадуць перавагу.

Ня ў тым пытаньне, ёсьць ці не, ці існуюць насамрэч Вышэйшыя-Ніжэйшыя. А ў тым, ці верылі ў іх тыраны ці не, і як яны, абодва, пераглядваліся зводдаль, спаборнічаючы ў жорсткасьці, крыважэрнасьці. Крывасмок на Захадзе глядзіць на такога ж вампіра на Ўсходзе, крывапускальнік на свайго дублёра-суперніка: ты колькі скінуў Ім гэтых сваіх калгасьнікаў? а ваенных? сваіх партыйцаў — колькі? Шмат, кажаш, мне не зраўняцца? Ну, нічога, сёе-тое засталося і на маю долю — вось ужо амаль 100 мільёнаў з тваіх 200 мільёнаў у маіх руках! Так што паспаборнічаем па-бальшавіцку. Вочы Вышэйшых спыніліся на мне назаўсёды, старайся, не старайся — табе ня ўдасца вярнуць іх прыхільнасьці. Твае ахвярапрынашэньні сталі і яшчэ стануць маімі, а неўзабаве і астатніх

адбяру ў цябе. Што ты без 200 мільёнаў трупаў, каму ты будзеш патрэбен?

Некалькі мільёнаў ваеннапалонных — само сабою шмат, вельмі шмат, але калі гэта ахвярапрынашэньне для Вышэйшых, якія ўнізе, ці Ніжэйшых, якія наверсе (Вышэйшыя-Ніжэйшыя), дык гэта не такая ўжо значная порцыя «чырвонай расы». Для Ненаедных. Аднак калі боль аднаго пусьціць па нэрвах многіх, пакуты тысяч прапусьціць праз душы мільёнаў, а мільённыя, двух-, трохмільённыя пакуты прадэманстраваць дзясяткам мільёнаў, выпусьціць на прастору чужой агромністай краіны, каб і маці, і бацькі, і дзеці — усе пакутавалі, мучаліся разам зь імі, — тады зусім іншыя маштабы. Ніжэйшыя-Вышэйшыя атрымаюць у шмат разоў больш «чырвонай расы».

У тым і рэч, што Сталін, ужо атрымаўшы верх над кровапускальнікам-супернікам, раўніва падбіраў ацалелых «сваіх» ваеннапалонных — зграбаў усё, што засталося з адабранага ў яго. Зь якой помсьлівасьцю ацалелых даморваў у сваіх лягерах.

(Калі гэта і блюзьнерства, дык, бадай, толькі ім і можна растлумачыць самую вялікую недарэчнасьць XX стагодзьдзя — гэтую парачку, празь якую Захад і Ўсход усё ж «пабывалі разам». Каб ачнуўшыся ад «спараваньня ў нянавісьці», мы выявілі ў сябе ў руках «плод» — адну на ўсіх Бомбу, адну на ўсіх сьмерць.)

На Глушу ўся праўда пра ваеннапалонных, што ўжо даходзіла да нас праз расказы відавочцаў, чуткі, абрынулася ўсё роўна нечакана. З ранку пранеслася: у Бабруйску ў крэпасьці спалены палонныя, па шашы сюды гоняць велізарную калёну, шмат тысяч, заводзкая машына прабіралася міма, аб'яжджала трупы ледзь ня цэлую гадзіну! На кожнай вярсьце па дзесятку, па два застрэленых. Што немцы вырабляюць такое з нашымі палоннымі, ведалі, ня раз чулі, але цяпер г э т а сунулася сюды. Як бы прымеркавалі да Кастрычніцкага сьвя-

та, да бальшавіцкага — у гэтым угадваўся нейкі асобны сэнс, намёк: любіце свае дэманстрацыі, ну дык наце вам!

Да шашы памкнуліся дзясяткі глушанцаў, людзей у вясковых кажухах, хустках, усё новыя і новыя падыходзілі, падбягалі. У руках у многіх акрайцы хлеба, вараная бульба, хатні сыр — што хто прыхапіў дома. Твары спалохана-ўстрывожаныя, ужо выцьцё бабскіх галасоў чутно. Усе ўзіраюцца ў бок Бабруйску, але перад вачыма толькі зьбялелая шаша і пустата далечы, што варушыцца ад бязгучнага палёту, падзеньня сьнежных камякоў. Сьнег на шашы адразу ж растае, распырскваецца коламі. Яшчэ адна паўтаратонка а д т у л ь, не зарымліваючыся, праехала да заводзкіх варот, у тых, што сядзелі ў кузаве, былі нейкія асаблівыя твары. І тое, што ніхто зь іх ня крыкнуў, не сказаў ні слова тым, што чакалі, толькі пацьвярджала застылы выраз іх твараў: я н ы ў ж о б а ч ы л і ! — тое, што павінны былі ўбачыць мы. Выраз іх твараў дзіўным чынам перадаўся, перамясьціўся на многія жаночыя, плач, крык, як па нябожчыку, стаў грамчэй, трывожней.

Але нешта ўжо зачарнела ў сьнежнай імгле зводдаль ля мастка. З-за сьнегу вынырнулі чорныя чалавечыя фігуры, чуецца нейкі дзіўны, з шамаценьнем і ныцьцём, шэпт-крык. Рэзка (як тыя чорныя фігуры з-за сьнежнай плёнкі) прагучалі хлапкі-стрэлы, адзін, другі. Нарэшце можна разгледзець: паперадзе ідуць эсэсаўцы ў сваіх чорных плашчах, ля ног сабакі рвуцца, сьледам сунецца тая самая, з шамаценьнем-хлюпаньнем, людзкая маса, насоўваецца мутнай плямай, што ўсё разбухае. Бачна, як канваіры, што ідуць па абодва бакі ад калёны, то набягаюць на яе, узмахваючы рукамі, то адбягаюць (белыя бярозавыя палкі ў іх руках, нябачныя спачатку з-за сьнегу, мы разгледзелі пазьней). Вось адзін спыніўся і, адкінуўшы аўтамат на рэмені за сьпіну, каб не перашкаджаў, узяў у абедзьве рукі бярозавую доўбню і раз за разам апускае яе на галовы, на плечы, на рукі, што засланяюцца (а многія ўжо і не засланяюцца), людзей, якія

ідуць міма. Шэрая шынэльная маса, непраўдападобна вялізныя застыглыя вочы, аднолькава цёмныя ва ўсіх твары — рухаецца ўсё гэта, цячэ, працякае міма нас, праз нас. Хлюпаньне-шэлест у сьнежным месіве соцень, тысяч ног, босых або ў анучах. Між імі і намі — гэтыя, у смаляных, мокра зіхоткіх плашчах, зь бярозавымі, паздрадніцку белымі палкамі і аўчаркі, што ірвуцца да жывога чалавечага мяса. Ашчэраныя зяпы. Палонныя ідуць спачатку скрозь нашу немату, затым — як прарвалася — скрозь бесьперапынны бабскі крык, выцьцё. Нехта спрабуе перадаць, перакінуць тое, што прынесьлі: хлеб, вузялкі з тварагом, сала, — да нас пад частыя ўдары палак цягнуцца худыя рукі, шэрыя шынэльныя рукавы. (Колер лютага голаду, колер палону — шэры, шынэльны, гэта засталося надоўга ў нашай сьвядомасьці.) Здалося, што канваіры схапілі кагосьці з глушанцаў і зашпурнулі ў калёну палонных, бярозавыя палкі цяпер з аднолькавай лютасьцю апускаліся на галовы тых, што ішлі па шашы, і на галовы жыхароў, што напіралі ад канаваў. Высокі, асабліва прыкметны сярод тых, што ідуць, адкінутай назад галавой, пракрычаў, і яго ўсе пачулі:

— Вось, родныя, на пагібель нас!..

Колькі цягнуўся гэты паход людзей-ценяў, колькі іх прайшло перад намі, адказаць, бадай, ня мог ніхто. Яны ішлі, адыходзілі ў бок Старых Дарог, Слуцку, пакідаючы на ўзбочынах сябе — новыя і новыя трупы. І ўсё гэта не канчалася, цягнулася, перамясьціўшыся разам з намі ў нашы дамы, да вячэрніх капцілак, у паўзмрок цесных ад суседзяў пакояў.

Калі я прыбег да шашы і ўбачыў, што ў руках у многіх глушанцаў прадукты, харч, я кінуўся назад да свайго дому, але мама ўжо несла нешта ў глыбокай талерцы (клінок сыру, вараную бульбу), а Жэня валачыў некалькі буханак чорнага і шэрага хлеба (акурат учора Эдзік Віткоўскі прывёз з гораду мяшок хлеба — тыднёвы паёк глушанскай мэдыцыне). Цікава, што мама не забылася талерку, хаця гэта было дзікавата па акаліч-

насьцях. (Як дзікаватым здалося, калі ў 1946-м яна паклікала абедаць немцаў-ваеннапалонных, якіх яе сын прывёў з Глушанскага лягеру рабіць для аптэкі склеп, і паклала перад кожным мэльхіёравы прыбор — лыжку, відэлец, нож — ну зусім як да вайны, калі ў нас зьбіраліся госьці.) Калі ўсё пачалося, людзі пабеглі, пачалі крычаць, імкнучыся перадаць, перакінуць палонным тое, што прынесьлі, я ўбачыў, як Жэня шпурнуў проста ў сярэдзіну калёны хлеб, і там замільгалі рукі над галовамі. Я кінуўся туды, дзе з жанчынамі стаяла зьбялелая мама са сваёй не да месца талеркай, схапіў сыр, што заставаўся (мяккі, рыхлы, крышыўся ў руках) і паспрабаваў нейк наблізіцца да тых, што ішлі, ловячы момант, калі паміж імі і мной ня будзе хоць бы аўчаркі. Але, калі ірвануўся наперад, на мяне наляцеў велічэзны, цяжэразны канваір і стаў лупцаваць па мне ўсім адразу: аўтаматам, палкай, каленкай, ботам і нічым не трапляючы — ад лішку гневу і абурэньня. Але выбіў з рук сыр, і ён упаў мэтры за два ад ног ідучых. Адскочыўшы да канавы, я прызямліўся на міг на адразу прамоклыя калені, ледзь не скаціўся ў сьнежную жыжу, што запоўніла канаву. Сыр мой, які разваліўся на кавалкі, ляжаў перад вачыма палонных, што ішлі міма, нехта яго заўважаў, рабіў міжволі крок, рух да яго, і тут жа на іх падалі лютыя ўдары, удары, а адзін палонны, які нечакана вёртка ўхіліўся ад замаху немца, кінуўся, не, нырнуў туды, дзе ляжаў гэты няшчасны сыр. Упаў на яго і рукамі, доўгімі пальцамі стаў запіхваць кавалкі ў рот, не зьвяртаючы ўвагі на боты, што білі яго, таўклі яго з двух бакоў. Канваір, адступіўшы ўбок і адкінуўшыся ўсім целам назад, раптам ударыў з аўтамата ў чалавека. Страчыў і страчыў у нерухомага палоннага, які ляжаў над сырам, п а д к і н у т ы м  м н о ю .

— Кажуць, гэта фіны былі?..

Нявінна-запытальна, а мне здалося, што ілжывапрыкідваючыся, загучаў голас Віткоўскай. Яна, як звычайна, усё гойдаецца сваім маленькім целам над улас-

нымі каленьмі. Як тады, пасьля арышту мужа. Падае, кладзецца грудзьмі на свае каленкі — быццам заведзеная.

— Пакіньце вы, якія там фіны!

Віткоўская ўлавіла нязвыкла рэзкі тон мамінага голасу, так яна зь Віткоўскай ніколі не размаўляла.

— Чаго ад ворагаў чакаць, — загаласіла жанчына, — ад чужых, калі свае вунь што зь людзьмі вычваралі?..

У той вечар мама была сама не свая. Нешта адбывалася ў ёй, мабыць, многае вырашалася на будучае. Ня ведаю, што яна бачыла за тым, што працягвалася, праходзіла, не канчаючыся, — у нас ва ўсіх перад вачыма. Сваіх бацькоў, сястрычак, у далёкую высылку гнаных. Ці ў такой вось працэсіі паўтрупаў — нашага бацьку, чуткі былі, што бачылі і яго ў палоне. (Нават, што павесілі яго ў Магілёве за тое, што атруціў нямецкіх афіцэраў. Мама хадзіла ў Дойнічава да чалавека, які нібыта бачыў гэта, ажно нічога такога ён ня бачыў і не расказваў.)

Чаго напэўна ня ведала наша мама, дык гэта таго, што ёй давядзецца расшукваць Жэню ўжо ў нашых лягерах ваеннапалонных, вызваленых зь нямецкіх лягераў.

Упэўнены ў адным: з гэтага дня, з гэтага вечара яна за нас баяцца стала яшчэ больш, але па-іншаму ўжо. Нешта ўвайшло ў яе, зьявілася — што мацней і ўладней нават за боязь, страх за сям'ю.

Я ж менавіта ў гэты дзень, 7 лістапада 1941 году, бег, ня думаючы, куды бягу, праз свой агарод да будынку школы, трымаючы ў руцэ бязважкі крыжык, якім мама хацела вярнуць нас да Бога, і ня першы на зямлі папракаў кагосьці Там: раз Ты такі, тады нічога ад Цябе ня трэба! А калі шпурнуў ад сябе крыжык, не адчуўшы ніякага вызваленьня рукі ад цяжару, мабыць, зразумеў: віну сваю не адкінуў, яе не адкінеш, будзеш заўсёды насіць у сабе. Гэта ж з-за мяне забілі чалавека!

Тое, што мама, як тады казалі, «зьвязаная» з акружэнцамі, а пазьней — з партызанамі, мы з братам пра гэта ведалі. І што ёй там, у вёсках ці ў лесе (хадзіла туды нібыта мяняць рэчы на прадукты), даюць грошы, мёд, сала, а яна ўсё гэта возіць у Бабруйск, каб абмяняць на аптэчным складзе на «перавязачныя матэрыялы», на каштоўны стрэптацыд. Ад нас ня ўтойвала гэтага з самага пачатку, зь лета 41-га. Мабыць, разумеючы: калі што, расплочвацца ўсім, а таму сама, можа, таго не ўсьведамляючы, шукала і атрымлівала ад нас згоду. Вядома, самую бурную і радасную згоду. Але наўрад ці гэта яе супакойвала ці суцяшала. «Нічога вы не разумееце, вам усё гэта гульня!» — такая была рэакцыя на наш энтузіязм.

І ў Глушы немцы зрабілі лягер для ваеннапалонных. Адразу за пасёлкам, насупраць электрастанцыі і лазьні. Лягер, агароджаны двума радамі калючага дроту, прыкметна пашыраецца ў раўназначныя два бакі: акуратныя збудаваньні для нямецкай і «дабравольчай» аховы і равы-магілы ззаду за скляпамі-зямлянкамі каля лесу. Палонных ганялі рамантаваць асфальтку, нарыхтоўваць лес, расчышчаючы ўздоўж дарогі «паласу бясьпекі», звыклым для Глушы рабіўся колер палону — нашы шынялі ў іржавых прапалінах, з абгарэлым крысом. Нацягнутыя на вушы пілёткі. У лягеры было шмат коней, але цяжэразныя бочкі з каменна-ледзяной вадой вазілі на людзях: учапіўшыся ў аглоблі, у градкі, штурхаючы павозку, валаклі абмерзлыя бочкі, а ледзяная вада, выплёскваючыся, аблівала іх з плеч да ног, ды яшчэ канваір падбягаў і біў прыкладам за тое, што рыўкамі цягнуць. Білі немцы, білі «дабравольцы», самі з учарашніх палонных.

І раптам нешта адбылося — ня ў Глушы, а дзесьці, — палонных як білі на кожным кроку, так і працягвалі біць, па-ранейшаму марылі голадам, штодня трупы закопвалі каля лесу, але чамусьці сталі прыводзіць у мэдпункт і аптэку — лячыць. Нібыта быў нейкі пратэст Молатава, заява саюзьнікаў, Чырвонага Крыжа — і вось

вынік. Па аўторках чалавек 50—60 прыганялі да будынка аптэкі, дзе ў задніх двух пакоях Эдзік Віткоўскі разьмясьціў глушанскі мэдпункт, па некалькі палонных спачатку запускалі да яго праз заднія сенцы, затым з рэцэптамі яны ішлі ў аптэку праз парадную зашклёную вэрандачку. Усё ў строгім парадку, хаця для зьнясіленых гэтых людзей ад хваробы патрэбны быў галоўны рэцэпт і асноўныя лекі — ежа. Мама з сваімі памочніцамі — худзенькай ціхоняю Франяй і вясёлай таўстушкай Нінай, — калі першы раз нечакана прывялі галодных людзей, з ног зьбіліся, зьбіраючы ў «матэрыяльнай» і на кухні ўсё, што можна зьесьці, чым можна падтрымаць сілы чалавека: глюкозу, нейкія свае запасы ежы. Да наступнага аўторка ў аптэцы было ўжо больш патрэбных «лекаў». Мы зацягнулі туды ўсё, што маглі ўзяць у сябе дома: сыр, малако, хлеб. Спэцыяльна мама і бабуля наварылі бульбы, кашы. І маміны памочніцы нешта прынесьлі. Але само так атрымалася, што да аўторка ў аптэку глушанцы, а то і вяскоўцы, пачалі зносіць што ў каго мелася, справа набыла зусім іншы размах. Немцы-канваіры самі ў аптэку не заходзілі, старонячыся брудна-вашывых шэрых шынялёў, прагульваліся ў двары, уздоўж шашы, ля вокнаў мэдпункту. Набівалася, зьбіралася перад шкляной аптэчнай стойкай па 20—30 чалавек, галодныя людзі стараліся, як маглі, навесьці нейкі парадак, устанавіць чарговасьць — каму атрымаць і каб тут жа зьядаць, не выносячы на вуліцу. Галодным вар'яцтвам запаленыя ці мёртва пакорлівыя вялізныя вочы, зубы, якія выпіралі ўперад, і гэтыя па-бабску недарэчныя, нацягнутыя, здавалася, ужо не на галаву, а на чэрап, пілёткі — так балюча было іх бачыць, на іх глядзець. Шкляная стойка хадуном хадзіла, усе адзін аднаго ўгаворвалі не напіраць, і ўсе міжволі прарываліся наперад. Жанчыны з асьцярогай пазіралі на вокны. І аднойчы адбылося тое, што не магло рана ці позна не адбыцца. Нехта з палонных у рукаве вынес акраец хлеба, не ўтрываў і адкусіў на вачах у канваіра. Той кінуўся

да яго, выхапіў хлеб і, падняўшы яго, трымаючы высока, як доказ, кінуўся ўсярэдзіну аптэкі. Жанчыны ўсё гэта бачылі ў вакно, і, пакуль ён прабіваўся праз зьбіты натоўп палонных, мы пасьпелі вынесьці на кухню кошыкі, сумкі. Мы з братам уцяклі ў мэдпункт да Эдзіка і там затаіліся, а мама і яе памочніцы (потым яны весела апавядалі) паглыбіліся ў звыклую працу: старанна заварочвалі нейкія парашкі, адлічвалі кроплі. Канваір засьпеў іх за гэтым заняткам. Ад такога нахабства анямеў, закрычаў на маму, тыцкаючы кавалкам хлеба ледзь ня ў твар, а затым пхнуў аўтаматам па вяртушцы так, што бутэлечкі пасыпаліся.

Палонных тут жа выштурхнулі з аптэкі, павялі ў лягер. А маму празь нейкі час выклікалі ў павет. Бургамістар Ельніцкі, «таксама з кулакоў», сарамаціў, дакараў «мадам Адамовіч» за такія з выклікам паводзіны. І хто б, а то — «разумная і культурная жанчына». (У чалавека свае ўяўленьні былі пра гэта.) У канцы папярэдзіў, перадаў тое, што нямецкі камэндант сказаў перакладчыку, фольксдойчу Бартэлю, а той — бургамістру: яшчэ такое паўторыцца — і ня будзе ні аптэкі, ні аптэкара!

Калі праз два тыдні (адзін прапусьцілі) зноў прывялі палонных на лячэньне, увесь склеп быў набіты прадуктамі. Людзі несьлі, угаворвалі, прасілі: «Вы ўжо як-небудзь, Ганна Мітрафанаўна». Мама толькі забараніла нам з Жэнем напрасткі ў гэтым удзельнічаць (нашы пратэсты толькі раззлавалі яе), і ўсё працягвалася. Бачачы гэта, устрывожаны фэльчар Эдзік Віткоўскі перамясьціўся з сваім мэдпунктам у памяшканьне былога радыёвузла. Заг. аптэкі прыняла гэта як належнае, так было нават зручней, вызваляліся два пакоі пад склад прадуктаў.

Невядома, чым бы ўсё скончылася — дзясяткі ж людзей ведалі, удзельнічалі ў гэтым, — але неўзабаве перасталі прыганяць палонных. Мабыць, сышло на нішто дзеяньне «ноты Молатава».

У мяне былі свае справы з палоннымі. Некалькі чалавек прыводзілі пампаваць ваду ў камэндатуру, а я да гэтай, калісьці бальнічнай, помпы, езьдзіў з бочачкай на тачцы ці з санкамі, мне чамусьці не забаранялі браць ваду. Заходзіў у будку, Пятро (чарнавокага, падобнага на цыгана палоннага так звалі) тут жа закручваў ваду для камэндатуры і адкручваў мне, каб пайшла ў навешанае знадворку на трубу маё вядро. Паліцай сумаваў на вуліцы, і я хуценька апустошваў свае кішэні ў кішэні шынялёў. Асабліва радаваліся тытуню: пры кураве ня так есьці хочацца. Заадно паведамляў навіны. Помню, як засьпяшаўся зь весткай, вялікай радасьцю: немцаў папёрлі ад Масквы, хутка нашы будуць тут і для вас таксама ўсё скончыцца.

Чамусьці маўчалі палонныя, а Пятро нарэшце сказаў, але як бы просячы, патрабуючы яго абвергнуць:

— Кажуць, нашы не даруюць за палон?

І я, вядома, не згаджаюся, абвяргаю, няпраўда, хлусьня нямецкая! Каму будзе сапраўды блага — вось гэтым! — і паказваю вачыма на паліцая. І палонныя радасна згаджаюцца, але ў вачах туга застаецца. Яны не маглі тады выразіць, а я нават падумаць: тыя двое, якія н а м і  в а ю ю ц ь  і  н а м і  х а р ч у ю ц ц а — адзін у Маскве, другі ў Бэрліне — яны, калі каго ўзялі ці аддалі ў палон, дажаруць, абгрызуць да касьцей.

...У тэлевізары паказалі, у газэтах зьявіліся фатаграфіі: асколкі чэрапа Адольфа Гітлера зь дзіркай ад кулі.

У 1945-м крамлёўскаму пераможцу, магчыма, прад'яўлялі доказы таго, што знойдзены ў двары Імпэрскай канцылярыі абгарэлы труп — у адной яме з рэшткамі Евы і сабакі — Адольф Гітлер.

І тут жа з усёй стараннасьцю некалькі службаў МУС, ГРУ навыперадкі ўзяліся высьвятляць, к у д ы  з ь н і к  Г і т л е р? Без канца дапытваліся з гэтай нагоды камэрдынэр фюрэра Гейнц Лінге, ад'ютант Ота

Гюньшэ, шэф-пілёт Ганс Баўр, нейкія аўстрыйскія цёткі фюрэра дапетрыць не маглі, чаго ад іх хочуць маскоўскія пераможцы: каб зманілі, што Адольф Гітлер жывы і недзе хаваецца? Навошта гэта ім, што за гэтым тоіцца? Але і генэралы вышуку Круглоў, Сяроў, Абакумаў таксама ня ведалі, чаго чакае, а галоўнае, хоча Правадыр, а таму шукалі, шукалі даўно адшуканае. Каб адно не спыняцца, каб не разгневаўся Гаспадар. Паддопытным здавалася, што ў Маскве дух ці душу фюрэра ня хочуць адпускаць, спрабуюць насьцігнуць і вярнуць. Затое генэралам «органаў» і разьведслужбаў пачало здавацца: Сталін жадае — а хто пасьмее яму ў нечым пярэчыць, ня выканаць нават ня выказанае адкрыта яго жаданьне? — чакае і патрабуе ж ы в о г а  Г і т л е р а. Добра яшчэ, што не жывога Нэрона ці Чынгісхана.

Хаця зразумець яго можна (рашаліся думаць некаторыя зь іх): адразу страціць такога ворага — усё роўна, што найблізкага сябра страціць! А тут яшчэ Рузвэльт памёр! Чэрчыль сышоў з арэны. Ня з Трумэнам жа ці Этлі мець справу Сталіну. Затужыш і па Гітлеру. Калі далажылі, што скончыў з сабой, вымавіў, магчыма, загадзя падрыхтаванае: «Даіграўся, падлюга!»

А магчыма, і не загадзя — шчыра вырвалася. Колькі можна было б цікавага высьветліць у Гітлера — таго, што нікому невядома. А што сказана, абгаворана магло быць сам-насам — пра што не пагаворыш з Молатавым ці зь Берыем. Колькі агульных успамінаў, хаця ніколі адзін з адным не сустракаліся, не гаманілі. Вось менавіта — ніколі. Тым больш...

Сьляды «зьніклага» Гітлера ўсё яшчэ шукалі ў Бэрліне, у Гішпаніі, у Аргентыне, у той самы час, калі ён сядзеў за Крамлёўскай сьцяной у невялікім зацемненым пакоі побач з кабінэтам Сталіна, яны ўдвух сядзелі за сталом, але размова, дзеля якой Сталін усё гэта і задумаў, ня ладзілася. Госьць панічна баяўся, што назаўтра раніцой яго адсюль забяруць, ня вернуць у камэру на Лубян-

цы, а пасадзяць у клетку і павязуць па Расеі. Як дзікага зьвера — на пацеху натоўпу.

Але ўсё адладзілася. Прывялі яго зноў, а гаспадара кабінэта не пазнаць. Зьняў мундзір генэралісімуса, якім асабліва бянтэжыў спачатку: быццам выклікалі да фэльдмаршала яфрэйтара. (Столькі раней яфрэйтарствам калолі вочы, што не магло цяпер ня ўсплыць у сьвядомасьці.) Гаспадар Крамля быў у сьціплым паўваенным фрэнчы і ў грубых салдацкіх ботах. Усьміхаўся ў пышныя, як у Ніцшэ, вусы; вочы — ветлівыя, цёплыя. Ані сьледу ранейшай пахмурнай пагрозы, што ўчора таілася асабліва ў жорсткіх, як луска, зморшчаках вакол жоўтых вачэй.

Сустрэў ля парога, як госьця, правёў да стала, звычайнага канцылярскага стала, але накрытага на гэткую халасьцяцкую ці дзелавую вячэру. Два прыборы, лёгкая закусь і шмат зеляніны, салатаў, збоку дзьве сьціплыя бутэлькі віна, ніякай рускай гарэлкі. Затое многа-многа мінэральнай вады. Здагадаўся, ведае, што фюрэр любіць мінэральную? Ці густы супадаюць? Усё вымушала прыгадаць выраз: па-ўсходняму гасьцінны (гаспадар). А маглі ж і раней сустрэцца, маглі.

Ужо праз некалькі дзён (начэй) стол з падкрэсьлена вэгетарыянскага ператварыўся ў грунтоўна-мясны, госьць ахвотна аддаваў належнае чырвонаму віну і добраму кавалку падсмажанай сьвініны. П'янеў імгненна, але гаспадара не абдурыш: у яго быў ужо вопыт адносін са слабакамі, накшталт Кліма Варашылава, што разыгрывалі адключку задоўга да сапраўднай, і быў спосаб праверыць чалавека: гатоў, сасьпеў для шчырай гаворкі ці толькі прыкідваецца, блазнуючы, як які-небудзь Мікіта Хрушчоў. Спосаб просты: прымусь глядзець сабе ў вочы і раптам ашаламі пытаньнем. Напрыклад, ты ангельскі шпіён ці амэрыканскі? пра што ўчора гаманілі, калі выйшлі з машыны?..

З Гітлерам іншае пытаньнейка спрацуе, безадказна: дык, кажаш, баяўся, што ў клетцы па Расеі павязуць?

Цікавая ідэя, трэба абмазгаваць, як кажуць мае сакратары райкомаў. Але перш пагамонім душэўна. Ужо ж мы можам не дурыць адзін аднаго!

Дзіўна, але яны цудоўна абыходзіліся безь перакладчыка. А калі б прысутнічаў хто-небудзь трэці, нямала цікавага пачуў бы, даведаўся. З таго, што ў час пакутлівых бяссоньніц чарадой праходзіла перад вачыма ў гэтых сьценах ці на «бліжняй» дачы. Усё жыцьцё чалавека — суцэльны маналёг, размова з самім сабой, за сябе і яшчэ за каго-небудзь, хто зьявіўся і тырчыць перад табой, не ідзе прэч.

Госьць, асьмялелы, разьняволены віном, рабіўся нават балбатлівым. Перабіваў, аспрэчваў гаспадара, а той толькі паблажліва пасьміхаўся і падліваў упадабанае каўкаскае віно ў фужэры. Але ў нейкі момант госьць лавіў на сабе нерухомы жоўты позірк Яшчара і імгненна цьверазеў. Пасьпешліва вяртаўся да тэмы, гаворкі, якая, ён заўважыў, уціхамірвала гаспадара. Бясконцая гаворка пра тое, як ён, фюрэр, не ўлічыў скіфскую прыроду і стратэгію рускіх, а дакладней, Сталіна стратэгію і тактыку — заманьваць, заклікаць ворага ў глыбіню сваёй тэрыторыі, бліжэй да сьцен уласнага дому: рускія перакананыя, што дома і сьцены ім памагаюць. На Захадзе іншыя ўяўленьні і перавагі. Шмат, шмат сюрпрызаў вы нам паднесьлі! І пад Масквой, і пад Сталінградам, дый пасьля. Госьць, паступова захапляючыся, накідваўся на сваіх генэралаў, тупых і саманадзейных бездараў, што ня цямяць, што інтуіцыя правадыра (фюрэра) стакроць каштоўней, чымся іх падручнікі, знакамітыя «спэцыяльныя» веды і правілы вядзеньня вайны. Гаспадару тэма гэтая таксама была да душы. Вусы правадыра пачыналі міжволі распушвацца, ён наліваў віно, падсоўваў закуску.

— Адольф?.. Гэта тое ж, што Вольф, воўк? Так, здаецца, у старажытных германцаў чыталася "Адольф"?

— Так, гэта так, таварыш Сталін. Але я дзіўлюся вашай эрудыцыі.

— Тое-сёе і мы ведаем, вывучалі. Нават нямецкую мову, у вольны ад рэвалюцыйных справаў час. Дарэчы, нам лёгка было разгадаць, хто хаваецца ва ўсіх гэтых "логавах": Вольфшанцах і іншае. Вельмі неасьцярожна, вельмі. Я разумею: малады рух, рамантыка. Але мы гэтае не скарысталі. Хоць і маглі. Ацані хоць ты зараз, Адольф.

— А хто нас пасварыў? Сусьветнае габрэйства.

— Упусьціў ты свой шанец. Давялося мне аднаму.

Прызнаюся, нялёгка ўявіць сабе гэтую парачку, іх гаворкі. Для мяне — куды лягчэй і больш звыкла: сустрэчу былога паліцая з тым, хто яго калісьці падстрэліў, падкараціў яму адну нагу. Была, здарылася такая сустрэча ў вясковай лазьні недзе ў 59-м, у 60-м. Паліцай, «атрымаўшы сваё», вярнуўся ў родны край, і нічога, нават з пэнсіяй, шахцёрскай, варкуцінскай, а гэта разоў у 5-10 вышэй, чым ва ўчарашніх партызан, а цяпер — калгасьнікаў. Так што ў яго ўзьнікла дадатковая прычына пабойвацца помсты. Што рабаваў аднасяльчан і суседзяў, паляваў на партызан разам зь немцамі — за гэта адседзеў, дый забываецца, як выяўляецца, усё, калі жытка прыцісьне. А пасьля вайны ўсіх прыціснула — партызан ты, не партызан. Але вось пэнсію землячкі не даруюць — гэта ён ведаў.

Жыў зь вечнай аглядкай, боязьзю. А тут такая сустрэча ў лазьні. Дакладней, ужо ў прылазьніку, калі выйшлі, распараныя, улагоджаныя, апранацца.

— Глянь, гэта ён! Як цябе там клічуць?

— А гэта вы, таварыш Татур? І я вас прызнаў.

— Яшчэ б! Ну, як жывеш? Выпусьцілі?

— Дакумант маю. Ад званка да званка. Жыву, пакуль жывецца. Во, бачыце!

І запрасіў зьвярнуць увагу на яго нагу: во, карацей, крывая, ня гнецца, падла!

— Пасьля бою Зубарэвічаўскага, помніце? Здорава вы нас там. Ваша работа, таварыш Татур. Твая, Пятро!

Зрабіў і яшчэ рух, быццам прытанцоўваючы. З

такім выразам на твары, зь якім задаволены заказчык, сустрэўшы, дзякуе майстру-шаўцу за добры абутак, — маўляў, штодня ўспамінаю добрым словам!

— Улёг ты за мной тады, Пятро, ну, думаю, канцы мне!

— А дзе ты там схаваўся? Мы шукалі, шукалі: як скрозь зямлю праваліўся.

— А там была сабачая будка. Застрэлены сабака ляжаў. Яго кроў мяне і ўратавала. Маю не заўважылі.

— Дык ты ў будцы хаваўся? Я бачыў таго сабаку.

— Куды заўгодна палезеш, калі прыжучаць. Здарава вы нас тады, нічога ня скажаш!

... Госьць перабіраў самыя памятныя ім абодвум крытычныя сытуацыі, але ў яго асьвятленьні яны дэманстравалі перавагу Ўсходу над Захадам. З французамі, скандынавамі, з ангельцамі такое ў Гітлера праходзіла ўдала, з посьпехам, а тут — як ні біўся, ні стараўся — адчуваў, што ў яго зусім іншы праціўнік. І як здорава Сталін засьцярогся ад шпіёнаў. Ужо ж жучыў Гітлер, жучыў сваіх Гелена, Канарыса: чаму не папярэдзілі, што ў рускіх, як выявілася, танкаў больш, чым у Германіі, а самалётабудаўніцтва зь вялізным запасам магчымасьцяў? Спэцыяльныя падразьдзяленьні змушаны былі стварыць для ачысткі аўтамагістраляў ад рускай тэхнікі. (Гэта прагучала двухсэнсоўна — як напамін аб страшным разгроме ўсёй успомненай тэхнікі. Давялося тут жа зьмяніць тэму.)

Некалькі начэй запар — толькі пра гэта, пра тое, як з Бэрліну бачылася, ацэньвалася. Але часта заўважаў, што яго ўжо ня слухаюць, гаспадар пра нешта задумваецца, зноў незадаволена хмурнее, ці не прыкідвае ён: а ці патрэбен, ці не адправіць суразмоўніка куды-небудзь н а з у с і м. Раптам спытаў:

— Вам што-небудзь перадавалі балгары — увосені 41-га, калі вы свой «Тайфун» на Маскву запусьцілі? Пра што была размова?

Гітлер помніў пра што: Сталін прапаноўваў «новы Брэсцкі мір», усё, усё аддаваў, што на захад ад Масквы, — абы пакінулі яго самога ў Крамлі. Абяцаў рэсурсы Расеі паставіць на службу Нямеччыне, для вайны з заходнімі дэмакратамі-плютакратамі.

Не, прызнацца Гітлеру, што ён ведае, што помніць пра такое, — значыць, падпісаць сабе сьмяротны прысуд. Даразмаўляесься, даўспамінаесься, што гэты ўсходні сатрап замкне цябе ў клетку і загадае вазіць па ўсёй сваёй імпэрыі. Глядзі, што і ў Бэрліне будуць паказваць...

Госьць сыграў поўнае выпадзеньне памяці: не было аніякай балгарскай размовы, не абмяркоўвалася нават!

Дзіўна толькі, што пра сваіх ваеначальнікаў, Тухачэўскага і іншых, каго ён абвінаваціў у змове зь нямецкім генштабам, Сталін не распытваў. Не цікавіўся гэтым. Затое проста-такі ўкручваўся ў мазгі: успомні і раскажы, ці выходзіла нямецкая разьведка ці хаця б прыватныя асобы на Жукава, на іншых яго генэралаў — з чым, калі, наколькі ўдала?

Падобна, што Сталіну ўжо і гэтыя намазолілі вочы, бярэцца за іх. Ну, што ж, ягоная справа. Нічога пэўнага яму не сказаў, але і не адмаўляў, што магло такое быць на ўзроўні зацікаўленых службаў. І нават нібыта былі размовы, што рускія ваенныя хацелі б скончыць вайну бяз Сталіна (зрэшты, як і нямецкія — бяз Гітлера), баяліся, што Сталін абыдзецца зь імі так жа, як з Троцкім, Бухарыным, Тухачэўскім, — лічыць патрэбным не дзяліцца вынікамі перамогі.

Сталін выслухаў уважліва, з тварам непранікальна-спакойным. Прапанаваў:

— А ўсё-ткі вып'ем за нашых генэралаў. Яны стараліся, як умелі. Выслухай іх і рабі ўсё наадварот. Вельмі памагала.

Гітлеру вельмі хацелася даведацца, усё прыкідваў, як падступіцца да размовы пра галоўнае — пра Вышэйшых: ці аб'яўляліся яны Сталіну і як, зь якімі загадамі-

прапановамі? Хацелася супаставіць даты, часавыя моманты: да каго зь іх прыходзілі раней і з чым, як Яны выбіралі паміж двума? Калі рабілі стаўку на ўсходняга і калі адступаліся — на карысьць заходняга. А потым зноў зьвялі Вочы на Сталіну. Цяпер пра гэта можна пагаманіць без раўнівай злосьці і зайздрасьці. Нейкім чынам прачытаў думкі і тут жа спытаў:

— Гэта хто вам падказаў: ня скончыўшы справу з англасаксамі, кінуцца і на ўсход? Мабыць, нехта больш аўтарытэтны за ўсіх Бісмаркаў, хто ж я н ы?

«Яны» — вымавіў з націскам, але па яго схопленых іржою вачах не прачытаеш: каго мае на ўвазе.

— Што, фінская кампанія ўвяла ў зман: волат на гліняных нагах?

— Прызнаюся: так, і фінская. Але былі і іншыя галасы. Здаецца...

— У нас, атэістаў, у такіх выпадках раяць: калі нешта «здаецца» — перахрысьціся.

Пазьбягае прамой размовы пра іх. Мабыць, лічыць іх выключна сваёй таямніцай?

А аднойчы загаварыў напрамую вось пра што:

— Дурань ты, Адольф, я табе скажу! Ды мы напару, разам, ведаеш як апрацавалі б усіх гэтых чэрчыляўрузвэльтаў. І сьпераду, і ззаду. Што табе ў нашым камунізме? Ну, прыбраў бы адно слова з свайго нацыянал-сацыялізму. А трэба, дык мы б адно дадалі. Хіба ў словах справа? Сяброў сапраўдных няма, гэта праўда, але ж інтарэсы нашы супадалі? Дурань ты, дурань, Адольф!

Часта і падоўгу прастойвалі ля вялізнай, на ўсю сьцяну, карты сьвету. Моўчкі пацягваючы віно, разглядалі контуры кантынэнтаў.

— Цікава, Бог іх бачыць такімі ж, Эўропу, Амэрыку?

— Бог — ня ведаю, а вось Вышэйшыя істоты (я даўно хацеў пра гэта, Іосіф!) бачаць, як яно ёсьць насамрэч.

— А як насамрэч?

— Людзі поўзаюць унутры шара, як мухі, а нам здаецца, што па паверхні. Мае вучоныя правяралі.

— А ты ім і паверыў. Ва ўсіх вучоных мазгі, як вывернутая курыная трыбуха. Упраўляць трэба час ад часу.

Нехта з двух фужэрам або люлькай датыкаўся да якой-небудзь часткі плянэты, што, заклікаючы да сябе, ляжала перад імі. Другі сваю кропку на карце адшукваў і тыцкаў у яе. Фужэры ім ужо перашкода, адставіўшы ўбок, растапыранымі пальцамі мацалі, казыталі плянэту, узгадваючы тое, што было год ці два назад, і прыкідваючы, што і дзе адбываецца, робіцца цяпер, у дадзены момант. Пальцы, рукі іх сустракаліся на пышнацелай Францыі, на Скандынавіі, што адскочыла ўбок, як палахлівы конь, спаўзалі ўніз на потна-сьпякотны поўдзень, тыцкаліся ў залівы, поўзалі па рэках. Разгарачана разьбягаліся — госьць да адной палавіны зямнога шару, гаспадар да другой, кожны настойваў на сваім варыянце, выстогнваў сваю праввату, але затым іх рукі зьбягаліся — на Паўночнай Амэрыцы. Адзін да яе ўзьняўся ад Бразыліі, Аргентыны, другі спусьціўся праз Аляску. Кулаку балюча ад прыкрытай тонкай картай старажытнай крамлёўскай цэглы. Перабегшы да велізарнага глёбуса, пачыналі ўсё спачатку, зь яшчэ большым азартам, натхненьнем. У далонях глёбус сьлізгае атласна-круглявымі клубамі, абодва яны то замінаюць адно аднаму, а то дапамагаюць, горача і радасна лямантуюць:

— Адсюль!

— Не, адсюль!

— Тут падбрушша мяккае...

— А пра бомбу забыў? Не забывай пра бомбу. Для цябе рыхтавалі, а бедным япошкам дасталося.

— Няма ніякай атамнай бомбы. Прапагандысцкі блеф — з амэрыканскім нахабствам і размахам.

— А што табе застаецца казаць, калі ты прасраў яе? Так, ты, а хто ж! Калі б аб'ядналі сілы, нямецкая тэхніка, наша рабочая сіла. І ня толькі рабсіла. Твае ж Эйнш-

тэйны разьбегліся. А мы сваіх — габрэй, не габрэй — у надзейнае месцайка, пад замок: твары, рызыкуй!

— Ну, а дзе ваша бомба, калі так?

— Будзе. І сёе-тое яшчэ. Ці ня думаеш ты, што скажу табе як ёсьць. Наша гестапа ня дрэмле. І таварыша Сталіна па галоўцы не пагладзіць.

Калі госьць напіваўся (а гэта ўсё часьцей), ён пачынаў плакаць ад крыўды: немцы яго прадалі, забылі! Жывуць бок ля боку з амэрыканцамі, ангельцамі, гэтымі рускімі сьвіньнямі. Часам спахопліваўся, пужаўся, але Сталін яго як бы ня чуе, аднойчы толькі паправіў: «Я б сказаў: «рускія бараны».

— На немцаў скардзісься. А ты б з маім народам паспрабаваў. Ты дык хоць прайграў вайну, а тут: паў-Эўропы прысабачыў да імпэрыі расейскіх цароў — і што? Удзячнасьць хоць якая-небудзь? Толькі і ведаюць: «Сталін — гэта Ленін сёньня». А што ваш Ленін, калі б яго паслухаліся, даўно мелі б коўдру з шматкоў, а не дзяржаву. Дарэчы, як ты глядзіш на гэта: пастаяць на Маўзалеі на кастрычніцкія сьвяты? Засумаваў без парадаў?

Часам Іосіф грубавата паджартоўваў над Адольфам:

— Ну, ты і здатны жэрці! Сапраўдны Вольф! А казалі, што Гітлер — вэгетарыянец.

— Ды ну іх! Чым мы дзеля іх не ахвяравалі. Во, я нават акуляры не насіў, народу правадыр у акулярах не падабаецца. — Зьняў з носу і, прыжмурыўшыся, з асалодай паглядзеў на тоўстыя-таўшчэзныя лінзы, падарунак Сталіна. — Жывеш, як манах, усё дзеля іх. А якая ўдзячнасьць? Ня вартыя яны нас.

Часам размова аб мінулай вайне так захоплівала абодвух, што яны пачыналі сумесна нанова перайграваць галоўныя апэрацыі — як з таго, так і з другога боку. Захапіўшыся, Сталін маляваў на карце стрэлы з захаду на ўсход, хвацка закручваючы іх вакол Масквы, Куйбышава, пры гэтым прыгаворваючы: «Вось так, і тут вас дастанем, бач куды пахаваліся, зашыліся, шкуры

міністэрскія, — ня так ад немцаў, як ад Сталіна, абы быць толькі далей!»

А то пачыналі сьпяваць, разам: грузінскія і цірольскія мэлёдыі надзіва зладжана гучалі, сьпевы настройвалі на агульны смутак — і той і другі чужыя ў сваіх краінах, прышлыя, яны ўсё зрабілі, каб узьвялічыць чужы народ, але засталіся ў адзіноце. Затое яны адзін аднаго разумеюць.

— Слухай, — пацікавіўся, як заўсёды, нечакана Іосіф, — у сваёй зоне ў Нямеччыне мы гэтага не адшукалі, вы ўсе архівы на захад зацягнулі, саюзьнікам дасталіся. Вось ты мне скажы: што атрымліваў наш Ільіч грошы ад Вільгельма — гэта мне вядома, я гэта ведаю лепш, чым хто, але мяне іншае цікавіць: на якой дамоўленасьці працаваў, ці была і якая мянушка ў яго?

Адольф ужо ведае, што нельга адразу адказваць: так, ці не, трэба так выбудоўваць, выцягваць свой адказ, каб ён па ходу клаўся на патаемныя думкі Іосіфа, яго інтарэс.

Сказаць, пацьвердзіць, што Ленін — германскі агент «па штату», не шкада Гітлеру, калі гэта трэба Сталіну. Але ці гэта жадае пачуць? Як-ніяк Ленін — іх сьвятыня. А што, як раззлуецца? Пачаў няпэўна, але па яшчэ больш зацьвярдзелай лусцы зморшчын ля зусім зжоўклых вачэй сьцяміў бязь лішніх словаў, які адказ чакаецца.

— Была, была неяк гаворка, калі абмяркоўвалася пытаньне аб прапагандысцкім забесьпячэньні «пляна Барбароса». Пра Сталіна, прабач...

— Гэта я ведаю, чытаў вашыя ўлёткі: прадаўся жыдам і заходнім плютакратам.

— Ну, а пра Леніна... Называлі, прыпамінаю, і яго агентурнае імя. Калі памяць ня здраджвае: Мангол.

— Мангол? Вось дык Уладзімер Ільіч. «Чынгісхан, які прачытаў «Капітал» Маркса»... Гэта ён так выказаўся пра аднаго вядомага марксіста. Гаворым пра іншых, а што пры гэтым прагаворваемся, — не прыкмячаем. Ну,

а ты, Адольфік, прызнавайся, прайшоў такую службу? Усе не без граху.

— Паклёп габрэйскі! Рэйхсвэр нібыта плаціў яфрэйтару Адольфу Гітлеру за паслугі інфарматара. Немцы ўсяму паверацьі, гэта такі народ.

Быў момант: Адольф, раптам расчуліўшыся, папрасіў дараваць яму за тое, што «нягоднікі Гімлера» застрэлілі сына Сталіна. Бацька ў адказ доўга маўчаў, адно хадзіў ля сьцяны з пагаслай люлькай у сьціснутым кулаку. І раптам, ускінуўшы абедзьве рукі над галавой, закрычаў. Па-свойму, на грузінскай, мабыць, зрэшты, таксама зразумелай новаму яго сябру:

— Дзеці! Якія дзеці? Пры чым тут дзеці? Каму ад іх радасьць? Нікому.

І каторы раз Гітлер быў у захапленьні ад зноўку набытага сябра: сапраўды, фатальная памылка, што яны не пайшлі да канца разам. Ну ў каго яшчэ столькі агульнага?

І зноў быццам падслухаў яго думкі Сталін:

— Бачыш тое вакно? Ды ты глядзі на тую вежу! Зь яе скочыў Грышка Атрэп'еў, калі ўцякаў ад маскоўскага люду, падманутага, узбунтаванага баярскай сволаччу. Ведаеш такога? Самазванец Грышка Атрэп'еў. Дарэчы...

Крануў слабасільную, падвялую руку Адольфа сваёй, такой жа:

— Дарэчы, у яго адна рука была таксама... убогая. Знак, ці што, такі? Ня бойся, нам не давядзецца скакаць.

— У мяне і правая цяпер таксама, — паскардзіўся Гітлер, — падклалі, гады, бомбу пад стол. Усяму віною маё добрае сэрца. Не, я дрэнна вучыўся ў таварыша Сталіна.

— Ну, ня трэба прыбядняцца. Я ж не выпадкова пасылаў майго Лаўрэнція на стажыроўку да твайго Генрыха.

— Гімлер — здраднік. Шкада, што я не пасьпеў яго расстраляць сам.

— Усё трэба рабіць у час. Своечасова. Гэта ты маеш рацыю.

— Як там мае Гімлеры, ня крыўдзяць цябе на Лубянцы? А то яны ў нас жартаўнікі: адарвуць галаву і скажуць, што так і было.

— Не магу паскардзіцца. Я быццам госьць у іх. Ветлівыя, абыходлівыя.

— А ты і ёсьць госьць, — і Сталін раптам засьпяваў, тэатральна адкінуўшы ўбок руку зь люлькай: — «Ты не пле-енник, ты гость у меня!» — І паабяцаў: — Мы цябе яшчэ ў Вялікі зводзім. Як ты наконт балерын? Ці таксама вэгетарыянец? А вось мае паплечнікі — майстры па гэтай частцы.

Час ад часу у пакой, папярэдне пашкрэбшыся ў дзьверы, упаўзаў-увaходзіў лысы чалавечак без вачэй (ніводнага разу вачэй ня ўзьняў, і Гітлер іх не пабачыў), клаў на стол чырвоную папку і зьнікаў. Сталін неахвотна перабіраў лісткі, нешта падпісваў, а іншыя гняўліва перакрэсьліваў або размашыста пісаў некалькі словаў зьверху на палях. Аднойчы, пасьміхаючыся, перадаў ручку госьцю: «Ссумаваўся? Падпісвай!» — і паказаў дзе. Звыкнуўшы за гэты час нічому не зьдзіўляцца, Адольф зь нечаканым задавальненьнем прарабіў тое, па чым рука і вока сапраўды засумавалі, — паставіў подпіс. Гэты подпіс рухаў арміі, вырашаў лёсы людзей і краін.

— Няхай яны там!.. — зларадна вымавіў гаспадар кабінэта, адштурхоўваючы ад сябе папку з паперамі.

Усё часьцей з Крамля выходзілі дырэктывы, указаньні за двума подпісамі: усім вышэйшым чынам знаёмы: «Сталін» і другі, незразумелы. Тымі, хто ведаў, прачыталася лацінка: «Адольф Гітлер». Але паверыць у гэта спачатку ніхто не рашаўся. Зачыніўшыся ў кабінэтах за двайнымі дзьвярыма, сакратары абкомаў і крайкомаў узіраліся ў подпіс, як у нейкі кабалістычны знак. Ня можа быць, гэта нешта іншае! Здагадкамі не дзяліліся, ні з кім гаворак не вялі, кожны прыкідваўся, што пасьвечаны і анічога такога не прыкмячае, ня бачыць. Партыя ведае, што робіць. Задужа ўсе вучоныя былі: не забягай паперадзе бацькі! Але і ратуй Божа за-

марудзіць, спазьніцца, калі партыя разварочваецца на маршы на 180°. Тое, што было наперадзе, называлася пярэднімі рубяжамі, выкрываецца і ўжо называецца «хвасьцізмам», а «хвасьцістаў» б'юць. Колькі мідаўцаў, ды і чыстых партыйцаў не змаглі ў патрэбны момант прыкінуцца, што яны заўсёды так думалі і лічылі, калі фашысцкая Нямеччына і Гітлер з «ворага №1» раптам зрабіліся сябрамі і саюзьнікамі. Дзе яны тыя, няспрытныя? Але нельга ні на мілімэтар і наперад забегчы: а раптам разварот будзе адменены, а ты ўжо выбег з шэрагу. Назад ня вернесься, ня прымуць — правілы жорсткія.

Калі ты адданы сын партыі, верны ленінец-сталінец, ды і проста хочаш выжыць, — загадзя прымай усё, што можа паступіць, прыйсьці зьверху. Але пры гэтым будзь гатовы ад усяго ў той жа міг адрачыся, адмовіцца, калі сытуацыя зноў зьменіцца. Няма нічога, з чым ты сябе атаясамліваеш, нічога, апроч аднаго-адзінага выпадку. Затое тут: прымай усё як ёсьць, безагаворачна. Раз зыходзіць ад Яго. Нават калі вось такое: папера з росьпісам нябожчыка, і якога — Адольфа Гітлера!

Гаспадар ведае, што робіць, калі ён гэта робіць. Сьвет ня раз ахкаў уражаны. Ахкне і яшчэ раз.

Сьвет, аднак, ня ахкнуў, усё, што адбывалася, ён схільны быў утапіць у газэтнай, у радыёбалбатні на тэму пра таталітарызм (знайшлі слоўка і ўзрадаваліся). Маўляў, з аднаго кораня выраслі, адзін ствол сьсекла другая сусьветная вайна, другі на сябе ўсе сокі забраў і на яго пераляцела, перасела ўсё, што раней тулілася пад карой і ў кроне сьсечанага дрэва. Тыранічнае блюзьнерства, ня больш. Ну, а што чуткі самыя дзікія ў Маскве і па ўсёй велізарнай краіне — менавіта агромністасьць адлегласьцяў, тэрыторыяў садзейнічае іх характару і інтэнсіўнасьці. А калі яшчэ ўлічыць умовы, у якіх жывуць гэтыя людзі, і тое, як яны жывуць, — чуткі і міфы адзіны сродак зьберагчы сябе ад поўнага вар'яцтва. Вось і трызьняць наяве: Сталіна, аказваецца, даўно няма ў Крамлі, атруцілі. Ці то Троцкі атруціў, ці то нямецкія

шпіёны — пасьля таго, як дабрэйшы грузін запратэставаў супраць калектывізацыі, раскрытыкаваў пляны, намеры за кошт аграбленьня сялян рабіць машыны і танкі. З дапамогай трацкістаў немцам удалося пасадзіць у Крамлі свайго чалавека — на месца і пад выглядам Сталіна. І падабраць яму «саратнікаў» (многія зь іх таксама двайнікі). А інакш і ня вытлумачыш усё, што вычваралася ў краіне. Асабліва, калі армію абезгаловілі, а потым не дазвалялі адбіваць напад Нямеччыны, пакуль ён не набраў сілу.

Так што народ як бы і не зьдзівіўся, калі Адольф Гітлер апынуўся ў Крамлі. А дзе яму яшчэ быць? Знайшлі дурняў! Ды ён заўсёды там сядзеў.

Ну а Палітбюро? Аніякага няма Палітбюро: міжсабойчык пэдэрастаў, яны сваіх жонак збагрылі ў лягеры і наўсю забаўляюцца на дачах, старыя ванючыя казлы. Спэцыяльныя людзі адлоўліваюць на вуліцах маладзенькіх дзяўчат — яны іх, падсмажаных, зьядаюць, каб раскачагарыць свае азызлыя тушы. (Дарэчы, вось яшчэ адно тлумачэньне таму, што здарылася ў дзень сьмерці і хаўтур крамлёўскага дыктатара: чаму так кінуліся да труны яго дзясяткі тысяч, душачы адзін аднаго ў нябачаных зборышчах, — падсьвядомае імкненьне самому пабачыць, пераканацца, знайсьці пацьверджаньне ці абвяржэньне: дык ён гэта ці ня ён?!)

Хвалі чутак і страсьцей разьбіваліся аб крамлёўскую сьцяну, толькі пырскі далятаді да кабінэту-сталовай-спальні Сталіна, але на спробы спачатку яму нешта паведамляць ён так адрэагаваў, што інфармацыя амаль абарвалася. Госьць пасяліўся ў кабінэце, спаў на канапе, больш яго не непакоілі, не адводзілі і не прыводзілі.

Сталін, аднак, не забываўся пра тое, што можа адбывацца па-за Крамлём. Наадварот, вельмі нават яму падабалася ўяўляць, якая зьбянтэжанасьць царуе там, асабліва ў яго вернай партыі. Ну, а як яшчэ праверыш сілу свайго аўтарытэту, улады? Толькі так. Напрыклад: уступаем у антыкамінтэрнаўскую кааліцыю дзяржа-

ваў! — намер такі быў напярэдадні вайны. Шкада, што не атрымалася. Дурань гэты заўпарціўся, а за ім — і дучэ, і японцы. Вядома, для тых, хто не па-Сталіну дыялектыку вывучаў, гэта быў бы гром зь яснага неба. Стаўку даводзіцца ўздымаць. Аж да вось такога сюрпрызу: Гітлер у Крамлі! Каб вочы на лоб лезьлі. На наступны крок ужо і фантазіі не стае.

Аднойчы падумаў уголас:

— А ты, Адольф, добра глядзеўся б у Маўзалеі, побач зь Ільічом.

Гітлер зноў убачыў накіраваны застыглы позірк Яшчара — скамянелыя зморшчыны вакол нерухомых жоўтых вачэй! Запратэставаў:

— Ніхто мне не дазволіць.

— Таварышу Сталіну лепш ведаць, што і хто ў гэтай краіне дазволіць ці не дазволіць. А то давай паспрачаемся. На што?

— Але калі на тое пайшло, — госьць ледзь ня плакаў, — там законнае месца Сталіна. І нікога больш.

— А ён мне і пры жыцьці — во! (Сталін вяла крануў даланёю сваю зморшчакаватую шыю.) Дастаў ён мяне! Што жывы, што маўзалейны. І потым, я, можа, наогул не зьбіраюся. — Памаўчаўшы дадаў: — Паміраць.

На Кунцаўскай дачы («бліжняй») пад шум соснаў за цёмнымі вокнамі думалася пра сьмерць. Не любіў ні з кім пра гэта ўголас гаварыць, і ніхто не адважыўся б пра яе загаварыць у яго прысутнасьці, але тут парушыў свае правілы. З Гітлерам чамусьці цягнула і гэта абмеркаваць. Як спэцыяліст з спэцыялістам? Ды не, пра сьмерці, якія з многімі нулямі, што за цікавасьць гаманіць? Статыстыка. А вось пра тую, што і да цябе мае адносіны, да якой ты «прыпісаны», — паспрабуй пра яе ня думаць. Госьць, ня быў бы то немец, сыпаў цытатамі зь нейкага ангельскага аўтарышкі (нянавісьць звычайна прываражвае, так і тут — ні кроку, каб не ўспамянуць англасаксаў), у гаспадара ж апошні час немаладая памяць усё часьцей выкідвае на паверхню тое, чым насычаўся мозаг у дзіця-

чыя і сэмінарскія гады: «Сьмерцію сьмерць папраў», «Сон — брат сьмерці...» Таму і не любіў гэты стан — спаць. Сустракацца з «братам сьмерці», прытым кожную ноч. Паступова зрушыў ноч, сон да самае раніцы. А калі б мог, дык і наогул вачэй не заплюшчваў бы. Спаў бы з расплюшчанымі.

Забаўна было чуць ад Адольфа развагі пра «касьмічны век» тых, каго «Вышэйшыя Істоты» далучаюць да ліку «новых гігантаў», ці што. Гаворыць, лунае ў сваіх аблоках, а абодва ведаюць, што варта таварышу Сталіну пазваніць, і зойдуць, і возьмуць раба божага пад белыя рукі — вось і ўвесь твой век. Усе гэтыя фантазіі да месца былі ў Бэрліне, у сталіцы «тысячагадовага рэйху». А цяпер і жыцьцё, і лёс твой — у гэтых вось паплямленых узростам, старасьцю руках. Ну, а яго, Сталіна, у чыіх?

Думак — на ўсю, што засталася, ноч. Услухоўваўся ў шум лесу за драўлянымі сьценамі, прыглушаныя галасы, што ўгамоньвалі каравульную аўчарку, да неспакойнага дыханьня ў суседнім пакоі, да ўскрыкаў у сьне фюрэра разгромленай імпэрыі — дык што такое: «сьмерць Сталіна»? Як гэта можа быць і якая тады лёгіка і справядлівасьць? Навошта было агарод гарадзіць, калі ўсё гэтым скончыцца? Ва ўсіх — у Аляксандра Македонскага, у таго ж Чынгісхана — канчалася гэтым. Але хіба параўнаеш: што ў сьвеце залежала ад іх рукі і волі, а што ад таварыша Сталіна. Ня ў тым справа, каб паўсьвету пад нечай рукой (гэта было і ня раз), а каб так, што нікому не схавацца, ніводнаму сярод мільёнаў — твая воля з кожным і штохвіліны. У гэтым розьніца. Ты трымаеш (і як!) паўсьвету, а значыць, паўсьвету цябе затрымлівае на зямлі, трымаецца за цябе, не адпускае. Сьмешна, калі паплечнікі зазіраюць у вочы, але сказаць, нагадаць баяцца: ты ўжо стары — назаві пераемніка! Гэта вы можаце прыняць такую спадчыну і ўтрымацца ў кожнай душы на палавіне плянэты? Думаеце, што вам удасца гэта зрабіць, як удалося таварышу Сталіну імем Леніна? Маім

імем разьлічваеце пражыць? Як бы ня так — паміж пальцаў у вас усё высьлізьне.

Ня зь імі, аднак, начныя гамонкі ў Сталіна, таварыша Сталіна. Ёсьць у яго іншыя суразмоўнікі, апошні час — пастаянныя. Вылепіліся, выступілі з паўзабытых уражаньняў дзяцінства. З калісьці чытаных, успрынятых, а затым адрынутых са злоснай пагардай і юнацкай крыўдай на ўвесь сьвет кніг «духоўнага зьместу». З усяго наступнага, а больш за ўсё зь вечных крыўд на сваіх атэістычных настаўнікаў і паплечнікаў, якімі ён усё больш грэбаваў, узьнікла патрэба ў іншых, зусім іншых суразмоўніках і апанэнтах. Не з матэрыялістамі ж ванючымі спрачацца. У іх адзін аргумэнт: старэчая тленнасьць чалавечага цела, незваротнасьць адміраньня шэрага рэчыва. Як быццам у гэтым уся справа і да гэтага ўсё зводзіцца. Багі, урэшце, чаму неўміручыя (лічылася)? Грэцкія, рымскія. Бо за кожным было замацавана нешта вечнае: мора — Нэптун, неба — Гера, ну і гэтак далей. А калі за табой замацавана (або ты замацаваны) паўсьвету, а ня нейкая там рачулка ці гара, як за Зэўсам? Ну, добра, гэта паганскія багі, а ня тыя Адзіныя, якім сёньня пакланяюцца — сотні мільёнаў людзей кожнаму. Хрысьціянскаму, юдэйскаму, мусульманскаму. Яны таксама ня недзе там у «эмпірэях» жывуць, а ў кожным воласе на чалавечай галаве, у кожным дыханьні жывых істот. Проста пра гэта ва ўсіх галоўных кнігах сказана. Значыць, задача ў тым, каб распасьцерці сябе на ўсё, на ўсіх, каб ужо ад тваёй добрай ці гнеўнай волі залежала, ці ўпадзе волас з чалавечай галавы. І адзін ён упадзе ці разам з галавой. «Сьмерцію сьмерць папраў...» Добра Богу ад нараджэньня зьмітаваць уласную сьмерць, ведаючы пра гарантаваную неўміручасьць сваю. Ну, а калі табе яе трэба яшчэ атрымаць, зарабіць — неўміручасьць? І калі даводзіцца сьмерць адганяць ад сябе, трымаць на адлегласьці, як той сыбірак рабіў: конь ляцеў з санямі, а ён ваўкам, што даганялі яго, кідаў па аднаму барану? А была б тысяча, мільён бараноў пад рукой, хіба пашкадаваў бы?

Але дужа часта (а апошнія гады асабліва часта) падобныя лягічныя збудаваньні руйнаваліся самі сабою, усё менш давалі супакаеньня. І тады ўзьнікала патрэба ў малітве. Але гэта была асаблівая малітва.

«Калі Ты ёсьць, як лічаць многія, і калі Ты, праўда, такі апякун, як пішацца ў Бібліі, у Каране, — забяры ўсіх і ўсё назад, каго я адабраў у Цябе, забірай і жывых, і мёртвых. (Мёртвыя асабліва неадступна за намі сьледуюць, яны, выявілася, самыя «адданыя».) Калі трэба, я адыйду ад справаў, пакіну гэтую краіну, паўсьвету — каму хочаш і на каго хочаш. Я ўжо амаль зрабіў гэта, Ты ж бачыш. Ты пакінь мне самога сябе. Назаўсёды, навек. Ну, хіба Табе цяжка парушыць «законы прыроды», калі Ты сам іх прыдумаў і сьцьвердзіў? А мне не патрэбен ніхто, ні верныя, ні няверныя. Зрэшты, яны заўсёды гатовыя ў любы момант «адляпіцца» ад бога, ці нябеснага, ці зямнога — Ты гэта спазнаў раней за мяне. Я мог бы і далей з Табой супернічаць, адбіраючы, як у капіталістаў адбіраем, — краіну за краінай, народ за народам, руйнуючы Твае храмы на ўзгорках і ў душах так званых «вернікаў». Але навошта ўсё, калі няма ў мяне ф і з ы ч н а г а бясьсьмерця? І яшчэ, я зразумеў тое, што Ты, мабыць, заўсёды ведаў: калі нават усе краіны і ўсе народы, усе, якія ёсьць, людзі сыйдуцца на адной плошчы, каб славіць свайго Бога, заўсёды адшукаецца ў гэтым зборышчы нехта, хто ціхенька шле Табе праклёны. Ты зьнішчыў «серным агнём» (Ты аддаў яго амэрыканцам!) Садом і Гамору, не адшукаўшы ў горадзе ніводнага праведніка. А калі адзін вось такі гнюсны двурушнік сярод суцэльных праведнікаў — хіба не заслугоўваюць яны (усе да аднаго!) нашага агню?.. Але не, гэта проста так, наастатак кажу, мне нішто і ніхто не патрэбен, пакінь толькі мяне. Старым, хворым, адзінокім, нікому невядомым — я на ўсё згодзен. Калі хочаш, я памяняюся месцам нават зь ім, што ўсё прайграў, вартым жалю нахлебнікам — Адольфам Гітлерам...»

Краіна, парадку і беззлачыннасьці якой многія зайздросьцілі, стаміўшыся ад сваіх дэмакратыяў, зьмяняцца стала на вачах. Як бы ўпала ў ціхае шаленства: звыклая норма адыходзіла, зьмяняючыся нязвыклай ненармаванасьцю. Прыпыненыя былі расстрэлы ў цэнтры і на месцах, больш не судзілі тых, хто па-паклёпніцку абвінавачваў уладу ў расстрэлах і катаваньнях; ніхто больш не сачыў, колькі сотак зямлі пры хаце калгасьніка і ці няма лішніх; ці не будуюць недазволеныя гаражы пры дачах гараджане; не адлоўлівала больш міліцыя грамадзян, што непрапісана жывуць у гарадах; цэнзары не вышуквалі глыбокі «падтэкст» і «алюзіі», дазволеныя і недазволеныя лічбы і факты гатовых да выданьня часопісаў, кніг, запрашальных білетаў, этыкетак і бутэлечных наклеек; строгія райкомаўскія дамы не сядзелі ў пустых залях тэатраў і не «прымалі» больш новых пастановак і канцэртаў. На прывакзальных плошчах ніхто не сачыў, каб бабулькі не прадавалі кроп, пятрушку ці нейкія вырабы прыватніка; сусед не прыслухоўваўся, а пра што там суседзі гамоняць ці сьпяваюць за сьценкай або за дзьвярыма прыбіральні; у дзіцячых садках і яслях уся выхаваўчая і патрыятычная работа пушчана была на самацёк; нават вар'ятні перасталі прымаць новых кліентаў зь ліку тых, што не разумеюць і не прымаюць палітыку партыі і ўраду — сапраўды, краіна ўваходзіла ў паласу вар'яцтва, ціхага шаленства.

І адбывалася ўсё гэта таму, што адзін чалавек у велізарнай краіне раптам павёў сябе ня так, як учора ці пазаўчора. Усяго толькі адзін чалавек, але на ім усё ў гэтай дзяржаве замыкалася — як на шчыце, на пульце кіраваньня. Усё, да апошняе драбязы. Аднойчы ў гэтай краіне такое ўжо адбывалася. У першы тыдзень пасьля нападу Нямеччыны, Гітлера. «Чалавек-пульт» пацягнуў сябе на дачу (на гэтую ж, «бліжнюю»), выключыўся-адключыўся. Усе астатнія сыстэмы кіраваньня адладжаныя былі так, што маглі ўзаемадзейнічаць толькі праз яго. А таму замёрлі, заглухлі і яны. Франты рва-

ліся, камусьці ўдавалася прабіцца, выйсьці на сувязь з Крамлём — тэлефоны трызвонілі па ўсіх кабінэтах, апусьцелых. Чалавек з сумным, памятым тварам Касыгіна пераходзіў ад апарата да апарата, паднімаў трубку і без канца паўтараў адну фразу: «Таварыш Сталін у курсе».

І вось такая ж сытуацыя паўтарылася. Мэханізм дзяржаўнага кіраваньня ўсім і ўсімі быў адладжаны так, што ён або дзейнічаў на поўную катушку, або ня дзейнічаў зусім. Усё было збудавана на тым, што перад вачыма ў кожнага грамадзяніна — Калыма. Не, не далёкая, сыбірская, гаворка пра геніяльнае вынаходніцтва Правадыра: пры кожным калгасе, у кожным калектыве, поруч, рукой падаць — свая Калыма. Аступіўся — і ты ўжо там, крок ўправа, крок улева — калёна, астатнія пайшлі безь цябе, а ты — за рысай.

Але страх застацца за рысай скоўваў, як ніколі, мазгі саміх захавальнікаў і збудавальнікаў Агульнага Страху. Яны так паглыбіліся ў звышскладаную задачу — абслужыць з усёй павагай госьця Правадыра, не падвяргаючы сябе небясьпецы апынуцца заўтра пасобнікам самога Адольфа Гітлера, што ні на што іншае ўвагі ўжо не зьвярталі. І грамадзяне адразу сталі адбівацца ад рук.

Партыя — у яе ўзьніклі свае праблемы і складанасьці, якія забіралі (і паралізавалі) усю ранейшую яе энэргію. Партыя заўсёды помніла, што яна амаль цалкам замяніла сабой ранейшы склад: тыя ранейшыя не падабаліся Генсеку. Падабацца Яму і толькі Яму — гэтае калектыўнае гарэмнае пачуцьцё панавала ў партыі. Вечная гарэмная паніка: а раптам не ўлагодзім! Што тады будзе? І вось такое выпрабаваньне: Гітлерам! Нічым займацца ўжо не маглі, а толькі ўслухоўваліся: «Што, што там, за Сьцяной?»

Саветы розных узроўняў — пра іх і гаварыць ня варта, яны і ў лепшыя свае часы былі ўжо пры партыі слугой-служанкай, а тут — толькі і маглі, што сьледаваць па пятах за паняй, што ўпала ў ціхую гістэрыку. Зрэшты, не ўпускаючы пры гэтым выпадку што-небудзь

цішком зжаваць, каб не зьбянтэжыць паню самагонным духам.

(Каго яшчэ ўспомніў новы лідэр пасьляжнівеньскіх камуністаў Г. Зюганаў, калі нядаўна гаварыў пра неадменных «кітоў» дзяржаўнасьці? КГБ, Партыя, Саветы, ага, яшчэ армія! Тая, 1945-га году армія, асабліва была нязручная для развароту на 180°. Як-ніяк 4 гады ваявала з Гітлерам. Ну, але меўся ў запасе лёзунг: «Камуністы, наперад!» — было, было каму разгарнуць і армію.)

Забылі мы пра членаў Палітбюро (як усё-ткі хутка забываюцца такія рэчы). Як яны, «прынебажыхары», сябе адчувалі, калі Гаспадар ім усім даў ад варот паварот дзеля аднаго? Іх ані не зьбянтэжыў Гітлер у Крамлі. Хлопцы гэтыя да чаго толькі не прывыклі. Адзінае, што мучыла: не дапускае да сябе Коба, і яны ня маюць магчымасьці сказаць-паказаць яму: згодныя! згодныя! На ўсё, як і заўсёды, згодныя.

Непастаянны і непрадказальны ў сваіх сымпатыях-схільнасьцях «просты народ» асабліва з нагоды гэтых людзей зларадпічаў. Адставіў іх Гаспадар, турнуў, ну, і правільна зрабіў! Даўно пара! Хто яны такія, каб быць поруч зь Ім, штодня бачыць Яго, слухаць Яго, тады як астатнія гэтае шчасьце маюць толькі на сьвяты, і то здаль? А зводдаль — каго табе не падставяць! Атруцілі! Падмянілі! Абдурваюць народ!

Прыйшоў такі момант, калі Сталін ад госьця стаміўся, нават да яго за Сьцяну пранікла тое напружаньне, у якім знаходзіўся сьвет, ня кажучы ўжо пра краіну — ад падзеяў у Крамлі. Як ні дзіўна, але раптам засумаваў па сваіх апрабаваных паплечніках. І яшчэ па многаму іншаму, што ён так лёгка, легкадумна гатовы быў саступіць камусьці (няхай нават самому Богу) — гэта дзеля чаго? Дык жа не, адыдзі-адсунься!

Пакуль не прыняў канчатковага рашэньня, падумалася, што цікава было б зьвесьці іх за адным сталом — пачаставаць паплечнікаў Гітлерам. Ня кожны дзень такое пабачыш.

Пасадзіў фюрэра за сталом на тое месца, дзе звычайна сядзеў сам: праверыць паплечнікаў на «паўлаўскі рэфлекс». Цырульнік спарадкаваў звыклую валасатасьць Адольфа, не пазнаць немагчыма. Праўда, азыз, раздаўся ў шчоках ад начных застольляў, другое падбародзьдзе зьявілася — як бы за Берыю не прынялі. «Гітлер і Берыя ходзяць у адны дзьверы...» Пра Сталіна распавядалі, цяпер можна і пра Гітлера — нічога больш дасьціпнага гэты народ не прыдумае.

Бясхітрасныя кабеты, дачная абслуга, пазналі адразу, ня ўмеюць схаваць прастанароднае агіды і жаху, ну але нічога не папішаш, Адольф, яны ў мяне не палітыкі. На дачы палітыкаў не трымаю.

Зьявіліся адразу двое: Лаўрэнці і Малянкоў. «Мы з Тамарай ходзім парай...» Ужо і ня тояцца, што сьпеліся, дуэт у мяне за сьпінай. Але чамусьці разуліся: Малянкоў трымае пад пахамі свае чаравікі, Берыя боты ў руках. Ашалелі яны, ці што? Апамяталіся і кінуліся назад, да парогу. Пераглянуўся з Адольфам: ну, цяпер бачыш, з кім мне даводзілася працаваць? А ты скардзіўся на сваіх...

Вярнуліся абутыя, як нічога ня здарылася, Берыя, бліскаючы акулярамі і распухлай мордай, шуміць, гаворыць, балбоча за ўсіх, але госьця ня бачаць. Не заўважаюць, як бы і няма нікога такога ў пакоі: адзін толькі таварыш Сталін, да яго ўся ўвага. Прасьцяк Варашылаў, калі ўвайшоў, на міг зачапіўся позіркам за чалавека, што сядзіць на звыклым месцы гаспадара, па-бабску замітусіўся, учапіўся ў руку таварыша Сталіна і не адпускае, давялося стрэсьці яго: ты хаця не заплач, жалезны нарком, ня ганьбі Чырвоную армію!

Лазар Майсеевіч малайцом, нічога ня скажаш! Патрымаўшы руку гаспадара ў абедзьвюх далонях і як бы набраўшыся ад яго энэргіі, упэўненасьці, што ўсё ідзе, як трэба, павітаўся з астатнімі, працягнуў руку і госьцю, не зьміргнуўшы вокам. Фюрэр прыўстаў з крэсла, вітаючыся з крамлёўскім габрэем, абарадаўвася, што яго

нарэшце бачаць. Зайшоў Андрэй Андрэевіч Андрэеў, але яго самога ніхто не заўважае — пустое месца. Ён у Палітбюро безгалосы і безаблічны, як бы замест каня ў рымскім сэнаце. Так таварышу Сталіну зажадалася.

Зьявіўся Молатаў з партфэлем пад пахай — хоць ты сам перад ім уставай! Зьдзіўленьня, няўпэўненасьці — ані ў воку. Можна падумаць, учора сустракаліся і рассталіся. «Каменная задніца» — але гэта зь лексыкону Ільіча. Хаця па сутнасьці — верна. Паперкаю прыцісьне чалавека, як магільнай плітой. Ведае справу. Гэта Ільіч ня ведаў, а таму і балбатаў, язык жа без касьцей, ну, ды яму мала заставалася, можна было і дазволіць. Пра таварыша Сталіна: «Пан Картатэкін». Ім, жэнэўцам, гаварунам, няўцям, што сіла, улада ў таго, у каго картатэка.

Так, але ты, Вячаслаў, ня можаш ня ведаць, не пазнаць гэтага тыпа з варашылаўскімі вусікамі: сустракаліся ў Бэрліне, перамовы вялі. Знаёмы ж зь ім, пазнаёміўся раней за мяне. Глядзі, і Адольф цябе пазнаў, як узрадаваўся, нябога, быццам роднаму! Ды падыдзі, падбадзёр, прылашчы. Ну не, камень і ёсьць камень, звык, сволач, глядзець далёка наперад. А тут забеглі гэтыя двое: добры дзень, я ваша цётка! Як Бобчынскі і Добчынскі — у творы клясыка расейскай літаратуры Гогаля. (Гегеля? Не, менавіта Гогаля. Адзін раз памыліўся, і потым увесь час скача чахарда: Гогаль-Гегель-Гогаль). Прасьцяк Мікіта, хітрун з хітруноў Анастас, што іх зьвязвае — Хрушчова зь Мікаянам? Давядзецца нанова з усімі імі разабрацца.

А дзе Калінін, гэты дзе хаваецца, казёл капусны?

— Дзе Міхаіл Іванавіч? Без усесаюзнага старасты нейк нядобра пачынаць.

— Забыў дарогу, — хіхікнуў Берыя, з папрокам-намёкам таварышу Сталіну. Доўга, маўляў, ня клікаў. — А во, лёгкі на ўспамін.

— Сядайце, Міхаіл Іванавіч, будзеце займаць госьця, вось сюды. — Гаспадар не дазволіў старасту шмыгануць у кусты, падцягнуў і пасадзіў поруч з Гітлерам. А

потым даводзь, што не сядзеў! Але нічога, можа, яшчэ і не давядзецца.

— Знаёмцеся, хто яшчэ не знаёмы: Адольф Гітлер. Просім любіць і шанаваць.

І адразу зьніклі напружанасьць, няпэўнасьць, усе ажывіліся, заўсьміхаліся з палёгкай. Гаспадар выразна паглядзеў на Берыю.

— Думаю, варта госьця пасьвяціць у рыцары нашага стала.

Мікіта адразу ж працягнуў зводдаль свой фужэр, прапаноўваючы госьцю чокнуцца, той прыўстаў з крэсла, а яму раз — і падклалі туды вялікі памідор. Апусьціўся на сваё месца, і на твары разгубленага Адольфа Гітлера зьявіўся цягуча-зьдзіўлены выраз, які будзе ў кожнага, у любога, хто...

Берыя сфармуляваў пераажыванні госьця так:

— Захацеў перднуць, а ўсраўся!..

І адразу ўсе перашкоды, перапоны ўпалі: камунізм, нацызм, Расея, Нямеччына, — за сталом былі свае, што разумелі адзін аднаго ва ўсім. І асабліва ў гэтым. Берыя ўсё пераконваў госьця:

— Дык дапетрыў: сам сабе ня вер? Захацеў, а атрымалася што?

Пілі доўга, шмат жартавалі, гаманілі, сьмяяліся — адвялі душу за ўпушчаны час. Госьця літаральна на руках занесьлі ў суседні пакой, паклалі на атаманку. Варашылаў расшнураваў чаравікі яму, Калінін сьцягнуў штаны. Пры гэтым Берыя падміргнуў Лазару Майсеевічу:

— Глянь, ён не абразанец?

Назаўтра зайшлі нейкія людзі і разбудзілі госьця. Строгія, нешматслоўныя, такіх ён помніць па першых днях на Лубянцы. Загадалі апрануцца. У паўадчыненыя дзьверы бачыць Іосіфа, што сядзіць за сталом. Чамусьці ў фантастычным сваім мундзіры, знаёмым зь першай сустрэчы. Затрапятаўшы ад благога прадчуваньня, выкрыкнуў:

— Тут людзі прыйшлі...

— Гані іх пад такую тваю!.. — супакойліва-марудліва прарakатаў голас гаспадара, што не ўздымаў галаву ад сваіх папер. Але страшныя людзі нічога ня чуюць, адно толькі камандуюць: зьбірайся! хутчэй! І прадбачліва перакрываюць шлях у пакой, дзе гаспадар, пазіраючы туды з боязьзю.

Адтуль раптам голас:

— Ты ня помніш, якія словы сказаў ў ноч з 21 на 22 чэрвеня? Калі аддаваў апошнія распараджэньні. Ну, калі ўспомніш, скажаш мне.

Ужо выведзены з пакоя пачуў, усьлед прагучала:

— Прабач, друг дарагі, мне яшчэ трэба папрацаваць. Падзапусьціў справы таварыш Сталін. Савецкі народ мае права пакрыўдзіцца на таварыша Сталіна.

... Тонкі і крохкі на выгляд асколак чэрапа з кулявой дзіркай, сківіца з пазнанымі асабістым дантыстам Адольфа Гітлера каронкамі былі схаваныя ў кардонны карабок на той выпадак, калі Сталін запатрабуе паказаць яму. Але той, мяркуючы па ўсім, не спытаў. Паказалі нам (у тэлевізары) праз сорак гадоў пасьля сьмерці самога Сталіна.

Добра перажыць фюрэра, якое патрэбна шанцаваньне дзеля гэтага! А двух адразу, і чужога, і свайго, і тым лепш. Што ім было прыбраць раней нас, як прыбіралі многіх і многіх. Але падлай сталі ня мы, а яны. Яе, ня ведаючы, як пазбавіцца, цягаюць, цягаюць зь месца на месца. (А з душамі іх таксама так?) І сьвет зноў перакanaўся ў блаславёным дэмакратызме сьмерці. Ну, і ня будзем да яе несправядлівымі, толькі таму што самім нам хочацца жыць і жыць. Дзеля суцяшэньня сабе: мы як бы плоцім жыцьцямі, каб пазбавіцца ад іх. Хіба мала знайшлося б на нашым баку (помню гарачлівыя размовы партызан пра гэта) тых, хто ахвяраваў бы сабой, абы прыбраць фюрэра нямецкага, і адпаведна — на другім баку, тых, хто марыў цаной свайго жыцьця адправіць у пекла Сталіна? А сёньня дык ужо і «наш бок» з тугой і

непаразуменьнем пытае: ну чаму той жа Тухачэўскі ці яшчэ хто-небудзь, усё роўна ж былі асуджаныя, чаму не зрабілі гэтага?..

Так што, згаджаючыся на ўласную сьмерць, мы тым самым пацьвярджаем волю і права быць вольнымі. «Нічым ня можа валодаць чалавек, пакуль ён баіцца сьмерці (гэта П'ер Бязухаў, а па-сутнасьці — Леў Талстой). А хто не баіцца яе, таму належыць усё».

Радасьць, захапленьне 1945-га, цьмяная здагадка 1953-га, што «ўсенародны плач» па кату-забойцу свайму — гэта істэрычная рэакцыя пажыцьцёвых зэкаў, перад якімі раптам расчыніліся вароты на волю, — для нас, хто перажыў і тое і другое, пароль надзеі ўвесь у формуле: добра перажыць фюрэра! Радасьць ідыётаў? — ну што ж, ня большае, аднак, ідыёцтва, чым наша жыцьцё было (і якім зноў прыманьваюць краіну.)

Аднак пара канчаць з блюзьнерствам нябожчыка, пасьмяротнымі фантазіямі фюрэраў-правадыроў і абудзіць свой тэкст дзеля жывых...

* * *

За вайну я зрабіў не адно адкрыцьцё ў адносінах свайго ня толькі «духу», але і цела, «арганізму». Напрыклад, што можна спаць на нагах. Ісьці за кімсьці, а ўсьлед за табою хтосьці (гэта калі мы ўсю ноч атрадам ішлі рваць чыгунку), і, засынаючы на хаду, нават сны бачыць. Або: спаць ня ўсім целам (на сьнезе, на марозе), а асобнымі яго частачкамі, кавалачкамі — тымі, якія сяк-так грэюцца, калі з падціснутымі каленямі прытуляесься да сьпіны таго, хто ляжыць перад табой, а да тваё сьпіны таксама нехта прытуляецца (клаліся на сьнег шчыльна адзін да аднаго). Засынаеш на нейкія сэкунды, ня больш, і сьпіш ня ўвесь, а толькі каленкамі, жыватом, падпахамі — што крыху сагрэлася. Як бы і мозаг адпачывае толькі тымі частачкамі, клеткамі, якія адказваюць за нагрэтыя мясьціны.

Калі сон — гэта «брат сьмерці» ці рэпэтыцыя (многія пра гэта пісалі, даўно), калі думкі ідуць у гэтым напрамку, тады лермантаўскае: «не тем холодным сном могилы я б хотел навеки так уснуть», — на паўшляху да талстоўскага: «я умер — я проснулся. Да, смерть — пробуждение».

Абуджаемся ад мітусьні, зь яе абыякавасьцю ці варожасьцю на кожным кроку, імкнучыся да таго, што Талстой называе любоўю, агульны выток якой — Бог. (А раней, да абуджэньня, жылі «каленкамі», «падпахамі», нейкімі часткамі, а ня ўсёй істотай.)

Праўда, калі я перачытваў «Вайну і мір» у 1941-м, зусім іншыя старонкі раману хвалявалі: паход Напалеона на Маскву і як гэта ў яго не атрымалася. Аднойчы немцу-афіцэру пра гэта нагадаў, калі ён паказваў нам карту, як будзе ўзята Масква (дом ля самай варашаўкі, і немцы забягалі да нас пагаліцца, прывесьці сябе ў парадак). Афіцэр сярдзіта пайшоў «да сябе» (у суседні пакой), а калі сабраўся зусім адыходзіць, на разьвітаньне пастукаў па ілбе мне сагнутым пальцам і паабяцаў: «Павесім!»

Ясна, што сёньня перачытваеш талстоўскія старонкі (а менавіта гэтым зараз заняты поруч зь пісаньнем, тэлевізарам і хваробамі) іншымі вачыма. Здавалася б, вайна павінна была настройваць на думкі аб сьмерці. Што неабавязкова адбывалася. Як ні дзіўна, але думкі пра яе як бы адкладваліся на пасьля, для мірнага часу (г. зн., калі цябе, магчыма, ужо ня будзе). Занадта захоплівалі чалавека самі падзеі, у тым ліку і галоўная падзея: гульня ў кошкі-мышкі з гэтай самай сьмерцю, што пагражала ўвесь час, штохвіліны.

Глуша пасьля прыходу немцаў заставалася на тым самым месцы, і людзі ў ёй жылі ў асноўным усё тыя ж. А таму захоўваліся і вельмі адчувальнымі былі, а часам усё вызначалі ранейшыя адносіны адзін да аднаго, чалавека да чалавека, суседа да суседа — унутры ці над новымі, прынесенымі акупацыяй. Людзі і на халодных вятрах вайны як бы працягвалі жыць тымі «цёплымі» часткамі,

што грэліся чалавечай блізкасьцю кагосьці да некага, што ўстанавіліся раней. Чалавек, сям'я (хоць бы і мы, наша сям'я) павінны былі загінуць паводле новых нормаў паводзін, пакараньня, але гэтага ня здарылася, і менавіта дзякуючы таму, што дзейнічалі, спрацоўвалі не да канца разбураныя ранейшыя сувязі чалавечай блізкасьці, якія і да вайны камусьці дапамагалі выжыць, ацалець. Але ж цяпер было яшчэ больш складана: на выхаваную, назапашаную да вайны нянавісьць накладвалася новая, ваенная.

І сёньня бачу: як бургамістар Ельніцкі рыдлёўкай з размаху біў мёртвых — распранутых дагала вясковых хлопцаў, якіх прывезьлі да камэндатуры на падводах (іх, бяззбройных, паліцаі перахапілі на дарозе «ў партызаны» — так растлумачылі). Гэтыя жахлівыя тупыя ўдары рыдлёўкай па нежывых целах і ёсьць грамадзянская вайна «ўнутры» нашай Айчыннай. (Яны мне да жаху знаёмыя пачуліся на днях, калі ўбачыў-пачуў, што адбывалася на Гагарынскай плошчы ў Маскве. Асабліва, калі да машыны, што раздушыла Ўладзімера Талакнеева, кінуліся, як зь пікамі, тыя, з чырвонымі сьцягамі, каб перашкодзіць, ня даць адагнаць, адцягнуць машыну, вызваліць раздушанага. Твары, якія гэта былі твары! Зусім як у таго, што рыдлёўкай біў мёртвых.)

У першым сваім рамане я «рэканструяваў» нашу вайну пад стрэхамі з усімі падрабязнасьцямі яшчэ сьвежых успамінаў. З адушаўленьнем таго, хто выжыў, я к б ы ж ы в е п а с ь л я с ь м е р ц і. Сьвежыя былі і страсьці, пачуцьці, у тым ліку сталай няпрыязі ці адкрытай нянавісьці да ворага (ці тых, каго ворагамі лічылі). Многія пачуцьці сёньня ці прытупіліся, ці адступілі, а то і перамяніліся. Многія рэчы ўжо нецікавыя, затое інтарэс набываюць зусім іншыя бакі даўніх падзеяў і паводзіны людзей, у тым ліку і самых блізкіх.

У гэтым шэрагу той факт, што ў вельмі нават актыўнага падпольшчыка не заўважаў аніякага пачуцьця варожасьці, а тым больш нянавісьці да немцаў і іх

памагатых. Не магу прыгадаць аніводнага выяўленьня такога пачуцьця, хаця ўвесь час былі разам, — гэта ж мая мама. На чым жа ўсё трывала, мацавалася? Нейк я ўсклікнуў удзячна: «Ты, мама, артыстка!», а яна, яшчэ ня вызваліўшыся ад пераэкытага жаху, калі ўсё вісела на валаску (і яе, і наш лёс, жыцьцё), слаба нам усьміхнулася. (Адно заставалася паднесьці кветкі «артыстцы».)

Не на нянавісьці трымалася — дык на чым жа? На пачуцьці самазахаваньня? Магчыма, але памножаным на ўсьведамленьне матчынай віны за ўсё, што можа здарыцца зь дзецьмі, зь сям'ёй. А сям'я складалася ўжо зь дзесяці чалавек. Зьбегліся пад глушанскую страху аж дзьве маміны сястры (Соня і Зіна) зь дзецьмі. З Соняй муж яе Пеця (ён камуніст і павінен быў зьехаць з Парыч, дзе жылі да вайны).

Ну а калі ня зможа адвесьці бяду: раскрыецца яе — а праз яе і дзяцей, і шурына — сувязь з партызанамі? І ня тое важна, што па чыёй неасьцярожнасьці (дзясяткі людзей уцягнутыя ў падпольныя справы). Што б ні загубіла — віна яе! Яна сама пайшла на гэта. Перад сабой не апраўдаесься.

У немцаў на акупаванай тэрыторыі быў страшны праціўнік — такія вось жанчыны. Яны занадта многім рызыкавалі, а таму прайграць у паядынку зь любым немцам, паліцаем, даносчыкам было занадта страшна. І самыя часам непрыкметныя, што нічым нібыта не вылучаліся, станавіліся, вось менавіта, артысткамі мімаволі. Часам — вялікімі.

Прайграла не яна, наша мама, а ўсе, з кім яна ўступіла ў міжвольны паядынак: і бургамістар Ельніцкі, і паліцай Гузікаў, і нямецкі камэндант, кожны зь іх, нешта там абараняў (сваю новую пасаду, права на помсту савецкай, што іх перасьледавала, уладзе, інтарэсы «вялікай Германіі»), і толькі яна ратавала самае галоўнае, без чаго ёй ня жыць — дзяцей, сям'ю. А таму яна змагла тое, што не змаглі яны, хоць адным рухам рукі,

словам — загадам маглі яе зьнішчыць. І тым ня менш прайгралі яны.

Прыгадаю тут толькі тры выпадкі, калі паратунку, здавалася, не было. Але нешта такое адбылося — парыў, у якім жаху было ня менш, чым вытрымкі, — і пагібель зноўку адступіла.

Перанесьціся жывой памяцьцю ў рэальнасьць таго летняга дня 1942 году, той ранішняй гадзіны — магчыма. І цяпер стаіць перад вачыма. Але немагчыма ўявіць, што пяцідзесяці гадоў з потым пражытага табой — гэтага проста не было б, жыцьцё абарвалася б на пятнаццаці. Нічога, што было потым! Затое можна дамаляваць ва ўяўленьні, што казалі б суседзі: «Пагналі ў камэндатуру Адамовічыху зь дзецьмі, усіх, і старых таксама, знайшлі ў іх зброю, лістоўкі...» Затым павезьлі б у Старыя Дарогі, там стацыянарна працавалі катоўні-падвалы палявой жандармэрыі, СД. (Звычайна туды адвозілі, і як правальваліся чалавек, сям'я.) А пасьля вайны доктару Адамовічу ўсё гэта расказвалі б, як і завошта яго сям'ю зьнішчылі, а ён не разумеў бы сваю Нюрку: як яна магла, навошта яна ўсё гэта рабіла? Хіба вайна і бяз гэтай яе страшнай ахвяры ня скончылася б сэкунда ў сэкунду ў той самы дзень, у які яна і скончылася? На нашага бацьку не падобна. Але такая бяда здарылася зь іншай сям'ёй, пры гэтым маці ўратавалася, жывая засталася. Яе муж, вярнуўшыся з фронту, тут жа ад яе пайшоў, яго яна таксама страціла. І нядобра пайшоў, папікнуў: ты да мужыкоў ірвалася бліжэй, да сваіх партызан!

«... Мы, мадам Адамовіч, павінны зрабіць у вас вобыск!»

Са спальні нечы голас чуем і насталую ў суседнім пакоі («залі») страшную немату. А ў руках у нас — у мяне, у Жэні, у Сонінага Пеці — улёткі. На беларускай мове вершыкі Кандрата Крапівы — даволі-ткі дурныя — пра «паламаную вось»: Бэрлін — Рым, фюрэр — дучэ, але мы толькі што весяліліся, чытаючы іх. Сунулі іх пад матрац, страшны, сьмяротны доказ, і выйшлі на той го-

лас і насталую ў суседнім пакоі цішыню. У дзьвярах, што вялі на кухню, застыў немец зь вінтоўкай на плячы, сярод залі стаіць Гузікаў, паліцай у скураным паліто і лётчыцкім шлеме на галаве, а перад ім наша мама. Сказаў пра вобыск, а цяпер глядзіць на Казіка Пагоцкага (ён нас чакаў, зьбіраліся разам ісьці на работу — шашу рамантуем немцам і тым ратуемся ад высылкі ў Нямеччыну). Казік зьбялеў ня менш, чым гаспадыня дому. І мабыць, нездарма, паліцай падкрэсьлена недружалюбна ў яго пытае:

— А вы, таварыш Пагоцкі, што тут?

Здавалася, не гітара, а каленкі Казіка, ударыўшыся аб стол, калі ён падхопліваўся, брынкліва загулі. (Што пагнала старую, яго маці, даносіць: даўняя бабская няпрыязь да «падсуседзяў», падагрэтая падазрэньнем, што яе сына хочуць «аблытаць», жаніць з разьвядзёнкай зь дзіцём — Казік сапраўды нудна строіў зь сябе кавалера-залётніка да мамінай сястры Зіны — няўжо гэта?)

Круглатвары ад лётчыцкага шлема паліцай не сьпяшаецца са справай, яму прыемна адчуваць усю значнасьць сваёй ролі і свайго становішча. Кажа ўжо нам тром, што выйшлі са спальні:

— Ваш таварыш па рабоце паведаміў, што ў вас ёсьць зброя, улёткі. Я павінен зрабіць вобыск.

Нага яго, бот за тры мэтры ад ложка, ад плеценага каша для бялізны (на высокім ложку сядзіць Соня з гадавалай Галкай, падобна было, што нават немаўлятка анямела). У кашы, я ведаю, дзьве гранаты-лімонкі (учора Пеця паклаў, а ноччу зьбіраўся аднесьці — ці аднёс?).

Мама сама толькі на золку вярнулася зь лесу, зь Мішам Каваленкам хадзіла на сустрэчу з партызанамі, насіла мэдыкамэнты. Міша — прамое начальства Гузікава, памочнік начальніка паліцыі. Вось так усё пераблытана, але нешта ўпусьціў наш Міша, данос прайшоў, прасьлізнуў міма яго. І наогул год жыцьця на вачах у даволі-ткі даверлівых немцаў, усё ж удала-шчасьлівы, усіх зрабіў задужа бясьпечнымі. Як не паддацца

было і маме? Хаця яна ня раз і сябе, і нас, і Пецю асабліва спрабавала вярнуць да пагрозьлівай небясьпекі: «Вам усё цацкі!»

І вось грымнуў гром — не над страхой, а пад страхой нашага дому.

Загаварыла мама. Гэта былі амаль бессэнсоўныя словы, нічога быццам яны не азначалі ў такой грознай сытуацыі, але пакуль яны гучаць, Гузікаў стаіць, слухае і нічога не распачынае. А мама гаворыць, гаворыць, як бы сама да канца ня верачы ў жахлівасьць становішча (вось яна, тая хвіліна!). Вылятаюць словы пра тое, што камусьці зайздросна, што мы, такой сям'ёй, ня дохнем з голаду, і што быў бы дома Міхаіл Іосіфавіч, можа, пасаромеліся б, ён столькі для ўсіх рабіў...

Я гляджу на маму так, як глядзеў у маленстве, спапялёны дрыжыкамі ад хваробы: яна ўратуе, яна заўсёды ратавала, яна ня можа ня выратаваць!

Але вось мама змоўкла. Мы стаім асуджана, на парозе статуй-немец, а сярод пакоя чалавек, ад якога ўсё залежыць: зараз зрушыць зь месца — і ўсё пакоціцца да страшнага канца. А мама маўчыць. Чаму, чаму яна маўчыць?

І тут яна раптам упала на крэсла, рукамі, локцямі на стол, і зарыдала. Страшна і безнадзейна. Як жа яна рыдала! Жэня падыйшоў, узяў яе за плечы:

— Ня трэба! Мама, ну, ня трэба!

Што ня трэба? Што трэба, што ня трэба? Я гатовы быў адштурхнуць брата. Толькі мама ведае, што цяпер трэба, што можа ўратаваць.

Яна плакала шчыра, больш шчыра не бывае, але ў той жа час яна ведала, што сьлёзы яе і павінны быць шчырымі. (Калі ўсё скончыцца, яна выгукне: «Госпадзе, як я толькі вытрывала!») Ня дзіва, што ня ўстояў бедны Гузікаў? Ён, здаецца, гэтага не чакаў, не гатовы быў да таго, што вось так рыдаць будзе перад ім жонка доктара. І раптам сказаў:

— Так, ад Гузікава залежыць, мадам Адамовіч. Я ня стану наносіць абразу сям'і доктара. Аднак трэба лепш сяброў выбіраць. (І здаецца, паглядзеў на канапу, адкуль толькі што сагнаў Казіка Пагоцкага).

Што, калі б гэты чалавек (тут ужо ня нашы, а яго інтарэсы, лёс) мог ведаць, што, не абшукаўшы наш дом і не загубіўшы тым самым нашу сям'ю, ён рыхтаваў, наблізіў страшную ўжо для яго самога падзею? Праз паўгода большасьць з глушанскіх падпольшчыкаў пайшлі ў лес, у партызаны, і ў гэтую ж ноч з 3 на 4 сакавіка 1943 году партызаны павялі з сабой, выкраўшы ў немцаў з-пад носу (як зімой ваўкі сабаку выкрадваюць ад самага парога гаспадара), усю паліцыю. Падрыхтаваў гэта, вядома, Міша Каваленка і яго група ў самой паліцыі — яны ў тую ноч усе стаялі ў каравуле, і астатніх дваццацёх трох паліцэйскіх узялі «цёпленькімі», соннымі. Калі іх вялі празь лес, Гузікава зарэзаў партызан (алтаец, сам з уласаўцаў) Федзя Злобін: яму сказалі, што менавіта гэты паліцай забіў іх сябра Мікіту Храпко, і скуранка на ім — Мікітава, і дзесяцізарадка была ў яго Мікітава. Каравул не ўсачыў, як даўгім цесаком Федзя ўдарыў Гузікава ў жывот — тут жа, у калёне паліцэйскіх, што стаялі прыгнечана-пакорліва. Але з астатнімі адбылося нешта яшчэ горшае. (У іх ліку і Ўладзік Іваноўскі, мой амаль аднагодак, калі я радасна-ўзрушаны падышоў да іх, — у тым начным партызанскім ужо лесе, — ён так і ўчапіўся, каб хоць мне расказаць, што ў паліцыі ён усяго толькі месяц, гэта маці яго ўгаварыла — абы ў Нямеччыну не забіралі). Іх пагналі кудысьці асобна ад нашага абозу, а калі наляцелі нямецкія самалёты і ўзяліся нас бамбіць, паліцэйскіх (так расказвалі) зачынілі ў нейкім хляве, каб не разьбегліся. Але адтуль яны так і ня выйшлі, і толькі потым мы пачулі, што адбылося: ляжалі там дровы, і камусьці з начальнікаў аховы прыйшла ідэя — няхай самі канчаюць сябе. Сказалі паліцэйскім: «22 — гэта перабор, далей павядзём толькі палавіну, самі вось гэтым (паленьнем) вырашайце, каму жыць, а каму

не». Слухалі празь сьцены, як унутры г э т а адбывалася, а потым зайшлі і перастралялі «пераможцаў турніру» (так гэта называлі зь нядобрым сьмехам).

Ідучы ад нас і выводзячы немца (зь некаторым, мабыць, зьдзіўленьнем і шкадаваньнем: што гэта жанчына зрабіла з намі?), Гузікаў ня ведаў свайго лёсу. І мы, вядома, ня ведалі, што будзе праз паўгода. Толькі помню, як гнятліва падзейнічала на маму расправа з Гузікавым у тым лесе (але не на мяне, вядома), а пра хлеў яна чуць не магла бяз жаху. Але самому Гузікаву не было ад таго лягчэй, што нехта за яго перажываў. Як бы там ні было, ён нас не загубіў і тым самым падрыхтаваў уласную пагібель. Ня выявіў паліцэйскай стараннасьці падчас вобыску, пэўна, лічыўся з тым, як да яго паставяцца ў пасёлку, калі ён нешта адшукае ў сям'і доктара і арыштуе яе. А тут яшчэ перакладчык Бартэль, які выяўна апекаваўся гэтай сям'ёю. Як, зрэшты, і іншымі глушанцамі — стараўся «фольксдойч», як толькі мог, адгарадзіць іх ад жорсткасьці далёкай радзімы — Нямеччыны, якая раптам прыкаціла да яго.

Пасьля вобыску, які не адбыўся, мінула месяцы тры, і зноў старая Пагоцкая пайшла з даносам. На гэты раз яе ўсё-ткі перахапіў Каваленка Міша, уважліва выслухаў папярэджаньне, што шурын Адамовічыхі — камуніст, што зьбіраецца ў партызаны, зманьвае іншых (яе Казіка) і наогул гэта бандыцкая сямейка. «Памочнік начальніка паліцыі» (дарэчы, Міша з старавераў) самым строгім чынам загадаў старой ні да каго больш не хадзіць, ён усё сам зробіць, што трэба, — тут жа паведаміў маме, адшукаўшы нейкую нагоду зазірнуць у аптэку. (Хаця яны звычайна пазьбягалі прылюдных сустрэч.) Зайшла мама ў дом, амаль упала на крэсла: ну вось, цяпер мы сапраўды прапалі! Казала я вам, але хіба вы паслухаецеся? Старую перахапіў Каваленка, але хто ведае, да каго яна яшчэ схадзіла ці пойдзе. Папярэджвала ж,

хто такія гэтыя Пагоцкія! (Папрок Сонінаму Пецю, які пасьпеў-ткі пашчыраць з Казікам.)

Што пагнала старую і другі раз даносіць? Ці ня страх (ужо і Казікаў жах), што пра першы данос ведаем (мы і не хавалі гэтага), а таму назад ходу няма. Камусьці з нас ня жыць: прагоняць немцаў, што тады?

У «Вайне пад стрэхамі» я досыць падрабязна расьпісаў вядомыя мне акалічнасьці і нават «псыхалёгію» старой і яе сына так, як я ўсё ўяўляў. Цяпер жа пра адно расказ: матчын паядынак са сьмерцю, на гэты раз — з бургамістрам Ельніцкім. Важная акалічнасьць: бургамістар з раскулачанай сям'і. Яго г л у ш а н с к а я павага да доктара дапаўнялася пачуцьцём салідарнасьці з жанчынай такога ж лёсу. Магчыма, тое, што і мадам Адамовіч таксама «кулачка», уздымала яго ва ўласных вачах. Не кажыце, што раскулачвалі непісьменных мужыкоў! Наўрад ці быў ён зацікаўлены — аддаць і гэтую сям'ю «бандытам». Так што і яго, мабыць, задаволіў вынік першага вобыску.

Другі ж выпадак павінен быў зьбянтэжыць яго пасапраўднаму. Зьбеглі ў «банду» сястра доктарыхі з мужам, які, як выявілася, да ўсяго ж камуніст. Вось каго яна прыгрэла, а калі нехта зь сям'і пайшоў у лес — гэта ўжо не «раскулачаная» сям'я, а партызанская, «бандыцкая».

За адну ноч «сацыяльнае становішча» наша ў вачах бургамістра і нямецкіх уладаў адразу зьмянілася — з плюсавога на мінусавое. (Як да вайны, калі нехта ўтаіў, а потым выявілася, што бацька «рэпрэсаваны органамі» ці што брат-сват служыў у белых.)

Мы ў тую ж ноч усе зьбіраліся бегчы да партызан, сьцежка да іх была ўжо пратаптаная. Мама і плакала, пытаючы: «Куды я павяду старых перад самай зімой?», пасьля таго як сані Лешчуна памчалі ўжо Соню з малой Галкай і Пецю, а мы з братам яе ўгаворвалі: «Пойдзем, мама!», але яна і сама разумела — застацца, значыць, быць тут жа схопленымі, немцы такога не дару-

юць! Леглі, не распранаючыся: «Пасьпіце крыху, дзеткі!», нешта абдумвала, вырашала і, мабыць, рашыла, але, калі ранішняе сьвятло ўламалася ў вокны, яна, ачнуўшыся, тут жа пагнала нас з дому: што, што мы, дзеткі, нарабілі, мы загінулі, ідзіце неадкладна да Ляўковіча (дарожнашашэйны наш начальнік, таксама быў зьвязаны з партызанамі) і не вяртайцеся, Богам малю, не вяртайцеся, пакуль сама не паклічу! Што б ні здарылася!

Мы ўжо вось так аднойчы ўцякалі, а яна заставалася — гэта калі прыехалі эсэсаўцы забіваць Глушу, усіх глушанцаў зьбіраліся спаліць жыўцом (як суседнія Восы-Калёсы і Каменку спалілі), але мы ж думалі, што машыны гэтыя — моладзь хапаць будуць у Нямеччыну. Вярнуліся толькі пасьля таго, як глушанскіх жанчын, дзяцей выпусьцілі з хлева (казалі, што перакладчык Бартэль выратаваў, патлумачыўшы немцам, што ўцекачы-моладзь тут жа стануць партызанамі), і мы ледзь пазналі маму, Соню, цётку Зіну. Нейкія чорныя, быццам іх ужо абпаліў агонь. Мама вялым голасам апавядала: спачатку людзі крычалі, плакалі, потым змоўклі, стала нейк усё роўна...

На гэты раз яна сьвядома свой і астатніх, хто ў доме заставаўся, лёс аддзяліла ад нашага з братам: раней мы ня ведалі, што чакала тых, якія засталіся, тут усё было ясна. Была толькі надзея, што і на гэты раз ёй удасца адвесьці бяду.

Ад «старога сьвету» (ужо старога савецкага) нам засталіся героі: Паўкі і Паўлікі, Алегі і Зоі. Сярод іх і беларуска-савецкі «бацька Мінай». Чалавек, які не памяняўся лёсам са сваімі дзецьмі, як прапаноўвалі яму, партызанскаму камандзіру, нядобрыя немцы, не прыйшоў зь лесу, і дзяцей расстралялі. З усіх прапагандысцкіх сіл узьвялічвалі яго «подзьвіг», да амаль антычных вяршынь. «Агульнае» паставіў вышэй за «асабістае», тым больш, што фашысты ўсё роўна дзяцей ня выпусьцілі б і г.д. і да т.п. Але нешта не сыходзілася, не атрымлівалася зь яго антычнага героя: тыя ж маглі

пайсьці супраць волі цара, а то і багоў, каб толькі выканаць абавязак перад роднай крывёю. Няшчасны савецкі бацька, савецкі камандзір, які добра разумеў: могуць і свае расстраляць, калі праявіш «слабасьць». Герой дык ты герой, але раптам вырашыш выкупіць жыцьцё дзяцей і сваё там, у ворагаў, за кошт партызанскіх таямніц, сакрэтаў.

Бацька не прыйшоў да дзяцей, не паспрабаваў выратаваць іх. Ну, а калі дзеці, сыны пакінулі б маці, не прыйшлі? Няхай нават паслухаўшы яе мальбу — не прыходзіць. Ні пры якіх акалічнасьцях не вяртацца — не павялічваць яе пакут шматкроць. Як гэта называлася б, што гэта было б?

Перамогшы, ты выратвала нас, мама, яшчэ і ад такога выбару! Я ня ведаю, якім бы ён быў. Ведаю толькі, што ў любым выпадку, пры любым варыянце выбар быў бы самы страшны ў нашым з братам жыцьці.

Хаця нейкі, няхай сабе і паслаблены варыянт падобнага выбару меў месца праз год ляснога, партызанскага жыцьця. Пасьля цяжкіх баёў на Бярэзіне толькі невялікая частка атраду ацалела, а я апынуўся за лініяй фронту і мог, яшчэ не прызваны, ісьці-ехаць куды хацеў і як мага далей ад вайны. Замест гэтага раптам памкнуўся назад: т а м  ж а  з а с т а л а с я  м а м а  і  я н а  н і ч о г а  н я  в е д а е  п р а  м я н е! Зусім дзіцячае рашэньне: пабадзяўшыся ўздоўж фронту, зь вялікай радасьцю і палёгкай далучыўся да групы з суседняга атраду (яны перапраўлялі сем'і, а цяпер вярталіся), і мы рушылі да ненаедна рыкаючага фронту. Нават калі б мы змаглі праскочыць празь яго, што адбылося б, калі б я з мамай сустрэўся? Якую радасьць я ёй нёс у блякадныя (яшчэ надоўга) лясы, балоты? Шкадаваньне, адчай — гэта дакладна. А радасьць толькі ў першыя сэкунды, хвіліны: сынок, жывы! Але тут жа даведалася б, што сын ужо быў у поўнай бясьпецы і вярнуўся толькі дзеля таго, каб паказацца, што жывы. Вярнуўся толькі дзеля яе! Нічога сабе «дзеля», абрадаваў бы, нічога ня скажаш.

* * *

Уся мізансцэна пасьля нашага з братам адыходу была выбудавана ў чаканьні каго-небудзь з паліцыі, воласьці ці нямецкай камэндатуры. Старым растлумачана, што яны нічога ня бачылі і ня чулі. Зіна з дачкой схаваліся ў суседзяў. Мама запаліла ў печы: зьбіраецца на работу. Праўда, здарылася ў доме непрыемнасьць, сям'я сястры пайшла жыць да настаўніка Гарнастая, дом якога за школай, каля лесу. Але так, можа, нават лепш, у яе свае дзеці і свае клопаты. (Пецю, калі ён уцякаў да санак Лешчуна, мама нагадвала: не забудзь, пакінь запіску там, толькі з крыўдай напішыце! Найнаіўны ход нават для даверлівых немцаў. Але ўсё нейкая зачэпка, зыходная фраза, калі самі ня пойдзем, застанемся.)

Выбудаваную мізансцэну дапоўніла ўнушальная постаць Ельніцкага, які зьявіўся ў дзьвярах. Высокі і вялізны ў раскошным даўгім футры. З парога спытаў біблейскім голасам:

— Мадам Адамовіч, дзе ваш шурын?

Расчырванелая ад пячнога жару з-за шырмы выйшла гаспадыня. А што такое? Нешта здарылася? Рэч у тым, што я папрасіла яго пакінуць наш дом. Даўно ня ладзілі, у мяне свае дзеці, сям'я і без таго вялікая, цяжка. Пайшоў жыць да Гарнастаяў.

— Ваш шурын пайшоў у банду.

— Што? Госпадзе! Пагубіў, пагубіў, сволач!

Хаця словы былі, магчыма, падрыхтаваныя, але страх, жах перад тым, чым усё можа скончыцца, былі шчырыя. Скажыце, што мне рабіць, пане бургамістар? Вось і рабі дабро чалавеку! Хіба я магла ведаць? Што нам рабіць, што нам рабіць?..

— А чаго вы хацелі ад камуніста? Ён жа быў парцейны, так?

— Ён муж маёй сястры. Я ж не магла...

— Вось ён вам і аддзячыў!

Калі мама ішла ў госьці да бургамістра — на вясель-

ле дачкі запрасіў — яна дастала з чамадану лепшы свой адрэз на сукенку, шоўк палевага колеру, перад самой вайной прывезены з Кіславодзку, мужаў падарунак. Доўга ім любавалася, але: кінеш за сабой — знойдзеш перад сабой! — гэта перамагло. Нават разьвесялілася, што яна такая хітрая, дальнабачная. Але і праўда, дальнабачная. Ня думаю, аднак, што бургамістар у гэтую хвіліну помніў пра падарункі. Хутчэй пра тое мог успомніць, што немцу-камэнданту было прымнае суседзтва за сталом гэтай культурнай жанчыны, нават фатаграфію сваіх дзяцей ёй паказваў. І яшчэ, пра што думаеш: зьненавіджаны ў пасёлку, а асабліва ў вёсках начальнік воласьці (яму ўжо аднойчы закінулі ў вакно гранату, пашанцавала, што ў тым пакоі нікога не было), ня мог не ацаніць непадробную (а прыкідваньне ён добра адчуваў) дабразычлівасьць гэтай жанчыны. Дурную, бязглуздую, нетутэйшую незласьлівасьць. Калі кожны гатовы ў шмацьцё разадраць і цябе, і ўсіх, хто з табой поруч, — на радасьць усяму пасёлку — хочаш ня хочаш, а ацэніш дабрату, прытым такой аўтарытэтнай жанчыны.

Мабыць, пайшоў ён з асуджанага дому ўсё яшчэ зь няясным уяўленьнем, як быць, як яму паводзіць сябе ў гэтай сытуацыі. «Кулачка-бандытка» — пачуцьці яго былі зьбянтэжаныя. Многае цяпер залежала ад перакладчыка Бартэля, камэнданту ён будзе тлумачыць. Дарэчы, адыходзячы, Ельніцкі спытаў пра сыноў: дзе яны? Дзе ж ім быць, пайшлі на работу. Яны яшчэ нічога ня ведаюць. (А мы ў гэты час сядзелі ў хаце незнаёмага вясковага дзядзькі, які, аднак, нас ведаў, ён усё адыходзіў даведацца, што там у Глушы?)

Нешта залежала і ад Мішы Каваленкі, у яго былі асаблівыя адносіны з камэндантам: звонкагалосы, вясёлы хлопец немцам падабаўся. Калі ішлі, ён і наша мама, у лес ноччу ці вярталіся, на вокрык вартавога яму было дастаткова падаць голас, і адразу ж з бункеру: «О, Міхаіл!» Камэнданта галіў кожнае раніцы глушанскі хлопец з чароўнай «гагарынскай» усьмешкай, тыя ж

ямачкі на шчоках. Менавіта так: калі паляцеў касманаўт, і я пабачыў ягоны твар, першае, што падумаў: «Ну, копія Міша! Наш Каваленка!» (Загінуў у Бэрліне ледзь ня ў той самы дзень, калі Гітлер атруціўся-застрэліўся.) Так што ў Бартэля ў камэндатуры быў наш добры памочнік-саюзьнік.

Мы з Жэнем вярнуліся ўвечары ў той жа дзень. Хаця мама і настойвала (празь Ляўковіча), каб пабылі да наступнага ранку. Але Жэня не паслухаўся, ну, і я зь ім быў згодзен: магчыма, гэта пастка, ну а калі не, і калі заўважаць, што сыны не начавалі дома?

І зноў Гузікаў. Яму даручана (Бартэль нас папярэдзіў) сачыць за домам: пад асабістую, пэрсанальную адказнасьць, калі гэтая сямейка зьбяжыць!

Калі каму больш за ўсё абавязана Глуша (а ня толькі наша сям'я), што ацалелі, дык гэта Бартэлю, «фольксдойчу»-перакладчыку пры нямецкім камэнданце. Бартэль да вайны працаваў мэханікам на электрастанцыі, перакладчыкам зрабілі таму, што немец і ведаў мову. Сын ягоны стаў салдатам вэрмахту, аднойчы бачыў яго ў групе нямецкіх салдат: гэтак жа коратка пастрыжаны, апрануты, як яны, толькі ўсьмешка, як у бацькі, сарамлівая. Не хацелася, але яшчэ тады адзначыў: добрая! Добра, калі б лёс абышоўся зь імі па-божаму. За тое дабро, якое Бартэль рабіў людзям. Хаця, вядома ж, застанься ён тут, атрымаў бы ўсё тыя ж дваццаць пяць гадоў лягераў.

Дзе ён апынуўся потым, калі застаўся жывым, ня ведаю, а вось Ельніцкі — у Аўстраліі. У 60-я гады Глуша разглядвала фатаграфію высокага прыгорбленага іншаземца ў шортах, пазнавальнага, на фоне спраўнага доміку і шыкоўнай машыны — Ельніцкі даслаў родзічам, каб не забывалі.

Што Ельніцкі таксама памог нам пасьля адыходу Пеці ў партызаны, пацьвярджаецца наступнымі яго помсьлівымі ўчынкамі — калі і мы пайшлі. Тым, як ён гневаўся, які пакрыўджаны і злосны быў, што гэтая баба так яго перай-

грала, а ён жа ёй так верыў! І калі праз год дайшла да яго вестка, чутка, што «сын Адамовічыхі папаўся-ткі», што бачылі яго ў Слуцкім лягеры ваеннапалонных, Ельніцкі не паленаваўся памчацца за сто кілямэтраў — ужо ж ён адпомсьціў бы! Праз сына — маці. Адквітаўся б, вярнуў даўжок праігранта. Вялікая ўдача Жэні, наша шчасьце, што ў гэты час ён хварэў на тыф, ляжаў у бараку сьмяротнікаў. Усіх ваеннапалонных, апроч заразнага бараку, выгналі на пляц, бургамістар і раз прайшоў, вывучаючы твары, і другі, а калі пайшоў, дык тут жа вярнуўся, расказвалі, і трэці раз прабег уздоўж шарэнгі...

Ну а перамога над камэндантам — гэта ўжо нешта зусім неверагоднае. Мама рэдка вярталася да тых падзеяў, але калі апавядала і праз дваццаць гадоў, голас яе дрыжаў, перасякаўся ад запозьненага неўразуменьня і перажываньня: як яна магла, на што разьлічвала, калі такое казала немцу-камэнданту?

Пайсьці ў камэндатуру яе вымусіў Гузікаў. Перапоўнены пачуцьцём уласнай значнасьці — яму ўручылі лёс сям'і доктара, але цяпер ужо «бандыцкай сям'і»! — раптам вырашыў, што можна ўсё. Прыйшоў і раз, і другі ў дом, паўп'яны, яго пачаставалі, ён пакуражыўся, хвалячыся і вінтоўкай, і скуранкай забітага ім партызана, і пры гэтым патрабуючы да сябе ня проста ўвагі гаспадыні, а ж а н о ч а й увагі «мадам Адамовіч». Ня ведаў ён гэтую «мадам», якая ў шаснаццаць гадоў польскаму жаўнежу, усяго толькі за руку яе ўзяў, прылюдна канфуз учыніла.

— Што-о та-акое? — спытала яна, калі паліцай дазволіў сабе заявіць нейкія «правы». — Ды вы пры сваім розуме? Заўтра ж іду ў воласьць, у камэндатуру!

— Пойдзеш... Толькі не сама — павядуць! Як міленькіх!

Ён пайшоў, лаючыся, п'яна вываліўся ў ноч, адкуль і зьявіўся, а мама адразу загадала:

— Перакуліце вазоны, кветкі! Стол! Ну, што вы, не разумееце? Ён загубіць нас!

Мы з братам учынілі належны разгром у кватэры, мама ранічкай зьбегала дамоў да Бартэля: ідзіце, паглядзіце, што Гузікаў нарабіў! Прыходзіць, пагражае, патрабуе Бог ведае чаго!..

Бартэль прапанаваў ёй ісьці да камэнданта і самой пра гэта расказаць. Таму самаму немцу, які паказваў, Бартэль помніць, фатаграфіі сваіх дзяцей на вясельлі ў дачкі Ельніцкага.

І зноў нас сплавіла як мага далей ад дому, а сама, пабачыўшы ў вакно, што перакладчык пайшоў ужо па шашы ў бок камэндатуры, хуценька сабралася і накіравалася туды ж.

Што ёй падказвала словы, інтанацыю, усе паводзіны — на мяжы безразважнай, але адзіна выратавальнай рызыкі? Не інакш сам Бог, казала яна потым.

— Або арыштуйце нас, або дайце нам жыць, або мы пойдзем у партызаны!

Яна ведае, што на пагібель, але што ёй застаецца, калі няма аніякай магчымасьці жыць; гэты паліцай Гузікаў прыходзіць, буяніць п'яны, патрабуе Бог ведама што — вось так у вас і партызанамі робяцца: паліцэйскім гэта і трэба, каб людзі рзьбягаліся, а барахло ім заставалася; яны і вас прададуць, як радзіму прадалі; дзеці для мяне самае галоўнае, але я вымушана буду весьці іх на пагібель, нічога іншага не застаецца; або дайце нам жыць, або арыштуйце нас, або мы пойдзем у лес!

Дзе ён цяпер, той немец, які ўсё гэта выслухаў ад жанчыны з вачыма то нэрвова сухімі, то раптам залітымі сьлязьмі, слухаючы цярпліва яе нечувана па тым часе нахабныя словы, — не арыштаваў неадкладна, ня крыкнуў, ня стукнуў кулаком па стале? Пад дапытліва насьмешлівым позіркам другога немца (мама пеpакананая, эсэсаўца) камэндант вынес свой прысуд: вы, жанчына, не вінаваты, я гэта бачу, пакараны будзе паліцэйскі.

І сапраўды пасадзілі Гузікава ў «халодную». І хаця яго ўжо на наступную раніцу выпусьцілі і, больш таго,

менавіта яму даручана было вачэй не спускаць зь неспакойнага дому, страляць у любога з гэтай сямейкі, калі апынецца за рысай пасёлку, і было ясна, што ўжо цяпер Гузікаў пастараецца расквітацца за ўсё — як бы там ні было, але невядомы мне афіцэр — немец, закінуты ваеннай выпадковасьцю ў Глушу, даў нам выратавальную паўзу, дазволіў сябе абыграць пры ўсіх яго магчымасьцях нас вельмі проста зьнішчыць — як ня быць яму ўдзячным?

Што, мода такая: усім дзякаваць, ва ўсіх прасіць дараваньня, адвешваць пакаянныя паклоны на ўсе бакі? Ужо і за перамогі дзякуем. Ці нават просім дараваць.

Ужо калі зайшла гаворка: трэба б папрасіць. За перамогі выкрадзеныя, адабраныя. Напрыклад, у мільёнаў бяспашпартных сялян (і беларускіх вяскоўцаў), якія з вызваленай імі ад фашысцкага рабства Эўропы, з партызанскіх лясоў вярнуліся — напрасткі ў прыгонную залежнасьць ад калгаснага, раённага начальства. Папрасіць, хоць бы са спазьненьнем, дараваньня ў дзясятка народаў, якія амаль на паўстагодзьдзя пазбаўленыя былі адваяванай у Гітлера свабоды таму, што перамогу ім прынесьлі мы, самі несвабодныя. І хто ў нас дараваньня папрасіў за несвабоду вызваліцеляў? А «свае» народы, нацыі (беларусы, украінцы, літоўцы, латышы, эстонцы, малдаване, многія, многія), што, падобна да нашых ваеннапалонных, з фашысцкага лягеру перамешчаныя былі ў савецкі, з кляймом ледзь ня здраднікаў. Ня кажучы ўжо пра народы, проста сасланыя ў лягеры і на пасяленьне.

Хто расейскі народ маліў аб дараваньні за яго расьпятую культуру, годнасьць, рэпутацыю?

Не, ну хаця б якая камуністычная сволач (саграшыў-ткі злосьцю, даруй, Госпадзе!), што цягае па вуліцах Масквы, Менску, Кіева партрэты Сталіна, пакаялася перад тымі франтавікамі, інвалідамі, вэтэранамі, у якіх Вярхоўны Галоўнакамандуючы адразу ж пасьля

вайны расьціснуў далонь і адабраў мятыя рублёўкі, што атрымлівалі за баявыя ордэны? Дзе вы там, Зюганавы-Лук'янавы-Прахaнавы? Ці ў ленінградзкіх блякаднікаў дараваньня папрасілі б — усе былыя і цяперашнія Толсьцікавы-Раманавы; у маскоўскіх апалчэнцаў, дабітых жданаўшчынай, — ужо ня ведаю, каму і прасіць. Толькі ва ўсіх у іх Перамогу ўкралі. Утрапёны Бакунін папярэджваў: бойцеся перамогі, зь яе вянкоў вам скуюць ланцугі! Наш вопыт: калючага дроту наробяць для новых лягераў.

* * *

Шмат гадоў пасьля ўсяго, што памяць зьвязвала з вайной, да нашага глушанскага дому, пад выраслыя бярозы, прыйшла маміна паплечніца па санчасьці Валя Бузак, жанчына з голасам дзіўна ціхім для настаўніцы, якой яна працавала да і пасьля вайны. Валя, прысеўшы на лавачку побач са сваёй былой «начальніцай», якая чысьціла для ўнучак моркву, з усьмешкай на добрым твары стала прыгадваць самыя цяжкія для нашай мамы дні, калі мы з Жэнем і паўатраду зьніклі недзе каля Бярэзіны, не вярнуліся ў свае лясы, а тыя партызаны, абмарожаныя, зраненыя, што дабраліся да сваіх, прыносілі страшныя весткі. Пра тое, як загінуў камісар Голадаў і больш за восемдзесят нашых хлопцаў у вёсцы Коўчыцы, як увесь узвод Шуева ў вёсцы Слабодка нямецкія танкі запрасавалі ў акопах. А Р-н удакладніў, што ён сваімі вачыма бачыў, як «абодвух сыноў Ганны Мітрафанаўны танк...» — і ён абцасам, падэшвай бота крутануў па сухім рыпучым сьнезе. А калі вочы яго сустрэліся з позіркам маці, што стаяла тут жа, Р-н немаведама чаму дадаў: «Як гэта ні сумна, Ганна Мітрафанаўна...» Навошта ён сказаў, зрабіў гэта ў прысутнасьці маці, растлумачыць цяжка. Ня хочацца думаць, што з-за старой між імі няпрыязі, а ўзьнікла яна з таго, што Р-на падазравалі ў стукачоўстве, «слухачоўстве», і мама нейк пагардліва цурала-

ся на выгляд інтэлігентнага балбатуна. Магчыма, ён ёй чымсьці нагадваў Казіка Пагоцкага.

Але, можа, прычына ў той сумятні, што парою авалодвае душой чалавека пасьля асабліва крывавага бою, калі здаецца, што выратаваўся ты адзін, а калі яшчэ нехта, дык нібыта тваё выратаваньне ўжо не такая цудоўная, выключная падзея. На жаль, людзі, на жаль, чалавекі!

Сапраўды, вельмі многіх партызан і чырвонаармейцаў (мы ўжо ваявалі бок у бок з савецкай арміяй) у вёсцы Слабодка нямецкія танкі запрасавалі ў акопах. Я там не аказаўся толькі таму, што адмахнуўся ад Шуева, калі ён з пагрозай скіраваў на мяне з акопу аўтамат: «А ну, вярніся!» Куды вярніся, калі я сувязны пры сваім камандзіры ўзводу Лазаравым, а ён паранены ў абедзьве рукі, і я павінен быць зь ім...

Жэня быў у тым акопе, усё магу ўявіць, а вось як ён устаў з-пад пяску і які ён быў пры гэтым — яму заўсёды за ўсіх няёмка, заўсёды зьбянтэжаная ўсьмешка ў самы недарэчны момант! — малюю сабе гэта і не магу: балюча.

Ачнулася мама ад тых словаў Р-на ў будане, дзяўчаты-санітаркі ля яе і камісар брыгады, дабрадушна-круглатвары Х-о, ён убачыў, што ў жанчыны расплюшчыліся вочы, тут жа стаў казаць: нічога ня зробіш, Ганна Мітрафанаўна, гэта такая вайна, але савецкая ўлада вас не забудзе, вы дзеля яе ахвяравалі дзецьмі...

Тут апавядальніца зрабіла вялікія-вялікія вочы, а голас яе ўсё такі ж ціхі:

— Ой, Ганна Мітрафанаўна, ён загаварыў, а вы так прыўсталі, вочы зрабіліся, ня ведаю, якія... I вы я-ак плюнеце яму ў твар!

— Што ты, Валечка?! — Мама рукі з нажом і морквай апусьціла на калені. — Я нічога такога ня помню. Нічога ня помніла. Няўжо? Які жах! Што ж ты маўчала столькі гадоў, я павінна хоць цяпер папрасіць у чалавека даравацъ.

Ня ведаю, ці пасьпела гэта зрабіць? Калі не, я прашу за яе.

Але каго, каго яна бачыла перад сабой, паўачуняўшы ад жаху нечаканай страты адразу абодвух сваіх сыноў? З кім і з чым яна так па-бабску бездапаможна і бязглузда расквіталася? Ня ведаю. А сама яна нават ня помніла.

* * *

Колькі ж разоў я прыяжджаў у Глушу! Часьцей — з боку Бабруйску, часам — праз Старыя Дарогі, з боку Слуцку. Спачатку вочы шукаюць нашы бярозы — радасны дзевяцівяршынны выкід зяляніны ў неба, — востры дах дому, сінюю вэранду: ці сядзіць мама-бабуля на ганку, ці каля бяроз шарэе яе халат. Дзе там бегае мая Наташа, Жэніны Галя, Інка? Бацькі то наяжджаюць, то ад'яжджаюць — зь Менску, з Магілёву.

З Глушы, дзе б ты ні знаходзіўся, на ўвесь сьвет распаўсюджваюцца ціхія, мяккія хвалі марудлівага плыткага часу, ранішніх дзіцячых і птушыных галасоў: прыехаў на два-тры дні ці нават проста пазваніў — і ты зноў спакойны, свабодны для іншых думак і клопатаў, самае дарагое на сваім месцы і нічога ня здарылася. Тое месца на зямлі, дзе для цябе сышлося жыцьцё і сьмерць, цяпер, калі вайна ў мінулым і толькі ў памяці, месца гэтае як астравок устойлівасьці, нязьменнасьці. У моры ўжо новых падзеяў і хваляваньняў. Летні цёплы вечар, і ўсё, усе побач, вакол цябе Глуша твайго дзяцінства і дзяцінства нашых дзяцей, на лавачцы сядзіць наша мама, што нібыта зьмірылася са старасьцю, з хваравітай замаруджанасьцю любых дзеяньняў, усё больш маўклівая, але па-ранейшаму неадступна ўдзельнічае ў жыцьці сыноў ды і ўсёй шырокай радні, — хочацца спыніць стан такой самадастатковасьці жыцьця: нідзе няма нічога, што было б больш патрэбным, даражэйшым.

Зь дзясяткаў маіх вяртаньняў у Глушу адзін прыезд — лета 1945 году, — вядома, запомніўся асабліва.

Разарванае вайной жыцьцё нашай сям'і зьбіралася, сьцягвалася нанова — як рана зацягваецца.

З вайны Глуша выйшла ўдала, ёй пашанцавала. Ну, проста-ткі як нашай вялікая сям'і. Што, і ў пасёлкаў, вёсак, гарадоў ёсьць свой Анёл-Захавальнік? Глушанскі распарадзіўся, каб Сталін прыняў удакладненьні Ракасоўскага ў адносінах «апэрацыі Багратыён» — частку наступленьня, войск пусьціць праз Палесьсе. А тым самым Глуша, хаця яна і прыляпілася небясьпечна да варшаўкі, заставалася ў баку ад галоўных баёў, сьмерцяў, пажараў.

Партызаны, тыя жыхары, што хаваліся ў лясах ці далёкіх вёсках і там іх не перабілі, не спалілі жыўцом, як многіх іншых, — вярталіся ў сваю Глушу. Поўнымі ці няпоўнымі сем'ямі. Мама вярнулася адна-адзінюткая. Яна потым скупа ўспамінала, апавядала, як увайшла ў нашы весьнічкі, двор, у наш дом — цэлы год у ім жылі, зьбегшыся з другіх гарнізонаў, паліцаі, зрабілі тут каравулку. Як усё загадзілі і што даламалі, сьцягнулі суседзі — можна толькі здагадвацца. Мама з сабой прынесла тое, што ў яе было ў рэчмяшку: г. зн., нічога. Здабыла бярэма чыстай саломы, паслала ля сьцяны, дзе чысьцей, і так правяла першую ноч у сваім доме. Нехта зазіраў у вокны, верылі і ня верылі, што вярнулася Адамовічыха, што гэта яна. У Глушу ня раз прыходзілі весткі, што і сыны, і сама — загінулі, забілі іх.

Калі мы ішлі ў партызаны, хвалюючыся, чакалі, калі пакінем дом, у куфар, закапаны ў падполе, паскідвалі тое, што шкада было пакідаць проста так: нейкія сталовыя прадметы, мэдычныя кнігі бацькі, я — свой альбом акварэльных малюнкаў і вершы (сшытак). Няхай ляжыць, хаця, вядома, былі перакананыя, што «бобікі», зь іх выключным нюхам, тут жа ўзарвуць падлогу і ўсё выцягнуць. Так былі ў гэтым перакананыя, што мама і не падумала пра куфар, пра рэчы, ёй патрэбныя. А калі ўсё-ткі ўзадралі падпол, яшчэ празь некалькі месяцаў, знайшлі ўсё зусім згнілое (апроч шкла і відэльцаў з

лыжкамі). І мае вершы, і альбом адсырэлі, счарнелі. Вершаў не пісаў болей, маляваць не цягнула, ня ведаю чаму.

У галаве ў мамы, якая вярнулася, было адно: Жэня! Дзе ён, што зь ім? Да сустрэчы зь дзядзькам Антонам пра мяне ёй было вядома толькі тое, што Р-н паведаміў: запрасавалі! Праўда, нехта нібыта бачыў малодшага за фронтам, але як яна магла ня думаць, што ёй спэцыяльна гэта кажуць, каб вярнуць надзею? Тая ж Валя Бузак апавядала, як раптам зьнікала Ганна Мітрафанаўна і яе шукалі вакол па лесе, зімнім балоце, а выйдуць на яе: сядзіць на купіне, сьнег ля ног растаў — ад сьлёз.

І раптам: о, радасьць, о, жах! Шуеў і зь ім некалькі партызан аб'явіліся ў атрадзе, жывыя, цэлыя, яны ўцяклі са слуцкага лягеру. Зь імі зьбіраўся і Жэня, але яго зваліў тыф, і ён застаўся. (Той самы тыф, які ўратаваў ад Ельніцкага.) Куды падзеўся лягер потым? Мама езьдзіла, кідалася, шукала сьляды яго: куды маглі пагнаць?..

А пра мяне і бацьку нашага ад Антона пачула. У вайну цудаў было нямала: напрыклад, два салдаты схаваліся пад плашч-палатку, закурыць, прыкурыць: шчоўкнулі запальнічкай — ты? ты?! — выявілася, бацька і сын, тры гады нічога ня ведалі адзін пра аднаго, і вось, калі ласка! Так павінна было супасьці, здарыцца, што падразьдзяленьне, у якім дзядзька Антон быў сапёрам, праходзіла праз Глушу. Ён пабег усіх распытваць пра сям'ю доктара. Што яму маглі расказаць? Сустрэлася яму нават Пагоцкая, пасьля ён казаў: што больш за ўсіх гаравала, бедавала, што Адамовічы прапалі, пабілі іх. Ужо ні на што не разьлічваючы, у кожнай беларускай вёсцы, дзе спыняліся і дзе бачыў людзей са зброяй, партызан, пытаў: а такую вось ня ведаеце? Непадалёк ад Слуцку гэта адбылося, зноў спытаў, а яму:

— Ганна Мітрафанаўна? Дык вось жа яна!

Яна ішла з поўным вядром ад калодзежа і ўзіралася ў незнаёмага, высокага, як брат Антон, салдата ў нядарэчных абмотках і караткаватым шынялі. Ішла, паз-

навала і ня верыла, але вось ўпусьціла вядро з вадой і горка заплакала. Дзядзька Антон падбег, абняў, а яна яму:

— Я адна, Антон, я адна!

— Ды не адна ты, Аня, вось, вось, глядзі!..

Ён пашукаў у кішэнях, знайшоў, выцягнуў — лісты з маім почыркам, з татавым почыркам. Вось, глядзі!

Дзядзька ўсю вайну перапісваўся зь сястрой Воляй, што жыла ў алтайскім Ленінагорску. Калі аб'явіўся там я, вядома, даведаўся пра гэта, стаў пісаць мне, атрымліваць мае лісты, а тут і тата здагадаўся паведаміць аб сабе на Алтай — там замкнулася кольца перапісак.

Дзядзьку ўразіла, як узрадаваліся яму незнаёмыя партызаны: за доктара, вядома, свайго, узрадаваліся. Праз паўгадзіны ўжо сядзелі за шумным сталом і, перабіваючы адзін аднаго, апавядалі, як яны ўсе ведалі, не сумняваліся, што Ганна Мітрафанаўна адшукае дзяцей, пра гэта і сны гаварылі.

Чытаючы ў Плютарха, у Ціта Лівія пра македонцаў і наогул старажытных, як разгадвалі сны, кроку бяз гэтага не рабілі, не пачыналі, я ўспамінаў свой атрад, партызан. Ну, чыстыя македонцы! Уяўляю, якія ў нашых пачаліся сны-разгадкі, калі стала зусім немагчыма, загналі іх у Камар-Мох, яны столькіх страцілі, а жыцьцё саміх на валаску. Нават камісар Буянаў, са словаў Валі Бузак, прыходзіў у санчасьць і «палітработу» праводзіў па снах. Сны сьведчылі, што хутка справы пойдуць лепш, а для немцаў — зусім блага. Маме прысьнілася, што брыла па глыбокім сьнезе і раптам бачыць — бохан хлеба. Узяла ў рукі, а ён — цёплы! Празь некалькі крокаў — яшчэ адзін такі ж. Галоўнае, цёплы, значыць, жывыя, і абодва.

І вось цяпер, калі знайшоўся малодшы, упэўнена прадказвалі: знойдзецца і Жэня.

Але ён не знаходзіўся. Куды толькі ні езьдзіла мама: і ў Заходнюю Беларусь, і на Ўкраіну. Брала вузялок з хлебам і імчалася ў белы сьвет, прачуўшы, што там і там былі лягеры нашых ваеннапалонных ці туды вось, на

шахты, прывезьлі іх зь Нямеччыны. А палонных, недамораных у лягерах нямецкіх, везьлі і везьлі на ўсход — у нашы. Маці ў адчаі раскідвала рукі перад гэтым выгнаньнем-зыходам, у надзеі не прапусьціць, вылавіць, затрымаць. А ўжо расшукаўшы сына, яна ўсё зробіць, каб забраць яго, адабраць — няўжо нічога ня значыць усё тое, што людзі рабілі (і яна таксама) у вайну?

Ужо і перамога адбылася, адрадаваліся, адсьвяткавалі, адплакалі. І раптам — ліст. Ад Жэні, салдацкі трохкутнічак.

Брат паведамляў: ён у шпіталі, вайна ідзе да завяршэньня, а значыць, ён жывы застанецца. Не пісаў раней таму, што на гэта не разьлічваў. «Ты, мама, ужо адплакала, не хацеў, каб табе другі раз давялося». (Вось дурань, вось дурань у мяне брат!) Потым ён так тлумачыў свае паводзіны: уцёк з калёны ваеннапалонных у Польшчы, стаў чырвонаармейцам, на Вісьле стаялі, у акопах нашых людзей раз-два і палічыў. Ад кулямёта да кулямёта перабягалі, каб паказаць немцам, каб думалі, што ў Расеі яшчэ ёсьць салдаты. Дзе ўжо было разьлічваць, што жывы дабрыдзеш да канца вайны?

— Ага, мама, а ў Слуцкім лягеры мне сустрэліся твае знаёмыя, помніш палонных, якіх ты карміла ў аптэцы? Яны даведаліся, чый я, і калі выйшаў з тыфознага бараку (а есьці, есьці хацелася, яны гэта ведалі), далі мне мяшэчак сухароў, назапасілі, назьбіралі са сваіх кавалачкаў, пакуль я там ляжаў.

Мама не прамовіла, не нагадала сваё ўлюбёнае: кінь за сабою — знойдзеш перад сабою! — яна проста заплакала.

Магчыма, гэта былі апошнія яе ваенныя сьлёзы.

І вось я вяртаюся ў Глушу. У Новасыбірску мог засесьці на цэлы месяц (эшалёны з войскам, з тэхнікай гналі ў бок Японіі), мабыць, так яно і было б, калі б мяне не чакала Глуша, мама. Пазнаёміўся на забітым людзьмі вакзале з інвалідам-франтавіком, на пратэзе, вырашылі сумесна шукаць выхад са становішча, з нашага пункту

гледзішча, недарэчнага: ёсьць білеты, а выехаць ня можам. Трэба закампасьціраваць, ну, ды гэта ўжо празьмернасьць, дурыкі не ваенных людзей. Мы ж лепш ведаем, як нам абавязкова ехаць трэба. Пабрылі ўздоўж пустога эшалёну, які чакаў свае пары на запасной каляі. Калі добра прыгледзецца, заўсёды адшукаеш, калі ня дзьверы, дык шчыліну. Гэта любому франтавіку вядома, а партызану ўжо — тым больш. І сапраўды, у адным вагоне нехта не падняў, пакінуў прачыненым вакно ў прыбіральні. Вось ён, наш шанец! Інвалід паслаў мяне ў разьведку, падмог зьнізу, ззаду: вось я і ў вагоне, няхай пакуль толькі ў прыбіральні. Падаў мне рэчмяшок, сумку. Цяпер давай ты, я працягнуў уніз рукі, але франтавік раптам засумняваўся, не, ён не палезе, шчасьлівай табе дарогі, братка! Што ж, шкада, удвух было б лягчэй качаць правы перад праваднiцай. Адзін я ў пустым вагоне, садзіся, кладзіся дзе захочаш. Але мы ня гордыя, нас і верхняя, трэцяя паліца цалкам задаволіць. Забраўся і заціх, услухоўваючыся. Цягнік ціхенька, на дыбачках падбіраецца да вакзалу, чутнага зводдаль. Людзі, што па цэлым месяцы чакаюць ад'езду, — ясна, што і залямантуеш, і штурхацца пачнеш. Праваднiца таксама лямантуе, вішчыць — так, мабыць, у яе характар яшчэ той. Хутка сустрэнемся. Тупат, чамаданныя стукі ўжо ў тамбуры, унізе пада мной — маёр! Другі і яшчэ горш — палкоўнік з трыма чамаданамі! І яшчэ, і яшчэ — хаця б адзін неваенны, цывільны. Падобна, што я забраўся ў вагон для высокіх чыноў. Так што і не разьлічвай, ня ўдасца зацерціся сярод пасажыраў. Белая варона! Вагон зазелянеў мундзірамі, зазіхацеў пагонамі, што луг веснавы. Прабегчыся, ці што? — я скочыў з сваёй высокай паліцы: «Добры дзень!» — і прысеў ля вакна, насупраць маёра. Ён зьдзівіўся. І ўсё навокал зьдзівіліся: а гэты адкуль тут? Але маўчаць, я спытаў, колькі да адыходу цягніка, адказу не пачуў. А вось і красуня-праваднiца, уставілася на мяне.

— Вы як тут? Як вы прайшлі?

— У дзьверы, а то яшчэ як!

Працягнула руку па білет, я заадно і сваю партызанскую даведку падаў (дзейнічала, спрацоўвала, калі год зь лішнім таму назад ехаў на ўсход). На даведку не зірнула, а зь білетам усё і так ясна: бязь месца, незакампасьціраваны, і затым — гэта вагон для вышэйшага камсаставу. Даведка зь пячаткай Цэнтральнага штабу партызанскага руху (выдадзена ў Гомельскай Нова-Беліцы ў самым пачатку 1944 году) запрашальна бялее на століку, усё больш сіратліва бялее, любы можа зірнуць, пераканацца, што перад ім не зладзяйчук і не які-небудзь паліцай — не зацікавіўся ні адзін маёр, ні адзін палкоўнік. Ні слова ні за, ні супраць. Правадніца, штосьці скеміўшы, хуценька прапанавала: я вас у суседні, у агульны, перавяду. Што ж, абы ехаць. Як толькі я апынуўся ў тамбуры, дзьверы за мною зачыніліся, ніхто мяне і не зьбіраўся падсаджваць у суседні вагон. А цягнік ціхенька крануўся, і за тое дзякуй Богу, — наўздагон ляцелі стогны і лямант тых, што засталіся на пэроне. Ваеннаміліцэйскі патруль, што праходзіў па эшалёне, маімі дакумэнтамі зацікавіўся. Павялі з сабой, я ўжо рыхтаваў гарачую прамову ў апраўданьне свайго ўчынку, каб дайшло, працяла, адчулі. Але не спатрэбілася нічога. Павялі ў свой службовы вагон, паглядзелі дакумэнты: паедзеш з намі, пацан! Добра, пацан дык пацан, абы рухацца — да Казані, да Масквы, да Глушы.

І вось ён, гэты момант! Скочыў з машыны, прыняў свае рэчы, а вочы ўжо ахапілі ўсё, што змаглі, абнялі, прысунулі: прышашэйныя сосны, дом, нашы вокны, бальніца-камэндатура з пачарнелымі ад зьнятых земляных прызбаў сьценамі, аптэка, дзе, я ведаю, цяпер і працуе і жыве *я н а*. Нехта ў белым халаце кінуўся за вакном, я накіраваўся да вэрандачкі, але *я н а*, мабыць, пабегла праз сенцы — зьвярнуў, засьпяшаўся туды, амаль бягу. Я туды, а яна — праз вэранду на вуліцу, сьледам за мной, здагнала ў сенцах, а ў руках у мяне рэчы, шпурнуў іх пад ногі, і вось мы ў аптэчнай куханьцы стаім

адзін перад адным. Як бы ня ведаючы, што рабіць. Пацалаваліся. Гэтыя сэкунды кудысьці далёка-далёка адкінулі месяцы, гады, вечнасьць, дзе мы ўжо маглі і не сустрэцца ніколі.

— Сынок...

(Госпадзе, колькі потым было выпадкаў, дзён, калі я мог быць поруч зь ёю, нешта сказаць, пачуць яе голас, няхай у ім і недарэчная старэчая паніка, спалох, які чамусьці раздражняў. Ну, звоніць тэлефон, ну, у дзьверы пазванілі — што, што здарылася, якая прычына бегчы, палохацца: «Саша, званок!» — ды што здарылася, што за паніка, мама? Нічога, дурань, не здаралася, усяго толькі жыцьцё прайшло, адыходзіць, канчаецца. Цяпер хаця б, дапетрыў, разумееш?) Нас абкружылі нейкія незнаёмыя людзі, прайшлі праз аптэку на кухню, Ніна і Франя гучна расказваюць, як сьмешна мы кідаліся, бегалі адно за адным. Маму віншуюць вясковыя бабы, трымаючы ў руках паперкі-рэцэпты. Усё так, быццам не яны толькі што ад вайны ўратаваліся, а я, што больш за год быў ад яе далёка-далёка, ажно за Ўралам. У 8-й клясе вучыўся, у горна-мэталюргічным тэхнікуме. Калі адтуль ехаў, спыталі, ці вярнуся давучвацца. Дзякуй горнаму, дзякуй мэталюргічнаму, дзякуй гораду Ленінагорску, але я больш не сірата — я ў Беларусі, я знайшоў сям'ю, і яна мяне знайшла.

Калі засталіся ўдваіх, мама паказала мне лісты бацькі і Жэні, а я ёй апавядаў, як там, далёка ад вайны, я раптам на брушны тыф захварэў (хаця ў партызанах ні разу нават насмарку не схапіў) і як тата даслаў на бальніцу лекі і ліст уклаў, для цэнзараў. Маўляў, знайшоўся сын, прашу забраць палову стрэптацыду, лекаў, я спэцыяльна дзьве порцыі паклаў. (Рэч у тым, што ў папярэдніх яго пасылках я знаходзіў цэглу, а аднойчы — ірваны, струхлелы кажух.)

Мяне кармілі, мне ўсьміхаліся, са мной гаманілі звонка-шчасьлівымі галасамі, а мне ўжо хацелася выйсьці і прайсьціся па Глушы. Глушанцы — хто

пазнаюць, а хто не пазнаюць мяне. Чакай, гэта, здаецца, Ельніцкага зяць, ён быў у паліцыі, а потым цесьць яго ад паліцыі вызваліў («па хваробе», але ж мы ведалі — па блату, і тым выратаваў яго ў тую ноч). На мяне азірнуўся са зьдзіўленьнем і амаль спалохам, а я міжволі павітаўся. Ад паўнаты шчасьця. А чаму не вітацца цяпер, калі ня ваша, а наша Глуша? Я і з Казікам, і з Пагоцкай (а ўжо тым больш са старым) павітаўся б, пагаманіў. Хацеў бы паглядзець на іх, дом іх бачны каля лесу. І з дрэвамі, з соснамі павітаўся (кара ўсё яшчэ па-ранішняму халаднаватая), перакінуўся словам. Вось гэтая самая тоўстая, каля аптэкі, мяне выратавала ў ноч, калі мы па адным адыходзілі да таго вунь лесу. Перабег шашу, і тут пачуліся галасы, сьмех: паліцаі ідуць! Пакуль праходзілі міма, я зрабіў поўны абарот вакол ствала дрэва. А заўважылі б — ноччу, з чамаданчыкам! — чым бы ўсё для мяне скончылася?

На маё пытаньне: «А як тут Пагоцкія?» — мама ўвечары паведаміла:

— А ведаеш, да мяне прыяжджалі, пыталіся пра іх. Дакладней, тут пачаў працаваць упаўнаважаны ад Бабруйскага іх гэтага НКВД ці як гэта цяпер? Зайшоў у аптэку, паглядзеў, паклікаў мяне ў заднія пакоі. Так і так, у яго дакумэнты важныя, ён часта ад'яжджае. «Магу я ў вас іх захоўваць? Мы ведаем, што вы партызанка і муж усю вайну ў арміі». Я яму кажу: «Няма ў мяне сэйфа, баюся я вашых папер!» — «А нічога, вы ж захоўваеце атруту, вось там і маё схавайце».

Аднойчы мне кажа: так і так, паступіла заява (назваў Лешчуна і яшчэ двух партызан), што Пагоцкія на вас даносілі немцам. Вы пацьвердзіце? Разумееш, сынок, я сказала: нічога ня ведаю і нічога ня буду пацьвярджаць! Ну, як жа так, усе пра гэта ведаюць. Яны ведаюць, а я ня ведаю. Не пытайцеся ў мяне ні пра што.

Мабыць, заўважыўшы, што сын ня дужа яе разумее, растлумачыла:

— Мне Бог усё вярнуў, а я буду... Няхай Ён іх

судзіць, Яго воля. Я пакля́лася, калі вас знайшла, усім усё даравацъ!

Але калі старая сама прыйшла ў аптэку, прынесла слоік мёду, сала — як жа мама яе турнула!

— Ніна і Франя стрымалі, а то б я яе з ганку спусьціла.

Пра Казіка мама паведаміла: зьехаў некуды ў глыбінку, нібыта настаўнікам працуе. Камусьці мёд іх да смаку прыйшоўся, у армію не забралі, хаця ўсіх падмялі, каго толькі можна.

* * *

Тады я маму ня дужа разумеў, затое зразумеў пазьней. Так, менавіта пасьля такой вайны, такога ўсплёску нянавісьці, лютасьці трэба было пачынаць перарываць ланцуг, хаця б на сваім узроўні, участачку. Наўрад ці яна пра гэта думала або так разважала. У яе свае доказы: яна адмаліла сыноў у Бога — і цяпер не яна, а Ён усяму судзьдзя. Палітыкамі нашы бацькі не былі, іх адвучылі начыста. Даваенны страх працягваўся і ў пераможцах. А мы, хто маладзейшы, што прынёсшы з вайны, а што зачэрпнуўшы пасьля XX зьезду, усё больш набывалі «смак» да «палітыкі». Мама прыглядвалася не без трывогі.

Званок мне ў Менск:

— Саша, дык што гэта такое?

— А што?

— У газэце вось напісана, мне паказалі, у «Звяздзе» — што ты нігіліст!

— Ну і што? Базараў таксама быў нігіліст.

— Але тут напісана: іржавы!

У пасьляваенных «органах» апынулася нямала былых партызан. І наш адзін — Мікалай С. Ад яго я шмат цікавых рэчаў пачуў, і пра сябе таксама.

— Чаму маё начальства так цябе ня любіць? — пытаў Мікалай.

— А ня любіць?

— Гэта дакладна. Па-першае, кажуць: не савецкі чалавек. І другое: ён нас ня любіць, органы.

Зь другім я спрачацца ня стаў бы: забілі, замучылі, падставілі пад кулі кожнага трэцяга жыхара велізарнай краіны, а вы іх любíце! Крыўдзяцца. Але вось савецкі, не-савецкі — гэта трэба было яшчэ даказаць. Калі быў, заставаўся «савецкім», а калі перастаў ім быць. Ва ўсякім выпадку, калі бацька, вярнуўшыся з арміі ў Глушу, раптам задумаў і пачаў будаваць уласны дом (ня жыць жа вечна па закутках у аптэцы!), я зьдзівіўся:

— Уласны? Дык хутка ж камунізм!

Самае дзіўнае, што ня ўсё было жартам, была доля зусім шчырага пераканаmaking, чаканьня: мы ж перамаглі, цяпер усё адолеем, зможам!

Ну што, хіба ня цалкам савецкі (ідыёт)? Дом бацькаў, намі дабудаваны, стаіць, можаце пераканацца, у Глушы. Ну, а камунізм на адной шостай... Тут была яўная недапрацоўка і саміх органаў. Больш рашуча з намі трэба было, больш крута абыходзіцца. Каб аніякіх адліг, аніякіх перабудоваў. Народ наш па-добраму не разумее, тут жа робіцца нахабным. Вось і мы — у раньнехрушчоўскія часы. Нас стараліся паклікаць на дапамогу, каб разам «паляпшаць сацыялізм», у адной запрэжцы з органамі, а мы хаця і марылі аб палепшаным, але каб бяз органаў, без такіх, прынамсі, а калі зь імі, дык бяз нас.

Мы тады часта зьбіраліся ў гасьцінным фінскім доміку на ўскраіне Менску — у Мастака. Пасядзець за сталом, пашумець, у гучных спрэчках разгрызьці ўсе пытаньні, што раптам і адразу адкрыліся нам. Лічылася, што «чужых» у нашай кампаніі няма (дый абрыдла азірацца), таму гаварылі пра ўсё адкрыта. А тым больш, мы былі заадно з Хрушчовым — каго ж баяцца? Аднойчы сабраліся, пытаем: «А Паэт дзе?» Няма Паэта. І раптам зьяўляецца: выгляд чалавека — крыху зьбянтэжанага, але задаволенага: «Хлопцы, дзе я бы-ыў!» Яго, аказваецца, «выклікалі». Даў падпіску аб неразглашэньні.

Падрабязна стаў апавядаць, што абяцаў не выдаваць, а ў заключэньне параіў: падрыхтуйцеся, кожны павінен мець «вэрсію», каб не засьпелі, як яго, зьнянацку.

Я чакаў свае чаргі нават зь цікаўнасьцю. Мы ж былі дужа самаўпэўненыя: нядаўнія партызаны, франтавікі — нас голымі рукамі ня возьмеш! Быццам і ня помнілі, што ў многіх іншых заслугі вунь якія гучныя, а загрымелі так, што і сьледу не засталося.

Але ж быў усё-ткі ўжо XX зьезд!

І вось надышла мая чарга. Нейкая шустрая фізіяномія зазірнула ў дзьверы акадэмічнага Інстытуту літаратуры, ветліва прагучала маё прозьвішча — просяць у калідор. Не пасьпеў выйсьці — у твар мне кніжачку. А, дужа прыемна! Малады чалавек нават нейк пакрыўдзіўся, што аніякага ўражаньня. Паведаміў: вас запрашаюць у дом на праспэкце Сталіна, нумар такі, надта просім, для размовы. Зайсьці трэба з боку Камсамольскай, там ёсьць сталовая, агульная, гарадзкая — праз яе і прайсьці. Усё прадугледжана: каб непрыкметна, не падводзіць сваіх людзей.

Усё так і было: абедзенная таўхатня, нейкія дзьверы — гэтыя, здаецца? Ну, а далей — калідоры вядомага ў Менску будынку, які ў зруйнаваным горадзе быў узьведзены (немцы будавалі, ваеннапалонныя) у ліку першых пасьля вайны, калі наогул ня першым.

Пра гэтыя бясконцыя калідоры мне потым апавядаў Мікалай С., той самы супартызан, забаўную гісторыю, прынамсі, як забаўную, хаця, думаю, яму было не да сьмеху, калі за ім імчаўся на кароткіх ножках міністар унутраных справаў Цанава, менскі Берыя, зь ляматам: «Стой! Хто такія? Стой, кажу!»

Ішлі маладыя два лейтэнанты па калідоры сваёй арганізацыі і раптам бачаць — Цанава насустрач. Рэфлекс спрацаваў: не трапляць на вочы, невядома, што яму цюкне ў галаву. Разьвярнуліся і наўцёкі, ды — крута ўніз па лесьвіцы, у прыбіральні, адзін у мужчынскую,

другі — у жаночую. Доўга чуўся немы крык разьятранага Цанавы.

У названым пакоі мяне чакалі. Твар вострага на вока капітана нібыта знаёмы, недзе бачыў, але як бы бакавым зрокам. Наўпрост — не трапляўся. Празь пяць хвілін я скеміў: ведае пра пісьменьнікаў усё. Пра жывых, пра мёртвых, пра рэабілітаваных і яшчэ не рэабілітаваных. У гэтай справе і прапануе мне паўдзельнічаць — удзячнай справе рэабілітацыі беларускіх пісьменьнікаў. А справа працаёмістая: са ста дванаццаці — сотню, ці што, угробілі. Прыкрыя памылкі ўсё. Бяз вашай (нашай) дапамогі не абысьціся.

Зразумела, усё зразумела. Ды толькі лепш: вы самі па сабе, а мы самі па сабе. Вось у мяне ў часопісе «Полымя» сэрыя артыкулаў менавіта пра такіх пісьменьнікаў, рэпрэсаваных, пра многіх. Калі ласка, выкарыстоўвайце.

Так яно так. Але нам бы (ім) хацелася... Вочы паляўнічага ці птушкалова: зоркія, азартныя. Кіпцюрык, толькі кіпцюрык твой ім патрэбен!

А вось кіпцюрык мне за ўсё даражэй. Таму аніякія заклікі да патрыятызму, удзелу ў высакароднай справе не даходзяць, ня дзейнічаюць. Тым больш, што ў запасе ў мяне «вэрсія». Падрыхтаваўся скарыстаць яе ў самы крытычны момант. А момант такі ўсё не наступае. Гамоняць са мной паважліва, мы як бы разам палюем. Толькі я — птушка, а ён — клетка з прачыненымі дзьверцамі.

Падпісаў мне пропуск на выхад: дазвольце як-небудзь яшчэ раз з вамі пагаманіць. Падумайце.

Памчаў да сяброў расказаць пра такое лёгкае вызваленьне.

Але якое там. Праз тыдзень — тэлефонны званок. Ці не маглі б прыйсьці? Тым жа маршрутам.

Што і казаць, цікава вось так проста прайсьці ў будынак, самому ўвайсьці і выйсьці, куды прыводзілі і адкуль выхад быў ох які цяжкі. У. А. Кручкоў, да пучу — старшыня КГБ, пажартаваў з намі, народнымі

дэпутатамі, што прыйшлі з прапановай Лубянку пераўтварыць у "Мэмарыял": а вы, маўляў, заўважылі, што дзьвярныя ручкі, што звонку і што знутры, сьцёртыя ў нас у аднолькавай ступені? У іншыя часы ўнутраныя былі сьцёртыя менш: рукі краналі іх куды радзей, чым звонку, — мабыць, у гэтым соль жарту. І прыкмета нашага часу. Але гэтую прыкмету мы бачылі (ці хацелі бачыць) і ў часы хрушчоўскія — як знак незваротнасьці.

А яшчэ, помніцца, ішоў па праспэкце імя Сталіна, калі вартавыя нават звонку ахоўвалі тых, хто працаваў на паверхах і хто сядзеў у падвалах, зацікавіла: а што гэта за пракладкі паміж магутнымі гранітнымі плітамі, фанэра ці шкло? Калупнуў пальцам і тут жа адскочыў: вартавы імчыць на мяне, трымаючы перад сабой штык. Вось такі гэта быў будынак.

А зайсьці ў яго, аказваецца, проста, толькі трэба было ведаць: праз гарадзкую сталовую. Мабыць, і ў гэтым была спакуса: атрымаць права не баяцца таго, што пужае ўсіх. Так што ня толькі страх заганяў у «невідзімкі», але і жаданьне ад яго пазбавіцца, ад вечнага страху — хоць бы такім спосабам. Але ж я ішоў з «вэрсіяй» у запасе, мне страшна не было.

Высокі чын у грубым швэдры з-за стала глядзеў на мяне амаль сумуючы. Што чын высокі, хаця і не ў мундзіры, я скеміў адразу: бо мой капітан зь мінулай сустрэчы быў адкінуты некуды да самага парога, ледзьве затрымаўся за краёчак стала, сядзеў сьціпла, твар быў не як у мінулы раз — чалавека, які ўсё разумее, а тупавата-казённы, прысутны, і ня больш.

— Я вас слухаю, — прамовіў чын так, быццам просьбіт да яго зьявіўся: ён, маўляў, яшчэ паглядзіць, ці падыходзіш ты да такой высокай ролі. Ну што ж, тым лепш, ты мяне слухаеш, і я цябе слухаю. Давялося гаварыць яму. Зноў пра «перабудову ў органах», пра патрэбу ў правераных сумленных грамадзянах. Вы самі патрабуеце аднавіць сумленныя імёны пісьменьнікаў. Вось і памагайце нам у гэтай справе.

Прыберагаючы «вэрсію», цягну тую ж бадзягу: артыкулы мае надрукаваныя, больш сказаць мне няма чаго. Ён: а вы напішыце спэцыяльна для нас. Чаго вы баіцёся? Ці не паважаеце нашу работу?

Бакавым зрокам я бачыў свайго вастравокага ўчарашняга капітана. Заўважыў, як ён насьцярожваўся, напружваўся, калі чын у швэдры пачынаў падцягваць, падцягваць мяне да сябе.

— Вы што ж, такой дробязі ня можаце зрабіць для дзяржавы, якая вас вывучыла, выхавала? Прытым высакародная справа — памагчы ў рэабілітацыі.

Ну што тут скажаш яму? Запярэчыць сапраўды няма чаго. Уладзімеру Аляксандравічу Кручкову я ў твар сказаў пра сорак мільёнаў, імі загубленых. Але гэта ўжо 1990 год, а то быў яшчэ 1957-ы.

Чын пачынае злаваць:

— Вы думаеце, мы ня ведаем, пра што вы там гамоніце на вуліцы Ўсходняй?

Фінскі дамок Мастака стаяў на вуліцы Ўсходняй.

— Дык вы ў якасьці западозранага паклікалі мяне?

Шары, сутыкнуўшыся, адразу разьбегліся. Чын нават заўсьміхаўся. Але папярэджаньне было зроблена. Пара выцягваць «вэрсію». Ці яшчэ не пара?

Я ўбачыў, як занепакоіўся капітан ля парога. Ды ён зусім ня хоча, каб чын раскалоў мяне і паказаў бы, што капітан працаваць ня ўмее, ня ведае, як з такімі трэба дзейнічаць. Вядома ж, чын зазірнуў сюды на хвілінку, каб паказаць, як гэта робіцца.

А ўжо гадзіна, калі ня больш, прайшла. Гэта ж трэба — столькі я чалавека трымаю.

Нахабна паспачуваў: маўляў, і яшчэ гадзіна, і яшчэ праміне — нічога, апроч часопісных артыкулаў, прапанаваць не магу.

— Добра. Вось гэты, як яго пісьменьнік... Галавач (запытальны позірк у бок капітана), цяпер яго справа па рэабілітацыі на стале.

— Я і пра яго напісаў. У часопісе «Полымя» (такі вось нумар).

— Добра. Тое ж самае напішыце для нас.

Я ўбачыў, як напружыўся капітан.

— Я прышлю часопіс.

— Часопіс мы і самі можам. Што, вы так не паважаеце нашу дзейнасьць?

— Дзейнасьць як дзейнасьць.

— Значыць, напішаце? Тое ж, што ў часопісе.

— Не.

— Чаму?

Па твары капітана пабачыў: я амаль у лавушцы, дазволіў сябе падцягнуць да самых дзьверцаў.

— Чаму ня можаце такую дробязь? Дзеля свае дзяржавы? — напіраў чын.

— Не магу — і ўсё.

— Ага, вось як, значыць! — тут убачыў я кулакі на стале. Вялікія.

Памаўчалі. Раптам заўсьміхаўся чын, гэта было так нечакана:

— Ага, зразумела. Вы думаеце, што з вас хочуць зрабіць сэксота. Памыляецеся, дабра гэтага ў нас хапае. Зразумейце ж, ваш брат пісьменьнік — людзі вельмі бесклапотныя. Калі іх не перасьцерагчы, у такое ўлезуць. Потым самі ня радыя. Мы цяпер занятыя прафіляктыкай, выключна прафіляктыкай. Але для гэтага павінны разумець, што адбываецца ў пісьменьніцкім асяродзьдзі. Каб потым не займацца рэабілітацыямі. Патрэбны кваліфікаваныя людзі, якія маглі б нас прасьвятляць. Разумееце? Не даносіць, а прасьвятляць. Менавіта каб не зьвяртацца да ўсякіх тайных супрацоўнікаў.

— Сапраўды, — згадзіўся яго суразмоўнік (я), — нядобра атрымліваецца. Сядзяць на партсходзе поруч. Той, хто «сядзеў» гадоў дваццаць пяць, і той, хто яго пасадзіў.

Мог бы расказаць яму амаль вясёлую гісторыю, як двое такіх езьдзілі ў Маскву. Пасадчык купіў на дваіх білеты.

— Грыша, ты маладзейшы, я сабе ніжняе месца бяру.

— Як ніжняе? Ды я з-за цябе на нарах столькі гадоў!..

— Добра, добра, я наверх палезу.

Гасьцініца.

— Грыша, тушы сьвятло, ужо дзьве ночы.

— Ды я з-за цябе столькі кніг не прачытаў!

— Добра, добра, прабач.

Гісторыю гэтую не расказаў. Замест гэтага прапанаваў:

— Дайце мне шынэль.

— ??

— Калі я абавязаны дзяржаве, не адслужыў у арміі, няхай яна выдасьць шынэль, каб бачна было: чалавек пры службе.

Гэта і ёсьць мая «вэрсія», якую прыберагаў на крытычны выпадак.

— Ну, навошта ж? У вас ужо склалася навуковая кар'ера. (А на твары: а на храна ты нам патрэбен у шынялі?) Значыць, па-добраму ў нас не атрымліваецца...

Чын змоўк. Маўчаў капітан. А я, помню, прыкідваў: мне — 30, нават калі 10 гадоў адбяруць, змагу жыць далей, пісаць (крадком пісаў свае партызанскія раманы). Калі ж завязьне кіпцюрык — жыцьцю канец, а ўжо літаратуры — тым больш.

— Так і быць, мы вам давяраем. Я вам раскажу...

— Не, не, нічога не расказвайце, не давярайце!

Пасьля чатырох гадзін вось такіх падцягваньняў і адскокаў (зацікаўленая рэакцыя капітана, які яўна і ўсёй душой жадаў правалу свайму начальніку, памагла мне кантраляваць сытуацыю) раптам гнеўны вокрык:

— Пішыце!

— ??

— Пішыце, што нікому ніколі не раскажаце пра гэтую гаворку.

Шпурнуў ліст, які сьлізгануў па стале...

Але я вось сабе ўявіў: іншы час, ці ты ня ўстояў, ці ня змог вывернуцца, і яны цябе заарканілі. Зь якім пачуцьцём выйшаў, выходзіў? Мая глушанская біяграфія прызямляе, падказвае прыклады-паралелі, якія, мабыць, выклічуць не зусім эстэтычную рэакцыю. Нейк мы лёталі па прыбраным бульбянішчы, прывыкнуўшы і не заўважаючы, што на ўскрайку яго стаіць дашчаны сарцір, адзін на ўвесь заводзкі інтэрнат. Хлапец пабег па мячык, што стукнуўся аб заднюю яго сьценку і ўпаў там. Пабег і раптам зьнік: адно галава тырчыць над зямлёй і плечы, абапёртыя на локці. Калі выцягнулі за рукі з выграбной ямы, ня ведалі, сьмяяцца ці плакаць. Яму, гэта дакладна, не да сьмеху было. Да падпахаў у жоўта-зялёным дзярме, а водар, а смурод! І галоўнае, ня ведаеш, што рабіць: абцерціся — бацьвіньня з усяго поля мала дзеля гэтага, адмыцца — дзе, і як будзеш ісьці праз пасёлак, міма людзей. Чаму, чаму абавязкова са мной такое! — проста-такі крычыць твар хлапца. У вачах яго я раптам убачыў шалёную рашучасьць: нырнуць т у д ы, галавой уніз, і ўжо не вынырваць!

А ныралі ж, і колькі, безаглядна.

Ня думаю, што «крыўда» органаў, выкліканая маёй незгаворлівасьцю, так доўга вісела, даваў і іншыя нагоды да нелюбові. Трэба быць справядлівым. Бо яны ж, «органы», ня толькі на вуліцы Ўрыцкага, а і «падсуседзьмі» — у любым будынку-ўстанове. І вядома ж — у Саюзе беларускіх пісьменьнікаў. А ў нас там свае страсьці, асабліва калі ты крытык і ня цэніш «вытворчыя раманы». Нечае цярпеньне лопнула. («Якая табе справа, што мае раманы тоўстыя, сумныя, — твае, ці што, грошы?!») І я раптам даведаўся: расшукалі Казіка Пагоцкага (гэта ж трэба ўмець, глушанцы і тыя ня ведалі, дзе ён, што зь ім), ад яго прыйшоў ліст, і ўсе цяпер маглі даведацца, перака-

наіца, што ня толькі Адамовіч-сын — чалавек сумніцельны, але і яго маці... Сябравала зь нямецкім камэндантам, ён яе нават не арыштаваў. (Пагоцкі ніяк і праз столькі гадоў ня мог пазбавіцца ад шоку, калі нават пасьля другога даносу старой нас не кранулі.)

Я расказаў пра гэта маці, яна адрэагавала зусім нечакана: навошта ты, сынок, пра іх пісаў? А яшчэ гэты фільм! (Да таго часу прайшоў па экранах Тураўскі фільм «Вайна пад стрэхамі».)

Спалохалася — за мяне:

— Табе яны нічога ня зробяць?

І паведаміла:

— Ведаеш, мне прыслалі мэдаль «За адвагу» другі раз. Гэта памылка? Ці гэта азначае, што зноў вайна будзе? Раз успомнілі пра нас.

* * *

Жэня далечваўся ў Нямеччыне, армія генэрала Пухава, дзе служыў бацька, стаяла ў Роўне. Ну, а мы з мамай зноў жылі ў Глушы, і да яе цягнуліся нябачныя ніці, што ўсё зьвязвалі. Час быў асаблівы — 1945 год. Пра што ў іншыя часы падумваў бы хлопец з васьмікляснай адукацыяй (плюс адзін курс тэхнікуму)? Як скончыць сярэднюю школу. Мы ж адразу — у які інстытут паступіць? Чатыры гады вайны зарадзілі рашучасьцю ня толькі ў цягніках безьбілетна езьдзіць. Я выбіраў паміж мэдінстытутам і ўнівэрсытэтам, а дакладней, яны выбіралі, спаборнічаючы, каб мне спадабацца: калі мэдінстытут засумняваўся (і не без падставаў), што за круглая пячатка на даведцы аб здачы экстэрнам экзамэнаў, і я, прысаромлены, намерыўся забраць у іх дакумэнты, тут жа кінуліся прасіць прабачэньня за празьмерную здагадлівасьць (усё ж нязначны быў працэнт мужчын, што паступалі на вучобу, а ім мужчыны былі патрэбны). Але я ўсё-ткі забраў дакумэнты, калі на вуліцы ў Менску сустрэў Жэню Семенчука, якога ў школе мы называлі Жома

і якому ў вайну ў бабруйскім нямецкім шпіталі ампутавалі руку (як ахвяры партызанскага бандытызму, хаця паранілі яго немцы і быў ён сам партызан).

— Куды паступаеш?

— У мэдінстытут.

— Ідзі да нас у БДУ (Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт).

— А можна? Ведаеш, у мяне даведка за дзесяць клясаў і зь пячаткай, але крыху таго... (я крутануў рукой, паказваючы, як пячатку паварочваюць, каб нельга было нічога разабраць).

— Затое партызанская ў цябе нармальная?

— Нармальная.

Жэня-Жома ўзмахнуў кароткім абрубкам рукі:

— Яе і прад'явім.

У Роўна, паказацца бацьку і паглядзець на яго, я ехаў, ужо стаўшы студэнтам і жыхаром, які меў часовую прапіску сталічнага Менску. Не здагадваўся, што мяне яшчэ і ў разьведку пасылалі, у мамы былі свае меркаваньні. Яна ўжо распачынала сваю шырокую праграму, акцыю па зборы пад глушанскую страху ўсяго нашага роду. Ужо былі напісаныя і пасланыя лісты куды толькі можна — у Сыбір, на Ўрал. Вядома, ня толькі таго і сьвету, што ў Глушы, але само сабою зразумела: калі людзей гвалтоўна разагналі каго куды і калі ўсё нарэшце зьмянілася (а тады верылі, што вайна, перамога многае зьмянілі), ясна, што трэба аднаўляць раскіданае жыцьцё, памагчы вярнуцца выгнаньнікам. Праўда, многія ўжо іншыя карані набылі, пусьцілі ў іншую глебу, для некаторых Глуша ўжо гучала этымалягічна — г л у ш. Але што датычыцца доктара Адамовіча, дык ужо тут дакладна: няма чаго яму, новасьпечанаму падпалкоўніку, рабіць у арміі, калі вайна скончылася! Мяне не прасілі перадаць такі мэмарандум, але ён, вядома ж, меўся на ўвазе (а неўзабаве мама сама паехала ў Роўна і выклала яго публічна, пры ўсіх бацькавых сябрах-палкоўніках).

Бацька мне здаўся моцна ўзмужнелым: твар агру-

беў, голас цьвярдзей, больш рашучы, мундзір ужо не ляжаў на ім як на цывільным чалавеку, ён быццам прырос да крыху ацяжэлай постаці. Толькі вочы стомлена запаленыя, задумлівыя і нечакана лёгкія на сьлёзы. Абняў мяне і прасьлязіўся, не бянтэжачыся, што глядзяць яго мэдсёстры. Зноў і зноў ім тлумачыў, што чатыры гады лічыў нас нежывымі, назаўсёды страчанымі і што мы, і жонка, і сыны, — храбрыя партызаны, а вось ён (я) ужо студэнт... Сам ня мог ніяк у гэта паверыць і без канца паведамляў пра гэта палкоўнікам, што ішлі да яго. Мне ўжо рабілася няёмка за бацьку-падпалкоўніка, якога ўсе яны, я бачыў, паважаюць, і, мабыць жа, не за сэнтымэнтальнасьць. Увечары, калі засталіся адны, наслухаўшыся маіх апавяданьняў пра безь яго пражытыя гады, сёетое паведаміў пра сябе: як пад Курскам па сто, па дзьвесьце рук-ног адразаў «па-жывому», а пасьля гэтага — аглушаў сябе шклянкай сьпірту, каб адключыцца.

У маёй памяці горад Роўна застаўся нечым накшталт лермантаўскай Тамані: мяне там ледзьве не застрэлілі. Горад лічыўся «бандэраўскім», і таму пасьля пачастункаў у мой гонар, калі ўсе разыходзіліся, а адна мэдсястрычка засталася без суправаджэньня, бацька, што не стамляўся ганарыцца сынам-партызанам-студэнтам, сам прапанаваў мне яе праводзіць дамоў. Ужо ня помню, як звалі яе, але была яна не па-гарадзкому (ці таму, што Заходняя Ўкраіна) маўклівая, сарамлівая і, здаецца, прыгожая. (Кажу: «здаецца» таму, што ўсе дзяўчаты тады здаваліся мне хвалююча-цудоўнымі.)

Мы ішлі зь ёю, не датыкаючыся нават рукой рукі, па рана апусьцелых вуліцах чыстага гарадка з клапатліва пакладзенымі пад пышнымі дрэвамі драўлянымі тратуарамі. Зрэдку трапляліся патрулі, а недзе воддаль пастрэльвалі. Ну зусім як у сваёй Глушы мы ўслухоўваліся ў аўтаматныя чэргі здалёк. Але там, тады гэта былі н а ш ы стрэлы, партызанскія, тут жа — чужыя, б а н д ы ц к і я. (Але гэта зь якога боку глянуць.)

Нечаканы дождж загнаў нас у нейкі двор пад нізкі брыль хлеўчука. Насупраць рад цёмных вокнаў даўгога, у некалькі сенцаў дому. Дождж як зь вядра, даводзіцца шчыльна прыціскацца да варотаў хлеўчука, што ўзяты, зачынены на моцную мэталічную завалу, міжволі прыціскаемся адно да аднаго, а дождж усё роўна дастае, засякае па нагах. Але дождж цёплы, летні, і вялікай бяды ў ім няма. Затое можна вось так стаяць зь дзяўчынай. Вочы яе зусім блізка, а што ў іх, хіба гэта хтосьці можа ведаць?

Магчыма, мне ўдалося б пацалаваць другую ў маім жыцьці дзяўчыну (першая засталася ў далёкім алтайскім горадзе), калі б ня здарылася, не адбылося тое, што раптам адбылося. Расчыніліся са стукам дзьверы над высокім ганкам, але ніхто не выходзіў, а толькі панукваньне, як бы сабаку: «Пайшоў! Пайшоў!» Сабаку мы не пачулі, затое коратка трэснуў стрэл (з «ТТ»?) і тут жа другі. Ды што ён, ачумеў?! Я чамусьці адразу сьцяміў, ня толькі што адбываецца, але і хаду думак таго, хто страляў: з вакна ён доўга назіраў, як двое важдаюцца ля замка на ягоным хлеве, і вось вырашыў пужнуць зладзейчукоў, ды не, прыстрэліць свалачэй! Наш афіцэр, мабыць. Мне б падаць голас, адазвацца: ды ты што! мы тут ад дажджу хаваемся... («Добра ад дажджу прыладзіўся — зь дзяўчынай! І чым вы там займаліся?» — але гэта ўжо хада думак не таго, хто страляў, а кагосьці абагульнена-дарослага, іранічнага, ад каго лепш — чым далей.) Я штурхнуў ад сябе дзяўчыну, выпіхнуў яе з «зоны агню», абстрэлу і сам кінуўся ўсьлед. (І ўсё моўчкі, моўчкі.) Параўняўшыся з вокнамі, рукой нахіліў спалохана-паслухмяную дзявочую галаву, каб з вакна той дурань ня стрэліў, дабеглі да вугла дому, не выпростваючыся, а там, таксама, напаўсагнуўшыся, уздоўж сьцяны, уздоўж сьцяны. Уф, выратаваліся! Ад чаго толькі? Вельмі падазраю, што ратаваўся я ад сораму. Яшчэ б, засьпелі зь дзяўчынай і якраз на думцы яе пацалаваць! Але вельмі дзіўна, што і яна паводзіла сябе ў поўнай згодзе з маімі недарэчнымі дзеямі. Ці яе так загіпнатызавалі ўнушэньні майго

бацькі, што зь ёю — бывалы і надзейны ваяка. Ведае, як паводзіць сябе.

І тым ня менш вярнуўся ваяка дамоў з самым брыдкім пачуцьцём на душы. Вось тады ўпершыню нечакана ўзьнікла здагадка пра многія сьмерці, якія я ў вайну назіраў: існуе ня толькі страх, але і *сорам* сьмерці. Ня страх сьціснуў мае вусны, калі па нас стралялі, а сорам, але не ўсяго толькі дзіцячы сорам, што *засьпелі зь дзяўчынай*, не, больш арганічны, магчыма, той, што перажываеш наогул перад канцом, сьмерцю. Яго я бачыў, заўважаў (але не разумеў) у вачах сьмяротна параненых, пасьля пакут, што спустошылі, адступілі, калі чалавек раптам убачыў, ужо *бачыць сьмерць*. Мабыць, ня толькі ў зьвяроў, жывёл патрэба, паміраючы, забіцца ў гушчар, схавацца, сысьці з вачэй?.. А тое, што ў задушаных пятлёй пры гэтым адбываецца семявывяржэньне, можа навесьці на думку: а ці не падобны сорам сьмерці да тых сноў, калі ты з голай жанчынай, а вакол людзі глядзяць, як яна табой, а ты ёю спрабуеце авалодаць, атрымаць асалоду, *паспрабаваць*. Вось менавіта: ня толькі сьмерць ахоплівае чалавека, але і чалавек раптам пачынае перажываць да яе род прыцягненьня, а менавіта *сараматнага*. А побач, вакол людзі...

Вяртаўся з Роўна, гэтак жа, як і туды ехаў, на перакладных — больш у таварных вагонах, чым у пасажырскіх. На адной са станцыяў ускочыў у таварняк ды проста ў лапы да «фюрэра». Агідна маленькага, нікчэмнага, але вось жа запомніўся, на ўсё жыцьцё. Пасьля яны нас суправаджалі на кожным кроку, куды ні сунесься — уладалюбцы, якія перажываюць асалоду, упіваюцца сваёй маленькай уладай, гаспадары ня столькі лёсаў, колькі нэрваў суграмадзян, — але каб падумаць: «фюрэр!» — нам трэба вайну было прайсьці. Да вайны іх, мабыць, інакш успрымалі.

Гэта быў звычайны таварны вагон, але, як знарок, з нарамі ў некалькі ярусаў, і пасажыры — тыповыя для

таго часу, з бруднымі вузламі, зь дзецьмі, твары галодна-брудныя, вочы запаленыя ад стомы, але таксама, як знарок, — габрэі, некалькі габрэйскіх сем'яў. (Перабіраліся аднекуль з заходніх, цяпер ужо нашых, раёнаў ва ўсходнія.) Усё як знарок, каб пра гаспадара вагона падумалася: фюрэр! Ён яшчэ не зьявіўся — пабег у буфэт падзаправіцца, як мне паведамілі, — але па тым, як пра яго ўпаўголаса казалі, як спалохана ня раілі мне зьвязвацца і лепш пашукаць іншае месца ў цягніку, але галоўнае — амаль лягерная туга і чаканьне чарговай пакуты прыніжэньнем у вачах жанчын — гэта многа сказала пра пана лейтэнанта, што адсутнічаў. (Яны яго так называлі.) Але ўсяго я, вядома, уявіць ня мог, павінен быў (і хацелася) пабачыць і сам перажыць. (Ці сябе выпрабаваць.) Папаўзьлі ўжо міма нас згарэлыя прыстанцыйныя будынкі, а лейтэнанта ўсё няма. Дасьць Бог, адстане ад цягніка... Ого, ён адстане, такога нізавошта ня здарыцца! (Нават надзеі ў людзей не было зь ім больш ня ўбачыцца.) І сапраўды: раптам завіс у праёме дзьвярэй на локцях, крэкча, лаецца. Як жа кінуліся бедныя габрэі ўцягваць у вагон свайго дабрадзея-ката. Але ён не паверыў у іх старанасьць, тут жа папракнуў у двурушнасьці:

— Радыя, радыя былі б! Ці калі б пад калёсы. Увесь сьвет абдурваеце, а мяне не падманеце. Так, прыдавім вуха хвілінак на 600. Каб ні гу-гу! Калі вы мне нумарны аб'ект ачысьціце-вызваліце? Я што, наняўся катаць вас у казённым вагоне?

— Мы хутка даедзем, мы так удзячны пану лейтэнанту...

— Гэта хто тут пан? Паноў мы адмянілі ў сямнаццатым. Нічога, хутка дапетрыце, што да чаго.

Глянуў у мой бок. А накінуўся на жанчын:

— Гэта вы так сьцеражэце вагон? Выганю ўсіх! Дакумэнты?

— А ў цябе яны ёсьць? — спытаў я.

— У мяне дык у парадку. Мне твае патрэбны.

— Вось і прад'яві свае, што маеш права пытаць у мяне.

Цалкам савецкая гаворка. Але мы ўжо асьмельваліся, вучыліся высьвятляць, а чаму, уласна?

Колькі я ехаў зь імі, столькі перабрэхваліся мы зь ім, нашым паханам-лейтэнантам, што ляжаў наверсе. Спачатку вагон быў на маім баку: хоць нехта нахабнікукату дае адпор. І мне гэтая роля падабалася. Я бачыў нясьмела-ўхвальныя позіркі і ўсьмешкі, якіх ня мог зьверху заўважыць гаспадар вагона. Але я пайду, а яны застануцца зь ім сам-насам. І ён ужо ж пастараецца вярнуць пахіснуты «аўтарытэт», недатыкальную ўладу, і невядома, чым давядзецца ім плаціць за маю сьмеласьць. Якой новай прыніжанасьцю, якой яшчэ ступеньню дагодлівасьці? Нічога сабе — памог людзям, Аляксандра-абаронца адшукаўся!

Калі выскачыў з вагону, ён высунуў сваю вусатабакенбардную фізіяномію і спытаў напасьледак:

— А ты выпадкам сам — ня жыд?

— Ужо цікавіліся. Немцы.

Маміна паездка сьледам за маёй у Роўна і яе акцыя па выемцы мужа з арміі надоўга стала сямейнай нашай легендай: спачатку вясёла-шчасьлівай, а неўзабаве і сумнай (нечакана кароткім быў век адстаўнога лекара-падпалкоўніка). Але да таго як мама да яго паехала ў Роўна, пераведзены быў у армію Пухава гвардыі радавы Яўген Адамовіч і неўзабаве дэмабілізаваны. Не пасьпеў зьявіцца ў Глушу, як яму прапанавалі паступіць у школу (ці як у іх называлася) МГБ, г. зн. «зьвязаць сваё жыцьцё з органамі». Партызан, сям'я партызанская — каму, як ня нам, у іх служыць, змагацца зь недабітымі ворагамі? А што ў сям'і ў самой карані напалавіну кулацкія — гэтым можна пагарджаць, вайна зрабіла нам праверку.

Адзінае, не былі, падобна, паінфармаваныя, што Жэня пабываў у палоне. Тут мама змагла іх перайграць. Як раней перайграла паліцая, бургамістра, нямецкага камэнданта. Думаю, гэта яе нябачнай воляй перакіну-

ты быў мой брат зь Нямеччыны ў Заходнюю Ўкраіну, дзе ў генэрала Пухава начальнікам армейскага шпіталя служыў наш бацька. Працавалі штабныя пісары, падпісваліся дакумэнты, атэстаты, а затым —дэмабілізацыйныя паперы, і наўрад ці падазравалі людзі ў пагонах, што выконваюць волю жанчыны зь нейкага пасёлачка. Але тут яе перамога магла павярнуцца паражэньнем, бядой: дамогшыся анкетнай стэрыльнасьці для сына, маці тым самым прывабіла вунь якіх сарок. У дзяцінстве нас палохалі: будзеш мыць-церці мордачку доўга — сарокі ўкрадуць, вырашаць, што сыр! Уяўляю, як яна адрэагавала на навіну, на прапанову — вучыцца яе сыну на «чэкіста». Таму што помню яе рэакцыю на прапанову партызан летам сорак другога, каб Жэня ўступіў у паліцыю. У інтарэсах справы. «Не хачу! Нізавошта. К а б  л ю д з і  я г о  п р а к л і н а л і? А што кажаце: па заданьню, дык потым, пасьля вайны, даказвай кожнаму, чыё і якое заданьне! Што хочаце, толькі ня гэта!»

Жэня паехаў да мяне ў Менск — вучыцца на лекара. А мама накіравалася ў Роўна. Куды муж яе даўно запрашаў зь несхаванай упэўненасьцю, што роля афіцэрскай жонкі для яго Нюркі — куды як падыдзе! Каму, як ня ёй?

Пра сваю паездку мама заўсёды апавядала з асаблівай, пераможнай весялосьцю і больш ахвотна, чым пра ўсе іншыя свае паядынкі.

— Прыяжджаю я, а Міша ўсё падрыхтаваў, усе там падрыхтаваліся. Яго сябры-палкоўнікі. Быццам агляд наперадзе, прыяжджае нейкі важны начальнік. Гэта ім так не хацелася адпускаць Міхаіла Іосіфавіча, і трэба пераканаць мяне, што нічога лепш, чым іх жыцьцё, не бывае. Ну, усё добра, усё цудоўна, стол зрабілі, якіх і не пабачыш: насмажылі шніцэляў ці, як іх там, — біфштэксаў, панастаўлялі бутэлек зь нянашымі наклейкамі, сам генэрал Пухаў прыехаў, жонкі разадзетыя сядзяць, ну і, вядома, прамовы, тосты, так добра ўсе пра Мішу кажуць, як ён ваяваў, які патрабавальны начальнік і

добры, адданы сябра. І пра мяне — быццам сто гадоў ведаюць. Адно заставайся! Я ўсё паслухала і таксама ўстала — падзякаваць. Ну і кажу: Міша, чатыры гады ты быў, як і твае сябры, на вайне, а мы, а Глуша і твае бабкі-галубкі ў вёсках безь цябе абыходзіліся. Вайна, калі вы помніце, скончылася. Я табе не абяцаю, што будуць біфштэксы, нічога гэтага там няма, але бульбачку абяцаю, была і ёсьць, — зьбірайся, Міша, дзякуй тваім сябрам, усім вам за такі прыём, але мы едзем дахаты.

І ў Глушы зноў зьявіўся доктар Адамовіч. І зноў: галубка, галубчык, але і раптоўны гнеў, рэзкасьць, больш крута, як было. Незадоўга да разьвязкі яго паклікалі тэрмінова: сусед сякерай засек суседку, а за што? За тое, што ля яго парога выклала крыж — злое закляцьце; бацька пабачыў той знак (з палачак ці яшчэ чаго) ля парога, боязка захаваны. У тым і сіла крыжа-закляцьця: лічылася, што чалавека, які крануў, парушыў яго, чакае немінучая расплата. Крыж выкладваўся ля парога, каб той, каму жадаюць зла, пагібелі, яго не заўважыў, растаптаў. (Таксама «данос», але каму — сатану? Тады чаму — крыж?) Бацька люта адшпурнуў нагой начараваную недарэчнасьць. І магу ўявіць ягоны твар у гэты міг.

А калі празь некалькі месяцаў ён памёр, Глуша, ахкнуўшы, сказала: вось, гэта таму!

Сьмяротнае захворваньне прывёз са звычайнай паездкі да парадзіхі. На саўгаснай машыне выехаў, а яна па дарозе сапсавалася, пешшу пайшоў праз начную завіруху ў сваім цяжкім, усё тым жа «нераскулачаным» тычынаўскім кажусе (мама яго зьберагла ў знаёмай цёткі ў вёсцы), успацеў, прадзьмула, прастудзіўся. Вярнуўся дамоў з высокай тэмпературай — раптоўная страта мовы, аняменьне рукі, нагі. Інсульт. Усё хацеў нешта сказаць, ня мог, сьляза выкацілася, зь ёю на шчацэ і адышоў.

Калі я, выклікаsuccessfully зь Менску тэлеграмай (Жэня быў у Глушы), на бабруйскім вакзале ўбачыў заводзкую машыну і знаёмую бальнічную мэдсястру, яна толькі зага-

варыла — адразу зразумеў: ехаў я не да цяжка хворага (так у тэлеграме), а да памерлага бацькі. Адразу адчуў сябе вінаватым за староньнія ў вагоне думкі. Убег у дом і ў цесным пакойчыку ўбачыў яго, па-хлапчукоўску худога, вяла паслухмянага, — ц е л а майго бацькі жанчыны абмывалі ў нізкай, шырокай балеі. Мне не здалося, як бывае (Талстой пра гэта), што нехта іншы, ня ён перада мной і ня нехта, хто жахліва падмяніў дарагога табе чалавека. Менавіта ён, але толькі які ж бездапаможны,варты жалю. І ў труне ня стаў чужым. (Хаця такія пачуцьці потым, у іншых выпадках, я перажыў: варожай падмены.) Мама заснула на хвілінку ноччу, раптам прачнулася і заплакала, але не як да гэтага, каля труны, плакала, а па-дзіцячы пакрыўджана: дык гэта праўда? усё гэта праўда?! Мабыць, у сьне бачыла яго жывога (столькі гадоў быццам удава пры жывым мужы), прачнулася, а ў суседнім пакойчыку ціха гамоняць бабулькі над яго ц е л а м!

— Нам ногі цалаваць ня будуць, — сказаў пасьля могілак — над памінальным сталом — бабруйскі сакратар, па прозьвішчу Акуліч (помню прозьвішча).

Ён меў на ўвазе вясковых і глушанскіх цётак, што ўразілі яго — падыходзілі і цалавалі ногі глушанскага доктара.

Колькі разоў я гэтыя словы ўспамінаў: ня будуць!

Індусы ведаюць больш за іншых з таго, што ведаць трэба абавязкова. Яны пачалі задумвацца над многім даўно, раней за іншых.

«Калі ты ўвайшоў у сьвет, ты горка плакаў, а ўсе радасна сьмяяліся. Зрабі жыцьцё такім, каб, пакідаючы сьвет, ты радасна сьмяяўся, а вакол цябе плакалі».

Каб радасна сьмяяўся?.. «Хорошую религию придумали индусы!» — блазнаваў Валодзя Высоцкі. Ён жа, як сапраўдны індус, вырываў з уласных грудзей «с гибельным восторгом» і кідаў нам: «Погибаю! Погибаю!» Калі ёсьць што, бывае, чаму можна пазайздросьціць, ужо наступіўшы на апошнюю рысу, дык хіба што гэта: радас-

на сьмяяцца з гібельным захапленьнем! А чаму б і не? Атрымаў у сваё распараджэньне Сусьвет (няхай на міг, на імгненьне), так, табе было дадзена ўсяго толькі зь Вечнасьці перабегчы ў Вечнасьць, але на шляху ты ўбачыў і зямлю з тым, што на ёй, і неба (над сабой, але добра, калі і ў сабе), усё, усё пасьпеў (у параўнаньні зь нічым — каму жыцьцё ня выпала). («І калі вы пражылі адзін-адзіны дзень, вы бачылі ўжо ўсё», — у Мантэня і пра гэта адшукаеш.)

«Мы забіваем толькі шчасьлівых сьвіней» — дзіўную рэкляму паказалі мне ў Гішпаніі. Ды не пакрыўдзімся, перанёсшы гэта на саміх сябе: прырода забівае толькі шчасьлівых (г. зн., каму выпала шчасьце нарадзіцца).

Хітрая бабуля ўгаварыла ўнучку, што рана ўстала, набегаўшыся, паспаць удзень («адну-адну хвілінку»), дзіця разаспалася і расплюшчыла вочы на сонца, якое ўжо заходзіла, падала за стрэхі хат, адгарала: як сунічкі, пасыпаліся з вачэй сьлёзы:

— А заўтра дзень яшчэ будзе? Такі — будзе?..

У сярэдзіне свайго веку чалавек звычайна растрачвае, разьменьвае на іншыя радасьці і мэты падараванае дзяцінствам чаканьне-веданьне, што кожны наступны дзень — зноў шчасьце, бо жыцьцё само па сабе — шчасьце. Але перад канцом жыцьця ўсё можа вярнуцца, не, не пачуцьцё дзіцячай неўміручасьці, а толькі арыфмэтыка, але якая! Нават калі няма ўжо ўпэўненага ліку на гады, тады — на месяцы, дні. Няхай толькі гадзіны, хвіліны, сэкунды, але, затое колькі, палічы! Гэта колькі любімых, любячых, ці проста дарагіх, ці прыемных чалавечых твараў? Галасы, галасы, гукі, якімі навакольны сьвет столькі гадоў гаманіў з табой. Словы чалавечай мовы, што гучаць, і знакі напісаньня, калі маеш магчымасьць вярнуць (хаця б для сябе) ня тое што дні, гадзіны, а гады, дзесяцігодзьдзі. Як жа ня быць удзячным: прырода адорвае сьмерцю толькі шчасьлівых.

Як, як там у «Досьледах» у Мішэля Мантэня? У 15

стагодзьдзі яны вось так рыхтаваліся да сустрэчы зь непазьбежным: «Прызначэньне гэтай кнігі — даць своеасаблівае задавальненьне маім сваякам і сябрам: страціўшы мяне (а гэта адбудзецца неўзабаве), яны змогуць адшукаць у ёй сякія-такія сьляды майго характару і маіх думак і, дзякуючы гэтаму, дапоўніць і ажывіць тое ўяўленьне, якое ў іх стварался пра мяне».

Пра сьмерць найбольш думаюць, як гэта ні дзіўна, у пачатку жыцьця і ў канцы. Дзеці і старыя. Калі яшчэ не ўключыліся ў бег жыцьця і калі бег прыпыняецца. «Вызваліце месца другім, як другія вызвалілі яго дзеля вас», — падрыхтоўваў і сябе, і іншых да непазьбежнага шматвопытны Мантэнь. А вось гэта — мая шасьцігадовая Наташа: «Я ведаю, навошта людзі паміраюць! (Усё пытала, пакутавала над гэтым пытаньнем). Гэта як у кіно ходзяць. Адны паглядзелі і іншым трэба».

Марксізм яшчэ і таму давёў сваіх пасьлядоўнікаў да незьміронай супярэчнасьці з прыродай чалавека, што выключыў саманадзейна зь філязофіі, а значыцца, і маралі, праблему сьмерці. Хаця яшчэ Цыцэрон ведаў: філязофстваваць — гэта ня што іншае, як рыхтаваць сябе да сьмерці.

А ўсьлед за Цыцэронам, Сэнэкам — Мішэль Мантэнь: «... уся мудрасьць і ўсе развагі ў нашым сьвеце зводзяцца ўрэшце да таго, каб навучыць нас не баяцца сьмерці».

«Пазбавім яе загадкавасьці, прыгледзімся да яе, прывыкнем да яе, разважаючы пра яе часьцей, як аб чым іншым».

«Разважаць пра сьмерць — значыць разважаць пра свабоду. Хто навучыўся паміраць, той развучыўся быць рабом. Гатоўнасьць памерці пазбаўляе нас ад усякага падпарадкаваньня і прымусу. І не існуе ў жыцьці зла для таго, хто спасьціг, што страціць жыцьцё — ня зло».

«І калі вы можаце адшукаць суцяшэньне ў добрай кампаніі, дык ці ня йдзе ўвесь сьвет той жа сьцяжынаю, што і вы?»

Стоп! Нявінна-суцяшальная для веку Мантэня сэнтэнцыя зусім ня так можа адгукнуцца ў душах людзей веку Дваццатага. Яны атрымалі Бомбу і цяпер маюць магчымасьць у «добрую кампанію» з сабою захапіць увесь род людзкі, каб «знайсьці ў гэтым суцяшэньне». Васьмідзесяцігадовая бабуля ў маім менскім двары аднойчы паскардзілася і палетуцела: «Каб якая вайна, а то адной паміраць неахвота». Дзякуй Богу, пры ёй не было «прэзыдэнцкага чамаданчыка». А вось цэкоўскі Іван Іванавіч — той быў набліжаны да тых, хто «прымае рашэньні», — ён мне растлумачыў дыялектыку гуманізму «не-абстрактнага» (ніяк забыць не магу): калі на зямлі застанецца дзесяць чалавек, галоўнае, каб яны засталіся савецкімі людзьмі!

«Філязофія», якая выключыла з поля зроку індывідуальную чалавечую думку пра сьмерць, заканамерна стала праграмай калектыўнага самагубства.

* * *

Усё добра, усё правільна, усё гэта так. Але чаму паўтараеш сам сабе: словы ўсё гэта, словы... Бо я заўсёды памятаю, як памірала мама. Не пра сваю, пра яе сьмерць — самая вострая памяць.

А нічога ж такога няма ў гэтых трох запісных кніжках («май 1979 г.», «чэрвень 1979 г.»), каб баяцца іх раскрыць, прачытаць. Тым ня менш з таго мая я ў іх ні разу не зазірнуў, баючыся болю, сьціскаючыся ад адной думкі зноў да гэтага дакрануцца.

Пасьля вайны мама цяжка хварэла толькі двойчы. (Калі не лічыць «партызанскі артрыт», што мучыў яе ўсе апошнія гады, — захворваньне суставаў.)

Калі ў Менску здарыўся зь ёю інфаркт ў 1961 годзе, я «ўдзельнічаў» у яе хваробе напрасткі — і псыхалягічна, і проста-ткі фізычна — у асноўным ёй жа на шкоду. У бальніцу не паклаў, «не аддаў». Вырашыў, што сам буду «несьці крыж». Але несьлі яго ўсе, нават суседзі —

мілая Ніна Васілеўна і яе муж, бездакорныя памочнікі, калі трэба было прыпадняць хворую, падбіць сяньнік, каб не было, ратуй Божа, пролежняў. У хатніх умовах на ўсю моц выявілася тое, што ні хварэць на інфаркт у тыя гады, ні лячыць яго яшчэ не навучыліся. Чалавека трымалі ня менш чым месяц у стане нерухомасьці (уявіце, што вам трэба праляжаць, не паварочваючыся, хаця б суткі!), і пры гэтым лічылася, што хворага палохаць страшным словам «інфаркт» ні ў якім разе нельга — і вось паспрабуйце ўтрымайце яго ў такім невыносным становішчы столькі часу, калі ён нават не ўсьведамляе цяжкасьці захворваньня. Але мая хворая не ўсьведамляць не магла: усё было напісана на твары сына, яе паніка, страх, пакуты цалкам адлюстроўваліся на мне і ўва мне. Калі нехта збоку бачыў двух сыноў каля ложку хворай у час прыступу хваробы: паніку на твары аднаго і тупавата-спакойнае чаканьне на твары другога, мог бы рашыць, што вось гэты любіць-перажывае, а гэты, «як цурбан». Я і злаваў на брата, але ён жа са сваім тварам, прафэсійна «доктарскім», дзейнічаў супакойваюча на хворую, што толькі і трэба было, я ж, зьбіраючы і люструючы на сваім пакуты і трывогу хворай, толькі шкодзіў ёй. І праляжалі мы (менавіта «мы»), пакутуючы ад прыступаў, аж два месяцы. Мама выходзіла з хваробы, а я пагружаўся — у безнадзейную (колькі гадоў потым ня мог пазбавіцца) бяссоньніцу, што зусім разладзіла маё і начное і дзённае жыцьцё.

Але ніяк ня лепш і ня больш разумна паводзілі мы сябе, калі спасьцігла нас бяда незжывальная — у мамы выявіўся рак лёгкіх. Яна праляжала некалькі тыдняў дома, потым, на гэты раз ужо зразумеўшы, што «для гэтага і існуюць бальніцы» (словы брата), я пагадзіўся, і яе забралі ў бальніцу санкіраваньня.

22 траўня 1979 году раньнім халаднавата-сонечным сьвітанкам я вяртаўся з бальніцы дамоў па вуліцах Менску, які прачынаўся, а ў моргу засталася мая мама. Белая-белая прасьціна, а пад ёю тое, што адбылося — зь ёю,

з намі. Дзіўна, што пад той прасьцінай як бы нікога няма — так плоска яна ляжала...

Пахавалі ў Глушы — непадалёк ад магілы бацькі. Вярнуўшыся ў Менск, я нешта запісаў, і вось упершыню, роўна праз 14 гадоў, раскрываю запісную кніжку.

25.5.1979 г.

Мама памерла, апошні раз ехала ў Глушу і там засталася, ужо ня вернецца, і нічога не вярнуць, павярнуць нельга, а столькі цяпер хацелася б. Навошта хаваў боль, сьлёзы, і яна, так пакутуючы, амаль ня бачыла нашых сьлёз, і ўсё таму, што мы «не павінны былі» паказваць ёй, што яна памірае, а яна хавала ад нас невыносны боль, адгароджваючыся раздражненьнем на нашу, усіх, няўмеласьць і нязграбнасьць, але мы пра яе боль ведалі, а яна наш «не павінна была бачыць», і пайшла, так і ня ўбачыўшы. А можа, сьлёзы нашы — не пасьля, а тады! — патрэбныя былі ёй больш за бескарысныя лекі і мумiё і нашыя кругласутачныя дзяжурствы. Апошнія два дні сьвядомасьць затуманеная была, вочы глядзелі востра, але кудысьці нам за сьпіну (ці зрэнкамі ўсярэдзіну), і ўспрымала тых, хто каля яе, абагульнена: вы!.. «Што вы не даеце мне ўстаць?.. Піць! Ну хто так падае? Мне трэба ўстаць. Чаму вы не даеце мне ўстаць?.. Не кажыце мне пра дактароў!..»

(Пра дактароў раней яшчэ: «Мы запаленьне вылечвалі без антыбіётыкаў. А яны пяць месяцаў ня могуць!»)

Удзень 21-га ўсё скардзілася: «Хачу дыхаць!..», «Хачу дыхаць!..» Па-дзіцячы прасіла: «Хачу дыхаць» — і ўвечары. Не хапала паветра. Пра рак сказала пры мне адзін толькі раз: «У мяне рак, таму я так пакутую». Але думала, ведала, а наша, як ёй здавалася, няведаньне крыўдзіла: «Мама, нельга так часта ўставаць (на стул), ты пакутуеш толькі». — «Ня ведаеце вы, ніхто ня ведае маёй мукі», — вырвалася адзін-адзіны толькі раз. І яшчэ — Брылю: «Іван Антонавіч, вы калі-небудзь ба-

чылі, каб так хто мучыўся?» (Вера — нам з Жэнем: «Яна ж рабіла дабро толькі, за што ёй гэта?»)

«Запаленьне», а Саша нічога ня можа, ня робіць, не шукае іншых лекараў, якія вылечылі б... Непаразуменьне, дакор, нават пачала была скрозь зубы дзён дзесяць назад: «Ды калі б...» Я зразумеў: «Ды калі б вы хто-небудзь, ты хварэў, я б разьбілася, а знайшла!” (спосаб вылечыць). Прафэсар Ганчарык на адзін дзень узьняў настрой — яе, а мой зусім зруйнаваў, пацьвердзіўшы дыягназ. А потым яна ўжо пра мэдыцыну і чуць (не хацела). Усё зразумела, а мы ўсё хавалі сьлёзы, а яна іх чакала, мабыць. І «дачакалася» — калі я адкінуў бескарысную, недарэчную ў гэтыя імгненьні чорную кіслародную падушку і, усё зразумеўшы па твары дзяжурнага доктара, што падбег, перастаў стрымлівацца. І ўсе гадзіны потым, калі яна страшна ляжала пад прасьцінай, і калі прывезьлі дамоў ужо ў труне, і ў Глушы перад сотнямі людзей, можна было не хаваць сьлёз. Але яны ёй патрэбны былі!..»

Нейк па «Свабодзе» я пачуў амэрыканскую гісторыю пра бацькоў, што пахавалі сына і ў памяць пра яго стварылі нешта накшталт клюбу, у якім людзі маглі б вучыць адзін аднаго, як трэба праводзіць блізкіх у сьмерць. Самі яны сына праводзілі і правялі, як у дальнюю дарогу, туды, дзе рана ці позна яны сустрэнуцца абавязкова, толькі ён выправіўся раней за іншых. Ні схаваных словаў, ні падману, «каб не было лішніх пакут» (а па-сутнасьці — зьбераганьне ўласных нэрваў і сіл); апошнія дні і гадзіны, ім дараваныя, яны правялі разам, не згубілі, не патрацілі на бессэнсоўнае вывёртваньне ад праўды, правялі ў адкрытых праявах любові і спачуваньня.

Але галоўнае, не было тлуму, недарэчнага стаяньня «пад вакном вагона», жахлівага чаканьня, калі кранецца «цягнік» і вы зробіце некалькі крокаў праводзячы, а нехта пасьпешліва саскочыць з прыступак — гэты рабіў выгляд, што ён з тым, хто «ад'яжджае», на роўных,

каб да апошняга ня верыў, што ён «паедзе», а ўсе застануцца...

Што, не падобна? А колькі разоў мы маглі бачыць (і нас маглі бачыць): доктара акружылі сваякі, хочуць пачуць не такі бязьлітасны прысуд, усе са шчыра спакутаванымі тварамі. Але праз дваццаць, трыццаць крокаў яны ж, што накіроўваюцца ў палату асуджанага, — ну, зусім іншыя ў іх вочы, твары, проста-такі мясцкомаўскія актывісты, пасланыя павіншаваць юбіляра, дачная кампанія, што памкнулася да берага ракі. Яны зойдуць да таго, хто памірае, ня з тым, што на душы ў іх, а што на тварах, — а яны жахлівыя, гэтыя нашыя хлусьлівыя твары.

У той травеньскі дзень 1979 году, калі б хто здымаў мой твар, кадар за кадрам, уражаньне атрымаў бы тое ж. Сядзеў з раніцы за сталом і пісаў «Карнікаў» (нічога лепшага не знайшоў, чым схавацца ад чорных думак у гэты змрок!), потым ішоў па сонечным праспэкце, спачатку прыслухоўваўся, але разышоўся і забыўся, што ногі нейкія ватныя, да будынку бальніцы на Чырвонаармейскай прыкрочыў зусім прыгодны, каб зайсьці да паміраючага: бадзёры з выгляду, загарэлы і моцны — хворыя на лавачцы ля парогу праводзілі зайздросьлівымі вачыма. Зайшоў у палату. Гэтую ноч побач з бабуляй правяла Наташа, толькі што напаіла хворую чаем. Я глядзеў на белы, з саском парцалянавы паільнік: калі зь яго глушанская бабуля паіла малаком траіх сваіх унучак — было на што паглядзець. Седзячы за бясьпечным плотам, усе трое ўважліва глядзелі, як дояць кароўку, затым кожная выпівала свой кубачак малака — атрымаўшы парцалянавы сасок праз шчыліну ў плоце. Была Глуша, было ўсё...

Хворая глядзела на нас уважліва і строга, але адчувалася — ня бачыць, яна ўвесь час услухоўваецца ў нешта, мабыць, зноў пагрозьліва заварушыўся боль...

11.4.1979 г.

Апрануўся ў тое, у чым прыйшоў у бальніцу тыдзень назад, глянуў на кашулю, абутак зь некаторым адчужэньнем: вось гэта ўсё сабралі б і паставілі ў прыбіральні на шафе — памерлага Сплашнова і папка цяпер там ляжыць — і ўзьняўся на паверх вышэй, у палату мамы.

Сядзіць на ложку ў блакітнаватай байкавай кофтачцы, і зноўку, як у дзяцінстве, — ня рысы (мамінага) твару і нават ня твар, а с ь в я т л о... Калі б тыдзень назад здарылася (са мной), апярэдзіў бы яе — гэта была б такая жорсткасьць! У адносінах да яе. А тое, што адбываецца, хіба ня жорсткасьць? А за вакном — усё тое ж. І заўсёды будзе. (Безь цябе, бяз вас.) Так думалі заўсёды. Але іншыя, ня мы.

Колер вачэй у мамы раптам здасца такім бессэнсоўна-дзіцячым. І тады прыкметна, як далёка завялі яе гэтыя тры месяцы. І надзея разам з сэрцам падаюць. Баісься заўважаць.

16.4. Усё зьбіраўся, выплыўшы з крывавага вопыту сваіх апошніх прац («Я з вогненнай вёскі», «Хатынская аповесьць», «Карнікі»), вярнуцца да Пушкіна, зь якога пачынаўся сам і якім уздымаўся ўвесь час гадоў да дваццаці васьмі — як аэрастат «лятучым газам». Перачытаць яго і ім выгнаць шлакі, якімі, вядома ж, атручаны. І, здавалася, абноўлена пачну зноў зь лёгкага кроку. Але ўсё ня мог узяць сінія томікі ў рукі, будучы несвабодным для гэтай сваёй першай і галоўнай любові. А несвабодна дзяліць сябе, не ўсяго аддаць Пушкіну проста ня мог. А тут падумалася (на бальнічным ложку): не пасьпееў бы і гэта! Але, здаецца, пасьпею, недзе да канца году, вызваліўшыся ад гіпэрбарэяў («Карнікаў»), буду піць, піць яго строфы і гнаць, гнаць зь сябе ўсё, што, пакуль працаваў, было энэргіяй, а робіцца, калі скончыў, атрутным шлакам стомы ад чалавечай жорсткасьці і дурноты.

16.4.1979 г. Бедная, плача ад болю, слабая, бездапаможная, але туды, дзе яе хвароба — грозная! — нават не глядзіць і таму не разумее, чаму ёй прапаноўваюць наркотыкі, абураецца іх мэдычнай непісьменнасьцю. Яна помніць, як бегалі да яе (у аптэку) марфіністкі, якія яны былі. Зь яе любоўю да чысьціні ва ўсім — гэта жах, а таму гатова цярпець боль. І доўга расказвала мэдсястры, які жах гэтыя наркотыкі. А мы згаджаемся і ведаем, што падзеі прывядуць да такога стану... І жах — быццам мы ў змове ўсе супраць яе. Вось ужо дзе будзеш пытацца бессэнсоўна: завошта ёй такое?

17.4. Зь яе дзівоснай, рэдкай энэргіяй, актыўна пражытым жыцьцём — колькі людзей, якім яна, хворая, бязногая, была патрэбна да апошніх дзён, ды і цяпер яшчэ нейкія клопаты яе мучаюць разам з болем у баку, сьпіне — яна абсалютна няздольна думаць аб сьмерці — сваёй, аб хваробе с ь м я р т э л ь н а й. Ні разу не загаварыла, што гэта, можа быць, рак... Быццам забыла, што бывае гэта зь людзьмі. Церпіць боль мужна, і дактары гавораць пра гэта з павагаю, якую ў іх нялёгка заслужыць.

Успомніла, як у бальніцы ў Глушанскай: прыйшоў тата наш, а сваячка (хворага) стаіць у куце, моліцца, хацела ўстаць (з каленяў), а ён: «Не, не, прадаўжай, галубка, ты мая памочніца. Удваіх, можа, і вылечым нашых хворых».

24.4.79 г.

Гіпэрбарэі — найнешчасьлівейшы народ. Яны ніколі ня ўмеюць адчуць свае віны перад іншымі, віна іншых перад імі — галоўнае і пастаяннае іх пачуцьцё. А ня ведаючы пачуцьця віны, яны ня ведаюць выхаду... Гэта і народу (нацыі) датычыцца, але і сацыяльнай групы, але і чалавека асобнага.

Наташа пабегла ва ўнівэрсытэт, я застаўся, нешта пытаю, гавару, расказваю, але адчуў: зараз страчу пры-

томнасьць! Што гэта са мной? Ці гэта ад цяжкага бальнічнага паветра? Пасьпеў прамармытаць: «Я на хвілінку да доктара», выйшаў у калідор, прылёг на канапу: халодны пот, столь паплыла. Мэдсястра прабягала, спытала: сэрца? Ды не, нічога, зараз пройдзе... І вось я ўжо ў кабінэце хірурга. Крывацёк у страўніку? Які крывацёк? Выклічце мне, калі ласка, таксі... А ўжо прывалаклі каталку: у вас поўны страўнік крыві! Чакайце, куды гэта вы мяне, я павінен яшчэ вярнуцца ў палату і нейк растлумачыць. Санітары чакалі за дзьвярыма, а я маме дзелавіта тлумачыў, куды так тэрмінова іду, чаго і хто зараз сюды замест мяне прыйдзе. Раней бы наўрад ці прайшло такое, а тут — амаль не пачула. І вось ужо ў маю палату (гэта паверхам ніжэй) зазіраюць іншыя хворыя: ці ня тыя самыя, што, зайздросьцячы, сустракалі мяне ля пад'езду? Яны прыйшлі паглядзець на чалавека, які ішоў па вуліцы і ня ведаў, што «прабадзеньне язвы», што «2,5 літры крыві выцекла». Лічбу гэту і мне паведамілі, каб угаварыць легчы пад нож. Ня лёг. Не захацеў застацца бяз страўніка. І акрамя таго, як растлумачыць ляжачай на паверх вышэй, куды я падзеўся на столькі дзён? (Потым прафэсар Філіповіч скажа: «Ну, вы шчасьлівчык!»)

У запісных кніжках знайшоў два лісткі — нашу з мамай бальнічную перапіску.

«Дарагая мая мама!

Зьбіраўся прыйсьці сёньня, але, мабыць, усё-ткі ў сераду. Прастуда, горла маё прайшлі цалкам амаль. А вось Ганна Іванаўна (доктар) раіць мне, паколькі вясна і многа разоў за зіму абвастралася, прайсьці абсьледаваньне ў лечкамісіі. Чаго ні разу не рабіў. А можа, і варта, пабудзем побач з тыдзень, ня будзе і хадзіць далёка.

Наконт муміё я раіўся з дактарамі. Пагаворым і з Аляксеем Іванавічам, ня будзем самалячэньнем займацца, гэта ясна. Кажуць мне, што ўсё-ткі табе вяся-

лей — выгляд твой гаворыць. Вось толькі бок твой не балеў бы!

Цалую моцна. Саша.”

«Дарагая мая мама!

Як ты там, бядняга, можа, крыху лепш табе? Апэтыт у цябе які-небудзь ёсьць?

Мне расказалі пра гэтую гісторыю з кашулямі. Можа, мне пазваніць заг. аддзяленьня Аляксею Іванавічу, ён вельмі добры чалавек.

Са мной усё нармальна, але прыйду да цябе ў пачатку таго тыдня, t° трымаецца, хаця і невялікая.

Цалую. Саша.”

Пра кашулі — іх сушылі на батарэі ў палаце, вельмі пацела, бесьперапынна, а нехта зь сясьцёр гучна запратэставаў супраць парушэньня правіл.

«Саша!

Ня сьмей званіць і нікому гаварыць, нянечкі як сушылі, так і сушаць (кажуць, ня слухайце гэтую дурніцу), гэта ж адна выскачыла, а то можа такое зрабіць з уколамі, што і хірургі не памогуць — паўтараю, нікому ні слова. Ем — усяго патрохі, па гэтым жыць буду. Будзь здароў, не сьпяшайся. Цалую. Мама.”

Бадай, чарговасьць лістоў была іншая: спачатку — пра кашулі, потым — пра маю «прафіляктыку».

І вось я, узышоўшы на паверх, зьявіўся ў яе зноў, у бальнічным касьцюме, нібыта толькі што мяне «паклалі»: цяпер будзем разам! Спачатку прыняла ўсяго толькі як зручную магчымасьць не карыстацца дапамогай, паслугамі чужых людзей: для яе гэта заўсёды была пакута з пакут. Каб нехта ды нешта для яе зрабіў! Яна для іншых — гэта зразумела, але каб для яе — заўсёды паніка, ня ведае куды падзецца. А яшчэ гэтая бязьмежная любоў да чысьціні. Павінны адвезьці на рэнтген:

Саша, прыйдзі абавязкова, паможаш устаць, ты сам усё зробіш. Добра б, але мне ніяк нельга з маім страўнікам. І трэба прыдумляць, што тэрмінова доктар паклікаў... І г. д. і да т. п.

У нейкі момант ня вытрывала, спытала ў нявестак: «Дзе Адамовічы?» — ды так варожа-староньне спытала.

Вось так! Дзе там сыны, чым яны ўсе там занятыя?

У апошнюю ноч усё паўтарала: «Кліч, Антон...» Каго кліч? Ці не сыноў? Бо гэта ж ён памог ёй знайсьці іх, быў добрым вестуном — у вайну.

Але, здаецца, нават затуманеная ўколамі ад болю матчына сьвядомасьць угадвала, у чым і дзе падман.

"Інтуіцыя ўсё сказала. Нейк за дзён 6 да разьвязкі, калі я сабраўся ў Аксакаўшчыну далечвацца і паехаць ня змог, таму што трывожна было... мама раптам сказала: «Пагублю я цябе!»

— Ты пра што, мама?

— Не даюць табе палячыцца. Пагублю я цябе!..

Значыць, ня верыла, што ў мяне проста лёгкае абвастрэньне і з гэтым ляжаў на паверх ніжэй.

«Раніцой 22 траўня, калі мы былі пры ёй (з Соняй), яна ўсё клікала Антона, дакладней, зьярталася да яго: «Кліч, Антон... Кліч, Антон...» І так разоў дваццаць. А перад гэтым разы два, калі я падымаў яе, назвала мяне таксама «Антонам»: сьвядомасьць пайшла туды, дзе дзяцінства? Не сыны, ня ўнучкі, а браты і сёстры і калі сама была маленькаю і таксама бездапаможнаю. Старэйшая за Антона, але ён у школу пайшоў разам зь ёй (у пяць гадоў) і быў заўсёды побач..."

«А пахаваньне ўжо, памінкі — гэта было пацьвярджэньне яе жыцьця. Несьлі яе пляменьнікі (усіх амаль яна так ці інакш накіроўвала ў жыцьцё), партызаны нашы. А каля «падпольнай» аптэкі раптам зьбегліся ўсе партызаны (іх было чалавек 15) да труны і ўзьнялі труну яе на выцягнутых руках. А хто ім сказаў, падказаў, потым не маглі ўспомніць...»

«... У мамы кроў — група першая, рэзус адмоўны.

Мне яе перадала. У адносінах да мяне гэта ня мае таго сэнсу. Затое пра яе падумалася: такую кроў можна аддаваць усім, сумяшчальная зь любой групай. Нібыта так па мэдыцыне. Вось яна і аддавала ўсім сябе, хаця зь яе даволі ўладным характарам людзі звычайна бяруць, а не аддаюць».

«Мама гаварыла з унучкамі, што хоча памерці летам. І сваёй сяброўцы (па Глушы) Холад тое ж самае:

— У траўні памру. Не хачу зімой, а то такі дурны звычай, што трэба бяз шапак праводзіць, усе папрастуджваюцца».

«— Мне тут так адзінока, страшна!" (Гэта яна сказала, калі Інка і Наташа пакінулі яе на дзьве гадзіны з бальнічнай нянечкай.)

І заплакала, так па-дзіцячы зморшчыўся цёмна-схуднелы тварок яе.

О, Госпадзе, усё гэта стаіць і не адыходзіць, і ня трэба, каб хоць нешта пайшло».

6.4.1979 г. Я ўвесь час лаўлю сябе на думцы і пачуцьці пра ілжывае і подлае сваё становішча: я лячуся тут (у Аксакаўшчыне), таму што яе няма, я адпачываю, с п а к о й н а чытаю, пішу, таму што яна п а м е р л а ў ж о, і ня трэба трывожыцца, званіць і рвацца ехаць у Менск. Вось што такое сумленьне: збоку нібыта «не вінаваты», а свой прысуд: «вінаваты, вінаваты!»

Вярнуўся з батанічнага (саду), дзе гэта запісалася, пачаў пасьпешліва шукаць Пушкіна, схапіў сінія томікі, каб вярнуцца туды, дзе я быў неаддзельны ад Яе — да дзяцінства, юнацтва, Глушы. Але Пушкін ужо ня той, не, я ня той, усё ня тое...

Аказваецца, і ў Пушкіна трэба пагружацца паступова — пасьля вялікага перапынку, ня варта кідацца разгарачанаму з абрыву ў крынічную ваду — не адразу прыме, адштурхне рознасьцю тэмпэратур.

Старажытныя эгіпцяне на саркафаг ставілі жука-скарабея, з надпісамі-заклінаньнямі, к а б н я

с ь в е д ч ы л а  с э р ц а  н я б о ж ч ы к а  с у п р а ц ь  я г о  н а  с у д з е...

Дзіўная формула. Наша сэрца — супраць нас? Гэта што, стараліся ўлашчыць, угаварыць сумленьне быць больш стрыманым т а м?

Так, жыцьцё пражыць — ня поле перайсьці. Як усё проста, але сказана назаўсёды, пра ўсіх. Зь Вечнасьці перабегчы ў Вечнасьць. А па шляху — столькі ўсяго.

*25 траўня 1993 г.*
*(Пачата ў сьнежні 1992 г.)*

Літаратурна-мастацкае выданьне

**Алесь Адамовіч.**
**Vixi.**
*Тры апошнія аповесьці.*

*Над выданьнем працавалі:*
Натальля Адамовіч, Міхась Тычына, Сяргей Дубавец, Віктар Корзун

Падпісана ў друк 28.08.2002. Фармат 60x84/16. Папера афсэтная. Друк афсэтны. Ум.-друк. арк. 29,4. Ул.-выд. арк. 22,5. Наклад 200. Заказ 860.

Рэклямна-выдавецкая фірма "Ковчег".
Ліцэнзія ЛВ №180 ад 23.01.1998.
220012, Мінск, вул. Кедышка, 8-1а.

Друкарня Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства "Информационно - вычислительный центр Министерства финансов Республики Беларусь"
Ліцэнзія ЛП № 45 ад 10.10.1997г.
220004, Мінск, вул. Кальварыйская, 17.



ISBN 985-6056-33-0

9 789856 056331

Алесь Адамовіч

VIXI